Рег. № 273-2016-6 и/р

Установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”

Гістарычны факультэт

Кафедра гісторыі Беларусі

УЗГОДНЕНА

Загадчык кафедры
_____А.Р.Яшчанка
14 красавіка 2016 г.
Старшыня метадычнага савета факультэта
_____ С.Б.Жыхараў
25 красавіка 2016 г.

УЗГОДНЕНА

Дэкан факультэта
_____ М.М.Мязга
_____ 2016 г.

ВУЧЭБНА МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ
ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

для спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці)
1-23 01 12 МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Складальнікі:
дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, к. г. н., дацэнт, А.Д. Лебедзеў
дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, к. г. н., дацэнт, В.А. Міхедзька
дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, к. г. н., дацэнт, В.П. Пічукоў

Рассмотрено и утверждено
на заседании кафедры истории Беларуси
14 апреля 2016 г.,
протокол № 10

Рассмотрено и утверждено
на заседании научно-методического
совета университета
__11 05_____ 2016 г.,
протокол № 6

ЗМЕСТ

1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 3

2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 5

2.1 КАНСПЕКТЫ ЛЕКЦЫЙ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ” 5

3 РАЗДЗЕЛ КОНТРОЛЮ ВЕДАЎ 360

3. 1 Тэставыя заданні 360

3. 2 Пытанні да экзаменаў 367

4 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 373

4.1 ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА 373

5 ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА 411

5.1 ЛІТАРАТУРА 411

Тлумачальная запіска

Актуальнасць вывучэння дысцыпліны ў кантэксце ўсходнеславянскай і еўрапейскай гісторыі абумоўлена тым, што беларускі народ гістарычна сфарміраваўся ў працэсе ўзаемадзеяння розных сацыяльна-эканамічных і этнакультурных супольнасцей пад уплывам еўразійскіх цывілізацыйных і геапалітычных фактараў.

Улік уплыву на працэс гістарычнага развіцця беларускага народа розных культурна-цывілізацыйных фактараў, перш за ўсё ўсходнеславянскага і ўсходнееўрапейскага, адлюстроўвае патрэбнасць сучаснага беларускага соцыума ў самасвядомасці і асэнсаванні свайго мінулага, сучаснасці і будучыні.

Асноўныя мэты сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў у ВНУ – фарміраванне і развіццё сацыяльна-асобасных кампетэнцый, заснаваных на гуманітарных ведах, эмацыйна-каштоўнасным і сацыяльна-творчым вопыце, якія забяспечваюць вырашэнне і выкананне грамадзянскіх, сацыяльна-прафесійных, асобасных задач і функцый.

Месца вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя Беларусі” ў сістэме сацыяльна-гуманітарных ведаў вызначаецца прадметам вывучэння: агульнасістэмнымі заканамернасцямі і рэгіянальнымі асаблівасцямі працэсаў дзяржаўна-палітычнага, сацыяяьна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага і духоўнага развіцця беларускага народа ў кантэксце ўсходнеславянскай і агульнаеўрапейскай гісторыі з улікам цывілізацыйных характарыстык.

Пачынаецца ВМК з тэарэтычнага раздзела. У ім прадстаўлены канспекты лекцый, тэматыка якіх адпавядае вучэбнай праграме дысцыпліны. У іх раскрыты важнейшыя тэарэтычныя пытанні гісторыі першага перыяда Новага часу, прыведзены неабходны для засваення асноўны фактычны матэрыял. Да кожнай тэмы лекцый рэкамендавана літаратура, якая дазваляе студэнтам больш глыбока вывучыць пытанні лекцыі.

Практычны раздзел ВМК уяўляе сабою практычнае кіраўніцтва для правядзення семінарскіх заняткаў. Ён утрымлівае не толькі пералік пытанняў да семінарскіх заняткаў і рэкамендуемую для іх вывучэння літаратуру, але і арыентуе студэнтаў на засваенне асноўных паняццяў, персаналій, якія маюць дачыненне да вывучаемай тэмы. Тэматыка практычных заняткаў складзена ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай дысцыпліны.

Раздзел кантролю ведаў уключае комплекс тэставых заданняў, якія ахопліваюць увесь матэрыял курса ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай. Студэнтам прапануецца выканаць тэсты рознага тыпу. Самыя простыя з іх патрабуюць выбару правільнага адказа з прыведзенных варыянтаў. Ёсць тэсты, пры выкананні якіх студэнты павінны суаднесці элементы двух мностваў, устанавіць паслядоўнасць. Тэсты адкрытага тыпу патрабуюць напісання правільнага адказу. Тэставыя заданні падрыхтаваныя такім чынам, што яны дазвалюць праверыць узровень засваення студэнтамі як фактычнага матэрыялу (даты, падзеі, персаналіі), так і іх тэарэтычныя веды. Тэсты могуць выкарыстоўвацца для праверкі бягучай паспяховасці студэнтаў на працягу семестра, для ажыццяўлення імі самакантролю ведаў. Раздзел кантролю ведаў

уключае кантрольныя пытанні да тэм, якія выносяцца на самастойнае вывучэнне студэнтаў, і пытанні да экзамена.

Дапаможны раздзел ВМК уяўляе сабою вучэбную праграму дысцыпліны. Яна дазваляе студэнту зарыентравацца адносна аб'ёма ведаў, якія ён павінен засвоіць пры вывучэнні курса. Праграма ўтрымоўвае і спіс літаратуры, якая неабходна студэнту для грунтоўнага засваення вучэбнага матэрыяла і можа быць выкарыстана пры напісанні курсавых работ.

ВМК прадназначаны для студэнтаў 1-2 курсаў спецыяльнасці "Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны" 1-23 01 12.

2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

2.1 КАНСПЕКТЫ ЛЕКЦЫЙ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ”

Тэма 1. Уводзіны ў гісторыю Беларусі.

1. Гісторыя як навучальная дысцыпліна

Тэрмін гісторыя бярэ свой пачатак ад старажытнагрэчаскага слова апавяданне аб минулых падзеях, фактах, аб тым, што пазнана, даследавана.

Назапашванне гістарычных ведаў у глыбокай старажытнасці пачалося і вялося ў вусных пераказах. Найдаўнейшыя пісьмовыя помнікі з а глядам гістарычных падзей вядомы ў дзяржавах Старытытнага Усходу (канец 4 – пач. 3-га тыс. да н.э. Вялікі ўклад ў распрацоўку гістарычных уяўленняў пакінулі антычныя гісторыкі – Герадот, Плутарх, Лівій, Тацыт і інш.)

У старажытнасці гісторыя лічылася не навукай, а галіной мастацтва. Але, ужо ў працах Герадота праявляўся прагматызм, ён імкнуўся не толькі апавядаць пра тыя ці іншыя факты ў пэўнай паслядоўнасці, аднак і растлумачыць іх паходжанне з даўніны.

Сярэдневяковыя заходнееўрапескія гістарычныя веды мелі даволі складаную структуру і падзеляліся на свяшчэнную і свецкую гісторыю. Гісторыя разглядалася як працэс, прадвызначаны Богам.

У эпоху Адраджэння ў цэнтры гісторыі аказваюцца падзеі і факты.

У эпоху Асветніцтва гісторыкі адмовіліся ад тэалагічнага тлумачэння гісторыі, склаўся погляд на гісторыю як працэс заканамернага развіцця, прызнавалася адзінства лёсу ўсяго чалавецтва.

Навукай гісторыя зрабілася на пачатку XIX ст., калі галоўная цікавасць была накіравана на вывучэнне грамадскага жыцця на ўсіх ступенях яго развіцця.

На пачатку XX ст. рускі гісторык С. Платонаў казаў, што “Гісторыя з’яўляецца навукай, якая вывучае канкрэтныя факты ва ўмовах (іменно) часу і месца і галоўнай мэтай яе лічыцца сістэмнае адлюстраванне развіцця і змен жыцця асобных гістарычных грамадстваў і ўсяго чалавецтва”. “Савецкі гістарычны слоўнік” дае наступнае тлумачэнне “гісторыя–гэта 1) працэс развіцця прыроды і грамадства; 2) даследаванне мінулага чалавецтва ва ўсёй канкрэтнасці і разнастайнасці”.

Такім чынам, гістарычная навука ў шырокім сэнсе гэта працэс развіцця ў грамадстве.

У вузкім спецыфічным сэнсе гісторыя гэта навука аб заканамернасцях разгортвання ў прасторы і часе сусветна-гістарычнага працэсу і ўзаемадзеянняў этнапалітычных супольнасцей.

Аб’ект пазнання гістарычнай навукі – уся сукупнасць з’яў грамадскага жыцця на працягу ўсёй гісторыі грамадства.

У параўнанні з іншымі грамадска-гуманітарнымі навукамі гісторыя выступае як навука комплексная, інтэгральная.

Прадметам яе пазнання з’яўляецца раскрыццё чалавечай дзейнасці ва ўсёй шматбаковасці, прасторавай і часовай канкрэтнасці.

Асноўнымі функцыямі гістарычнай навукі з’яўляюцца такія сацыяльныя функцыі як

Навукова-пазнавальная дазваляе на канкрэтным прыкладзе гістарычнага шляху развіцця грамадства ад старажытнасці да сучаснасці выяўляе галоўныя тэндэнцыі развіцця гістарычнага працэсу, дае фундаментальныя тэарэтычныя навуковыя веды;

- Практычна-рэкамендацыйная заключаецца ў тым, што гісторыя ўвогуле выяўляе заканамернасці развіцця грамадства, дапамагае вырашэнню сучасных праблем краіны;
- Выхаваўчая адыгравае значную ролю ў фарміраванні навуковага светапогляда, патрыятызму.

2. Тэрыторыя і прыродныя умовы. Перыядызацыя гісторыі Беларусі

Беларусь знаходзіцца на захадзе старажытнай Усходне–Еўрапейскай раўніны, на водападзеле Чорнага і Балтыйскага мораў. Яе цяперашняя плошча 207,6 тыс. кв. км, а насельніцтва на 2000 г. складала 10,3 млн. чалавек.

Краіна не мае выхаду ні да мора, ні да гораў. Межы Беларусі з Літвой, Латвіяй, Расіяй, Украінай і Польшчай не звязаны з істотнымі прыроднымі рубяжамі ці перашкодамі. Большую частку яе паверхні ўтвараюць раўніны і нізіны, а ўзвышшы не займаюць і трэцяй часткі плошчы краіны. Асноўныя формы рэльефу сфармаваліся яшчэ ў ледавіковы перыяд. Выгляд тэрыторыі і сетка рэк атрымалі блізкія да цяперашніх рысы яшчэ каля дзевяці—пяці тысячагоддзяў назад. Марэнныя ўзгоркі чаргуюцца тут з раўнінамі ды азёрна–балотнымі нізінамі, асабліва на поўдні, дзе прырода захавала больш старажытнае аблічча.

Галоўныя рэкі — Дзвіна, Дняпро, Нёман і Прыпяць, прытокі якіх густой сеткай пакрываюць тэрыторыю ўсяго краю ды звязваюць яе ў адно цэлае. Водасістэмы Дзвіны і Нёмана, якія ўпадаюць у Балтыйскае мора, аддзелены ад Дняпроўскага басейна шырокай чарадой узвышшаў, працягнутай з паўднёвага захаду на паўночны ўсход Беларусі. На поўначы, у Паазер’і рэльеф мае выразна марэнна–ледавіковыя формы. Сярод забалочаных нізін і раўнін тут засталася найбольшая колькасць азёр, пакінутых апошнім ледавіком. Цэнтральная частка тэрыторыі Беларусі ўзвышана, таму яна заселена шчыльней за іншыя раёны і лепш гаспадарча асвоена. Поўдзень краіны ахапіла вялікая прыледавіковая раўніна, значную частку якой займае Беларускае Палессе — моцна забалочаная нізіна ў басейне Прыпяці, нахіленая на ўсход.

Клімат Беларусі ўмерана–кантынентальны і вільготны, які фармуецца пераважна пад уплывам палярна–марскога паветра. Глебы малаўрадлівыя, пясчана–гліністыя ці пясчаныя, толькі зрэдку — дзярнова–падзолістыя, а на поўдні — тарфяністыя. Галоўным прыродным багаццем краю здаўна былі лясы, якія густым масівам пакрывалі ўсю яго паверхню. З XVIII ст. іх высечка набыла знішчальны характар, але ў XIX ст. лясы ахаплялі яшчэ больш за палову тэрыторыі Беларусі, і нават цяпер лясное покрыва займае каля 1/3

плошчы краіны. Асабліва багатыя лесам Падзвінне ды басейн Бярэзіны. Беларускі лес змешаны, але ў цэлым на сухіх землях дамінуюць хваёвыя, а ў забалочаных раёнах — вольха і бяроза.

Ландшафт Беларусі, вядома ж, на працягу стагоддзяў мяняўся ў выніку як прыродных працэсаў, так і людскога гаспадарання. Аднак у асноўных рысах выгляд мясцовасцяў нашага краю з эпохі Сярэднявечча да гэтага часу не зведаў асабліва значных трансфармацый. Як сведчаць рэвізіі пушчаў сярэдзіны XVI ст., праведзеныя ў сувязі з аграрнай рэформай, вялізныя гушчары і багны аддзялялі адзін заселены абшар ад другога, сярод якіх найбольшай шчыльнасцю насельніцтва і гаспадарчай асвоенасцю вылучаліся заходнія і цэнтральныя землі — Панямонне, Падляшша, басейн Вяллі ды яшчэ паветы Менскі, Слуцкі і Клецкі. Асобнымі выспамі жыхарства канцэнтравалася таксама ў Полацкай, Віцебскай ды Смаленскай землях, у раёнах Пінска ды Турава. Астатнія абшары, асабліва на поўдзень ад пінскіх балотаў, якія аддзялялі Беларусь ад Украіны, былі зусім малалюдныя.

Гістарычная перыядызацыя – гэта форма колькаснага і якаснага абазначэння гістарычнага развіцця. Перыядызацыі існуюць лінейныя (падзел гісторыі на раўназначныя паслядоўна наступаючымі ступені) і іерархічныя (калі вялікія ступені гісторыі падзяляюцца на меншыя, напрыклад – сярэднявечча на ранняе і поздняе). Так сама існуюць і спецыяльныя перыядызацыі – напрыклад – археалагічная. Аснову любой перыядызацыі складваюць крытэрыі. Крытэрыі могуць быць сацыяльна-эканамічныя, духоўныя, палітычныя і інш. Канчаткова пытанне перыядызацыі гістарычнага развіцця грамадства не вырашана і ў наш час. Існуе некалькі розных канцэпцый перыядызацыі, у падмурак кожнай з якіх пакладзены свой прынцып.

Найбольш ранняя перыядызацыя – гэта так званая канцэпцыя “трох ступеняў”. Распрацавана яна была яшчэ ў старажытныя часы грэчаскімі навукоўцамі. Згодна з іх меркаваннямі, чалавецтва ў сваім развіцці прайшло тры стадыі. Першая стадыя – “залаты век” – характаразавалася прысваеннем гатовых дароў прыроды. Другая стадыя – дзікасць – была звязана са з’яўленнем і распаўсюджваннем такіх форм гаспадарання, як паляванне і жывёлагадоўля. Трэцяя стадыя – цывілізацыя – характаразавалася высокім узроўнем развіцця земляробства і грамадскага жыцця. Пераход ад адной ступені да другой праходзіў паступова. Гэта перыядызацыя з некаторымі змяненнямі і дапрацоўкамі была галоўнай да сярэдзіны XIX стагоддзя.

Першую спробу ўсеагульнай перыядызацыі зрабілі еўрапейскія гуманісты XIV-XVI стагоддзяў, якія эпоху Адраджэння назвалі Новым часам у параўнанні з папярэднім перыядам гісторыі. У канцы XVII стагоддзя канчаткова склалася класічная трохчасткавая схема гісторыі: “Старажытны свет – Сярэднія вякі – Новы час”. Зараз гэтая перыядызацыя дапоўнена перыядам “Найноўшы час”.

У XIX ст. Карл Маркс распрацаваў фармацыйную тэорыю развіцця грамадства на падставе якой была складзена адпаведная перыядызацыя. Былі вылучаны тры фармацыі – пярвічная (архаічная); другасная (эканамічная); трацічная (камуністычная). У падмурак гэтага падзелу на фармацыі быў пакладзены прынцып панавання асноўнага спосабу вытворчасці ці тыпу

маёмасці. Так, да другаснай фармацыі даследчык вылучаў азіяцкі, антычны, феадальны і сучасны спосабы вытворчасці. Гэтая канцэпцыя, дапрацаваная У. Леніным і І. Сталіным, была пануючай у гістарычнай навуцы СССР.

У наш час папулярнасць набыла цывілізацыйная канцэпцыя развіцця грамадства, пачатак якой пакладзены ў XIX ст. А. Тойнбі, І. Данілеўскім, О. Шпенглерам. Цывілізацыя – гэта «ўстойлівы, самаўзнаўляльны тып сацыяльнай арганізацыі аднаго ці некалькіх грамадстваў, калі яны звязаны прыкладна аднолькавымі палітычнымі, эканамічнымі, сямейнымі, псіхалагічнымі і прававымі традыцыямі, якія могуць перадавацца ад адных этнасаў да другіх, што з'явіліся на гістарычнай арэне пазней». Згодна з цывілізацыйнай канцэпцыяй існавалі на працягу гісторыі лакальныя цывілізацыі (яны ахоплівалі кароткія гістарычныя цыклы) і сусветныя цывілізацыі (ахоплівалі больш працяглыя гістарычныя цыклы). Гэтыя цывілізацыі аб'ядноўваюць шэраг краін і тэрыторый, яны маюць свае спецыфічныя асаблівасці развіцця, але, змяняючы адна адну, яны захоўвалі паслядоўнасць і пераемнасць развіцця тэрыторый. Гісторыя такім чынам падаецца як адзіная плынь.

Гісторыя Беларусі вывучаецца на падставе розных перыядызацый. Выкарыстоўваюць еўропацэнтрысцкую, простую і ўніверсальную перыядызацыю. Згодна з ёй, гісторыя Беларусі падзяляецца на наступныя перыяды:

- старажытны (100 тыс. г. да н.э. – V ст. н.э.);
- сярэднія вякі (VI ст. н.э. – XV ст. н.э.);
- новы час (XVI ст. – пачатак XX ст.);
- навейшы час (з 1914 г. па сённяшні дзень).

Існуе так сама дзяржаўніцкі падыход да перыядызацыі, які аформіўся ў пачатку XX стагоддзя ў працах В.Ластоўскага і Ў.Ігнатоўскага. Вылучаліся перыяды беларускай гісторыі – полацкі, літоўска-беларускі, польскі, расійскі і савецкі. А ў сярэдзіне XX стагоддзя зацвердзілася фармацыйная канцэпцыя перыядызацыі, заснаваная на прынцыпах гістарычнага матэрыялізму. Нацыянальныя адметнасці і каштоўнасці рэгіёну гэты падыход не цікавіў.

3. Важнейшыя крыніцы па гісторыі Беларусі

Крыніцы па гісторыі Беларусі вельмі разнастайныя па форме, зместу і дакладнасці інфармацыі. Гісторыкі карыстаюцца некалькімі тыпамі крыніц. Кожны тып, у сваю чаргу, можа падзяляцца на больш дробныя састаўныя часткі.

Археалагічныя крыніцы. Гэты тып крыніц – асноўны для даследчыкаў да з'яўлення крыніц пісьмовых. Аднак і з існаваннем пісьмовых крыніц археалагічныя не страчваюць сваей вагі ў вывучэнні гістарычных падзей да XV-XVII ст. Да археалагічных крыніц адносяць: рэшткі старажытных паселішчаў, стаянак, гарадзішчаў, гарадоў; выкапневыя прылады працы, прадметы побыту, хатняе начыненне, адзенне; горныя выпрацоўкі, гідратэхнічныя збудаванні, палі старажытнага земляробства, дарогі; зброю, абарончыя збудаванні; магільнікі і інш. На ўсёй тэрыторыі Беларусі

зарэгістравана каля 6 тысяч буйных археалагічных помнікаў, што ахопліваюць храналагічны перыяд ад часоў першых пасяленцаў (каля 100-40 тыс. гадоў да н.э.) і да XV ст.

Тапанімічныя крыніцы. Тапонімы – гэта назвы геаграфічных аб'ектаў. Яны былі дадзены яшчэ ў самыя старажытныя часы, захоўваючы звесткі пра этнічны склад старажытнага насельніцтва тэрыторыі, найбольш распаўсюджаныя яго заняткі. Так, існаванне падсечна-агнявой (ляднай) сістэмы земляробства знайшло адлюстраванне ў назвах населеных пунктаў Ляды, Чысць. Ад старадаўніх промыслаў і рамёстваў атрымалі назвы пунктаў Рудня, Кавалі, Пушкары. Ў 20-я – 60-я г. XX ст. праводзілася палітыка перайменавання паселішчаў. Шмат весак і гарадоў, што мелі нязвучныя назвы, страцілі іх. Так каля 1000 старадаўніх назваў населеных пунктаў зніклі з карты Беларусі. У выніку каштоўнасць гэтага тыпу крыніц значна знізілася.

Помнікі пісьменнасці. Пісьменнасць ва ўсходніх славян звязана з увядзеннем братамі Кірылам і Мяфодзіем у 863 г. кірылічнай азбукі, якая пакладзена ў аснову алфавітаў сучаснай беларускай, рускай і ўкраінскай моў.

Раннія пісьмовыя крыніцы – гэта «Аповесць мінулых гадоў», Лаўрэнцьеўскі, Іпацьеўскі, Радзівілаўскі летапісы, «Руская праўда», «Слова аб палку Ігаравым» і інш. дакументы. У іх мы знаходзім самыя раннія звесткі пра гарады Полацк, Тураў, Брэст, Мінск, Друцк, аб рассяленні ўсходніх славян на тэрыторыі Беларусі, іх гаспадарчай дзейнасці, грамадскім ладзе. Разам з археалагічнымі крыніцамі яны даюць досыць поўнае ўяўленне аб жыцці і занятках насельніцтва старажытнай Беларусі.

Беларускія летапісы складаліся ў межах Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў XIII-XVI стст. на старажытнарускай, старабеларускай і польскай мовах. Ранні этап беларускага летапісу прадстаўлены кароткімі летапіснымі рэдакцыямі. Гэта Супрасльскі, Ураўскі, Познанскі, Нікіфараўскі, Слуцкі, Акадэмічны летапісы. Да падрабязных летапісаў адносяцца «Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага», а таксама спісы Красінскага, «Летапіс Быхаўца». Яны адлюстроўваюць заканчэнне працэсу этнічнай, палітычнай і эканамічнай кансалідацыі беларускіх земляў, што адбылася да XVI ст. Летапісы канца XVI-пачатку XVII ст. (Баркулабаўскі летапіс, Віцебскі летапіс) аб беларускіх землях гавораць як аб адзіным палітычным і эканамічным рэгіёне.

Гаспадарчыя дакументы XV – першай паловы XIX ст. як крыніцы па гісторыі Беларусі маюць выключную каштоўнасць. Яны прадстаўлены інвентарамі маёнткаў, гарадоў, рэвізіямі дзяржаўных і магнацкіх маёнткаў і г.д. Тут маюцца звесткі аб памерах зямельных угоддзяў, колькасці двароў, занятках насельніцтва, стане рамяства і гандлю і іншых баках дзейнасці насельніцтва.

Матэрыялы цэнтральных і мясцовых органаў дзяржаўнай улады Расійскай імперыі з'яўляюцца крыніцай па вывучэнню палітыкі цэнтральнага ўрада на беларускіх землях і стана развіцця гаспадаркі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст.

Мемуарная літаратура і дзённікі ўтрымліваюць вельмі каштоўныя звесткі аб настроях, якія панавалі ў грамадстве ў тыя часы, аб спосабах вядзення гаспадаркі ў кожным канкрэтным маёнтку, якім валодаў аўтар.

Статыстычныя даведнікі выдаваліся ў межах Расійскай імперыі з пачатку XIX ст. Адзін з першых даведнікаў: «Статистическое изображение городов и посадов Российской империи по 1825 год» (1829 г.) утрымліваў дакладныя звесткі аб эканамічным стане беларускіх гарадоў. Друкаваліся спецыялізаваныя даведнікі, яны ахоплівалі розныя сферы гаспадарчага развіцця («Фабрично-заводская промышленность России. Перечень фабрик и заводов» (1897 г.); «Статистика землевладений в 1905 г.» (1906-1907 гг.), а таксама матэрыялы рэвізій конскіх перапісаў і ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г.

У савецкі перыяд перш за ўсё выдаваліся статыстычныя даведнікі па выніках кожнай пяцігодкі ці да юбілеяў існавання савецкай улады («Советская Белоруссия», 1921 г.; «Белорусская ССР в цифрах. К 10-летию существования БССР. 1919-1929 гг.», 1929 г.; «Ітогі першай пяцігодкі БССР», 1934 г.; «Белорусская ССР за годы Советской власти», 1967 г.; «Народное хозяйство Белорусской ССР. Юбилейный статистический ежегодник», 1978 г. і г.д.). Да кожнага з іх трэба падыходзіць творча і крытычна.

Перыядычныя выданні – гэта агульная перыёдыка, прадстаўленая грамадска-палітычнымі, культурнымі часопісамі і газетамі «Русский архив» (1863-1917), «Русская старина» (1870-1918 гг.), «Губернскія ведамасці», “Мінскі лісток”, гарадскія газеты-капейкі, першымі беларускімі газетамі “Наша доля” і “Наша ніва”.

Публікацыя дакументаў па гісторыі Беларусі пачалася ў першай палове XIX ст. Першай такой публікацыяй з’явілася выданне «Белорусского архива древних грамот. 1507-1768 гг.», здзейсненнае Іванам Грыгаровічам у 1824 г. Шматтомныя выданні здзейсніла Пецярбургская археаграфічная камісія, што выдала 5 тамоў «Актов, относящихся к истории России», 1846-1853 гг. і 15 тамоў «Актов, относящихся к истории Южной и Западной России», 1863-1892 гг. Віленская археаграфічная камісія выдала на працягу 1865-1904 гг. 39 тамоў «Актов, издаваемых Виленской Археографической комиссией» і 14 тамоў «Археографического сборника документов, относящихся к истории Северно-Западной Руси». Археаграфічная камісія, што працавала ў Віцебску, у 1871-1906 гг. выдавала «Историко-юридические материалы», усяго 32 выпускі. Такім чынам асноўная частка публікацыі дакументаў была здзейснена ў дарэвалюцыйныя часы.

У савецкі перыяд ў 20-я гг. выдадзен зборнік «1905 год у Беларусі». У 30-я гг. убачылі свет «Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі ў гады распаду феадалізму» (у 2 т.); Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах, IX-XVIII стст.» (Т.1. 1936), «Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі, 1772-1903 гг.» (Т.3. 1940). У 50-70-я гг. выдадзены зборнік «Белоруссия в эпоху феодализма» (У 4 т.), «Документы и материалы по истории Белоруссии. 1900-1917 гг.», «Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времен до 1917 г.».

Архіўныя матэрыялы можна разглядаць як асобны тып крыніц. Зараз ў Нацыянальным архіве Беларусі налічваецца 7089 фондаў (па дакументах з XIV да XIX ст. – 3089, па дакументах XX ст. – 4000), у якіх захоўваецца больш за 2 млн. спраў, частка з іх – каштоўныя крыніцы па эканамічнай гісторыі Беларусі.

4. Асноўныя этапы развіцця гістарыяграфіі гісторыі Беларусі

Канцэпцыі польскіх і расійскіх гісторыкаў

Расійская афіцыяная навука зыходзіла з вялікадзяржаўніцкіх поглядаў на Беларусь як на спадчыннае ўладанне расійскіх манархаў, а на беларусаў як на частку велікарускага народа. Так, прадстаўнік тэорыі "заходнерусізму" М.Каяловіч сцвярджаў, што народ "Западной Расіі (беларусы і украінцы) гэта галіна рускага народа, якая пасля мангола-татарскага пагрому Паўночна-Усходняй Русі папала спачатку пад уладу Літоўскага княства, а потым – Польскай дзяржавы. Таму Расія павінна не толькі вызваліць "истинно"рускія землі, але і давесці неабгрунтаваннасць прэтэнзій польскага боку на землі "Западной России".

Польскія вучоныя разглядалі Беларусь як частку Польшчы. Згодна з ідэалагічнымі пабудовамі польскіх навукоўцаў, беларусы, як і украінцы, з'яўляліся толькі галіной адзінага польскага народа. Найбольш значным прадстаўніком польскага вялікадзяржаўнага напрамку лічыцца Л.Галембоўскі.

Першымі прафесійнымі гісторыкамі, якія заклалі падмурак канцэпцыі беларускай гісторыі, былі прафесары Віленскага універсітэта І. Анацэвіч, М. Баброўскі, І. Даніловіч, Т. Нарбут, Ю. Ярашэвіч і інш. І. Даніловіч упершыню апублікаваў Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 г., Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г. і іншыя крыніцы па гісторыі Беларусі. Ю. Ярашэвіч апублікаваў фундаментальнае даследаванне "Вобраз Літвы з пункту гледжання цывілізацыі ад найстаражытнейшых часоў да канца XVIII ст. (Вільня, 1844 – 1845. Т. 1 – 3). Вывучэннем гісторыі Вялікага княства Літоўскага, збіраннем археалагічных крыніц, пошукамі і апрацоўкай матэрыялаў для "Актов Западной России" (СПб., 1846 – 1853. Т. 1 – 5) займаўся І. Анацэвіч.

Браты Я. І К. Тышкевічы з'яўляюцца пачынальнікамі беларускай археалогіі, З. Даленга-Хадакоўскі – заснавальнікам беларускай фальклярыстыкі і мовазнаўства, Т. Нарбут – аўтарам 9-томнай "Гісторыі літоўскага народа" (Вільня, 1835 – 1841), А. Кіркор – вучоным і грамадскім дзеячам, Я. Чачот – збіральнікам і выдаўцам (на польскай мове) народных песень.

Вывучэнне айчыннай гісторыі звязана з імем беларускага археографа І. Грыгаровіча. Ён сабраў і на сродкі графа М.П. Румянцава выдаў "Белорусский архив древних грамот", быў аўтарам гістарычнага даследавання "Беларуская іерархія" (напісана ў 1824 г., выдадзена ў 1992 г. у Мінску), прымаў удзел у выданні "Актов Западной России". Аўтарам навуковых твораў "Путешествие по Полесью и Белорусскому краю" (СПб., 1853, 1856) быў пісьменнік-этнограф П. Шпілеўскі. У 1855 г. у Санкт-Пецярбургу

М.В. Без-Карніловічам былі выдадзены "Исторические сведения "о примечательных местах Белоруссии…", тэрыторыю якой ён абмяжоўваў Віцебскай і Магілёўскай губернямі, астатнія беларускія землі называў Літвой.

Зараджэнне і развіцце беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі

Работа па стварэнню непасрэдна абагульняючых прац па гісторыі Беларусі ў пачатку XX ст. была распачата В.Ластоўскім. У 1910 г. ён выдаў "Кароткую гісторыю Беларусі" у Вільні.

Дадзенную працу прадоўжыў У.М.Ігнатоўскі, які на працягу 1919–1926 гг. зрабіў чатыры выданні "Кароткага нарыса гісторыі Беларусі". У аснову яе быў пакладзены прынцып дзяржаўнай прыналежнасці Беларусі. Яшчэ больш падрабязным даследаваннем, выкананым на аснове нацыянальна-дзяржаўнага падыходу з'явілася "Гісторыя Беларусі" М.Доўнар-Запольскага. Напісана яна была ў сярэдзіне 20-х гадоў, аднак надрукавана ўпершыню толькі ў 1994 г.

Даследчык і гісторык беларускай мовы, акадэмік Я. Карскі ў 1903 –1922 гг. выдаў трохтомную працу "Беларусы", якую называюць энцыклапедыяй беларусазнаўства. Значны ўклад у беларускую гістарыяграфію ўнеслі грунтоўныя даследаванні гісторыкаў, этнографаў і лінгвістаў М. Янчука, А. Слупскага, І. Насовіча, М. Дзмітрыева, М. Федароўскага, Е. Раманава і інш., выдадзеныя ў канцы XIX – пачатку XX ст.

Вывучэнне гісторыі Беларусі у савецкай гістарычнай навуцы

Адным з галоўных напрамкаў гістарычных даследаванняў ў 20-30-я гг. з'яўлялася вывучэння рэвалюцыйнай спадчыны. На Беларусі пачаў працаваць інстытут гісторыі партыі. У матэрыялах літападаўскага пленума Цэнтральнага бюро КП(б)Б 1923 г. падкрэслівалася, што: "работа Истпарта Белоруссии имеет громадное значение для освещения событий Октябрьской революции, истории Коммунистической партии и вообще истории революционного и национально-революционного движения (белорусского, еврейского, польского)".

У 1928-1929 гг. у рэспубліцы вяліся дыскусіі па гістарычных пытаннях. Кіраўніцтва КП(б)Б непакоілі разважанні аб нядаўнім мінулым рэвалюцыйнага руху на Беларусі і яго ўдзельніках, у адыходзе ад афіцыйных трактовак ролі БСГ падрыхтоўцы падзей Кастрычніцкай рэвалюцыі, Белнацкама – у абвяшчэнні БССР і г.д. 27 чэрвеня 1929 г. Бюро ЦК КП(б)Б прыняла спецыяльную пастанову, якая датычылася артыкула З.Х.Жылуновіча «20 год назад (успаміны з мінулага), які быў надрукаваны у часопісе «Полымя» у мае 1929 г. Погляды З.Х.Жылуновіча кваліфікаваліся як «правыя, процілеглыя поглядам КП(б)Б, нацыяналістычныя разважанкі».

У маі- чэрвені 1929 г. у рэспубліцы працавала камісія ЦКК ВКП(б) на чале з У.П.Затонскім, якая абвінаваціла партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва БССР у перманентных уступках нацыяналізму, у праявах нацыянал-дэмакратычнай ідэалогіі. Такую ацэнку у тым ліку атрымалі гістарычныя працы і погляды У.М.Ігнатоўскага, З.Х.Жылуновіча. Пачаліся арышты навукоўцаў, якія да 1930 г. набылі масавы характар.

У 1921 г пачаў працаваць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Сярод трох яго факультэтаў самым буйным быў факультэт грамадскіх навук, які меў 4 аддзяленні: грамадска-педагагічнае, літаратурна-лінгвістычнае, эканамічнае і прававое. Першымі прафесарамі гісторыі і грамадскіх навук былі

С.Я.Вальфсон, У.М.Ігнатоўскі, Дз.П.Канчалоўскі, С.З.Кацэнбоген, В.Г.Кнорін, М.М.Нікольскі, У.М.Перцаў, У.І.Пічэта і інш. У сярэдзіне 20-х гадоў адбыўся перавод усіх дысцыплін, якія выкладаліся ў БДУ на беларускую мову навучання. Навукоўцы БДУ на чале з рэктарам У.І.Пічэтам у 20-я гг. унеслі значны ўклад у развіццё гістарычнай навукі. Ва універсітэце ў 1934 г быў створаны асобны гістарычны факультэт, у 1936 г. з адзінай кафедры агульнай гісторыі вылучыліся кафедра гісторыі СССР і БССР. У 30-я гг. больш увагі удзялялася вывучэнню гісторыі СССР, чым БССР. Лекцыйныя гадзіны на першую дысцыпліну амаль удвая перабольшавалі курс па гісторыі Беларусі. Такі падыход да вывучэння беларускай гісторыі быў невыпадковым, таму, што у гэты час вялася актыўная барацьба з так званым “нацыянал-дэмакратызмам”.

У 1928 – 1930 гг. партыйчэйкай БДУ каля 30 навуковых супрацоўнікаў як палітычна ненадзейных” было адхілена ад працы. Іх абвінавачвалі ў “антымарксісцкай ідэалогіі, вялікадзяржаўніцкім шавінізме, беларускім нацыянал-дэмакратызме. Сярод іх былі Д.І.Даўгяла, М.М.Шчакаціхін. 13 верасня 1930 г. быў арэштаваны У.І.Пічэта, якого абвінавачвалі ў «вялікадзяржаўным шавінізме, беларускім буржуазным нацыяналізме і празаходняй арыентацыі».

Важная роля ў культырным жыцці рэспублікі належала Інбелкульту-вышэйшай навукова-даследчай установе, якая ставіла сваёй мэтай “даследванне прыродных вытворчых сіл, народнай гаспадаркі, сацыяльна-грамадзкага руху, мовы, літаратуры, этнаграфіі, гісторыі, сучаснага быту і г.д. усіх нацыянальнасцяў, якія жывуць на Беларусі”. Адным з напрамкаў дзейнасці Інбелкульту з’яўлялася праца па краязнаўству, у якой актыўны ўдзел прыймала настаўніцтва.

У пастанове ЦВК БССР “Аб інстытуце Беларускай культуры ды зацвярджэнні палажэнні аб ім што, “ Савецкая ўлада з самага пачатку свайго існавання на Беларусі звярнула вялікую увагу на развіццё культуры працоўных мас. Беларуская і жыдоўская культуры, якія да гэтага часу былі ў заняпадзе і лічыліся ганебнымі, атрымалі правана самастойнае існаванне і сваё далейшае развіццё. Як культуры заняпаўшыя, яны патрабавалі і патрабуюць дзеля свайго ўзросту і пашырэння асаблівай і неаслабнай ўвагі з боку дзяржавы”.

18 кастрычніка 1928 г. Інбелкульт быў рэарганізаваны ў Беларускую Акадэмию Навук, сярод заснавальникаў якой былі і гісторыкі У.М.Ігнатоўскі, В.У.Ластоўскі, У.І.Пічэта, А.Н.Ясінскі. У 1929-1933 гг. разгарнулася барацьба супраць так званага нацыянал-дэмакратызма. Частку навукоўцаў пачалі абвінавачваць у прыналежнасці да быццам бы існаваўшага Саюза вызвалення Беларусі. У сувязі з гэтым былі пазваўлены звання акадэміка Ластоўскі і Пічэта. Прэзідэнт акадэміі Ігнатоўскі ў студзені 1931 г. быў выключаны з партыі і скончыў жыццё самагубствам. У выніку сталінскіх рэпрэсій была рэпрэсіравана больш за 140 супрацоўнікаў акадэміі, што адмоўна адбілося на развіцці многіх галін навукі, асабліва гуманітарных.

У сярэдзіне 30-х гадоў у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук БССР былі зроблены некаторыя захады да пачатку падрыхтоўкі новай абагульняючай працы па гісторыі Беларусі, але ў складаных грамадска-палітычных абставінах гэтага не ўдалося зрабіць. Толькі ў 1954 г. пабачыў свет першы том “Истории

Белорусской ССР". У 1955 г. ён выйшаў на беларускай мове, у 1958 г. быў выдадзены другі том выдання. Аднак праца працягвалася, і ў 1961 г. было ажыццёўлена другое, дапоўненнае выданне "Истории Белорусской ССР" у двух тамах. У ім на значным для таго часу фактычным матэрыяле зроблена сістэматызаванае выкладанне гісторыі беларусі са старажытных часоў. Адак, усе вывады і ацэнкі ў гэтым выданні поўнасцю адпаведалі афіцыйна-партыйным ацэнкам таго часу. "Истории Белорусской ССР"

На прцягу 1972–1975 гг. была выдадзена пяцітомная "Гісторыя Беларускай ССР", дзе першыя два тамы раскрывалі дасавецкі перыяд беларускай гісторыі, а тра тамы шірока асвятлялі 50 гадоў савецкай гісторыі. Ацэнкі гітарычных падзей адпавядалі афмцыйным устаноўкам: па дасавецкай гісторыі адмаўлялася самабытнасць у развіцці беларускага народа, для савецкага перыяда быдл характэрным надзвычай шырокае адлюстраванне станоўчага вопыту і вельмі скупа пададзены ці зусім адсутнічаюць метады ўсталявання новага жыцця, цяжкасці ў яго пабудове.

У дадзенных працах - двухтомнай і пяцітомнай "Гісторыях Беларускай ССР" поўнасцю было праігнаравана тое, што было зроблено іх папярэднікамі з-за таго, што працы гэтыя былі забаронены, а прозвішчы аўтараў выкрэслены з навуковага і грамадскага ўжытку.

Сучасны стан беларускай гістарыяграфіі.

Толькі з канца 80-х–пачатку 90-х гадоў у сувязі з вялікімі грамадска-палітычнымі зменамі, што адбыліся ў свеце, і ўзнікненнем самастойнай дзяржавы Рэспублікі Беларусь стварыліся пэўныя ўмовы для напісання новых абагульняючых прац па гісторыі Беларусі ў якіх адсутнічаў б моцны ідэалагічны ціск. Такім даследаваннем з'явіліся "Нарысы гісторыі Беларусі"(1994, 1995). Пры гэтым аўтары зыходзілі з факта шматвяковага існавання беларускага этнасу. У дадзеннай працы упершыню адлюстраваны некаторыя маладаследаванныя старонкі беларускай гісторыі (падзеі сярэдзіны XVII ст, жыццё беларускай дыяпара і г.д.)

У якасці вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў устаноў, забяспечваючых атрыманне вышэйшай адукацыі, выдадзены "Гісторыя Беларусі з 1795 да вясны 1917 г." (падрыхтавана калектывам гродзенскіх гісторыкаў) (2001 г.), "Гісторыя Беларусі. XIX – XX стагоддзі" (падрыхтавана гісторыкамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта) (2002 г.), "История Беларуси. С древности до наших дней" П.Г. Чыгрынава (2004 г.) і інш.

Тэма 2. Засяленне тэрыторыі Беларусі. Насельніцтва Беларусі ў эпоху бронзы і жалезным веку

1. Неандэртальцы і краманьенцы. Умовы жыцця, прылады працы, асноўныя заняткі.

Пранікненне на тэрыторыю Беларусі першабытнага чалавека адбывалася 100-35 тыс. гадоў назад. Людзі ў тыя часы займаліся збіральніцтвам,

паляваннем на буйных жывёл(маманта, шарсцістага насарога). Прылады працы і палявання, якімі карысталіся людзі гэтай эпохі (археалагічная эпоха мусцье) знойздены каля в. Падлужжа (Чачерскі р-н Абідавічы (Быхаўскі раён), Свяцілавічы (Светлагорскі раён). З крамнёвых адшчэпаў пры дапамозе паслядоўнага аббівання выраблялiся прылады працы 20 тыпаў – востраканечнікі, скрэблы, рубілы, наканечнікі дзідаў(коп'яў) і г.д.

У часы ранняга і сярэдняга палеаліту існавала праабшчына. Яна ўяўляла невялікую (некалькі дзясяткаў дарослых 20-20 чал.) групу людзей. Іншы раз такія праабшчыны аб'ядноўваліся ў больш буйныя, але яны існавалі толькі пэўны час. Складана сказаць, якімі былі адносіны паміж мужчынай і жанчынай. Калі браць і праводзіць аналогію з прыматамі, то трэба адзначыць, што шымпанзе і гарылы жывуць парнымі семьямі, іншыя гарэмнымі. Можна меркаваць, што больш ці менш падобныя звычаі існавалі і ў чалавечым статке. З цягам часу ўзнікла экзагамія –забарона шлюбу паміж сваякамі.

Праабшчыны неандэртальцаў ужо клапаціліся аб суродзічах, хавалі памёрлых, ажыццяўлялі калектыўныя работы.

Адной найбольш вядомай стаянкай на Беларусі з'яўляецца стаянка чалавека каля в. Юравічы Калінкавыіцкага раёна (26 тыс. г.н.), Бердыж Чачерскага раёна (23 тыс. г.н.). Яны адносяцца да палеаліту. На кожнай стаянцы жыло прыкладна па 25 чалавек. Насельніцтва было нешматлікім. Э. Загарульскі лічыць, што колькасць насельніцтва на беларускіх землях складала у тыя часы некалькі сотен чалавек.

Да канца сярэдняга палеаліту зацянулася фарміраванне чалавека сучаснага фізічнага тыпу – неаантрапа. У гэтыя часы ўзнікае раннеродавае гармадства, адбываўся пераход ад праабшчыны да роду, ад групавога шлюбу да парнай сем'і.

У познем палеаліце асноўным прамысловым калектывам з'яўлялася раннеродавая абшчына. Некалькі абшчын аб'ядноўваліся ў род. Род з'яўляўся аб'яднаннем людзей аднаго паходжання, якое спачатку падлічвалася спачатку па мацярынскай лініі. У абшчыну разам з тым прымаліся іншыя асобы з другіх родаў, з якімі наладжваліся шлюбныя сувязі. Род быў уласнікам пэўнай тэрыторыі.

Прылады працы чалавек выраблял з крамнёвых пласцін і касцей жывёлы. Жытлы ён рабіў з біўняў і рэбраў маманта, накрываў іх звярынымі шкурамі. Гэта давала магчымасць чалавеку існаваць у суровых умовах прыледніковай амаль бязлеснай зоны. 10 тыс. год назад скончылася ледніковая эпоха , наступіў сучасны геалагічны перыяд . Адбылося змяненне клімату. Пасля адступлення ледавіка ў эпоху мезаліта тэрыторыя Беларусі (паўднёвая і цэнтральная частка) канчаткова была заселена краманьёнцамі. Асваенне і засяленне тэрыторыі адбывалася з поўдня ўздоўж вялікіх рэк па меры адступлення ледавіка. У мезаліце адбылося поўнае засяленне чалавекам тэрыторыі Беларусі. Агульная колькасць насельніцтва – 4,5–6 тыс. чалавек. У этнічных адносінах насельніцтва тады не ўяўляла адзінства. На Беларусі вядома каля 120 стаянак, у тым ліку 61 – на Палессі. У далінах буйных рэк Беларусі жыло ўжо першае сталае (аўтахтоннае) насельніцтва.

Пачатак мезаліту азнаменаваўся карэннымі змяненнямі клімату і прыродных умоў. Ледавік адступіў далёка на поўнач, а потым і наогул знік, і кліматычныя ўмовы на цяперашняй тэрыторыі Беларусі сталі нагадваць сучасныя. Досыць хутка выраслі лясы, сфарміравалася рачная сетка. Нязвыклыя да цёплага клімату маманты і шарсцістыя насарогі адышлі за ледавіком, а потым вымерлі. Кардынальна змяніўся жывёльны свет. Замест буйных жывёл, якія хадзілі па шырокіх адкрытых прасторах тундры, з'явілася незлічоная колькасць дробных і сярэдніх жывёл, што насялялі лясы. Рачная сістэма набывае сталы выгляд, а рэкі напаўняюцца рыбай. Вялікая колькасць ежы пазбавіла людзей ад неабходнасці качаваць у яе пошуках. Па-першае, на Беларусі з'яўляецца сталае насельніцтва, па-другое, уся тэрыторыя Беларусі была заселена да канца гэтага перыяду. Гэта яшчэ вельмі рэдкія паселішчы – стаянкі (іх выяўлена каля 120), якія месціліся па берагах рэк, каля радовішчаў крэмню. Такім чынам, сучасныя беларускія землі ўвайшлі ў айкумену – тэрыторыю, пастаянна заселеную людзьмі.

Змены прыродных умоў адбіліся на гаспадарчых занятках насельніцтва і вызвалі з'яўленне новых прылад працы. Значна ўзрасла роля паляванне, яно ўжо не патрабавала ўдзелу ў працэсе значнай колькасці людзей, а атрымала індывідуальны характар. Больш таго, у паляўнічага з'явіўся памочнік – сабака. Новыя прылады – лук і стрэлы значна палегчылі паляванне на дробных жывёл і птушку.

Росквіт у мезаліце атрымала рыбалоўства. Гэтаму спрыяла ўтварэнне рэк і вялікай колькасці азёр пасля адыходу ледавіка. Пад канец перыяду мезаліту была вынайдзена сетка (да гэтага рыбу лавілі з дапамогай астрог, гарпуноў і проста рукамі), што значна павялічыла памеры здабычы.

Росквіт атрымала і збіральніцтва. Спіс аб'ектаў збіральніцтва шматразова павялічыўся. Усе гэтыя ўмовы дазволілі збіраць большую колькасць ежы, якая была дастаткова разнастайнай. Гэта стымулявала аселы лад жыцця і замацаванне новай формы сацыяльнай арганізацыі людзей – родавай абшчыны.

У вытворчасці каменных прылад працы таксама наглядаліся свае адметнасці. Па-першае, выраблялася вялікая колькасць каменных сякер (тэрыторыя старажытнай Беларусі ўся была пакрыта лясамі). Па-другое, атрымалі распаўсюджанне мікралітычныя прылады працы (мікраліты). Гэта складныя прылады, што састаўляліся з некалькіх невялікіх каменных пласцінак памерам 1-2 кв.см. Найбольш шырока яны былі распаўсюджаны на захадзе і ўсходзе сучаснай Беларусі. Гэтыя рэгіёны атаясамліваюцца з існаваннем свідэрскай і сожскай (суадносна) археалагічных культур. Адметная прыкмета першай – гэта наканечнік стралы ў выглядзе ліста вярбы, у стрэл сожскай культуры наканечнікі – гэта маленькія і кароткія каменныя адшчэпы.

Такім чынам, перыяд мезаліту – гэта час, калі на беларускіх землях з'явілася пастаяннае аселае насельніцтва, атрымала росквіт прысвайваючая гаспадарка, замацаваўся родавы лад грамадства.

Значны ўплыў на заняткі насельніцтва аказвалі прыроднаасяроддзе, якое з'яўлялася матэрыяльнай асновай існавання чалавека, крыніцай для развіцця гаспадаркі. Разнастайнасць глебы і раслінага свету, памяркоўны клімат спрыялі развіццю гаспадарчай дзейнасці людзей. Выключнае значэнне мелі

рэкі Днепр, Зах. Дзвіна, Нёман са шматлікімі прытокамі, якія аб'ядноўвалі ў адзінае цэлае паасобныя часткі беларускай тэрыторыі.

2. Плямёны і археалагічныя культуры каменнага веку.

У канцы 5–пачатку 2 тыс. да н.э. у часы неаліта пачалася так званая тэхналагічная рэвалюцыя, якая была звязана з шліфаваннем каменных прылад працы. Крамянёвая вытворчасць дасягнула новага ўзроўню. Амаль ўсе прылады працы (звыш 100 тыпаў) выраблялiся з пласцін (нажы, дроцікі, сякеры і інш.) Для вырабу прылад працы шырока выкарыстоўвалі іклы, рагі і косці жывёл.

Людзі пачалі займацца землеробствам і жывёлагадоўлей, з'яўляецца кераміка. Колькасць насельніцтва павялічваецца (27–36 тыс. чалавек, больш за 500 паселішчаў). Вызначыць этнічную прыналежнасць старажытнага насельніцтва ў палеаліце, мезаліце і ў большай часткі неаліту няма магчымасці. Прыкладна ў III тыс. да н.э. ў Падзвінні і Падняпроў'і з'явілася фіна-ўгорскае насельніцтва, а на крайнем паўднёвым захадзе Папрыпяцця – невялікія групы індаеўрапейскага насельніцтва. (Даіндаеўрапейскі і індаеўрапейскі перыяды этнічнай гісторыі Беларусі).

У новы перыяд каменнага веку асаблівых змен у клімаце не адбылося, асноўныя змяненні адбыліся ў гаспадарцы.

У гэты перыяд з'явіўся першы штучны матэрыял, выраблены чалавекам – гэта абпаленая гліна. Менавіта ў неаліце пачалі шырока вырабляць гліняны (керамічны) ляпны посуд (ганчарнае кола будзе вынайдзена значна пазней, у перыяд станаўлення феадалізму). Але і ляпны посуд атрымаў даволі дасканалы выгляд, ён упрыгожваўся разнастайным арнаментам (але пакуль яшчэ не меў плоскага дна). Па форме посуду і яго ўпрыгожваннем пачалі вызначаць асноўныя археалагічныя культуры гэтага перыяду (ці, па-іншаму, асноўныя этнічныя суполкі).

Выросла колькасць насельніцтва, археолагам вядома на Беларусі каля 600 стаянак (галоўным чынам на берагах рэк і азёраў), што дае падставы вызначыць яго памеры ў 5-6 тысяч чалавек. Яно належыла да чатырох галоўных этнічных суполак: культуры грабеньчата-накольнай керамікі (ці днепра-данецкай), верхнедняпроўскай, нёманскай і нарвенскай археалагічных культур.

Асноўнымі заняткамі ў неаліце, як і раней, заставаліся паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва. Гэтыя састаўныя часткі прысвайваючай гаспадаркі давалі неабходнае харчаванне і сыравіну. З'яўленне невялікіх лішкаў дазволіла перайсці ад ураўняльнага размеркавання ў межах роду на размеркаванне згодна звычаю. Гэта азначала, што паляўнічы ці рыбалоў мог пакінуць сабе большую і лепшую частку здабычы. У асобнай сям'і з'явіліся запасы, што паменшыла яе залежнасць ад роду, аднак жа, сем'і з роду не выдзяляліся – вельмі нізкай была вытворчасць працы, таму і прылады працы яшчэ знаходзіліся ў агульным карыстанні родзічаў. Наогул, перыяд неаліту лічыцца перыядам найвышэйшага росквіту мацярынскага роду.

Акрамя з’яўлення керамічнага посуду, было яшчэ некалькі адметных вынаходніцтваў людзей, што жылі на Беларусі ў неаліце. Пляценне рыбалоўных сетак з раслінных валокнаў (лён, каноплі, крапіва) дапамагло з’яўленню першабытнага ткацтва. Быў пабудаваны самы просты вертыкальны ткацкі станок, на якім выраблялі самую простую тканіну, але яна ўжо магла выкарыстоўвацца для пашыву адзення і ў гаспадарцы.

Сталі выкарыстоўвацца новыя прыёмы па апрацоўцы камня – шліфаванне, паліраванне і свідраванне. Гэта дазволіла ствараць больш якасныя прылады працы, асабліва палепшыліся магчымасці выкарыстання сякер, якія з гэтага часу не прывязваліся да дрэўка, а насаджваліся на яго. Такіх сякер патрабавалася ўсё болей і болей.

На поўдні Беларусі пад канец неаліту з’вілася земляробства ў першай, самай простай форме – матычнай (галоўная прылада апрацоўкі глебы – матыка).

Крэмню, што знаходзілі на паверхні зямлі, пачало нехапаць і людзі пачалі распрацоўку радовішчаў гэтай сыравіны. На тэрыторыі, што належыць нёманскай археалагічнай культуры (і этнічнай суполцы) знаходзяцца вядомыя Краснасельскія шахты. Яны атрымалі названне ад сучаснага пасёлка Краснасельскі, што ў Ваўкавыскім раёне Гродзенскай вобласці. Археолагі знайшлі больш за 1000 шахт глыбінёй да 8 метраў. Распрацоўка крэмню вялася з дапамогай каменных і касцяных кірак у тоўшчы мелу. Шахты мелі дасканалую сістэму вентыляцыі і падачы сонечнага святла. Побач з шахтамі месціліся майстэрні па апрацоўцы крэмню і вытворчасці прылад працы. Можна сказаць, што мясцовае насельніцтва спецыялізавалася менавіта ў гэтай галіне гаспадаркі. Краснасельскі крэмень пачаў разыходзіцца па ўсёй Беларусі і за яе межы. Такім чынам, першыя крокі міжрэгіянальнага абмену пачало рабіць і першабытнае насельніцтва Беларусі.

Усе гэтыя зрухі ў гаспадарцы дазволілі даследчыкам гаварыць аб здзяйсненні так званай “неалітычнай рэвалюцыі”. Пачаўся пераход ад прысвайваючай гаспадаркі да вытворчай (земляробства). Тэрыторыя сучаснай Беларусі ўключыліся ў міжрэгіянальны абмен таварам. З’явіліся зачаткі рамёстваў, пакуль яшчэ ў выглядзе хатняй вытворчасці – выраб керамічнага посуду і тканіны.

Вызначыць этнічную прыналежнасць старажытнага насельніцтва ў палеаліце, мезаліце і ў большай частцы неаліту няма магчымасці.

Матэрыялы археалагічных раскопак дазволілі ўстанавіць, што на тэрыторыі сучаснай БеларусI ў эпоху неаліту жылі тры вялікія групы плямён. У беларускім Палессі і на тэрыторыі паўночна-заходняй часткі Украіны жылі плямёны, для якіх была характэрна грабенчата-накольчатая кераміка. Яны выраблялі шыракагорлыя, востродонныя гаршкі, упрыгожаныя адбіткамі грэбеня і наколкамі. Дпя гэтых плямён былі характэрны таксама лістападобныя навершнікі стрэл, серпападобныя нажы, долаты, цёслы, невялікія трапецыяпадобныя сякеры і іншыя прылады працы. Прадстаўнікі гэтых плямён былі еўрапеідамі - краманьёнцамі: рослымі, шыракатварымі, з вялікім чэрапам. Яны насілі адзенне з апрацаваных скураў жывёлы, пацеркі і падвескі з шліфаваных пласцінак, ракавін і клыкоў. Іх адзенне, галаўныя ўборы

і нават абутак упрыгожваліся касцянымі пласцінкамі, зубамі аленя, дзіка, рыбы і г. д.

Другая група плямён засяляла вярхоўі Дняпра І Сожа. Для іх быў характэрны посуд, арнаментаваны ямачнымі і лапкавымі адбіткамі. Наколы ў ім амаль поўнасцю адсутнічаюць. Таму такую кераміку называюць грабенчата-ямачнай.

Трэцяя група плямён займала вярхоўі Прыпяці, Ясельды і ба-сейн Нёмана. Яны выраблялі вострадонны, таўстасценны посуд, пад венчыкамі якога наносіліся наколы, насечкі і перакрэсленыя лініі. Асноўная частка паверхні посуду не арнаментавалася. Тут перапляталіся элементы як грабенчата-ямачнай, грабенчата-накольчатай, так і шнуравой керамікі. Гэтую культуру археолагі называюць нёманскай.

Археолагамі і лінгвістамі выказваецца меркаванне, што ў 3-м тысячагоддзі да н.эры ў Падзвінні і Падняпроўі пражывалі групы ўральскага насельніцтва, яго фіна-угорскага адгалінавання, а ў нека-торых мясцовасцях Папрыпяцця, на яго крайнім паўднёва-захадзе - асобныя невялікія групы індаеўрапейскага насельніцтва. Сляды фіна-угорцаў засталіся на Беларусі ў тапаніміцы - у назве рэчак, азёр, мясцовасцей, нават пазнейшых племянных аб'яднанняў. Антрапалагічна старажытныя фіна-угорцы належалі да мангалоіднай расы.

Менавіта гэтым даследчыкі тлумачаць наяўнасць некаторых манга-лоідных рыс знешнасцІ (вузкія вочы, круглы твар, чорныя валасы) ў насельніцтва некаторых рэгіёнаў Беларусі (перш за ўсё на крайнім паўночным усходзе, паблізу з тэрыторыямі, якімі фіна-угорцы - лівы і эсты - апанавалі поўнасцю).

3. З'яўленне індаеўрапейцаў, іх балцкая галіна на беларускіх землях.

Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі пачаўся на мяжы 3 і 2 тысячагоддзя да н.э. і працягваўся да 8-6 стст. да н.э.. Бронзавых рэчаў на тэрыторыі Беларусі знойдзена мала–шыла, сякеры, наканечнікі коп'яў, упрыгожанні. Вялася мясцовая вытворчасць некаторых бронзавых рэчаў з прывазной сыравіны, а таксама пераплаўка скасаваных вырабаў (першая палова 2-га тысячагоддзя да н.э.)

Аддаленасць ад старажытных цэнтраў металургіі была прычынай захавання тут на больш працяглы час каменных прылад працы, аднак апрацоўваліся яны лепш: шырока ўжываліся шліфаванне, свідраванне, пілаванне, апрацоўка крэменю струменістай рэтушшу. Распаўсюдзілася здабыча крэменю шахтавым спосабам (Краснасельскія шахты ў Ваўкавыскім раёне).

У часы бронзавага веку адбываўся пераход да вытворчай гаспадаркі. Побач з традыцыйным паляваннем, рыбалоўствам і збіральніцтвам пачалі займаць земляробства і жывёлагадоўля. Сярод насельніцтва з'явілася сацыяльная няроўнасць. Жывёлагадоўля і землеробства дазволілі людзям пакідаць нешта ў запас, ствараць багацце. Гэта падрывала аснову мацярынскага роду і ставіла на першае месца вялікую патрыярхальную семью, праца якой

была больш прадукцыйнай. Так, з'явілася прыватная уласнасць, якая паздней і пахавала першабытнае грамадства.

Адна з галоўных рыс эпохі патрыархату – з'яўленне прагрэсіўнага лядна-агневога землеробства, выкарыстанне ў якасці цяглаваў сілы быкоў і коней. У гэты час паступова вылучаюцца роды і племены, якія мелі больш сельскагаспадарчых прадуктаў, жывёлы ці іншых матэрыяльных каштоўнасцей, што спрыяла пашырэнню абменаў.

З развіццём прылад працы і больш разнастайнай гаспадарчай дзейнасцю ў першабытных калектывах ўсё больш укаранялася прыроднае полаўзроставае раздзяленне працы. Маладыя мужчыны спецыялізаваліся на паляванні, старыя – на вырабе прылад працы, жанчыны займаліся вядзеннем калектыўнай хатняй гаспадаркі, збіральніцтвам. Паўсюдна пашырыўся пласкадонны посуд разнастайнага асартыменту, што было выклікана з'яўленнем агнішчаў з роўнай чарэнню, сталоў са шчапаных і часаных дошак і больш разнастайнай ежы.

У бронзавым веку пачынаецца новы –індаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі. У этналінгвістыцы выдзеляецца некалькі моіных груп, асноіную з якіх складаюць індаеўрапейцы. Гэтая моўная група ўключае каля 100 розных моў, на якой размаўляюць амаль 150 народаў, што жывуць у розных рэгіёнах свету.

Індаеўрапейцы падзяляецца на падгрупы: Іранскую (асеціны, афганцы, курды, персы, сарматы, скіфы. цыгыны), Славянскую (балгары, беларусы, венеды, дулебы, кашубы, македонцы, палякі, рускія, сербы, славакі, словенцы, украінцы, харваты, чэхі), Германскую (англасаксы, белгі, вандалы, датчане, галандцы, готы, нарманы, нарвежцы, шведы і інш.), Кельцкую (брэтонцы, галы, ірландцы, кельты, шатландцы), Балцкую (голядзь, дайноўцы, жемайты, латгалы, літоўцы, прусы, яцвягі і інш.), Раманскую (іспанцы, італьянцы, лаціняне ці рымляне, малдаване, партугальцы, румыны, французы) і інш.

Са сваёй "прарадзімы" (хутчэй за ўсё Малой Азіі) 3000–1500 да н.э. старажытныя індаеўрапцы рассяліліся на Іранскім нагор'і, у Індастане, Сярэняй Азіі і далей на Захад, Прычарнамор'і. Еўропе. У выніку ўласнага гістарычнага развіцця і запазычанняў (субстратаў) з моў мясцовага насельніцтва паступова ўтварыліся групы плямёнаў, мовы якіх набылі адметныя асаблівасці.

На думку навукоўцаў прарадзімай індаеўрапейцаў з'ялялася Малая Азія. Індаеўрапейцы ўжо ў 4 тыс. да н.э. мелі даволі развітую вытворчую гаспадарку і патрыярхальны лад. У выніку дыферэнцыяцыі некалькіх парадкаў утварыліся паўночна-заходняя галіна – продкі будучых германцаў, плямёны, якія вандравалі на ўсход ад Дняпра былі іранамоўнымі, на тэрыторыі ад Балтыкі да Волгі жылі паўночныя індаеўрапейцы. У 2 тыс да н.э. Беларусь засялілі індаеўрапейскія плямёны. Беларусь зрабілася часткай прарадзімы балтаў і славян (сяярэднядняпроўская культура)-балцка-славянская супольнасць, якая з працягам часу распалася на балцую і славянскую.

Першыя групы індаеўрапейцаў на беларускіх землях былі балцкімі. У рамках індаеўрапейскага перыяду вылучаецца балцкі этап (3–2 тыс.годдзя да н.э. – ІУ-У стст. н.э.). Балты прыйшлі на Беларусь з Сярэдняга Падняпроў'я, засвойваючы мясцовы індаеўрапейскі субстрат. На працягу 2 тысячагоддзяў

адбываўся працэс змешвання балтаў з мясцовым насельніцтвам, на поўначы Беларусі існаваў уплыў фіна-угорскага насельніцтва.

Агульная колькасць насельніцтва ў бронзавым веку склала 50–75 тыс. чалавек. Асноўным тыпам пасялення балтаў былі умацаванныя гарадзішчы, якіх на тэрыторыі Беларусі налічваецца каля 1 тыс. З развіццём земляробства гарадзішчы змяніліся адкрытымі селішчамі – вёскамі, дзе жыло некалькі вялікіх, а потым і малых сем'яў. Некаторыя рэгіёны Беларусі былі слаба заселены балтамі, але на большай частцы яе тэрыторыі сфарміраваўся балцкі этнас.

На тэрыторі Беларусі ў жалезным веку сфарміравалася некалькі археалагічных культур: днепрадзвінская (на поўначы), штрыхаваннай керамікі (сярэдняя і паўночна-заходняя частка Беларусі), мілаградская (на поўдні), зарубінецкая (на поўдні).

Мясцовае насельніцтва паступова трансфарміравалася ў індаеўрапейцаў-балтаў, адначасова аказваючы пэўны уплыў на іх мову і культуру.

Тэма 3. Рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі

1. Генезіс усходнеславянскіх плямён і шляхі іх рассялення па тэрыторыі Беларусі.

Этнонім "славяне" выводзяць ад "слова" (г.зн. славяне–тыя, хто разумее словы, у адрозненне ад "нямых"-немцаў).

Паводле меркаванняў многіх археолагаў, старажытныя славяне, таксама як і германцы і балты, былі нашчадкамі жывёлагадоўча-земляробскіх плямён шнураваннай керамікі культуры, якія на мяжы 3 і 2 тысячагоддзяў да н.э. рассяліліся з Паўночнага Прычэрнамор'я і Прыкарпацця па Цэнтральнай, Паўночнай і Усходняй Еўропе.

Некаторыя археолагі лічаць праславянамі носьбітаў чарналескай культуры ў падняпроўі, невраў і скіфаў-земляробаў. Існуе меркаванне пра сувязь са славянамі мілаградскай і зарубінецкай культуры, яе прыемніцы кіеўскай культуры. Апошнюю звязваюць з продкамі ўсходніх славян.

Пра местазнаходжанне славянскай прарадзімы існуюць розныя погляды. Па адной з версій яна знаходзілася паміж Эльбай і Одэрам на захадзе, у басейне Віслы, у Верхнім Падняcтроўі і да сярэдняга Падняпроўя на Усходзе.

Паўночнымі суседзямі славян былі германцы і балты, якія разам са славянамі складалі паўночную групу індаеўрапейскіх плямён, усходнімі суседзямі былі заходне-іранскія плямёны: скіфы, сарматы, паўднёвымі – фракійцы і ілірыйцы, заходнімі–кельты.

У канцы 5 ст. славяне падзяліліся на 2 групы: антаў і склавінаў.

Славяне пачалі распадацца на асобныя пляменныя групоўкі. Ужо з 6 ст. вядомы дулебы (у больш позні час назва паляне), севяране, драўляне, углічы, ціверцы, харваты, дрыгавічы, крывічы, радзімічы, вяцічы і і нш.

У выніку рассялення славян на вялізных прасторах, на якіх жыло рознае мясцовае насельніцтва, этнічная і моўная супольнасць славян пачала

разбурацца, што прывяло да ўтварэння трох славянскіх груповак–заходняй, паўднёвай і ўсходняй. З распадам родавага ладу і ўзнікненнем старажытнейшых славянскіх дзяржаў (1-е балгарскае царства, дзяржава Сама, Вялікамараўская дзяржава, Кіеўская Русь і інш.) у канцы першага тысячагоддзя пачалі фарміравацца сярэдневяковыя народнасці: палякі, чэхі, крыху пазней славакі (зах.славяне), славенцы, сербы, харваты і балгары (паўд. славяне). Ва ўсходніх славян ішоў працэс фарміравання старажытна-рускай народнасці.

На тэрыторыю Беларусі першыя славяне прыйшлі з поўдня прыкладна ў VI—VII ст., калі ўзрост балцкіх старажытнасцяў тут сягаў ужо двух тысячагоддзяў. Храналагічна гэта супала з пачаткам распаду агульнаславянскай мовы. Моцная славянская групоўка з'явілася тады на Ўкраіне і на поўдні Беларусі, ніжэй Прыпяці. Але абшары на поўнач ад гэтай ракі славяне пачалі асвойваць толькі ў VIII ст. Што ж да паўночных і заходніх зямель краіны, дык іх тут не было да IX ст. Рухаючыся па рэках, славяне сяліліся побач з балтамі, нярэдка падпарадкоўваючы іх, займалі гарадзішчы абарыгенаў. Яны пераўзыходзілі балтаў па ўзроўні сацыяльнай арганізацыі, мелі больш развітую гаспадарку: займаліся ворыўным земляробствам, ведалі двухполле, карысталіся ралам з жалезным наканечнікам, чараслом. Аб паступовым рассяленні ўсходніх славян па тэрыторыі ўсёй Беларусі ў IX ст. (за выняткам Панямоння, дзе яны з'явіліся на век пазней) сведчаць пашыраныя тут тыпова славянскія старажытнасці — акруглыя курганы з пахаваннямі паводле абраду трупаспальвання, паўзямлянкі з печамі–каменкамі ў куце, спецыфічная кераміка, асаблівыя ўпрыгожванні і інш.

Невядома, наколькі мірным было суіснаванне двух этнасаў на тэрыторыі Беларусі. На шэрагу балцкіх гарадзішчаў мяжы VII — VIII ст. зафіксаваны сляды пажараў, што сведчыць пра ваенныя канфлікты. Агульны заняпад Банцараўскай культуры археолагі звязваюць з каланізацыйнай экспансіяй славян. Вынікам працяглых і актыўных міжэтнічных кантактаў, паступовага змешвання славян з карэнным балцкім насельніцтвам ды яго метысацыі стала ўтварэнне новых міжплемянных супольнасцяў — сімбіёз балцкай і славянскай культуры.

2. Праблема паходжання беларусаў

Адным з самых складаных у гісторыі Беларусі з'яўляецца пытанне: як і калі з раней названых славянскіх, славяна-балцкіх супольнасцей і іншых груп насельніцтва сфарміравалася беларуская народнасць, як узнікла Беларусь? Адказаць на гэтыя пытанні адназначна нельга. Справа ў тым, што ў навуцы няма адзінай думкі наконт гэтых праблем. Адны даследчыкі сцвярджаюць, што беларусы як этнас ужо існавалі ў XIII ст., а працэс фарміравання беларускай народнасці па-чаўся яшчэ ў VII - VIII стст. (Г.Штыхаў, М.Ермаловіч, М.Ткачоў і інш.). Паводле У.Сядова, беларуская этнічная супольнасць склалася ў XIII - XIV стст., М.Грынблат лічыць, што

фарміраванне беларусаў адбывалася ў XIV — XVI стст. Ёсць іншыя меркаванні.

Няма адзінага погляду і на пытанні аб продках беларусаў. Узнікла мноства канцэпцый, якія ўзаемавыключаюць адна адну. У XIX ст. з'явіліся польская і велікаруская канцэпцыі, якія адмаўлялі існаванне самастойнага беларускага этнасу на тон падставе, што ў насельніцтва Беларусі быццам не было самастойнай славянскай мовы. Прыхільнікі польскай канцэпцыі (Л.Галембоўскі, А.Рыпінскі і інш.) лічылі беларускую мову дыялектам польскай мовы, а беларусаў — часткай польскага этнасу. Творцы велікарускай канцэпцыі (А.Сабалеўскі, І.Сразнеўскі і інш.) сцвярджалі, што Беларусь — частка велікарускай этнічнай тэрыторыі, а беларуская мова - дыялект рускай мовы.

Памылковасць гэтых канцэпцый выяўлена даследаваннямі па бела-рускай мове. Яшчэ ў пачатку XX ст. выдатны беларускі славіст Я.Карскі ў фундаментальнай працы "Беларусы" пераканаўча даказаў, што беларуская мова з'яўляецца самастойнай славянскай мовай, якая паводле свайго лексічнага складу, сінтаксісу, фанетыкі і марфалогіі ўваходзіць у групу ўсходнеславянскіх моў нароўні з велікарускай і ўкраінскай.

У пачатку XX ст. з'явілася крывіцкая канцэпцыя. Яе аўтарамі былі М.Пагодзін, В.Ластоўскі і інш. Яна заснавана на памылковым уяўленні аб тым, што продкамі беларусаў з'яўляюцца крывічы. Аўтары канцэпцыі атаясамлівалі беларусаў і крывічоў і прапаноўвалі называць беларусаў крывічамі, а Беларусь - Крывіяй.

Аднабаковасць крывіцкай канцэпцыі вырашылі пераадолець вядомы беларусазнаўца Я.Карскі, гісторык-славіст У.Пічэта, даслед-чык этнічнай гісторыі Беларусі М.Грынблат, вядомы гісторык М.Доўнар-Запольскі. Яны ўключылі ў склад продкаў беларусаў не толькі крывічоў, але таксама дрыгавічоў і радзімічаў. Адсюль і назва канцэпцыі - крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкая. Аднак і гэта кан-цэпцыя, як і папярэдняя, не ўлічвае таго факта, што дрыгавічы і радзімічы, як і крывічы, зніклі да сярэдзіны XII ст., калі агульнабеларускі этнічны комплекс яшчэ не сфарміраваўся.

Асаблівую папулярнасць набыла балцкая тэорыя этнагенезу беларусаў. Паводле гэтай тэорыі, змяшэнне славян з даславянскім насельніцтвам — балтамі - прывяло да з'яўлення беларускага этнасу. Балты, такім чынам, адыгралі ролю субстрату (падасновы) у этнагенезе беларусаў. Аўтар гэтай тэорыі археолаг У.Сядоў робіць выснову на падставе таго, што шмат элементаў беларускай культуры і мовы маюць балцкае паходжанне. Аднак У.Сядоў не ўлічыў таго, што гэтыя элементы ўласцівы як славянам, так і балтам. Яны індаеўрапейскага паходжання. Балты з'явіліся продкам, субстратам не непасрэдна беларусаў, а ўсходнеславянскіх супольнасцей — крывічоў, радзімічаў і дрыгавічоў.

Існуе і фінская канцэпцыя паходжання беларусаў. Яе аўтарам з'яўляецца пісьменнік І.Ласкоў. На падставе таго, што на тэрыторыі Беларусі ёсць назвы рэчак і азёраў фінскага паходжання (Дзвіна, Свір і інш.), ён лічыць, што продкамі беларусаў маглі быць і фіны. Для такой высновы няма навуковых падстаў. Фінамоўнае насельніцтва на тэрыторыі Беларусі жыло ў глыбокай

старажытнасці і было асімілявана не славянамі, а старажытнымі балтамі, якія рассяліліся ў Панямонні, Падзвінні і Падняпроўі ў бронзавым веку. Фіны на тэрыторыі Беларусі з'явіліся субстратам не беларусаў, а старажытных балтаў.

У 50-я гады XX ст. савецкі этнограф С.Токараў абгрунтаваў новую канцэпцыю. Яе сутнасць заключаецца ў наступным.

У канцы IX - пачатку X ст. узмацніліся працэсы нівеліроўкі этнакультурных асаблівасцей усходніх славян. Гэта было абумоўлена эканамічнай, палітычнай, культурнай і канфесійнай інтэграцыяй.

Пачалося далейшае развіццё феадальных адносін, класаў і гарадоў, распаўсюджванне хрысціянства. Стала складвацца агульная тэрыторыя ўсходніх славян. Цэнтрам збірання ўсходніх славян было Сярэдняе Падняпроўе, дзе знаходзіўся г.Кіеў, які стаў сталіцай новай дзяржавы - Кіеўскай Русі. У выніку змешвання розных супольнасцей — крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў, драўлян, палян, вяцічаў і іншых - у Сярэднім Падняпроўі ў IX — X стст. сфарміравалася новая, усходнеславянская этнічная супольнасць — старажытнаруская народнасць. У другой па-лове X ст. зацвердзілася і агульная назва гэтай тэрыторыі — Русь. Сярэдняе Падняпроўе стала звацца Рускай зямлёй, кіеўскія князі — рускімі князямі. 'Згодна з гэтай канцэпцыяй, моцная Старажытна-руская дзяржава абараняла ўсходнеславянскія землі ад нападаў іншаземных рабаўнікоў, вызваліла іх жыхароў ад уплаты даніны хазарам і варагам. У гэтай дзяржаве існавала адзіная культура і мова. Затым у выніку палітычнага раз'яднання, распаду Кіеўскай Русі раз'ядналася і старажытная народнасць. У выніку ўтварыліся тры роднасныя народы: рускі, беларускі і ўкраінскі.

Аднак у гэтай канцэпцыі з'явілася шмат апанентаў (Г.Штыхаў, М.Ермаловіч, М.Ткачоў і інш.). Яны поўнасцю адмаўляюць сам факт існавання старажытнарускай народнасці і фарміравання на яе аснове беларусаў, украінцаў і рускіх. Згодна са сцвярджэннямі М.Ермаловіча, ніякай старажытнарускай народнасці не існавала. А калі гэта так, дык і не магло быць ніякага падзелу неіснуючай агульнарускай народнасці на тры галіны - рускую, украінскую і беларускую. Гэткая выснова робіцца на той падставе, што Кіеўская Русь, куды ўваходзілі ўсходнеславянскія землі, не з'яўлялася такой дзяржавай, як яе апісваюць у нашай гістарычнай і вучэбнай літаратуры. Яна, на думку Ермаловіча, зусім не з'яўлялася збіральнікам славянскіх народаў. Пры гэтым ён нават спасылаецца на К.Маркса. Апошні назваў Кіеўскую Русь імперыяй, якая была недарэчнай, нескладнай, скараспелай, "шматковай". Гэта дзяржава, дапаўняе Ермаловіч, была штучным і таму нетрывалым ваенна-адміністрацыйным аб'яднаннем. У ёй паспешліва і насуперак волі і інтарэсам народаў аб'ядноўваліся племянныя землі, і таму яна не мела агульнай эканамічнай базы. Галоўная мэта дзяржавы — здзяйсняць ваенныя паходы на Візантыю. Для гэтага і збіралася з заваяваных тэрыторый шматлікае і рознаплемяннае войска. А калі гэта так, дык, піша Ермаловіч, становіцца праблематычным узнікненне старажытнарускай народнасці ў такой дзяржаве, як Кіеўская Русь. Аб неіснаванні старажытнарускай народнасці сведчыць і той факт, што Кіеўская дзяржава ў XII ст. распалася на часткі, якія адпавядалі першапачатковым племянным тэрыторыям.

У пачатку 90-х гадоў новую канцэпцыю ўзнікнення беларусаў распрацаваў гісторык-этнограф М.Піліпенка. Аўтар гэтай канцэпцыі адмовіўся ад уяўлення аб беларускім этнагенезе як спрошчанай эвалюцыі, а таксама ад тлумачэння яго толькі вялікай міграцыяй. Даследчык лічыць, што ў фарміраванні беларускага этнасу мелі месца як эвалюцыя, так і дыфузія, якія цесна ўзаемадзейнічалі і дапаўнялі адна другую ў гэтым працяглым і складаным працэсе. Піліпенка па-новаму падышоў да пытання аб продках беларусаў. Ен лічыць, што ў выніку шырокага рассялення славян і змешвання іх з усходнімі балтамі ўтварыліся не беларусы, а першапачатковыя ўсходнеславянскія этнічныя супольнасці крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў. Гэта адбылося ў IX - X стст. Затым у канцы X - пачатку

XI ст. разам з іншымі ўсходнеславянскімі супольнасцямі крывічы, дрыгавічы і радзімічы кансалідаваліся ў новую агульнаславянскую этнічную супольнасць. Для яе былі характэрны агульнаўсходнеславянская мова, агульная матэрыяльная і духоўная культура. З трансфармацыяй гэтых першапачатковых этнічных славянскіх супольнасцей у агульнаславянскую старажытную супольнасць іх тэрыторыі сталі агульнай этнічнай тэрыторыяй, якая атрымала назву "Русь". Менавіта з гэтага часу ў дачыненні да тэрыторыі Беларусі, як і да суседніх усходнеславянскіх зямель, пачала ўжывацца назва "Русь", а насельніцтва стала называцца русамі, русічамі, русінамі, рускімі.

З цягам часу, адзначае М.Піліпенка, у выніку інтэнсіўных этнічных працэсаў на аснове ўзаемадзеяння, згуртавання дзвюх значных груп (папрыпяцкай і падзвінска-дняпроўскай) усходнеславянскага насельніцтва, з аднаго боку, і кансалідацыі іх з асобнымі групамі неўсходнеславянскага населыгіцтва — заходнеславянскага (польскага), балцкага і цюркскага (татарскага), з другога, на шырокай тэрыторыі, размешчанай паміж Прыпяццю на поўдні і Заходняй Дзвіной на поўначы, Нёманам на захадзе і Дняпром на ўсходзе, да сярэдзіны XVI ст. сфарміраваліся новы комплекс культуры і звязаная з ім сістэма мовы. Усё гэта сведчыла аб з'яўленні новай, усходнеславянскай этнічнай тэрыторыі, якая атрымала з таго часу сваю назву "Белая Русь".

3. Разлажэнне першабытна-абшчынных адносін. Узнікненне класавага грамадства.

Пісьмовыя крыніцы сведчаць, што ў крывічоў-палачан, радзімічаў і Дрыгавічоў ужо ў VI—VIII стст. былі свае "княжанні", склаўшыяся на аснове этнічных супольнасцей. Гэта былі даволі ўстойлівыя этнаграфічныя аб'яднанні, якія ўтварыліся стыхійна. На думку Г.В.Штыхава, яны ўяўлялі сабой не плямёны, як у раннім жалезным веку, а саюзы плямён, склаўшыяся протанароднасці ("народцы") і аднача-сова дзяржаўныя ўтварэнні ці прота - дзяржавы. "Княжанні" складаліся з валасцей-княстваў, былых радавых абшчын. У кожнай воласці-княстве меліся свае веча і свае князі з дружынамі. Заканадаўчая ўлада ў воласці належала веча - народнаму сходу. Яно збірала-ся ў галоўным горадзе воласці.

Веча выбірала князя і адмаўляла яму ў даверы, калі ён парушаў

пастаўленыя ўмовы, абвяшчала вайну і заключала мір з суседзямі. На веча назначаліся "ўраднікі" на свабодныя пасады, прымаліся пастановы, рэгулюючыя гаспа-дарчыя і грамадска-прававыя адносіны ў межах воласці.Валасныя князі, як правіла, рэкрутаваліся з былых радавых ста-рэйшын. Яны ажыццяўлялі выканаўчую ўладу ў волацсі. Разам з дружынаю яны абаранялі тэрыторыю воласці ад знешніх ворагаў, ахоўвалі гандлёвыя шляхі і купецкія караваны, якія праходзілі праз тэрыторыю воласці, ажыццяўлялі ваенныя паходы ў суседнія землі, чынілі суд і расправу над сваімі супляменнікамі.

Племянныя князі выбіраліся з ліку валасных па праву старшынства, па маральных якасцях, ваенных здольнасцях. Акрамя прадстаўнікоў мясцовай фармацыі мелі месца прызванні на княжацкі пасад і прышлых людзей. Яны вербаваліся з нармана-варажскіх элементаў, якія часта праходзілі праз беларускія землі з поўначы на поўдзень. Як вербаваўся ў князі прышлы элемент сведчыць летапіснае паданне аб прызванні ў Наўгародскую зямлю Рурыка з сям'ёю і скарбам.

У некаторых жа мясцовасцях варагі бралі ўладу ў свае рукі і сілай зброі, прымушаючы падначаленае насельніцтва плаціць ім даніну.

Земляробчае насельніцтва старажытнай Беларусі было арганізавана ў абшчыны **("верв", "грамада"),** якія валодалі ворнай зямлёй. Яны складаліся з усіх сем'яў адной або некалькіх вёсак. Паступова абшчына пападала пад "апеку" феадалаў. На працягу многіх стагоддзяў эпохі феадалізму гаспадарка сялян вялася на землях, якія належалі сельскай абшчыне. Землі даваліся ў карыстанне асобных двароў; час ад часу абшчына рабіла іх перадзел. У ей спалучалася абшчыннае валоданне зямлёй з індывідуальным вядзеннем гаспадаркі. Сенажаці, лясы, вадаёмы бьші ў сумесным карыстанні. Абшчына садзейнічала згуртаванню сялян у іх адносінах з феадаламі. Сяляне былі зацікаўлены ў яе захаванні. У пэўнай меры ў гэтым былі зацікаўлены і феадалы, якія выкарыстоўвалі кругавую паруку для стараннага выканання сялянамі панскіх павіннасцей.

Клас феадалаў меў сваю іерархію. На яе вяршыні знаходзіўся князь, ніжэй — князі больш дробных удзельных княстваў "вотчын", затым ішлі феадалы-ўладальнікі вялікіх і малых памесцяў. Вярхоўным уласнікам усёй зямлі лічыўся вялікі князь. Ён меў уладанні, раскінутыя па ўсяму княству. За карыстанне імі насельніцтва абавязана было плаціць князю даніну грашыма або натурай (прадуктамі, футрам і інш.). Абкладвалася кожная сялянская гаспадарка ("дым").

Крыніцы X-XШ стст. называюць наступныя віды феадальнага землеўладання: княжацкае, баярскае і царкоўнае. Феадальнае землеўладанне было вотчынным ці памесным. Землеўласнікамі былі таксама сялянская абшчына і асобныя сяляне. Уся эпоха феадалізму характарызуецца пастаянным імкненнем феадалаў да максімальнай канцэнтрацыі ў сваіх руках зямельнага фонду. Яны пастаянна пашыралі свае уладанні і паступова сабралі ў сваіх руках лепшыя землі. Па меры развіцця феадальных адносін доля абшчыннага і сялянскага землеўладання пастаянна змяншалася.

Закабаление свабоднага сялянства было абумоўлена гістарычнымі абставінамі феадальнай эпохі. Сялян даводзіла да галечы плата княжацкіх данін, частыя спусташальныя войны, галодныя і неўраджайныя гады, смерць кармільца, падзеж жывёлы. У перыяд войнаў сяляне абавязаны былі ісці ў апалчэнне, а гэта падрывала іх гаспадарку. Збяднелыя сяляне траплялі ў феадальную залежнасць. Абшчынныя землі пераходзілі да феадалаў ці станавіліся ўласнасцю дзяржавы. З развіццём феадальнага ладу ўсё болей скарачалася і колькасць сялян, што жылі на дзяржаўных землях, паколькі гэтыя землі разам з людзьмі пераходзілі да свецкіх і царкоўных феадалаў.

З'яўляюцца новыя катэгорыі феадальна залежных сялян: закупы, радовічы, ізгоі, халопы, чэлядзь. **Усіх залежных ад феадала людзей пачалі падзяляць на "непахожых" і "пахожых".** Першыя доўга жылі на адным месцы і страцілі магчымасць пакінуць пана. Другія яшчэ не былі поўнасцю заняволены. Залежнае насельніцтва займала самае прыніжанае становішча на сацыяльнай лесвіцы. іх жыццё цанілася у 16 разоў тайней за жыццё кіраўнікоў княжацкіх маёнткаў - "агнішчан" і "цівуноў".

Сяляне адпрацоўвалі паншчыну на раллі феадала, плацілі чынш натурай (мёдам, ільном, печаным хлебам, аўсом, жытам, авечкамі, курамі і г. д.) ці грашыма. Грашовая рэнта была рэдкай з'явай, што тлумачыцца натуральным характарам гаспадаркі. З часам доля паншчыны ўсё больш узрастае ў параўнанні з чыншам.

4. Саюзы плямен (княжанні).

У выніку славяна-балцкага сінтэзу ў VIII - X стст. узніклі новыя этнічныя славянскія супольнасці, якія часта ўпамінаюцца ў сярэдне-вяковых пісьмовых крыніцах. Гэта - дрыгавічы, радзімічы, крывічы.

Дрыгавічы займалі большую часткў Паўднёвай і значную частку Сярэдняй Беларусі. У "Аповесці мінулых гадоў" адзначаецца, што яны жылі паміж Прыпяццю і Заходняй Дзвіной. У іх культуры пераважалі славянскія элементы. Мова была славянскай. Аднак у іх тагачаснай культуры зафіксаваны і балцкія элементы — спіральныя пярсцёнкі, змеегаловыя бранзалеты, падковападобныя спражкі. Дабалцкіх вытокаў адносіцца звычай пахавання нябожчыкаў у драўляных дамавінах-церамах.

Змешанае паходжанне дрыгавічоў у выніку славяна-балцкага сінтэзу зафіксавана і ў назве гэтай супольнасці. Корань яе, відаць, балцкі. У літоўскай мове ёсць шмат слоў з гэтым коранем (сыры, вільготны), якія адлюстроўваюць адну з асаблівасцей мясцовасці, дзе аселі дрыгавічы, а менавіта вільготнасць, забалочанасць зямлі ў парэччы Прыпяці.

Пазней да былой асновы было дададзена славянскае "-ічы". Такім чынам, тэрмін "дрыгавічы" ўяўляе сабой славянізаваную назву былой, даславянскай формы, якая азначала групу балцкага насельніцтва ў адпаведнасці з асаблівасцю тэрыторыі пражывання. З геаграфічнай асаблівасцю тэрыторыі дрыгавічоў звязана і паходжанне слова "дрыгва" ў беларускай мове, што ў перакладзе на рускую азначае "трясина".

Радзімічы, паводле звестак з "Аповесці мінулых гадоў", займалі землі паміж Дняпром і Дзясной. Асноўны арэал іх рассялення - басейн р. Сож. Як і дрыгавічы, радзімічы сфарміраваліся ў выніку змяшэння славянскага і балцкага насельніцтва і асіміляцыі апошняга. У культуры пераважалі славянскія элементы. Мова была славянская. Разам з тым ў археалагічных помніках адзначаны і балцкія элементы: шыйныя грыўны, бранзалеты са стылізаванымі змяінымі галовамі, прамянёвыя спражкі.

Летапісная легенда аб паходжанні радзімічаў ад міфічнай асобы Радзіма адлюстроўвае, на наш погляд, хутчэй за ўсё біблейскі светапогляд аўтара гэтай легенды, чым існаванне сапраўднага чалавека. Тут мы сустракаемся з прыкладам міфатворчасці. На думку шэрага аўтараў (М.Піліпенка, Г.Хабургаеў), тэрмін "радзімічы" выяўляе блізкасць з балцкім тэрмінам "знаходжанне".

Крывічы займалі поўнач Беларусі і суседнія раёны Падзвіння і Падняпроўя (Пскоўшчыну і Смаленшчыну). Яны жылі ў вярхоўях рэк -Заходняй Дзвіны, Дняпра і Ловаці - і былі найбольш шматлікім усходнеславянскім насельніцтвам. Культура крывічоў дзялілася на дзве вялікія групы: полацка-смаленскую і пскоўскую.

У этнічным абліччы пераважалі славянскія рысы. Мова была сла-вянскай. Да балцкіх элементаў у культуры крывічоў трэба аднесці бранзалеты са змяінымі галовамі, спіральныя пярсцёнкі, грыўны балцкага тыпу і г.д.

Што да назвы "крывічы", дык існуе некалькі гіпотэз. Адны вучоныя (гісторык В.Ластоўскі) выводзяць назву "крывічы" ад слова "кроў"; тады яе можна разумець як "сваякі па крыві", "крэўныя". Вядомы гісторык С.М.Салаўёў сцвярджаў, што назва "крывічы" звязана з характарам мясцовасці, якую займала гэта супольнасць (узгоркаватая, няроўная - крывізна). Вялікая група вучоных (археолаг П.М.Траццякоў, гісторык Б.А.Рыбакоў, беларускі філолаг і гісторык М.І.Ермаловіч) сцвярджаюць, што ў назве "крывічы" захавалася імя язычніцкага першасвяшчэнніка Крыва-Крывейты.

Такім чынам, звесткі археалогіі, мовазнаўства, антрапалогіі сведчаць пра тое, што раннесярэдневяковыя этнічныя супольнасці дрыгавічоў, радзімічаў, крывічоў сфарміраваліся ў выніку змяшэння, сінтэзу славянскіх і балцкіх груп насельніцтва. У іх культуры і мове пераплялiся славянскія і балцкія элементы з перавагай славянскіх рыс. Менавіта крывічы, дрыгавічы, радзімічы, а не наступныя этнічныя супольнасці ўтрымлівалі ў сабе балцкі субстрат.

Для характарыстыкі дрыгавічоў, радзімічаў, крывічоў важнае значэнне мае высвятленне тыпу гэтых этнічных супольнасцей. Неправамерна называць іх плямёнамі таму, што ў іх асяроддзі ўжо не было сацыяльнай роўнасці, аднолькавага становішча ўсіх членаў этнічнай супольнасці, знік родаплемянны падзел, з'явілася палітычнае кіраванне, утварыліся "княжанні", на чале якіх стаялі князі. Звесткі з археалогіі, пісьмовых крыніц сведчаць, што дрыгавічы, крывічы і радзімічы пераступілі мяжу абшчынна-радавога ладу і ўвайшлі ў пачатковы этап ранняклясавага грамадства. Гэта пацвярджае і ўзровень развіцця іх эканомікі, які характарызуецца пачаткам грамадскага падзелу працы.

Дрыгавічы, крывічы, радзімічы з'яўляліся тэрытарыяльнымі культурна-этнічнымі супольнасцямі і не сфарміраваліся ў народнасці. Яны ўяўлялі сабой не плямёны, як у раннім жалезным веку, а протанароднасці ("народцы") і адначасова пачатковыя дзяржаўныя ўтварэнні, ці протадзяржавы.

Дрыгавічы, крывічы-палачане, радзімічы паступова ўцягваліся ў працэс фарміравання беларускай народнасці. Прычым трэба адзначыць, што паміж славянамі і балтамі мелі месца і мірнае суіснаванне, і ваенныя сутыкненні, і асіміляцыйныя працэсы. Асімілявалі не толькі славяне балтаў, але ў шэрагу выпадкаў славяне былі асіміляваныя балтамі. Мелі месца істотныя адрозненні гэтых працэсаў на ўсходзе і захадзе Беларусі. На ўсходзе былі вельмі моцныя сувязі славянскай, балцкай і суседняй фіна-угорскай культуры, якія доўга ажыццяўляліся ў межах шырокай паласы, і працягласць іх была вельмі вялікай. У заходніх рэгіёнах Беларусі ўсходнеславянскія супольнасці дрыгавічоў, валынян, крывічоў суседнічалі і суіснавалі з усходнебалцкімі (літоўскімі), заходнеславянскімі (мазавецкімі), заходнебалцкімі (яцвяжскімі) плямёнамі. У адрозненне ад балтаў, якія жылі на тэрыторыі сучаснай Беларусі і Смаленшчыны і былі асіміляваны славянамі, балцкія плямёны Паўднёва-Усходняй Прыбалтыкі сталі асновай, на якой склаліся народнасці: літоўцы, латышы, прусы, яцвягі. Па мове балты гэтага рэгіёна падзяляліся на заходніх (прусы, яцвягі) і ўсходніх (літоўцы, латышы, куршы і інш.).

Тэрыторыю паміж Нёманам і вярхоўямі р. Нараў насяляла група яцвяжскіх плямён — судзінаў, дайновы, палаксянаў і ўласна яцвягаў. Іх мова была пераходнай паміж балцкімі і славянскімі мовамі. Некаторыя даследчыкі лічаць, што яцвягі займалі болып шырокую тэрыторыю, уключаючы Нёманска-Бугскае міжрэчча (У.Сядоў). У першай палове XIII ст. зямля яцвягаў была часткова падпарадкавана галіцка-валынскімі і мазавецкімі князямі. У другой палове XIII ст. пасля кровапралітнай барацьбы яцвягі, як і суседнія роднасныя ім прусы, былі канчаткова заваяваны крыжакамі. Нейкая іх колькасць перасялілася ў суседнія землі — Літву, Полыпчу, Беларусь. Менавіта гэтым тлумачыцца тое, што ў заходніх раёнах Беларусі з'явіліся назвы населеных пунктаў Яцвязь, Ядзьвінкі, Прусы, Прусікі. Сляды знаходжання дайновы захаваліся ў тапонімах Дзейнава, Дайнова, Дайноўка, якія лакалізаваны ў раёнах Валожына, Гродна, Слоніма, Івянца. Такім чынам, ёсць усе падставы сцвярджаць, што яцвягі былі адным з кампанентаў у фарміраванні беларускай народнасці.

У заходнім рэгіёне Беларусі доўга пражывалі асобныя балцкія і змешаныя балцка-славянскія групы насельніцтва. У IX — XI стст. балцка-славянская мяжа праходзіла па лініі Гродна — Ліда — Іўе — Вілейка - Мядзель - Браслаў. У XII — XIII стст. яна адсунулася далей на захад і паўночны захад да сучаснай Літвы і Латвіі. Важна таксама адзначыць, што змяшэнне балтаў са славянамі адбывалася не толькі на тэрыторыі Беларусі, але ў нейкай ступені і на тэрыторыі Літвы і Латвіі. Аб гэтым сведчаць наступныя прыклады: у XII — XIII стст. на тэрыторыі Латвіі існавалі княствы Кукенойс і Герцыке, якія знаходзіліся ў залежнасці ад Полацка; старажытная частка г. Вільні была заснавана крывічамі ў XI — XII стст. Невыпадкова ў складзе аўкштайтаў выдзяляецца лакальная група дзукаў, у якой шмат агульнага з беларусамі.

У той жа час сярод славянскага насельніцтва працягвалі існаваць групы балтаў. Аб існаванні на заходняй частцы ўсходнеславянскай этнічнай тэрыторыі ўсходнебалцкіх груп літоўцаў сведчаць назвы населеных пунктаў — Літва, Літоўцы, Літоўка, якія і сёння сустракаюцца на Маладзечаншчыне, Слонімшчыне, Стаўбцоўшчыне і ў іншых мяс-цовасцях. Набегі нямецкіх рыцараў былі галоўнай прычынай пера-сялення невялікіх груп заходніх балтаў - жамойтаў на ўсход. Гэта пацвярджаюць назвы населеных пунктаў: Жамойцішкі (Воранаўскі р-н), Жамойдзі (Лідскі р-н), Жамойск (Докшыцкі р-н) і інш. Пад ціскам Лівонскага ордэна ў падзвінска-дняпроўскі рэгіён перасялілася і частка ўсходнебалцкага насельніцтва — латыголаў. На Віцебшчыне налічваецца каля 30 населеных пунктаў з назвай Латыголь, Латыголічы, Латыголава і інш. Наогул балцкіх назваў населеных пунктаў на тэрыторыі Беларусі сёння налічваецца болып за 200. Пераважная іх колькасць знаходзіцца ў заходніх раёнах.

Тэма 4. Першыя княствы-дзяржавы на беларускіх землях.

1. Узнікненне княстваў. Старажытнабеларускія землі і Кіеўская Русь.

Першыя прадзяржаўныя славянскія ўтварэнні ўзніклі ў канцы УІ–пачатку УІІ ст. На Балканскім паўвостраве, у даліне Альпійскіх гор і Паўночных раёнах сучаснай Аўстрыі.

Менавіта на гэты час (УІ–УІІ стст.) прыпадае пранікненне славян на тэрыторыю сучаснай Беларусі. Да гэтых часоў адносяцца і першыя летапісныя звесткі аб крывічах-палачанах: “Трымаць пачалі род свой і княжанне ў палях, а ў драўлянах свае, а дрыгавічы сваё, а славены сваё ў Ноўгарадзе, а другое на Палаце, што палачане. Ад іх жа крывічы, якія сядзяць у вярхоўях Волгі, у ў вярхоўях Дзвіны, і ў вярхоўях Дняпра, іх жа ёсць горад Смаленск бо да гэтуль сядзяць крывічы”.

З паловы ІХ ст. Сярод усіх усходніх славян пачынаецца дзяржаўна-грамадская арганізацыя. Плямёны крывічоў, драгавічоў і радзімічаў ідуць па тым жа гістарычнам шляху. Будуецца гаспадарства і тут. Яшчэ да заклікання князёў-варагаў (862 г.) пачалі тут складацца воласці –княства.(У. Ігнатоўскі. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі.–Мн., 1991.– с. 34)

Аб тым, што фарміраванне племянных “княжаній” ва ўсходніх славян адбывалася адначасова з фарміраваннем Старажытнарускай дзяржавы–Кіеўскай Русі адзначаюць *І.Коўкель і Э.Ярмусік* (И. Ковкель, Э.Ярмусик. История Беларуси. – Мн., 1998.–С. 11)

Дмитрачков П. О у сваім артыкуле “Зарождении и развитии государственности на белорусских землях/”(гл.:БД–2001.–№4.)звяртае ўвагу на тое, што пытанні звязаныя з гісторыяй узнікнення дзяржаў па сённяшні дзень з’яўляюцца спрэчлівымі, дыскусійнымі. Гэта датычіцца і з’яўлення дзяржаўнасці на ўсходнеславянскіх, у тым ліку і беларускіх землях.

Большасць даследчыкаў лічыць, што з’яўленне дзяржаўнасці на ўсходнеславянскіх землях адносіцца да раняга сярэднявечча, да УІ–УІІІ стст, калі тут склаліся племяныя княжанні, якія былі першапачатковымі

дзяржаўнымі ўтварэннямі. Аб гэтым сведчаць і звесткі, якія ёсць ў “Аповесці мінулых гадоў”: “І по сіхь братія держаці почаша родь іх в княженье в полях, а древляне сваё, а дреговічі сваё, а словене своё в Новгарадзе, а другое на Полате, іже полочане”. Цэнтрамі гэтах княжэняў станавіліся гарады, а фкнцыі па кіраванню выконвалі князі, якія абапіраліся на дружыны і родаплемяную знаць.

Дзмітрачкоў П. Выказвае сумненне аб тым, што галоўную ролю ў стварэнні усходнеславянскай дзяржаўнасці адыгралі варагі. Ён прыводзіць меркаванне М.Ермаловіча, што Рагвалод і Тур былі князямі славянскага паходжання. Ён падзяляе погляд многіх гісторыкаў, што варагі з’явіліся тут для спянення усобіц, у якасці трэцейскіх суддзяў, таму, што дзяржаўнасць, яе палітычныя інстытуты і механізмы не могуць быць “привнесены извне” (с. 104).

Дзяржаўнасць на ўсходнеславянскіх землях фарміравалася гістарычна, паступова і стала вынікам тых аб’ектыўных працэсаў, якія развіваліся ў славян на апошняй стадыі першабытнага грамадства. Асноўнымі перадумовамі гэтага сталі паглыбленне грамадскага падзелу працы, узнікненне прывыатнай уласнасці і звязаных з ёю новых сацыяльных груп, рост колькасці і шчыльнасці насельніцтва і інш. Пры гэтым племяныя княжэнні ўжо ў IX ст. Трансфарміраваліся ў больш складаныя дзяржаўна-тэрытарыяльныя ўтварэнні – княствы феадальнага тыпу, хаця іх эканоміка працяглы час мела шматукладны характар.

На беларускіх землях працэс развіцця дзяржаўнасці найбольш выразна праявіўся на тэрыторыі Падзвіння і Верхняга Панямоння, дзе замацавалася частка крывічоў. Прычым у IX ст. Улада полацкай адміністрацыі расапўсюджвалася не толькі на земля крывічоў, але і на тэрыторыі, на якіх жылі дрэгавічы, балты і фіна-угры. М.Ермаловіч падкрэсліваў, што Полацк “ужо ў IX ст. Сканцэнтрыраваў вакол сябе велізарную тэрыторыю і стаў адным з важнейшых і магутных дзяржаўнаўтваральных цэнтраў Усходняй Еўропы” (М.Ермаловіч Старажытная Беларусь Мн., 1990, с.52)

Паступова з’явілася дзяржаўнасць і ў дрегавічоў, цэнтрам якой стаў Тураў. П.Дзмітрачкаў выказвае меркаванне аб існаванні дзяржаўнасці і ў радзімічаў, верагодна, князем якіх быў Радзім.

Такім чынам, асновай дзяржаўнасці на ўсіх беларускіх землях былі племяныя княжанні. Гэта было характэрным і для іншых усходнеславянскіх земляў. Так, на поўначы цэнтрам кансалідацыі мясцовых плямёнаў стаў Ноўгарад, на поўдні ўсходнеславянскія плямёны аб’ядноваліся вакол Кіева. Яшчэ больш гэтыя працэсы ўзмацніліся пасля аб’яднання Ноўгарада і Кіева, што адбылося ў другой палове IX ст., у выніку чаго ўтварылася Кіеўская Русь.Да канца X ст. У гэтую дзяржаву былі ўключаны практычна ўсе землі ўсходніх славян, што дае магчымасць разглядаць гэтую дзяржаву як агульнаўсходнеславянскую. Напрыканцы XI– пачатку XII ст. Пачынаецца перыяд феадальнай раздробленасці ўсходнеславянскіх зямель (1097 Любечскі з’езд князёў, але прадстаўнікоў Полацка там не было). “Змены ў эканоміцы патрабавалі прыстасавання да іх палітычных структур. Галоўным цэнтрам гаспадарчага і палітычнага жыцця становіцца зямля”. Княствы сталі

распадацца на ўдзелы, але ўжо у XIII ст. Узнікла новая тэндэнцыя да аб'яднання, што і прывяло да утварэння ВКЛ.

Пры вывучэнні пытанняў, звязаных з узнікненнем дзяржаўнасці на ўсходнеславянскіх землях неабходна улічваць наступныя моманты:

- Асновай для наступнага развіцця дзяржаўнаўтваральных працэсаў на ўсходнеславянскіх землях сталі племяныя княжанні;
- Племяныя княжанні пераўтварыліся у больш складаныя дзяржаўныя ўтварэнні, якімі сталі Полацкая земля, Тураўскае і некаторыя іншыя раннефеадальныя княствы;
- Дзяржаўнасць на тэрыторыі Беларусі фарміравалася у цеснай сувязі з працэсамі, якія адбываліся на ўсходнеславянскіх землях, што прывялі да ўзнікнення Кіеўскай Русі, якую неабходна разглядаць "як завяршаючы этап зліцця ўсходнеславянскіх земляў у адну дзяржаву".
- Палітычная сістэма Кіеўскай Русі не вызначалася цэнтралізацыяй, трываласцю, і мясцовыя княствы з самага пачатку ігралі значную ролю ў вырашэнні як унутраных, так і знешных праблем. Гэта самастойнасць узрасла з сярэдзіны XII ст., калі наступіў перыяд феадальнай раздробленасці. Адбыўся распад не толькі Кіеўскай дзяржавы, але і тых княстваў, якія ўваходзілі ў яе склад. Дзяржаўнасць пачала канцэнтравацца на рэгіянальным узроўні.

Па меркаванню доктара юрыдычных наук Я.Юхо да вызначэння дзяржаўнасці ў мінулым выкарыстоўвалася некалькі тэрмінаў. У летапісных і іншых пісьмовых крыніцах дзяржавы называюцца: "земля", "горад", "княства", "воласць".

Тэрміны "княжанне", "княства". "воласць" у асноўным падкрэслівалі паўнамоцтвы, а тэрмін "зямля", "горад" – тэрыторыю дзяржавы і яе дзяржаўную будову.

У склад "зямлі", як правіла, уваходзіло некалькі дробных дзяржаў, г. зн. Што "зямля" выступала як злучанная феадальная дзяржава. "Горад", як правіла, не ўключаў у свае валоданні іншых дзяржаў, а меў толькі прыгарады.

У дзяржаўным ладзе да IX ст. Пераважалі дробныя-дзяржавы княствы, якія былі абасоблены нават ад сваіх бліжэйшых суседзей. Зрухі ў вытворчых адносінах, што адбыліся ў IX-X ст., выклікалі карэнныя змены ў дзяржаўным ладзе. Гэтаму садзейнічала таксама новая саслоўна-тэрытарыяльная ідэалогія, якая падтрымлівалася праваслаўным духавенствам, выхаваным на ідэях і традыцыях візантыйскага дэспатызму і цэнтралізму.

Парадаксальным на думку С. Тарасава з'яўляецца тое, што хрысціянства прапагандуючы і сцвярджаючы адзінае на зямлі Царства Божае аб'ектыўна спрыяла станаўленню самастойных і незалежных дзяржаў Еўропы і свету. Больш-менш адзіная духоўная прастора толькі прыспешваларазмежаванню ў прасторы геаграфічнай праз свярджэнне нацыянальна-этнічных дзяржаў. Сярод славян ўсходнія славяне апошнімі прыйшлі да стварэння інстытутаў дзяржаўнісці, але ўвядзенне хрысціянства ў якасці афіцыйнай рэлігіі ў іх праходзіла адначасова з усёй з усёй Паўночнай і Цэнтральна-Усходняй Еўропай. Гэта сведчыць аб агульнасці ўмоў і пасылак да абодвух працэсаў.

Усё гэта паступова прывяло да таго, што дробныя-дзяржавы княствы аб'ядноўваліся пад пратэктаратам больш моцных дзяржаў або нават зліваліся з імі. Акрамя таго, і больш моцныя дзяржавы ўступалі паміж сабою ў саюзы і аб'яднанні, утвараючы сваеасаблівыя феадальныя федэрацыі і канфедэрацыі. Узаемасувязі ў такіх саюзах часта трымаліся на роднасных адносінах кіраўнікоў дзяржаў (князёў) і пасля смерці аднаго з іх скасоўваліся, у сувязі з чым аб'яднанная дзяржава-саюз распадалася на асобныя часткі – дробныя дзяржавы-княствы.

Такім чынам, саюзы і аб'яднанні дзяржаў-княстваў утвараліся як на аснове сямейных сувязей, дабраахвотных пагадненняў, так і па прымусу больш моцных дзяржаў, але характар гэтых саюзных аб'яднанняў ад гэтага не змяняўся.

На тэрыторыі Беларусі можна выдзяліць некалькі буйных дзяржаў-княстваў, якія існавалі ў IX-XII стстс. Сярод іх найбольшае значэнне мелі: Полацкае, Менскае, Тураўскае, Гародзенскае, Навагародскае княствы.

Але перш, чым казаць аб Полацкім княстве і аб яго ролі ва ўзнікненні дзяржаўнасці на беларускіх землях неабходна адказаць на пытанне "Што сабой уяўляла Кіеўская Русь і як яна ўплывала на развіццё беларускіх зямель?" У гістарычнай літаратуры існуюць розныя погляды на Кіеўскую Русь, яе месца ў гісторыі ўсходніх славян.

2. Дзяржаўнасць Полацкай зямлі.

Найбольш магутным сярод дзяржаўных утварэнняў на беларускіх землях было Полацкае княства. Д.ю.н. Я.Юхо адзначае, што кожная старажытная дзяржава мела свой палітычны цэнтр, стольны або старэйшы горад. Па імені стольнага горада называлася і ўся дзяржава, што служыць сведчаннем таго значэння, якое надавалася сталіцы ў палітычным, культурным і гаспадарчым жыцці ўсёй дзяржавы. Па імені галоўнага горада называліся і ўсе жыхары дадзеннай дзяржавы: палачане, берасцейцы і г.д.

Гэтую думку падтрымлівае і С. Тарасав, які лічыць, што "крывічы" гэта назва племяні ці групы плямён. У той жа час "палачане" гэта ўжо прадзяржаўнае аб'яднанне па тэрытарыяльным прызнаку, а не "крэўскае"–па крыві.

У VIII-X стст. На Падзвінні шлі дзяржаваўтваральныя працэсы. Крывічы ўзгадваліся ў старажытных летапісах пад 856, 862, 944, 980 – і да 1128 года.

Найбольш старажытныя гарады ўсходніх славян былі важнымі адміністрацыйна-фіскальнымі і ваеннымі цэнтрамі. Гарады і дзяржаўнасць ва ўсходніх славян узнікалі і развіваліся адначасова і ва ўзаемнай сувязі. Сведчаннем гэтаму з'яўляецца Полацк, які ўпершыню ўзгадваецца пад 862 г. сярод іншых рускіх гарадоў.

У 860-я гг. адбыўся паход кіеўскіх князёў Аскольда і Дзіра на Полацк. У 882 г. сталіцу крывічоў падпарадкаваў Кіеву кіеўскі князь Алег. У 907 г. Полацк, як *саюзнік ці даннік* Кіева, прымаў удзел у сумесным паходзе рускіх князёў на сталіцу Візантыйскай імперыі – Царград (Канстантынопаль).

Першым гістарычна вядомым полацкім князем быў Рагвалод, які прыйшоў з-за мора (магчыма, як і Рурык, быў варагам).

Па меркаванню сучасных даследчыкаў гісторыі Беларусі Полацк праводзіў самастойную ад Кіева палітыку, і трапіў пад уладк кіеўскіх князёў на два дзесяцігоддзя пасля трагічных падзей 980 г. (Рагвалод, Рагнеда, Яраполк, Уладзімір).

У 988г. Уладзімір пасля няўдалага замаху на яго жыццё адсылае Рагнеду разам з малалетнім сынам Ізяславам у Полацкае княства. Ізяслаў, як прамы нашчадак Рагвалода, адраджае самастойную дынастыю полацкіх князёў. (Але з другога боку ён сын Уладзіміра).

Ізяслаў княжыў у Полацку прыкладна з 988 па 1001 гг. Праз два гады пасля смерці бацькі на полацкі прастол узышоў малалетні *Брачыслаў (1003-1044 гг.).* Менавіта пры гэтым князе Полацкая дзяржава пачала сваё хуткае ўзвышэнне.

У 1021 г. Брачыслаў выступае супраць свайго роднага дзядзькі, наўгародскага князя Яраслава Ўладзіміравіча (Мудрага), захоплівае Ноўгарад і выводзіць у Полацк мноства палонных з маёмасцю. Яраслаў у горадзе адсутнічаў, ён спяшаецца перахапіць Брачыслава і ў бітве на рацэ Судаміры вялікімі намаганнямі перамагае палачан. У той жа год (1021) было падпісана пагадненне паміж Яраславам і Брачыславам, згодна з якім да Полацкага княства адыходзілі Віцебск і Ўсвяты (гэтыя гарады кантралявалі валокі на галоўным адгалінаванні шляху з варагаў у грэкі).

У 1026 г. Яраслаў Мудры стаў вялікім кіеўскім князем. Брачыслаў тым часам актыўна пашыраў межы княства ў паўднёвым і заходнім напрамках, у першую чаргу падпарадкоўвае землі, што ляжалі уздоўж Заходняй Дзвіны. Палачане засноўвалі на заходніх землях свае пасяленні. Так у 1065 г. заснаваны горад Браслаў, на Дзвіне заснаваны гарады Герцыке і Кукейнос.

Часта балты рабілі набегі на славянскія паселішчы, і тады збіраліся вялікія паходы ўсходнеславянскіх князёў на “Літву”. У 1040 г. на “Літву” хадзілі са сваімі дружынамі Яраслаў Мудры і Брачыслаў.

З 1044 па 1101 гг. кіраваў Полацкім княствам.Усяслаў Брачыслававіч

У 1054 г. памірае Вялікі кіеўскі князь Яраслаў Мудры. Ён пакідае 7 нашчадкаў.. Амаль 10 год працягвалася мірнае суіснаванне дзвюх старажытнарускіх дынастый – Рагвалодавічаў і Яраславічаў.

Але ў 1065 г. пачынаецца барацьба Ўсяслава з Кіевам і Ноўгарадам, якімі валодалі старэйшыя Яраслававы сыны. Усяслаў спрабаваў захапіць Пскоў, але няўдала. У наступным годзе (1066) Усяслаў захапіў Ноўгарад, вывез з наўгародскага Сафійскага сабору царкоўныя рэчы для пабудаванага раней ў Полацку трэцяга ва ўсходніх славян Сафійскага сабора.

Зімой наступнага 1067 г. кааліцыя Яраславічаў арганізавала паход на Полацкае княства. Быў спалены Мінск, каля яго на р. Нямізе адбылася галоўная бітва паміж Яраславічамі і Усяславам, дзе апошні быў разбіты.

Каб перадухіліць разрабаванне сваёй зямлі, Усяслаў згадзіўся на перамовы. Але пад час іх ён быў узяты ў палон і вывезены з двума сынамі ў Кіеў. Неўзабаве ў Кіеве адбылося паўстанне гараджан, кіеўскі князь быў выгнаны, а Усяслаў вызвалены і пастаўлены на кіеўскі прастол. Толькі сем

месяцаў ён быў кіеўскім князем. Да горада падступіў выгнаны Ізяслаў Яраславіч з войскам свайго цесця, польскага караля Баляслава. Усяслаў вымушаны быў адысці да Полацка, але Ізяслаў выгнаў яго і адтуль.

З 1069 па 1071 гг. у Полацку сядзелі сыны Ізяслава Яраславіча – Мсціслаў і Святаполк.

Усяслаў збіраў сілы і ў 1071 г. ён аднавіў свой кантроль над Полацкай дзяржавай. Больш да самай смерці Усяслаў Чарадзей не прадпрымаў ваенных аперацый супраць Яраславічаў, і нашчадкі Яраслава таксама не турбавалі палачан. Гэтыя 30 год міру сталі перыядам упарадкавання дзяржаўнага ладу княства, перыядам гаспадарчага росквіту, росту гарадоў. На тэрыторыі княства было 35 гарадоў, а самы вялікі – Полацк налічваў да 10 тысяч жыхароў. Самыя вялікія гарады сталі цэнтрамі ўдзельных княстваў.

Такім чынам, знаходжанне Полацку ў складзе старажытнарускай дзяржавы было часовым, вельмі непрацяглым. Ды і сама Кіеўская Русь ніколі не была адзінай маналітнай дзяржавай. Шмат хто з гісторыкаў лічыць, што лічыць, што аб'яднанне асобных зямель у гэтай дзяржаве не мела пад сабой трывалых эканамічных падстаў і уяўляла сабой механічнае аб'яднанне тэрыторыі пад уладай адной палітычнай сілы.(ГБ–Т1–С.216)

Па меркаванню Дзмітрачкова палітычная сістэма Кіеўскай Русі не вызначалася цэнтралізацыяй, трываласцю, і мясцовыя княствы з самага пачатку ігралі значную ролю ў вырашэнні як унутраных, так і знешных праблем. Гэта самастойнасць узрасла з сярэдзіны XII ст., калі наступіў перыяд феадальнай раздробленасці. Адбыўся распад не толькі Кіеўскай дзяржавы, але і тых княстваў, якія ўваходзілі ў яе склад. Дзяржаўнасць пачала канцэнтравацца на рэгіянальным узроўні.

Пасля таго, калі памёр чарнігаўскі і тмутараканскі князь Мсціслаў Уладзіміравіч, уладу на ўсходнеславянскіх землях захоўвалі толькі дзве княжацкія галіны: сын Уладзіміра – Яраслаў Мудры ў Кіеве і праўнук Рагвалода – Брачыслаў Ізяслававіч у Полацку. У Ноўгардзе сваёй дынастыі не было ніколі. У той час, калі ўсе землі на тэрыторыі старажытнарускай дзяржавы перходзілі да нашчадкаў Яраслава Мудрага, Полацк устойліва знаходзіўся ў руках прадстаўнікоў мясцовага княжацкага роду. У XI ст Полацкае княства дасягнула найбольшай магутнасці.

Пасля смерці Усяслава Чарадзея Полацкае княства распалася на Мінскае, Друцкае, Ізяслаўскае, Віцебскае, Лагожскае. У ніжнім цячэнні Заходняй Дзвіны знаходзіліся гарады-крэпасці Кукенойс і Герцыке, якія з'яўляліся васаламі Полацка.

3. Утварэнне Тураўскага княства

У басейне Прыпяці знаходзілася Тураўскае княства, якое ахоплівала значную частку дрыгавічскіх зямель. Княства знаходзілася ў непасрэднай блізасці ад Кіева, доўгі час знаходзілася ў сферы яго палітычнага прыцягнення і таму не магло набыць той ролі, якую мела Полацкая зямл

Першы галоўны горад княства – Тураў упершыню ўзгадваецца пад 980 г. у сувязі з князем Турам. У “Аповесці мінулых гадоў” сказана, што “…бо бе Рогволод першел из заморья имяше волость свою Полотьске, а Тур Турове, от него же и Туровци прозвашася”.

Хутка Тураў быў падпарадкаваны суседняму Кіеву, і тут склалася традыцыя – Тураў атрымліваў старэйшы сын Вялікага кіеўскага князя, які займаў потым бацькава месца ў Кіеве, а Тураў зноў атрымліваў старэйшы сын новага кіеўскага князя. Пачаў гэтую традыцыю Уладзімір Святаслававіч, які перадаў Тураў старэйшаму сыну Святаполку. З тураўскага на кіеўскі вялікакняжацкі прастол перайшлі Святаполк Уладзіміравіч(1015), Ізяслаў Яраслававіч (1054), Святаполк Ізяслававіч (1093), Вячаслаў Уладзіміравіч(1139).

У палітычнай гісторыі Тураўскага княства выдзяляюць 4 перыяды.

Першы. (988–1015)– вылучэнне Тураўскага княства са складу Кіеўскага вялікага княства і палітыка Святаполка па адасабленні ад Кіева. Святаполк ўвайшоў . у змову са сваім цесцем, польскім кн. Баляславам Храбрым з мэтай дамагчыся незалежнасці ад Кіева. Пасля раскрыцця змовы Святаполк быў схоплены і зняволены ў турму, аднак потым вызвалены , у 1015 г. пасля смерці бацькі заняў кіеўскі прастол (да 1091);

Другі (1019–1113) час знаходжання Тураўскага княства пад уладай вялікага кіеўскага князя Яраслава Мудрага, яго сына Ізяслава Яраслававіча(з 1052) і сыноў апошняга – Яраполка і Святаполка.

Трэці (1113–1158)– захоп Тураўскага княства Уладзімірам Манамаахм і захаванне княства за яго нашчадкамі. У 1113 г. пасля смерці князя тураўскага і вялікага князя кіеўскага Святаполка Ізяслававіча, на кіеўскі прастол уступіў Уладзімір Манамах, які не перадаў Тураў нашчадкам Святаполка, а захаваў за сабой. Спроба сына Святаполка Яраслава ў 1123 г. з дапамогай замежных войск дамагчыся сваёй спадчыны закончылася трагічна– ён загінуў. У 1125 пасля смерці Уладіміра Манамаха Тураўскае княства адышло да яго 3-га сына Вячаслава. Знаходзячыся у 1142–1158 гг. у залежнасці ад кіеўскіх князёў, Тураўскае княства поўнасцю ці па частках перадавалася іх саюзнікам, за гэты час ў ім змянілася 7 князёў.

Чацвёрты (1158–пачатак XIУ ст.) – час існавання адноўленага самастойнага Тураўскага княства. У 1158 пасля смерці вялікага князя кіеўскага Юрыя Уладзіміравіча Далгарукага унук князя тураўскага і вялікага князя кіеўскага Святаполка Ізяслававіча *Юрый Яраслававіч* заняў Тураў насуперак волі кіеўскага князя Давыда Ігаравіча і адстаяў яго ў цяжкай 10-тыднёвай аблозе ад сумеснага войска паўднёва-рускіх князёў (кааліцыі шасці рускіх князёў на чале з кіеўскім Ізяславам). Горад меў добрыя ўмацаванні, Юры карыстаўся падтрымкай гараджан, і самая працяглая асада горада часоў Кіеўскай Русі скончылася безпаспяхова.Аблога паўтарылася ў 1160 (Юры таксама паспяхова вытрымаў трохтыднёвую аблогу валынскімі войскамі), а ў 1162 быў заключаны мір, што азначала аднаўленне самастойнага Тураўскага княства.

Знаходзячыся пад уплывам Кіева, Тураўскія князі прымалі ўдзел у паходах супраць Полацка ў 1127 г.

Такім чынам, у 50-я гады XII ст. Тураў выйшаў з пад улады Кіева і ў ім зацвердзілася самастойная княская дынастыя. Пад уладай Кіева засталіся толькі Мазыр і Брагін.

Першы адзіны князь Тураўскай зямлі стаў і апошнім яе ўладаром.. Юры, як і Ўсяслаў Чарадзей, меў некалькі сыноў, паміж якімі падзяліў сваё княства. Былі ўтвораны ўдзелы – Тураўскі, Пінскі, Клецкі, Слуцкі, Дубровіцкі. З цягам часу дробныя княствы трапілі ў залежнасць ад магутнага галіцка-валынскага князя.

Асаблівасці палітычнай гісторыі мелі вынікам асаблівасці палітычнага ладу ў Тураўскім княстве. Вялікую ролю ў Тураве адыгрывала ***веча***. Менавіта з яго згоды Кірыла Тураўскі быў абраны ***епіскапам*** Турава.

У Тураве існавала некалькі адміністратыўных пасад, што выконвалі функцыі, блізкія да некаторых княжаскіх функцый. Так, ***тысяцкі*** ўзначальваў гарадское апалчэнне, яго абавязак – ваеннае кіраўніцтва. Акрамя таго, у Тураве дзейнічаў ***пасаднік*** – галоўны кіраўнік цывільнай адміністрацыі княства. Такая пасада яшчэ існавала толькі ў Ноўгарадзе Вялікім.

4. Беларускія землі у Смаленскім, Чарнігаўскім, Уладзіміра-Валынскім княствах.

На паўднёвым усходзе Беларусі радзіміцкія гарады Гомель і Чачэрск на Сажы, а таксама Рэчыца і Рагачоў на Дняпры ў XII — пачатку XIII ст. уваходзілі ў Чарнігаўскае княства. Дрыгавіцкія ж гарады Мазыр і Брагін залежалі ад Кіева.

Паабапал Заходняга Буга ў XI—XII ст. сфармавалася Берасцейская зямля з гарадамі Берасце, Драгічын, Камянец, Кобрын і Мельнік. Аб'яднаная вакол свайго цэнтра, аддзеленая ад Валыні багнамі ды лясамі, яна была дастаткова адзінай у сацыяльна–палітычных адносінах вобласцю, хоць этнічны склад насельніцтва гэтай тэрыторыі вызначаўся вялікай разнастайнасцю. Відаць, да X ст. на Берасцейскім Пабужжы дамінавалі валыняне, а пазней яго пачалі каланізаваць дрыгавічы. Акрамя таго, археолагам тут трапляюцца старажытнасці заходніх славян і заходнебалцкай племянной групоўкі яцвягаў, якія займалі галоўным чынам землі Падляшша і Верхняга Панямоння.

Амаль да сярэдзіны XII ст. Берасцейшчына ўваходзіла ў склад Тураўскай зямлі. Па дамоўленасці тураўскага князя Святаполка з польскім каралём Баляславам I Харобрым у час міжусобнай вайны з 1019 да 1022 ці нават да 1031 г. Берасце займаў польскі гарнізон. З сярэдзіны XII ст. за ўплыў над Берасцем пачалася барацьба суседніх Русі і Польшчы. Упартае змаганне за яе вялі князі кіеўскія, турава-пінскія і галіцка–валынскія, пакуль да пачатку XIII ст. Апошнія канчаткова не сцвердзілі сваёй улады над Берасцейскай зямлёй.

У Верхнім Панямонні асобную вобласць утварала Чорная Русь. Як вядома, ужо ў XIV ст. так звaліся землі па левых прытоках і часткова па правым беразе Нёмана з паўсталымі тут яшчэ ў X—XI ст. усходнеславянскімі гарадамі Горадня, Ваўкавыск, Наваградак, Слонім і Здзітаў. Гэтыя абшары, заселеныя балтамі, актыўна каланізавалі дрыгавічы і крывічы, а таксама валыняне і драўляне.

І хоць сельскае насельніцтва тут яшчэ доўга заставалася балцкім, у гарадах, як

сведчаць матэрыялы археалагічных раскопак, уся матэрыяльная культура (у прыватнасці, прадметы побыту і рамёстваў) ад іх заснавання мела чыста славянскі характар. У летапісах панямонскія гарады пачалі фігураваць параўнальна позна, толькі ў XII—XIII ст., калі яны ўжо дасягнулі ў сваім развіцці сапраўднага росквіту, а Горадня і Наваградак сталі цэнтрамі ўдзельных княстваў, прычым апошні быў адным з найбагацейшых гарадоў рэгіёна. На пачатак XIII ст. Верхняе Панямонне ў палітычным сэнсе належала таксама да сістэмы Галіцка–Валынскага княства. Аднак ужо ў першай трэці XIII ст. у барацьбу за дамінаванне ў землях Чорнай Русі пачалі ўключацца і аб'яднаныя літоўскія плямёны. Яшчэ праз колькі дзесяцігоддзяў гэтай беларускай зямлі выпала быць адным з тэрытарыяльных ядраў новай дзяржавы, якая стала аб'ядноўваць вакол сябе раздробленыя і аслабленыя землі Русі на шырокіх прасторах ад Нёмана да вярхоўяў Дняпра.

Тэма 5. Феадальная раздробленасць на беларускіх землях.

1. Прычыны і наступствы феадальнай раздробленасці.

Феадалізм існаваў амаль ва ўсіх краінах на працягу стагоддзяў, на тэрыторыі Беларусі, Расіі і Украіны – у IX–XIX стст.

Навукоўцы звяртаюць увагу, што Беларусі былі уласцівы замаруджаннае і расцягнутае ў часе фарміраванне феадалізму, а таксама працягласць позднефеадальнага перыяду.

Станаўленне феадальных адносін на ўсходнеславянскіх землях ў параўнанні з краінамі Заходняй Еўропы мела сваю спецыфіку:

- Яны мінавалі рабаўладальніцкі лад,
- феадальныя адносіны тут усталяваліся на 4ст. пазней, чым у Еўропе. На ўсходнеславянскіх землях у 10 ст. з'явілася княскае землеўладанне, у 12 ст. – манастырскае і баярскае.

На ўсходнеславянскіх землях існавала так званае вольнае ці захопнае землеўладанне сялян. (Чэлядзь. Смерды: вольныя і залежныя–закупы, радовічы, прашчэннікі, ізгоі; палюддзе)

Для феадалізму характэрна панаванне аграрнай вытворчасці. Вядомы ***тры формы феадальнай рэнты****: даніна (натуральная), паншчына (адпрацоўчая), чыныш (грашовая).*

На раннім этапе феадалізму панавала натуральная гаспадарка; абмен быў нязначным, гандлёвыя сувязі не развітымі; рамяство яшчэ толькі пачынала аддзяляцца ад сельскай гаспадаркі. У буйных памесцях пераважала адпрацовачная рэнта і звязаная з ей паншчынная сістэма гаспадарання. Шырока распаўсюджваўся таксама натуральны аброк з сялян, якія знаходзіліся ў больш лёгкай залежнасці. Грашовая рэнта была развіта яшчэ слаба.

Характэрнай рысай сацыяльна-палітычных адносін, якія склаліся ў Еўропе да сярэдзіны XI ст., была непарыўная сувязь паміж феадальнай уласнасцю на зямлю і палітычнай ўладай феадала.

Буйная вотчына ўяўляла сабой не толькі гаспадарчую адзінку, але і як бы *маленькую дзяржаву - сеньёрыю*. У дачыненні да насельніцтва сваіх уладанняў феадал быў не толькі землеўладальнікам, але і адміністратарам -сеньёрам, у руках якога знаходзілася ўлада, суд, сродкі прымусу. Такая арганізацыя грамадства абумовіла панаванне ў Еўропе ў X—XI стст. (у некаторых краінах і пазней) палітычнай раздробленасці.

Феадальная іерархічная лесвіца складалася з кароля, які лічыўся вярхоўным сеньёрам усіх феадалаў; буйнейшых свецкіх і духоўных феадалаў з ліку тытулаванай знаці: герцагаў, вышэйшых прадстаўнікоў кліра, графаў, архіепіскапаў і епіскапаў, абатаў буйнейшых манастыроў; землеўладальнікаў рангам ніжэй - баронаў; а таксама дробных рыцараў, якія былі ніжэйшымі прадстаўнікамі пануючага класа. Асновай і забеспячэннем васальных адносін з'яўлялася феадальнае зямельнае ўладанне - феод, ці па-нямецку лен, які васал трымаў ад свайго сеньёра.

Сістэма *васалітэту* на ўсходнеславянскіх землях не атрымала такога пашырэння, як у Заходняй Еўропе, феадальная іерархія не набыла шматступеньчатай структуры.

Самы галоўны феадал – гэта кіраўнік дзяржавы – князь. Ён лічыўся ўладаром усёй зямлі дзяржавы. Спачатку князь сам збіраў з насельніцтва княства даніну (палюддзе). Але потым права збору даніны было перададзена самым даверaным асобам з дружыны князя – мужам, і гэта атрымала назву “**кармленне**” (права збору даходаў з воласці). Такім чынам, галоўная крыніца станаўлення класа феадалаў – гэта княжацкая дружына. Другая крыніца – гэта вылучэнне і ўзбагачэнне абшчыннай вярхушкі.

Клас феадалаў меў сваю іерархію. На яе вяршыні знаходзіўся князь, ніжэй — князі больш дробных удзельных княстваў "вотчын", затым ішлі феадалы-ўладальнікі вялікіх і малых памесцяў. Вярхоўным уласнікам усёй зямлі лічыўся вялікі князь. Ён меў уладанні, раскінутыя па ўсяму княству. За карыстанне імі насельніцтва абавязана было плаціць князю даніну грашыма або натурай (прадуктамі, футрам і інш.). Абкладвалася кожная сялянская гаспадарка ("дым").

Крыніцы X-XШ стст. называюць наступныя віды феадальнага землеўладання: княжацкае, баярскае і царкоўнае. Феадальнае землеўладанне было вотчынным ці памесным. Землеўласнікамі былі таксама сялянская абшчына і асобныя сяляне. Уся эпоха феадалізму характарызуецца пастаянным імкненнем феадалаў да максімальнай канцэнтрацыі ў сваіх руках зямельнага фонду. Яны пастаянна пашыралі свае уладанні і паступова сабралі ў сваіх руках лепшыя землі. Па меры развіцця феадальных адносін доля абшчыннага і сялянскага землеўладання пастаянна змяншалася.

У сувязі з пераменамі ў палітычным жыцці ўсходнеславянскага грамадства XII ст адбываюцца змены і ў адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры. Так, з канца XI ст. пабач з валасцямі, што падпарадкоўваліся непасрэдна Полацку, ўжо існуюць воласці-ўдзелы, якімі кіруюць стрэйшыя сыны полацкага князя. Відавочна, што гэта ўпраўленне ажыццяўлялася на родавым (звычаёвым) праве, таксама як і ў Кіеўскай Русі. Пазней, ужо ў XII ст., ужо на феадальным праве вядомы ўдзелы княствы (“отчіны”). Яны могуьц

складвацца з некалькіх валасцей і амаль нічым не звязвацца са сваім былым цэнтрам – Полацкам. Нарэшце зноў утвараюцца “землі”, якія аб’ядноўваюць па некалькі ўдзелаў-княстваў.

У пачатку XII ст. Старажытнаруская дзяржава (Кіеўская Русь) распалася на асобныя княствы. Землі Беларусі ўваходзілі ў склад Полацкага, Тураўскага, Пінскага, Новагародскага і часткова Смаленскага, Чарнігаўскага, Кіеўскага і Уладзіміра-Валынскага княстваў.

Чаму распалася Старажытнаруская дзяржава? Таму ёсць некалькі прычын. Першая з іх звязана з далейшым развіццём сельскай гаспадаркі, рамяства і гандлю. Гэта рабіла ў новых умовах непатрэбнай адзіную дзяржаву, якая недастаткова ўлічвала асаблівасці княстваў і не стымулявала іх сацыяльна-эканамічнае развіццё. Лічылася, што княствы маглі самастойна і лепш вырашаць складаныя гаспадарчыя праблемы.

Другая прычына звязана з наяўнасцю крэпасцей і войск ў мясцовых феадалаў, ростам іх ваеннай магутнасці, што стварала ілюзію магчымасці самастойна абараняць сваю тэрыторыю ад знешніх ворагаў і падаўляць выступленні залежных сялян. Апошняе нараджала яшчэ адну ілюзію – непатрэбнасць адзінай дзяржавы. На самай справе, развал Кіеўскай Русі, феадальная раздробленасць прывялі да 240 гадоў татара-мангольскага іга на рускіх землях. І, нарэшце, трэцяе, рост эканамічнай і ваеннай магутнасці мясцовых феадалаў нараджаў у іх асяроддзі сепаратысцкія настроі, імкненне да незалежнасці ад вялікага кіеўскага князя і поўнага самастойнага княжання. А безгранічны сепаратызм заўсёды і непазбежна вядзе да гібелі адзінай дзяржавы. Так здарылася і з Кіеўскай Руссю.

У сучаснай гістарычнай літаратуры выказваюцца новыя погляды па пытаннях феадальнай раздробленасці. Так, М. Ермаловіч лічыць, што раз’яднанасць беларускіх, у прыватнасці полацкіх, зямель у XIII ст. не трэба перабольшваць. Феадальная раздробленасць, якая была вынікам феадальнага спосабу вытворчасці, з’явілася на той час не толькі заканамерным, але і прагрэсіўным этапам гістарычнага развіцця. Справа ў тым, што ў нетрах феадальнай раздробленасці выспявалі ўмовы для ўмацавання беларускіх зямель. Ствараліся лепшыя магчымасці для асваення зямель і прыродных рэсурсаў, росту гарадоў, развіцця земляробства і рамёстваў. А гэта садзейнічала таварнай вытворчасці, вяло да эканамічнага і палітычнага збліжэння паасобных зямель.

Феадальная раздробленасць Полацкага княства была звязана з развіццём вотчыннага землеўладання, а таксама палітычным расколам у асяроддзі нашчадкаў Усяслава, фарміраваннем асобных галін княжацкай сем’і – спадкаемцаў вотчын.

Як адзначаюць даследчыкі, удзелы, выдзеленыя на родавам праве (раннія), пэўны час развіваліся побач з вотчыннымі ўладаннямі, створаннамі на феадальнам праве (познімі), паступова таксама набываючы знасэнне пастаянных вотчын.

Дадзены працэс быў характэрнай рысай Кіеўскай Русі XII ст., калі сістэма феадальных вотчын скаладвалася ў некаторай ступені на аснове ўдзелаў Яраслававічаў. Тое ж самае адбывалася ў Полацкай зямлі.

2. Драбленне Полацкай зямлі

На пачатку XII ст. Старажытнаруская дзяржава распалася на асобныя княствы і феадальныя рэспублікі. У гэты перыяд Кіеўская Русь ужо не ўяўляла сабой адзінага палітычнага цэлага і складалася з шэрага асобных зямель - княжанняў. Землі Беларусі ўваходзілі ў склад Полацкага, Тураўскага, Пінскага, Новагародскага і часткова Смаленскага, Чарнігаўскага, Кіеўскага і Уладзіміра-Валынскага княстваў.

Працэс палітычнага драблення на пачатку XIII ст. пайшоў яшчэ хутчэй. Адным з першых фактычна незалежных ад Кіева стала Полацкае княства.

Свайго апагея барацьба паміж кіеўскімі Яраславічамі (нашчадкамі Яраслава Мудрага) і полацкімі Ізяславічамі (нашчадкамі Уладзіміра і Рагнеды, Рагвалодавымі ўнукамі) дасягнула ў перыяд княжання Усяслава (1044 - 1101).

Пасля смерці Усяслава Полацкая зямля была падзелена паміж яго сынамі (іх было 6), якія потым сталі надзяляць валасцямі сваіх дзяцей. З'явіўся шэраг асобных княстваў: Полацкае, Мінскае, Віцебскае, Друцкае, Ізяслаўскае, Лагойскае, Стрэжаўскае, Гарадзецкае. Прастол у Полацку лічыўся галоўным. Гэты горад працягваў заставацца найважнейшым палітычным цэнтрам.

У XII ст. вялікае значэнне набывае Мінскае княства. Першы мінскі князь Глеб Усяславіч у 1116 г. захапіў частку тэрыторыі дрыгавічоў. Уладзімір Манамах разам з чарнігаўскім, смаленскім, пераяслаўскім князямі пачаў паход на Мінскае і Друцкае княствы. Оршу і Копысь

Манамах перадаў Смаленску. У 1119 г. яму ўдалося захапіць Мінск і на некаторы час прылучыць да велікакняжацкіх уладанняў. Паланёны Глеб Усяславіч быў адпраўлены ў Кіеў.

У сярэдзіне XII ст. спробу аб'яднаць Мінскае і Полацкае княствы зрабіў мінскі князь Расціслаў Глебавіч, запрошаны полацкім вечам на княжанне ў Полацк. Свайго князя Рагвалода палачане адправілі ў Мінск, дзе яго ўтрымлівалі ў "вялікае патрэбе". Але Рагвалод здолеў уцячы, яму ўдалося вярнуць сабе Друцк. У самім Полацку ўспыхнуў мяцеж гараджан супраць Расціслава і яго людзей. Даведаўшыся пра змову, Расціслаў уцёк у Мінск, а палачане зноў паклікалі да сябе Рагвалода. Вайна паміж Расціславам і Рагвалодам не прывяла да перамогі ніводнага з іх, аб'яднаць княствы не ўдалося.

3. Падзел Тураўскай зямлі.

У другой палове XII ст. Тураўская зямля таксама перажывала працэс драблення. Сыны Юрыя Яраславіча князі Святаполк, Іван і Глеб падзялілі яе на некалькі ўдзелаў, сярод якіх асаблівае значэнне пачаў набываць Пінск. Калі да апошняй чвэрці стагоддзя захоўвалася адзіная дынастыя мясцовых князёў, вядомая па летапісах як «князі тураўскія», або «з Турава Святаполчычы», дык у 1180-х г. вылучылася асобная дынастыя пінскіх князёў.

Не дзіўна, што пры раздробленасці і аслабленасці Турава–Пінская зямля хутка зноў трапіла пад уплыў больш моцнага суседняга палітычнага цэнтра.

Ужо на пачатку XIII ст. турава–пінскія князі знаходзіліся ў залежнасці ад галіцка–валынскіх. Каб вызваліцца з–пад улады Данілы Галіцкага, яны пазней нават ішлі на саюз з паганскай Літвою, якая хутка ўмацоўвалася ў Панямонні. Прыкладам, пінскі князь Міхаіл дапамагаў Літве ў супрацьстаянні з Данілам Галіцкім і папярэджваў яе пра паход апошняга ў 1243 г. Аднак летапісных звестак пра турава–пінскія землі гэтага часу вельмі мала.

4. Арганізацыя кіравання і дзяржаўны лад у землях-княствах.

Важная роля ў арганізацыі ў раннесярэдневечным горадзе і яго воласці належыла князю. Князь у Полацкай зямлі быў неабходным прадстаўніком яе сацыяльна-палітычнай арганізацыі. Адсутнасць князя парушала нармальнае жыццё княства, рабіла яго небяспечным перад знешнім светам.

Першым і важнейшым абавязкам князя былі арганізацыя войска і камандаванне ім. Князь павінен быў клапаціцца пра бяспеку і абарону Полацкай зямлі. Ён кіраваў знешней палітыкай, зносінамі з іншымі князямі і дзяржавамі, мог аб'явіць вайну і заключыць мір.

Другім абавязкам князя былў збор даніны і іншых пабораў з насельніцтва для ўтрымання дружыннай арганізацыі і іншых дзяржаўных патрэб.

*Апорай княжацкай улады была д*ружына. На першым месцы была старэйшая дружына . Гэта бляры, сільныя мужы. Малодшая дружына – "дзецкія"– жыла пры двары князя. З яе выходзілі слугі князя, яго целаахоўнікі.

Акрамя дружыны войскіа князя магло ўключаць наёмнікаў, якімі ў X–XI стст. былі атрады варагаў. Важнай часткай ваенных сіл горада было анроднае апалчэнне, якое склаадлася з гараджан і называлася "полк".Полацкія князі ў XII–пачатку XIII ст. выкарыстоўвалі таксама дапаможныя атрады з неславянскага насельніцтва Усходняй Прыбалтыкі.

У распараджэнні князя было кіраўніцтва княствам. Ён назначаў цівуноў (якія займаліся судовымі справамі, выконвалі функцыі фінансавай адміністрацыі), мытнікаў, ключнікаў.

У Полацкай зямлі на працягу XII–XIII стст. дзейнічалі дзве галіны ўлады– улада князя і улада веча –сход палачан для вырашэння грамадскіх спраў.

У асобныя перыяды гісторыі Полацка ўлада веча была вельмі значнай. На вечы ажыццяўляўся вышэйшы суд, кантралявалася дзейнасць князя, вырашаліся пытанні вайны і міру. Ад імя полацкааг веча заключаліся дагаворы з Рыгай і іншымі гарадамі. Калі веча не падтрымлівала князя, ён быў вымушаны пакінуць горад, таму што веча мела сваю ўзброенную сілу – аплчэнне гараджан. Веча магло выгнаць аднаго князя і запрасіць другога. Веча абмяжоўвала ўладу князя, але не знішчала яе. Князь прымаў удзел у справах кіравання, меў сваю дружыну, вершыў суд, раздаваў воласці з гарадамі іншым князям – сваім васалам.

У сярэдзіне XII ст., калі ўлада веча ўзмацнілася, рэзідэнцыя полацкіх князёў была перанесена за межы горада і знаходзілася ў Бельчыцы (2 км ад Полацка), а ў дзядзінцы – Верхнім замку– знаходзілася рэзідэнцыя епіскапа, які

займаў у Полацку вельмі высокае палажэнне. Ад яго імя пісаліся дагавары, якія заключаліся вечам, да іх прымацоўвалася яго пячатка.

Асаблівасці палітычнай гісторыі мелі вынікам асаблівасці палітычнага ладу ў Тураўскім княстве. Вялікую ролю ў Тураве адыгрывала ***веча***. Менавіта з яго згоды Кірыла Тураўскі быў абраны ***епіскапам*** Турава.

У Тураве існавала некалькі адміністратыўных пасад, што выконвалі функцыі, блізкія да некаторых княжаскіх функцый. Так, ***тысяцкі*** ўзначальваў гарадское апалчэнне, яго абавязак – ваеннае кіраўніцтва. Акрамя таго, у Тураве дзейнічаў ***пасаднік*** – галоўны кіраўнік цывільнай адміністрацыі княства. Такая пасада яшчэ існавала толькі ў Ноўгарадзе Вялікім.

Тэма 6. Сацыяльна-эканамічнае развіццё.

1.Шматукладнасць эканомікі. Развіцце феадальных адносін.

У УІІ ст. да н.э. у плямён, якія жылі на тэрыторыі Беларусі стварыліся аб’ектыўныя перадумовы для разлажэння першабытнага ладу. *Выкарыстанне жалезных прылад працы спрыяла павышэнню прадукцыйнасці працы, што прывяла да ўзнікнення сацыяльнай няроўнасці ў грамадства.* На змену першабытнай (родавай) абшчыне паступова прыходзіць абшчына суседская.

У працэсе распаду першабытных адносін асноўная роля ў грамадскім жыцці стала належыць мужчынам. Вярхоўнай уладай ў плямёнах стаў сход ўзброенных воінаў, дружыннікаў, дзе вырашаліся пытанні вайны і міру, выбіраліся старэшына роду і правадыр племені. *Грамадска-палітычны лад, які ўзнік на апошняй стадыі першабытнага грамадства адтрымаў назву ваеннай дэмакратыі.*

Феадалізм (ад лац. уладанне) грамадска-эканамічная фармацыя, якая прыходзіць на змену рабаўладальніцкаму або першабытнаму ладу і папярэднічае капіталізму. Тэрмін феадалізм быў уведезны ў навуку французскім вучоным Ф.Гізо ў XIX ст. для абазначэння адпаведнага эканамічнага і грамадска-палітычнага ладу. !н разглядаў феадальныя адносіны як спалучэнне вярхоўнай і мясцовай улады з землеўладаннем, адзначаў умоўны характар зямельнай уласнасці, васальную іерархію.

Станаўленне феадалізму - доўгі і складаны працэс. І ў познеантычным, і ў варварскім грамадстве ўзнікалі перадумовы для фарміравання феадальных адносін. Гістарычна склалася так, што ў Заходняй Еўропе станаўленне феадалізму адбывалася ва ўмовах ўзаемадзеяння рымскага і варварскага грамадству. Сінтэз элементаў абодвух грамадстваў найбольш актыўна працякаў там, дзе антычны і варварскі пачаткі былі дастакова ўраўнаважаныя. Класічным прыкладам такога варыянта развіцця з'яўляецца Паўночна-Усходняя Галія, дзе феадалізм зацвердзіўся ў 8-9 СТСТ.

Устанаўленне феадальных адносін у Еўропе ў 9-11 стст. у цэлым прывяло да ўздыму эканомікі і скачка ў развіцці прадукцыйных сіл. Усталяваліся парадак і кантроль за арганізацыяй вытворчасці. І феадал, і селянін былі зацікаўлены ў павелічэнні прадукцыйнасці працы і памераў прадукцыі. Развівалася рамяство, паступова яно аддалялася ад сельскагаспадарчых

заняткаў, адраджаліся на новай феадальнай аснове рымскія гарады, узнікалі новыя пасяленні, рынкавыя цэнтры, парты для рачнога і марскога гандлю.

Некаторыя вучоныя разглядаюць феадалізм як заходнееўрапейскі феномен, іншыя, у тым ліку і марксісты, бачаць у ім усеагульную стадыю развіцця чалавечага грамадства.

Асноўнымі класамі пры феадалізме былі феадалы і сяляне, якія знаходзіліся ад іх у той ці іншай форме залежнасці. На Беларусі, як і ў суседніх рэгіёнах, сяляне былі ператвораны ў прыгонных.

Асноўная эканамічная сутнасць – прысваенне феадаламі дададковага прадукту шляхам эксплуатацыі сялян на аснове манапольнай уласнасці на зямлю і няпоўнай уласнасці на зямлю і няпоўнай уласнасці на непасрэдных вытворцаў. Ступень зплежнасці сялян ал феадалаў была рознай, у шэрагу краін яна набывала форму прыгонніцтва.

Насельніцтва беларускіх зямель не было сацыяльна аднародным. На адным полюсе феадальнага грамадства стаялі самыя багатыя і ўплывовыя людзі – князі і баяры. Эканамічную аснову іх панавання і багацця складала ўласнасць на зямлю. Існавалі розныя формы феадальнага землеўладання: вотчыннае – валоданне зямлёй, сядзібай і сялянамі з правам продажу зямлі, раздзелу яе і перадачы ў спадчыну; памеснае – перадача зямлі ў часовае ўладанне за службу без права спадчыны; царкоўнае і манастырскае – знаходжанне зямель ва ўласнасці царквы і манастыроў.

Клас феадалаў меў іерархію. На вяршыні піраміды знаходзіўся вялікі князь, ніжэй – князі-кіраўнікі асобных зямель, княстваў (“отчын”), яшчэ ніжэй – феадалы-уладальнікі вялікіх і малых памесцяў (баяры, дваране). Дробныя феадалы ішлі на службу да багацейшых і знатных, станавіліся іх васаламі і карысталіся іх заступніцтвам.

Феадалы карміліся за кошт сваіх вотчын. Вотчына ўключала замак феадала, абкружаны земляными валамі і равамі, драўлянай сцяной, за якой размяшчаліся замкавыя пабудовы, а таксама падпарадкаваную феадалу вясковую акругу. Меліся і баярскія двары-замкі, якія ўяўлялі сабой своеасаблівыя сталіцы мікраскапічных дзяржаў у дзяржаве. Уладара абслугоўвала залежная ад яго чэлядзь. Ён меў уласнае войска, з дапамогай якога ахоўваў сваё дабро і здзяйсняў уладу над сялянамі вясковай акругі.

З уласным войскам феадал выступаў на вайну па патрабаванні князя ці мацнейшага феадала. Войска складалася са старэйшай дружыны вялікіх князёў і князёў буйных зямель, у якой служылі феадалы-баяры, і малодшай дружыны, у якой служылі баярскія і дваранскія дзеці, а таксама з войска феадалаў, якое ўключала ў сябе не толькі васальных баяр, але і служылых людзей, рамеснікаў і вольных сялян, што парвалі з абшчынай. Крыніцы называюць і гарадскія палкі, якія фарміраваліся па тысячах і дзяліліся на сотні.

Большую частку насельніцтва складалі сяляне. Сярод іх крыніцы называюць смердаў (найбольш шматлікая група феадальна залежных сялян), закупаў (часова несвабодныя людзі, якія трапілі ў даўгавую залежнасць за ўзятую пазыку (купу), халопаў і рабоў (асабіста несвабоднае насельніцтва).

Вядомы таксама радовічы – сяляне, звязаныя з феадалам нейкімі абавязацельствамі (“радам”, адсюль словы “радзіцца”, “дамаўляцца”), ізгоі – сяляне, якія выйшлі з абшчыны, знаходзіліся на службе ў феадалаў і поўнасцю залежалі ад іх волі.

2. Стан сельскай гаспадаркі

Земляробчае насельніцтва старажытнай Беларусі было арганізавана ў абшчыны ("верв", "грамада"), якія валодалі ворнай зямлёй. Яны складаліся з усіх сем'яў адной або некалькіх вёсак. Паступова абшчына пападала пад "апеку" феадалаў. На працягу многіх стагоддзяў эпохі феадалізму гаспадарка сялян вялася на землях, якія належалі сельскай абшчыне. Землі даваліся ў карыстанне асобных двароў; час ад часу абшчына рабіла іх перадзел. У ей спалучалася абшчыннае валоданне зямлёй з індывідуальным вядзеннем гаспадаркі. Сенажаці, лясы, вадаёмы бьші ў сумесным карыстанні. Абшчына садзейнічала згуртаванню сялян у іх адносінах з феадаламі. Сяляне былі зацікаўлены ў яе захаванні. У пэўнай меры ў гэтым былі зацікаўлены і феадалы, якія выкарыстоўвалі кругавую паруку для стараннага выканання сялянамі панскіх павіннасцей.

Асноўнай вытворчай адзінкай з’яўлялася гаспадарка адной сялянскай сям’і (“дым”, “рала”). Гаспадарча самастойныя сялянскія сем’і сяліліся невялікімі вёскамі, якія называліся “весямі”. Адміністрацыйным і рэлігійным цэнтрам некалькіх “весяў” было вялікае сяло – “пагост”. Жыллём служылі невялікія зрубы ці паўзямлянкі з глінабітнымі печамі, у якіх палілася па-чорнаму.

Абшчына аб’ядноўвала сем’і адной або некалькіх вёсак. Зямля з’яўлялася ўласнасцю абшчыны і перыядычна пераразмяркоўвалася паміж асобнымі сем’ямі. У абшчынным карыстанні заставаліся сенажаці, лугі, лясныя ўгоддзі, рэкі і азёры. Абшчыннікі былі звязаны паміж сабой кругавой парукай: разам адказвалі за здзейсненае на яе тэрыторыі злачынства, калі віноўнік невядомы, разам узнаўлялі страты, нанесеныя гаспадарцы або рэчы ўласніка. Абшчына была адным са сродкаў супраціўлення наступленню феадалаў на сялянскія землі і ўгоддзі. У працэсе эвалюцыі з абшчыны вылучаліся заможныя сялянскія гаспадаркі.

Асноўныя формы сялянскіх павіннасцей феадалу – аброк ці “павоз” (аплата натурай часткі сялянскага прыбытку) і паншчына (баршчына) (работа на барскім полі). Сяляне таксама працавалі на будаўніцтве гарадоў, замкаў, абарончых ліній, дарог. У час войнаў і феадальных міжусобіц яны аддавалі сваіх коней, абавязаны былі пастаўляць прадукты харчавання.

Большую частку неабходных для жыцця рэчаў сяляне рабілі самі. Яны пралі і ткалі, шылі адзенне і абутак, будавалі хаты, рабілі мэблю, посуд і г. д. Сыравінай для вытворчасці тканін, напрыклад, служылі шэрсць, лён і каноплі.

Ткалі на гарызантальных ткацкіх станках. Існавалі розныя сістэмы земляробства: падсечная (у лясной зоне), пераложная (у далінах рэк, на лясных палянах, сухадольных лугах, высахлых тарфяніках – зямлю

пераставалі апрацоўваць для аднаўлення яе натуральнай урадлівасці), папарная збожжавая сістэма з двухполлем ці трохполлем.

Сеялі жыта, пшаніцу, авёс, ячмень, проса, грэчку, гарох, лён, каноплі. Асаблівасцю развіцця жывёлагадоўлі было тое, што да канца I тысячагоддзя н.э. зацвердзілася стойлавае ўтрыманне жывёлы. Паляванне, рыбалоўства, збіральніцтва і бортніцтва ігралі падначаленую ролю.

3. Узнікненне гарадоў. Гарадское рамяство. Унутраны і знешні гандаль.

Ужо ў X ст. у найбольш развітых і густанаселеных раёнах, у месцах перасячэння важных шляхоў зносін пачалі ўзнікаць гарады, якія з'яўляліся спецыфічнымі ваенна-адміністрацыйнымі і рамесна-вытворчымі цэнтрамі.

Горад выконваў функцыі: адміністратыўную (ён быў цэнтрам княства ці воласці, там месцілася адміністрацыя); рамесную (у горадзе канцэнтраваліся вытворцы, больш таго, з'явіліся першыя аб'яднанні рамеснікаў – брацтвы); гандлёвую (менавіта ў гарадах знаходзіліся гандлёвыя рынкі – таргі); рэлігійна-культурную (саборы і цэрквы будаваліся ў гарадах, тут засноўвалі манастыры, а пры іх – скрыпторыі па перапісцы кніг і школы); абарончую (дзякуючы моцным абарончым збудаванням, у гарадах хавалася насельніцтва навакольных сёл у час небяспекі).

Узнікненне гарадоў было звязана з развіццём эканамічных адносін, а таксама з тым, што з асноўнай масы насельніцтва, занятага сельскай гаспадаркай, выдзяляліся купцы і рамеснікі, у значнай меры ўжо адарваныя ад земляробства. Яны пачалі сяліцца вакол умацаваных пунктаў, на месцах асобных селішч.

У летапісах, хроніках і другіх пісьмовых крыніцах, якія адносіліся да IX – XIII стст., названа больш 35 гарадоў, знаходзячыхся на тэрыторыі Беларусі. Некаторыя з іх атрымалі назву ад рэк, на якіх яны заснаваны: Полацк – ад Полаці, Друцк – ад Друці, Віцебск – ад Віцьбы.

Гарады ўзнікалі на месцы родавых цэнтраў, маглі вырасці з феадальнага замка ці сяла (пры ўмове спрыяльнага геаграфічнага іх знаходжання), ці быць заснаванымі на новым месцы па волі князя. Самым старажытным горадам Беларусі з'яўляецца Полацак – старажытная сталіца крывічоў. Ён упамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 862 год. Іншыя нашы гарады ўпершыню ўзгадваюцца: Віцебск – 974 г., Тураў – 980 г., Заслаўль – 988 г., Брэст – 1019 г., Браслаў – 1065 г., Мінск – 1067 г., Друцк – 1078 г., Барысаў – 1102 г., Гародня і Слуцк – 1116 г., Навагрудак – 1117 г.

Адным са старэйшых гарадоў беларускага Палесся з'яўляецца Мазыр, які займаў вельмі важнае геаграфічнае становішча, размяшчаўся на скрыжаванні буйных водных шляхоў (Прыпяць, Пціч) і сухапутных (Жытомір–Бабруйск, Рагачоў-Рэчыца-Пінск). Першыя звесткі аб горадзе ў пісьмовых крыніцах адносяцца да 1155 г., калі вялікі князь кіеўскі Юрый Далгарукі перадаў горад свайму саюзніку чарнігаўскаму князю Святаславу Ольгавічу. Пазней горад быў вернуты ў склад Кіеўскага княства.

У гарадах жылі князі і княжацкая дружына. У іх засяроджваліся таксама свецкія і духоўныя феадалы, сюды сцякалася і насельніцтва, якое займалася рамяством і гандлем.

Частку феадальнага грамадства складалі жыхары гарадоў –бюргеры, мяшчане. Насельніцтва феадальных гародоў было неаднароднае. Яно падзялялася на вярхі (купецтва і багатыя ўладальнікі майстэрняў) і нізы (гарадскія чорнарабочыя).

Старажытныя беларускія гарады мелі ўсталяваўшуюся структуру. Галоўнай часткай горада з'яўляўся дзяцінец – умацаваны цэнтр горада, дзе знаходзілася рэзідэнцыя князя ці яго намесніка. Пад сценамі дзяцінца знаходзілася пасяленне рамеснікаў, гандляроў і іншых гараджан – пасад. Яго маглі таксама абнесці сценамі. Акрамя адміністратыўнага цэнтра – дзяцінца – існаваў і грамадскі цэнтр горада – торг ці рынак. Менавіта тут збіралася веча – агульны сход дарослых мужчын горада і акругі, што вырашаў важныя пытанні.

Адасабленне рамяства ад сельскай гаспадаркі ў сваю чаргу вызвала развіццё пастаяннага ўнутранага гандлю – з'явіліся спецыяльныя месцы, дзе вёўся гандаль – рынкі, таргі. Развіццё гандлёвых адносін з іншымі тэрыторыямі прывяло да з'яўлення на нашай тэрыторыі вялікай колькасці манет. Перыяд IX – X стст. – гэта час распаўсюджвання на Беларусі куфіцкага дырхема (сярэбраная манета Арабскага халіфата). Выкарыстоўваліся ў гандлі як цэлыя манеты, так і часткі (галоўным чынам на мясцовым рынку). Сярэбраныя грошы былі вельмі шырока распаўсюджаны на нашай тэрыторыі. Праз беларускія землі праходзіў "шлях з вараг у грэкі", што звязваў Заходнюю і Паўночную Еўропу з Візантыяй і арабскім Усходам. У непасрэднай блізкасці ад яго ў 1973 г. быў адкрыты Казьянкаўскі манетны скарб (схаваны каля 940-х гг.), што ўключаў 7588 сярэбраных манет агульнай вагай каля 20 кг.

У выніку збяднення радовішчаў срэбра на Усходзе галоўнае месца ў грашовай сістэме на беларускіх землях заняў заходнееўрапейскі дынарый (канец X – першая палова XI стст.), але і ён хутка знік з прычыны феадальнага драблення дзяржаў Заходняй Еўропы. У так званы безманетны перыяд (другая палова XI – XIII стст.) у гандлёвых аперацыях выкарыстоўвалі плацёжныя зліткі з серабра (грыўны) ці іх вагавыя часткі.

Беларускія земля гандлявалі, з краінамі Ўсходу, так і заходнееўрапейскімі. Аб гэтым сведчаць не толькі дадзенныя археалагічных крыніц, але і запазычаныя з іншых моў словы, якія ў гэты час прыйшлі ў беларускую мову (шоўк, аксаміт, назвы каштоўных камянёў і г.д.).

Такім чынам, на працягу X – XIII стст. у межах шматукладнага грамадства (спалучаліся рысы першабытнаабшчыннага, рабаўладальніцкага і феадальнага грамадстваў) адбылася перамога феадальных адносін. Узнікла феадальная зямельная маёмасць і клас залежных сялян. Адбылося адасабленне рамяства ад сельскай гаспадаркі, у выніку чаго значны штуршок у развіцці атрымаў гандаль, хутка сталі ўзнікаць гарады. Поспехі ў развіцці гаспадаркі спрыялі ўтварэнню першых дзяржаў на нашай тэрыторыі.

5. Сацыяльнае расслаенне грамадства.

Насельніцтва беларускіх зямель не было сацыяльна аднародным. На адным полюсе феадальнага грамадства стаялі самыя багатыя і ўплывовыя людзі – князі і баяры. Эканамічную аснову іх панавання і багацця складала ўласнасць на зямлю. Існавалі розныя формы феадальнага землеўладання: вотчыннае – валоданне зямлёй, сядзібай і сялянамі з правам продажу зямлі, раздзелу яе і перадачы ў спадчыну; памеснае – перадача зямлі ў часовае ўладанне за службу без права спадчыны; царкоўнае і манастырскае – знаходжанне зямель ва ўласнасці царквы і манастыроў.

Клас феадалаў меў іерархію. На вяршыні піраміды знаходзіўся вялікі князь, ніжэй – князі-кіраўнікі асобных зямель, княстваў (“отчын”), яшчэ ніжэй – феадалы-уладальнікі вялікіх і малых памесцяў (баяры, дваране). Дробныя феадалы ішлі на службу да багацейшых і знатных, станавіліся іх васаламі і карысталіся іх заступніцтвам.

Феадалы карміліся за кошт сваіх вотчын. Вотчына ўключала замак феадала, абкружаны землянымі валамі і равамі, драўлянай сцяной, за якой размяшчаліся замкавыя пабудовы, а таксама падпарадкаваную феадалу вясковую акругу. Меліся і баярскія двары-замкі, якія ўяўлялі сабой своеасаблівыя сталіцы мікраскапічных дзяржаў у дзяржаве. Уладара абслугоўвала залежная ад яго чэлядзь. Ён меў уласнае войска, з дапамогай якога ахоўваў сваё дабро і здзяйсняў уладу над сялянамі вясковай акругі. З уласным войскам феадал выступаў на вайну па патрабаванні князя ці мацнейшага феадала. Войска складалася са старэйшай дружыны вялікіх князёў і князёў буйных зямель, у якой служылі феадалы-баяры, і малодшай дружыны, у якой служылі баярскія і дваранскія дзеці, а таксама з войска феадалаў, якое ўключала ў сябе не толькі васальных баяр, але і служылых людзей, рамеснікаў і вольных сялян, што парвалі з абшчынай. Крыніцы называюць і гарадскія палкі, якія фарміраваліся па тысячах і дзяліліся на сотні.

Большую частку насельніцтва складалі сяляне. Сярод іх крыніцы называюць смердаў (найбольш шматлікая група феадальна залежных сялян), закупаў (часова несвабодныя людзі, якія трапілі ў даўгавую залежнасць за ўзятую пазыку (купу), халопаў і рабоў (асабіста несвабоднае насельніцтва). Вядомы таксама радовічы – сяляне, звязаныя з феадалам нейкімі абавязацельствамі (“радам”, адсюль словы “радзіцца”, “дамаўляцца”), ізгоі – сяляне, якія выйшлі з абшчыны, знаходзіліся на службе ў феадалаў і поўнасцю залежалі ад іх волі.

Тэма 7. Барацьба з крыжацкай агрэсіяй і нашэсцем мангола-татараў.

1. Знешнепалітычнае становішча беларускіх зямель у пачатку 13 ст.

Раздзеленыя на мноства дробных удзелаў і аслабленыя Полацкая і Тураўская землі з канца XII ст. ужо амаль не траплялі ў поле зроку летапісцаў. Літоўскія плямёны паступова пазбавіліся ўсялякай залежнасці ад Полацка ды пачыналі самі ціснуць на беларускія землі, ажыццяўляючы адзін рабаўнічы набег за другім. Гаворачы пра барацьбу «грозных палачанаў» з літоўцамі, аўтар «Слова пра паход Ігараў» называе князя Ізяслава Васількавіча, які «позвони

своими острыми мечами о шеломы литовския, притрепав славу деду своему Всеславу». Перад знешняй небяспекай Полаччына спрабавала пераадольваць унутраны крызіс. Пра пэўную палітычную стабілізацыю ў ёй можа сведчыць ужо само трыццацігадовае княжанне аднаго князя Валодшы — Уладзіміра Ўсяславіча, які займаў полацкі пасад з 1180-х да 1216 г. Пад кантролем Полацка тады заставаўся яшчэ ўвесь басейн Дзвіны ад Земгальскай затокі да Смаленшчыны. Археалагічныя даследаванні пацвярджаюць, што зямля перажывала і бурнае гаспадарчае развіццё. Аднак менавіта тады на захадзе полацкіх уладанняў з'явілася сіла, якая ўжо ў XIII ст. стала адным з найважнейшых фактараў палітычнага жыцця паўночнай часткі Ўсходняй Еўропы.

2. Напад нямецкіх феадалаў на Усходнюю Прыбалтыку і Полацкую зямлю.

У першай палове XIII ст. Еўропа перажывала час значнага сацыяльнага гаспадарчага развіцця, узмацнення ролі буйных дзяржаў і кааліцый у вырашэнні праблем унутранай і міжнароднай палітыкі. Галоўная роля ў вырашэнні гэтых праблем належыла Ватыкану, Свяшчэннай Рымскай імперыі, Францыі, Іспаніі.

Аўтарытэт папства патрымлівался крыжовымі паходамі ў Святую зямлю і язычніцкія краіны Міжземнамор'я з удзелам манархаў, бісупаў, рыцарства, бо рымская курыя была іх асноўным арганізатарам і духаўным апекуном.

Чацвёртая экспедыцыя (1202–1204 гг.) стала першым крыжовым паходам супраць хрысціянскай краіны, быў захоплены Канстанцінопаль, замест Візантыйскій імперыі была створана Лацінская, гэта адкрыла шлях да аб'яднанне каталіцкай і грэка-праваслаўнай цэркваў (1215 г. Латэранскі сабор). У 1261 г. Візантыйская імперыя была адноўлена, але вярнуць былую веліч яна не здолела. (У XУ ст. яе заваевала Атаманская Порта).

Эпоха агульнаеўрапейскіх міжземнаморскіх паходаў завершылася. На мяжы XII – пачатку XIII ст. паяалі ствараца манаскія і рацарскія ордэны с місіянерскімі мэтамі. У 1198 г. папа Інакенцій III зацвердзіў статут Тэўтонскага ордэна. Нямецкія каралі разам з рымскімі папамі надалі Ордэну шырокіе прывілеі. Рост насельніцтва, збядненне і беззямелле дробнага рыцарства, палітычныя разлікі цэсараў і князёў, місіянерскія натхненні і арыстакратычна-прыгодніцкія традыцыі – розныя веравызнанні і прагматычныя прычыны збіралі пад ордэнскімі харугвамі прыхільнікаў еўрапейскай (пераважна нямецкай) духоўнай, тэрытарыяльнай і палітычнай экспансіі. Для ўвасаблення крыжовых хрысціянска-місіянерскіх планаў з улікам пануючага ў Еўропе міжнароднага і кананічнага права і цэркоўных уплываў Рыма заставаліся толькі Ўсходняя Прыбалтыка,адступніцкія (схізматычныя) княства Русі і некаторыя дробныя княствы, часткова заселенныя язычнікамі. Існавалі супярэчнасці і паміж Ганзай і купецтвам усходнеславяскіх зямель, і перш за усё вялікага Ноўгарада.

Крыжакі, пашыранная ў беларускай гістарычнай літаратуры назва членаў еўрапейскай рыцарска-манаскіх ордэнаў незалежна ад іх назвы і

местазнаходжання (Нямецкага ордэна – Тэўтонскага), Інфлянскага ордэна). Тэрмін пазычаны з польскай гістарычнай літаратуры, у якой крыжакамі называюць рыцараў суседняга Нямецкага ордэна па выяве крыжа на плашчы. У беларуска-літоўскіх летапісах ордэнскія рыцары называюцца “немцамі” , “немцамі прускімі”, “немцамі ліфлянцкімі”, “немцамі інфлянцкімі інфлянцкімі”.

Крыжовыя паходы, агульная назва ваенна-палітычных кампаній, якая праводзілася еўрапейскімі феадаламі ў 11–15 стст. пад рэлігійнымі лозунгамі з санкцыі папскага прастола. У вузкім сэнсе – серыя такіх паходаў на Блізкі Усход у 1096–1270. Прынята адрозніваць 8 крыжацкіх паходаў. Тэалагічна-прававой основай паходаў сталі хрысціянскія ідэй паламніцтва і “святой вайны” з “няверными”. Удзельнікі крыжовых паходаў нашывалі на на плашчы крыж з чырвонага сукна, таму іх назвалі крыжакамі. Ва усходняй Прыбалтыцы папамі толькі ў 1217–1265 гг. было абвешчана больш за 100 крыжацкіх паходаў.

У 1186 г. з пабудовай нямецкім місіянерам Мейнардам касцёла пачалося хрышчэнне ліваў. яно суправаджалася захопамі зямель і запрыгоньваннем мясцовага насельніцтва, выклікала сутыкненне з Герцыке і Кукейносам – вассальнымі княствамі княствамі Полацкай зямлі.

Крыжакі з’явіліся ва Ўсходняй Прыбалтыцы ў канцы XII ст у вусці Дзвіны, вялікай сухаходнай ракі. Каля 1185 г. аўгусцінцам Мейнгардам быў закладзены першы касцёл над Дзвіной. Пры яго прыемніке лівы былі падначалены архібіскупству. Трэці біскуп атаясамліваў хрысціянізацыю прыбалтаў з навязваннем палітычнай улады і ў 1201 г. заклаў горад Рыгу як апорны пункт каланістаў і сталіцу біскупства. У 1202 г. быў заснаваны Ордэн мечаносцаў, які з 1237 г. называўся Лівонскім або ліфлянскім Ордэнам.

У 1201 г. з дазволу полацкага князя Уладзіміра біскупам Альбертам была пабудавана крэпасць Рыга. У наступным годзе (1202) біскуп разам з абатам Тэадорыкам заснавалі ордэн мечаносцаў. З 1203 г. па 1210 г. вялася барацьба Полацка і Рыгі, пад час якой Полацк страціў Кукейнос (1208 г.) і Герцыке (1209 г.), кантроль над Ніжнім Падзвіннем і перастаў атрымліваць даніну ад ліваў і латгалаў (дагаворы 1210 і 1212 гг. з крыжакамі). Тым не менш, Уладзімір арганізаваў вялікі сумесны паход палачан, літоўцаў і эстаў супраць ордэна, але ў дзень адпраўлення вялікага войска князь нечакана памёр, верагодна, быў атручаны крыжацкімі шпіёнамі. Паход праваліўся, а наступленне крыжакоў працягвалася. У 1224 г. выгнаны з Кукейнаса князь Вячка загінуў пры абароне эстонскага горада Юр’еў (зараз Тарту), яшчэ раней, у 1214 г., пасля смерці князя Усевалада, цалкам пад уладу Рыгі перайшоў Герціке. Полацк страчваў свае пазіцыі, і паскорыўся гэты працэс са з’яўленнем у Прыбалтыцы яшчэ аднаго ордэна – Тэўтонскага. Тэўтонцы былі выгнаны з Палесціны сарацынамі, і іх запрасіў да сябе адзін з польскіх князёў – Конрад Мазавецкі. Тэўтонцы аселі на землях балцкага племені прусаў (1230 г.). Хутка яны знішчылі прусаў і пачалі рабаваць польскія, літоўскія і беларускія землі.

У 1237 г. адбылося аб’яднанне Тэўтонскага ордэна і ордэна мечаносцаў, апошні стаў называцца Лівонскім ордэнам. Аб’яднаныя сілы крыжакоў былі ўшчэнт разбітыя Аляксандрам Неўскім у 1242 г. у бітве на Чудскім возеры каля

Пскова. Крыху раней малады наўгародскі князь Аляксандр перамог шведскіх рыцараў на рацэ Няве (1240 г.), дзе ў бітве прымалі ўдзел полацкія дружыны, асабліва вызначыўся Якаў Палачанін. Гэтыя перамогі прыпынілі актыўныя наступальныя мерапрыемствы крыжакоў, але не адвялі пагрозу рэгулярных наездаў крыжакоў на славянскія і балцкія землі з рабаўніцкімі мэтамі.

Манаскія ордэны – гэта цэнтралізаваныя манаскія аб'яднанні ў каталіцкай царкве, дзейнасць якіх рэгламентуюцца статутатамі(рэгуламі), зацверджаннымі папам рымскім.

На чале ордэна стаіць генерал (генеральны магістр), пры якім ёсць капітул– калегія кіруючых асоб. Адрозніваюцца адзін ад аднаго традіцыйным ладам жыцця, мэтамі, закладзенымі сваімі заснавальнікамі і задачамі, вызначанымі папствам, а таксама колерам і кроем адзення. Маюць свае звычаі і абраднасць. большасць манаскіх ордэнаў жывуць у кляштарах. Старэйшым лічыцца ордэн бенедыкцінцаў (каля 530). У XI–XII ст. у сувязі з крыжовымі паходамі на Блізкі Усход узнік шэраг духоўна-рыцарскіх ордэнаў, члены якіх былі адначасова рыцарамі і манахамі.

Барацьба з мечаносцамі і тэўтонцамі вялася з пераменным поспехам. У 1236 г. літоўцы перамаглі мечаносцаў пад Шаўляем, у 1237 г. – Даніла Галіцкі перамог крыжакоў пад Драгічынам. Як вынік – у тым жа годзе (1237) адбылося аб'яднанне Тэўтонскага ордэна і ордэна мечаносцаў, апошні стаў называцца Лівонскім ордэнам. Аб'яднаныя сілы крыжакоў былі ўшчэнт разбітыя Аляксандрам Неўскім у 1242 г. у бітве на Чудскім возеры каля Пскова. Крыху раней малады наўгародскі князь Аляксандр перамог шведскіх рыцараў на рацэ Няве (1240 г.), дзе ў бітве прымалі ўдзел полацкія дружыны, асабліва вызначыўся Якаў Палачанін. Гэтыя перамогі прыпынілі актыўныя наступальныя мерапрыемствы крыжакоў, але не адвялі пагрозу рэгулярных наездаў крыжакоў на славянскія і балцкія землі з рабаўніцкімі мэтамі.

З 60-х гг. XIII ст. узмацніліся сувязі Полацка з Наваградкам, на полацкае княжэнне сталі запрашаць літоўскіх князёў, наладжваліся сумесныя паходы літоўскіх, наваградскіх і полацкіх дружын супраць крыжакоў (бітва каля возера Дурбе 1260 г.). Цесныя сувязі з Вялікім княствам Літоўскім садзейнічалі ўстанаўленню саюзных адносін і паступоваму ўваходжанню Полацкай зямлі ў склад ВКЛ, але з пэўнымі правамі на аўтаномію.

3. Роля беларускага народа ў барацьбе з мангола-татарамі.

Калі Полацкае княства змагалася з крыжакамі, Тураўскае княства, разам з іншымі рускімі княствамі пазнала жорсткасць мангола-татарскай няволі

Залатая Арда, Улус Джучы, дзяржава, якая існавала ў XIII-XУ ст. Узнікла у пач. 40-х XIII ст. Займала тэрыторыю Зах. Сібіры, Паўночнага Харэзма, Волжскай булгарыі, Паўночнага Каўказа, стэпаў ад Волгі да Дуная. У васальнай залежнасці трымала рус. землі. Напачатку займала тэрыторыю зах. частку імперыі Чынгіс-Хана – тэр. ўдзельнага княства (улуса) яго сына Джучы (Адсюль адна з назваў Залатой Арды). Самастойнай дзяржавай стала пры Батыі, сыне Джучы.

У 1237–1240 гг. войскі мангольскага хану Бату, унука Чынгіз-хана, паслядоўна заваявалі і спусташылі Разанскую, Уладзіміра-Суздальскую, Пеаяслаўскую, Чарнігава-Северскую, Кіеўскую і Галіцка-Валынскую землю. Заваяваннне насіла выключна жорсткі характар: гарады, якія аказвалі супраціўленне, цалкам вынішчаліся.

На працягу больш як 2,5 стагоддзя ВКЛ было ў складаных адносінах з Залатой Ардой. Вясной 1238 мангола-татары пагражалі з Усходу. Але ў выніку гераічнай барацьбы насельніцтва Смаленскага княства з войскамі чужаземцаў іх прасоўванне на Захад спынілася. У жніўні 1242 татары зноў спрабавалі ўзяць Смаленск, але былі адбіты. У канцы 1246 мангола-татары ўварваліся на тэрыторыю ВКЛ з Поўдня, зрабілі вялікія спусташэнні.

Зімою 1258/1259 г. на захад Беларусі рушыла вялікае татарскае войска на чале з Бурундаем. Бурундай загадаў удзельнічаць у паходзе галіцка-валынскаму князю Васільку, напісаўшы: “иду на Литву, еже иси мирен – поиди со мною”, і той не адмовіўся. Раазм з ардой у Беларускае Панямоньне ўварвалася галіцка-валынвалынскае войска князя Васількі, А Данілі Галіцкі сам напаў на Ваўкавыск – відаць, каб не саступаць у ініцыятыве хану Барундаю. Паводле летапісу, кааліцыя спусташыла вялізарныя абшары на захадзе Беларусі.

Гэтыя набегі на тэрыторыю Беларусі паўтараліся яшчэ не аднойшы. Азіяцкія наезднікі ўварваліся ў наш край край у 1275 г. – і з імі пашлі іх галіцка-валынскія хаўруснікі, затым тое ж здарылася і ў 1277 г., калі нагайскай арда наляцела на Гародгю і Новагародак па просьбе сыноў Романа Данілавіча. Трэці паход быў у 1287 г., кожнага разу татары чынілі “вялікае ліха і многа пакасці”, аднак гэтыя ўварванні не пагражалі беларусі ардынскім панаваннем.

У 1258, 1275, 1277 разам з ардынскімі войскамі ў паходах на ВКЛ удзельнічалі і дружыны галіцка-валынскіх князёў, але былі адбіты. Дайшлі летапісныя звесткі аб жорсткіх бітвах з татарамі пра ўшчэнт разбітага ворага дружынамі з Пінска, Слоніма, Навагрaдка, Турава і інш. гарадоў.

Княствы на тэрыторыі сучаснай Беларусі гэтае нашэсце закранула ў значна меншай ступені. Укосныя летапісныя паведамленні і матэрыялы археалагічных даследаваняў дазваляюць сцвярджаць пра разбурэнне ў гэты час хіба толькі ўскрайкаў беларускай тэрыторыі – гарадоў Гомеля, Магілёва, магчыма, Берэсця, Пінску і некаторых іншых. Так, пра разбурэння Гомеля і Магілёва сведчаць дадзеныя археалагічных раскопак. Пра паход Бату-хана на мяжы 1240–1241 г. на тэрыторыі Піншчыны і Берасцейшчыны паведамляе Валынскі (Іпацьеўскі) летапіс. Каля Берасця пасля праходу татар было немагчыма “іті в поле смрада раді і множества ізбіеных”. Тады ж і пінскія князі былі вымушаны ратавацца за мяжой,што сведчыць калі не пра разбурэнне іх вотчын, то, прынамсі, пра рэальную пагрозу. У 1240-1241 гг. Былі разрабаваны і спалены паўднёвабеларускія гарады, у тым ліку Гомель, Мазыр, Брэст. У 1249 г. Міндоўг перамог татарскага хана Койдана каля Крутагор’я.

Тэма 8. Рэлігія і культура

1. Распаўсюджванне хрысціянства.

Язычніцтва ўжо не адпавядала патрэбам кіруючай вярхушкі Кіеўскай Русі. Суседнія дзяржавы і дзяржавы, з якімі ўсходнія славяне былі звязаны гандлёвымі сувязямі адмовіліся ад паганства на карысць хрысціянства (Еўропа), ці мусульманства (Азія). На землях Старажытнай Русі таксама былі знаёмы з хрысціянствам. Бабка Уладзіміра Святаславіча, княгіня Вольга, прыняла хрысціянства ў Канстантынопалі разам з некаторымі прадстаўнікамі кіеўскай знаці. У Кіеве пад час княжання Святаслава дзейнічала Дзесяцінная царква, і шмат кіеўлян, што арыентаваліся на супрацоўніцтва з Візантыяй, далучаліся да візантыйскай веры.

Хрысціянства сёння – адно з трох сусветных рэлігій, яно мае тры асноўныя плыні: каталіцкую, праваслаўную і пратэстанскую

Хрысціянства ўзнікла ў I ст. у Палесціне як рэлігія прыгнечаных, аднак у IV ст. яна стала афіцыйнай дзяржаўнай рэлігіяй ва ўсёй Рымскай імперыі. Падзел імперыі на Усходнюю і Заходнюю адбіўся на хрысціянстве. Усходняя - праваслаўная - царква падпарадкавалася візантыйскаму імператару.

Заходняя каталіцкая царква пасля падзення Рыма ў 476 г. лічыла сваім галоўным кіраўніком Папу Рымскага. З цягам часам нарасталі не толькі палітычныя, але і дагматычныя, абрадавыя супярэчнасці.

З канца X–XI ст. язычніцтва на беларускіх землях пачало паступова выцясняцца хрысціянствам– найперш у выглядзе ўсходняга абраду (праваслаўя), некалькі пазней – каталіцызму. Працэс хрысціянізацыі мясцовага насельніцтва неаднойчы суправаджаўся ўзаемнымі непрыхільнасцю, сутыкненнямі, праследваннямі, знішчэннем свяцілішчаў і ідалаў.

Хрышчэнне Русі адбылося напрыканцы X ст. (988 г. Кіеў, Кн. Уладзімір). На Русі з’явілася духавенства, на чале якога стаяў мітрапаліт, які меў рэзідэнцыю ў Кіеве. Падпарадкаваныя яму епіскапы знаходзіліся ў буйных гарадах.Правам назначэння мітрапаліта карыстаўся канстантынопальскі патрыярх. Царква на Русі знаходзілася ў залежнасці ад грэчаскай царквы. Духавенства Русі, падобна візантыйскаму, падтрымлівала свецкую ўладу і клапацілася аб уласных царкоўных інтарэсах. Царква адтрымлівала ад князёў дзясятую частку даходаў і значныя зямельныя ўладанні.

Пра распаўсюджванне хрысціянства на Беларускіх землях звестак ў пісьмовых крыніцах недастаткова. На Полаччыне знаёмства мясцовых жыхароў з хрысціянствам пачалося ў IX ст. Ісландскі помнік пісьменнасці “Сага аб хрышчэнні” распавядае пра Торвальда Вандроўніка (ён ахрысціў Ісландыю), які вяртаўся на радзіму пасля паломніцтва ў Палесціну. Яго шлях пралягаў праз Полацк, дзе місіянер заснаваў манастыр Іаана Прадцечы, але неўзабаве і сам памёр (пахаваны ў гэтым манастыры).

Былі знаёмы з хрысціянствам у сям’і першага гістарычна вядомага полацкага князя Рагвалода. Усе дзеці Рагнеды былі вядомы сваімі прыхільнымі адносінамі да хрысціянства. Рагнеда, пакунуўшы Уладзіміра, пастрыглася ў манашкі, узяўшы імя Анастасія і жыла ў Заслаўі ў скіце. Яе сын Ізяслаў Уладзіміравіч чытаў хрысціянскія кнігі і быў вельмі набожным.

У 992 г. у Полацку была заснавана епархія – царкоўная тэрытарыяльная адзінка, што кіравалася епіскапам. Была пабудавана першая царква ў імя

Багародзіцы. Першымі епіскапамі былі грэкі (з Візантыі) ці балгары. Першая звестка пра полацкага епіскапа Міну датуецца ў летапісе 1105 г. Полацкія епіскапы Міна, Козма, Дыянісій, Нікола.

Па меркаванню навукоўцаў, усталяванне хрысціянства ў Полацку адбывалася больш спакойна, чым у некаторых іншых гарадах (Напрыклад, за супраціўленне новай вере была спалена палова Ноўгарада). У Полацку былі адкрыты манастыры– жаночы св. Спаса і мужчынскі св. Багародзіцы (заснаваныя Еўфрасінняй Полацкай), Барысаглебскі ў Бельчыцах пад Полацкам. Манастыры карысталіся значнай падтрымкай ад князёў, частка манахаў і манахінь былі са знатных феадальных родаў. У XII ст. у Полацку існавала не менш 10 культавых збудаванняў, 3 манастыры

У 1005 г. утворана Тураўская епархія. Епіскапы у Тураве: Ігнацій, Іакім, Кірыл (каля 1169 г.), Лаўрэнцій. Хрысціянізацыя Тураўскай зямлі пачынаецца пры Святаполку (988-1015 гг. - князь тураўскі, 1015-1019 гг. -вялікі кіеўскі князь), больш вядомым як "Святаполк Акаянны". Нязгодны з рэлігійнай палітыкай Уладзіміра, вымушаны лічыцца з настроямі сваей дружыны і тураўскай знаці, якія насцярожана ўспрымалі любыя пачынанні Кіева, Святаполк стаў патураць заходняму адгалінаванню хрысціянства. Нагадаем, што ў тыя часы хрысціянства яшчэ фармальна заставалася адзіным. Ён ажаніўся на каталічцы, наблізіў да сябе калабжэгскага епіскапа Рэйнберна - вядомага барацьбіта з язычніцтвам на тэрыторыі Польшчы - і аддаў перавагу каталіцтву, збіраўся ўвесці менавіта гэту веру у сваім княстве. Зразумела, чаму тагачасныя і пазнейшыя крыніцы, што выйшлі з-пад пяра праваслаўных аўтараў, прасякнуты нянавісцю да Святаполка, які патураў іншай ад праваслаўя веры.

У Тураве, верагодна, усталяванне хрысціянства суправаджалася крывавымі падзеямі. Тураўскае паданне апавядае пра каменныя крыжы, якія прыплылі ў горад па Прыпяці, і пра тое, што вада ў рацэ была чырвоная ад крыві.

Мяркуецца, што Тураўская епархія была заснавана ў 1005 г. У 1013 г. у Тураве дзейнічаў біскуп Рэйнберг з Калобжыц, што прыехаў разам з дачкой польскага караля Баляслава, жонкай тураўскага князя Святаполка Уладзіміравіча. Ён пачаў рабіць захады па распаўсюджванню хрысціянства паводле лацінскай традыцыі і спробы стварэння тут каталіцкай біскупіі.

Спроба ўсталяваць “лацінскую” вера не ўдалася. І на Тураўшчыне таксама пачынае распаўсюджваецца вера па візантыйскаму ўзорк. У 1113 г. у Тураве быў заснаваны Варварінскі манастыр. У XII ст . існаваў і мужчынскі Барысаглебскі манастыр, пры якім знаходзілася епіскапская рэзідэнцыя. Самым вядомым тураўскім епіскапам быў наш славуты культурны дзеяч Кірыла Тураўскі, які жыў у XII стагоддзі.

Пашырэнне хрысціянства ў стражытных езмлях Беларусі мела агульныя рысы з зацвярджэннем новай веры ў іншых землях усходніх славян:
яно хутка пранікала ў сем’і феадалаў і знаці, купецкага люду, але амаль не мела ўплыву ў сельскай мясцовасці, дзе па-ранейшаму шанавалі старых паганскіх багоў.

Пад час барацьбы за княжаскі трон у Кіеве (пасля смерці Уладзіміра) у 1015 г. былі забіты князі-браты Барыс і Глеб. Менавіта яны сталі першымі ўсходнеславянскімі святымі (кананізаваны ў 1072 г.). Гэтых святых шанавалі ў Полацкім княстве. Два сыны Ўсяслава Чарадзея названыя ў гонар святых. У сваю чаргу, сын Усяслава Барыс мае прамое дачыненне да так званых "барысавых камянёў". На велізарных валунах, што з'яўляліся язычніцкімі фетышамі, ён загадаў выбіць хрысціянскі сімвал – шасціканцовы крыж з надпісам "Господі помозі".

Разглядаючы пытанне аб распаўсюджванні хрысціянства на ўсходнеславянскіх землях навукоўцы выкарыстоўваюць тэрмін "дваяверства" ("двухвер'е") .Пры гэтым, размова павінна ісці не пра ўстанаўленне дзвюх паралельных рэлігійных з'яў, а пра іх сінкрэтызацыю. Царква была вымушана дапасоўваць нават свае святы і абрады да язычніцкага святочнага календара. Элементы стараславянскага складу жыцця і жывёлагадоўчага культу ўвайшлі ў хрысціянскі царкоўны каляндар.

Царква ў перыяд сераднявечча –гэта арганізацыя духавенства і веруючых, якая дзейнічае на аснове хрысціянскага веравучэння і культу. Для яе характэрна наяўнасць цэнралізаванага кіравання на чале з іерархіяй духавенства і падзел прыналежных да царквы на прафесійных дзеячаў культу і радавых веруючых (клір і міране). На чале царквы на Русі стаяў мітрапаліт, які назначаўся канстанцінопальскім патрыярхам. *Усходнеславянская царква была часткай візантыйскай грэка-праваслаўнай царквы.*

Хрысціянства на ўсходнеславянскіх землях супала па часу з усталяваннем дзяржаўнасці і станоўча паўплывала на яго. Вера ў адзінага Бога адпавядала адзінаўладдзю князя ў дзяржаве, а духавенства падтрымлівала яе і было ёй апорай.У выніку прыняцця хрысціянства ўзрос аўтарытэт усходнеславянскіх княстваў з імі як з роўнымі пачалі лічыцца іншыя хрысціянскія краіны.

2. Літаратура.

Хрысціянства значна паўуплывала на культурнае развіццё. Яно развівалася на аснове культурных традыцый усходнеславянскіх плямёнаў і культуры Візантыі, якая падвяргалася творчай перапрацоўцы. У духоўным жыцці ўсходніх славян спалучаліся і перапляталіся язычніцкія і хрысціянскія традыцыі.

Ускладненне грамадскай і гаспадарчай дзейнасці разам з прыняццем хрысціянства абумовілі развіццё з канца X ст. пісьменства. Матэрыялам для пісьма служыў пергамент, пакрытыя воскам дошчачкі і бяроста, на якіх стылямі (пісаламі) надрапвалі надпісы. Надпісы рабілі таксама на камянях, цэгле, металічных пячатках, званах, прасліцах, касцяных вырабах і інш. У аснову беларускай азбукі пакладзены алфавіт, створаны ў 60-я гг. IX ст. знакамітым балгарскім асветнікам, візантыйскім царкоўнікам Кірылам Салунскім і адаптаваны яго вучнямі пад славянскую фанетыку. Самым старажытным помнікам пісьменства на Беларусі і першым датаваным

надпісам на ўсёй тэрыторыі Усходняй Еўропы з'яўляецца надпіс на пячатцы полацкага князя Ізяслава (канец X ст.). імя кня зя перададзена на ім кірылічнымі літарамі, але ў грэчаскім гучанні - "Ізяславос". Пісьменства XII-XШ стст. прадстаў-лена таксама надпісамі на так званых "Барысавых" і "Рагвалодавых" камянях (XII ст.), берасцянымі граматамі (XIII -першая палова XIV ст.), знойдзенымі ў Віцебску і Мсціславе; на крыжы Ефрасінні Полацкай (XII ст.), на цаглінах полацкага Сафійскага сабора (надрапаны імёны яго будаўнікоў). Паступова ў XII ст. пісьмом сталі карыстацца не толькі князі і вышэйшае духавенства, але і простыя гараджане.

У X1-XII СТСТ. на тэрыторыі сучаснай Беларусі пачалася перапіска кніг. Яна вялася ў майстэрнях - *скрыпторыях,* якія ствараліся пры манастырах.

Самая старажытная рукапісная кніга - Тураўскае Евангелле (XI ст.). Перапіскай кніг займалася асветніца XII ст. Ефрасіння Полацкая.

Першымі збіральнікамі кніг былі храмы і манастыры, якія на працягу многіх стагоддзяў з'яўляліся ачагамі асветы і культуры на нашых землях. Самая першая бібліятэка была створана пры Сафійскім саборы ў Полацку.

Да ліку ранніх помнікаў пісьменства адносяцца Полацкі (XII ст.), Тураўскі і Навагародскі (XIII ст.) летапісы, якія, аднак, да нашага часу не захаваліся. Шмат якія падзеі беларускай гісторыі адлюстраваны ў "Аповесці мінулых гадоў", створанай у пачатку XII ст. кіеўскім манахам Нестарам. Гэта помнік агульнаўсходнеславянскага летапісання. Мяркуюць, што звесткі пра некаторыя падзеі на Беларусі ў яго папалі з Полацкага летапісу.

Літаратура XII-XШ стст. прадстаўлена царкоўна-павучальнымі творамі і жыціямі святых. Вьдатныя кніжнікі, высокаадукаваныя людзі і царкоўныя прапаведнікі тых часоў - Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч і Аўрамій Смаленскі.

Кірыла Тураўскі (каля 1130 - каля 1182) - выдатны для свайго часу пісьменнік, красамоўны прамоўца, аўтар шэрагу "слоў", малітваў-споведзяў, аповесцей-прытчаў. Ён паходзіў з заможнай гарадской сям'і, атрымаў добрае хатняе выхаванне, пазней спасціг вышэйшыя навукі. Добраахвотна стаў манахам. Быў першым вядомым на Русі "стоўпнікам" - зачыніўся ў манастырскай вежы, каб поўнасцю аддацца роздуму і малітвам. Карыстаўся вялікай павагай тураўцаў, што яны нават прасілі яго стаць епіскапам тураўскім. Сваю епіскапскую пасаду разглядаў як нялёгкі абавязак хрысціяніна і асветніка, бо яго ўзнёсла-паэтычная натура не была схільнай да іерархічнай кар'еры і царкоўнага адміністратарства.

Творы Кірылы Тураўскага набылі вялікую папулярнасць на Русі, распаўсюджваліся ў спісах XП-XУП стст., неаднаразова друкаваліся ў XУ1-XX стст. Найбольш вядомымі з'яўляюцца "словы" Кірылы, у якіх ён расказвае пра розныя выпадкі з дзейнасці Хрыста, выказваючы да іх свае адносіны. Пяру К. Тураўскага даследчыкі прыпісваюць больш за 60 літаратурных твораў, частка якіх, аднак, толькі гіпатэтычна звязваецца з яго імем - унікальны выпадак, калі захавалася такая багатая спадчына ад пісьменніка XII ст. Пісьменнік па-майстэрску валодаў народнай вобразнай і стараславянскай мовамі, глыбока ведаў візантыйскую культуру, асабліва паэзію і красамоўства. Творам К. Тураўскага ўласцівы алегарычнасць, іншасказальнасць. Летапісец назваў

Кірылу "рускім Златавустам". У літаратуры выказваецца меркаванне, што К. Тураўскі быў аўтарам "Слова аб палку Ігаравым", якое лічыцца шэдэўрам сусветнай літаратуры XII ст. Памяць Кірылы царква шануе 18 красавіка па старому стылю.

Зоркай першай велічыні ззяе на небасхіле старабеларускай культуры Ефрасіння (свецкае імя Прадслава) Полацкая (каля 1101-1167). Яна паходзіла з дынастыі князёў Рурыкавічаў па мужчынскай лініі і з дынастыі Рагвалодавічаў па жаночай. Унучка знакамітага Усяслава Чарадзея, дачка князя Святаслава-Георгія, яна мела сваякоў сярод візантыйскіх імпе-ратараў, князёў кіеўскіх, тураўскіх, пераяслаўскіх, смаленскіх і інш. Звестак пра жыццё Ефрасінні мала. Адзінай крыніцай інфармацыі з'яўляецца "Жыціё святой і найпрападобнейшай Еўфрасінні", створанае ў канцы XII ст. Да гэтай крыніцы далучаюцца звесткі з летапісаў гэтага перыяду.

Прадслава была здольнай дзяўчынкай, мела ахвоту да вучэння, цікавілася рукапіснымі кнігамі, да якіх князёўна мела доступ, атрымала добрую для таго часу адукацыю пры двары. У 12-гадовым узросце (узрост, калі, паводле кананічнага права, дзяўчына магла ўступаць у шлюб) яна адмовілася ад дынастычнага шлюбу і пастрыглася ў манашкі. У манастыры яна занялася шматграннай асветніцкай дзейнасцю. Па яе замове вядомы дойлід Іаан пабудаваў мураваны храм святога Спаса, а жывапісцы распісалі яго фрэскамі.

Рэшткі фрэсак, якія захаваліся да сённяшняга дня, ўяўляюць вялікую гістарычную і мастацкую каштоўнасць. У храме размяшчалася келля Ефрасінні. Па просьбе Ефрасінні візантыйскі імператар Мануіл Комнін падарыў ей абраз Адзігітрыі (Маці Божай) Эфескай, асвечаны канстанцінопальскім патрыярхам Лукою. Цяпер гэты абраз знаходзіцца ў Санкт-Пецярбургу ў фондах Рускага музея.

Па заказе Ефрасінні ў 1161 г. майстар-ювелір Лазар Богша зрабіў настольны крыж (даўжыня 51 см) для Спаскай царквы. Заснаваныя Ефрасінняй Полацкай манастыры сталі асяродкамі асветы ў Полацкім княстве. У іх былі створаны школы. Яна, асветніца, памнажала кніжнасць, стварыла майстэрню па перапісцы кніг.

На схіле жыцця асветніца вырашыла здзейсніць паломніцтва ў Святую Зямлю і ў 1167 г. адправілася ў Іерусалім. Але, знясіленая падарожжам, захварэла і памерла. Была пахавана непадалёку ад Іерусаліма, адкуль рака з яе рэшткамі як каштоўнейшая рэліквія была ў 1187 г. вывезена у Кіева-Пячорскую лаўру. У 1910 г. рака з мошчамі святой была ўрачыста перавезена з Кіева ў Полацк.

3. Школы дойлідства, фрэскавыя роспісы.

Вышэйшым узорам старажытнарускай культуры з'яўляецца манумен-тальная архітэктура. У X — XIII стст. у архітэктуры Еўропы дамінаваў раманскі стыль. Грамадзянскія і культавыя раманскія пабудовы вызначаліся масіўнасцю, суровай манументальнасцю і крапаснымі рысамі. У муроўцы абавязкова ўжываўся абчэсаны і прыродны камень, часам разам з цэглай. Рысы раманскага стылю ёсць у многіх помніках беларускага дойлідства.

К канцу X ст. на Русі не было каменна-цаглянага будаўніцтва. З прыняццем хрысціянства бярэ пачатак узвядзенне манументальных культавых пабудоў. На пачатковым этапе рускія дойліды пераймалі візантыйскія архітэктурныя формы, потым іх пераасэнсавалі ў адпаведнасці са сваімі мастацкімі густамі, традыцыямі. Будаўніцтву сабораў на Русі надавалася дзяржаўнае і палітычнае значэнне.

У сярэдзіне XI ст. у Полацку, следам за Кіевам і Ноўгарадам, быў пабудаваны старажытнейшы з вядомых на тэрыторыі Беларусі мураваны Сафійскі сабор. Ен меў шмат агульнага з наўгародскай Сафіяй. Будаўнічым матэрыялам былі плітачная цэгла і брукаваны камень. План храма адрозніваецца строгай сіметрыяй. Унутраная прастора падзяля-лася 16 слупамі на 5 уздоўжных нефаў. Пасярэдзіне будынка змяш-чаўся галоўны купал, вакол якога групавалася яшчэ 4 меншых. Сцены ўнутры сабора былі распісаны фрэскамі і ўпрыгожаны мазаікай.

Хуткі рост гарадоў, рамёстваў і гандлю, распаўсюджанне хрысціянства стварылі ўмовы для далейшага развіцця мураванай архітэктуры. У XII ст. у Віцебску была пабудавана Благавешчанская царква (засталіся руіны). Яе рысы (незвычайная выцягнутасць плана, 6 калон) нагадваюць заходнееўрапейскія базілікі. Пазней базілікі былі паўтораны ў пабудовах Полацка, Гродна, Смаленска. У XII - XIII стст. у Полацку з'явіліся некалькі мураваных сабораў. Сярод іх - Спаскі, быў пабудаваны ў сярэдзіне XII ст. Непадалёк ад Полацка, у Бельчыцах, у XII ст. быў заснаваны манастыр.

У ім было не менш за 4 мураваныя саборы. Адзін з іх меў двухскатны дах, на грэбені якога была выстаўлена драўляная галава, што сведчыць пра выкарыстанне ў мураванай архітэктуры традыцыйнага драўлянага дойлідства.

Значнай своеасаблівасцю адрозніваюцца манументальныя збудаванні Гродна. У старажытнарускі перыяд у горадзе было ўжо некалькі цагляных храмаў і грамадзянскіх збудаванняў. Найболып яскравай рысай пабудоў Гродна была маляўнічасць афармлення фасадаў устаўкамі з каля-ровых шліфаваных валуноў. У XII ст. былі пабудаваны Барысаглебская (Каложская) царква на ўскраіне старажытнага Гродна, Крапасныя вежы, Ніжняя царква на тэрыторыі Гродзенскага дзядзінца, царква ў Ваўкавыску, якія стварылі яскравую і самабытную гродзенскую архітэктурную школу. Спалучэнне чырвонага фону цаглянанай кладкі з умураванымі рознакаляровымі керамічнымі пліткамі і паліраванымі камянямі надавала архітэктурным ансамблям Гродна маляўнічасць і непаўтор-насць.

На тэрыторыі Беларусі вядома яшчэ адно збудаванне - царква ў Тураве, архітэктурныя формы і будаўнічая тэхніка якой дазваляюць датаваць яе сярэдзінай або другой паловай XII ст. Рэшткі яе, выяўленыя пры раскопках на Тураўскім гарадзішчы, даюць падставу меркаваць, што гэта быў шасціслуповы трохапсідны храм, які меў хоры. Царква была збудавана з плінфы спосабам раўнаслойнай муроўкі на растворы з дамешкай цамянкі (дробна тоўчанай цэглы). У XIII ст. умовы для манумен-тальнага будаўніцтва натэрыторыі Беларусі істотна змяніліся. У сувязі з драбленнем Полацкай зямлі на ўдзелы і палітычным аслабленнем самога Полацка тут прак-тычна прыпыняецца манументальнае культавае будаўніцтва. Пачынаюць пераважаць

абарончыя збудаванні, што звязана з узмац-неннем ваеннай пагрозы з боку крыжакоў і татар. У апошняй чвэрці XIII ст. у Камянцы (каля Брэста) была ўзведзена 30-метровая вежа абарончага значэння — Белая вежа, якая захавалася да нашага часу. Круглая ў плане, яна мае 5 ярусаў з байніцамі на кожным з іх. Ёсць звесткі пра тое, што такія вежы былі ў Гродне, Тураве, Новагародку і, магчыма, у Полацку.

У заходніх землях Русі вышэйшага ўзроўню дасягнуў фрэскавы жывапіс, які атрымаў самастойнае развіццё, увабраўшы багатыя народныя традыцыі, лепшыя здабыткі візантыйскіх мастацкіх школ. Ен быў шырока выкарыстаны ў полацкіх Сафійскім і Спаскім саборах, у храмах Бельчыцкага манастыра, віцебскай Благавешчанскай і гродзенскай цэрквах. Яго сюжэты — фігуры святых, ілюстрацыі да евангельскіх і біблейскіх сказанняў.

4. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Шырокае развіццё на беларускіх землях атрымала прыкладное мастацтва. Нават звычайныя прадметы з дрэва, косці, гліны, металу ўпрыгожваліся разьбой, інкрустацыяй. Своеасаблівая ў гэтым сэнсе прыгажосць керамікі XI - XIII стст. У ёй мы не знойдзем яскравасці маляўнічых спалучэнняў эмалі, пераліваў сонечнага спектра шкла. Яе прыгажосць выяўлялася ў строгасці і стрыманасці каляровых гучанняў, у шурпатасці, аксамітнасці грубa зробленай фактуры.

Трохі іншы характар мелі прадметы, прызначаныя для феадальнай арыстакратыі, заможных гараджан. Яны часта ўпрыгожваліся выявамі фантастычных звяроў і птушак, выкананымі ў асаблівай манеры — "звярыным стылі". Любімымі сюжэтамі старажытнарускага прыкладнога мастацтва былі геральдычныя львы. Узорамі тонкай разьбы па каменю і косці з'яўляюцца шахматныя фігуркі, знойдзеныя ў Гродне і Ваўкавыску.

Пра высокае мастацкае майстэрства тагачасных умельцаў гавораць прадметы хрысціянскага культу. Сярод іх вылучаюцца найтанчэйшай мастацкай разьбой каменныя абразкі з шэрага шыферу, знойдзеныя ў час раскопак на гарадзішчы Мінска ў 1957 г. Адзін з гэтых абразкоў выяўляе ўшанаваных у старажытнасці святых у поўны рост з фігурай Хрыста ў верхняй частцы. Што да характарыстыкі выяўленых асоб, спосабу разьбы па каменю, выразу твараў, дык ва ўсіх выразна праяўляюцца асаблівасці народнага мастацтва з яго непасрэднай перадачай навакольнага свету. Твары і аблічча святых у многім нагадваюць нам беларускіх сялян. Каштоўнасць абразкоў абумоўлена тым, што ў дадзеным выпадку мы маем своеасаблівае зліццё майстэрства стварэння абразоў, запазычанага з Візантыі і паўднёваславянскіх краін, з пры-звычаенасцю і вопытам апрацоўкі дрэва і каменя, якая спрадвеку існавала сярод народа і паходзіла ад перыяду першабытнага грамадства.

Для стварэння прадметаў хатняга побыту, зброі, прылад працы і ўпрыгажэнняў выкарыстоўваліся розныя металы: жалеза, бронза, медзь, срэбра, золата. Тэхніка іх апрацоўкі ў XI - XIII стст. дасягнула высокага ўзроўню. У беларускіх гарадах былі распаўсюджаны амаль усе вядомыя ў

Еўропе тэхнічныя спосабы апрацоўкі металаў: плаўка, ліццё, коўка, залачэнне дроту, гравіраванне, упрыгожванне металічных вырабаў эмаллю, чарненнем.

Помнікі прыкладнога мастацтва нешматлікія. Але і тое невялікае, што захавалася да нашага часу, сведчыць пра высокі ўзровень гэтага віду мастацтва ў нашых продкаў. Мы маем на ўвазе найперш крыж Ефрасінні Полацкай, створаны мясцовым майстрам Лазарам Богшам. Крыж выконваў ролю каўчэга для захавання хрысціянскіх рэліквій. Яго асновай з'яўлялася кіпарысавае дрэва. Зверху і знізу дрэва закрывалі залатыя пласціны (усяго 21), аздобленыя каштоўнымі камянямі, арнаментальнымі кампазіцыямі і абразкамі, якія былі выка-наны ў тэхніцы перагародкавай эмалі. Па майстэрстве выканання твор Лазара Богшы не саступаў лепшым візантыйскім узорам, выраблены у гэтай найтанчэйшай тэхніцы. Шасціканцовы крыж меў вышыню каля 52 см, пасярэдзіяе ў 5 квадратных падпісаных гнёздах знаходзіліся рэліквіі. Яго бакі былі абкладзены срэбнымі з пазалотаю пласцінамі, выкананымі ў тэхніцы ціснення. Крыж быў абведзены шнурком перлаў.

Крыж Ефрасінні Полацкай з'яўляецца не толькі выдатным творам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, але і каштоўным помнікам ста-ражытнабеларускага пісьменства. Зробленыя на крыжы надпісы ўмоўна падзяляюць на дзве часткі. У першай частцы паведамляецца аб годзе стварэння святыні, кошце матэрыялаў і працы, у другой жа запісаны праклён таму, хто знясе крыж са Спаскай царквы, якой падаравала яго Ефрасіння.

Няпросты лёс напаткаў крыж Ефрасінні Полацкай, шмат разоў змяняў ён уладальнікаў і месцазнаходжанне. Ужо на мяжы XII -XIII стст. яго вывезлі з Полацка смаленскія князі, у XVI ст. крыж ненадоўга трапіў у рукі маскоўскіх князёў, а затым захоўваўся ў Сафійскім саборы, які належаў уніятам. Пасля скасавання уніі ён быў вернуты ў Спаса-Ефрасіннеўскую царкву. З 1929 г. крыж знаходзіўся ў Магілёўскім краязнаўчым музеі. У гады Вялікай Айчыннай вайны крыж знік, і яго месцазнаходжанне невядома. У 90-я гады брэсцкім майстрам М.Кузьмічом была зроблена дакладная копія гэтага крыжа.

Тэма 9. Утварэнне і станаўленне Вялікага княства Літоўскага (2 палова 13 – 15 ст.)

1. Уплыў знешнепалітычнай сітуацыі на ўтварэнне дзяржавы у верхнім і сярэднім Панямонні. Сацыяльна-эканамічныя перадумовы фарміравання ВКЛ.

Па пісьмовых крыніцах Літва вядома з XI ст. Упершыню яна згадана пад 1009 г. у аналах нямецкага гарадка Кведлінбурга ў запісе пра місіянера Брунона, забітага на памежжы Літвы (Litua) і Русі. З 1040 г. пра Літву сталі паведамляць і ўсходнеславянскія летапісы. Этымалогія гэтай назвы дакладна не вызначана, аднак большасць літоўскіх гісторыкаў лічыць, што яна паходзіць ад невялікай рачулкі Летаўкі, што ўпадае ў Вяллю. Верагодна, спачатку Літвой

называлася зямля — тэрыторыя племянной групоўкі ўсходніх балтаў, якая знаходзілася на паўднёвым усходзе сучаснай Рэспублікі Літва і ў прылеглых раёнах Беларусі, паміж рэкамі Нёманам і Вяллёй, а потым назва перайшла на народ.

Па ўзроўні сацыяльнага развіцця балты адставалі ад славян, не мелі ні дзяржаўнай арганізацыі, ні монатэістычнай рэлігіі. Разам з латгаламі, земгаламі, лівамі ды іншымі прыбалтыйскімі плямёнамі старажытная Літва плаціла даніну Русі і, праўдападобна, нейкі час была залежнай непасрэдна ад Полацка. У XII ст. полацкія, віцебскія ды менскія князі выкарыстоўвалі літоўскія дружыны ў ваенных паходах у сваіх інтарэсах, абапіраліся на іх у міжусобнай барацьбе. Аднак з раздрабленнем і аслабленнем княстваў Беларусі ініцыятыва ваенных акцый пераходзіла да самой Літвы. З летапісаў і хронікі Генрыха Латыша відаць, што на пачатак XIII ст. Яна стала магутнай ваеннай сілай. З 1201 да 1236 г. літоўскія дружыны зрабілі 22 паходы на ўладанні Нямецкага ордэна, 4 — на Польшчу і 14 разоў хадзілі па здабычу на ўсходнеславянскія землі, у тым ліку на Полаччыну і Смаленшчыну. У адносінах да Літвы і нямецкі Ордэн Братоў па мячы, што ўзяўся актыўна каланізаваць Прыбалтыйскія землі, доўгі час займаў толькі абарончыя пазіцыі.

Як ужо згадвалася, на ўсходзе і поўдні Русі раздробленыя княствы спустошыла мангола–татарская арда на чале з ханам Батыем. Хоць тэрыторыя сучаснай Беларусі, як і Літвы, не зведала татарскага нашэсця, рэальная пагроза іх нападу існавала. Землі Беларусі і раней былі слаба звязаныя з цэнтрам Русі, а пасля падпарадкавання Кіева татарскаму хану сувязі яшчэ больш аслаблі. З іншага боку, Полаччына мела даўні вопыт цеснага кантакту з балцкімі плямёнамі. Паміж усходнімі латгаламі, літоўцамі і славянамі ў басейне Дзвіны і Нёмана ніколі не было выразнай этнічнай мяжы. Усходнеславянскае насельніцтва тут нярэдка жыло ўперамешку з балцкім. У княскім асяроддзі практыкаваліся міжэтнічныя шлюбы (напрыклад, князь Усевалад з Герцыке ажаніўся з дачкой літоўскага кунігаса Даўгерда), князі–русіны маглі змяняцца літоўцамі. Таму аб'яднанне раздробленых, аслабленых зямель у адну дзяржаву, па–першае, было выгадна не толькі літоўскім князям, але і суседнім усходнеславянскім гарадам і землям, а па–другое, абапіралася на набыты вопыт суіснавання.

Сярод іншых фактараў, якія садзейнічалі ўзнікненню новай дзяржавы, можна выдзеліць таксама:

1. Развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці, рамяства, гандлю, рост гарадоў. Усё гэта спрыяла ўзбагачэнню мясцовай эліты, якая і стала ініцыятарам утварэння новай дзяржавы, каб абараніць сваю маёмасць і статус. Акрамя таго, назапашаныя і новыя рэсурсы дазвалялі арганізаваць абарону і пашырэнне дзяржавы.

2. Паглыбленне сацыяльнай дыферэнцыяцыі грамадства, сацыяльных супярэчнасцей паміж саслоўямі. Сацыяльныя супярэчнасці і сілавыя спосабы іх вырашэння выклікалі патрэбу ў грамадскім парадку. У самім саслоўі феадалаў таксама абвастрылася барацьба за панаванне. Усё гэта выклікала грамадскую патрэбу ва ўтварэнні дзяржавы, якая б заканадаўча абмежавала грамадска небяспечныя разбуральныя працэсы, якія праяўляліся ў знішчэнні

людзей і матэрыяльных каштоўнасцей.

2. Міндоўг і яго палітыка.

У канцы XII - першай палове XIII стст. на змену цэнтрабежным тэндэнцыям прыходзіць імкненне да кансалідацыі і на беларускіх землях. З розных бакоў няўмольна насоўваліся крыжакі і мангола-татары. У пачатку XIII ст. Полацкае княства першае з ўсходнеславянскіх зямель прыняла на сябе цяжар барацьбы з крыжакамі - ордэнам Мечаносцаў. Услед за мечаносцамі ў Прыбалтыцы з'явіўся Тэўтонскі ордэн, які нейкі час "кватэраваў" у Трансільваніі. Тэўтонаў запрасіў мазавецкі князь Конрад, каб з іх дапамогай перамагчы суседзяў - ваяўнічых прусаў. Крыжакі, заваявалі Прусію, мясцовае насельніцтва часткова загінула, часткова перасялілася на тэрыторыю сучаснай Беларусі. З Усходу прыйшла іншая бяда: у 1236-1240 гг. татара-мангольскія орды разрабавалі Паўночна-Усходнюю Русь, спалілі Кіеў. Стэпавых драпежнікаў чакалі і на Беларусі. У такіх умовах адышлі на другі план міжусобіцы ўсходнеславянскіх князёў паміж сабою і іх сваркі з даўнімі суседзямі - літвой, якія жылі на захад ад Менска. У канкрэтна-гістарычных умовах таго часу склаўся своеасаблівы славянска-балцкі ваенна-палітычны саюз. Яго пачаткам быў саюз важнейшага горада Панямоння Навагародка з літоўскім правадыром Міндоўгам. Невядома, ці сам Міндоўг прыслаў да навагародцаў прапанову злучыць свае сілы, ці навагародскія ўплывовыя людзі паслалі запрашэнне на княжанне. Такім чынам, новая дзяржава ўтваралася ў Навагародку, куды ў сярэдзіне XIII ст. перамясціўся з Полацка цэнтр палітычнага жыцця Бела русі, а першую цагліну ў яе падмурак заклаў Міндоўг.

У 1246 г., відаць, у момант узыходжання на трон у Навагародку Міндоўг прыняў праваслаўе, што было ўмовай яго абрання на пасаду князя навагародскага. У 1248 г. ён аб'яднаў землі верхняга Панямоння вакол Навагародка: "поймана бъ вся земля Литовская", што можна прыняць за пачатак ВКЛ.

Галоўным праціўнікам на шляху пабудовы панямонс-кай дзяржавы ў 50-70-я гг. XIII ст. былі галіцка-валынс-кія князі, якія трымалі гэту тэрыторыю пад сваім кантро-лем і ўбачылі ў саюзе літвы з Навагародкам небяспеку для сваіх пазіцый у Панямонні. У 1252 г. вялікае войска на чале з Данілам Галіцкім, спустошыла "ўсю зямлю навагародскую", захапіла Гарадзен, пагражала задушыць пра-цэс утварэння новай дзяржавы ў самым пачатку. З гэтага першага цяжкага выпрабавання дзяржаву выратаваў дьшламатычны манеўр Міндоўга, якому ўдалося пера-цягнуць на свой бок Лівонскі ордэн згодай прыняць за-ходні варыянт хрысціянства. Падзякай Папы Рымскага за такі крок было прызнанне новай дзяржавы і карана-цыя Міндоўга ў Навагародку ў 1253 г. каралём Літвы. У 1254 г. быў падпісаны мірны дагавор з Данілам Галіцкім. Пад палітычны ўплыў ВКЛ увайшоў Полацк, куды на княжанне быў запрошаны пляменнік Міндоўга. Багатыя полацкія традыцыі дзяржаўнага і культурнага жыцця ака-залі значны ўплыў на фарміраванне унутранага ладу ВКЛ.

Забойства ў 1263 г. Міндоўга стала пачаткам унутранага крызісу ВКЛ, які працягваўся некалькі гадоў. Старэйшы сын Міндоўга Войшалк пасля ўпартай міжусобіцы пры падтрымцы навагародскай і пінскай дружын вярнуўся ў Навагародак, заняў бацькоўскі прастол і пачаў княжыць "ва ўсёй зямлі Літоўскай".

3. Уключэнне ў склад ВКЛ Полацкага, Віцебскага, Менскага княстваў і падняпроўскіх зямель.

На пачатку XIV ст. поспехам адзначалася **дзейнасць вялікага князя Віценя (1293-1316),** пры якім у складзе ВКЛ быў канчаткова замацаваны Полацк. Аб'яднанне адбылося на падставе "рада" - дагавора 1307 г., які гарантаваў палачанам аўтаномнасць зямлі, захаванне мясцовых законаў і суда, і са згоды полацкага баярства і багатага купецтва. Значным тэрытарыяльным прырашчэннем было далучэнне да ВКЛ Берасцейскай зямлі. Віцень увёў княжацкі герб і агульнадзяржаўную пячатку з выявай Пагоні. Пагоня з цягам часу стала гербам дынастыі вялікіх літоўскіх князёў, а з 1384 г. - дзяржаўным гербам ВКЛ.

Аб'яднаўчую палітыку славянскіх і балцкіх зямель актыўна прадоўжыў **вялікі князь Гедымін (1316-1341).** Ён правіў чвэрць стагоддзя і за гэты час далека пасунуў межы і ўплыў сваей дзяржавы на поўдзень і ўсход. Гедымін перанёс сталіцу дзяржавы ў Вільню, заснаваную на месцы паселішча 11-12 СТСТ. на Крывой (Лысай) тары. Ужо ў 1323 г. Вільня называлася ў Гедымінавых граматах "каралеўскім горадам", тэта значыць, сталіцай. Сябе ж ён называў "каралём Літвы і Русі".

Падчас праўлення Гедыміна да княства далучыліся Віцебская, Менская, Тураўская землі. Можна меркаваць, што гэты працэс насіў мірны характар. Ужо ў 1323 (1326) г. Менскае княства ўваходзіла ў склад дзяр-жавы. Менскі князь Васіль не быў выгнаны са сваёй зямлі, а па-ранейшаму правіў там. Як васал Гедыміна ён ездзіў у складзе літоўскага пасольства ў Ноўгарад Вялікі. Гедымінаў сын Альгерд пабраўся шлюбам з дачкой віцебскага князя Яраслава Марыяй і ў 1320 г., пасля смерці цесця, стаў спадкаёмцам Віцебскага княства.

З пачатку XIII ст. Тураўская зямля, пераадольваючы імкненне галіцка-валынскіх князёў падначаліць яе сабе, усё больш і больш звязвае свой лес з Наваградкам. Лагічным завяршэннем гэтага збліжэння з'явіўся ўваход турава-пінскіх абшараў у Вялікае княства.Трэба помніць, што Пінск яшчэ ў 1260-ыя гады адыграў важную ролю ва ўтварэнні ВКЛ. Пагроза апынуцца ў "воли татарскай", плаціць даніну Залатой Ардзе прадвызначылі іх рашэнне. Ужо ў першай палове XIV ст. у Тураўскай зямлі канчаткова ўсталявалася ўлада літоўскіх князёў. Пры Гедыміне тут кіраваў яго сын Нары-монт. У гэты час дзяржава Гедыміна набыла межы, якія амаль супадалі з сучаснымі межамі Беларусі. Увайшло ў склад ВКЛ таксама Падляшша (цяпер у складзе Польшчы), а ў 1340 г. — Валынь.

Такім чынам, пры Гедыміне большая частка сучасных беларускіх зямель апынулася ў складзе ВКЛ. Палітычная мудрасць гаспадара праявілася ў тым, што пры ўключэнні новых зямель ён гарантаваў ім аўтаномію і непадзельнасць

тэрыторыі, дэкларавaў "старыны не парушаць", захоўваў мясцовыя законы, недатыкальнасць правоў і ўладанняў феадалаў, мяшчан, духавенства, падсуднасць іх толькі сваім мясцовым судам, самастойнасць пры заключэнні гандлёвых пагадненняў.

За стагоддзе свайго імклівага росту, ад Міндоўга да Гедыміна, невялікае княства ў Панямонні далучыла суседнія тэрыторыі, заселеныя славянамі і балтамі, і пераўтварылася ў Вялікае княства Літоўскае і Рускае. Тэрмін "Літва" стасаваўся тады да верхняга і сярэдняга Панямоння, пад "Русею" разумелася сучаснае беларускае Падняпроўе і паўночная Украіна.

Пры Альгердзе Вялікае княства Літоўскае выступіла з палітычнай праграмай аб'яднання, збірання ўсіх рускіх зямель і абвясціла сябе пераемнікам духоўных і культурна-гістарычных традыцый старажытнай Русі. У 1358 г. ён адкрыта абвяшчае сваю палітычную праграму, заявіўшы паслам германскага імператара, што "ўся Русь павінна належаць Літве". У 1359 г., пасля смерці былога літоўскага саюзніка Івана Смаленскага, Альгерд адхапіў ад Смаленскага княства ледзь не палову - усё Пасожжа з Мсціславам. Хутка ён пасягне і на непасрэдныя ўладанні Залатой Арды - на ардынскія правінцыі на Украіне. Напачатку Альгерд лічыў, што зможа перамагчы Маскву і тым самым спыніць аб'яднаўчую палітыку, з якой яна, у параўнанні з ВКЛ, значна спазнілася. Ён прыступіў да тактыкі знясільвання Масквы праз падтрымку міжусобнай барацьбы з ёю, якую вялі рускія княствы.

Больш як удвая павялічыў князь тэрыторыю дзяржавы, пашырыў яе межы далёка на поўдзень і на ўсход. Ён далучыў да яе большую частку Украіны, землі на ўсходзе Белай Русі - на Дняпры і Сожы, частку заходніх зямель сучаснай Расіі.

Тэма 10. Эканамічны лад і сацыяльныя працэсы.

1. Формы феадальнага землеўладання, павіннасці сялян.

У феадальную эпоху галоўным сродкам вытворчасці і галоўным багаццем краіны была зямля. Манапольнае права ўласнасці на зямлю належала класу феадалаў. Асноўным прадукцыйным класам, які працаваў на зямлі і вырабляў прадукцыю, было сялянства. Яго права ўласнасці на зямлю абмяжоўвалася адносінамі землекарыстання. Першапачаткова вялікі князь літоўскі лічыўся вярхоўным ўласнікам усёй зямлі. Але з канца XIV ст. побач з велікакняжацкай стала прызнавацца і прыватная ўласнасць на зямлю: княжацкая, баярская, царкоўная. Разам з тым землі падзяляліся на дзяржаўныя і прыватныя. Аднак да XVI ст. (1588 г.) не існавала дакладнага падзелу на асабістыя ўладанні вялікага князя і іншыя дзяржаўныя землі. Прыватныя ж землі падзяляліся на свецкія і царкоўныя маёнткі.

Вышэй ужо казалася пра змены ў становішчы шляхты – асноўнай часткі класа феадалаў. Паступова змяняўся і прававы статус сялян. Яны страчвалі права

распараджацца зямлёй і станавіліся землекарыстальнікамі ў феадалаў. Разам з тым сяляне падзяляліся на катэгорыі ў адпаведнасці са сваім маёмасным і падатным становішчам, а таксама ў залежнасці ад той ступені асабістай свабоды, якой яны карысталіся.

Поўнай уласнасцю феадалаў была ***"чэлядзь нявольная"***, якая ўяўляла сабой катэгорыю хатніх рабоў. Чэлядзь не вяла сваёй уласнай гаспадаркі і жыла пры дварах феадалаў. Крыніцамі набору яе былі: купля-продаж, шлюб з нявольным чалавекам, нараджэнне ў няволі, пакаранне за злачынства. Акрамя працы на полі, чэлядзь выконвала і іншую працу ў гаспадарцы: апрацоўвала агароды, сады, пасвіла статкі, жанчыны ткалі лён і г.д.

Асноўную частку насельніцтва складалі ***"цяглыя"*** сяляне ўсіх найменняў. Яны мелі меншую ступень асабістай залежнасці ад ўладальніка. Акрамя таго, яны карысталіся зямельнымі надзеламі, рознымі па памеры і гаспадарчым складзе. Сялянскія надзелы складаліся звычайна з сядзібнай і агароднай зямлі, поля, сенажаці, часам – бабровых і рыбных ловен.

Для сялянскага землекарыстання была характэрна надзвычайная церазпалосіца ў размеркаванні надзелаў і сядзіб. Уся зямля, як тая, што знаходзілася ў карыстанні асобнай сям'і, ці "дыму", так і тая, якой карысталіся ўсе жыхары вёскі (лясы, балоты, азёры, рэкі і г.д.), лічылася маёмасцю складаных сялянскіх згуртаванняў – абшчын. Абшчына несла адказнасць за своечасовае выкананне сялянскіх павіннасцей, а пазней стала ўдзельнічаць і ў землеўпарадкаванні сялянства.

За карыстанне зямлёй сяляне былі абавязаны плаціць уласніку пэўную рэнту. Формы рэнты былі розныя і падзяляліся на тры асноўныя віды: адработачную, грашовую і прадуктовую.

Адработачная рэнта была адной з самых распаўсюджаных на тэрыторыі Беларусі, яна называлася паншчынай. Паншчыну селянін павінен быў адпрацаваць у гаспадарскім маёнтку. Часцей за ўсё гэта былі палявыя работы, на якіх селянін быў двойчы ў тыдзень разам з канём і сваім інвентаром: сякерай, касой, бараной. Цяглыя сяляне адбывалі паншчыну не толькі на полі. Некаторая частка сялян у якасці асноўнай павіннасці абкладалася чыншам. Такія сяляне называліся ***асаднымі***, ці чыншавымі. Чынш уяўляў сабой грашовую форму рэнты.

Разам з паншчынай і чыншам, якія былі асноўнымі павіннасцямі, сяляне выконвалі і дадатковыя: "талокі" – агульныя сязонныя гаспадарчыя работы, "гвалты", ці "згоны" – агульныя тэрміновыя работы, прывязаныя да пэўных выпадкаў: для рамонту дарог, гацей, для аблавы на звяроў, у выпадку стыхійных бедстваў і г.д.

К канцу XV ст. адным з асноўных відаў павіннасцей было дзякла – даніна прадуктамі. Яно было мядовым, бабровым, кунічным, збожжавым, піўным, сенным і г.д.

У залежнасці ад ступені асабістай свабоды цяглыя сяляне падзяляліся на ***"пахожых"*** і ***"непахожых"***. Спачатку ўсе сяляне мелі права пераходу ад аднаго ўладара да іншага, права сыходу з абшчыны. З развіццём інстытута феадальнага права на зямлю выяўлялася акрэсленая зацікаўленасць феадалаў у яго ліквідацыі.

Прывілей 1447 г. пачаў працэс юрыдычнага абгрунтавання прыгоннага права ў ВКЛ. Ён сцвярджаў, што сяляне, якія пражылі на зямлі феадала 10 год, станавіліся “непахожымі”, старажыхарамі. Адзнакай старажыхарства было і спадчыннае валоданне зямлёй селяніна.

Разам з “непахожымі” ў феадальных маёнтках жылі і сяляне “пахожыя”, ці вольныя. ***“Людзі служэбныя”***, ці “служкі”, складалі трэцюю, даволі шматлікую катэгорыю насельніцтва. Па сваім эканамічным становішчы яны былі блізкія да цяглавага сялянства. Яны таксама былі землекарыстальнікамі, што сядзелі з сем’ямі на сваіх вотчынах. Але ад сялян яны адрозніваліся сваёй асаблівай службай. Галоўнай іх павіннасцю была вайсковая служба. У мірны час яны раз’язджалі па справах княжацкай і феадальнай адміністрацыі.

2. Гарады і замкі, рамёствы і гандаль.

У XIV – XVI стст. назіраўся значны рост гарадоў і гарадскога насельніцтва. Гарады былі цэнтрамі рамяства і гандлю. Па памерах яны адрозніваліся, большая частка з іх былі невялікія. Гэта былі паселішчы з некалькіх вуліц з 200 – 300 дварамі. Найбольш буйнымі гарадамі на тэрыторыі Беларусі ў гэты час былі Вільня, Полацк, Магілёў, Віцебск, Мінск, Брэст, Гародня, Слуцк, Новагародак. Павялічваліся і паселішчы гарадскога тыпу – мястэчкі. Гарады і мястэчкі ўзнікалі як на дзяржаўных, так і на прыватнаўласніцкіх землях. Мястэчкі ў асноўным належалі феадалам. Каля 40% усіх гарадоў таксама былі прыватнаўласніцкімі. Гарады, што належалі феадалам, былі адміністрацыйнымі, гаспадарчымі і культурнымі цэнтрамі іх зямель. Жыхары гэтых гарадоў неслі феадальныя павіннасці на карысць свайго гаспадара.

Разам з прыватнаўласніцкімі былі і дзяржаўныя, ці велікакняжацкія гарады. Іх насельніцтва лічылася асабіста вольным. Аднак у XVI ст. у гэтых гарадах з’явіліся ўладанні свецкіх і духоўных феадалаў разам з залежным ад іх насельніцтвам. Прыватныя ўладанні ў велікакняжацкіх гарадах атрымалі назву “юрыдык”. Яны складалі адасобленую частку горада і не падпарадкоўваліся ўладзе гарадскога самакіравання. Да другой паловы XVI ст. магдэбургскае права атрымалі амаль усе буйнейшыя гарады Беларусі.

Гарадское самакіраванне мела свае асаблівасці. Галоўным органам адміністрацыйнага кіравання горада быў магістрат. Ён складаўся з Рады (выбарнага органа кіравання) і лавы (суда). На чале Рады стаяў войт, як правіла, прызначаны вялім князем. Члены Рады – райцы – выбіраліся з ліку заможных гараджан. Радзе належалі не толькі функцыі кіраванні жыццём горада, але і суда. Але ж судовыя функцыі яна выконвала толькі па маёмасных і грамадзянскіх справах. Крымінальныя справы разбіраліся лавай. Члены лавы – адмыслова пабудаваныя для гэтай мэты будынкі – ратушы.

Насельніцтва гарадоў фарміравалася за кошт беглых сялян, з рамеснікаў, перасяленых феадаламі ў горад, а таксама за кошт натуральнага прыросту. Сярод жыхароў гарадоў большасць (каля 80%) складалі беларусы. Акрамя таго тут жылі рускія, украінцы, літоўцы, палякі, яўрэі, немцы, татары. Большую

частку насельніцтва складалі рамеснікі і гандляры. Жыхары гарадоў і мястэчак называліся мяшчанамі.

Рамеснікі адной спецыяльнасці былі аб'яднаныя ў цэхі. Яны ствараліся з мэтай абароны грамадскіх, палітычных і маёмасных правоў рамеснікаў. Гэта былі своеасаблівыя манапалізаваныя структуры, якія дапамагалі сваім стваральнікам пазбегнуць канкурэнцыі, а таксама засцерагчы мясцовы гарадскі рынак ад вырабаў іншагародніх і іншаземных рамеснікаў. У час ваенных дзеянняў цэхі пераўтвараліся ў вайсковыя атрады.

У XIV – XVI стст. развіваўся ўнутраны і знешні гандаль на беларускіх землях. Таргі і кірмашы сталі атрыбутам гаспадарчай дзейнасці гарадоў і мястэчак. Таргі, як правіла, наладжваліся 1 – 2 разы на тыдзень. Кірмашы існавалі толькі ў буйных гарадах і ладзіліся раз у год. На знешні рынак Беларусь пастаўляла жыта, сала, лес, паташ, футра, скуры, вырабы рамеснікаў. Імпартавалася жалеза, медзь, волава, свінец, металічныя вырабы, фламандскае і англійскае сукно, галандскае палатно, віно, соль, селядцы, прадметы раскошы.

3. Сацыяльны склад насельніцтва.

У XV ст. грамадства стала выразна раздзяляцца на асобныя сацыяльна–палітычныя групы. Сацыяльнае расслаенне ў Полацкай зямлі добра прасочваецца на мясцовым актавым матэрыяле. Калі ў 1440-50-х г. полацкія граматы падпісвалі ўсе жыхары Полаччыны — «вси полочане», «полочане, вси люди добрые и малые», дык з 1460-х фігуравала ўжо некалькі асобных групаў: граматы падпісваліся «от бояр полоцких, от мещан и всего поспольства», а неўзабаве з'явіліся і сацыяльныя нізы — «чорныя людзі».

Баярамі ў Вялікім Княстве Літоўскім, падобна як раней на Русі, лічыліся ваеннаслужылыя людзі, якія за службу атрымлівалі ад вялікага князя зямельныя ўладанні. Мясцовае баярства ў беларускіх землях–вобласцях даволі рана аб'ядналася і ўзначаліла там земскае жыццё. Дзякуючы сістэме дзяржанняў і кармленняў, яно трымала ў сваіх руках усю мясцовую адміністрацыю. Напрыклад, у рэальным кіраванні Полаччынай удзельнічалі практычна ўсе буйныя баярскія роды зямлі. Да баярства далучаліся і ўдзельныя князі, якія пасля рэформаў Вітаўта хутка бяднелі, гублялі палітычную вагу і пераходзілі ў стан служылых. Падпарадкоўваючы сабе земскі соймік, баяры і князі праводзілі праз яго юрыдычныя і маёмасныя інтарэсы сваёй групы.

Баяры–шляхта першымі юрыдычна аформіліся ў асобны стан, а з яго выдзяленнем адасаблялася і мяшчанства, якое займала прамежкавае становішча паміж упрывілеяванымі грамадскімі вярхамі і масай сялянства. У мове афіцыйных дакументаў яшчэ доўга пераважала назва «баяры», а тэрмін «шляхта» (польскае szlachta паходзіць ад нямецкага Geschlecht) у шырокі ўжытак увайшоў толькі з другой чвэрці XVI ст. У Вялікім Княстве, як і ў Кароне, гэтае слова азначала нобіляў (лац. nobilis —высакародны, радавіты, знатны) — катэгорыю людзей з акрэсленымі прывілеямі, правамі і абавязкамі.

У залежнасці ад маёмаснага становішча і палітычнага значэння ў складзе шляхты выдзялялася некалькі стратаў. Верхнюю ўтварала арыстакратыя — вялікія паны і князі, прадстаўленыя нашчадкамі Рурыкавічаў і літоўскіх

дынастый. Яны валодалі вялікімі латыфундыямі і тысячамі падданых сялян, апрача агульнага шляхецкага права мелі яшчэ сваё асобнае, у прыватнасці, былі непадсудныя павятовай адміністрацыі, выступалі на вайну пад уласнай харугвай, выстаўляючы сваё войска з баяр і слуг. Вайсковы попіс 1528 г., у якім зафіксавана колькасць выстаўленых коняў, дазволіў даследчыкам вызначыць групу самых буйных землеўладальнікаў. Гэта Кезгайлы, Радзівілы, Гаштаўты, Алелькавічы, Астрожскія, Осцікавічы, Глябовічы, Забярэзінскія, Кішкі, Хадкевічы, Сангушкі і інш.

Яшчэ ніжэй знаходзілася самая дробная шляхта, якая не мела сваіх падданых. Такія шляхцічы валодалі мінімальным надзелам зямлі і за яго самі служылі буйному пану ці вялікаму князю.

Жыхары гарадоў складалі параўнальна невялікую частку насельніцтва Беларусі (згодна з падлікамі Зіновія Капыскага, прыкладна 15--16 % усяго люду), хоць іх грамадска–палітычная роля была непрапарцыйна большай за ўдзельную вагу. Паўстаўшы яшчэ ў XI—XII ст., многія гарады Беларусі мелі традыцыі высокаразвітага рамяства, актыўнага гандлю і ад пачатку ўтварэння Вялікага Княства займалі важныя пазіцыі ў палітычным жыцці краіны.

Насельніцтва буйных гарадоў Беларусі, асабліва заходніх, было поліэтнічным. Ужо ў XIII—XIV ст. у іх пасялілася шмат іншаземцаў, асабліва немцаў. У Полацку, напрыклад, існавала ўласная ганзейская факторыя, якая функцыявала да пачатку XVI ст. Нямецкія аб-
шчыны ў XIV ст. з’явіліся ў Горадні і Берасці. З часоў Вітаўта ў беларускіх гарадах сяліліся таксама палякі, яўрэі і татары. Жылі яны па сваім праве, трымаючыся абшчынамі.

Сялянства да сярэдзіны XV ст. У абсалютнай большасці яшчэ асабіста не залежала ад землеўладальнікаў. Яно складалася ў асноўным з цяглых людзей, якія мелі дзялку зямлі ды выконвалі за яе гаспадарчыя працы і плацілі аброк. На захадзе Беларусі за адзінку абкладання павіннасцямі бралася служба (звычайна два ці тры сялянскія дымы, аднак маглі быць службы і з большай колькасцю гаспадарак). У Падняпроўі і Падзвінні яшчэ існавалі воласці, насельніцтва якіх выконвала агульныя павіннасці. У гэтых землях да XVII ст. дамінавальнай формай гаспадаркі заставаліся промыслы, і сяляне адбывалі павіннасць данінай, а не цяглам. Сярод даннікаў былі бортнікі, баброўнікі, асочнікі, лаўцы, сакольнікі, руднікі, рыбаловы і г.д. За карыстанне ляснымі абшарамі падняпроўскія сяляне плацілі дзяржаве даніну бабрамі, куніцамі, мёдам і нават срэбрам.

У юрыдычным плане сярод сельскага насельніцтва адрозніваліся людзі пахожыя (свабодныя), непахожыя («отчычы»,«людзі отчызные»), закупы (часова несвабодныя) і чэлядзь нявольная, парабкі (рабы). «Воляй» сялян было права вольнага пераходу да іншага гаспадара, калі павіннасці рабіліся надта цяжкімі. Землеўладальнікі ж імкнуліся пазбавіць іх такога права. Для гэтага яны выкарыстоўвалі прынцып даўнасці — працягласць пражывання падданых у адным маёнтку. Сялян, якія на працягу доўгага часу жылі ў адным уладанні, пан называў «звечнымі», «айчыстымі» і не адпускаў са сваёй зямлі.

Існаваў яшчэ вышэйшы слой сельскага насельніцтва, які ўтвараліслужылыя сяляне — слугі путныя, панцырныя, шчытныя, конныя. Яны мелі

асабістую вольнасць, неслі ваенную службу, выконвалі розныя даручэнні ўладаў, але і ад цягла не вызваляліся, якое, праўда, было лягчэйшае, чым у простых сялян. Але гэтая катэгорыя сельскага насельніцтва была параўнальна малалікая. Звычайна з іх ліку папаўняліся шэрагі шляхты пасля спусташальных войнаў.

У цэлым да канца XVI ст. сфармаваўся адносна адзіны стан прыгонных, у які ўвайшлі былыя вольныя (пахожыя) сяляне і чэлядзь. Іх сацыяльны статус замацоўваўся юрыдычна, права на іх эксплуатацыю было аформлена заканадаўча. Так прыгон стаў галоўным сродкам прымусу сялян працаваць на пана–землеўладальніка.

Тэма 11. Унутраная і знешняя палітыка і войны Вялікага княства Літоўскага.

1. Барацьба з крыжацкай агрэсіяй, Грунвальдская бітва. Унутраная палітыка ВКЛ.

Для абароны княства ад уварванняў крыжакоў Гедымін узвёў першакласныя па тым часе крэпасці ў Троках, Вільні, Меднікаx, Лідзе, Крэве. З усіх канцоў дзяржавы збіралі майстроў-будаўнікоў, княжацкія цівуны зганялі просты люд насыпаць валы, капаць рвы, цягаць камяні, высякаць лес. Праз стагоддзі захавалася памяць аб гэтых грандыёзных будоўлях.

У барацьбе супраць Ордэна Гедымін меў выдатнага памочніка — князя Давыда Гарадзенскага, які фактычна быў намеснікам у Гародні і галоўным ваяводам княства. Яго ўзвышэнне пачалося яшчэ пры Віцені, але асабліва ярка палкаводчы талент праявіўся на пачатку праўлення Гедыміна. Практычна ніводная перамога над крыжакамі як у абарончых, так і ў наступальных аперацыях не абыходзілася без удзелу Давыда. Гедымін нават аддаў за яго сваю дачку.

Узімку 1341—1342 года войска ВКЛ захапіла крыжацкую крэпасць Баербург. Праўда, платай за гэта было жыццё вялікага князя. З канца 1330-ых гадоў на ўзбраенні ордэнскіх замкаў з'явілася агнястрэльная зброя. Пакуль што яна выглядае дзівам —большасць ваякаў толькі прыглядаецца да яе, спадзеючыся на старыя добрыя самастрэлы, мячы і дзіды. Літоўскаму князю давялося пазнаёміцца з яе эфектыўнасцю на ўласным вопыце. Каменнае ядро трапіла ў Гедыміна, які знаходзіўся у шэрагах вояў. Паводле іншых звестак, Гедыміна атруцілі.

Доўгі час даволі паспяхова супраць крыжакоў дзейнічаў Кейстут. На кожны паход крыжакоў ён адказваў спусташальнымі ўварваннямі *ў* Прусію. Штогод, а то і па некалькі разоў на год, нападалі яны на ВКЛ, спусташалі землі Панямоння і Падзвіння, Жамойці. Неаднаразова яны абрушваліся і на Гарадзен. На працягу 1345—1377 гг. прускія і лівонскія крыжакі зрабілі сюды каля 100 рэйдаў. У адказ Кейстут і Альгерд з беларускімі, смаленскімі і валынскімі палкамі некалькі разоў нападалі на Лівонію, даходзілі аж да Юр'ева (сучасны Тарту, Эстонія), змаглі разбіць нямецкую крэпасць Каралевец

(Кенігс-берг). У 1345—1382 гг. літоўскае войска зрабіла 30 паходаў на Прусію і 10 - ў Лівонію.

Смерць вялікага князя Альгерда (1377) выклікала вос трую і працяглую дынастычную барацьбу ў Вялікім княстве Літоўскім, якая нярэдка перарастала ў ваенныя сутыкненні паміж прэтэндэнтамі на трон. У змаганне актыўна ўмешваліся і замежныя дзяржавы, у першую чаргу Тэўтонскі ордэн.

Альгерд сваім пераемнікам прызначыў сына ад другога шлюбу - Ягайлу. Гэта стала прычынай незадаволенасці іншых сыноў Альгерда і суродзічаў Брат Альгерда Кейстут на кароткі час 1381-1382 гг. захапіў Вільню і стаў вялікім князем літоўскім. Разгарнулася барацьба паміж Кейстутам і Ягайлам, апошні абапіраўся на дапамогу крыжакоў. Пераможцам з гэтай вайны выйшаў Ягайла. Кейстут быў вераломна захоплены ў палон і на загад пляменніка задушаны. Аднак барацьбу з Ягайлам працягнуў сын Кейстута - Вітаўт.

Становішча Ягайлы было нетрывалае. У гэтай сітуацыі яму былі прапанаваны два варыянты шлюбу: з дачкой вялі кага князя маскоўскага Дзмітрыя Данскога і з польскай каралевай Ядвігай. Фактычна гаворка ішла пра выбар гістарычнага шляху, па якім пойдзе Вялікае княства Літоўскае, пра яго ўсходнюю ці заходнюю палітычную арыентацыю. Ягайла абраў другі шлях.

14 жніўня 1385 г. у замку Крэва прадстаўнікі Польскага каралеўства і Ягайла з некалькімі братамі заключылі міждзяржаўнае пагадненне. Згодна з яе ўмовамі, Ягайла абяцаў хрысціцца паводле каталіцкага абраду разам з усімі сваімі братамі і хрысціць падданых, "свае землі літоўскія і рускія назаўжды далучыць да Кароны Каралеўства Польскага", перадаць усе свае скарбы на патрэбы злучаных дзяржаў, заплаціць велізарную суму 200 тыс. фларэнаў бы лому жаніху Ядвігі аўстрыйскаму прынцу Вільгельму. Наўзамен Ягайлу быў паабяцаны шлюб з Ядвігай і польская карона - як мужу каралевы. У 1386 г. пачалася рэалізацыя умоў Крэўскага пагаднення. Гэтаму злучэнню была накана-вана працяглая і няпростая гісторыя. 3 цягам часу мяняліся яго ўмовы, але ў цэлым яно аказалася выгадным і перспек-тыўным для абодвух бакоў, пріснаваўшы 400 гадоў.

У Вялікім княстве Літоўскім было многа незадаволеных Крэўскай дамовай. Літоўская знаць, хоць і прыняла каталіцкі хрост, але не жадала дзяліцца ўладай і трапляць у палітычную залежнасць ад польскіх паноў. Праваслаўныя баяліся экспансіі каталіцкага касцёла. І практычна ўсім не падабалася дэкларацыя ў крэўскім акце страта дзяржаўнай незалежнасці ВКЛ. Таму вельмі хутка тут узнікла магутная апазіцыя Ягайлу. Яе ўзначаліў Вітаўт. Разам з крыжакамі ён распачаў барацьбу супраць свайго стрыечнага брата. 3 кожным месяцам пазіцыі Вітаўта ў ВКЛ мацнелі, папулярнасць расла, ён атрымліваў адну перамогу за другой. Некаторыя землі, напрыклад Полацкая, добраахвотна прынялі яго ўладу. У выніку Ягайла быў вымушаны пайсці на ўступкі Вітаўту. У 1392 г. паміж імі было заключана Востраўскае пагадненне, паводле якога Вітаўт атрымаў пад сваю ўладу Вялікае княства Літоўскае. Тым не менш яшчэ доўгі час ён усё ж такі прызнаваў вярхоўную ўладу польскага караля Уладзіслава II Ягайлы, як "вярхоўнага" князя ВКЛ.

Самым небяспечным ворагам ВКЛ быў Тэўтонскі ор-дэн, які рэгулярна здзяйсняў напады на літоўскія і заходне-беларускія землі. У 90-я гг. XIV ст. іх аб'ектамі асабліва час та станавіліся Гародня, Ліда, Наваградак. Даходзілі немцы

і да сталіцы - Вільні. Такім жа небяспечным ворагам быў Ордэн і для Польшчы. Супольны праціўнік, а таксама Крэў-скае пагадненне рабілі Вялікае княства Літоўскае і Каралеў-ства Польскае натуральнымі саюзнікамі.

У 1409 г. пачалася так званая “Вялікая вайна” (1409 – 1411 гг.) паміж Польшчай і ВКЛ, з аднаго боку, і Тэўтонскім ордэнам, з другога. Менавіта антыкрыжацкі польска-літоўскі саюз дазволіў 15 ліпеня 1410 г. нанесці сакрушальнае паражэнне Тэўтонскаму ордэну ў Грунвальдскай бітве і спыніць крыжацкую экспансію на славянскія землі.

Грунвальд быў адной з найбуйнейшых бітваў еўрапейскага сярэднявечча. У ім з абодвух бакоў удзельнічала некалькі дзясяткаў тысяч чалавек, значная частка якіх загінула. У арміі саюзнікаў было 90 харугваў: 50 з Польшчы і 40 з ВКЛ. 22 харугвы ВКЛ былі выстаўлены беларускімі землямі. 30 з 40 палкоў ВКЛ неслі на сваіх сцягах герб "Пагоня".

Адным з галоўных накірункаў унутрыпалітычнай дзейнасці Вітаўта было скасаванне буйных удзельных княстваў у ВКЛ. Ён жорстка падаўляў супраціў князёў і ператвараў удзелы ў намесніцтвы, кіраўнікоў якіх прызначаў сам. Так былі ліквідаваны Віцебскае, Кіеўскае, Чарнігаўскае і іншыя княствы.

2. Адносіны Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай.

Альгерд праводзіў прадуманую і паслядоўную "ўсходнюю" палітыку. З мэтай умацавання свайго ўплыву на ўсходзе ў 1349 г. аўдавелы князь узяў сабе ў жонкі цвярскую князёўну Ульяну. Ён падтрымліваў цесны саюз з Цверру, дапамагаў ёй у барацьбе з Масквой. Альгерд аб'яднаў пад сваёй уладай большую частку гістарычнай Кіеўскай Русі і рэальна прэтэндаваў на завяршэнне гэтага працэсу на ўсходзе. Здавалася б, лідэрства на Русі назаўсёды перайшло да Гедымінавічаў. У саюзе з Цверру Альгерд спрабуе замацаваць свой поспех у "вотчыне" асноўнага саперніка.

Убачыўшы рэальную пагрозу сваім пазіцыям у Паўночна-Усходняй Русі, узмацнелая Масква імкнецца перашкодзіць пашырэнню літоўскага уплыву. Не ў стане ўступіць у адкрытую барацьбу з самім Вялікім княствам Літоўскім, яна паспрабавала аслабіць саюзніка Альгерда — Цвер. Менавіта ў падтрымку Цверы Альгерд у 1368 г. арганізуе першы паход на Маскву. Ён разбіў маскоўскае войска на Строшьше, узяў шмат палонных і некалькі дзён стаяў аблогай ля Масквы.

Паходы на Маскву - "літоўшчыны", як там празвалі гэтыя уварванні, — былі паўтораны ў 1370 і 1372 гг. У іх удзельнічалі таксама Кейстут і яго сын Вітаўт, смаленскі князь. Аднак, нягледзячы на знешні эфект, задума падчыніць Маскву не ўдалася.

Алгерд вымушаны быў прызнаць вотчынныя правы нашчадкаў Каліты на Уладзімірскае княжанне, г.зн. падзяліў з імі Русь. Грандыёзны намер Альгерда адраджэння Старажытнарускай дзяржавы сутыкнуўся з супраціўленнем ўсходніх княстваў, аб'яднаных вакол Масквы. Але спробы маскоўскіх вялікіх князёў перашкодзіць аб'яднанню беларускіх зямель былі сарваны.

З канца XV ст. найбольш прыярытэтным напрамкам знешняй палітыкі ВКЛ стаў усходні, на якім разгортваліся падзеі, што склалі асноўны змест канфлікту з Вялікім княствам Маскоўкім. К канцу XV ст. яно ўзмацнілася і, падбіраючы астатнія рускія землі, у сутык падышло да межаў ВКЛ. Пачала нарастаць канфрантацыя паміж Вільняй і Масквой як двума цэнтрамі аб'яднання старажытнарускіх зямель. Масква прад'яўляла прэтэнзіі не толькі на тыя рускія княствы, якія пакуль яшчэ заставаліся самастойнымі, але і на землі ВКЛ, населеныя праваслаўным, рускім па тагачаснай тэрміналогіі, насельніцтвам. Літоўская ж дыпламатыя імкнулася ўбіць клін у аб'яднаўчыя працэсы ў Маскоўскай дзяржаве і прадтрымлівала апошнія самастойныя княствы Русі. Акрамя таго, пачынаючы з канца XV ст., маскоўскі вялікі князь Іван III абвясціў сябе абаронцам інтарэсаў праваслаўнага насельніцтва ВКЛ, умешваючыся тым самым ва ўнутраныя справы заходняга суседа. Сапраўды праваслаўе ў ВКЛ было не пануючым, а цярпімым веравызнаннем, але цярпімасць гэта была дастаткова шырокай і адкрытага гвалту над праваслаўнымі ў гэты перыяд тут не было. Таму заявы Івана III пра ўціск на праваслаўных у ВКЛ належыць прызнаць надуманымі, закліканымі апраўдаць агрэсію супраць заходняга суседа.

З 1487 да 1492 г. на памежжы фактычна ішла неаб'яўленая вайна, якая суправаджалася ад'ездамі т. зв. "украінных" князёў на службу ў Маскву. А з 1492 па 1494 г. доўжылася ўжо першая маскоўска-літоўская вайна**.** У выніку яе да Маскоўскай дзяржавы адышлі Вяземскае княства і землі ў вярхоўях Акі. ВКЛ адмовілася ад прэтэнзій на Пскоў, Ноўгарад, Цвер. Мірная дамова 1494 г. была замацавана шлюбам вялікага князя Аляксандра з Аленай, дачкой вялікага князя маскоўскага Івана III. У 1500 г. пачалася чарговая маскоўска-літоўская вайна, якая доўжылася да 1503 г.**,** калі было абвешчана 6-гадовае перамір'е і вызначаны новыя межы паміж дзяржавамі. Да Масквы адышла прыкладна трэцяя частка тэрыторыі ВКЛ з 19 буйнымі гарадамі, у т. л. Гомелем, Бранскам, Чарнігавам, Ноўгарад-Северскім, Старадубам і г.д.

Пры Жыгімонце Старым войны з Маскоўскай дзяржавай аднавіліся. Вайна 1507 – 1508 гг. нікому не прынесла поспеху (ВКЛ вярнула толькі Любеч і пяць смаленскіх валасцей) і скончылася т. зв. "вечным мірам", які доўжыўся толькі 4 гады. У 1512 г. вайна аднавілася. Яна цягнулася 10 гадоў. У ходзе яе 31 ліпеня 1514 г. быў страчаны Смаленск, а 8 верасня 1514 г. адбылася знакамітая бітва пад Оршай, у якой гетман ВКЛ князь Канстанцін Астрожскі дашчэнту разбіў больш чым удвая пераважаючае маскоўскае войска. У 1522 г. было падпісана 5-гадовае перамір'е, па ўмовах якога Смаленская зямля засталася за Масквой, шматлікі "маскоўскі палон" – за ВКЛ. Але мір так і не быў падпісаны з-за спрэчак наконт Смаленска. Таму перамір'е было прадоўжана ў 1527 і 1532 гг. У 1534 г. пачалася чарговая вайна, якая доўжылася да 1537 г., калі было падпісана 5-гадовае перамір'е, якое затым працягвалася ў 1542 і 1548 гг. (да 1562 г.). У выніку яе ВКЛ вярнула Гомель, аднак страціла шэраг тэрыторый на поўначы. У сярэдзіне XVI ст. ВКЛ сустрэлася з дамаганнямі Івана IV ужо на сучасныя беларускія і ўкраінскія землі. Гэта сведчыла аб пагрозе існаванню ВКЛ. З 1559 г. ВКЛ аказалася

ўцягнутым у чарговы ваенны канфлікт, які меў самыя страшныя наступствы для яго далейшага лёсу.

3. Арганізацыя войска ВКЛ і барацьба супраць крымскіх татар.

Войска ВКЛ складалася з вайсковых фарміраванняў усіх зямель дзяржавы. Станаўленне вайсковай арганізацыі ВКЛ адбывалася ў некалькі этапаў. Да канца 14 ст. акрамя дружын з літоўскіх і славянскіх зямель дзяржавы, шырока выкарыстоўвалася ўсеагульнае народнае апалчэнне - пагоня, якая была найбольш архаічнай формай вайсковай мабілізацыі. Як сведчыць прывілей Ягайлы 1387, у пагоні, у выпадку ўварвання непрыяцеля ў межы дзяржавы, прымала ўдзел усё мужчынскае насельніцтва, здольнае насіць зброю. Адначасова прывілей упамінае прафесійных дружыннікаў. У далейшым яны аформіліся ў саслоўе рыцарства, якое ў 15-16 ст. стала асноўнай ваеннай сілай ВКЛ. Гал. формай вайсковай мабілізацыі ў гэты час становіцца феад. апалчэнне (паспалітае рушэнне), куды землеўладальнікі выстаўлялі ўзброеных воінаў.

Да 16 ст. не існавала сталай нормы выстаўляемага атрада ў залежнасці ад велічыні зямельных уладанняў і колькасці сялян. Нюансы службы агаворваліся персанальнымі дамовамі паміж сеньёрам і васалам. Да сярэдзіны 15 ст. асн. катэгорыямі ваяроў у паспалітым рушэнні былі конныя капійнікі і стральцы (лучнікі і арбалетчыкі). З канца 14 ст. шырока выкарыстоўваліся татары. Найдрабнейшай арганізацыйна-тактычнай адзінкай войска было «кап'ё», вядомае з 16 ст. як почат. У яго ўваходзілі (у ідэале) 1 капійнік і 2 стральцы. «Коп'і» злучаліся ў харугвы, якія арганізоўваліся паводле тэр. прынцыпу ці выводзіліся буйнейшымі феадаламі. Колькасны склад харугваў залежаў ад мабілізацыйных магчымасцей рэгіёнаў, хоць здараліся выпадкі яго ўнармавання. Так, напярэдадні грунвальдскай выправы Вітаўт загадаў выставіць з кожнай тэрытарыяльнай адзінкі ў Жамойці па 300 чал. У час бою харугвы дзейнічалі звужанымі наперад калонамі - клінамі. Наперадзе калоны размяшчаліся капійнікі, за імі - стральцы, якія стралялі навесам паверх галоў пярэдніхліній.

З сярэдзіны 15 ст. з-за большых патрабаванняў да засцерагальнага ўзбраення з'явілася новая градацыя воінаў: даспешныя (капійнікі), панцырныя (стральцы) і шчытныя. З пач. 16 ст. нормы вайсковай службы рэгламентаваліся агульнадзяржаўнымі актамі (пастанова Новагародскага сойма 1502, Статуты ВКЛ 1529,1566,1588 і інш.). Адначасова ішло аблягчэнне кавалерыі за кошт змяншэння значэння цяжкаўзброеных капійнікаў. Статут ВКЛ 1529 патрабаваў выстаўляць аднаго паўнавартаснага вершніка (з панцырам, прылбіцай, кордам, павезай і кап'ём) ад 8 сял. службаў. У рэальнасці патрабавалі толькі мінімум засцерагальнага рыштунку. У залежнасці ад наступальнага ўзбраення вылучаліся гусоры, узброеныя кап'ём і шчытом,газот (лук, часам у спалучэнні з рагацінай), кашубы (рагаціна ці ошчап) і бруншвікі (агнястрэльная зброя). Паны, якія не валодалі 8 службамі, неслі службу паводле сваёй магчымасці, што прыводзіла да надзвычайнай стракатасці ўзбраення войска.

Паводле пастаноў соймаў 1563 і 1567, у склад паспалітага рушэння ўводзілася пяхота - на 2 коннікаў па 1 драбу з ручніцай і мячом ці з рагацінай і сякерай. Зборам ваяводскіх і павятовых харугваў займаліся харужыя, кашталяны і маршалкі. Пасля ўліку (гл. Попісы войска) войска пераходзіла пад уладу гетманаў (вядомы з 15 ст.). Паспалітае рушэнне праіснавала да канца 18 ст. Аднак ужо ў канцы 15 - пач. 16 ст. яно пачало траціць свае баявыя якасці. Гэта было звязана з ростам зацікаўленасці шляхты ў вядзенні ўласнай гаспадаркі і недастатковым пакараннем за ўхіленне ад вайсковай службы.

Паступова павялічвалася роля наёмнага войска, якое да канца 16 ст. стала асноўнай ваеннай сілай. Першапачаткова жаўнераў наймалі за мяжой, пераважна ў дзяржавах ягелонскай кааліцыі - у Польшчы, Венгрыі і Чэхіі, а ў далейшым - і з ураджэнцаў ВКЛ. Наёмнікі арганізоўваліся ў роты на чале з ротмістрамі. Конныя роты падзяляліся на почты, якія ўзначальваліся таварышамі, пешыя - на дзесяткі, якімі камандавалі дзесятнікі. Аснову пешых рот складалі стральцы, забяспечаныя арбалетамі (да пач. 16 ст.) ці агнястрэльнай зброяй. Напярадзе стральцоў размяшчаліся павезнікі з вялікімі шчытамі ці капійнікі, забяспечаныя пласцінавымі даспехамі (часам тыя і другія). Ужо ў 16 ст. наёмнікі выкарыстоўвалі разнастайныя функцыі - змагаліся ў адкрытым полі, неслі гарнізонную службу, прыкрывалі адбудову замкаў, выконвалі інжынерна-сапёрныя работы, паліцэйскія функцыі. Важнае месца займалі пушкары, якія абслугоўвалі артылерыю, вядомую ў ВКЛ з 1382, выраблялі порах, рамантавалі зброю.

У другой палове XV ст. ВКЛ на ўсходзе і поўдні апынулася ў акружэнні варожых дзяржаў. На паўднёвых межах з'явіўся моцны і небяспечны вораг – Крымскае ханства, што ўтварылася ў выніку распаду калісьці магутнай Залатой Арды. З 1475 г. ханства трапіла ў васальную залежнасць ад Турэцкай Порты і ажыццяўляла палітыку султанаў. Крымская знаць жыла за кошт рабаўніцтва суседніх земляў. У апошняй чвэрці XV ст. ханства становіцца саюзнікам Маскоўскай дзяржавы. У 1480 г. паміж Менглі-Гірэем і Іванам III было заключана пагадненне аб сумеснай барацьбе з ВКЛ. Крымскі валадар абяцаў Маскве ваяваць землі вялікага князя літоўскага Казіміра.

Галоўным аб'ектам спусташальных набегаў хан абраў багатыя, урадлівыя землі паўночнага суседа. Апроч прагі нажывы, яго падштурхоўвала на тое і палітычная прычына – абавязацельства перад маскоўскім саюзнікам.

Смерчам праносілася татарская конніца па ўкраінскіх і беларускіх землях, а абраная тактыка – пазбягаць сечы, рабаваць і хутка бегчы прэч – была беспамылковай. Асабліва пакутавала ад гэтага Украіна. З канца XV ст. крымскія татары пачынаюць пустошыць землі Беларусі. З 1500 да 1569 |г. яны зрабілі 45 наездаў. Дзесяткі тысяч чалавек выводзілі яны ў палон для продажу ў азіяцкія краіны. Асаблівую каштоўнасць уяўлялі для татараў маладыя і дужыя людзі, а таксама дзяўчынкі, якіх яны потым прадавалі за вялікія грошы на нявольніцкіх рынках Крыма і Турцыі.

Падчас вайны 1500–1503 гг. Іван III патрабаваў ад Менглі-Гірэя зрабіць напад на ВКЛ, у напрамку Турава – Пінска – Менска, каб паставіць яго пад двайны ўдар. Карыстаючыся тым, што асноўныя сілы княства ваявалі з Масквою, крымчакі пастаянна пустошылі беларускія землі. У 1500 г. яны

спалілі ваколіцы Бярэсця, пасад Камянца. Восенню 1502 г., у самы разгар баёў пад Смаленскам, пераправіўшыся цераз Прыпяць, яны ваявалі землі каля

Тэма 4. Этнічныя працэсы і культура беларускіх зямель ў XIV-XV ст.

1. Этнічныя працэсы.
2. Дойлідства і выяўленчае мастацтва.
3. Рукапісная кніга. Арыгінальная і перакладная літаратура.

Турава, Пінска, Слуцка. Слуцкі князь Сямён Міхайлавіч Алелькавіч перахапіў крымчакаў у шасці мілях ад Бабруйска і ўшчэнт разбіў на рацэ Уша, вызваліўшы ўсіх палонных.

У наступным, 1503 г., 6-тысячны татарскі атрад, узначалены сынам хана Біці-Гірэем, прыйшоў пад Слуцк і стаў там кошам (лагерам). Загоны спустошылі ваколіцы Капыля і Нясвіжа, спалілі Клецкі замак. Даведаўшыся пра падыход вялікага войска, яны павярнулі назад і са значным палонам вярнуліся ў Крым. 3-тысячны татарскі атрад дайшоў амаль да Навагародка, але вярнуцца ў Крым яму на гэты раз не ўдалося. Літвінскае войска на чале з Сямёнам Алелькавічам, Станіславам Кішкам, Юрыем Неміровічам і Альбрэхтам Гаштольдам дагнала крымчакаў і разбіла іх каля Давыд-Гарадка.

Інтэнсіўнасць нападаў некалькі аслабла пасля іх разгрому войскам ВКЛ на чале з князем Міхаілам Глінскім пад Клецкам у жніўні 1506 г. Наступнае буйнае паражэнне крымчакам было нанесена ў 1527 г. у бітве пад Каневам. Пазней іх набегі спыняліся наладжанай сістэма аховы паўднёвых рубяжоў дзяржавы, у т. л. стварэннем атрадаў казакаў на Украіне.

Тэма 12. Этнічныя працэсы і культура беларускіх зямель ў XIV-XV ст.

1. Этнічныя працэсы.

Народнасць – форма моўнай, тэрытарыяльнай, эканамічнай і культурнай супольнасці людзей, якая ўтвараецца гістарычна ў выніку кансалідацыі, зліцця плямён і папярэднічае ўтварэнню нацыі. Яна ўласціва рабаўладальніцкаму і феадальнаму ладу. Асноўнымі прыкметамі народнасці з’яўляюцца: адносная агульнасць мовы, агульнасць тэрыторыі, культуры, пэўныя гаспадарчыя сувязі, этнічная самасвядомасць і саманазва.

Працэс фарміравання беларускай народнасці заняў дастаткова працяглы перыяд і адбываўся пад уздзеяннем геаграфічна-кліматычных, сацыяльна-эканамічных, палітычных, царкоўна-рэлігійных фактараў, а таксама агульнаеўрапейскіх этнічных тэндэнцый.

Стымулюючым фактарам паскарэння кансалідацыі беларускага этнасу было ўтварэнне ВКЛ, у межах якога былі створаны неабходныя палітычныя

ўмовы ўтварэння беларускай народнасці. У межах ВКЛ была створана адзіная сістэма дзяржаўнага кіравання, уведзена адзінае заканадаўства, што сведчыла аб складванні сістэмы палітыка-прававой цэнтралізацыі ў краіне, узмацненні палітычных сувязей паміж яе рознымі тэрыторыямі.

Аднак палітычнае аб'яднанне не знішчыла цалкам лакальнай аўтаномнасці асобных зямель. Наяўнасць жа ў грамадска-палітычным жыцці ВКЛ як аб'яднальных, так і сепаратысцкіх тэндэнцый ускладняла працэс фарміравання беларускай народнасці.

Эканамічнай асновай этнаўтваральных працэсаў стала далейшае развіццё сельскай гаспадаркі, удасканаленне рамяства. Узрастала роля буйных гарадоў Беларусі як цэнтраў рэгіянальнага і транзітнага гандлю, сродкаў умацавання тэрытарыяльна-эканамічных сувязей беларускіх зямель. Паступова ў ВКЛ усталявалася адзіная грашовая сістэма, ішоў працэс усталявання гандлёва-вымяральных стандартаў. Развіццё таварна-грашовых адносін і ўнутраных гаспадарчых сувязей садзейнічала інтэнсіфікацыі інтэграцыйных этнічных працэсаў у межах дзяржавы. Аднак працэсы гэтыя на ўзроўні дзяржавы стрымліваліся існаваннем склаўшыхся рэгіянальных, лакальных рынкаў.

Што датычыць сацыяльных фактараў, то далейшае развіццё феадальных адносін, паступовае ўсталяванне прыгоннага права садзейнічалі кансалідацыі шматлікіх катэгорый насельніцтва зямель Беларусі ў сацыяльныя групы з агульнымі правамі і абавязкамі для кожнай з іх. Сфарміраваліся чатыры асноўных саслоўі: шляхта, духавенства, мешчанства і сялянства. Гэты працэс садзейнічаў усталяванню больш шырокіх сувязей у межах кожнага саслоўя і паміж імі.

Пэўную этнакансалідуючую ролю адыгрываў канфесійны фактар. Канфесійныя антагантзмы актывізавалі складанне і ўмацаванне розных форм самасвядомасці насельніцтва. Прыкмета веры станавілася своеасаблівай прыкметай народа, а барацьба за веру з'яўлялася часткай барацьбы за яго самабытнасць.

Сукупнасць дзейнасці этнаўтваральных фактараў спрыяла фарміраванню беларускай народнасці і такіх яе агульных прыкмет, як этнічная тэрыторыя, адносная агульнасць мовы, своеасаблівая матэрыяльная і духоўная культура, этнічная самасвядомасць і саманазва.

Ядро этнічнай тэрыторыі беларускай народнасці ў асноўных рысах адпавядала арэалам рассялення яе старажытных продкаў – крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў. Тут адбыліся значныя змены ў мове ўсходнеславянскага насельніцтва. На працягу XIV – XV стст. у ёй развіваліся такія спецыфічныя рысы беларускай гаворкі, як цвёрдае "р", "дзеканне" і "цеканне", "аканне" і "яканне", прыстаўныя гукі на пачатку слова. Фарміравалася гутарковая мова як сродак зносін паміж людзьмі. Матэрыяльная і духоўная культура беларускага этнасу базіравалася на шэрагу элементаў, атрыманых у спадчыну са старажытнарускага часу. Другой яе складовай часткай былі новаўводзіны, якія закранулі сямейны і абшчынны побыт, навуку і асвету, фальклор, звычаі і абрады, мастацтва. Трэцяй часткай комплексу культуры былі элементы, запазычаныя ў суседніх народаў.

У XV – XVI стст. на тэрыторыі Беларусі з’явіўся шэраг новых тыпаў пасяленняў: мястэчка, фальварак, засценак, ваколіца. Змянілася планіроўка вёсак ў Заходняй і Цэнтральнай Беларусі. Гэтаму спрыяла правядзенне аграрнай рэформы 1557 г., калі ў гэтых раёнах было ўведзена падворнае землекарыстанне і распаўсюдзіўся пагонны тып двара з уласцівым яму размяшчэннем пабудоў у адзін рад. У Паўночнай і Усходняй Беларусі ўсталяваўся пераважна вяночны тып двара з размяшчэннем пабудоў па перыметры.

На ўсёй тэрыторыі Беларусі склаўся цэлы комплекс сельскагаспадарчых прылад працы (літоўская саха, драўляная частаплеценая барана, матыка, серп, цэп і інш.), дапаможных гаспадарчых пабудоў, ветраных і вадзяных млыноў.

Адным са значных кампанентаў народнасці з’яўляецца самасвядомасць. У ВКЛ жыхар беларускіх зямель адрозніваў сябе ад іншых народаў. Значны час насельніцтва беларускай тэрыторыі ВКЛ называла сябе рускім і сваю мову рускай. Гэта ў значнай ступені было абумоўлена тым, што насельніцтва гэтых зямель у пераважнай большасці прытрымлівалася праваслаўя, або рускай веры. У выніку склалася так, што самасвядомасць і саманазва ў беларусаў фарміравалася пазней за іншыя этнічныя прыкметы. Але трэба адзначыць, што “рускае” насельніцтва ВКЛ ужо ў той час адрознівала сябе ад жыхароў Маскоўскай дзяржавы. Такім чынам, у XV – XVI стст. завяршыўся працэс фарміравання беларускага этнасу пад уздзеяннем розных этнаўтвараючых фактараў.

2. Дойлідства і выяўленчае мастацтва.

На працэс станаўлення і развіцця беларускай архітэктуры і выяўленчага мастацтва значна паўплывалі старажытнарускія традыцыі, а таксама лепшыя дасягненні архітэктуры і мастацтва заходнееўрапейскіх краін. Шырокае распаўсюджанне на Беларусі набыла готыка – мастацкі стыль, запазычаны з Заходняй Еўропы. Найбольш тыповыя гатычныя пабудовы вылучаліся вялікай вышынёй, стромкім сілуэтам і вертыкальнымі лініямі, вузкімі стрэльчатымі парталамі і вокнамі з каляровымі вітражамі, высокімі вежамі.

Готыка на Беларусі была прадстаўлена шматлікімі абарончымі збудаваннямі – замкамі, якія адначасова з’яўляліся адміністрацыйнымі, палітычнымі, эканамічнымі і культурнымі цэнтрамі. Мураваныя замкі пачалі будавацца ў першай палове XIV ст. Узнікла абарончая сістэма замкаў у Лідзе, Новагародку, Крэве, Вільні і Троках.

Абарончая сістэма складалася з замкаў розных тыпаў. Адны з іх будаваліся на ўзвышшах, другія размяшчаліся ў нізіннай балоцістай мясцовасці на штучным насыпе. Гэта быў новы тып замкаў – кастэлі. Да тыпу кастэляў належалі, напрыклад, Лідскі замак, пабудаваны ў 30-я гг. XIV ст., замак у Крэве, які спалучаў рысы абарончага збудавання і велікакняжацкай рэзідэнцыі.

Акрамя будаўніцтва кастэляў, перабудоўваліся і старыя драўляныя замкі. Да іх адносіўся і Новагародскі замак, які існаваў у X – XVII стст. Ён пэўны час з’яўляўся рэзідэнцыяй вялікіх князёў лістоўскіх, шмат разоў перабудоўваўся.

У пачатку XVI ст. з’явіўся Мірскі замак, пабудаваны магнацкім родам Ільінічаў па тыпу кастэляў. Аднак у першых гаспадароў замка не хапіла грошай на яго дабудову, а пазней гэты род вымер. У1568 г. замак перайшоў да Радзівілаў, якія і завяршылі замак у стылі рэнесанса.

Разам з замкамі другім пануючым архітэктурна-кампазіцыйным цэнтрам гарадскіх пасяленняў былі гандлёвыя плошчы, дзе размяшчаліся будынкі магістратаў, купецкія лаўкі, крамы.

Значнае месца ў архітэктуры азначанага перыяду займала культавае дойлідства. У сувязі з пашырэннем каталіцызму на ўсёй тэрыторыі Беларусі пачалося будаўніцтва касцёлаў. У гатычным стылі быў пабудаваны Троіцкі касцёл у вёсцы Ішкалдзь (Баранавіцкі раён), захаваўшыяся да нашых дзён касцёлы ў вёсцы Усялюб (Навагрудскі раён) і ў Іўі. У культувай архітэктуры канца XV – першай паловы XVI ст. з’яўляецца новы тып пабудоў – інкастэляваныя храмы, прыстасаваныя да абароны. На Беларусі да нашых дзён захаваўся шэраг абарончых храмаў: Сынкавіцкая царква-крэпасць, Мураванкаўскай (Маламажэйкаўская) царква, Барысаглебская царква ў Новагародку, Спаса-Праабражэнская царква ў Заслаўі.

У выяўленчым мастацтве Беларусі другой паловы XIII – першай паловы XVI стст. вылучаюцца іканапіс, фрэскі, кніжная мініяцюра, гравюра, арнамент, драўляная разьбяная скульптура.

Творы манументальнага жывапісу гэтага перыяду амаль не захаваліся (дайшлі толькі фрагменты фрэсак).

Найбольш актыўна развіваўся іканапіс. Абразы захоўвалі традыцыі старажытнарускага і візантыйскага мастацтва, напрыклад, абразы “Маці боская Замілаванне” (канец XIV – пачатак XV ст.), “Маці боская Ерусалімская” (першая палова XV ст.), “Маці боская Смаленская” (мяжа XV – XVI стст.) і інш. З пачаткам XVI ст. пад уплывам рэнесансавых павеваў у абразах персанажы пачалі надзяляцца індывідыальнымі рысамі, у сюжэце з’яўляюцца элементы пабытовага, этнаграфічнага характару (абраз “Пакланенне вешчуноў” (каля 1514 г.) з в. Дрысвяты і г.д.).

З распаўсюджаннем ідэй Адраджэння звязана і развіццё свецкага жывапісу, пераважна партрэтнага па жанры. Захаваліся выявы партрэта Ягайлы ў касцёле ў Сандаміры. У Трокскім замку знаходзіцца шэраг фрэсак, прысвечаных Вітаўту. У XV ст. партрэт ужо перастае належаць да твораў манументальнага жывапісу і паступова набывае самастойнае значэнне. Шырокае распаўсюджанне партрэта прыходзіцца на XVI ст. Тады сярод вярхоў грамадства з’яўляецца мода на зборы карцін і ствараюцца цэлыя партрэтныя галерэі (Радзівілаў, Сапегаў, Тышкевічаў і інш.).

У рамках дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на Беларусі ў другой палове XIII – першай палове XVI ст. развівалася размалёўка па дрэву, чаканка па металу, выраб керамікі. Беларускія майстры добра ведалі тэхналогію металаапрацоўкі, выраблялі металічныя ўпрыгожванні і посуд. Развівалася касцярэзная вытворчасць. Беларускія рамеснікі таксама ствараліі розныя рэчы з каменю: надмагільныя крыжы і бюсты, статуі, рэльефы.

Разнавіднасцю дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з’яўлялася кафлярства. У пачатку XVI ст. беларускія кафляры авалодалі тэхнікай стварэння шматколернай паліхромнай кафлі.

Побач з іншымі відамі выяўленчага мастацтва на Беларусі развівалася скульптура. Скульптурныя творы ўпрыгожвалі каталіцкія манастыры, касцёлы, палацы феадалаў.

3. Рукапісная кніга. Арыгінальная і перакладная літаратура. Беларуска-літоўскае летапісанне.

У другой палове XIII – першай палове XVI стст. паралельна з працэсам стварэння беларускай арыгінальнай літаратуры ішло развіццё старабеларускай літаратурнай мовы, якая замацоўвала характэрныя асаблівасці гаворкі насельніцтва Беларусі.

Пісьмовыя помнікі з беларускамоўнай асновай умоўна можна падзяліць на тры групы: юрыдычна-дзелавыя, свецка-мастацкія і канфесійныя. З часоў Старажытнай Русі на беларускіх землях захавалася сістэма пісьмовага двухмоўя, калі старажытная славянская літаратурная мова задавальняла духоўныя інтарэсы і дзелавыя патрэбы насельніцтва, а царкоўнаславянская выкарыстоўвалася ў набажэнстве і рэлігійнай літаратуры. Паступова царкоўнаславянская мова страчвала на Беларусі свае пазіцыі. З’явілася так званая беларуская рэдакцыя царкоўнаславянскай мовы. Аб гэтым сведчыць

мова такіх твораў канфесійнай літаратуры XV ст. як “Жыціе Аляксея, чалавека Божага”, “Пакуты Хрыста” і інш.

Найбольш адчувальна на гаворку народа рэагавала юрыдычна-дзелавая пісьменнасць. Асноўнымі цэнтармі яе былі дзяржаўныя, прыватнаўласніцкія і магістрацкія канцылярыі. Велікакняжацкая канцылярыя мела свой архіў, які называўся “Метрыкай Вялікага княства Літоўскага”. Большасць актаў і грамат ВКЛ у XIV – XVI стст. былі напісаны кірыліцай на старабеларускай мове. Старабеларуская мова – афіцыйная мова дзяржаўных дакументаў і заканадаўства – канчаткова сфарміравалася ў XVI ст.

Прамежкавае становішча паміж юрыдычна-дзелавой пісьменнасцю і канфесійнай займала мова свецкіх мастацка-літаратурных твораў. У XIII – XVI стст. на Беларусі па-ранейшаму была шырока распаўсюджана царкоўна-рэлігійная літаратура: кнігі Бібліі, жыціі святых, апокрыфы. Творы былі перакладныя ці арыгінальныя. Сярод свецкіх літаратурных твораў асаблівай папулярнасцю карысталіся такія перакладныя рэчы, як “Александрыя”, “Троя”, “Трыстан і Ізольда” і г.д.

З усіх жанраў беларускай літаратуры перыяду яе станаўлення найбольш дынамічна развіваліся летапісы – гістарычна-літаратурныя творы з апісаннем падзей па гадах.

Беларуска-літоўскія летапісы падзяляюцца на 4 групы: “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх”, “Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.”, “Хроніка Вялікага княства Літоўскга і Жамойцкага”, “Хроніка Быхаўца”.

“Летапісец вялікіх князёў літоўскіх” – адзін з першых твораў уласнабеларускай гістарычна-дакументальнай літаратуры. Ён быў напісаны невядомым аўтарам каля 1430 г. у Смаленску ў форме суцэльнага апавядання без выкарыстання дат. Тут выкладаецца гісторыя ВКЛ з 1341 г. (ад смерці Гедыміна) да канца XIV ст. Асноўную ўвагу хроніст надаў апісанню барацьбы за ўладу паміж Кейстутам і Ягайлам, шмат расказваў пра дзейнасць Вітаўта. Галоўная ідэя “Летапісца …” – абгрунтаванне цэнтралізатарскай палітыкі літоўскіх вялікіх князёў.

“Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.” – помнік першага беларускага летапіснага звода. Храналагічна ён ахоплівае перыяд ад сярэдзіны XI ст. да 1446 г. У ім змешчаны як рускія летапісы, так і творы мясцовага паходжання: “Смаленская хроніка”, “Пахвала Вітаўту”, “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх”.

У пачатку XVI ст адбыліся некаторыя змены ў летапісным жанры: аўтары сваю ўвагу амаль цалкам сканцэнтравалі на гісторыі ВКЛ. У 20-я гг. XVI ст. была сворана “Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”, дзе выкладалася гісторыя ВКЛ ад легендарнага князя Палемона да Гедыміна. У гэтым творы, напісаным у жанры гістарычнай аповесці, сцвярджалася паходжанне літоўскіх князёў ад рымскіх арыстакратаў.

“Хроніка Быхаўца” – яшчэ адзін найбольш поўны агульнадзяржаўны летапісны звод. Сваю назву яна атрымала ад прозвішча пана А. Быхаўца, якому належаў адзіны вядомы рукапісны экземпляр. “Хроніка” апісвае падзеі палітычнай гісторыі ВКЛ ад легендарных часоў да пачатку XVI ст. У ім упершыню была створана найбольш поўная сістэматызаваная палітычная гісторыя ВКЛ на працягу значнага прамежку часу. Цэнтральная тэма твора –

ваенна-патрыятычная. Храніст шмат увагі надаў апісанню паходаў і бітваў, ратных подзвігаў суайчыннікаў.

У другой палове XVI ст. летапісы пачалі паволі адміраць, саступаючы месца іншым гістарычным творам.

Такім чынам, другая палова XIII – першая палова XVI стст. – яркі і самабытны перыяд у развіцці беларускай культуры, час росту палітычнай і патрыятычнай свядомасці беларусаў, сінтэзу рэнесансава-гуманістычных павеваў і сярэдневяковых рэлігійных традыцый ў духоўным жыцці, пашырэння культурных сувязей паміж беларускім і іншымі народамі.

Тэма 13. Унутрыпалітычнае і знешнепалітычнае становішча ВКЛ ў першай палове і сярэдзіне XVI ст.

1. Аграрная рэформа сярэдзіны XVI ст. "Валочная памера" і яе сутнасць. Запрыгоньванне сялянства.

У сярэдзіне XVI ст. велікакняжацкі двор стаяў перад праблемай павелічэння прыбытковасці гаспадаркі. Частыя войны паставілі вялікага князя літоўскага ў залежнасць ад шляхты, бо толькі з яе згоды зараз можна было ваціраваць надзвычайныя падаткі на ўтрыманне наёмнага войска. Гаспадарскія маёнткі аддаваліся ў заставу пад вялікія грашовыя заклады. Выкупліваць іх удавалася далёка не заўсёды. Гэта прывяло да моцнага скарачэння велікакняжацкага дамену. Таму, каб павысіць прыбытковасць застаўшыхся маёнткаў, Жыгімонт Аўгуст у 1557 г. абвясціў аб правядзенні на дзяржаўных землях рэформы, якая ўвайшла ў гісторыю пад назвай "Валочная памера".

Уся зямля падзялялася на роўныя надзелы, "валокі", памерам 21,3 га. кожны. Лепшыя ўрадлівыя землі забіраліся пад княжацкія фальваркі, у якіх сяляне адбывалі паншчыну. Кожная сялянская гаспадарка замацоўвалася за часткай валокі. Сяляне гублялі права пераходу да іншага гаспадара і станавіліся прыгоннымі. З валокі вызначалася і сума розных павіннасцей. Яны былі рознымі для цяглых і асадных сялян. Так, цяглыя сяляне павінны былі за кожную валоку працаваць па 2 дні ў тыдзень у фальварку, а таксама плаціць натуральны аброк аўсом, сенам, хатняй птушкай, уносіць невялікі грашовы чынш і выконваць працоўную павіннасць у княжацкіх замках. Асадныя (чыншавыя) сяляне павінны былі плаціць чынш ад 66 да 106 грошаў у год.

Пасля дзяржаўных маёнткаў "Валочная памера" была праведзена і ў маёнтках феадалаў. К канцу XVI ст. яна ўжо скончылася ў заходніх і цэнтральных абласцях Беларусі, некалькі пазней – ва ўсходніх і паўднёвых.
Зараз уся зямля, маёмасць сялян і самі сяляне сталі ўласнасцю феадала ці дзяржавы ў залежнасці ад таго, на чыёй зямлі яны сядзелі.

Прынятыя ў хуткім часе Статуты ВКЛ 1566 і 1588 гг. устанавілі спачатку 10-, а потым 20-гадовы тэрмін вышуку беглых сялян і вяртання іх гаспадарам. Гэта азначала канчатковае юрыдычнае афармленне прыгоннага права на Беларусі і ва ўсім ВКЛ.

2. Гарады і гарадскога насельніцтва. Цэхавая арганізацыя гарадскіх рамеснікаў.

У крыніцах XVI - першай паловы XVII стст. упамінаецца прыкладна 350 гарадскіх паселішчаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі, з якіх пераважную большасць складалі мястэчкі ў 200-300 дамоў, з некалькімі вуліцамі і 2-3 тыс. жыхароў. У сярэдзіне XVII ст. з 2,8-3 млн. жыхароў Беларусі ў гарадах і мястэчках пражывала 350-400 тыс. чалавек, або 12-13%. Гарадское насельніцтва фарміравалася за кошт уцёкаў прыгонных сялян, перасялення вольных сялян, натуральнага прыросту. Але частыя войны і масавыя эпідэміі зводзілі натуральны прырост да мінімуму.

80% гараджан складалі беларусы. Этнічны склад гарадс кога насельніцтва істотна дапаўняўся рускімі, літоўцамі, яўрэямі, палякамі, украінцамі, латышамі, немцамі і татарамі, якія складалі ад 20, а ў некаторых гарадах - да 40% насельніцтва. Разнастайным быў канфесійны склад га раджан: праваслаўныя, католікі, уніяты, іўдзеі, мусульмане, кальвіністы і іншыя, але пераважалі хрысціяне.

Гарады мелі неаднародную сацыяльную структуру. Вяр-хушку складала багатая частка купецтва і рамесніцкія майстры, якім належала ўся ўлада ў горадзе. Уплывовы пласт складалі таксама прадстаўнікі ваенна-служылага саслоўя - баяры. Сярод гарадской вярхушкі была і шляхта, якая масава перасялялася ў гарады на працягу XVI - першай паловы XVII стст. Гарадскі патрыцыят складаў каля 25% іх насельніцтва. Найболыи шматлікую групу гараджан складалі дробныя гандляры, радавыя рамеснікі, чаляднікі і іх сем'і. Гэты сярэдні слой складаў 40-50% усіх жыхароў, улічваючы, што частку іх складала таксама духавенства, чыны ўрадавай адміністрацыі і інш. Найболып абяздоленай часткай гарадскога люду былі так званыя "люзныя людзі" і"гульцяі" - даведзеныя да галечы і абеззямеленыя сяляне, вымушаныя пакінуць сваю гаспадарку і знайшоўшыя прытулак у горадзе. У пачатку XVII ст. іх колькасць даходзіла да адной трэці гарадскога насельніцтва.

Гарады і мястэчкі існавалі як на дзяржаўных вялікакняжацкіх, так і прыватнаўласніцкіх землях. Больш 40% усіх гарадскіх пасяленняў Беларусі ў першай палове XVI ст. падпарадкоўваліся юрысдыкцыі буйных магнатаў (Слуцк, Стары Быхаў, Клецк, Копысь, Тураў, Шклоў, Зэльва, Маладзечна, Смаргонь, Лагойск і інш.).

Жыхары мястэчак і невялікіх гарадоў побач з рамяством і гандлем займаліся апрацоўкай зямлі і сельскагаспадарчымі промысламі.

Невялікімі тады былі і гарады. Гарады з насельніцтвам да 10 тыс. жыхароў і больш лічыліся буйнымі. Да іх адносіліся Полацк, Віцебск, Слуцк, Магілёў.

Крыніцы XVI ст. упамінаюць каля 200 рамесніцкіх прафесій і спецыяльнасцей.

Дзеля абароны сваіх інтарэсаў рамеснікі стваралі свае ўласныя карпарацыі. Такімі аб'яднаннямі сталі цэхі. Цэхі ў беларускіх гарадах былі трох тыпаў: спецыялізаваныя (уваходзілі рамеснікі адной прафесіі); аб'яднаныя (уваходзілі рамеснікі дзвюх і больш блізкіх прафесій) і зборныя (уваходзілі

прадстаўнікі розных прафесій). Апошнія карпарацыі ўзнікалі тады, калі ў тым ці іншым горадзе было мала рамеснікаў адной спецыяльна.

Рост рамяства садзейнічаў развіццю гандлёвай дзейнасці. У буйных гарадах таргі наладжваліся двойчы, у невялікіх гарадах і мястэчках - раз у тыдзень. У перадсвяточныя дні ў буйных гарадах арганізоўваліся кірмашы, якія маглі цягнуцца некалькі дзён.

Гандлёвыя сувязі звязвалі горад з вёскамі і мястэчкамі, а буйныя гарады - паміж сабой. Буйнейшымі гандлёвымі цэнтрамі Беларусі былі Віцебск, Полацк, Менск, Магілёў, Бярэсце. Гарады гандлявалі таксама з Расіяй, Полыпчай, Турцыяй, Малдавіяй і інш. Больш як 20 буйных "шляхоў і гасцінцаў" звязвалі беларускія гарады паміж сабой і з кірмашамі Варшавы, Любліна, Літвы, Венгрыі, Смаленска, Украіны. Беларускія купцы выконвалі пасрэдніцкую ролю ў гандлёвых сувязях Расіі з Польшчай.

З умацаваннем эканамічнай і грамадскай ролі гарадоў расло іх імкненне пашырыць свае правы і прывілеі. З канца XIV ст. дзяржаўная ўлада ВКЛ пайшла на дараванне гарадам самакіравання на аснове магдэбургскага права. Да сярэдзіны XVII ст. яго атрымала большасць буйных гарадоў, каля паловы сярэдніх гарадоў Беларусі, у тым ліку і прыватнаўласніцкіх.

Горадам, які атрымаў магдэбургскае права, кіраваў магістрат, што складаўся з рады і лавы. Рада ажыццяўляла функцыі гарадской улады і суда па маёмасных і грамадзянскіх справах, лава судзіла гараджан па крымінальных справах. Члены рады (радцы, райцы, ратманы) і гарадскога суда (лаўнікі) выбіраліся выключна з заможнай вярхушкі, радцы - штогод, лаўнікі - на больш працяглы перыяд. На чале магістрата стаяў войт, якому належала вышэйшая судовая і выканаўчая ўлада Пасяджэнні магістрата праходзілі ў будынку ратушы, які ўзводзіўся ў цэнтры горада, атрымаўшага магдэбургскае права.

Жыхары такіх гарадоў вызваляліся ад улады і суда дзяржаўнай адміністрацыі і ад выканання феадальных павіннасцей (па рамонту замка, абарончых умацаванняў і інш.), што давала ім магчымасць больш часу займацца сваей прафесійнай дзейнасцю. Павіннасці былі заменены аднаразавым штогадовым грашовым падаткам.

3. Лівонская вайна.

У 1558 г. маскоўскі цар Іван IV, больш вядомы як Іван Жахлівы, распачаў вайну супраць былога Лівонскага ордэна. На той час Ордэн уяўляў сабой канфедэрацыю – саюз 5 княстваў, створаных нямецкімі рыцарамі. Асноўнай мэтай маскоўскага цара была здабыча выхаду да Балтыйскага мора, гэта давала магчымасць самастойна гандляваць з Еўропай без дапамогі шматлікіх пасрэднікаў. Атрымаўшы выхад да Балтыкі, Расія магла больш актыўна ўдзельнічаць і ў еўрапейскіх справах. Лівонія была аб’яўлена спадчынай маскоўскіх князёў на падставе таго, што ў старажытныя часы гэтай тэрыторыяй валодалі князі Кіеўскай Русі. Спадчынай Масквы таксама была

названая і частка ВКЛ – беларускія і ўкраінскія землі з Полацкам, Віцебскам, Оршай, Магілёвам, Кіевам і іншымі буйнымі гарадамі.

Вялікая маскоўская армія ў першыя месяцы ваенных дзеянняў у Прыбалтыке захапіла Нарву, Дэрпт, падступіла да Рэвеля. Ордэн запрасіў перамір'я, адначасова актыўна стаў шукаць саюзнікаў у Еўропе, аднак Швецыя, Данія і Польша адмовіліся ваяваць супраць Расіі, толькі Вялікае княства Літоўскае, разумеючы небяспеку маскоўскага заваявання Лівоніі, вырашыла аказаць дапамогу Ордэну. У 1559 г. Лівонія перайшла пад пратэктарат ВКЛ, у выніку ваенныя дзеянні аднавіліся, і зноў паспяхова для Івана IV. У ліпені 1561 г. войска ВКЛ на чале з Мікалаем Радзівілам Рудым уступіла ў Лівонію, але было разбіта каля горада Пярну. Ордэн фактычна перастаў існаваць. Апошні магістр Кетлер перадаў у сакавіку 1562 г. Мікалаю Радзівілу Чорнаму (стрыечны брат Мікалая Радзівіла Рудога) пячатку Ордэна і ключы ад Рыгі. Каб пашырыць кола ўдзельнікаў вайны, Кетлер перадаў эстонскія землі Швецыі, вастраў Эзэль Даніі, Лівонію – ВКЛ, за сабой захаваў толькі Курляндыю на правах спадчыннага свецкага княства. Адначасова вялікі князь Жыгімонт Аўгуст прызначыў Кетлера сваім намеснікам у Лівоніі. Так перастала існаваць ваенна-царкоўная дзяржава – Лівонскі ордэн.

У адказ на гэта, атрады Івана IV у пачатку 1562 г. спустошылі ваколіцы Мсціслава, Шклова, Оршы, Віцебска, Дубровны, Копыля. Для генеральнага наступлення на Полацк пад Мажайскам рыхтавалася армія ў 60 тыс. чалавек. 31 студзеня 1563 г. гэтае войска асадзіла Полацк, а праз 2 тыдні гераічнай абароны (15 лютага) захапіла горад. Вільня запрасіла міру, але патрабаванні маскоўскага цара былі празмерныя – Полацк і Лівонія павінны быць далучаны да Расіі. У 1564 г. ваенныя дзеянні аднавіліся. Невялікаму войску Мікалая Радзівіла Рудога ўдалося разбіць дзве рускія арміі – каля ракі Ула 25 студзеня і пад Оршай 2 лютага 1564. Спробы Івана IV пранікнуць у цэнтр дзяржавы былі сарваныя. Але рускі цар добра замацаваўся ў паўночнай Беларусі – у 1566-1569 гг. ён будуе каля Полацка крэпасці Суша, Сокал, Сітна, Красны, Казьяны, Усвяты, Туроўля. У гэтых умовах княству патрабаваўся саюзнік, бо аднаму яму адбіць напады маскоўскага цара было немагчыма. Найбольш верагодным саюзнікам была Польшча, з якой у 1569 г. была заключана Люблінская ўнія. У 1570 г. новая дзяржава – Рэч Паспалітая пайшла на перамір'е з Іванам IV, апошняму так сама патрабавалася часова замірыцца з Літвой і Польшчай, бо пачаліся ваенныя дзеянні супраць Швецыі. Хутка памер апошні прадстаўнік дынастыі Ягеллонаў бяздзетны Жыгімонт II Аўгуст, таму ваенныя дзеянні аднавіліся толькі праз некалькі гадоў, калі ў Рэчы Паспалітай усталяваўся ўнутраны парадак.

4. Люблінская унія 1569 г.

Захоп войскам івана Грознага Прыбалтыкі і Полацка адсекла ўсходнюю і цэнтральную часткі Беларусі ад мора, што было цяжкім ударам па гандлі. Сілы дзяржавы былі на мяжы магчымага. Гэта вайна, як адзначалі пазней палітыкі, прыгнала ВКЛ да новай уніі з Польшчай.

У першай палове XVI ст. на змену рэлігійным супярэчнасцям, уласцівым палітычнаму жыццю княства ў Х1У-ХУ стст., прыходзяць іншыя - ўнутрысаслоўныя супярэчнасці паміж магнатэрыяй (багатай шляхтай) і шляхтай сярэдняй и дробнай. Пераважнае, дамінуючае становішча ў дзяржаве належала магнатам, якія адціскалі шляхту на другі план. Літвінскую шляхту прываблівалі "залатыя вольнасці" польскай шляхты, якая мела доступ да ўлады, рашуча уплывала на ўнутраную і знешнюю палітыку ўрада. Дасягненне гэтых мэтаў яна звязвала з заключэннем уніі з Полыпчай.

Для канчатковага вырашэння пытання аб уніі на 23 снежня 1568 г. быў прызначаны з'езд у Любліне. У склад дэлегацыі ВКЛ уваходзілі канцлер і віленскі ваявода Мікалай Радзівіл Руды, падканцлер Астафей Валовіч, жамойцкі староста Ян Хадкевіч, падскарбій Мікалай Нарушэвіч і іншыя ўплывовыя асобы. На сойм прыбылі кароль і каля 160 паслоў і сенатараў Польшчы і ВКЛ. У тэты ж дзень пачаліся перамовы. Амаль шэсць месяцаў працягваўся сойм. Кожны бок ставіў свае ўмовы, якія не прымаліся супрацьлеглым. Ніхто не саступаў. Больш таго, дэлегацыя ВКЛ раскалолася на магнацкую і шляхецкую групы, з якіх першая была супраць, а апошняя стаяла за ўтварэнне уніі з Польшчай.

1 ліпеня 1569 г. быў падпісаны акт уніі. Паводле гэтага акта, Каралеўства Польскае і Вялікае княства Літоўскае злучаліся ў адну дзяржаву, якая атрымлівала назву Рэч Паспалітая. Унія была заключана на наступных умовах:

Злучаныя дзяржавы маюць аднаго гаспадара - караля, які носіць тытул "кароль польскі і вялікі князь літоўскі, рускі, прускі, мазавецкі, жамойцкі, кіеўскі, валынскі, падляшскі і ліфляндскі". Яго пасада была не спадчыннай, а выбарнай. Абіраюць яго народы абедзвюх дзяржаў разам, для гэтай мэты збіраецца сойм у Варшаве. Каранацыя караля адбываецца ў Кракаве. Літва не мае права абраць для сябе асобнага вялікага князя. Для вырашэння найважнейшых дзяржаўных спраў збіраецца агульны сойм Рэчы Паспалітай. Ён складаецца з дэпутатаў, абраных на павятовых соймiках. Пасяджэнні сойма праходзяць на польскай зямлі. Скліканне асобных соймаў для ВКЛ і для кароны не прадугледжвалася. Усе нязгодныя з умовамі уніі ранейшыя пастановы ВКЛ касуюцца. Украіна (Кіеўшчына, Валынь, Падолле і Падляшша) аддзяляюцца ад ВКЛ і далучаюцца да Польшчы. Лівонія аб'яўляецца сумесным валоданнем княства і кароны. Дзяржавы праводзяць аіульную знешнюю палітыку.

Разам з тым, княству не адводзілася роля каланіяльнай ускраіны. Люблінская унія захоўвала пэўную самастойнасць ВКЛ. Яно мела свае войска, асобнае ад Польшчы заканадаўства і судовую арганізацыю, захоўвала даўні адміністрацыйны апарат і сваю пячатку. Польшча і ВКЛ захоўвалі самастойныя назвы і да канца XVII ст. мелі розныя дзяржаўныя мовы. Афіцыйнай дзяржаўнай мовай ВКЛ заставалася старабеларуская, у Польшчы - лацінская. Нягледзячы на ўмовы уніі, у XVI - першай палове XVII стст. грошы ў кароне і княстве былі асобныя. Захавалася нават мытная мяжа паміж імі.

Большая частка пануючага класа ВКЛ у апошняй трэці XVI ст. праяўляла незалежніцкія, антыпольскія настроі. Вялікакняжацкія палітыкі імкнуліся вывесці сваю дзяржаву з таго тупіка, у якім яна апынулася ў выніку Люблінскай

Уніі. Насуперак акту уніі ў ВКЛ у 70-80-я гг. XVI ст. рэгулярна збіраліся агульнадзяржаўныя соймы. У 1581 г. была створана асобная вышэйшая судовая інстанцыя для ВКЛ галоўны трыбунал. А прыняты ў 1588 г. Статут, па сутнасці, скасоўваў многія пастановы Люблінскай уніі.

5. Стафан Баторый, яго ўнутраная і знешняя палітыка.

Пасля смерці апошняга караля і вялікага князя з дынастыі Ягелонаў Жыгімонта Аўгуста першым абраным усёй шляхтай Рэчы Паспалітай каралём стаў французкі прынц Генрых Валуа (1573 – 1574). Аднак у хуткім часе ён з'ехаў у Францыю, дзе заняў каралеўскі трон.

Наступным каралём быў абраны трансільванскі князь Стэфан Баторый (1576–1586). Ва ўнутранай палітыцы ён імкнуўся да ўмацавання цэнтральнай дзяржаўнай улады і войска перадусім для паспяховага завяршэння Інфлянцкай вайны 1558 – 1582 гг. Стэфан Баторый аказваў шырокую падтрымку каталіцкай царкве і асабліва ордэну езуітаў; у той жа час, аднак, прытрымліваўся прынцыпаў рэлігійнай талеранцыі, пацвярджаў правы праваслаўнай царквы, караў удзельнікаў антыпратэстанцкіх пагромаў.

У знешняй палітыцы галоўным накірункам дзейнасці С. Баторыя была барацьба з Маскоўскай дзяржавай за кантроль над Інфлянтамі і адваяванне занятых маскоўскімі войскамі ў 1563 г. зямель ВКЛ. Ваенныя дзеянні паміж Рэччу Паспалітай і Масковіяй аднавіліся ў 1577 г., калі маскоўскія войскі захапілі большую частку Інфлянтаў. Швецыя выступіла ў вайне на баку Рэчы Паспалітай. Паводле рашэння сойма 1578 г., было сабрана вялікае войска, пераважна наёмнае (немцы і венгры). У 1579 г. войскі РП занялі Полацк, а ў наступным годзе – Усвят, Вялікія Лукі, Холм, Старую Руссу, у 1581 г. быў узяты ў аблогу Пскоў. Паводле Ям-Запольскага перамір'я 1582 г. ВКЛ вярнула Полаччыну. Пад супольнае кіраўніцтва ВКЛ і Польскага каралеўства адышла большая частка Інфлянтаў, толькі поўнач Эстоніі быў далучаны да Шведскага каралеўства. У выніку вайны насельніцтва Полацка скарацілася да 3 тыс. чалавек, а ў рэгіёне пуставала да 2/3 двароў.

Тэма 14. Эвалюцыя дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ.

1. Сталіцы, герб і мова дзяржаўнага справаводства, органы дзяржаўнай улады і кіравання.

Сталіца дзяржавы – гэта галоўны горад, дзе месціліся органы дзяржаўнага кіравання, рэзідэнцыя кіраўніка дзяржавы – вялікага князя. Тут збіраліся агульнадзяржаўныя вальныя сеймы. Першай сталіцай ВКЛ быў Навагрудак, а з 1323 г. сталіцай Вялікага княства Літоўскага Гедымін абраў Вільню (крывіцкае паселішча Крывы горад) на рацэ Вілії. З цягам часу Вільня стала адным з буйнейшых гарадоў ва Ўсходняй Еўропе. Па некаторых звестках, нсельніцтва Вільні ў XVI ст. было пераважна беларускім, праваслаўным.

Герб дзяржавы – "Пагоня" – летапісы ўзгадваюць пад 1270 – 1290-я гг., часцей за ўсё звязваюць з асобай Віценя. Спачатку гэта быў асабісты герб

вялікага князя, пазней ён стаў гербам дзяржавы. Статут 1566 г. юрыдычна замацаваў “Пагоню” як дзяржаўны герб ВкЛ. Кожнае ваяводства і павет павінны былі мець пячатку з “Пагоней”. Дзяржаўны герб меў наступны выгляд – на шчыце барочнай формы пурпуровага колеру ў сярэдзіне месціўся белы коннік з мячом і шчытом.

На працягу XIV – XVII стст. беларуская, а дакладней, старабеларуская мова выконвала функцыі дзяржаўнай мовы ВКЛ. На ёй былі выдадзены галоўныя законы княства – Судзебнік 1468 г., усе тры Статуты ВкЛ, вялася Метрыка Вялікага княства Літоўскага. На беларускай мове вялося справаводства ў гарадскіх магістратах, земскіх і замкавых судах, яна выкарыстоўвалася пры правядзенні рэвізій і інвентарызацый не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і на ўласна літоўскай тэрыторыі. Пасля заключэння Люблінскай уніі ўмовы для далейшага развіцця беларускай мовы як мовы дзяржаўнай, значна пагоршыліся. Справаводства паступова пераводзілася на польскую мову. Спецыяльнай сеймавай пастановай 1696 г. беларуская мова была забаронена для ўжывання ў справаводстве на тэрыторыі Рэчы Паспалітай.

Галоўным кіраўніком княства лічыўся вялікі князь літоўскі. Ён ажыццяўляў вышэйшы суд у дзяржаве, з’яўляўся вярхоўным галоўнакамандуючым, узначальваў знешнепалітычную дзейнасць. З XIV ст. пры асобе вялікага князя існаваў Савет па аналогіі з маскоўскай думай. Але ў адрозненне ад апошняй, Савет спачатку не быў дзяржаўнай установай. Гэта быў дарадчы орган пры вялікім князю, які ён фарміраваў па сваім меркаванні з ліку карысных і патрэбных людзей. На першым этапе галоўную ролю ў Савеце (Радзе) адыгрывалі князі. Але ў часы Вітаўта ў яе складзе пачалі пераважаць баяры, якія падтрымалі апошняга ў яго барацьбе за ўладу.

Паступова гэты дарадчы орган трансфарміраваўся ў прадстаўнічую ўстанову – Раду паноў. Паны Рады пачалі абмяжоўваць ўладу вялікага князя. Склад Рады не быў жорстка вызначаным. У яе ўваходзілі: вышэйшая свецкая і духоўная знаць (апошняя – толькі каталіцкага веравызнання), вышэйшыя службовыя асобы: канцлер (кіраўнік дзяржаўнай канцылярыі), гетман (камандуючы ўзброенымі сіламі), падскарбі земскі (кіраўнік фінансаў), маршалкі земскі і дворны, ваяводы, кашталяны, некаторыя старосты. Гарадзельскі прывілей 1413 г. абмяжоўваў доступ у Раду праваслаўнай шляхты, але з канца XV ст. гэта забарона пачала парушацца. У звычайны час Рада складалася з вузкага кола асоб пры вялікім князю.

У другой палове XV – першай палове XVI ст. вялікія князі літоўскія часта выбіраліся каралямі польскімі, што прыводзіла да іх працяглай адсутнасці ў ВКЛ. У час адсутнасці гаспадара Рада цалкам кіравала дзяржавай. А прывілеі 1492 і 1506 гг. увялі заканадаўчае абмежаванне ўлады вялікага князя з боку паноў Рады. З гэтага моманту ўсе законы і распараджэнні агульнага характару вялікі князь павінен быў выдаваць толькі са згоды паноў Рады.

Гаспадар і Рада ў сваёй дзейнасці абапіраліся на сейм ВКЛ, на які запрашаліся прадстаўнікі прывілеяваных саслоўяў. Пачатак рэгулярнага склікання агульнадзяржаўных сеймаў прыпаў на канец XV ст. У XVI ст. за імі замацавалася назва “вялікі вальны сойм”. Спачатку на ім маглі прысутнічаць

усе жадаючыя шляхцічы, але з 1512 г. было ўведзена абмежаванне – па 2 паслы ад кожнага павета. На сеймах абмяркоўваліся галоўныя пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі, заканадаўчыя акты, устанаўліваліся падаткі, вырашаліся судовыя справы, выбіраліся вялікія князі і зацвярджаліся кандыдаты на важнейшыя дзяржаўныя пасады. Так палітычны лад ВКЛ пачаў набываць рысы парламенцкай манархіі, бо ўлада вялікага князя пачала абмяжоўвацца яшчэ і сеймам. Так, у Статуце ВКЛ 1529 г. ужо гаварылася аб неабходнасці выдаваць прывілеі выключна на вальным сейме. Так развіццё канстытуцыяналізму, пачатак якому быў пакладзены ў XV ст. , прымала ўсё больш акрэсленыя абрысы.

Вышэйшымі службовым асобамі ў дзяржаве былі маршалак земскі, гетман, канцлер і падскарбій. Маршалак земскі старшынстваваў на пасяджэннях сойма і Рады, Гетман найвышэйшы камандаваў узброенымі сіламі дзяржавы, калі на чале іх не стаў сам вялікі князь. У час ваенных дзеянняў ён меў самыя шырокія паўнамоцтвы ад-носна ўсіх падначаленых асоб, у тым ліку права караць віна-ватых. Яго намеснікам быў гетман польны, той, хто ўзначальваў войска ў паходзе.

У войску знаходзіліся земскі харужы з земскай харугвай (сцягам). Ён узначальваў прыватныя і павятовыя харугвы, што'далучаліся да гетманскага войска, існавала пасада дворнага харужага, які захоўваў сцяг пры вялікім князю і камандаваў атрадам дваран.

Канцлер кіраваў дзяржаўнай канцылярыяй, пад яго на-глядам ажыццяўлялася падрыхтоўка законапраектаў, прывілеяў, грамат і іншых дакументаў з дзяржаўнай канцылярыі. У яго знаходзілася вялікая дзяржаўная пячатка, без якой ніводзін закон не мог уступіць у сілу, ён падпісваў і найважнейшыя дзяржаўныя акты. У канцылярыі пісьмова на беларускай мове (з 1696 г. - на польскай) афармляліся ўсе пастановы і распараджэнні князя і Рады. Дакументы, што выходзілі з канцылярыі і прыходзілі туды, запісваліся ў асобныя кнігі, якія называліся Літоўскай Метрыкай.

2. Сістэма мясцовага кіраўніцтва, судовая сістэма і асаблівасці яе існавання ў XIV — XVI ст.

Арганізацыя мясцовага кіравання была дастаткова складанай. У краіне захоўваліся яшчэ некаторыя старадаўнія княствы на чале з князямі, праўда, пазбаўленымі былых прывілеяў. Частка княстваў была ператворана ў ваяводствы на чале з ваяводамі. Больш дробнымі тэрытарыяльнымі адзінкамі былі паветы на чале са старостамі. На месцах быў створаны і дастаткова разгалінаваны адміністрацыйны апарат: кашталяны, гараднічыя, харужыя і г.д. У вёсках выканаўчую ўладу прадстаўлялі цівуны. Прадстаўнічымі органамі мясцовага кіраванне ў ваяводствах і паветах з’яўляліся сеймікі, на якіх рашаліся некаторыя пытанні мясцовага кіраванні і выбіраліся паслы-дэпутаты на вальны сейм. Толькі ў выніку рэформ 1565 – 1566 гг. былі прыняты меры па ўпарадкаванню адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу. Замест розных зямель, княстваў увадзіліся ваяводствы, якія падзяляліся на паветы, а апошнія, у сваю чаргу, – на воласці.

У 13-15 ст. заставалася тая ж судовая сістэма, што існавала да ўтварэння ВКЛ. У 16-18 ст. яна спалучала 2 сістэмы судоў: агульныя суды, што былі звязаны з органамі дзярж. кіравання, і саслоўныя. У 14-15 ст. у цэнтры княстваў насельніцтва судзілі князі з баярамі, у інш. гарадах - княжацкія намеснікі, у валасцях - валасцелі з валаснымі старцамі. Дзейнічаў і старадаўні копны суд жыхароў сяла або некалькіх сёл. Найвышэйшым судом ВКЛ быў гаспадарскі (велікакняжацкі) суд.

Вялікі князь быў вярхоўным суддзёй па ўсіх справах, якія паступалі да яго з ніжэйшыхінстанцый, а таксама па справах, якія ён разглядаў непасрэдна. У яго кампетэнцыю ўваходзілі гал. пытанні дзярж. парадку, падатковыя, маёмасныя і інш. справы. У Судзебніку 1468 было ўказана, што разам з гаспадаром у вырашэнні дзярж. спраў прымаюць удзел паны-рада. Калі князі доўгі час знаходзіліся ў Польшчы, то паны-рада ператвараліся ў вышэйшую судовую інстанцыю.

У пач. 16 ст. ў ВКЛ пачаў працаваць задворны асэсарскі суд, які складаўся з пры-значаных на пэўную сесію асоб і дзейнічаў пры вял. занятасці вял. князя. Статут ВКЛ 1529 пашыраў судовыя паўнамоцтвы паноў-рады, якая склікалася на судовыя сесіі ў Вільню штогод. Такім чынам, паны-рада станавіліся вышэйшай суд. інстанцыяй у ВКЛ. На рашэнні гэтага суда магла падавацца апеляцыя да вял. князя. У пач. 16 ст. пачаў дзейнічаць і маршалкаўскі суд, калі вял. князь даручаў маршалку земскаму (у яго адсутнасці - маршалку дворнаму) разглядаць пэўныя справы. У адрозненне ад асэсарскага суда маршалкаўскі суд разглядаў справы і тады, калі гаспадара ў дзяржаве не было. Акрамя таго, маршалак земскі судзіў усе справы аб злачынствах і правапарушэннях, якія адбываліся ў мясцовасці, дзе ў гэты час знаходзіўся князь, а таксама на сойме. Утварыліся так-сама камісарскія суды, якія займаліся гал. чынам справамі па памежных пытаннях.

Суд. сістэма ў ВКЛ была рэфармавана ў час рэформы 1565-66, калі шляхта атрымала самакіраванне і ў паветах былі створаны шляхецкія суды. Замкавы суд (або гродскі) быў павятовым судом для шляхты, мяшчан і сялян. Дзейнічаў у 2 складах - вышэйшым (як 1-я і 2-я інстанцыі) і ніжэйшым (толькі як 1-я інстанцыя). Галоўным суддзёй быў ваявода або староста. Калі гал. суддзя адсутнічаў, яго замяняў падстараста. У вышэйшы замкавы суд уваходзілі галоўны суддзя і прадстаўнікі шляхты. Ніжэйшы суд складаўся з нам. гал. суддзі, суддзі і пісара. Замкавы суд разглядаў справы пра цяжкія злачынствы асоб, якія былі затрыманы на месцы злачынства, таксама сведчыў копіі дакументаў, здзелкі, выконваў прыгаворы. Судом 1-й інстанцыі быў земскісуд, як разглядаў крымінальныя і цывільныя справы, выконваў натарыяльныя акты і інш. Ён выбіраўся павятовай шляхтай з ураджэнцаў павета, якія тут мелі маёнткі і ведалі права. Сесіі земскага суда адбываліся 3 разы на год. Судаводства вялося паводле Бельскага прывілея 1564 і Статутаў ВКЛ 1566 і 1588. Паводле рэформы 1565-66 у павеце існаваў і падкаморскі суд для разгляду памежных зямельных спрэчак паміж шляхтай. Суд вяршыў падкаморы, які разглядаў дакументы, выслухоўваў сведкаў, выязджаў на месца і выдаваў дэкрэт (гранічны ліст). Падкаморага прызначаў вял. князь з 4

кандыдатаў, выбраных шляхтай на павятовым сойміку. Падкаморы падбіраў сабе 1 або 2 каморнікаў, якія яму дапамагалі, і пісара. Ва ўсе павятовыя суды выбіраліся шляхціцы, якія добра ведалі беларускую мову, каб разбірацца ў дакументах, у т.л. старажытных.

Па-ранейшаму ў сельскіх мясцовасцях і некат. гарадах, дзе не было магдэбургскага права,у 16-17 ст. дзейнічаў копны суд, які разглядаўсправы сялян і гараджан. Суддзямі былі мясц. жыхары, гаспадары дамоў і зямельных надзелаў (звычайна 10-20 чал.). Яны дзейнічалі пад наглядам дзярж. або панскай адміністрацыі. У некат. мясцовасцях Беларусі (напр., у Слуцкім княстве) копныя суды дзейнічалі і ў 18 ст. Яны падлягалі замкаваму суду.

У1581 быў створаны і ў 1582 пачаў працаваць Трыбунал Вялікага княства Літоўскага - вышэйшы апеляцыйны суд ВКЛ, пастановы якога мелі сілу пастаноў сойма. Скла-даўся ён з 46 суддзяў-дэпутатаў, якія выбіраліся на павятовых соймiках па 2 дэпутаты ад кожнага тэрмінам на 1 год. Трыбунал ВКЛ разглядаў апеляцыі па рашэннях земскіх, гродскіх і пад-каморскіх судоў, а таксама скаргі на рашэнні павятовай адміністрацыі. У 1-й інстанцыі Трыбунал разглядаў справы аб належным выкананні старастамі і замкавымі ўраднікамі сваіх абавязкаў пры судаводстве. Сесіі Трыбунала ВКЛ праходзілі пад стар-шынствам маршалка. Пастановы прымаліся боль-шасцю галасоў на аснове Статута ВКЛ, соймавых канстытуцый і звычаёвага права. Сесіі Трыбунала напачатку праводзіліся ў Вільні і Троках (для тэр. Віленскага і Троцкага ваяводстваў, Жамойці), Новагародку і Менску (для астатняй тэр. ВКЛ), з 1588 штогод у Вільні і папераменна праз год у Новагародку і Мен-ску, з 1755 - штогод у Вільні і Гародні. З 1613 у ВКЛ існаваў Скарбовы трыбунал, які кантраляваў фінан-савыя справы дзяржавы. У1726 частка яго функцый перададзена Трыбуналу ВКЛ.

З 1572 у Польшчы і з 1587 у ВКЛ у часы бескаралеўя ў паветах дзейнічалі каптуровыя суды. На тэр. Беларусі ў склад каптуровага суда ўваходзілі ваявода або староста ці іх намеснікі, суддзя і пісар гродскага суда, падкаморы, суддзя, падсудак і пісар земскага суда. З 17 ст. ў склад каптуровага суда выбіраліся суддзі, абраныя на перадканвакацыйных павятовых соймiках. Каптуровы суд разглядаў крымінальныя справы аб забойствах, разбоях, падпалах, нападах на маёнткі, а таксама цывільныя справы магнатаў, шляхты і манастыроў. Пастановы каптуровага суда прымаліся большасцю галасоў і апеляцыі не падлягалі.

У гарадах ВКЛ, якія мелі самакіраванне, акрамя войтаўскага дзейнічаў і войтаўска-лаўніцкі суд, а таксама бурмістраўска-радзецкі суд. Войтаўскі суд дзейнічаў у гарадах, якія ўжо мелі магдэбургскае права, і ў тых гарадах, якія яго не мелі. Яны разглядалі спрэчкі паміж мяшчанамі. Больш пашыраным быў войтаўска-лаўніцкі суд (колькасць лаўнікоў была розная, напр., у Копылі і Нясвіжы іх было па 4, у Менску і Берасці - па 12, у Гародні -11). Гэты суд разглядаў крымінальныя справы, маёмасныя спрэчкі, сведчыў дагаворы куплі-продажу, тастаменты. Асобна ў гарадах з магдэбургскім правам дзейнічаў бурмістраўска-радзецкі суд, у склад якога ўваходзілі бурмістры і радцы. Суд разглядаў правапарушэнні мяшчан і інш. гараджан, спрэчкі паміж купцамі, паміж рамеснымі майстрамі, падмайстрамі і інш. У большасці прыватнаўла-

дальніцкіх гарадоў і ў малых дзярж. гарадах у 17-18 ст. дзейнічаў адзіны суд магістрата, у які ўваходзілі войт, бурмістры, радцы і лаўнікі.

Вялікае значэнне з 15 ст. меў вотчынны суд. Прывілеем 1447 вял. князь Казімір Ягелончык перадаў права суда над насельніцтвам феадалам - панам і баярам, на чыёй зямлі жылізалежныя адіх сялянеі гараджане. Артыкул 12 прывілея 1447 рэгламентаваў судовае права пана або баярына. Залежныя ад феадала людзі былі пазбаўлены права апеляцыі ў дзярж. органы і суды. Судаводства ў вотчынным судзе вёў сам пан ці службовыя асобы яго дваровай адміністрацыі, якім ён даручаў весці суд. Меры пакарання вызначаліся адвольна. Справы па цяжкіх злачынствах павінны былі разглядацца згодна з дзярж. заканадаўствам, перш за ўсё са Статутамі ВКЛ.

Прававая сістэма ВКЛ сфарміравалася на падставе мясцовага звычаёвага права, прававых актаў дзярж. і судовых органаў у ВКЛ з 2-й пал. 13 ст., побач са звычаёвым правам,утвараеццаі пісьмовае права, зафіксаванае ў дакументах-граматах (прывілеях). Спачатку складваліся дагаворы вял. князя з баярствам асобных земляў (Полацкай, Смаленскай і інш.), якія гарантавалі захаванне «старыны», а таксама ўстаўныя граматы і гаспадарскія лісты да пэўных асоб. З канца 14 ст. вял. князі выдалі шэраг прывілеяў групам феадалаў паводле лакальнага прынцыпу. У 15 ст. гал. значэнне ў прававой сістэме меліўжо заканадаўчыя акты: агульнадзярж. (агульназемскія) прывілеі,абласныя (зямельныя) прывілеі, граматы гарадам, валасцям, дзярж. асобам. Першым агульна-земскім прывілеем ВКЛ, выдадзеным Ягайлам у Вільні, быў прывілей 1387, якім зацвяр-джаліся правы баяр, якія прынялі і прымалі хрышчэнне паводле каталіцкага абраду. Такое ж значэнне меў Гарадзельскі прывілей 1413. Прывілей 1432 і прывілей 1434 ураўнавалі саслоўныя, маёмасныя і асабістыя правы як каталіцкага, так і праваслаўнага веравызнання. Агульнадзярж. прывілеем быў і Казіміраў прывілей 1447, які замацаваў шырокія правы баяр ВКЛ і перадаваў баярам права судзіць сваіх падданых; баяры станавіліся адзінымі суддзямі ўсваіх маёнтках. Агульназемскім прывілеем быў і Аляксандраў прывілей 1492, якім значна пашыралася ўлада паноў-рады. Такое ж значэнне меў і прывілей 1506. Вышэйшай ступенню заканадаўства ў дзяржаве сталі Статуты ВКЛ 1529, 1566 і 1588. Яны былі першымі ў Еўропе зборамі законаў, добра распрацаванымі юрыдычна на аснове мясц. права. Статут ВКЛ 1588 дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі і Літвы без значных змен да 1840. У 16 ст. працягвалі дзейнічаць і таксама выдавацца прывілеі асобным землям ВКЛ.

Тэма 15. Царква і рэлігія. Адраджэнне на Беларусі.

1. Рэлігійныя адносіны.

На тэрыторыі Беларусі з XIV ст. надзіва мірна ладзілі між сабою прадстаўнікі розных веравызнанняў — праваслаўя, каталіцтва, мусульманства і іудзейства. Верацярпімасць, узведзеная Гедымінам у ранг дзяржаўнай палітыкі, стала асновай балта–славянскага грамадскага саюзу і важнай умовай поспеху

аб’яднаўчай праграмы вялікіх князёў літоўскіх. Адыход ад традыцыі талерантнасці, звязаны з прыняццем Літвою заходняга хрысціянства ды яе імкненнем уберагчыся ад рутэнізацыі, быў часовай зменай гэтай палітыкі. Рэлігійная нецярпімасць дзяржаўнай улады Вялікага Княства, галоўныя прынцыпы якой утрымліваліся ў прывілеях 1387 і 1413 г., пасля Вітаўта не вытрымала выпрабавання жыццём. З укняжаннем Свідрыгайлы праваслаўныя князі і паны адразу ўзняліся на важныя дзяржаўныя пасады, і хоць той хутка страціў уладу, з імі ўжо нельга было не лічыцца. Троцкі прывілей 1434 г. азначаў пераход да больш рэалістычнай канфесійнай палітыкі, і згаданыя абмежаванні па канфесійнай прыналежнасці ператвараліся ў анахранізм.

Дыскрымінацыя праваслаўных падданых, якая выяўлялася ў іх недапусканні да найвышэйшых урадаў, сама па сабе была не перасследам, а стрымліваннем праваслаўя. Афіцыйнае стаўленне вялікіх князёў да праваслаўнай царквы заўсёды характарызавалася лаяльнасцю. Нават дэспатычны Вітаўт, загадваючы ў 1392 г. хрысціць у лацінскі абрад яшчэ неахрышчаных літоўцаў, распарадзіўся даваць русінам волю выбару, а ў грамаце аб прызначэнні мітрапалітам Рыгора Цамблака падкрэсліў, што зусім не хоча, каб у яго княстве грэцкая вера «змяншалася ці гінула, і цэрквы... ў заняпад прыходзілі», ды што рупіцца толькі аб парадку і ладзе ў праваслаўнай царкве.

Адносіны дзяржавы да праваслаўнай царквы ў Вялікім Княстве з канца XV ст. афіцыйна рэгуляваліся заканадаўствам. У 1499 г. па просьбе кіеўскага мітрапаліта Іосіфа Балгарыновіча вялікі князь Аляксандр выдаў спецыяльны дэкрэт, які забяспечваў юрысдыкцыю мітрапалітам і епіскапам ды іх судам. Грамата Аляксандра перадавала ў суд мітрапаліта справы як супраць каталікоў, так і супраць праваслаўных, забараняючы ўраднікам, незалежна ад іх веравызнання, умешвацца ў царкоўнае судаводства, не дазваляла вяльможам здымаць з пасадаў святароў без дазволу мітрапаліта і аберагала маёмасць царквы ад канфіскацыі свецкай уладай. Цяпер ніхто не мог чыніць праваслаўнай царкве «крыўды» і ўмешвацца ў яе справы.

У цэлым за гады княжанняў Аляксандра Казіміравіча, Жыгімонта Старога і Жыгімонта Аўгуста дзяржаўная палітыка Вялікага Княства Літоўскага ў сферы канфесійнага жыцця эвалюцыянавала ад талерантнасці да свабоды веравызнанняў. У перспектыве нарастальнага напружання ў адносінах з Масквой стаўленне ўладаў Вялікага Княства да праваслаўнага насельніцтва сваёй дзяржавы і не магло быць неталерантным. Статут 1529 г. як першы агульнадзяржаўны прававы кодэкс аднолькава пацвердзіў правы і свабоды не толькі каталіцкага касцёла, але і праваслаўнай царквы. У часе рэформаў напярэдадні Люблінскай уніі дайшло і да фармальнага ураўноўвання правоў вернікаў розных рэлігій, зафіксаванага ў прывілеі 1563 г. Нездарма калі пасля Берасцейскай царкоўнай уніі стала нарастаць канфесійная напруга, эпоха Ягайлавічаў ставілася ў станоўчы прыклад, а пра Жыгімонта Старога пісалася, што ён «цэрквы рускія гэтаксама будаваў і багаціў, як і касцёлы каталіцкія».

Калі б праваслаўе ў Вялікім Княстве сапраўды цярпела перасле, як сцвярджалася ў Маскве, дык сюды не ўцякалі б шматлікія падданыя маскоўскага манарха — і князі, і пярэднейшыя баяры. Між тым і яны, зацятыя

абаронцы праваслаўя, добра адчувалі сябе пад уладаю Ягайлавічаў. Так што пра прыгнечаны стан грэцкай царквы ў Вялікім Княстве да другой паловы XVI ст., тым больш пра яе пераслед, гаварыць не даводзіцца. Галоўная праблема таілася ва ўнутраным стане самога праваслаўя на землях Беларусі ды Украіны. Тое, што ерархія фармавалася толькі з небагатых родаў, што праваслаўныя магнаты амаль не апекаваліся сваёй царквой, што бракавала заможных апекуноў — усё гэта аслабляла царкву, паніжала яе інтэлектуальна–культурны ўзровень. Царква не давала патрэбнай адукацыі, і наогул, як сведчыў сучаснік, «не магла школ і навук паспалітых пашыраці, бо яны не фундаваліся». У дадатак праваслаўнае духавенства перажывала маральнае разлажэнне. «Блуды і распушчэнствы» у грэцкай царкве трывожылі і цэнтральную ўладу. Сам Жыгімонт Аўгуст у 1546 г. у пасланні кіеўскаму мітрапаліту Макарыю II (1534—1556) прапанаваў тэрмінова склікаць сабор ды прыняць захады па аздараўленні сітуацыі. Падобнае ўнутранае становішча грэцкай царквы не толькі падрывала яе пазіцыі ў супрацьстаянні з каталіцкім касцёлам, але і паніжала аўтарытэт праваслаўнай веры ў вачах грамадства.

Праваслаўе да 1385 г. было амаль дзяржаўнай рэлігіяй. Але пасля Крэўскай уніі пануючай рэлігіяй у ВКЛ стала каталіцтва. На пачатку XVI ст. каталіцкая рэлігія ўвайшла ў паласу крызісу. Сутнасць яго зводзілася да крытычных адносін шляхты як да каталіцкага культу, так і да арганізацыі касцёла і яго палітыкі. На глебе барацьбы паміж свецкай і духоўнай уладамі прарасла Рэфармацыя.

Рэфармацыя – грамадска-палітычны і рэлігійны рух, накіраваны супраць каталіцкай царквы як ідэйнай асновы феадалізму.

Шляхту і заможных гараджан Рэфармацыя прывабіла магчымасцю падарваць магутнасць царквы, якая ўшчымляла іх правы. У адрозненне ад заходнееўрапейскай, Рэфармацыя на Беларусі праходзіла на феадальным сацыяльна-эканамічным базісе, а яе асноўнай рухаючай сілай была феадальная знаць.

Найбольшае пашырэнне ў княстве атрымаў кальвінізм, абаронцам якога стаў Мікалай Радзівіл Чорны. Ён заснаваў у Вільні першую пратэстанцкую абшчыну. На тэрыторыі Беларусі было арганізавана больш за 50 кальвінісцкіх абшчын, а пры іх – цэрквы, школы, друкарні. Найбуйнейшымі рэфармацыйнымі цэнтрамі на Беларусі сталі Бярэсце, Нясвіж, Віцебск, Новагародак, Клецк, Іўе, Слуцк, Койданава і іншыя. Вакол іх групаваліся выдатныя вучоныя, прапаведнікі, пісьменнікі, кнігавыдаўцы.

У 60-я гг. XVI ст. на Беларусі, у Літве і на Украіне з кальвінізму вылучыўся больш радыкальны напрамак – арыянства, ці антытрынітарызм. Яго ідэолагі (Сымон Будны, Васіль Цяпінскі і іншыя) патрабавалі радыкальных сацыяльных пераўтварэнняў, асуджалі прыгонніцтва, прапаведвалі агульнасць маёмасці, што прывяло іх да канфлікту з кальвінісцкай шляхтай. У сярэдзіне XVII ст. члены арыянскіх абшчын былі выгнаны з Рэчы Паспалітай. У другой палове XVII ст. пад ударамі Контррэфармацыі Рэфармацыя сыходзіць з гістарычнай арэны.

Папства зрабіла стаўку ў выратаванні каталіцкай царквы на ордэн езуітаў. У ВКЛ езуіты з’явіліся на наступны год пасля Люблінскай уніі,

выкліканыя віленскім біскупам для барацьбы з Рэфармацыяй. Галоўным ідэолагам Контррэфармацыі на Беларусі і ў Літве стаў Пётр Скарга. Правячыя колы Рэчы Паспалітай надзялялі езуітаў вялікімі зямельнымі ўладаннямі. Эканамічная моц забяспечыла ім магутны ідэалагічны і палітычны ўплыў.

Езуіты ўзялі ў свае рукі адукацыю – адкрылі акадэмію ў Вільні і 11 калегіумаў на Беларусі, пакрылі яе сеткай сваіх касцёлаў і кляштароў, заняліся дабрачыннай дзейнасцю. Адноўлены і ўзмоцнены каталіцызм пачаў выціскаць пратэстанцкія абшчыны. К канцу XVII ст. Контррэфармацыя ў княстве перамагла.

Да сярэдзіны XVII ст. – польскія каралі практычна падпарадкавалі сабе праваслаўную царкву.

Распрацаваная Трыдэнцкім саборам праграма рэстаўрацыі касцёла прадугледжвала распаўсюджванне яго ва ўсходнеславянскім свеце. Заснаванне Маскоўскага патрыярхату ў 1589 г. узмацняла праваслаўе на рускіх землях. Таму Ватыкан паспяшаўся з набліжэннем да сябе другой часткі гэтага свету – беларуска-украінскай – праз унію. Яго намеры супалі з імкненнем палітыкаў умацаваць Рэч Паспалітую праз адзінавер'е ўсіх яе падданых.

Некаторых мясцовых праваслаўных лідэраў (К. Астрожскі, І. Пацей, К. Тарлецкі і іншыя) прывабіў сваёй жыццяздольнасцю каталіцкі захад. Яны ўбачылі шлях да пераадолення духоўнага крызісу ў заключэнні уніі з Рымам. Гэты шлях быў рэалізаваны ў выглядзе Берасцейскай уніі.

Новы накірунак хрысціянства – уніяцтва – быў аформлены на Берасцейскім саборы 6 – 9 кастрычніка 1596 г. Ён прадугледжваў захаванне праваслаўнай абраднасці, царкоўна-славянскай мовы ў набажэнстве, але прызнаваў вяршэнства папы рымскага, каталіцкае веравучэнне.

Але замест спакою унія стала крыніцай раздораў. Першым напрамкам рэлігійнай барацьбы была літаратурна-багаслоўская палеміка. Другім напрамкам была парламенцкая барацьба. На сеймах паміж праваслаўнымі і уніятамі адбываліся вострыя спрэчкі. Трэцяй формай рэлігійнай барацьбы была адміністрацыйная барацьба: закрыццё праваслаўных цэркваў, перадача іх і манастыроў уніятам.

Па Беларусі пракацілася хваля антыуніяцкіх выступленняў. Першай акцыяй стала паўстанне Севярына Налівайкі (1595 – 1596). З пачатку XVII ст. усё большую вагу пачалі набываць казакі. Яны пачалі бараніць пакрыўджаную царкву. У 1648 г. на барацьбу з прыгнятальнікамі ўзнялося запарожскае казацтва на чале з Б.Хмяльніцкім, адным з галоўных патрабаванняў паўстання была ліквідацыя уніяцкай царквы.

2. Гуманізм. Дзеячы Адраджэння на Беларусі. Кнігадрукаванне. Францыск Скарына і яго дзейнасць.

Беларускую культуру не абмінула такая з'ява як Адраджэнне, або Рэнесанс – эпоха станаўлення і росквіту ранняй буржуазнай культуры. Адраджэнне было абумоўлена якаснымі зменамі ў эканамічным і палітычным жыцці краін: зараджэннем капіталістычных адносін, фарміраваннем нацыянальных дзяржаў і абсалютных манархій, узмацненнем антыфеадальнай і

рэлігійнай барацьбы. Вялікія геаграфічныя адкрыцці, з'яўленне кнігадрукавання, развіццё навукі і тэхнікі прывялі да ўзнікнення новай, пераважна свецкай культуры. На гэтай аснове сфарміраваўся новы, гуманістычны светапогляд. Гуманізм – філасофска-светапоглядная пазіцыя, яка сцвярджае высокую годнасць чалавека – творцы зямнога шчасця, прызнае права на свабоднае развіццё яго здольнасцей, абараняе ідэалы справядлівасці, чалавекалюбства, свабоды і дасканаласці асобы.

У канцы XV – пачатку XVI ст. склаліся перадумовы Рэнесанса на Беларусі: рост гарадоў, фарміраванне беларускай народнасці, ажыўленне грамадска-палітычнай дзейнасці і г.д.

Прадстаўніком рэнесансавай культуры на Беларусі быў першадрукар, гуманіст і асветнік Францыск Скарына (каля 1490 – каля 1551 гг.). У 1517-1519 гг. ён у Празе пераклаў і выдаў (з каментарыямі) Псалтыр і 22 кнігі Старога запавету Бібліі. У 1522 г. ён пераехаў у Вільню, дзе заснаваў першую на тэрыторыі ўсходніх славя друкарню, з якой вышлі "Малая падарожная кніжыца" (1522 г.) і "Апостал" (1525 г.).

У 1550-я гг. у Бярэсці пачала працаваць пратэстанцкая друкарня Мікалая Радзівіла Чорнага – першая на Беларусі. Наогул, пратэстанцкія друкарні ў 1560-1570-я гг. дзейнічалі ў Нясвіжы, Вільне, Слуцку, Уздзе, Лоску, Іўе, Ашмянах. Сярод найбольш вядомых выданняў пратэстантаў – "Брэсцкая біблія" (1563 г.), "Нясвіжская біблія" (1572 г.), "Новы запавет" (1574 г.), "Размова паляка з літвінам" (1564 г.).

Першую кірылічную кнігу (на старажытнабеларускай мове) – Катэхізіс выдалі Сымон Будны і Лаўрэнці Крышкоўскі ў Нясвіжскай друкарні ў 1562 г., у той жа год С.Будны надрукаваў "Пра апраўданне грэшнага чалавека перад богам", пазней – "Біблію" (1572 г.), "Новы Завет" (1574 г.), "Аб галоўных палажэннях хрысціянскай веры" (1576 г.).

У 1570-я гг. у маёнтку Цяпіна на Полаччыне заснаваў друкарню Васіль Цяпінскі. Ён выдаў "Евангелле" на царкоўна-славянскай мове з паралельным перакладам на беларускую мову. С.Будны і В.Цяпінскі выступалі ў абарону беларускай мовы, за развіццё на ёй пісьменнасці і кнігадрукавання.

Рускія першадрукары – Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец пасля выгнання з Масквы працавалі на Беларусі ў маёнтку Р.Хадкевіча Заблудава. Яны выдалі "Евангелле вучыцельнае" (1569 г.) і "Псалтыр з Часасловам" (1570 г.). У 1580-я гг. І.Фёдараў пераехаў у Астрогу, дзе выдаў "Астрожскую біблію" (1580-1581 гг.), а П.Мсціславец працаваў у друкарні братоў Мамонічаў у Вільні.

Напрыканцы XVI ст. у княстве дзейнічалі шматлікія друкарні – прыватныя, пры буйных праваслаўных брацтвах, пратэстанцкія, вельмі актыўную дзейнасць распачалі езуіцкія друкарні. Выдавалася самая розная літаратура на беларускай, польскай, лацінскай мовах – як багаслоўская, так і свецкая, у тым ліку, прававая. Так, ў 1588 г. у друкарне Мамонічаў у Вільне ўпершыню быў выдадзены свод законаў – Статут ВКЛ. Выдавецкая дзейнасць была цесна звязана з развіццём літаратуры.

3. Грамадска-палітычная думка і літаратура. Сістэма адукацыі.

Эпоха Адраджэння наклала адбітак літаральна на ўсе бакі грамадска–палітычнага і культурнага жыцця краіны. Наяўнасць этнічна беларускага насельніцтва каталіцкага веравызнання (размешчанага пераважна на захадзе цяперашняй тэрыторыі краіны), развіццё вольных магдэбургскіх гарадоў, традыцыйная верацярпімасць і павялічэнне колькасці людзей з еўрапейскай адукацыяй — усё гэта спрыяла глыбокім культурным пераменам.

У выніку пранікнення новай заходнелацінскай традыцыі і яе сутыкнення з грэцка–візантыйскай, якая ў першай палове XVI ст. тут яшчэ цалкам дамінавала, на землях Беларусі пачаўся працэс культурнай сінтэзацыі. Спалучэнне ўсходніх і заходніх уплываў найвыразней праявілася ў развіцці літаратуры, пісьменства, архітэктуры. У літаратуры ўспрыманне новага адбывалася дзякуючы перакладам. Перакладаліся не толькі тэксты Святога Пісання і літургічныя творы, але жыціі святых, апакрыфічныя творы, духоўныя і свецкія аповесці.

Як і раней, працягвалі складацца рукапісныя Палеі, Пацерыкі, Пралогі, Мінеі – яны складаліся з твораў антычных і грэка-візантыйскіх аўтараў. У эпоху Адраджэння да іх дабавіліся пераклады заходнееўрапейскіх свецкіх раманаў – такіх як “Аповесць пра Баву”, “Гісторыя пра Атылу”, “Аповесць пра Трышчана”, “Александрыя”, “Троя”, дыдактычныя навелы, зборнікі фацэцый (анекдатычных гісторый).

З XIV ст. з’явілася летапісанне ВКЛ. У летапісах абгрунтоўвалася неабходнасць стварэння ВКЛ, абаранялася цэнтралізатарская палітыка вялікіх князёў. Помнікі – “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх” (прыкладна 1396 г.), “Пахвала Вітаўту”(канец 1420-х гг.), “Беларуска-літоўскі летапіс” (1446 г.).

На змену летапісанню разам з Адраджэннем ў XVI ст. прыйшла гістарычная проза і мемуарыстыка: “Баркулабаўскі летапіс”, “Дзённік” Федара Еўлашоўскага, “Пахвала гетману Канстанціну Астрожскаму” (пасля 1514 г.), на беларускую мову перакладалі “Хроніку” М.Стрыйкоўскага, “Хроніку” М.Бельскага.

У 1516 г. была выдадзена паэма “Пруская вайна” Яна Вісліцкага (родам з Беларусі, “русін”) на лацінскай мове, у якой аўтар апісвае перамогу славянскіх народаў над крыжакамі ў Грунвальдскай бітве. У 1523 г. у Рыме была выдадзена яшчэ адна паэма аўтара-беларуса Міколы Гусоўскага – “Песня пра зубра”, так сама на лацінскай мове. Гэта было пачаткам рэнесанснай лацінскамоўнай традыцыі ў беларускай паэзіі.

Заснавальнікам панегірычнай літаратуры (панегірык – хвалебная прамова) на Беларусі лічыцца Андрэй Рымша. Яго “Панегірык гербу Льва Сапегі” (1588 г.), а так сама панегірыкі гербам А.Валовіча, Ф.Скумны былі прыкладам для іншых аўтараў. У беларускай паэзіі з’явіліся жанры: дэкламацыя, вершаваныя прысвячэнні, сатырычная паэзія, паэтычныя “плачы”, “ляманты”, эпіграммы.

Адукацыя, як і ў папярэдні перыяд, захоўвала рэлігійны характар. Пры праваслаўных цэрквах і манастырах існавалі школы, у іх праграму навучання ўваходзілі: царкоўна-славянская граматыка, матэматыка, філасофія, тэалогія. Разам з тым, пры праваслаўных брацтвах (гэта грамадскія аб’яднанні

прыхажан) у Вільні, Магілёве, Слуцке, Бярэсце, Полацку і інш. дзейнічалі брацкія школы з больш шырокай праграмай, што ўключала вывучэнне замежных і класічных (лацінскай і грэчаскай) моў, гісторыю, рыторыку. Навучанне ў іх было галоўным чынам бясплатным.

Шырокая праграма адукацыі існавала ў пратэстанцкіх школах. Найбольш вядомыя – у Іўі, Вільне, Бярэсце, Слуцку. Пратэстанты выступілі з прапановай заснаваць у ВкЛ універсітэт, але ва ўмовах контррэфармацыі ідэю перахапілі езуіты, а пратэстанцкія школы наогул былі зачынены.

Асабліва хутка развівалася каталіцкая сістэма адукацыі ў XVI ст. згодна з пастановамі сінодаў, кожны прыход павіннен мець пачатковую школу. Акрамя таго, шматлікія каталіцкія манаскія ордэны адчынялі свае сярэднія навучальныя ўстановы – калегіўмы. Асабліва вядомымі былі езуіцкія і піярскія калегіўмы. Першы езуіцкі калегіўм быў заснаваны ў Вільне (1570 г.), на тэрыторыі Беларусі – у Полацку (1581 г.). Калегіўмы давалі класічную гуманітарную адукацыю. Навучанне было бясплатным, прымаліся юнакі любых саслоўяў і веравызнанняў, навучанне працягвалася 6-7 гадоў. Увесь навучальна-выхаваўчы працэс быў прасякнуты рэлігійнай накіраванасцю. У той жа час калегіўмы садзейнічалі ўсталяванню на Беларусі заходне-еўрапейскай сістэмы садзейнічалі ўсталяванню на Беларусі заходне-еўрапейскай сістэмы адукацыі. На базе Віленскага езуіцкага калегіўма ў 1579 г. была створана езуіцкая акадэмія – першая вышэйшая навучальная ўстанова ў ВКЛ. Першым яе рэктарам быў выдатны палеміст, дзеяч ордэна езуітаў – Петр Скарга.

4. Горадабудаўніцтва і архітэктура. Выяўленчае, тэатральнае і музычнае мастацтва

Галоўныя матэрыялы, што выкарыстоўваліся ў будаўніцтве ў тыя часы – дрэва. Гэты матэрыял не спрыяў захаванню пабудоў. Таму мы больш ведаем пра мураваныя збудаванні, якіх будавалі нешмат, але якія лепей захаваліся. У XIV – пачатку XVI стст. асноўны тып манументальных мураваных пабудоў – гэта замак. Менавіта ў XIV ст. з’явіліся цалкам мураваныя замкі-кастэлі, квадратныя ў плане з башняй-данжонам (Крэва, Ліда, Трокі, Меднікі).

У першай палове XVI ст. сфарміраваўся самабытны 4-х вежавы тып праваслаўнага храма з абарончай функцыяй (Мураванкаўская, Сынкавіцкая, Супрасльская цэрквы-крэпасці, Мікалаеўскі сабор у Брэсце). Іх стыль вызначаецца як “беларуская готыка”. Актыўна будаваліся каталіцкія гатычныя храмы – з аднанефавымі, аднаапсіднымі аб’ёмна-прасторавымі кампазіцыямі (касцёлы ў Ішкальдзі, Іўі). З рэфармацыяй з’явіліся новыя культавыя пабудовы – зборы, якія спалучалі гатычныя рысы ў форме пабудовы і рэнесансавы ордэрны дэкор (зборы ў Койданаве, Заслаўі, Замосці, Новым Свержані).

Езуіты прынеслі на Беларусь новы архітэктурны стыль – барока. Першы ўзор архітэктуры барокка на тэрыторыі Рэчы Паспалітай – гэта Нясвіжскі езуіцкі касцёл, які ў 1587-1593 гг. будаваў выдатны архітэктар Джаванні Бернардоні. Для барока характэрны пабудовы ў форме базілікі з плоскім

фасадам. Пабудовы вызначаліся плаўнасцю ліній і багатым знешнім і ўнутраным дэкорам.

Са змяненнем стыляў у будаўніцтве і ўвядзеннем новых прынцыпаў фартыфікацыі прыватныя замкі пачалі трансфармавацца ў палацава-замкавыя комплексы (Нясвіж, Гродна, Гальшаны). Акрамя іх будаваліся палацы з кампактнай цэнтральна-восевай планіроўкай без унутранага двара (дом-крэпасць у Гайцюнішках, Ружанскі замак).

З пашырэннем магдэбурскага права ў гарадах узнікла грамадзянская архітэктура – ратушы, дзе месціліся органы самакіравання (Нясвіж, другая палова XVI ст.).

У межах ВКЛ развіваліся ўсе віды выяўленчага мастацтва. На жаль, прыкладаў манументальнага мастацтва (роспісы храмаў) не захавалася, аб высокай ступені яе развіцця гавараць пісьмовыя крыніцы.

Раннія творы іканапісу ў XIV-XV стст. мелі вялікі ўплыў візантыйскіх узораў. Асноўныя прыкметы – дыспрапорцыя, пласкастное выяўленне, адсутнасць перспектывы. У другой палове XVI ст. у іконапісу адчуваюцца рысы Адраджэння – з'яўляюцца элементы бытавога характару, архітэктурныя кулісы, прасторавасць пабудовы. У пачатку XVI ст. складваецца беларуская іканапісная школа. Найболь папулярны сюжэт у іконапісе – выявы Маці Боскай Адзігітрыі (Багародзіцы). У свецкім жывапісе вылучаецца некалькі накірункаў. Партрэты-іконы характэрны для XIV ст., як прыклад – партрэт-ікона Ефрасінні Полацкай. Выкананы такія партрэты з улікам канонаў іконапісання.

На партрэтах-парсунах ужо больш аб'ёмнае прадстаўленне чалавека, з'яўляюцца элементы перспектывы і рэалізму. Невядомымі мастакамі створаны цікавыя партрэты княгіні Кацярыны Слуцкай (1580 г.), князя Юрыя Алелькавіча, Юрыя Тышкевіча (усе – канец XVI ст.). Перыяду Адраджэння на Беларусі характэрны сармацкі партрэт, з уласцівай яму ўрачыстасцю і параднасцю, увагай да атрыбутаў і гербаў, фактуры прадметаў і дэталяў адзення.

З развіццём кнігадрукавання далейшае развіццё атрымала кніжная графіка. Рукапісныя кнігі аздабляліся мініяцюрамі, друкаваныя – гравюрамі. Заснавальнікам кніжнай гравюры на Беларусі стаў Францыск Скарына. Яго выданні (Біблія, Псалтыр, Малая падарожная кніжыца) былі багата ілюстраваны сюжэтнымі кампазіцыямі і ілюстрацыямі прыкладнога характару, арнаментам.

З пашырэннем на Беларусі каталіцтва звязана паяўленне скульптуры. Самы ранні помнік драўлянай скульптуры, што захаваўся да нашага часу – "Распяцце" з в. Галубічы Глыбоцкага раёна (XIV ст.). У XV-XVI стст. у касцелах з'яўляюцца гатычныя алтары-рэтаблі, з якіх захаваліся толькі асобныя скульптуры. Вялікі ўплыў Рэнесансу наглядаецца ў скульптуры полацкіх майстроў "Святы Гжэгаж" – яе выразнасць набліжаецца да партрэтнай. Наогул, да скульптуры XVI ст. характэрна дасканалая апрацоўка форм чалавечай фігуры, увага да побытавых дэталяў. З'явіўся новы тып скульптуры – надмагіллі (Віленскі кафедральны сабор, надмагіллі канцлера А.Гаштольда і біскупа П.Гальшанскага, абодва – сярэдзіна XVI ст.).

У дэкаратыўна-прыкладным мастацтве вядучымі галінамі заставалася мастацкая апрацоўка металаў і вытворчасць ювелірных вырабаў. У гатычнай традыцыі зроблены пацір з Ружан (канец XV ст.), абклад Лаўрышаўскага евангелля (пачатак XV ст.). Уплыў Рэнесансу бачны ў паціру з Навагрудка (XVI ст.). Мясцовыя майстры арганічна спалучалі традыцыі ранейшых часоў і асаблівасці заходнееўрапейскага мастацтва.

Развіцце музычнага мастацтва шло ў межах царкоўных устаноў. З канца XV ст. развіваецца кантавая культура спеваў, а ў другой палове XVI ст. – партэсныя спевы, спевакоў рыхтавалі ў брацкіх і манастырскіх школах.

У самым канцы XVI ст. пры каталіцкіх установах-кляштарах сталі ўтварацца капэлы – калектывы, якія складаліся з аркестра і групы вакалістаў. З будаўніцтвам новых каталіцкіх храмаў пачала пашыралася арганная музычная культура.

У XIV-XVI стст. шырокую папулярнасць у народзе атрымаў лялечны тэатр – батлейка. Прадстаўленні даваліся пад час ярмарак, на рынках, запрашалі лялечнікаў і да двароў феадалаў.

Тэма 16. Войны сярэдзіны XVII і іх наступствы. Паўночная вайна на Беларусі.

1. Казацка-сялянская вайна 1648 – 1651 гг.

Распачатае ў 1648 г. на Украіне казацкае паўстанне на чале з гетманам Багданам Хмяльніцкім хутка вылілася ў вялікую вызваленчую вайну. Ва ўкраінскага гетмана і казацкай старшыны падчас гэтай барацьбы з'явіўся план стварэння сваёй дзяржавы, у межы якой яны хацелі ўключыць і землі паўднёва-ўсходняй Беларусі, прынамсі Падняпроўе і Палессе. Яшчэ ў маі 1648 г. Багдан Хмяльніцкі пачаў засылаць у гэтыя раёны сваіх агітатараў, а затым і казацкія загоны, якія распачыналі ваенныя дзеянні. Універсалы, якія ўкраінскі гетман высылаў аж да Барысава, Быхава і Магілёва, заклікалі сялян узбройвацца ды пачынаць вайну супраць паноў. Сацыяльная глеба для паўстання ў Беларусі была вельмі прыдатная, таму казацкі рух хутка перакінуўся і сюды. Народныя нізы на поўдні і ўсходзе Беларусі актыўна ўключыліся ў барацьбу, якая мела ярка выражаны сацыяльны і ў пэўнай ступені рэлігійны характар. Як адзначалі ваяводы памежных маскоўскіх гарадоў, паміж беларусамі і палякамі пачалася "сварка за веру".

З'яўленне казацкіх загонаў Нябабы, Галавацкага, Крывашапкі, Мікуліцкага, Гаркушы, Сакалоўскага і іншых палкоўнікаў, сярод якіх оыло нямала беларусаў (з ліку палкоўнікаў Хмяльніцкага многія таксама мелі беларускае паходжанне, напрыклад Бутрым, Грамыка, Крычэўскі, Ждановіч, Нячай, Хведаровіч), выклікала масавае далучэнне да іх бяднейшага сялянства і мяшчанства. Ужо летам 1648 г. на поўдні і ўсходзе Беларусі пачалася шырокая ўзброеная барацьба казацка-сялянскіх аддзелаў супраць шляхты, купцоў, магнатаў і каталіцкага духавенства. Узброіўшыся, сяляне-паўстанцы грамілі

галоўным чынам маёнткі сваіх паноў, рабавалі двары, знішчалі падатковыя дакументы і рэестры. Да восені 1648 г. жыхары Гомеля, Мазыра, Лоева, Рэчыцы і Турава "ўсе паказачыліся і пакляліся адзін другому стаяць да апошняга". Казакі авалодалі таксама Чачэрскам, Брагінам, Бабруйскам, Чэрыкавам, Пінскам і іншымі гарадамі. Перапужаная шляхта ўцякала ў глыб краіны. Хоць колькасна аснову ўзброеных фарміраванняў паустанцаў складалі мясцовыя прыгонныя сяляне і бяднейшыя мяшчане, стрыжнёвай і арганізацыйнай сілай у занятых раёнах заставаліся ўкраінскія казакі. Паколькі сацыяльныя вярхі грамадства былі ўжо фактычна апалячаныя, антыфеадальны рух набыў тут, як і на Украіне, выразную антыпольскую накіраванасць.

3 боку дзяржавы доўгі час не праводзілася ніякіх ваенных акцый супраць паўстанцаў. Састарэлы Ян Кішка, вялікі гетман, разгубіўся і нават не сабраў войска. Да восені 1648 г. у руках паўстанцаў апынуліся амаль усе галоўныя гарады паўднёва-ўсходняй Беларусі. У шэрагу выпадкаў сялянам з казакамі ўдалося нават разбіць шляхецкія фарміраванні (напрыклад, у Кобрыне - войска стольніка В.Гасеўскага, пад Мазыром - жаўнераў пісара Валовіча, а каля Чэрыкава - аддзел Лукамскага). Казацка-сялянскі полк Сакалоўскага паспрабаваў здабыць горад Слуцк - буйнейшую на той час фартэцыю Вялікага Княства, аднак пасля бясплённай аблогі адышоў ад яго. Дарэмнай была спроба казакоў захапіць другую важную фартэцыю ўсходняй Беларусі - Стары Быхаў.

Толькі ўвосень 1648 г. на барацьбу з паўстанцамі ўрад накіраваў некалькі фарміраванняў шляхты і наёмных жаўнераў. Хоць у сутычках каля Рэчыцы і Рагачова казакі і сяляне разбілі іх, прымусіўшы адступіць, у кастрычніку таго ж года значныя сілы шляхецкага войска, якімі кіраваў стражнік Мірскі, пасля ўпартай барацьбы авалодалі Пінскам. Затым шляхецкае войска авалодала Чэрыкавам, а ў студзені 1649 г., калі на поўдні Беларусі з 10-тысячным войскам з'явіўся палявы гетман Януш Радзівіл, пачалася буйная кампанія па ўдушэнні паўстання.

Гетман рушыў уздоўж Беларускага Палесся, ад Бярэсця на Тураў, Мазыр і далей. Хутка захапіўшы Тураў, Мазыр, Бабруйск, Рэчыцу і бязлітасна расправіўшыся з абаронцамі, ён за зіму 1649 г. ліквідаваў усе асноўныя асяродкі хваляванняў. За час перамір'я паміж Багданам Хмяльніцкім і Янам Казімірам войска Януша Радзівіла цалкам узяло пад свой кантроль землі ўздоўж Прыпяці і Дняпра, чым адрэзала Беларусь ад украінскіх казакаў.

Аднак вясной 1649 г., пасля таго як ад гетмана Хмяльніцкага прыйшоў 3-тысячны казацкі загон палкоўніка Іллі Галоты, вызваленчы рух на поўдні Беларусі ўзнавіўся. Дзякуючы далучэнню мясцовага сялянства сілы Галоты неўзабаве павялічыліся да 30 тыс. чалавек. У чэрвені Януш Радзівіл пачаў аперацыю супраць казацка-сялянскіх фарміраванняў і неўзабаве разграміў полк Галоты ў бітве каля Прыпяці. Тады Хмяльніцкі прыслаў на Беларусь яшчэ 6 тыс. казакоў на чале з Гаркушам і Пабадайлам, да якіх пазней быў накіраваны і загон палкоўніка Міхаіла Крычэўскага. Для ўкраінскага гетмана, які ўзнаўляў ваенныя акцыі супраць кароннага войска, важна было затрымаць сілы Вялікага Княства ў Беларусі, не дапусціць іх супольных дзеянняў з палякамі.

Разам з мясцовым сялянствам, якое прыстала да казакоў, сілы палкоўніка М.Крычэўскага дасягалі прыкладна 30 тыс. Каб не даць ім злучыцца з фарміраваннямі Пабадайлы, што стаялі ўмацаваным лагерам каля Лоева, паміж Дняпром і Сожам, Януш Радзівіл атакаваў непрыяцеля і ў жорсткай бітве 21 чэрвеня 1649 г. разграміў моцнае злучэнне Крычэўскага. Хутка быў знішчаны і лагер Пабадайлы, сілы якога здолелі вырвацца з акружэння. Пасля гэтага харугвы палявога гетмана ліквідавалі асяродкі паўстанцкага руху ў Пасожжы і некаторых іншых раёнах Беларусі. Вядома, што ў 1649 г. разам з рэгулярным войскам Януша Радзівіла супраць паустанцаў вяло барацьбу і фарміраванне беларускіх мяшчан і шляхты.

Апошнім значным подыхам казацка-сялянскай вайны стала ажыўленне хваляванняў у тым жа рэгіёне ў 1650 і летам 1651 гг, але яно зноў было хутка падаўлена Янушам Радзівілам. Летам 1651 г. Б.Хмяльніцкі накіраваў пад Гомель полк Забелы, а да Крычава - полк Шохава, што ажывіла выступленні мясцовай беднаты. Аднак ні Гомель, ні Крычаў казакі не захапілі. У ліпені 1651 г. гетман рушыў на Украіну. Злучэнне Марціна Нябабы (15 тыс), высланае Хмяльніцкім з мэтай затрымаць Радзівіла ў Беларусі, было цалкам разгромлена каля лоеўскіх перапраў. Неўзабаве Радзівіл пераможна ўвайшоў у Кіеў.

Паражэнне Б.Хмяльніцкага ад польскай арміі пад Берасцечкам карэнным чынам змяніла сітуацыю. Паводле Белацаркоўскага мірнага дагавора ад 18 верасня 1651 г. казацкія загоны больш не маглі знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі і адводзіліся на Украіну. Так былі канчаткова ліквідаваны народныя хваляванні ў беларускім краі.

У выніку ваенных дзеянняў вялізныя абшары паўднёва-ўсходняй Беларусі былі спустошаны і выпалены. Асабліва пацярпелі Мазырскі, Пінскі, Рэчыцкі паветы, а таксама Берасцейшчына. Шляхта Старадубскага павета пакінула свае маёнткі і больш не вярнулася. Улічваючы цяжкі эканамічны стан гэтых зямель, сойм Рэчы Паспалітай у 1649 г. зменшыў падаткі або зусім вызваліў ад іх шэраг паўднёвых паветаў Беларусі.

Антыфеадальная па сваёй сутнасці казацка-сялянская вайна 1648 - 1651 гг. у Беларусі з'яўлялася складовай часткай вялікай вызваленчай вайны на Украіне. Але тут яна не мела такой непарыўнасці і цэльнасці, як на ўкраінскіх землях, а была працэсам перманентным, серыяй лакальных паўстанняў. Не было ў Беларусі і мясцовага казацтва - арганізаванай ваеннай сілы, якая б выступала ў ролі галоўнага суб'екта ўзброенай барацьбы. Адсутнасць адзінага кіраўніцтва і сталага арганізацыйнага цэнтра ў рэгіёне, ахопленым хваляваннямі, не дазваляе разглядаць яе як самастойную з'яву беларускай гісторыі. Аднак па сваіх маштабах гэта была несумненна самая масавая ў гісторыі Беларусі адкрытая ўзброеная барацьба ніжэйшых слаёў народа супраць феадальнага прыгнёту.

2. Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай з 1654—1667 гг.

Вясной 1654 г. пачалася чарговая вайна Рэчы Паспалітай з Рускай дзяржавай. Амаль адразу былі заняты 33 гарады. Шэраг з іх здаваліся без бою,

бо сярод праваслаўнага насельніцтва ВКЛ былі моцныя прарасійскія настроі, а сярод мясцовай шляхты і духавенства вялася прапаганда, што за імі будуць захаваны іх правы і прывілеі, а тым, хто пяройдзе на царскую службу, гарантаваліся новыя ўладанні. Летам 1655 г. амаль уся Беларусь была занята рускімі войскамі. 31 ліпеня была захоплена Вільня.

Цяжкае становішча для Рэчы Паспалітай вырашыла выкарыстаць Швецыя. Летам 1655 г. шведскія войскі напалі на Польшчу і даволі хутка занялі большую частку Польшчы і Жамойць. У жніўні 1655 г. частка магнатаў ВКЛ на чале з канцлерам Янушам Радзівілам падпісалі ў Кейданах унію са Швецыяй, якая разрывала унію з Польшчай. У гэты час рускі цар Аляксей Міхайлавіч заключыў з Рэччу Паспалітай Віленскае перамір'е (24 кастрычніка 1656 г.), у адпаведнасці з якім Польшча і Расія спынялі ваенныя дзеянні паміж сабою і аб'ядноўваліся для барацбы са шведамі. У маі 1657 г. супраць Швецыі выступілі Аўстрыя і Расія, у чэрвені – Данія. Шведы паступова выціскаліся з захопленых зямель.

Віленскае перамір'е прыпыніла рух расійскіх войск на яшчэ не занятыя тэрыторыі Беларусі. Разам з гэтым на акупіраваных землях расла незадаволенасць царскай адміністрацыяй. Узмацніліся антымаскоўскія тэндэнцыі і сярод дзеючых у Беларусі казакоў. На гэта паўплывала смерць Б.Хмяльніцкага ў 1657 г., на замену якому прыйшлі гетманы, што прытрымліваліся прапольскай палітыкі.

У 1658 г. баявыя дзеянні паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй узнавіліся. Адначасова працягваліся ваенныя дзеянні супраць Швецыі. У 1660 г. паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй быў падпісаны Оліўскі мірны дагавор. Амаль уся Лівонія адыходзіла да Швецыі. Толькі невялікая яе частка – Латгалія – засталася за Рэччу Паспалітай.

Пасля гэтага ўсё польскае войска было накіравана на Беларусь, дзе яно атрымала шэраг перамог. Ужо ў 1661 г. рускія войскі пакідаюць Мінск, Барысаў, Магілёў.

У далейшым вайна вялася з пераменным поспехам і пасля працяглых перамоў скончылася падпісаннем у 1667 г. Андрусаўскага перамір'я тэрмінам на 13,5 гадоў. У адпаведнасці з яго ўмовамі да Расіі адыходзілі Смаленскае ваяводства з усімі паветамі і гарадамі, Старадубскі павет, Чарнігаўскае ваяводства і Левабярэжная Украіна. Кіеў з акругай у адну мілю быў перададзены Расіі на два гады. У 1686 г. у Маскве быў падпісаны паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай "вечны мір", у адпаведнасці з якім Польшча канчаткова адмовілася ад Кіева, атрымаўшы грашовую кампенсацыю.

3. Прычыны і пачатак Паўночнай вайны. Ход баявых дзеянняў і вынікі вайны для Беларусі.

Не абмінула Беларусь і Паўночная вайна (1700–1721). Данія, Расія, Саксонія і Рэч Паспалітая (саксонскі курфюрст Аўгуст II быў адначасова і каралём Рэчы Паспалітай – з 1697 г.) заключылі саюз супраць Швецыі. Кожная з саюзных дзяржаў мела свой уласны тэрытарыяльны інтарэс. Аўгуст II быў

зацікаўлены ў тым, каб далучыць да Саксоніі ці да Рэчы Паспалітай тэрыторыю Ліфляндыі і Эстляндыі, стаць цвёрдай нагой на берагах Фінскага заліва.
Ваенныя дзеянні распачаў Аўгуст II. Праз некаторы час Данія пацярпела паражэнне ад Карла XII у Гальштыніі і выйшла з вайны. Засталіся Аўгуст II і Пётр I. У 1702 г. Карл XII перанёс асноўныя баявыя дзеянні на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, спадзеючыся бліскучай перамогай хутка скончыць усю вайну. Удала выкарыстаўшы сепаратысцкія настроі шляхты на чале з вялікім гетманам літоўскім Казімірам Янам Сапегам, усяго за некалькі месяцаў Карл XII здолеў захапіць Вільню, Гродна і Варшаву. У 1704 г. шведы дамагліся ад Варшаўскай канфедэрацыі абрання новага караля, якім стаў познанскі ваявода Станіслаў Ляшчынскі. У сваю чаргу Аўгуст II звярнуўся за дапамогай да Расіі і восенню 1704 г. у ВКЛ увайшла буйная армія Пятра I, да якой далучыліся атрады Радзівілаў, Агінскіх і Вішнявецкіх, што надало баявым дзеянням характар грамадзянскай вайны.

На працягу 1705 – 1706 гг. шведская армія заваявала большую частку Цэнтральнай і Заходняй Беларусі. У 1707 – 1708 гг. баявыя дзеянні перанесліся на ўсходнебеларускія землі . Расійскія войскі вымушаны былі паступова адыходзіць на поўдзень. Менавіта на ўсходзе Беларусі адбылося і першае значнае паражэнне шведскай арміі – 28 верасня (9 кастрычніка) 1708 г. пад в. Лясная (Слаўгарадскі раён) быў разбіты 16-тысячны корпус генерала А. Левенгаўпта і захоплены вялікі абоз. Гэта перамога шмат у чым паспрыяла разгрому войска Карла XII 27 чэрвеня (8 ліпеня) 1709 г. у час славутай Палтаўскай бітвы.

У далейшым Рэч Паспалітая практычна не прымала ўдзелу ў ходзе Паўночнай вайны, якая і так паглыбіла яе гаспадарчы заняпад. На Беларусі за яе гады на трэць скарацілася колькасць насельніцтва.

Такім чынам, амаль бесперапынныя войны, якія вяла Рэч Паспалітая ў другой палове XVI – XVIII ст. прывялі да страты ёю ранейшага становішча на міжнароднай арэне. Яны спрычыніліся і да эканамічнага крызісу дзяржавы, а таксама прывялі да велізарных дэмаграфічных страт.

Тэма 17. Унутрыпалітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў сярэдзіне XVII – першай палове XVIII ст.

1. Унутрыпалітычная сітуацыя ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Палітычны крызіс, узмацненне феадальнай анархіі, рэлігійная сітуацыя.

Шматлікія войны знясілілі Рэч Паспалітую эканамічна. Разбурэнні, прынесеныя шведскім "патопам" (1655-1660), вайной з украінскім казацтвам (1648-1654) і Расіяй (1654-1667), Паўночнай вайной (1700-1721), выклікалі ў дзяржаве дэмаграфічны і гаспадарчы крызіс, адкінулі на дзесяткі гадоў назад яе ў эканамічным развіцці.

Шэраг прычын заняпаду Рэчы Паспалітай быў зак-ладзены ў самім яе грамадскім і дзяржаўным ладзе. У той час, як суседнія дзяржавы перажывалі ўздым і пашыралі свае тэрыторыі, Рэч Паспалітая "трымалася беспарадкам".

Яна апынулася ў стане поўнай анархіі і бязладдзя, якія сталі вынікам злоўжывання "залатымі шляхецкімі вольнасцямі".

Разам з аслабленнем цэнтральнай улады ўзмацнялася магутнасць буйнейшых зямельных магнатаў, якія ператварыліся па сутнасці ва ўдзельных князёў. Радзівілы, Сапегі, Вішнявецкія акружылі сябе шматлюднымі, поўнымі залежнай шляхты дварамі, якія здзіўлялі сучаснікаў сваім ба-гаццем. Заможныя і ўплывовыя магнаты мелі прыватнае войска (так званыя "надворныя харугвы"), з дапамогай якога вялі паміж сабой барацьбу за ўплыў у дзяржаве. іх землі вартавалі шматлікія замкі-крэпасці, нярэдка больш сучасныя і ўмацаваныя, чым дзяржаўныя. Эканамічна адасобленыя ўладанні ўяўлялі своеасаблівыя "дзяржавы ў дзяржаве". У XVII і XVIII стст. магнатэрыя стала рашаючай сілай у краше, яна фактычна кіравала дзяржавай ці, дакладней, сваімі непамернымі амбіцыямі вяла яе да скону. У сваіх бойках за першьшство магнаты ўсё часцей звяртаюцца за падтрымкай да іншаземных дзяржаў. У канцы XVII - пачатку XVIII стст. амбіцыі магнацкіх родаў у ВКЛ даходзяць да ўзброенага саперніцтва, перарастаюць у грамадзянскія войны.

Пасля смерці Аўгуста II у барацьбе з былым каралём Станіславам Ляшчынскім за карону Рэчы Паспалітай перамог сын першага Аўгуст III (1733-1763 гг.). Адзінае, што вызначае гэта кіраванне – адсутнасць войнаў. Гэта зразумела. Моцныя суседзі – Расія, Аўстрыя і Прусія не жадалі разбурэння слабай дзяржавы, якая была бар’ерам паміж імі. Аднак ва ўнутраных справах кароль не меў ніякіх рычагоў уціску. Аўгуст III увесь час жыў у Дрэздэне, сталіцы свайго герцагства, дзе ён быў абсалютным уладаром, а Рэч Паспалітую наведваў пад час сеймаў і паляванняў. Пасля яго смерці карона Рэчы Паспалітай пад уціскам Кацярыны II, рускай імператрыцы, дасталася яе фаварыту Станіславу Аўгусту Панятоўскаму (1764-1795 гг.), які стаў апошнім каралём Рэчы Паспалітай і вялікім князем Літоўскім. Панятоўскі быў стаўленнікам Чартарыйскіх, якія ваявалі супраць Патоцкіх і іх кандыдата – Караля Радзівіла.

На выбарчым сойме 1764 г. намаганнямі Чартарыйскіх і ціскам прысутных пад Варшавай рускіх войскаў, Панятоўскі быў абраны на трон Рэчы Паспалітай і прыняў каралеўскае імя Аўгуст.

Пасля першага поспеху Чартарыйскія і іх прыхільнікі прапанавалі план рэформ, які з некаторымі абмежаваннямі быў прыняты. Было ліквідавана права "ліберум вета", створана так званая "канферэнцыя караля з міністрамі" - прататып кабінета міністраў, які ажыццяўляў выканаўчую ўладу, зроблены захады па ўпарадкаванні фінансавай сістэмы дзяржавы, скасаваны ўнутраныя мытні, уведзены генераль-ны мытны тарыф і інш.

Расія і Прусія не жадалі ўзмацнення Рэчы Паспалітай, выступілі з пратэстам супраць асобных пунктаў праграмы рэформ. Яшчэ ў 1764 г. гэтыя дзве дзяржавы заключылі паміж сабой пагадненне, згодна з якім яны абавязваліся перашкаджаць сілай зброі рэфармаванню дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. Пытаннем, якое зрабіла магчымым для Расіі і Прусіі ўмешвацца ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай, была праблема дысідэнтаў праваслаўных і пратэстантаў, абаронцамі якіх дзве вышэйназваныя дзяржавы выступалі

згодна з ранейшымі пагадненнямі. У Рэчы Паспалітай правы дысідэнтаў былі значна абмежаваныя.

Станіслаў Аўгуст і Чартарыйскія не далі згоды на хуткае ўраўнаванне дысідэнтаў у правах з католікамі, што было ўспрынята Кацярынай II і Фрыдрыхам II як спроба выйсці з-пад кантролю Расіі і Прусіі. Пад патранатам Расіі і Прусіі ў 1767 г. стварылася ў Слуцку праваслаўная, а ў Торуні пратэстанцкая канфедэрацыі, якія ставілі мэтай дасягненне роўнасці канфесій. Да Рэчы Паспалітай былі накіраваны новыя царскія войскі.

У кастрычніку 1767 г. пачаў працу сойм, у парадку дня якога стаяла пытанне аб ураўнаванні ў правах дысідэнтаў і вяртанні дарэформенных парадкаў. Сойм стварыў спецыяльную камісію, якая павінна была выпрацаваць праект рашэнняў у справах дысідэнтаў. Праз год на пасяджэнні сой ма былі прыняты так званыя "Кардынальныя правы", якія мелі сілу закона і вярталі былыя парадкі і прывілеі: 1) выбарнасць караля, права "ліберум вета"; 2) выключнае права шляхты на займанне дзяржаўных пасад і валоданне зямлёй; 3) права суда над прыгоннымі і г. д.

У "Кардынальных правах" меліся і некаторыя новыя нормы. У прыватнасці, памешчыкі былі пазбаўлены права прыгаворваць прыгонных сялян да пакарання смерцю, на тэрыторыі Польшчы была пашырана норма права, якая існавала ў Статуце Вялікага княства Літоўскага, аб крымінальнай адказнасці шляхціча за забойства простага чалавека. "Кардынальныя правы" дэкларавалі нязменнасць дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай і абвяшчалі гарантам гэтага Расійскую імперыю. Так упершыню дэ-юрэ ўнутранныя справы Рэчы Паспалітай былі пастаўлены у залежнасць ад пазіцыі Расійскай дзяржавы. На гэтым жа сойме дысідэнты былі ўраўнаваны ў правах з католікамі. Ім дазвалялася займаць дзяржаўныя пасады, браць шлюб з католікамі і г. д.

2.Эканамічнае становішча. Сялянская і панская гаспадарка. Гарады і мястэчкі. Рамяство і гандаль.

З другой паловы XVII ст. пачынаецца эканамічны заняпад Беларусі. Ён быў выкліканы ўзмацненнем феадальнага прыгнёту, разбурэннем гаспадаркі, як у выніку антыфеадальнай, нацыянальна-вызваленчай барацьбы, так і ў значнай меры ў выніку знешніх войнаў. Аднаўляць разбураную гаспадарку пачалі з раздачы зямлі сялянам і пераводу іх на грашовы і натуральны аброк.

Аднаўленне гаспадаркі пачалося на Беларусі ў пачатку XVIII ст. з галоўнай галіны – сельскай гаспадаркі. Зацікаўлены ў гэтым былі феадальныя ўласнікі – шляхта, магнаты, кароль і царква, у руках якіх знаходзілася галоўнае багацце – зямля і прыгоннае сялянства.

Дробная шляхта гаспадарыла на невялікіх участках зямлі і валодала нязначнай колькасцю сялян. Маёнтак сярэдняга шляхціца складалі некалькі вёсак. Буйнымі землеўладальнікамі былі магнаты, уласнікі вялікіх зямельных латыфундый, у склад якіх уваходзілі некалькі дзесяткаў ці нават соцень вёсак. У канцы XVIII ст. 16 магнацкім сем’ям (Радзівілам, Сапегам, Агінскім, Чартарыйскім і інш.) належала на Беларусі 30% усіх сялян.

Буйнейшым феадальным уласнікам быў кароль Рэчы Паспалітай. Маёнткі, якімі ён распараджаўся, называліся каралеўскімі эканоміямі. Самымі вялікімі каралеўскімі ўладаннямі на ўсходзе Беларусі была Магілёўская эканомія, якая ў пачатку XVII ст. налічвала толькі ворнай зямлі 126 тыс. га. Вялікія землеўладанні належалі каталіцкай і ўніяцкай царквам. Пад час аднаўлення сельскай гаспадаркі феадальная знаць выкарыстоўвала ў асноўным два метады: перавод сялян на грашовы аброк – чынш і пашырэнне фальварка.

Грашовы аброк ужываўся часцей там, дзе разбурэнне было асабліва вялікім і востра не хапала рабочых рук. У гэтых маёнтках памешчыкі вымушаны былі адмаўляцца ад самастойнага вядзення гаспадаркі, перадавалі часова зямлю сваіх фальваркаў сялянам і пераводзілі іх з паншчыны на чынш. Чыншавыя стаўкі былі неаднолькавымі ў розных уладаннях, але досыць высокімі – 30-60 злотых з валокі. Але большасць землеўладальнікаў імкнуліся захаваць свае фальваркі. Развіццё фальварачных запашак пераважала там, дзе насельніцтва, якое хоць і памяншалася, але ў масе сваёй заставалася на месцы. Другая ўмова – памешчык павінен быў мець сродкі для вядзення сваёй гаспадаркі ў фальварку. Па-ранейшаму сеялі азімае жыта (яно займала да 50% усёй плошчы пасеваў), авёс, ячмень, грэчку, а на поўдні Беларусі – проса. Лён і каноплі займалі нязначнае месца ў панскіх пасевах. З-за недахопу рабочых рук і невялікай колькасці жывёлы зямля дрэнна апрацоўвалася і ўгнойвалася, таму сярэдняя ўраджайнасць асноўных культур у фальварках знізілася і складала сам 2-3. У 30-40-я гг. XVIII ст. фальварачныя гаспадаркі ўзмацніліся на захадзе і ў цэнтральнай частцы Беларусі. Для аднаўлення фальваркаў патрэбны былі грашовыя сродкі, якіх у памешчыкаў пастаянна не хапала. Таму з другой паловы XVII ст. стала шырока прадтыкавацца перадача маёнтка ў арэнду або залог. Арандатарамі былі шляхціцы, а часам і купцы, пераважала кароткатэрміновая арэнда на 1-3 гады. Паступова ўзнаўлялася і сялянская гаспадарка. Сяляне пашыралі яе шляхам запашкі пазанадзельнай зямлі, з якой яны не плацілі падаткі (бо ўтойвалі), ці плацілі невялікія падаткі. У аднаўленчы перыяд дзяржаўная ўлада і феадалы, каб хутчэй узняць пустоты, уводзілі розныя льготы для сялян, якія бралі для апрацоўкі дадатковы надзел. Такая палітыка станоўча ўплывала на стан сялянскай гаспадаркі і садзейнічала эканамічнаму ўздыму краіны ў цэлым. Сялянскія надзелы дзяліліся на цяглавыя, за якія ў асноўным выконвалася паншчына, і чыншавыя, за якія галоўным чынам сяляне плацілі грашовы аброк. Дапаўняла іх дзякла. У цэлым па Беларусі ў большасці былі цяглавыя сялянскія гаспадаркі. У сувязі з гаспадарчым разбурэннем павялічылася колькасць сялян, не меўшых амаль ніякіх сродкаў вытворчасці.

Паншчына. Яе адбывалі круглы год і мужчыны і жанчыны, са сваей рабочай жывёлай. Памеры яе вызначаліся з улікам магчымасці селяніну весці сваю гаспадарку. За разглядаемы перыяд памер паншчыны павялічыўся амаль у 3 разы, дасягаючы фантастычных лічбаў 24 дні на тыдні з валокі (маентак Блювенічы Лідскага павету на 1746 г.). У разбураных маентках і дзеля наваселаў рабіліся палегкі – у некалькі разоў памеры павіннасцяў памяньшаліся, але на непрацяглы час. Гвалты, талокі, згоны – работы ўсей сялянскай сям'ей на жніве, сенакосах, узворванні зямлі феадала. Колькасць

гвалтоў часцей за ўсе вызначалося ў 12 на год дзеля сялянскай гаспадаркі. Адзін гвалт мог працягвацца тры дні (маентак Глыбокае Ашмянскага павета, 1702 г.). Падводная павіннасць – на сваей жывёле дастаўляць панскія грузы да прыстані ці ў гандлевыя цэнтры – ажно да Круляўца (зараз Калінінград). Замест паездкі пан мог спаганяць грашовы эквівалент адпрацоўкі, і ен быў вельмі вялікі. Шарваркі – павіннасць заключалася ў рамонце і будаўніцтве дарог-гасцінцаў, мастоў, маенткаў. Мелі нерэгулярны характар. Акрамя таго, сяляне адбывалі старажоўшчыну (розныя гаспадарчыя работы ў двары феадала па чарзе сялянамі адной вескі), начную варту, яны сплаўлялі лес і іншыя грузы ў парты Прыбалтыкі, удзельнічалі ў аблавах пад час панскага палявання і інш., жанчыны прапалвалі агароды, ткалі, мылі для панскага двара. Пад час святаў сяляне павінны былі паднасіць абавязковае “каляднае” і “валачобнае” – пэўную колькасць птушкі і яек. Грашовыя падаткі: Чынш – галоўны падатак для сялян чыншавых. Памер чыншу ў разглядаемы перыяд павялічыўся з улікам інфляцыі амаль у два разы (з 30 злотых у 1682 г. да 120 злотых у 1750-х гг., Крычаўскае староства). Жорнавае – спаганялася панам за права карыстацца сваімі жорнамі. Угайнае, ялавічнае, вепраўшчызна – грашовыя падаткі за права карыстацца ляснымі ўгоддзямі. Чапавое – падата за права вырабляць алкаголь. Куніца – плата за дазвол выйсці замуж у іншую воласць. Усяго налічваецца каля 56 найменаванняў грашовых спагнанняў. Дзяржаўны падатак – падымнае – штогод уносіўся с кожнага дыма. Гіберна, што змяніла серабшчызну, ішла на ўтрыманне войска (спаганялася з дзяржаўных сялян). Рэйтаршчызна – ішла на ўтрыманне магнацкага прыватнага войска. На карысць ваенных спаганяліся з сялян стацыі (натуральны падатак) пад час кватаравання ў той мясцовасці войскаў. Агульны пералік падаткаў немагчымы, бо іх існавала каля 120-140. Максімальныя памеры падаткаў вызначаліся ў інвентарах. Але яны паўсюдна парушаліся арандатарамі і адміністрацыяй маенткаў. Улады, што абараніла бы селяніна – не было. Сялянскія паўстанні. Паўстанне ў Крычаўскім старостве 1743-1744 гг. Доўгія гады сяляне Крычаўскага староства вялі ўпартую барацьбу супраць самавольства кіраўніцтва староства (старастам быў Радзівіл) і арандатараў. Звычайныя формы барацьбы – скаргі, адмовы выконваць павіннасці, уцёкі, вынікаў не давалі. У канцы 1743 г. выбухнула ўзброенае паўстанне. Узначаліў выступленне сялян Васіль Вашчыла і яго паплечнікі: Іван Карпач, Стэсь Бачко, Васіль Вецер. Сяляне і мяшчане Крычава прагналі радзівілавых арандатараў, замест іх абралі са свайго кола. Паўстанцы разграмілі двары найбольш адыёзных шляхціцаў і ліхвяроў і падзялілі маёмасць. Былі знішчаны судовыя і даўгавыя кнігі. На разгром паўстання Радзівіл накіраваў у студзене 1744 г. значны вайсковы атрад на чале з паўкоўнікам Пястжэцкім. Калі галоўныя сілы паўстанцаў былі далёка ад Крычава, Пястжэцкі захапіў горад. 18 студзеня адбыўся няўдалы штурм горада, добра ўзброены атрад Пястжэцкага (меліся нават гарматы) адбіў напад дрэнна ўзброенай беднаты. Паўстанцы разбілі лагер каля вёскі Царковішча і пачалі рыхтавацца да асады Крычаўскага замка. У ноч на 26 студзеня, напярэдадні асады, Пястжэцкі нечакана напаў на лагер і разбіў сялянскае войска, кіраўнікі паўстання былі захоплены і жорстка пакараны. У пачатку лютага паўстанне было канчаткова задушана. Неарганізаванасць, стыхійнасць і лакальнасць –

прыкметы амаль усіх сялянскіх паўстанняў, з-за якіх яны не маглі скончыцца перамогай. Але Радзівіл пайшоў на ўступкі: ён замяніў прымусовыя работы грашовым чыншам, зняў абмежаванні для сялян у гандлі, на некаторы час не здаваў староства ў арэнду.

Не меньш моцным было паўстанне на Каменшчыне 1754-1756 гг. Хваляванні сялян ва ўладаннях Віленскага капітула на Мазыршчыне пачаліся яшчэ ў 1736 г., у 1754 яны перараслі ва ўзброенае паўстанне. Гэтаму паспрыяла пашырэнне на поўдзень Беларусі гайдамацкага руха, што ўзнік на Украіне. Геранім Радзівіл паслаў войскі на задушэнне паўстання, але сяляне аказалі яму сур'ёзнае супраціўленне пад Славечнам. Толькі ў 1756 г. паўстанне было задушана.

Яшчэ адным саслоўем былі мяшчане – жыхары гарадоў. На працягу XVI – першай паловы XVII ст. колькасць гарадоў дасягнула 37. Саслоўе мяшчан павялічвалася за кошт вольных сялян, уцекачоў і прыгонных.

Да першай паловы XVIII ст. магдэбургскае права мелі ўсе буйныя гарады. Магістрат быў вышэйшым органам самакіравання.

Саслоўе мяшчан складалася з заможных вярхоў (багатыя купцы і частка майстроў), сярэдняга пласта (пераважна частка майстроў і гандляроў) і беднаты. За межамі гарадской абшчыны знаходзіліся наёмныя людзі (землякопы, грузчыкі, вадавозы і г.д.).

Юрысдыкцыі магістрата не падлягалі сяляне, якіх пасялялі ў горадзе феадалы (мяшчане прыватных "юрыдык"), а таксама татары і яўрэі, што мелі свае судова-адміністрацыйныя органы.

Асновай эканамічнага жыцця гарадоў былі рамёствы і гандаль. У крыніцах таго часу ўпамінаецца каля 200 прафесій і спецыяльнасцей: па апрацоўцы металу, дрэва, скураной і футравай вытворчасці і г.д.

У той час пачалі ствараццa ўласныя карпарацыі рамеснікаў – цэхі. Звычайна ў цэхі ўваходзіла 60 – 70 чалавек. Цэхі былі трох тыпаў: спецыялізаваныя (адной прафесіі), аб'яднаныя (дзвюх і больш блізкіх прафесій), зборныя (розных прафесій). Цэхавыя статуты рэгламентавалі вытворчую дзейнасць цэха, імкнуліся ахоўваць сваіх рамеснікаў ад канкурэнцыі на рынку. Рамеснікаў, якія не ўваходзілі ў цэхі, называлі "партачамі".

Пашыраўся гандаль як унутраны, так і знешні. Найбольш трывалыя сувязі былі з Расіяй, Польшчай, Левабярэжнай Украінай, Рыгай, з краінамі Заходняй Еўропы. У Заходнюю Еўропу з Беларусі вывозілася жыта, лес і іншыя тавары лясной і сельскай гаспадаркі. Завозілася на Беларусь футра, абутак, мыла, жалеза, сталь, свінец і г.д.

Пастаяннай пагрозай для купецтва было самавольства шляхты, якая рабавала купцоў, разганяла кірмашы. Каб абараніць свае інтарэсы, ствараліся цэхі купцоў, якія рэгулявалі парадак куплі і продажу тавараў і іншыя справы.

Тэма 18. Культура Беларусі ў сярэдзіне XVII – першай палове XVIII ст.

1. Гістарычныя ўмовы этнакультурнага развіцця. Працэс паланізацыі

і яго вынікі.

Пасля войнаў сярэдзіны XVII ст. рэзка ўзмацніліся паланізацыя і акаталічванне ўсходніх зямель Рэчы Паспалітай. Беларуская мова паступова выцяснялася з дзяржаўнага справаводства і афіцыйнага ўжытку. Гэта тэндэнцыя знайшла завяршэнне ў соймавых пастановах 1696 - 1697 гг., паводле якіх паслы Вялікага Княства Літоўскага пагаджаліся: "У справах і пасольствах Рэчы Паспалітай мы, згодна з даўнімі законамі, не будзем карыстацца сваёй пакаёвай пячаткай або сыгнетам і абяцаем выдаваць усе лісты, справы і публічныя легацыі толькі на мове польскай і лацінскай, а не іншай". Узмацніўся ўціск у дачыненні да праваслаўных і пратэстантаў. У 1658 г. сойм Рэчы Паспалітай прыняў пастанову аб выгнанні арыян, а ў 1668 г. забараніў пераходзіць з каталіцтва ў іншыя веравызнанні. Праваслаўным шляхце, святарам і мяшчанам быў забаронены доступ у дзяржаўныя органы ўлады і самакіравання. Паблажлівыя адносіны да ўніяцкай царквы змяніліся на больш нецярпімыя, бо ўніяты не здзейснілі ўсіх планаў ідэолагаў Берасцейскай уніі па распаўсюджванні каталіцкіх і польскіх уплываў на Беларусі. На самой справе ўніяцкая царква больш спрыяла захаванню этнакулыурнай самастойнасці беларусаў, пагроза страты якой існавала ў XVII-XVIII стст.

Інтэлектуальнае жыццё ў другой палове XVII - пачатку XVIII ст. характарызавалася адыходам назад. Забываліся здабыткі часоў эпохі Адраджэння і Рэфармацыі, зноў набылі папулярнасць ідэі часоў сярэднявечча. Гэта, а таксама схаластыка, фанатызм, нецярпімасць сталі вызначальнымі прынцыпамі перыяду контррэфармацыі. Умовы развіцця культуры Беларусі ў XVII -XVIII стст. вызначылі яе спецыфічную рысу - полілінгвістычны характар. 3-за неспрыяльнай сітуацыі беларускамоўнай была пераважна народная культура - культура сялянства, гарадскіх нізоў, часткі шляхты і святарства. Многія ўраджэнцы Беларусі пісалі на лацінскай, польскай, часта на нямецкай і французскай мовах, але іх творы, пазіцыя аўтара заставаліся духоўна блізкімі да мясцовых вытокаў.

2. Развіццё літаратуры і кнігадрукавання. Грамадска-палітычная думка

У канцы XVI – першай палове XVII ст. на Беларусі адчыняліся брацкія школы, спачатку ў Вільні, а затым і ў іншых гарадах. У школах вывучаліся пяць моў (беларуская, славянская, грэчаская, лацінская, польская), арыфметыка, геаграфія і іншыя дысцыпліны. Індывідуальнае навучанне ў іх замянялася класна-ўрочным, якое дажыло да нашага часу. Навучальны год пачынаўся 1 верасня. Брацкія школы з’яўляліся і цэнтрамі кнігадрукавання. Брацкія друкарні ў Вільні, Куцейне і Магілёве выдавалі большасць кніг богаслужэбнага зместу.

Адметную ролю ў кірылічным кнігадрукаванні адыграў беларускі друкар магіляўчанін Спірыдон Собаль, які на тэрыторыі Беларусі адчыніў дзве друкарні. Адну – у Куцейне (ля Оршы) у 1630 г. і выдаў тут на беларускай мове

“Малітвы паўсядзённыя”, “Буквар”, “Часаслоў”. У 1635 г. ён адчыніў друкарню і ў Буйнічах (пад Магілёвам), дзе выдаў “Псалтыр”. У літаратуры апісаны 18 яго выданняў.

У XVIII ст. на беларускіх землях пашырылася свецкая адукацыя. Гэтаму садзейнічала рэформа школ, якая праводзілася пад кіраўніцтвам С. Канарскага. Рэформа пахіснула манаполію езуітаў у галіне асветы, значную ўвагу надала прыродазнаўчым навукам. Створаная ў 1773 г. Адукацыйная камісія адмяніла выкладанне ў рамках школьных праграм рэлігіі.

Бібліятэчная і архіўная справа. Багацейшай у Рэчы Паспалітай з’яўлялася Нясвіжская бібліятэка Радзівілаў, заснаваная ў 1600 г. У бібліятэцы налічвалася больш за 20 тыс. тамоў кніг амаль на ўсіх еўрапейскіх мовах. У 1772 г. бібліятэка была канфіскавана і перавезена ў Пецярбург. У бібліятэцы захоўваліся таксама рэдкія рукапісы. Сярод іх – Радзівілаўскі летапіс, упрыгожаны 617 каляровымі малюнкамі.

Больш за 6 тыс. рэдкіх кніг, старажытных рукапісаў, геаграфічных карт Беларусі, Літвы і Польшчы знаходзіліся ў Шчорсах, у маёнтку магната Храптовіча.

У Нясвіжскім замку знаходзіўся і архіў, у якім налічвалася больш за 500 тыс. гістарычных актаў, грамат, лістоў і іншых дакументаў. Гэтыя матэрыялы былі сабраны з 1551 г., калі Мікалай Радзівіл Чорны атрымаў права захоўвання ў Нясвіжы т. зв., “Літоўскай метрыкі” – дзяржаўнага архіва ВКЛ.

Літаратура. У разглядаемы перыяд агульнадзяржаўныя летапісы і хронікі паступова саступаюць месца новым літаратурным відам і жанрам: публіцыстыцы, гісторыка-мемуарнай літаратуры, палітычнай сатыры, паэзіі.
Сымон Будны (1530–1593) упершыню ў сусветнай літаратуры выдаў Евангелле (1574) з прадмовай, каментарыямі і заўвагамі, у якіх спрабаваў даць радыкальную рацыяналістычную крытыку кніг Новага Запавету. У творы “Аб найгалоўнейшых палажэннях хрысціянскай веры” (1576 г., Лоск) ён адстойваў чалавечую прыроду Хрыста, выступаў супраць замагільнага жыцця, Боскай Троіцы. Грамадска-палітычныя погляды яго былі памяркоўна гуманістычнымі. Крытыкаваў феадальнае самавольства, захопніцкія войны, быў абаронцам верацярпімасці і інтэлектуальнай свабоды.

Васіль Цяпінскі (1540–1600) у прадмове да Евангелля, якое ён выдаў на беларускай мове, крытыкаваў палітыку акаталічвання беларускага народа, выступаў за развіццё беларускай мовы, быў прыхільнікам збліжэння славянскіх народаў. Выступаў за набліжэнне асветы да простага народа.

Лявонцій Карповіч (1580–1620) — змагар за веру продкаў і нацыянальныя традыцыі – быў вядомым прадстаўніком аратарскай прозы. Яго асноўныя творы – “Казанні” – аказвалі вялікае ўздзеянне на слухача і чытача.

Афанасій Філіповіч – выступаў абаронцам інтарэсаў сацыяльных нізоў беларускага і ўкраінскага народаў. Праз свой “Дыяруш”, які з’яўляўся зборам твораў, ён крытыкаваў знешнюю і ўнутраную палітыку, а таксама духоўных і свецкіх феадалаў за іх імкненне да раскошы.
Адной з зорак старажытнай беларускай літаратуры быў аўтар “Граматыкі”.

Мялецій Сматрыцкі (1572–1630). Асобае месца сярод яго твораў займае “Фрынас” (1610), у якім Сматрыцкі звяртаецца да народа з заклікам еднасці ўсіх сіл у барацьбе з наступаючым каталіцызмам.

Новай з’явай у беларускай літаратуры была палітычная сатыра –“Прамова Мялешкі”, “Ліст да Абуховіча”. Аўтары высмейвалі самавольства шляхты, прадажнасць, ваенна-палітычную бяздарнасць.

Ананімная лірычная паэма “Лямант на смерць Лявона Карповіча” ўслаўляла чалавека як носьбіта высокіх маральных якасцей, мужнага змагара за веру продкаў, узнімала яго да ўзроўню хрысціянскага святога.

Сімяон Полацкі (1629–1680) – паэт і драматург, кнігавыдавец і грамадскі дзеяч. Ён лічыў, што пашырэнне асветы ўсталюе поўную гармонію і мір, асуджаў багацце, апяваў беларускія землі. асабліва Полацк і Віцебск, пісаў п’есы на біблейскія тэмы. Адна з іх мела назву “Комедия притчи о блудном сыне”. Найбольш значнымі зборнікамі яго паэтычных твораў з’яўляюцца “Вертоград многоцветный” і “Рифмологион”.

Асаблівасць развіцця грамадска-палітычнай думкі Беларусі ў перыяд панавання схаластыкі заключалася ў тым, што новыя філасофскія і навуковыя ідэі ўзнікалі галоўным чынам у нетрах самой схаластыкі, а не па-за яе межамі, як гэта было ў заходнееўрапейскіх краінах. Найбольш вядомымі схаластамі таго часу былі В.Тылкоўскі, А.Кміціц, А.Кярсніцкі і інш. Аднак панаванне схаластыкі не было непадзельным. Шырокую вядомасць атрымалі атэістычныя погляды Казіміра Лышчынскага (1634 - 1689). Пакінуўшы ордэн езуітаў, ён напісаў трактат "Аб неіснаванні Бога", у якім сцвярджаў, што Бог не існуе, а з'яўляедца толькі хімерай, народжанай фантазіяй людзей. Каталіцкае духавенства жорстка расправілася з беларускім вальнадумцам. У 1689 г. К.Лышчынскі быў спалены на вогнішчы.

3. Мастацтва. Стыль барока.

Тэатр і музыка. Развіццё драматургіі выклікала да жыцця тэатр. Спачатку з’явіўся школьны тэатр. Шырокае распаўсюджанне на Беларусі ў XVI ст. атрымаў тэатр лялек – батлейка. Сюжэты батлейкі былі заснаваны на біблейскай і евангельскай тэматыцы, а таксама бытавых матывах.

Важнай з’явай жыцця другой паловы XVIII ст. стаў прыгонны тэатр. Многія беларускія магнаты: Радзівілы, Сапегі, Тызенгаўзы і іншыя, – утрымлівалі ў сваіх маёнтках капэлы, аркестры, тэатры, а нярэдка і самі станавіліся кампазітарамі і музыкантамі, як Міхал Клеафас Агінскі, аўтар паланеза “Развітанне з Радзімай”.

У свецкай музыцы XVI–XVIII стст. найбольш характэрным жанрам быў кант – шматгалосая песня свецкага зместу.

У Нясвіжскай друкарні быў надрукаваны “Канцыянал” – адзін з першых на Беларусі нотных зборнікаў. У Нясвіжы была створана адна з першых на Беларусі майстэрань па вырабу музычных інструментаў. Аркестры беларускіх магнатаў часам былі буйнейшыя за вядомыя заходнееўрапейскія. Напрыклад, аркестр М. Агінскага налічваў 106 інструментаў, а аркестр Гайдна толькі 14.

Асабліва цікавым быў Слонімскі тэатр Міхала Казіміра Агінскага. Рэпертуар тэатра складаўся з опер і балетаў італьянскіх кампазітараў, а таксама твораў М.К. Агінскага. Сцэна тэатра дазваляла ставіць спектаклі барочнага тыпу з выхадам вялікай колькасці спевакоў, з паказам водных феерый. Частка сцэны затаплялася вадой і па ёй плавалі лодкі.

Не менш вядомы быў Нясвіжскі тэатр Францішкі Уршулі Радзівіл. Для свайго тэатра яна напісала 16 драматычных і оперных лібрэта. Спачатку тэатр з'яўляўся аматарскім: на сцэне выступалі члены княжацкай сям'і, госці, сваякі. У другой палове XVIII ст. выступалі ўжо іншаземныя майстры і артысты з прыгонных сялян.

Для падрыхтоўкі акцёраў оперы і балета на Беларусі існавалі некалькі школ (у Слуцку, Нясвіжы, Слоніме). Прыгонныя і прыватныя тэатры таксама працавалі ў Слуцку, Шклове, Магілёве, Чачэрску, Свіслачы.

Выяўленчае мастацтва. Ідэі Адраджэння, а затым і барока, праніклі ў майстэрні мастакоў. У беларускім жывапісе акрэсліліся два напрамкі. Першы – мастацтва, заснаванае на старажытнарускіх традыцыях; другі – жывапіс, які знаходзіўся пад уплывам заходнееўрапейскай мастацкай школы. Адбывалася перапляценне візантыйскага і заходнееўрапейскага стыляў з мясцовай беларускай школай.

У выніку сінтэзу розных школ і напрамкаў склалася самабытная беларуская іканапісная школа, якой уласціва вернасць канону, шырокае выкарыстанне этнаграфічных элементаў. На Беларусі існавалі некалькі іканапісных школ: магілёўская, полацка-віцебская, палеская, гродзенская, слуцка-мінская.

Другім важным напрамкам быў манументальны жывапіс. Сапраўдным творам мастацтва ў манументальным жывапісе з'яўляецца роспіс Мікалаеўскай царквы ў Магілёве – "Новазапаветная Троіца.

У пачатку XVIII ст. у манументальным жывапісе распаўсюдзіўся стыль барока, якому была характэрна маляўнічасць, багацце ўзору, прасторавасць.

Папулярным відам станкавага жывапісу ў XVI–XVIII стст. стаў партрэт. Ствараліся родавыя галерэі (партрэтныя галерэі Тышкевічаў, Радзівілаў і інш.).

Таленавітым мастаком і гравёрам XVI – пачатку XVII ст. з'яўляўся Тамаш Макоўскі. У 1613 г. у Амстэрдаме ён надрукаваў карту Вялікага княства Літоўскага. У дадатку да яе давалася падрабязнае апісанне Беларусі і Літвы: прыродныя багацці, народныя звычаі, гандлёвыя шляхі, навучальныя ўстановы Полацка і Нясвіжа, рэкі, азёры, гарады, рэзідэнцыі епіскапаў і мітрапалітаў. Тамаш Макоўскі з'яўляецца аўтарам гравюр з краявідамі Вільні, Клецка, Смаленска і іншых старажытных гарадоў.

У канцы XVIII ст. барока саступае месца новаму стылю ў выяўленчым мастацтве – класіцызму.

Архітэктура. У XVI – першай палове XVII ст. працягвалася стварэнне абарончых і культавых збудаванняў у стылі барока. Беларускі феадальны горад, як і раней, меў тыповую забудову: умацаваны замак – рэзідэнцыя феадала і размешчаны вакол замка гандлёва – рамесны пасад пад аховай замкавых сцен.

У XVI – першай палове XVII ст. былі пабудаваны: Нясвіжскі замак, Нясвіжскі фарны касцел – першы помнік барока на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Таксама замкі і касцелы хутка будаваліся і ў іншых гарадах Беларусі. Позняму беларускаму барока ўласцівы стромкасць і лёгкасць, хвалістыя абрысы вежаў і франтонаў. Яно атрымала назву “віленскае барока”.

У гэты час пачынаюць будаваць ратушы, будынкі навучальных устаноў, палацы. Найбольш знакамітыя палацавыя ансамблі той эпохі: палац Тызенгаўза ў Гродне і палацава-паркавы ансамбль Радзівілаў у Нясвіжы.

У пачатку XVIII ст. была заснавана ў Слуцку мануфактура па вытворчасці паясоў. Паясы ткаліся з залатых, шаўковых і сярэбраных нітак. Усяго было выраблена каля 10 тыс. слуцкіх паясоў.

4. Адукацыя і навука.

У 16-18 стст. асвета на Беларусі развівалася ва ўмовах барацьбы паміж праваслаўем, каталіцтвам і рэфармацыйнымі рухамі. Пры падтрымцы ўрада езуіты адкрывалі школы, якія спрыялі ўмацаванню пазіцый каталіцкай царк-вы і вынішчэнню рэфармацыйнага руху ў ВКЛ. У 1579 г. яны заснавалі Віленскую акадэмію - першую ў ВКЛ вышэйшую навучальную ўстанову. Першым рэктарам акадэміі быў ідэолаг контррэфармацыі Пётр Скарга. Акадэмія мела філасофскі і тэалагічны факультэты, з 1641 г. - юрыдычны. Яна рыхтавала служыцеляў культу, педагогаў, палітычных дзеячаў, дыпламатаў. Мела багатую бібліятэку, астранамічную абсерваторыю. У найбольш значных гарадах Беларусі (Полацку, Нясвіжы, Оршы, Брэсце, Пінску, Гродне, Наваградку, Віцебску, Мінску, Слуцку, Слоніме і інш.) езуіты адкрылі свае калегіі - навучальныя ўстановы сярэдняга тыпу, якія мелі антыпратэстанцкі, а потым і антыправаслаўны характар. У калегіях выкладаліся граматыка, рыторыка, этыка, багаслоўе, фізіка, матэматыка.

Адказам праваслаўнай царквы на каталіцкую экспансію апошняй трэці XVI ст. было адкрыццё брацкіх школ у Вільні, Брэсце, Магілёве, Мінску, Пінску, Оршы, Шклове і інш. У іх вывучаліся граматыка, рыторыка, арыфметыка, свяшчэннае пісанне, геаграфія, астраномія, мовы (беларуская, польская, грэчаская і лацінская). У навучальным працэсе выкарыстоўваліся элементы класна-ўрочнай сістэмы. Выкладчыкамі брацкіх школ працавалі выдатныя педагогі і царкоўна-культурныя дзеячы канца XVI - першай паловы XVII стст.: Васіль Цяпінскі, браты Зізаніі, Мялецій Сматрыцкі, Лявонцій Карповіч.

Пасля заключэння ў 1596 г. Берасцейскай царкоўнай уніі пачалі адкрывацца уніяцкія школы, што ўтрымліваліся, кіраваліся і забяспечваліся педагагічнымі кадрамі манаскім ордэнам базыльян.

Развіццё навуковых уяўленняў у Беларусі таго часу было абмежавана рамкамі навучальных школьных дысцыплін. Магчымасці для развіцця новага эксперыментальнага прыродазнаўства былі вельмі абмежаваныя. Навука развівалася дзякуючы працы і падзвіжніцгву геніяльных вучоных-адзіночак. Сярод іх - Казімір Семяновіч, які выдаў у 1650 г. у Амстэрдаме кнігу "Вялікае мастацтва артылерыі", што пазней шмат разоў перавыдавалася. Ён першым у сусветнай навуцы стварыў праект шматступеньчатай ракеты.

Пашырэнню навуковых ведаў спрыяла кнігавыдавецкая, асветніцкая дзейнасць ураджэнца Беларусі Іллі Капіевіча (1651 - 1714). Ён зведаў ганенні, жыў у Амстэрдаме, пазней Пятром I быў запрошаны на працу ў Маскву. Там Ілля Капіевіч выдаў болып за 20 падручнікаў па граматыцы і інш. Ён быў першым у гэтай справе ў Расіі. 3 дапамогай яго кніг рускія людзі змаглі пазнаёміцца са здабыткамі, багаццем еўрапейскай навукі і культуры.

Тэма 19. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове XVIII ст.

1. Нармалізацыя эканамічнага жыцця ў Беларусі: аднаўленне сельскай і гарадской гаспадаркі. Унутраны і знешні гандаль.

Сярэдзіна XVII – першая палова XVIII ст. – гэта перыяд развалу ўсяго гаспадарчага жыцця Беларусі і пачатак аднаўлення яе эканомікі. Але да сярэдзіны XVIII ст. гаспрадарка не дасягнула яшчэ ўзроўню сярэдзіны XVII ст. Эканамічны ўздым на Беларусі ў другой палове XVIII ст. У другой палове XVIII ст. адбылося значнае ажыўленне ва ўсіх сферах эканомікі Беларусі. Прычынамі ажыўлення былі: дэмаграфічная, звязана з хуткім ростам насельніцтва, ў 1791 – налічвалася звыш 3,6 млн. жыхароў на беларускіх землях. Да канца XVIII ст. насельніцтва беларускай вёскі ўжо перавысіла ўзровень 1648 г., а гарадскія жыхары склалі каля 11% ад усяго насельніцтва. Як вынік, павялічылася вытворчасць сельскай гаспадаркі і прамысловасці. Другая прычына – узрастанне попыту на сельскагаспадарчыя прадукты як у самой Беларусі, так і за яе межамі. Спрос на прадукцыю сяла павялічваўся таму, што ўзрасло насельніцтва гарадоў. Знешні гандаль значна ажывіўся, таму што рэзка выраслі цэны на збожжа (на жыта павялічыліся ў 4,5-5, пшаніцу ў 3-4, а на авёс і ячмень у 2-2,5 разы) на замежным рынку ў другой палове XVIII ст. Таму феадалы пашыралі ўласные фальваркі, пасевы збожжавых культур. Трэцяя прычына звязана з унутрыпалітычнымі зменнямі ў Рэчы Паспалітай. Павялічвалася зацікаўленасць у бесперашкодным развіцці рынку, паляпшэнні агульных умоў развіцця эканомікі краіны. Магнаты і феадалы-прадпрымальнікі імкнуліся да пэўнага ўрэгулявання ўнутрыдзяржаўнага ладу. Пад іх уздзеяннем у60-70-я гг. XVIII ст. былі праведзены гаспадарча-адміністрацыйныя рэформы, якія ўзмацнілі цэнтральны апарат дзяржаўнай улады: на сеймах абмяжоўвалася прымяненне вета па фінансавых справах, былі створаны адміністрацыйныя органы па галінах кіравання, заснавана Скарбавая камісія – спецыяльны дзяржаўны орган па кіраванні фінансамі, ажыццяўленні судовых функцый па фінансавых справах, нагляду за гандлем. У 1775 г. былі выдадзены законы, якія дазвалялі беларускім мяшчанам набываць феадальныя маёнткі, а шляхце займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю і гандлем без страт сваіх шляхецкіх правоў. Значнай колькасці багатых мяшчан прысвоена званне шляхты. Чацвертая прычына – гэта меры з боку дзяржавы па развіцці гандлю і сродкаў зносін. У другой палове XVIII ст. пракладваюцца пінска-слонімскі і пінска-валынскі тракты. Праводзяцца работы па ачыстцы і рэгуліроўцы рэк, збудаванню рачных партоў, будаўніцтву дарог і мастоў. У 1784 г. закончана будаўніцтва канала, які праз Шчару, Ясельду і Прыпяць злучыў Нёман з Дняпром. У 1781-1784 гг. быў пабудаваны другі канал, які адкрываў шлях з

Прыпяці ў Заходні Буг. У 1766 г. уводзяцца адзіныя для Вялікага княства Літоўскага меры вагі, аб'ёму і даўжыні. У 1764 г., а потым у 1775 г. урад Рэчы Паспалітай уводзіць "генеральную мытную пошліну", абавязковую для ўсіх, і адмяняе ўнутраныя пошліны. Тады ж сойм уводзіць даўгавы працэнт у памеры не больш як 6% на карысць духоўных і не больш 7% для свецкіх крэдытораў.

Меры вярхоўнай улады садзейнічалі эканамічнаму развіццю Беларусі, у тым ліку і сельскай гаспадаркі. Гэта праявілася ў:

- пашырэнні фальварачнай запашкі на захадзе і ў цэнтры Беларусі;
- у асваенні новых зямель;
- узнікненні новых фальваркаў;
- удасканаленні агратэхнікі;
- у росце пагалоўя хатняй жывёлы;
- у павышэнні ўраджайнасці, якая дасягнула сам-4;
- павялічэнні таварнасці вотчыннай сельскай гаспадаркі, пашырэнні яе сувязяў з рынкам.

Да канца XVIII ст. была адноўлена большасць гарадскіх паселішчаў. На Беларусі налічваўся 41 горад і каля 397 мястэчак з агульнай колькасцю жыхароў каля 370 тыс., што складала каля 11% усяго насельніцтва. Аднак агульная колькасць гарадоў да канца XVIII ст. не дасягнула ўзроўню першай паловы XVII ст. Галоўную ролю адыгрывалі вялікія гарады на галоўных гандлевых шляхах – Віцебск, Гродна, Магілёў, Мінск. Рамеснае насельніцтва ў вялікіх гарадах складала 30-40%, у малых 10-25% ад агульнай колькасці жыхароў. Акрамя рамяства важным заняткам жыхароў гарадоў заставалася сельская гаспадарка, а таксама розныя промыслы – рыбная лоўля, сплаў лесу і інш. Самая вялікая рамесная група – апрацоўшчыкі металаў. У сярэднім яны складалі 20-30% ад агульнай колькасці рамеснага насельніцтва гарадоў. Гэта кавалі, слесары, залатых і сярэбраных спраў майстры, ювеліры, меднікі, бляхары і майстры зброевай справы. Другая група – рамеснікі па скураным вырабе. У Мінску іх было каля 22% ад усіх рамеснікаў. Трэцяя – майстры па вырабе адзення: краўцы, ткачы, прадзільшчыцы, суконшчыцы, шапачнікі, шубнікі і інш. Іх было значна менш. Чацвёртая – рамеснікі будаўнічых спецыяльнасцяў: цесляры, столяры, цагельнікі, муляры, печнікі, шкляры. Значная частка гарадскіх рамеснікаў займалася вырабам прадуктаў харчавання. Па буйных гарадах налічвалася да 45-60 рамесных прафесій. Пануючае становішча ў гарадах заставалася за цэхавым рамяством, але колькасць цэхаў змяншалася да канца XVIII ст. Адначасова расла колькасць рамеснікаў, якія працавалі па-за межамі цэха. Яны пачалі выкарыстоўваць наёмных работнікаў. Такое становішча павялічвала канкурэнцыю і садзейнічала разбурэнню сярэдневяковай арганізацыі вытворчасці.

Ажывіліся гандлёвыя аперацыі як на ўнутранным рынку так і са знешнімі рынкамі толькі ў другой палове XVIII ст. Гэтаму садзейнічала ўзнаўленне сельскай гаспадаркі; уздым рамеснай вытворчасці і развіццё мануфактуры; пашырэнне таварна-грашовых адносін; паляпшэнне сродкаў зносін. У развіцці ўнутранага гандлю асноўная роля належыла кірмашам. Найбольш буйнымі былі кірмашы ў Мінску, Шклове, Бешанковічах і Зэльве.

Рэгулярны гандаль праз крамы ажыццяўляўся пры буйных мануфактурах у Гродне, Кобрыне, Паставах і іншых гарадах. Знешні гандаль – гэта вываз традыцыйных тавараў: збожжа, воску, мёду, шчаціння, скары. Пашырыўся вываз льну, пянькі, канаплянага і льнянога семя, зерня, лясных матэрыялаў, паташу, смалы, дзёгця, рагожы. Асноўнымі пунктамі вывазу былі балтыйскія порты Гданьск, Крулявец, Рыга. Паралельна пашыраліся гандлёвыя сувязі з Расіяй і Украінай. Такім чынам, у другой палове XVIII ст. Беларусь зрабіла значны крок наперад у сваім эканамічным развіцці. Завяршылася аднаўленне рашаючай галіны эканомікі – сельскай гаспадаркі. Наглядаюцца далейшы рост рамяства і паступовае перарастанне яго ў дробную таварную вытворчасць. Больш шырокае развіццё набывае працэс стварэння прамысловых прадпрыемстваў мануфактурнага тыпу, якія ў большай ступені былі звязаны з рынкам. Актывізуецца гандаль, умацоўваюцца і пашыраюцца гаспадарчыя сувязі Беларусі з іншымі краінамі.

Будаваліся новыя шляхі зносін. У 1784 г. было завершана будаўніцтва канала Агінскага, які злучаў Нёман з Прыпяццю. У 1781 г. пачалося будаўніцтва Днепра-Бугскага канала.

2. Сялянская гаспадарка і катэгорыі сялян. Вотчынныя мануфактуры. Рэфарматарская дзейнасць А.Тызенгаўза

На гэты час ва ўладаннях феадалаў на ўсходзе Беларусі, як і раней, фальварачна-паншчынная гаспадарка не атрымала шырокага развіцця. Прычынамі гэтага былі аддаленнасць рэгіёна ад цэнтра дзяржавы; частыя ваенныя канфлікты; нізкая шчыльнасць насельніцтва. У другой палове XVIII ст. ліквідуюцца вынікі разарэння і ў сялянскіх гаспадарках. Ураджаі былі ніжэй, чым на панскім полі, але ўжо складалі сам 3-3,5. Сяляне асвойвалі пустуючыя землі, а таксама расчышчалі ад лесу новыя плошчы. Сярэдні зямельны надзел прыватнаўласных сялян у другой палове XVIII ст. у цэлым па Беларусі склаў 0,63 валокі (больш чым 13,4 га) на адну гаспадарку. Ён быў большым, чым у перыяд войнаў і разбурэнняў, але яшчэ не дасягнуў узроўню даваеннага часу. На ўсходзе Беларусі сярэдні зямельны надзел быў некалькі большым, чым у заходніх і цэнтральных рэгіёнах. Пры аброчнай сістэме гаспадарання, якая пераважала на ўсходзе, у сяляніна была магчымасць апрацоўваць большую дзялянку зямлі. Значна павялічылася ў другой палове XVIII ст. і колькасць цяглавай жывёлы ў сялянскіх гаспадарках. Гаспадароў, што не мелі коней амаль не было. Сялянскія павіннасці заставаліся тымі ж, але змяніліся іх памеры. Узрасла паншчына, на трэць і больш павялічыўся грашовы аброк у чыншавых сялян. У цэлым сялянскія павіннасці ў гэты час павялічыліся ў сярэднім ў 1,5 разы ў параўнанні з папярэднім перыядам. Паглыбленне эканамічнай дыферэнцыяцыі, выкарыстанне ў некаторых памешчыцкіх маёнтках разам з паншчынай і наёмнай працай, зараджэнне вотчыннай прамысловасці, рост сельскай гаспадаркі сведчылі аб тым, што пачалося разлажэнне феадальна-прыгонніцкай гаспадаркі. У другой палове XVIII ст. была адноўлена рашаючая ў той час галіна эканомікі Беларусі – сельская гаспадарка: на захадзе і ў цэнтры – да 60-х гг., на ўсходзе – да 70-х гг.

У XVIII ст. на Беларусі з’явілася мануфактурная вытворчасць, заснаваная на раздзяленні працы і ручной тэхніцы. Для іх характэрна выкарыстоўванне прасцейшых машын і значныя рыначныя сувязі. Першыя прадпрыемствы адчынялі буйныя феадалы, якія мелі магчымасці для арганізацыі мануфактур у сваіх маёнтках і танную рабочую сілу – прыгонных сялян (такія прадпрыемствы звaліся вотчыннымі мануфактурамі). Акрамя магнатаў, актыўны ўдзел у развіцці мануфактурнай вытворчасці прымаў кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст. Па яго загаду галоўны ўпраўляючы эканоміямі, якія належалі каралю ў Беларусі і Літве Антонію Тызенгаузу, у 60-70-я гг. XVIII ст. заснаваў больш за 20 буйных прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку больш за 15 мануфактур у Гродне, а ў Брэсцкай эканоміі - металургічны завод у Рудні і суконную фабрыку ў Брэсце. У канцы XVIII ст. на Беларусі дзейнічалі звыш 50 прадпрыемстваў мануфактурнага тыпу.

Тэма 20. Спробы дзяржаўных рэформ. Першы і другі падзелы Рэчы Паспалітай

1. Прычыны падзення Рэчы Паспалітай

У канцы XVIII ст. у Рэчы Паспалітай назіраўся ўнутрыпалітычны крызіс, які быў вынікам дзеяння шэрагу ўзаемазвязаных фактараў.

Першым вытокам крызісу была Люблінская унія, якая заклала аснову нераўнапраўнага становішча ВКЛ у складзе дзяржавы і паклала пачатак унутранага антаганізму паміж дзвюма складовымі часткамі краіны.

Другім вытокам стаў палітычны лад Рэчы Паспалітай, які падрываў асновы дзяржаўнасці. Найбольш небяспечным было спалучэнне “залатых шляхецкіх вольнасцей”: выбранне манарха, liberum veto і “Pacta conventa”. У час бескаралеўя шляхецтва раз’ядноўвалася на супрацьлеглыя партыі: рускую, французскую, шведскую, аўстрыйскую, краіна апускалася ў бездань бязладдзя, анархіі.

Выбранне манарха мела адмоўнай рысай подкуп. Зніклі паняцці маральнасці, патрыятызму і інш. Асабісты інтарэс пераважаў над усім грамадскім жыццём. Каронны сейм у Рэчы Паспалітай дыктаваў каралю сваю волю. Кароль павінен быў строга выконваць як “Pacta conventa”, так і пастановы сейма.

Liberum veto магло паралізаваць цэнтральную ўладу. У 1652 г. дэпутат Сіцінскі ўпершыню ўжыў слова “не дазваляю” і прыпыніў пастанову сейма. Так, за 1744 – 1762 гг. усе адзінаццаць сеймаў не здолелі прыняць патрэбных рашэнняў. Любая пастанова караля ці сейма магла быць адхілена шляхтай.

У выніку асаблівасцей палітычнага ладу Рэчы Паспалітай да канца XVII ст. у дзяржаве назіралася аслабленне манархічнай улады; узмацненне шляхты, заняпад адміністрацыйнага кіравання, духоўнасці і грамадзянскага сумлення.

Трэцім вытокам палітычнага крызісу з’явілася бязглуздая рэлігійная палітыка. Берасцейская царкоўная унія не дала жаданых вынікаў. Лацінізацыя

уніяцкай царквы прывяла да расколу грамадства на яе прыхільнікаў і праціўнікаў. Гэта паглыбіла існуючыя ў грамадстве супярэчнасці.

Чацвёртым вытокам было спалучэнне нацыянальнага і рэлігійнага прыгнёту з феадальным. Распаўсюджанне аграрнай рэформы Жыгімонта Аўгуста на Усходнюю Беларусь выклікала супраціўленне народных мас: уцёкі ад гаспадароў, падпальванне маёнткаў, узброеныя паўстанні.

Адным з буйнейшых сялянскіх рухаў у XVIII ст. было .паўстанне пад кіраўніцтвам В. Вашчылы ў Крычаўскім старостве, уладанні князя Г. Радзівіла, у 1740 – 1744 гг. Паўстанне было жорстка падаўлена: 74 паўстанцы былі закатаваны (адны павешаны, іншыя – жывымі пасаджаны на кол). Пятым вытокам паглыблення палітычнага крызісу была барацьба паміж магнатамі за ўладу. У другой палове XVII ст. у ВКЛ асноўнымі сапернікамі былі Радзівілы, Пацы і Сапегі.

У 1696 г. большая частка беларуска-літоўскай шляхты выступіла супраць усемагутнасці Сапегаў. Барацьбу ўзначалілі Агінскія і Вішнявецкія. Яны выдалі ў Вільні універсал, у якім абвяшчалі гетмана Казіміра Яна Сапегу і яго сяброў ворагамі Айчыны і прыгаварылі іх да пакарання смерцю з канфіскацыяй маёмасці. Барацьба прыняла характар грамадзянскай вайны. У час Паўночнай вайны Сапега перайшоў на бок Карла XII і разам з ім пачаў граміць маёнткі праціўнікаў.

У часы кіравання Аўгуста III (1733 – 1763, сын Аўгуста II) у палітычным жыцці з’явілася новая рыса – зварот шляхты за дапамогай да суседніх краін дзеля вырашэння ўнутраных спраў.

У 1768 г. сейм (пад націскам рускіх войск) прыняў пастанову аб ураўнаванні ў правах праваслаўных і пратэстантаў з католікамі.

У лютым 1768 г. каталікі стварылі ў Бары (на Украіне) канфедэрацыю з мэтай супрацьдзеяння ўплыву рускай імператрыцы ў Польшчы. Хутка разгарэлася грамадзянская вайна, у якой канфедэратыўны рух быў задушаны з дапамогай царскай арміі.

2. Спробы дзяржаўных рэформ

Канцлер Міхаіл Чартарыйскі спадзяваўся ажыццявіць змены дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай пры падтрымцы Расіі. Праграма рэформаў была прапанавана на канвакацыйным сойме ў 1764 г. Паводле гэтага дакумента, колькасць войска мусіла павялічыцца з 24 да 50 тысяч, пры вырашэнні эканамічных пытанняў касавалася liberum veto, уводзіліся генеральныя мытныя зборы, дэпутаты вызваляліся ад абавязковых інструкцый соймікаў, і інш. Але ў красавіку таго ж года незадаволеныя рэформамі ў Рэчы Паспалітай Расійская імперыя і Прусія абавязаліся разам захоўваць status quo гэтай дзяржавы. У Пецярбургу Кацярына II і прускі кароль Фрыдрых II (1740—1786) падпісалі дамову з сакрэтным артыкулам, у якім бакі абавязаліся нават сілай зброі зберагаць у Рэчы Паспалітай тагачасны лад, не дапускаючы да пераўтварэння выбарнага каралеўства ў спадчыннае і правядзення іншых радыкальных рэформаў, а таксама разам выступіць за вяртанне дысідэнтам правоў і

свабодаў. «Сусветная гісторыя не ведае іншага акта падобнай подласці! — напісаў пазней пра дамову 1764 г. Карл Маркс. — Дзве дзяржавы заключаюць саюз, каб перашкодзіць трэцяй дзяржаве вылечыць яе ўнутраныя язвы і такім шляхам, у выпадку неабходнасці з дапамогай узброенай сілы, асудзіць яе на разлажэнне».

Вялікую ролю ў палітычным жыцці краіны адыграў Чатырохгадовы сойм, які пачаў дзейнічаць у 1788 г.

Своеасаблівым вынікам рэформаў і найвышэйшым дасягненнем патрыятычнай партыі на чале са Станіславам Аўгустам стаў Закон аб урадзе 1791 г., які ў гістарычнай літаратуры атрымаў назву "Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 3 мая". Канстытуцыя 3 мая была другім у свеце (пасля Канстытуцыі ЗША) дзяржаўным дакументам, які рэгуляваў арганізацыю дзяржаўнай улады, а таксама правы і абавязкі грамадзян, пад якімі разумеліся ўсе жыхары краіны.

Рэч Паспалітая пераўтваралася ў канстытуцыйную манархію. Улада караля абвяшчалася спадчынай, яна абмяжоўвалася соймам. Дзяржаўнай рэлігіяй абвяшчаўся каталіцызм. Для іншых канфесій гарантавалася свабода выканан-ня рэлігійных абрадаў. Шляхта разглядалася ў якасці прывілеяванага саслоўя, але яна пазбаўлялася найвышэйшай і апошняй улады над прыгоннымі сялянамі. Канстытуцыя дэкларавала, што сяляне пераходзяць "пад апеку права і ўлады дзяржаўнай". У новым законе абвяшчаўся падзел улады ў дзяржаве на заканадаўчую, выканаўчую і судовую. Канстытуцыя зрабіла рашучы крок па шляху зліцця Рэчы Паспалітай у адзіную краіну: былі ліквідаваны асобныя для Літвы і Польшчы цэнтральныя органы ўлады і сфарміраваны адзіны кабінет міністраў і іншыя дзяржаўныя ўстановы, у якіх прадстаўнікам Вялікага княства Літоўскага аддавалася палова пасад.

Канстытуцыя 3 мая выклікала незадавальненне старашляхецкай партыі, якую падтрымлівалі Прусія і Расія. 27 красавіка 1792 г. прадстаўнікі кансерватыўнай апазіцыі падпісалі акт канфедэрацыі, які перакрэсліваў пастановы Канстытуцыі 3 мая і вяртаўся да Кардынальных правоў 1768 г. Гэты акт быў абвешчаны 14 мая ў пагранічным мястэчку Таргавіца ва Украіне, пасля чаго канфедэраты звярнуліся да Расіі за ваеннай дапамогай. Кацярына II накіравала ў Рэч Паспалітую 100-тысячную армію, што з'яўлялася адкрытай агрэсіяй супраць законнага ўрада краіны.

3. Першы падзел Рэчы Паспалітай

Падзелы шляхецкай рэспублікі былі запраграмаваны яшчэ ў 1768 г. — у момант, калі, з аднаго боку, Расія атрымала права кантролю над дзяржаўным ладам Рэчы Паспалітай (Кацярына II распаўсюджвала гарантыі на выкананне рашэнняў сойма 1767—68 г., які ўраўняў правы дысідэнтаў з каталікамі), у выніку чаго апошняя нават фармальна стала васалкай усходняй імперыі, а з другога, Барская канфедэрацыя распачала барацьбу супраць Расіі і яе саюзніка караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

У дзяржаве разгарэлася грамадзянская вайна, пад лозунгам утаймавання якой суседзі адкрыта ўмяшаліся ў справы рэспублікі. У 1770 г. Прусія стварыла

«санітарны кардон» на суседніх з ёй каронных землях, а Расія ўвяла кардон на Дзвіне. Ужо тады ўрад Кацярыны II планаваў злучыць Дзвіну з Дняпром санітарнай мяжой, выціснуць адтуль канфедэратаў і далучыць занятую тэрыторыю да імперыі. На ўмацаванне гэтай мяжы планавалася задзейнічаць 50–тысячнае войска. Марудзілі, пакуль займаліся вайной супраць Турцыі. Але як толькі Турцыя была разгромлена, Расія непасрэдна прыступіла да гэтак званых «польскіх справаў».

Прусія баялася, што расійская імперыя сама анексуе ўсю Рэч Паспалітую, і кароль Фрыдрых II Вялікі (1740—1786) выступіў з ініцыятываю падзелу шляхецкай рэспублікі. Кацярына II прыняла прапанову. Пазней да іх далучылася Аўстрыя. 5 жніўня 1772 г. у Пецярбургу яны падпісалі тайную канвенцыю аб падзеле часткі тэрыторыі Рэчы Паспалітай.

Усходнія землі Беларусі — Полацкае ваяводства па правы бераг Дзвіны, амаль усё Віцебскае, усё Мсціслаўскае ды ўсходняя частка Менскага ваяводства, а таксама Інфлянты — разам 92 тысячы кв. км з насельніцтвам 1 300 тысяч чалавек — уключыла ў свой склад Расія. Аўстрыя атрымала паўднёвыя раёны Польшчы і частку Заходняй Украіны (адпаведна 83 тысячы кв. км і 2 650 тысяч чалавек), а Прусія — Памор’е і заходнепрускія землі (36 тысяч кв. км і 580 тысяч чалавек).

4. Другі падзел Рэчы Паспалітай

Большасць беларускай і літоўскай шляхты прыязна ўспрыняла Канстытуцыю 3 траўня. Зімою 1792 г. на сесіях 27 з 34 павятовых соймікаў усе 11 артыкулаў асноўнага закона былі цалкам ухвалены. Аднак кансерватыўныя колы магнатаў і шляхты выступілі супраць рашэнняў Вялікага сойма. Іх раздражняла ўмацаванне выканаўчай улады і ўвядзенне спадчыннасці трона. Канстытуцыя выклікала асаблівую незадаволенасць царскага ўрада, які падрыхтаваў для інтэрвенцыі 60–тысячную армію. Яна перакрэсліла надзеі пецярбургскага двара на тое, што Рэч Паспалітая добраахвотна вернецца пад расійскі пратэктарат. Для фармальнага апраўдання пераходу мяжы Рэчы Паспалітай патрабавалася толькі просьба незадаволенай апазіцыі. У Пецярбургу пад наглядам Кацярыны II адразу ж быў складзены акт канфедэрацыі праціўнікаў новай канстытуцыі.

Ужо ў красавіку 1792 г. генералы Міхаіл Кахоўскі і Міхаіл Крачэтнікаў падрыхтавалі армію для ўварвання ў Рэч Паспалітую. Кахоўскі атрымаў інструкцыю весці галоўныя сілы на Украіну, а Крачэтнікаў — у Беларусь. Разам з інструкцыяй імператрыца перадала яму спіс вышэйшых ураднікаў ВКЛ — верных прыхільнікаў Расіі. Сярод іх апынуліся былы герой барскай вайны вялікі гетман Сымон Касакоўскі (1793—1794), канцлер Аляксандр Сапега (1775—1793), віленскі біскуп Ігнацій Масальскі (1762—1794) і інш. На ўсходняй мяжы Рэчы Паспалітай сканцэнтравалася вялікае расійскае войска, перакінутае з турэцкай вайны. Кацярына II звярнулася да Пастаяннай Рады з нотай, у якой запатрабавала скасаваць Канстытуцыю 3 траўня. Прускі кароль Фрыдрых Вільгельм II (1786—1797), з якім у 1790 г. Станіслаў Аўгуст падпісаў

абарончы саюз, пакінуў Рэч Паспалітую ў адзіноце, бо ўжо патаемна дамовіўся з Пецярбургам аб новым супольным падзеле сваёй нядаўняй саюзніцы.

14 траўня 1792 г. пасля пераходу расійскімі палкамі дзяржаўнай мяжы Рэчы Паспалітай ва ўкраінскім мястэчку Таргавіца (адсюль і назва канфедэрацыі) праціўнікі Канстытуцыі апублікавалі свой акт, складзены ў Пецярбургу. Яны дэкларавалі, што пад апекай Расіі выступаюць у абарону парушаных правоў шляхты, каталіцтва, ранейшых парадкаў кіравання дзяржавай і яе цэласнасці. Такая ж канфедэрацыя паўстала ў Вялікім Княстве Літоўскім, дзе яна таксама аб'яднала радыкальных рэспубліканцаў.

Летам прыведзенае ў Беларусь расійскае войска разам з канфедэратамі лёгка перамагло патрыятычныя сілы Вялікага Княства Літоўскага. Асабліва актыўным быў абазнаны ў мясцовасці Сымон Касакоўскі. Пра тое, што рабіў гэты «патрыёт» на сваёй зямлі, напісаў сучаснік тых страшных падзеяў: «Маскоўскі генерал Касакоўскі гарцаваў па Літве, палячы агнём, рабуючы і пустошачы прыяцеляў Канстытуцыі і сваіх асабістых непрыяцеляў, гарады і вёскі. Казакі і салдаты маскоўскія паўсюль ганьбілі нявестаў… Увесь край там, дзе вялася вайна, ад масквы і сваіх стаў дашчэнту спустошаны, так што засталіся толькі неба і зямля». Хутка былі заняты гарады Браслаў, Бабруйск, Глуск, Менск, Нясвіж, Наваградак, Слонім, Горадня. Пасля капітуляцыі Вільні 14 і Берасця 23 чэрвеня царская армія рушыла ў Польшчу.

Кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, а за ім асобныя ваяводствы і войска далучыліся да Таргавіцкай канфедэрацыі. Кан-стытуцыя 1791 г. і прынятыя Вялікім соймам рэформы адмяняліся. Канфедэраты ўзялі ў свае рукі ўладу на месцах. Пакорлівыя перад урадамі Расіі і Прусіі, яны працягвалі рабаваць і тэрарызаваць насельніцтва свайго краю. На пачатку 1793 г. у Польшчу ўвайшло і прускае войска. Кацярына II выступіла з ініцыятывай новага падзелу Рэчы Паспалітай. Расійска–пруская дамова, падпісаная ў Пецярбургу 23 студзеня 1793 г., перадавала ў склад Расіі Менскае, частку Берасцейскага і Віленскага ваяводстваў з беларускім насельніцтвам, а таксама ўсходнюю Валынь, Кіеўскае, Браслаўскае і Падольскае ваяводствы — разам 250 тысяч кв. км. Прусія атрымала заходнія землі Польшчы (58 тысяч кв. км). Аўстрыю ж саюзнікі паабяцалі ўзнагародзіць за кошт тэрыторыі Францыі.

Тэма 21. Паўстанне 1794 г. Ліквідацыя Рэчы Паспалітай.

1. Падрыхтоўка і пачатак паўстання ў Польшчы. Тадэвуш Касцюшка.

У 1794 годзе імператрыца Кацярына II падтрымала рэакцыйную групоўку магнатаў, якія баяліся прагрэсіўных рэформ, пачатых Чатырохгадовымі сеймамі 1788-1792 гг., і выступілі супраць шляхецка – буржуазнага блока грамадства Рэчы Паспалітай. Створанная на расійскай тэрыторыі, гэтая групоўка абвясціла канфедэрацыю ў мястэчку Таргавіца. Пасля непрацяглай вайны, якую вялі ў 1792 годзе расійскія войскі, улада патрыётаў - рэфарматараў была звергнута і перайшла да таргавічан. Усе

прагрэсіўныя рэформы, у тым ліку і дэмакратычная канстытуцыя 3 мая 1791 года, другая пасля амерыканскай была скасавана.

Зазначым, што прагрэсіўныя рэформы ў Польшчы і на Беларусі праводзіліся падчас Вялікай французскай рэвалюцыі канца XVIIIст., і шмат яе рэвалюцыйных прынцыпаў і лозунгаў было ўзята рэфарматарамі Рэчы Паспалітай. На берагах Віслы і Немана ўтварыўся новы рэвалюцыйны ачаг у Еўропе.

Менавіта страх перад рэвалюцыяй выклікаў інтэрвенцыю Расіі Прусіі супраць Рэчы Паспалітай. Кацярына II і яе саюзнік – прускі кароль Фрыдрых Вігельм II – не збіраліся цярпець такую пагрозу побач з сваімі дзяржавамі. Таму яны і выкарысталі магнатаў – таргавічан, якія дзеля сваіх ітэрэсаў ахвяравалі і тэрыторыяй, і незалежнасцю дзяржавы. Пры гэтым таргавічане выступалі з прадмовай аб карысці сяброўства і саюза з Расіяй, якая, маўляў, дапаможа Рэчы Паспалітай выжыць у такі цяжкі час.

Скарыстаўшы таргавічан, Кацярына II правяла другі падзел Рэчы Паспалітай. На апошнім сейме у Гародні (1793 г.) яна пад пагрозай расійскіх салдат, якія абкружылі каралеўскі замак, а таксама занялі варту ў калідорах і каля ўваходу ў залу, дзе засядаў сейм, прымусіла зацвердзіць вынікі падзелу дзяржавы.

Эканамічныя цяжкасці, скарачэння тэрыторыі і войска, рабаванне граждан і сялян – усе гэта выклікала рэзкі пратэст шырокіх колаў грамадства: гарадскіх нізоў, буржуазных пластоў, сярэдняй, дробнай і беззямельнай шляхты, сялянства, святарства, шырокіх колаў афіцерства. Яны былі настроены рашуча : з патрыятычных паззіцый выступалі за ліквідацыю рэжыму і інтэрвентаў і іх прыслужнікаў, за аднаўленне сапраўднай незалежнасці і суверэнітэту, за вяртане захопленах Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй тэрыторыі і за дальнейшае правядзенне рэформ, якія пачаліся раней.

Падрыхтоўку паўстання пачалі тайныя патрыятычныя арганізацыі, якія аб’ядноўвалі прагрэсіўных прадстаўнікоў шляхты і мяшчан. Галоўнай сваёй мэтай яны ставілі вызваленне ад акупантаў і здраднікаў ўрада тэрыторыі Польшчы, Беларусі і Літвы і аднаўленне іх межаў, якімі яны былі да 1772 года. Цэнтр падрыхтоўкі паўстання знаходзіліся ў Варшаве. Кіраваў ім генерал Ігнацы Дзялынскі . Стварыўся таксама цэнтр у Вільні, які рыхтаваў паўстанне на Беларусі і ў Літве.

У шэрагу выдатных барацьбітоў за свабоду ганаровае месца належыць нашаму суайчыннiку Андрэю Тадэвушу Банавентуру Касцюшку. Чалавеку, які змагаўся за вызваленне ад чужаземнага панавання народаў Паўночнай Амэрыкі і Ўсходняй Эўропы, рабіў незабыўнае ўражанне сваёй энергіяй, мужнасцю, адданасцю ідэі свабоды.

Нарадзіўся Касцюшка ў 1746 годзе ў сям'і беларускага шляхціча, фамільны маёнтак якога знаходзіўся ў вёсцы Сяхновічы Кобрынскага павета (цяпер у Жабінкаўскім раёне). У 1760 годзе скончыў піярскую (каталіцкую) школу, а ў 1769 годзе - Варшаўскі кадэцкі корпус. Затым 5 гадоў вучыўся ў Парыжскай ваеннай акадэміі. Па вяртанні дадому яму не знайшлося пасады ні ў войску, ні на цывільнай службе. Т.Касцюшка вымушаны быў пакінуць радзіму і падацца ў 1776 годзе ў Паўночную Амэрыку, дзе тым часам пачалася

вайна за вызваленне ад ангельскага ўладарання. На працягу сямі гадоў ён змагаўся ў шэрагах амэрыканскай арміі, дзе атрымаў званне генерала і быў узнагароджаны сама высокім ордэнам Злучаных Штатаў - ордэнам Цынцыната. Перамога ў бітве пад Саратогай у 1777 годзе ў многім была заслугаю Касцюшкі.

Вярнуўшыся ў 1784 годзе на радзіму, Касцюшка доўгі час жыў у Сяхновічах. І хоць імкнуўся служыць у войску Вялікага Княства Літоўскага, яму там не знайшлося пасады, і ён змушаны быў у 1789 годзе пайсці ў польскае войска на камандзіра брыгады. Другі падзел Польшчы і Вялікага Княства, умяшанне суседніх дзяржаваў у іх нутраныя справы, а таксама незадаволенасць значнай часткі насельніцтва самавольствам феадалаў выклікалі абурэнне, якое ў сакавіку 1794 года перарасло ў народнае паўстанне. Кіраўніком яго быў прызначаны Тадэвуш Касцюшка.

2. "Віленскія якабінцы" і Якуб Ясінскі. Фарміраванне і баявая дзейнасць паўстанцкіх атрадаў.

Прыхільнікі паўстання падзяліліся на дзве групоўкі, або партыі. Адна з іх аб'ядноўвала памяркоўных прыхільнікаў рэформ Чатырохгадовага сейма. Яны імкнуліся да ўзнаўлення канстытуцыі 3 мая 1791 года і вызвалення ўсёй Рэчы Паспалітай з дапамогай іншых дзяржаў. Асабліва Францыі, ад незалежнасці ад Расіі, Прусіі і Аўстрыі. На чале яе ў Варшаве былі банкір Е.Капостас, юрыст Ф.Барс, І.Патоцкі.

Левае крыло шляхецка – буржуазнага блока, або партыі "якабінцаў", займала больш радыкальныя пазіцыі. Яно ставіла сваёй мэтай падняць усенароднае паўстанне супраць акупантаў і прыцягнуць да ўдзелу ў ім не толькі шляхту і мяшчан, але дробную гарадскую буржуазію, гарадскія нізы і сялянства. Для гэтага меркавалася правесці больш радыкальныя рэформы падчас паўстання і пасля яго. Групоўку "якабінцаў" у Варшаве ўзначалілі К.Канопка, ксёндз Ю.Мейер, Ю. Заёнчак, Я.Шаняўскі. Радыкальнае крыло патрыётаў выступала з лозунгам французская рэвалюцыя : "Свабода, роўнасць, братэрства".

Групу падрыхтоўкі паўстання ў Вільні летам 1793 года узначальваў палкоўнік Якуб Ясінскі, камендант (камандзір) корпуса інжынераў войска літоўскага. Віленскі цэнтр дзейнічаў актыўна, а яго члены былі настроены рашуча. Яны атрымалі назву "Віленскія якабіцы" і былі больш радыкальныя за варшаўскіх. Туды ўваходзілі разам з Я.Ясінскім капітан Ю.Гарноўскі, А.Грасман, ксёндз М.Карповіч, і інш. Віленскія якабінцы заклікалі выкарыстоўваваць вопыт Вялікай французскай рэвалюцыі, выступалі за адмену прыгону і аднаўленне федэратыўнай Рэчы Паспалітай у межах 1772 года, за адзінства пад лозунгам "За нашу і вашу свабоду".

24 сакавіка 1794года у Кракаве ўспыхнула паўстанне, у якім прынялі ўдзел, мяшчане і некаторая частка сялян. На чале паўстання стаў генерал – лейтэнант Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка, які быў абвешчаны вышэйшым і адзіным начальнікам узброеных сіл і кіраўніком усяго паўстаня. У гэты ж день быў абвешчаны Акт паўстання грамадзян, жыхароў Кракаўскага

ваяводства, і Касцюшка прынёlс прысягу, у якой абавязаўся даверанай яму ўлады не ужываць у чыіх – небудь асабістых інтарэсах, а толькі для абароны цэласці граніц, вяртання самаўладзя народа, усталявання ўсеагульнай свабоды.

Акт паўстання пачынаўся з выкрыцця подласці, акупанства і падступнасці царыцы Кацярыны II і прускага і караля Фрыдрыха Вільгельма.У Акце паўстання Касцюшка правільна ўказаў, што галоўнай мэтай Кацярыны II і Фрыдрыха Вільгельма было жаданне "распаўсюдзіць панаванне тыраніі" і падаўленне свабоды не толькі ў сваіх дзяржавах, але і ў суседніх народаў. Акт паўстання яшчэ раз выкрыў перад усім светам паказаны лібералізм Кацярыны II.

Палітычнае кіраўніцтва паўстаннем у адпаведнасці з Актам ускладалася на Вышэйшую нацыянальную раду. У якасці надзвычайных мясцовых органаў ствараліся камісіі кіравання ў ваяводствах, якія ў сваю чаргу стваралі дазорныя ўпраўленні. Кожнае дазорнае ўпраўленне ахоплівала 1000 – 1200 сялянскіх гаспадарак. Ствараліся новыя рэвалюцыйныя суды, якія павінны былі разглядаць крымінальныя справы аб злачынствах, накіраваных супраць паўстання.

Створаныя новыя органы ўлады, упраўленні і суды не знішчылі стары дзяржауны апарат, не была знішчана і манархія. Пасля ўзброенага паўстання ў Варшаве, якое адбылося 17-18 красавіка 1794г., была створана ў канцы мая Галоўная нацыянальная рада. У радзе ўвесь час ішла барацьба паміж правымі рэфарматарамі і рэвалюцыйна настроенымі дзеячамі, паслядоўнікамі французскіх рэвалюцыянераў.

Выданне Акта паўстання мела выключна важнае значэнне для мабілізацыі усіх прагрэсіўных сіл на барацьбу як з унутранай рэакцуыяй, так і з замежнымі захопнікамі. Гэты Акт абавязаў Касцюшку і Вышэйшую нацыянальную раду выпускаць як мага часцей пракламацыі і звароты да народу, паведамляць яму аб сапраўдным становішчы спраў. Гэтым былі засведчаны дэмакратычныя прынцыпы паўстання і імкненне прыцягваць да ўдзелу ў ім самыя шырокія масы народа.

У першы ж дзень паўстання Касцюшка звярнуўся з адозвамі "Да арміі", "Да грамадзян", "Да духавенства", "Да жанчын". Кожныя з гэтых адозваў глыбока эмацыянальная і пераканаўча заклікае стаць на абарону свабоды і айчыны .

Энергічная ідэалагічная падрыхтоўка паўстання і арганізацыйная работа па мабілізацыі простых людзей на барацьбу за свабоду напачатку мела некаторыя поспехі.

У ноч з 22 на 23 красавіка паўстанцы захапілі Вільню і была створана Вышэйшая рада на чале з якабінцамі Якубам Ясінскім, што аб'явіла сябе вышэйным органам улады ў Вялікім княстве Літоўскім. На наступны дзень у Вільні быў створаны рэвалюцыйны крымінальны суд, які асудзіў аднаго з дзеячаў таргавіцкай канфэдэрацыі гетмана Касакоўскага да пакарання смерцю. Стварэнне рэвалюцыйнай Вышэйшай рады ў Вялікім княстве Літоўскім выклікала страх у правага крыла кіраўніцтва паўстаннем, і Касцюшка быў вымушаны пад націскам правых адхіліць Я.Ясінскага ад кіраўніцтва Вышэйшай радай у Вільні, што ў канчатковым выніку прывяло да аслаблення

ўсяго рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі і Літве. У сярэдзіне мая на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў падтрымку паўстання ўжо дзейнічала некалькі атрадаў.

3. Адносіны да паўстання сялян. Паланецкі універсал.

Рухальнымі сіламі нацыянальна – вызваленчага руху, які пачаўся ў краіне, былі граджане, дробная буржуазія, гарадская інтэлігенцыя, прыгонныя сяляне і малазямельная шляхта. Аднак палітычнае кіраўніцтва паўстаннем у значнай степені знаходзіліся ў руках прадстаўнікоў шляхецка – буржуазнага блоку, якія імкнуліся не дапусціць сацыяльнай рэвалюцыі і надаць паўстанню выключна нацыянальна-вызваленчы прапольскі характар, што адразу абмежавала ўдзел сялян Беларусі і Украіны ў паўстанні.

Каб прыцягнуць сялян да паўстання, Касцюшка лічыў неабходным адмену прыгоннага права, таму канстытуцыя 3 мая, якая заховала саслоўную няроўнасць і прыгонную залежнасць сялян, не была яго ідэалам, у сувязі з чым Акт паўстання не закранаў пытанні аб аднаўленні канстітуцыі. Канчатковае вызначэнне дзяржаўнага і грамадскага ладу Акт паўстання адносіў да часу заканчэння рэвалюцыйнай вайны.

7 мая 1794 года Касцюшка выдаў Паланецкі універсал, якім абвяшчалася апека ўрада над сялянамі; сяляне аб'яўляліся асабіста вольнымі, г. зн. адмянялася прыгоннае права, але без зямлі, пайсці ад памешчыка селянін мог толькі пры ўмове выплаты даўгоў і дзяржаўных падаткаў, а таксама паставіўшы ў вядомасць Камісію ўпраўлення аб тым, куды ён перасяляецца; устанаўліваліся пэўныя льготы ў адбыванні паншчыны. Спецыяльнымі артыкуламі універсала Касцюшкі папярэджваў, што парушэнне гэтых пастаноў памешчыкамі будзе караца судом як процідзеянне мэтам паўстання.

Сяляне ў сваю чаргу заклікаліся старанна адбываць астатнія дні паншчыны, слухацца свайго начальства, дбаць пра гаспадарку, не павінны былі адмаўляцца ад найму да памешчыкаў за адпаведную плату.

Паланецкі універсал не адмяніў поўнасцю прыгоннага права і не ліквідаваў феадальнай эксплуатацыі, але дазваляў сялянам ісці ад памешчыкаў, што было таксама ў інтарэсах буржуазіі, якая зараджалася. Гэты акт быў безумоўна прагрэсіўным, хоць і палавінчатым. Ён аслабляў эканамічны стан памешчыцкіх маёнткаў, абмяжоўваў паншчыну і падрываў значэнне шляхецкіх прывілеяў. Таму памешчыкі ўсяляк затрымлівалі апавяшчэнне універсала і, баючыся сацыяльнай рэвалюцыі, часта ішлі на змову з замежнымі войскамі. Многія палажэнні універсала не выконваліся на месцах і засталіся толькі на паперы. Супраць ажыццяўлення палажэнняў Паланецкага універсала выступілі вярхі каталіцкага духавенства.

Такім чынам, сялян сярод паўстанцаў было меньш, чым разлічваў Касцюшка. Да таго сялянам не давалі ружжаў, яны былі ўзброены пераважна косамі, ад чаго іх празвалі **касінеры.**

Заклікі Касцюшкі да простага народу выклікалі недавер сялян і сабатаж памешчыкаў. У сялян Рэчы Паспалітай на працягу стагодзяў выхоўвалася рабская псіхалогія. Яны, пакорныя сваім панам, не былі гатовы да акціўных

дзеянняў у якасці свядомых барацьбітаў за свае правы, за сваю свабоду. Усё гэта ўлічваў Касцюшкаі ў кожным яго звароце да народу стараўся абудзіць іх свядомую актыўнасць, умацаваць веру ў перамогу.

4. Палітыка расійскага ўрада і прычыны паражэння паўстання.

Ваенныя і палітычныя сітуацыі складваліся не на карысць паўстання. У пачатку чэрвеня аб'яднаныя руска-прускія войскі у бітве каля мястэчка Шчакаціны прымусілі армію Касцюшкі адступіць. 15 чэрвеня прускія войскі занялі Кракаў, а Касцюшка вымушаны быў адступіць да Варшавы. У сярэдзіне ліпеня да Варшавы падышлі прускія войскі і рускі корпус пад камандваннем генерала Ферзена. Аднак гераізм абаронцаў Варшавы і умелыя дзеянні Касцюшкі ў жніўні- верасні прымусілі гэтыя войскі адысці ад Варшавы.

Аднак неўзабаве становішча паўстанцаў пагоршылася, бо Аўстрыя пашырыла терыторыю сваёй акупацыі, тым самым наносячы ўдар з поўдня. Аднак Касцюшка не падаў духам і спрабаваў адбівацца на ўсе бакі. У верасні ён зрабіў паездку на Беларусь з мэтай фарміравання тут новых атрадаў, а заадно наведаць родныя мясціны. Да гэтага часу на тэрыторыі Беларусі дзейнічала ўжо некалькі атрадаў, якія падтрымлівалі паўстанне.

8 жніўня рускі пасол у Стамбуле атрымаў абяцанне Турцыі захаваць мір з Расіяй, што дазволіла Кацярыне II перакінуць з турэцкай граніцы на тэрыторыю Рэчы Паспалітай корпус пад камандваннем А.Суворава. Нечаканае з'яўленне ў верасні новага корпуса на тэрыторыі Заходняй Беларусі паставіла ў крытычнае становішча дывізію паўстанцаў пад камандваннем генерала Серакоўскага. Корпус Ферзена пачаў наступленне з паўднёвага захаду, супраць яго Касцюшка выставіў дывізію Ю.Серакоўскагаі некаторую колькасць свайго рэзерву. На дапамогу яму павінна была падыйсці дывізія пад камандаваннем генерала Папінскага, але ён загаду Касцюшкі не выканаў і да месца бітвы гэтая дывізія не падышла. 10 кастрычніка корпус Ферзена ў бітве пад Мацяёвіцамі нанёс паражэнне войскам паўстанцаў, а сам Касцюшка, цяжка паранены , быў узяты ў палон. Той факт, што Касцюшка апынуўся ў палоне, адмоўна паўплываў на ход паўстання і прадвызначыў зыход барацьбы.

Начальнікам узброеных сіл 12 кастрычніка 1794 года Вышэйшы савет прызначыў замест Касцюшкі яго земляка Тамаша Ваўжэцкага, аднак ні яго аўтарытэт, ні ваенныя здольнасці не давалі яму магчымасці параўнацца з Касцюшкам. 4 лістапада войска пад камандаваннем А.Суворава авалодалі ўмацаванымпрыгарадам Варшавай Прагай, пасля чаго кароль Рэчы паспалітай і яго паплечнікі далі згоду на капітуляцыю Варшавы.

5. Трэці падзел Рэчы Паспалітай. Прычыны ліквідацыі Рэчы Паспалітай

24 кастрычніка 1795 г. былі ўсталяваны межы падзелаў. Прусія атрымала Мазовію і частку тэрыторыі Літвы да Немана, Аўстрыя атрымала тэрыторыю паўднёвай і цэнтральнай Польшчы з гарадамі Кракавам, Сандамірам, Люблінам і Холмам. Расіі адышла Заходняя Беларусь, Літва, Курляндыя, частка Валыні.

25 лістапада 1795 г. апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі пад прымусам падпісаў у Гродне акт адрачэння ад прастола. Такім чынам, Рэч Паспалітая, якая існавала больш за 200 гадоў, знікла з карты Еўропы.

Можна вылучыць шмат прычын, якія прывялі Рэч Паспалітую да падзелаў. Галоўная з іх відавочна палітычны лад Рэчы Паспалітай, які заканамерна падрываў самыя асновы дзяржаўнасці. Найбольш небяспечным было спалучэнне знакамітых "залатых шляхецкіх вольнасцей": выбранне манарха, liberum veto, "Pacta conventa", "канфедэрацыі", "рокашы".

Самую дакладную характарыстыку тагачаснаму становішчу Рэчы Паспалітай дала сама шляхта ў прыказцы «Польшча трымаецца на бязладдзі». Бязладдзе гэта стала вынікам разіцця «залатых» шляхецкіх вольнасцей, ці, лепш сказаць, злоўжывання імі. Ужо ў другой палове XVII ст. стала відавочным, што пашырэнне шляхецкай дэмакратыі пры паслабленні цэнтральнай каралеўскай улады вядзе да яе перадачы ў рукі алігархаў, якія фінансава закабалялі шляхту, робячы яе сваім васальным акружэннем. Але ні водная з груповак не мела сілы ўзяць уладу. Адсюль - разгул анархіі. Яшчэ ў 1669 г. сейм прыняў пастанову, дзе гаварылася, што «ўсялякае новаўвядзенне ў Рэчы Паспалітай можа быць небяспечным і прывядзе да вялікіх хваляванняў. Неабходна сейму сачыць за тым, каб нічога не падвяргалася змяненням». Але ў канцы XVII-XVIII ст. гэта неабходнасць для сейма адпала, бо шляхецкае права liberum veto, па якому нават аднаму дэпутату дазвалялася сарваць сейм, практычна паралізавала работу гэтага вышэйшага органа ўлады. Пасля першага прымянення гэтага права ў 1652 г., калі дэпутат Упіцкага павета В. Сіцынскі па жаданню Я. Радзівіла не згадзіўся з пастановай сейма, па 1764 г. з 55 сеймаў Рэчы Паспалітай такім чынам было сарвана 48.

Але апекаваць за непарушнасцю шляхецкіх вольнасцей знайшлося каму. Сквапныя суседзі Рэчы Паспалітай, як клапатлівая маці, ахоўвалі непарадак у Рэчы Паспалітай. Так, расійска-прускі саюзны дагавор 1764 г. меў сакрэтны артыкул, паводле якога саюзнікі абавязваліся захоўваць у Рэчы Паспалітай шляхецкую канстытуцыю, вольныя выбары караля і liberum veto. Пункт гэты, асабліва з боку Расійскай імперыі, выконваўся рупліва.

Тэма 22. Беларускія землі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай (1772 - 1801 гг.).

1. Увядзенне новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу. Змены ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці і гандлі. Стан гарадоў.

У выніку трох падзелаў (1772, 1793, 1795 гг.) Рэч Паспалітая спыніла сваё існаванне. Да Расіі адышла тэрыторыя Беларусі з насельніцтвам каля 3,3 млн. чалавек. З канца XVIII ст. пачынаецца новы этап беларускай гісторыі, цесна звязаны з гісторыяй Расійскай дзяржавы.

Адміністрацыйны падзел. Пасля далучэння да Расійскай імперыі на беларускія землі былі распаўсюджаны агульныя прынцыпы расійскага кіравання. Так, паводле праведзенай у 1796 г. адміністрацыйнай рэформы ў

Беларусі ствараліся губерні: Беларуская з губернскім горадам Віцебскам; Мінская з губернскім горадам Мінскам і Літоўская з губернскім горадам Вільняй.

У выніку новага адміністрацыйнага падзелу Расіі ў 1801 – 1802 гг. Беларуская губерня падзялілася на Магілёўскую і Віцебскую. Яны ўвайшлі ў склад Беларускага генерал-губернатарства (па 1856 г.). Літоўская губерня падзялілася на Гродзенскую і Віленскую, якія склалі разам з Мінскай губерняй Літоўскае (Віленскае) генерал-губернатарства (па 1912 г.). У час польскага паўстання 1830 – 1831 гг. і некаторы час пасля яго Мінская губерня мела статус генерал-губернатарства (1831 – 1834).

Генерал-губернатары з'яўляліся даверанымі асобамі імператара і надзяляліся фактычна неабмежаванымі паўнамоцтвамі. Выканаўчая ўлада ў губернях належала губернатарам, якія кіравалі праз канцылярыі ў складзе віцэ-губернатара, саветнікаў, пракурора, сакратароў і іншых чыноўнікаў. Як правіла, вышэйшыя пасады займалі чыноўнікі з рускіх, на іншыя чыноўніцкія пасады ў беларускіх губернях дапушчаліся мясцовыя ўраджэнцы. Толькі дваране-католікі, якія жадалі паступіць на дзяржаўную службу, павінны былі прайсці абавязковую 5-гадовую "стажыроўку" у вялікарасійскіх губернях.

Сацыяльна-палітычнае становішча беларускіх губерняў у канцы XVIII ст. У эканамічным і палітычным развіцці Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст. меліся адрозненні.

У Расійскай імперыі з яе абсалютнай уладай манарха дваране, нягледзячы на моцную залежнасць ад цэнтральнай улады, імкнуліся прыстасавацца да новых умоў гаспадарання. Рускія памешчыкі раней, чым памешчыкі Рэчы Паспалітай, пачалі пераводзіць сялян на больш прагрэсіўную форму рэнты – грашовы чынш. Разам з тым дваранская зямельная ўласнасць у Рэчы Паспалітай раней, чым у Расіі, згубіла свой умоўны характар. Яшчэ ў пачатку XVIII ст. "паспалітае рушэнне", служба ў якім лічылася неабходнай умовай для валодання шляхтай землямі, ужо не склікалася. У Расіі толькі маніфест Пятра III ад 1762 г. вызваліў дваранства ад нясення дзяржаўнай службы.

Існавалі адрозненні і ў формах дваранскага землеўладання, і ў прававым статусе дваранства. Расія не ведала землеўладання дробнай шляхты. У Рэчы Паспалітай дробная шляхта па свайму прававому становішчу амаль не адрознівалася ад магнатаў. З эпохі "залатых вольнасцей шляхецтва" яна не прывыкла да бясспрэчнага паслухмянства цэнтральнай уладзе. Улада караля ў Рэчы Паспалітай была вельмі слабай. Ён быў пазбаўлены заканадаўчых паўнамоцтваў і з'яўляўся толькі вярхоўнай выканаўчай уладай. Дзейнасць вышэйшага заканадаўчага органа ў краіне – Сейма – была паралізавана. Таму палітыка расійскага ўрада ў адносінах да дваранства Беларусі спачатку вызначалася асцярожнасцю.

Урачыстыя абяцанні расійскага ўрада не кранаць набытых беларускай шляхтай правоў і існуючых грамадскіх адносін абумовілі спакойны пераход новападданых у новую дзяржаўную залежнасць. Тым, хто прыняў прысягу, даваліся правы расійскага дваранства (пры захаванні многіх ранейшых правоў), маёнткі з сялянамі. Ухіліліся ад прысягі толькі некаторы буйныя магнаты: два

Радзівілы (ваявода віленскі і староста рэчыцкі); тры Агінскя (вялікі гетман літоўскі, кашталян віленскі і ваявода трокскі); Сапега (ваявода полацкі і гетман польскі і літоўскі); Салагуб (ваявода віцебскі); Пацей (вялікі стражнік літоўскі); Чартарыйскі (ваявода рускі). Але расійскі ўрад ліквідаваў бескантрольную самастойнасць феадалаў. Шляхта страціла правы на канфедэрацыі, на ўтрыманне свайго войска і ўласных крэпасцей.

Дваранству і купецтву беларускіх зямель у 1773 г. дазвалялася выбіраць дэпутатаў для выпрацоўкі праекта новага агульнадзяржаўнага Улажэння. У 1777 г. былі праведзены выбары павятовых і губернскіх прадвадзіцеляў дваранства, створаны павятовыя і губернскія дваранскія сходы. Асноўная частка беларускай шляхты задаволілася сваім новым становішчам.

У 1785 г. на далучаныя гарады Беларусі былі распаўсюджаны прынцыпы, абвешчаныя Кацярынай II у “Даравальнай грамаце гарадам”. У гарадах адмянялася панаванне свецкіх ці духоўных феадалаў, скасоўвалася магдэбургскае права. Шматлікія прыватныя гарады і мястэчкі былі выкуплены ўрадам. Кіраванне гарадскім жыццём канцэнтравалася ў Думе – прадстаўнічым органе з гарадскіх саслоўяў. Купецтва атрымала права на арганізацыю гільдый, як гэта было ў Расіі.

На беларускае насельніцтва была распаўсюджана расійская падатковая сістэма. Ліквідаваліся розныя дзяржаўныя зборы з насельніцтва. Замест іх уводзіліся падушны падатак і земскі збор. Але, прыняўшы пад увагу цяжкі стан беларускага насельніцтва, выяўлены ў час перапісу (пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай), расійскі ўрад на два гады вызваліў яго ад выплаты дзяржаўных падаткаў. На працягу наступных 10 гадоў падушны падатак збіраўся ў палавінным памеры.

Расійскі ўрад імкнуўся паказаць, што не мае намеру замахвацца на прававыя нормы, якія здаўна існавалі на далучаных землях. Асноўным заканадаўчым кодэксам тут заставаўся Статут Вялікага княства Літоўскага. Але мясцовая адміністрацыя ўсталёўвалася на расійскі ўзор і была строга падсправаздачна цэнтральнай уладзе.

Такім чынам, у першы час пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі яе ўрад імкнуўся не ўжываць жорсткія меры да мясцовага насельніцтва, каб прыглушыць апазіцыйныя настроі. Але значная частка апалячанай шляхты і каталіцкага духавенства, якія страцілі сваё прывілеяванае становішча, засталіся незадаволенымі. Гэта прымусіла расійскі ўрад устаць на шлях узмацнення сваіх пазіцый у беларускіх землях.

2. Прывядзенне да прысягі і афармленне сацыяльнага статусу насельніцтва. Правы і прывілеі пануючага саслоўя.

Расійскі ўрад дзяля ўзмацненні свайго ўплыву на далучаных землях адразу ажыццявіў шэраг мер. Насельніцтва на працягу месяца пасля выхаду ўказа аб уключэнні беларускіх зямель ў склад Расіі прыводзілася да прысягі. Сялян, як прыгонных, запісалі за новай дзяржавай іх паны з паручыцельствам духавенства. Асобам, якія не жадалі прысягаць новай уладзе, было прапанавана ў 3-месячны тэрмін прадаць сваю нерухомасць і выехаць за мяжу.

Па заканчэнні гэтага тэрміну маёмасць асоб, якія не прынялі прысягі, падлягала перадачы ў дзяржаўную казну. Большасць магнатаў і шляхты прысягнула новай уладзе.

Сацыяльная структура насельніцтва беларускіх губерняў. Большую частку насельніцтва пяці заходніх губерняў складалі беларусы. Толькі ў Віленскай губерні пераважала літоўскае насельніцтва – 48 % ад агульнай колькасці жыхароў, а беларусы (іх было 20 %) канцэнтраваліся пераважна ў Віленскім, Дзісенскім і Свянцянскім паветах. На тэрыторыі беларускіх зямель таксама жылі палякі, рускія, украінцы, літоўцы, латышы, татары і яўрэі.

Саслоўная палітыка расійскага ўрада. Саслоўная палітыка, якая праводзілася на тэрыторыі Беларусі, была скіравана на ўмацаванне пазіцый Расіі. Першым крокам у гэтым напрамку стала ўвядзенне ў Беларусі землеўладання рускага дваранства за кошт дзяржаўнага фонду. Але пасля 1801 г. раздача маёнткаў у Беларусі была спынена ўрадам Аляксандра I з-за супраціўлення дзяржаўных сялян пераводу іх у разрад памешчыцкіх.

У адносінах да беларускага дваранства ўрад ўлічваў гістарычныя асаблівасці, якія склаліся на працягу стагоддзяў.

У Расіі не існавала такой сацыяльнай групы як дробная шляхта. Яе эканамічнае становішча часам набліжалася да становішча селяніна-аднадворца. Аднак збяднелая шляхта фармальна не адрознівалася ад магнатаў і юрыдычна мела з імі аднолькавыя правы. Таму ўдзельная вага дваранства ў беларускіх губернях была самай высокай у імперыі – 5 – 6 % (у сярэднім 1,5 % па Еўрапейскай Расіі).

Палітыка расійскага ўрада ў адносінах да дваранства Беларусі вызначалася надзвычайнай асцярожнасцю. Мясцовым дваранам надаваліся ўсе правы і прывілеі, якімі валодала расійскае дваранства, але дазвалялася карыстацца “мясцовымі законамі”, калі яны не супярэчылі расійскім. Так, да 1831 г. Статут Вялікага княства Літоўскага дзейнічаў ва ўсіх беларускіх губернях, а ў Мінскай, Гродзенскай і Віленскай – да 1840 г.

Новым ва ўрадавай палітыцы быў дыферэнцыраваны падыход да розных груп беларускага дваранства. У адносінах да дробнай шляхты, якая складала абсалютную большасць мясцовага прывілеяванага саслоўя, праводзіўся так званы “разбор шляхты”: шляхціцы, якія не змаглі дакументальна пацвердзіць сваё дваранскае паходжанне, прыпісваліся да розных груп падатковага саслоўя. Хоць “разбор” шляхты быў дэкларавaны яшчэ ў 1772 г., яго рэалізацыя праводзілася марудна, непаслядоўна, у асноўным з-за складанай юрыдычнай сістэмы доказаў дваранскага паходжання.

З пачатку новага стагоддзя адным са шляхоў паслаблення пазіцый дробнага дваранства была змена заканадаўства ў сістэме выбарных судовых органаў. Змяненні ажыццяўляліся ў напрамку скарачэння органаў дваранскага самакіравання.

Важным крокам, які павінен быў умацаваць пазіцыі расійскага ўрада на беларускіх землях, была канфіскацыя маёнткаў за ўдзел у антыўрадавай дзейнасці. Канфіскацыі праводзіліся ў некалькі этапаў. З 1773 па 1775 г. яны былі накіраваны супраць той часткі магнатаў і шляхты, якія не захацелі прынесці прысягу новаму гаспадару, а пазней – супраць удзельнікаў паўстання

Тадэвуша Касцюшкі.

3. Насаджэнне рускага дваранскага землеўладання.

Адначасова з “прыручэннем” мясцовай шляхты ўрад займаўся распаўсюджаннем русскага землеўладання на далучаных землях. Фонд падараванняў – дзяржаўныя маёнткі і канфіскаваныя шляхецкія.

Яшчэ Кацярынай II асноўная частка дзяржаўных зямель разам з сялянамі (звыш 180 тыс. чалавек мужчынскага полу) была раздадзена рускім дваранам і чыноўнікам. Павел I аддаў рускім памешчыкам яшчэ каля 28 тыс. сялян-мужчын.

Усяго да пачатку XIX ст. было раздадзена 208.550 душ У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай тэрыторыя Беларусі з насельніцтвам каля 3 мільёнаў чалавек была далучана да Расійскай імперыі. Царскія картографы доўга краілі беларускія землі.

Вялікія памеры падараванняў (па 5-15 тысяч) не садзейнічалі з’яўленню на Беларусі вялікай колькасці рускіх дваран. Новых землеўладальнікаў можна было проста пералічыць: Р. Пацёмкін, П. Румянцаў-Задунайскі, С. Зорыч, А. Суворaў, М. Раннін і інш. Падараванні перапыніў Аляксандр I с прычыны рэзкага росту незадаволеннасці сялян, бо іх становішча рэзка пагаршалася. Павел I нават выдаў маніфест у красавіку 1797 г. аб абмежаванні паншчыны трымя днямі ў нядзелю, але памешчыкі ігнаравалі ўказ, а ўрад не настойваў на яго выкананні.

Тэма 23. Культура Беларусі ў другой палове XVIII ст.

1. Эпоха Асветніцтва на Беларусі.

На другую палову XVIII ст. прыходзіцца распаўсюджванне ідэй Асветніцтва на Беларусі. Яны прыйшлі з Еўропы і іх з'яўленню спрыялі навуковыя адкрыцці ў прыродазнаўстве і дасягненні ў галіне гуманітарных ведаў. Ім уласціва прызнанне прыярытэту асветы, навукі і розуму ў жыцці асобы, грамадства і дзяржавы. Ідэі Асветніцтва знайшлі адлюстраванне ў філасофіі, сацыялогіі, літаратуры і мастацтве. Для эпохі Асветніцтва характэрна суіснаванне шэрага кулыурных стыляў - барока, класіцызму, сентыменталізму, ракако. Аднак характар эпохі вызначаў перш за ўсё класіцызм. Сутнасць яго выявілася ў кананізацыі антычнай класікі як дасканалага ўзору для наследавання нарматыўнасці эстэтычных крытэрыяў. Грунтаваўся ён на традыцыях Адраджэння і разам з тым сінтэзаваў у пераўтворанай форме дасягненні процілеглага яму барока, якое папярэднічала і часткова суіснавала з новым напрамкам.

На станаўленне беларускага Асветніцтва істотна паўплывала французская філасофская і эстэтычная думка. У сярэдзіне XVIII ст. на Беларусь пачалі пранікаць навукова-філасофскія ідэі французскіх энцыклапедыстаў, а таксама Д.Ж.Лока, Ф.Бэкана, Д.Юма, Р.Дэкарта. Іх творы карысталіся

папулярнасцю, значыліся ў каталогах розных бібліятэк. Асаблівую цікавасць выклікала творчасць Вальтэра. Аднак развіццё асветніцкай думкі на Беларусі было абумоўлена пераважна патрэбамі мясцовага жыцця - развіццём эканомікі і грамадска-палітычнай сітуацыяй.

За час Асветніцтва змяніліся грамадскія ідэалы. Раней ідэалам быў "сармат" - чалавек набожны, забабонны, суровы, ненавіснік усяго чужога і хавальнік старашляхецкіх традыцый. На змену яму прыйшоў ідэал разумнага, адукаванага, рацыяналістычнага, але адначасова і касмапалітычнага чалавека. Зразумела, гэтыя рысы вызначаліся перш за ўсё адносна сацыяльнага партрэту шляхты і магнатаў.

2. Стварэнне і дзейнасць Адукацыйнай камісіі.

У другой палове XVIII ст. пад уздзеяннем асветніцкіх ідэй значныя змяненні адбыліся ў сістэме навучальных устаноў Рэчы Паспалітай і змесце навучання ў іх. Адукацыя пачынае набываць усё больш свецкі характар. Нават манаскія ордэны з іх даўно адшліфаванай сістэмай гуманітарна-тэалагічнай адукацыі былі вымушаны пайсці на змяненне і дапаўненне сваіх праграм. У іх значнае месца адводзіцца прыродазнаўчым навукам. Прыкметна абнавілася ў гэты час сістэма адукацыі ордэна піяраў (з'ятліся ў ВКЛ у 30-х гг. XVIII ст.), якія саперніча лі ў гэтай справе з езуіцкімі навучальнымі ўстановамі. У праграмах піяраў былі пашыраны курсы матэматыкі, прыродазнаўчых і свецкіх гуманітарных навук.

У 1775 г. у Рэчы Паспалітай была створана Адукацыйная камісія — першае ў Еўропе міністэрства народнай адукацыі, якая ажыццявіла рэформу школ і універсітэтаў у духу Асветніцтва. У ВКЛ, па планах Адукацыйнай камісіі, прадугледжвалася стварэнне трох асноўных форм народнай адукацыі: ніжэйшай — з парафіяльнымі школамі,сярэдняй — з акруговымі і падакруговымі школамі, вышэйшай— Віленскі універсітэт.

У дзейнасці адукацыйнай камісіі значны ўдзел прынялі вядомыя польскія асветнікі канца ХУШ ст. Г. Калантай, Я. Снядэцкі і інш. Тон рэформе ў ВКЛ задавалі Іаахім Храптовіч і Галоўная літоўская школа, у прыватнасці І. Страйноўскі, К. Нарбут і інш. Статут Адукацыйнай камісіі і мерапрыемствы, якія ажыццяўляліся ёю ў галіне асветы, насілі ў цэлым прагрэсіўны характар. Школа набывала свецкі напрамак і ад кіраўніцтва ёю адхілялася духавенства. Са школы выганяліся схаластыка і тупое завучванне. Выкладанне тэалогіі ў сценах школ было забаронена. У навучальным плане значнае месца адводзілася прадметам фізіка-матэматычнага цыкла, прыродазнаўчым навукам. Гуманітарныя прадметы былі прадстаўлены ў праграме польскай і лацінскай граматыкай, геаграфіяй, гісторыяй, заканадаўствам, "маральнай навукай", логікай, палітэканоміяй, рыторыкай. Адукацыйная камісія за 20 гадоў сваёй дзейнасці адкрыла 20 школ: у Гародні, Ваўкавыску, Барунах, Наваградку, Пінску, Бярэсці, Жыровічах, Нясвіжы, Слуцку і інш. Гэтыя школы з'яўляліся сярэдняй ступенню навучання. Паспяховае заканчэнне любой з іх давала права на паступленне ў вышэйшую навучальную ўстанову.

3. Гродзенская медыцынская школа. Дасягненні прыродазнаўчых навук

Гродзенская медыцынская школа — першая на Беларусі вышэйшая навучальная ўстанова па падрыхтоўцы медыцынскага персаналу. Існавала ў 1775 — 1781 у Гродне.

Адкрыта па ініцыятыве А. Тызенгаўза ў спецыяльна ўзведзеным трохпавярховым будынку. Арганізатарам і кіраўніком акадэміі быў французскі ўрач, вучоны-натураліст Ж. Э. Жылібер. Мела 3 аддзяленні: падрыхтоўкі «сучасных урачоў для гарадоў» (10 чал.), падрыхтоўкі правінцыяльных урачоў і хірургаў (20 чал.), аддзяленне павітух (спачатку на 5, пазней на 17 чал.). Навучэнцы ўтрымліваліся за кошт казны, пасля заканчэння вучобы павінны былі працаваць у Брэсцкім, Гродзенскім, Оліцкім, Шавельскім каралеўскіх уладаннях, адкуль і набіраліся. Навучанне мела акадэмічны характар. Працавалі 5 выкладчыкаў, 2 фельчары і акушэрка. Пры акадэміі дзейнічалі шпіталь на 60 ложкаў, анатамічны тэатр і музей, кабінет прыродазнаўства, аптэка, бібліятэка, батанічны сад (першы на тэрыторыі Беларусі і ў Рэчы Паспалітай). Ж. Э. Жылібер падтрымліваў навуковыя сувязі з Расійскай акадэміяй навук. У 1778 ён паведамляў аб першым выпуску (12 чал.). Пасля таго, як А. Тызенгаўз у 1780 быў змешчаны з пасады гродзенскага старосты, Ж. Э. Жылібер разам са сваімі вучнямі пераехаў у Вільню. Школа стала базай для стварэння ў 1781 медыцынскага факультэта Віленскага ўніверсітэта.

4. Ідэі Асветніцтва ў літаратуры і грамадскай думцы.

Пасля соймавай пастановы 1696 г., якая замяніла нашу дзяржаўную мову на польскую, сфера выкарыстання беларускай яшчэ болей звузілася. У тэты перыяд літаратура ў Вялікім Княстве Літоўскім стваралася пераважна на польскай, а часам на лацінскай мовах. Прыхільнік класіцызму паэт Міхал Карыцкі пісаў на лаціне. Самым папулярным яго творам была паэма «Птушыны сойм» - сатыра на шляхту і магнатаў Рэчы Паспалітай. Творчасць Карыцкага паўплывала на лацінамоўную паэзію эпохі Асветніцтва ў Польшчы і Украіне. Прадстаўніком сентыменталізму быў паэт і драматург Францішак Князьнін. Яго пяру належаць напісаныя па-лацінску і па-польску байкі, любоўная і рэлігійная лірыка, пастаралі з элементамі беларускага фальклору. Польскамоўны паэт, перакладнік і гісторык Адам Нарушэвіч пакінуў у сваёй творчай спадчыне палітычныя оды, пераклады з французскай і лацінскай моваў, дыярыюшы з апісаннем падарожжаў вялікага князя і караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага па падуладных яму землях.

Пад уплывам эстэтыкі барока і ідэяў Асветніцтва пашыралася жанравая разнастайнасць твораў, якія набывалі выразны свецкі характар і набліжаліся да жыцця. Узнікла інтымная лірыка, гумарыстычная паэзія, парадыйна-сатырычная проза і драматургія. Драматург Каятан Марашэўскі здабыў славу найперш сваей беларуска-польскай «Камедыяй», галоўны герой якой - прыгонны селянін Дзёмка. Аўтар сцвярджаў у п'есе асветніцкую думку, што

шчасце залежыць не ад лёсу, а ад чалавечых учынкаў. «Камедыя» Марашэўскага ў сучаснай апрацоўцы і цяпер у рэпертуары беларускіх тэатраў.

Папулярнасцю карысталіся і драматургічныя творы Міхала Цяцерскага: камедыі «Шлюб, перакулены дагары штучкамі арлекіна» і «Лекар па прымусе» (на вядомы сюжэт Мальера, але з беларускімі героямі і мясцовым каларытам), лібрэта оперы «Апалон-заканадаўца, або Рэфармаваны Парнас». Аўтаркай шматлікіх арыгінальных п'есаў і перакладаў была княгіня Францішка Уршуля Радзівіл, першая жанчына-драматург у Рэчы Паспалітай, а таксама таленавітая паэтка. У 1754 г. асобнай кнігаю выйшлі яе «Камедыі і трагедыі».

Надзвычай каларытныя мемуары, якія нагадваюць прыгодніцкі раман, стварыла ў 1760 г. ліцьвінка з Наваградчыны, падарожніца і лекарка Саламея Пільштынова (у дзявоцтве Русецкая). Яна дасціпна апісала побыт і норавы Вялікага Княства, Турцыі, Расеі, Аўстрыі. Польскамоўныя ўспаміны нашай таленавітай суайчынніцы перасыпаныя беларусізмамі, народнымі прыказкамі і прымаўкамі. У 1993 г. кніга С. Пільштыновай пад назовам «Авантуры майго жыцця» выйшла ў перакладзе на беларускую мову і, нягледзячы на вялікі наклад, хутка стала рэдкасцю.

5. Прыгонныя тэатры. Музычнае мастацтва.

Выдатнай з'явай нашай культуры ў гэтую эпоху сталі прыватныя тэатры, якія дасягнулі прафесійнага роўню. Найбольшую вядомасць у Вялікім Княстве і далёка за яго межамі мелі тэатры Радзівілаў у Нясвіжы і Слуцку, Тызенгаўза ў Горадні, Агінскага ў Слоніме. 60 актораў налічвала тэатральная трупа ў маёнтку Дзярэчын, што належаў Сапегам. Разам з тэатрамі звычайна ствараліся капэлы. Пры Нясвіжскім тэатры існавала балетная, музычная і вакальная школы. Спектаклі адбываліся ў адмысловым будынку «камедыхаўзе» ў суправаджэнні Нясвіжскай капэлы - прыдворнага аркестра князёў Радзівілаў. У рэпертуар уваходзілі камедыі, трагедыі, оперы Францішкі Уршулі Радзівіл, творы Мальера, Вальтэра, балеты і пантамімы. Нясвіжскія акторы з поспехам выступалі ў іншых гарадах краіны.

Слонімскі тэатр, заснаваны вялікім гетманам Міхалам Казімірам Агінскім, меў выключныя тэхнічныя магчымасці. Да прыкладу, пад час спектаклю маглі біць два вялікія фантаны, асветленыя бенгальскімі агнямі. Існавала таксама размешчаная на Агінскім канале плывучая сцэна на баржах для водных феерыяў і тэатралізаваных баталіяў з удзелам кавалерыі. У чатырох'ярусных ложах тэатра маглі змясціцца дзве тысячы гледачоў. Славілася майстэрствам Слонімская капэла. Рэпертуар тэатра Агінскага ўлучаў 60 опер (у тым ліку «Цыганы» на лібрэта Ф. Князьніна), 18 балетаў, тры музычныя камедыі, 253 сімфоніі. Музыку да некаторых сцэнічных твораў пісаў сам Агінскі, які, дарэчы, падказаў Гайдну сюжэт ягонай знакамітай араторыі «Стварэнне свету».

Вядомасць як кампазітар атрымаў пазней яшчэ адзін Агінскі - Міхал Клеафас, аўтар папулярных паланезаў (у тым ліку славутага «Развітання з Айчынай»), рамансаў, фартэпіянных п'есаў і напісанай на ўласнае лібрэта оперы «Зеліда і Валькур, або Банапарт у Каіры». Мелодыя каванціны Фігаро

ўпершыню прагучала за восем гадоў да стварэння Моцартам оперы «Вяселле Фігаро» ў вакальным цыкле Міхала Клеафаса Агінскага «Да Касі». Нашы кампазітары ўзбагацілі музычнае мастацтва Еўропы шэрагам адкрыццяў. Да іх належыць выкарыстанне вакальных цыклаў задоўга да «афіцыйнага» пачынальніка гэтага жанру Бэтховэна. Творы Мацея Радзівіла сталі першымі еўрапейскімі аркестровымі ўзорамі паланезаў.

Крыху пазней першую оперу «Фаўст» у супрацоўніцтве з Гётэ напісаў Антон Генрык Радзівіл. Магнаты Вялікага Княства запрашалі да сябе прызнаных майстроў тэатральнага і музычнага мастацтва з Заходняй Еўропы, але большасць трупы або аркестра заўсёды складалі акторы і музыкі з мясцовых сялянаў і мяшчанаў. Гарадзенскі балет і слонімскія танцоры сталі пазней асновай каралеўскага Варшаўскага балета.

Побач з прыватнымі працягвалі свае традыцыі гэтак званыя школьныя тэатры, што існавалі пры навучальных установах. Шырока вядомы быў тэатр Забельскага дамініканскага калегіюма (каля вёскі Валынцы Верхнядзвінскага раёна), дзе выкладалі знаныя драматургі К. Марашэўскі і М. Цяцерскі. Там была пастаўленая «Камедыя» Марашэўскага - першая беларуская камедыя, дзе галоўныя персанажы гавораць па-беларуску.

6. Архітэктура і жывапіс, класіцызм.

Сутнасць класіцызму выявілася ў кананізацыі антычнай класікі, арыентацыі на яе як на дасканалы ўзор для наследавання, у нарматыўнасці эстэтычных крытэрыяў, ідэалізацыі і абстрактнасці вобразнага абагульнення (тыпізацыі) без усебаковага выяўлення пры гэтым непаўторна-асабовага (індывідуалізацыі). Класіцызм характарызуецца універсальнасцю, бо ахапіў усе віды мастацтва, а таксама эстэтыку і крытыку. Для яго характэрна таксама пэўнае стылявое адзінства.

Станаўленне класіцызму ў архітэктуры Беларусі адносіцца да 70-90-х гг. і супадае з часам далучэння да Расійскай Імперыі. Асновай для пранікнення рыс класіцызму ў архітэктуру стала дзейнасць па перапланіроўцы ўсходнебеларускіх гарадоў. Планы іх пабудовы і кварталы набылі геаметрычныя абрысы, у якасці кампазіцыйных восей вылучаліся галоўныя вуліцы і гарадскія плошчы. У Цэнтральнай і Заходняй Беларусі класіцызм не меў значнага развіцця.

Палацы і замкі магнатаў аздабляліся высокамастацкімі габеленамі і партрэтамі. Апісанне Нясвіжскай рэзідэнцыі Радзівілаў за 1770 г. пералічвае 984 творы выяўленчага мастацтва на палатне і дрэве. У сярэдзіне XVIII ст. склаўся і атрымаў пашырэнне адметны стыль віленскага барока. Ён вызначаўся вытанчанасцю прапорцыяў, скульптурнай пластычнасцю фасадаў і інтэр'ераў, маляўнічасцю франтонаў і ажурных вежаў. У гэтым стылі ствараліся шматлікія вуніяцкія храмы.

У жывапісе перажываў свой росквіт жанр партрэта. У ім, а таксама ў гістарычным, батальным, пейзажным жанрах плённа працаваў прадстаўнік класіцызму Францішак Смуглевіч. У другой палове XVIII ст. пачаўся творчы шлях майстра партрэта Яна Рустэма. Мастацтва графікі папоўнілі працы

Аляксандра і Лявона Тарасевічаў, Васіля Вашчанкі, Гершкі Ляйбовіча. У скульптуры пад уплывам барока нашыя майстры стварылі з дрэва ўнікальныя алтарныя ансамблі ў Гарадзенскім касцёле езуітаў і Пінскім касцёле францысканцаў. Узнікла свецкая скульптура - бюсты магнатаў, гістарычных дзеячоў, мастацкія надмагіллі. Шырокую вядомасць у краіне і за яе межамі набылі творы дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, асабліва слуцкія паясы, карэліцкія шпалеры, урэцка-налібацкае шкло.

Тэма 24. Эканамічнае развіццё і сацыяльныя супчярэчнасці у першай палове XIX ст.

1. Сельская гаспадарка. Узмацненне феадальная эксплуатацыі сялянства.

Адной з асаблівасцей развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі было панаванне буйнога дваранскага землеўладання. У сярэдзіне 30-х гг. XIX ст. 3,6 % буйных памешчыкаў валодалі 50 % прыгонных сялян. Дробныя і сярэднія памешчыкі (да 100 душ прыгонных), якія складалі 80 % агульнай колькасці, валодалі ўсяго 15,8 % сялян.

У сваіх маёнтках памешчыкі будавалі прамысловыя прадпрыемствы па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі і сыравіны: суконныя, вінакурныя, цукраварныя, смалакурныя, жалезаапрацоўчыя. Вельмі важнай галіной прыбытку быў продаж лесу.

Асновай сельскай гаспадаркі з’яўлялася земляробства, ад якога памешчыкі атрымлівалі галоўную частку сваіх даходаў. Яны імкнуліся павялічваць плошчу ворных зямель. З канца XVIII да сярэдзіны XIX ст. плошча ворных зямель павялічылася ў 3–4 разы. Вырошчвалася жыта, авёс, ячмень. Папулярнай культурай стала бульба. У сувязі з пераўтварэннем бульбы з агароднай культуры ў палявую яе пасевы з пачатку XIX ст. да канца 30-х гг. узраслі ў 20–25 разоў. У многіх памешчыцкіх маёнтках пашыралася вытворчасць ільну. Раслі пасевы канапель, цукровых буракоў.

Важнейшым напрамкам спецыялізацыі памешчыцкіх гаспадарак, асабліва на Гродзеншчыне, становіцца танкарунная авечкагадоўля. На мяса-малочнай жывёлагадоўлі ў той час спецыялізаваліся толькі асобныя памешчыкі, якія мелі ў сябе вінакурныя заводы.

Некаторыя памешчыкі ў мэтах павелічэння таварнасці гаспадаркі выпісвалі з Англіі сельскагаспадарчыя машыны, уводзілі шматпольны севазварот, паляпшалі пароды жывёлы. У памешчыцкіх гаспадарках стала шырэй выкарыстоўвацца наёмная праца, галоўным чынам на прамысловых прадпрыемствах, на будаўнічых работах. Прапагандай перадавых метадаў земляробства і жывёлагадоўлі займалася Беларускае вольнае эканамічнае таварыства, што існавала з 1826 па 1841 г. у Віцебску. Развіццю капіталістычных адносін спрыяла і тое, што мясцовае дваранства атрымала доступ да пазык у цэнтральных банках з правам закладу маёнткаў разам з сялянамі. Перад адменай прыгоннага права ў банках было закладзена каля 68 % беларускіх сялян. Так феадальная памешчыцкая ўласнасць пераўтваралася ў капіталістычную ўласнасць банкаў і крэдытных устаноў.

Асноўнай вытворчай базай маёнтка памешчыка з’яўлялася сялянская гаспадарка. Зямельныя надзелы сялян у Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губернях адводзіліся ў падворнае карыстанне; у Віцебскай, за выключэннем інфлянцкіх (латышскіх) паветаў, і Магілёўскай губернях пераважала абшчыннае землекарыстанне. Размеркаванне зямельных надзелаў паміж сялянамі было нераўнамерным. Так, у канцы 50-х гг. сярэдні надзел у Віцебскай губерні складаў 6,5 дзесяціны (дзесяціна – 1,09 га), у Магілёўскай – 7,3 дзесяціны. У Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губернях асноўнай адзінкай зямельнага забеспячэння лічылася валока (каля 21 га сенажаці, ворыўнай і прысядзібнай зямлі). Гэтых надзелаў ледзьве хапала для забеспячэння пражытачнага мінімуму сялянскай сям’і. Дзяржаўныя сяляне таксама пакутавалі ад малазямелля. Сярэднія надзелы на рэвізскую душу складалі ў Гродзенскай губерні ад 1 да 2 дзесяцін, у Віцебскай і Магілёўскай ад 3 да 5. Гаспадарка сялян, як дзяржаўных, так і памешчыцкіх, была вельмі прымітыўнай. Жывёлы не хапала, глеба ўгнойвалася рэдка, ураджаі былі нізкімі. У пошуках выхаду невялікая частка сялян займалася промысламі, гандлем і іншымі пабочнымі заробкамі.

Аднак, нягледзячы на панаванне паншчыннай сістэмы, сялянская гаспадарка паступова звязвалася з рынкам. З пачатку XIX ст. развівалася і

прамысловая дзейнасць сялян. Яны выраблялі на продаж ільняныя і суконныя тканіны, аўчыну, хатнія драўляныя вырабы.

Пашыралася маёмасная дыферэнцыяцыя сярод сялян. З'явіліся заможныя сяляне. Многія з іх арандавалі млыны, займаліся дробным гандлем, карысталіся ў сваіх гаспадарках рознымі механічнымі прыстасаваннямі. У той жа час у беларускай вёсцы расла колькасць беззямельных сялян (бабылёў, кутнікаў і інш.). Сяляне ў масе сваёй усё больш разараліся і не маглі, як раней, несці павіннасці. Паншчына ў большасці маёнткаў Заходняй і Цэнтральнай Беларусі складала 6 чалавека-дзён у тыдзень з сялянскай гаспадаркі.

2. Разлажэнне феадальна-прыгонніцкага ладу. Пачатак прамысловага пераварота.

Адным з яскравых паказчыкаў крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы было нарастанне сялянскага руху. Калі ў першай трэці XIX ст. адбылося 46 буйных сялянскіх хваляванняў, то ў другой трэці, – больш за 90. Асаблівасцю сацыяльных супярэчнасцей у Беларусі з'яўлялася іх пераплятанне з нацыянальна-рэлігійнай варожасцю паміж сялянамі і панамі.

Своеасаблівай формай пратэсту сялян было тое, што некаторыя з іх пакідалі родныя мясціны ў пошуках "вольных зямель". Так, напрыклад, у пачатку 40-х гг. 1200 прыгонных Беліцкага павета Магілёўскай губерні пакінулі свае вёскі і групамі накіраваліся на пасяленне ў Херсонскую, Екацярынаслаўскую губерні і Бесарабію. Для таго каб затрымаць і вярнуць іх на радзіму, была паслана ваенная каманда.

У канцы 40-х гг. сярод сялян Беларусі пашырыліся чуткі, што рыхтуецца адмена прыгоннага права. У сувязі з гэтым сяляне пачалі часцей уцякаць ад памешчыкаў. У 1847 г. каля 10 тыс. сялян Віцебскай губерні групамі па 200 чалавек накіраваліся на будаўніцтва Мікалаеўскай чыгункі, спадзеючыся, што, адпрацаваўшы там 3 гады, яны будуць вызвалены ад прыгоннай залежнасці.

Але найбольш распаўсюджанымі формамі сялянскага руху з'яўлялася адмова ад выканання павіннасцей і падача "іскаў аб вольнасці" на імя цара.

З 40-х гг. XIX ст. працэс разлажэння феадальна-прыгонніцкай сістэмы на Беларусі, як і ва ўсёй Расіі, перарастае ў крызіс. У сельскай гаспадарцы ён выявіўся ў рэзкім зніжэнні прыбытковасці памешчыцкай і дзяржаўнай вёскі, у абеззямельванні і збядненні сялянства, у росце сацыяльных канфліктаў.

Да сярэдзіны XIX ст. прамысловая вытворчасць у Беларусі знаходзілася пераважна на дробнатаварнай і мануфактурнай ступенях развіцця. Асноўнымі прадпрыемствамі гэтага часу былі прыгонныя мануфактуры, гаспадарамі якіх з'яўляліся памешчыкі. Яны прымушалі працаваць на мануфактурах сваіх сялян. Пераважнае выкарыстанне працы прыгонных на прамысловых прадпрыемствах Беларусі ўяўляла сабой важную асаблівасць яе эканамічнага развіцця.

Акрамя таго, у гарадах і мястэчках мелася шмат розных дробных прадпрыемстваў і майстэрань з 1–3 рабочымі, гаспадарамі якіх былі купцы і мяшчане. Сярод прадпрыемстваў, якімі яны валодалі, былі скураныя, медныя,

цагельныя, капялюшныя. Вырабы гэтых прадпрыемстваў збываліся ў асноўным на мясцовых рынках.

Былі ў Беларусі і прадпрыемствы, заснаваныя на вольнай працы. Большасць “вольнанаёмных” складалі прыгонныя, якіх паны на кароткі тэрмін адпускалі на заробкі. Па сканчэнні гэтага тэрміну яны пакідалі прадпрыемства. Часовыя рабочыя-прыгонныя не маглі задаволіць прамысловасць, якой былі патрэбны кваліфікаваныя майстры і працоўныя. Прыгоннае права ставіла сур’ёзныя перашкоды для развіцця капіталістычнай прамысловасці.

Новай з’явай у прамысловым развіцці Беларусі было выкарыстанне на асобных прадпрыемствах машын і паравых рухавікоў. Аднак колькасць прадпрыемстваў, якія мелі машынную тэхніку, была нязначнай. Уладальнікамі большасці такіх прадпрыемстваў спачатку былі памешчыкі, хаця ўжо з 30-х гг. больш за палову іх належала купцам і мяшчанам.

Па колькасці занятых у прамысловасці рабочых сярод беларускіх губерняў першае месца займала Гродзенская губерня. У канцы 50-х гг. на яе прадпрыемствах працавала 5 112 рабочых з 9 714. Другое месца са значным адставанем належала Магілёўскай губерні, дзе ў гэты час на прадпрыемствах было занята 1 882 рабочыя. На апошнім месцы знаходзілася Мінская губерня, на прадпрыемствах якой працавала ўсяго 815 рабочых.

У Беларусі найбольш распаўсюджанымі былі прадпрыемствы па перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны – вінакурныя, суконныя, палатняныя, цукровыя, мукамольныя. Вядучай галіной прамысловасці Беларусі ў першай палове XIX ст. заставалася суконная. Каб заахвоціць да стварэння новых суконных мануфактур, прадпрымальнікам даваліся дзяржаўныя пазыкі. Ужо ў 1861 – 1863 гг. на тэрыторыі Беларусі налічвалася 64 суконныя прадпрыемствы, на якіх працавала звыш 51 тыс. рабочых. Суконная прамысловасць была ў асноўным сканцэнтравана ў Гродзенскай губерні (55 прадпрыемстваў).

Другое месца займала вытворчасць шарсцяных вырабаў. У 1857 г. налічвалася сем прадпрыемстваў гэтай галіны, на якіх працавала 1 444 рабочых. Усе яны знаходзіліся ў Гродзенскай губерні. Сярод прадпрыемстваў Беларусі значная доля належала папяровым, шкляным, чыгунным, медзеплавільным, жалезаапрацоўчым, цагельным і інш. Жалезаробчыя прадпрыемствы працавалі на мясцовай сыравіне. Жалеза здабывалі з балотнай руды. Шкляная прамысловасць была найбольш развітой у Магілёўскай губерні, дзе знаходзілася 8 з 14 заводаў.

Фабрыкі ў Беларусі пачалі ўзнікаць з 20-х гг. XIX ст. Першымі былі пабудаваны суконныя фабрыкі ў мястэчках Хомску Кобрынскага і Косаве Слонімскага паветаў. На металаапрацоўчым прадпрыемстве Бенкендорфа ў маёнтку Старынцы Чэрыкаўскага ўезда працавала каля 900 рабочых. Ствараліся ў Беларусі цукровыя прадпрыемствы. У 1857 г. было 13 цукровых заводаў, якія мелі паравыя рухавікі і штогод выраблялі 12,5 тыс. пудоў цукру. На іх працавала 1 164 вольнанаёмныя рабочыя. Цукар, які вырабляўся на прадпрыемствах Беларусі, прадаваўся не толькі на мясцовых рынках, але вывозіўся і ў Маскву. Аднак “цукровая гарачка” працягвалася нядоўга. Цукровыя заводы Беларусі не вытрымалі канкурэнтнай барацьбы з больш

буйнымі прадпрыемствамі Расіі, Украіны і Польшчы і ў сярэдзіне 60-х гг. спынілі сваё існаванне.

Нягледзячы на істотныя зрухі ў развіцці прамысловасці Беларусі першай паловы XIX ст., яе памеры ў параўнанні з агульнарасійскай былі нязначнымі, а тэмпы развіцця – надзвычай марудлымі. Пры гэтым дробнатаварная і мануфактурная вытворчасць у Беларусі з пачатку 30-х гг. перажывала крызіс, які быў звязаны з паглыбленнем крызісу ўсёй прыгонніцкай сістэмы. Прамысловасць адчувала востры недахоп у працоўнай сіле і асабліва ў людзях, якія валодалі тэхнічнымі ведамі.

3. Узрастанне ролі гарадоў і мястэчак. Транспарт і гандаль.

У першай палове XIX ст. у Беларусі назіраўся рост гарадскога насельніцтва. Колькасць насельніцтва беларускіх гарадоў расла як за кошт натуральнага прыросту, так і ў выніку прымусовага перасялення яўрэяў з сельскай мясцовасці, якія неўзабаве склалі пераважную колькасць гарадскога насельніцтва і якія засяродзілі ў сваіх руках рамяство і гандаль. 70 – 90 % гарадскога насельніцтва складала мяшчанства (рамеснікі, дробныя гандляры), 6 – 7 % – дваранства і духавенства, 2 – 2,5 % – купецтва. У сярэдзіне XIX ст. у Беларусі налічвалася 40 гарадоў і больш за 300 мястэчак. Найбольш буйнымі гарадамі былі Віцебск, Мінск, Магілёў, Гродна. Аднак у першай палове XIX ст. гарады яшчэ не сталі цэнтрамі прамысловасці, у іх працягвалі развівацца гандаль і рамяство.

Развіццё прамысловасці, рост гарадскога насельніцтва стымулявалі пашырэнне ўнутранага рынку. Гандаль Беларусі развіваўся пераважна ў форме кірмашоў, часта з вялікім гандлёвым абаротам. Усяго ў Беларусі штогод праходзіла каля 200 кірмашоў. На самым буйным з іх – Зэльвенскім (Гродзенская губерня) – гадавы абарот перавышаў 1 млн. руб. Сярод буйных кірмашоў былі Любавіцкі ў Магілёўскай губерні і Мінскі. Сюды прывозілі сельскагаспадарчыя і прамысловыя тавары не толькі з Беларусі, але і з Маскоўскай, Уладзімірскай, Ніжагародскай губерняў, Украіны, Польшчы, Прусіі і іншых месцаў.

Важнае значэнне ў Беларусі набыў вывазны гандаль. Прадметамі экспарту былі збожжа, лён, пянька, каноплі, лес, спірт, смала, паташ і г. д. У Беларусь завозілі шэрсць, металічныя вырабы, галантарэю, прадметы раскошы: фарфоравы і фаянсавы посуд, крышталь, люстэркі і г. д. Назіралася паступовае змяненне асартыменту прывезеных тавараў. Напрыклад, на Стаўпянскую прыстань у 1827 г. прывозілі пераважна прадметы раскошы: фарфоравы і фаянсавы посуд, крышталь, люстэркі, дарагое віно, а ў 1850-я гг. выгружалі пераважна чыгунныя вырабы, свінец, волава, паперу.

У развіцці гандлю важную ролю адыгралі суднаходныя рэкі – Бярэзіна, Прыпяць, Днепр, Заходняя Дзвіна, Нёман, якія праз каналы звязвалі Беларусь з балтыйскімі і чарнаморскімі портамі. У 1804 – 1805 гг. скончылася будаўніцтва Агінскага і Бярэзінскага каналаў. Яны звязалі Днепр з Заходняй Дзвіной, Нёманам і Віслай. На беларускіх рэках і каналах знаходзілася каля 85

прыстаней. Праз Рыгу, Гданьск, Кёнігсберг адпраўлялі буйныя баржы з таварамі з Беларусі за мяжу.

Развіццю гандлю спрыяла таксама паляпшэнне сродкаў сувязі і будаўніцтва сухапутных дарог. На працягу першай паловы XIX ст. былі пашыраны ўжо існуючыя і пабудаваны новыя грунтовыя шасэйныя дарогі, якія злучалі Маскву і Пецярбург з заходнімі і паўднёвымі рэгіёнамі імперыі. Некаторыя з іх пралягалі праз Беларусь. Гэта Пецярбургска-Кіеўская, Маскоўска-Рыжская. Была пабудавана Маскоўска-Варшаўская шаша, якая прайшла праз 3 беларускія губерні: Магілёўскую, Мінскую, Гродзенскую. Агульная працягласць шасэйных дарог у 1860 г. у Беларусі дасягнула 1 100 км.

Развіццё гандлю было цесна звязана са станам прамысловасці, сельскай гаспадаркі, плацежаздольнасцю насельніцтва. Феадальна-прыгонніцкая сістэма стрымлівала развіццё ўсіх галін народнай гаспадаркі, абмяжоўвала пашырэнне ўнутранага рынку. Знішчэнне прыгонніцкіх адносін з'яўлялася неабходнай перадумовай далейшага эканамічнага развіцця Беларусі.

Тэма 25. Вайна 1812 г. і Беларусь

1. Расійска-французскія адносіны і палітычная сітуацыя ў заходніх губернях напярэдадні вайны.

Захапіўшы ўладу ў Францыі, Напалеон пачаў відавочна праяўляць свае прэтэнзіі на сусветнае панаванне. У ходзе войн 1796 – 1809 гг. Францыя падпарадкавала амаль усе краіны Заходняй Еўропы, за выключэннем Англіі і Швецыі. Такая сітуацыя пагражала інтарэсам Расійскай імперыі. Расія актыўна ўдзельнічала ў ваенных кааліцыях еўрапейскіх манархій, накіраваных супраць Францыі. Але ў руска-франка-прускай вайне 1805 – 1807 гг. кааліцыя пацярпела паражэнне. Аўстрыя і Прусія сталі сатэлітамі Францыі. Англіі Напалеон абвясціў кантынентальную блакаду і прымусіў далучыцца да яе ўсе заваяваныя ім дзяржавы. Расія таксама вымушана была заключыць ў 1807 г. Тыльзіцкі мір, які меў антыбрытанскую накіраванасць. Згодна з гэтым дагаворам, Напалеон стварыў з польскіх зямель, што належалі Прусіі, Герцагства Варшаўскае, васальную Францыі дзяржаву на граніцы з Расіяй. Расіі Напалеон навязаў Беластоцкую акругу з мэтай паглыбіць руска-прускія супярэчнасці. Герцагства Варшаўскае Напалеон выкарыстоўваў у якасці свайго плацдарма на выпадак вайны з Расіяй. Ён нават пагражаў Аляксандру I, што гатовы аднавіць Польшчу ў межах 1772 г.

Да пачатку 1810 г. адносіны паміж Францыяй і Расіяй яшчэ больш абвастрыліся, і яны пачалі рыхтавацца да вайны. Узрастае ваенны бюджэт Францыі, яе войска папаўняецца навабранцамі. Напалеон сцягвае свае войскі ў Прусію і Герцагства Варшаўскае, пастаянна папаўняючы іх кантынгент. Адначасова ён стварае з суседзяў Расіі – Аўстрыі і Прусіі франка-аўстра-прускі ваенны саюз, абяцаючы ім пашырыць іх тэрыторыі за кошт зямель, якія ўваходзілі ў склад Расіі. У лютым 1812 г. Напалеон заключыў дагавор з Прусіяй, а ў сакавіку – з Аўстрыяй. Прусія абавязалася выставіць 20 тыс. салдат, Аўстрыя – 30 тыс., перадаць іх пад французскае камандаванне і

прадставіць усё неабходнае для забеспячэння саюзнай арміі. Армія Герцагства Варшаўскага ўжо ў сакавіку 1811 г. налічвала 60 тыс. чалавек. Такім чынам, супраць Расіі Напалеон здолеў выставіць 647 158 чалавек войска і 1 372 гарматы.

Падрыхтоўка Францыі да вайны не была тайнай для Расіі. Расійскі ўрад рыхтаваўся да абароны. Буйным поспехам расійскай дыпламатыі напярэдадні вайны стала заключэнне саюзных дагавораў з Швецыяй, Вялікабрытаніяй і Іспаніяй. Перамога Расіі ў руска-турэцкай вайне 1806 – 1812 гг. і Бухарэсцкі мірны дагавор, заключаны ў маі 1812 г., выключылі магчымасць удзелу Турцыі ў вайне на баку Францыі.

Тэрыторыя Беларусі і Літвы разглядалася расійскім камандаваннем у якасці будучага галоўнага тэатра ваенных дзеянняў. Таму ўрад прыняў шэраг мер для яе ўмацавання ў інжынерных і інтэнданцкіх адносінах. У жніўні 1810 г. было вырашана пабудаваць ваенныя цытадэлі ў Бабруйску і Дынабургу і ваенны лагер каля Дрысы, а каля Барысава – масты праз Бярэзіну. У будаўніцтве гэтых абарончых збудаванняў прымала актыўна ўдзел насельніцтва Беларусі. Напрыклад, на работы па пабудове Дрысенскага ваеннага лагера кожны дзень прыцягвалася каля 2 500 чалавек.

У ваенна-стратэгічных планах расійскага камандавання беларускія землі адыгрывалі значную ролю ў бягучым забеспячэнні дыслацыраваўшыхся тут палявых рэгулярных войск, стварэнні харчова-фуражных запасаў, пастаўцы для арміі коней, транспартных сродкаў і іншых неабходных для арміі рэчаў. Ішло таксама камплектаванне расійскай арміі. Толькі за 1811 г. з пяці беларускіх губерняў у расійскія войскі паступіла 14 750 рэкрутаў, а разам з наборам 1808 – 1810 гг. агульная колькасць рэкрутаў з Беларусі складала некалькі дзесяткаў тысяч чалавек.

Падрыхтоўка да вайны ўскладнялася супярэчнасцямі ў палітычным настроі беларуска-літоўскага грамадства, у першую чаргу ў асяроддзі шляхецкага саслоўя. Дэмакратычныя шляхецкія, мяшчанскія, інтэлігенцкія колы арыентаваліся на Напалеона. Вялікая колькасць шляхецкай моладзі яшчэ з часоў аўстра-франка-польскай вайны 1809 г. эмігравала ў Герцагства Варшаўскае і паступала служыць у польскае войска. Прынятыя ў гэтай сувязі расійскімі ўладамі захады (секвестр і канфіскацыя маёмасці, судовыя прыгаворы) асаблівага поспеху не мелі.

Аднак пераважная большасць шляхты з асцярогай глядзела на сацыяльныя рэформы ў герцагстве, асабліва на адмену прыгоннага права.

Для многіх шляхціцаў імя Напалеона было непарыўна звязана з Французскай рэвалюцыяй, якая знішчыла ўсе феадальныя інстытуты. Частка арыстакратаў і буйных землеўласнікаў звязвала свае надзеі на аднаўленне элементаў “літоўскай” дзяржаўнасці (ВКЛ) у саюзе з Расіяй і на чале з Аляксандрам І.

Са свайго боку, для забеспячэння падтрымкі з боку дваранства Літвы і Беларусі напярэдадні вайны з Францыяй імператар Аляксандр І істотна знізіў падаткі, якія паступалі ў казну з тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага, і выказаў жаданне аднавіць цэласнасць краю пад эгідай Расіі. Па

даручэнню імператара ў 1811 г. магнаты М. Агінскі, К. Любецкі, К. Плятэр, К. Любамірскі, С. Грабоўскі склалі праект “Палажэння аб кіраванні

аўтаномным Вялікім Княствам Літоўскім”. У склад апошняга павінны былі ўвайсці ўсе тэрыторыі, што адышлі да Расіі ад былой Рэчы Паспалітай. Першым крокам на шляху да аўтаноміі павінна было быць абвяшчэнне Маніфеста Вялікага княства Літоўскага. Прадугледжвалася таксама паступовае, на працягу 10 гадоў, асабістае вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці. Аднак ажыццяўленне праекта адкладвалася. У вышэйшым расійскім кіраўніцтве гэты праект разглядалі як спробу раздзялення і аслаблення імперыі.

2. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам 1812 г. і палітыка французскіх улад

Расійскае войска на заходняй мяжы імперыі складалася з трох армій і трох асобных карпусоў. Першая Заходняя армія на чале з ваенным міністрам М.Б. Барклаем дэ Толі (120,2 тыс. чалавек і 580 гармат) дыслацыравалася ў Віленскай губерні, па лініі Расоны – Ліда і прыкрывала пецярбургскі кірунак. Другая Заходняя армія пад камандаваннем генерала ад інфантэрыі П.І. Баграціёна (49,4 тыс. чалавек і 180 гармат) знаходзілася ў Гродзенскай губерні, паміж Нёманам і Бугам і засланяла маскоўскі напрамак. Трэцяя Заходняя армія на чале з генералам ад кавалерыі А.П. Тармасавым (44,2 тыс. чалавек і 168 гармат) была размешчана каля г. Луцка ў Валынскай губерні і закрывала кіеўскі напрамак. Акрамя таго, пад Рыгай знаходзіўся асобны корпус генерал-лейтэнанта І. Эсена (38,1 тыс. чалавек), каля Тарапца – рэзервовы корпус генерал-ад’ютанта Я. Мелера-Закамельскага (27,5 тыс. чалавек) і войскі генерал-лейтэнанта Ф. Эртэля (37,5 тыс. чалавек). Паводле плана, распрацаванага саветнікам Аляксандра І прускім генералам К. Фулем, рускія арміі былі размешчаны на фронце ў 600 км і аказаліся адарванымі адна ад другой на 100 – 200 км. Гэта стварала рэальную пагрозу разгрому іх паасобку, на што і разлічваў Напалеон.

У ноч на 12 чэрвеня 1812 г. пачалася пераправа войскаў Напалеона праз Нёман. Адразу быў заняты г. Коўна. Напалеон спадзяваўся разбіць рускія войскі ў прыгранічных раёнах і прымусіць Расію заключыць мір. На нарадзе ў Дрысенскім лагеры расійскае камандаванне прыняло рашэнне не ўступаць у рашаючую бітву да аб’яднання 1-й і 2-й армій у Віцебску. Армія М.Б. Барклая дэ Толі адыходзіла на Віцебск праз Вільню – Свянцяны – Дрысу – Полацк. Для прыкрыцця Пецярбургскага напрамку ў Дрысенскім лагеры быў пакінуты корпус П.Х. Вітгенштэйна. У асабліва цяжкім становішчы апынулася 2-я армія П.І. Баграціёна, якая адступала ў напрамку Ваўкавыск – Слонім – Навагрудак – Нясвіж – Магілёў. Яна страціла сувязі з асноўнымі рускімі войскамі і праследавалася французскай арміяй.

Беларусь стала арэнай ваенных дзеянняў. 16 чэрвеня 1812 г. французская армія заняла Вільню. У той жа дзень сюды прыехаў Напалеон. У чэрвені – ліпені адбыліся жорсткія баі каля вёсак Вароны, Закрэўшчына, Гудзявічы Гродзенскай губерні, пад мястэчкамі Вішнева, Карэлічы Віленскай губерні;

паблізу мястэчкаў Мір і Раманава Мінскай губерні, каля мястэчка Астроўна і вёскі Кукавячыны Віцебскай губерні, пад Клясціцамі каля Полацка. 15 ліпеня А.П. Тармасаў разбіў пад Кобрынам саксонскі корпус Ж. Рэнье і знішчыў больш за 6 тыс. салдат і афіцэраў праціўніка. Аднак у ліпені 1812 г. злучыцца расійскім арміям у раёне Віцебска не атрымалася. Корпус Даву апярэдзіў рускую армію, заняў Магілёў і перагарадзіў ёй шлях каля вёскі Салтанаўка. Спроба рускіх войск прарвацца не ўдалася. Тады П.І Баграціён пераправіў армію праз Днепр каля Нова-Быхава і выратаваў яе ад разгрому. Чарговым пунктам сустрэчы рускіх армій быў прызначаны Смаленск.

Амаль уся Беларусь, апрача паўднёвых паветаў, кантралявалася французскім ваенным камандаваннем. Але ўжо на пачатку вайны Напалеон вымушаны быў пакідаць значныя сілы ў гарнізонах, асабліва ў Вільні, Мінску, Віцебску. Напалеонаўская армія разам з хворымі і дэзерцірамі страціла да 150 тыс. чалавек, у ёй пагоршылася дысцыпліна, шырока распаўсюдзілася марадзёрства.

Напалеон разлічваў, што значная частка літоўска-беларускай шляхты спадзявалася на аднаўленне пры яго дапамозе Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Каб яшчэ больш схіліць шляхту на свой бок, Напалеон распарадзіўся стварыць у захопленай Вільні Часовы ўрад пад назвай “Камісія Вялікага княства Літоўскага”. Дзейнасць Камісіі распаўсюджвалася на Віленскую, Гродзенскую, Мінскую губерні і Беластоцкую вобласць, якія былі ў хуткім часе ператвораны ў дэпартаменты з двайной (мясцовай і французскай) адміністрацыяй. Галоўныя пасады ў іх занялі французскія военачальнікі – інтэнданты. У склад Камісіі ВКЛ ўвайшлі мясцовыя землеўласнікі і палітычныя дзеячы: С. Солтан (старшыня), К. Прозар, Ю. Серакоўскі, А. Сапега, Ф. Ельскі, А. Патоцкі, Я. Снядзецкі. У яе функцыі ўваходзілі фінансавыя пытанні (збор падаткаў і размеркаванне бюджэтных сум), арганізацыя ўзброеных сіл, фарміраванне жандармерыі і суда. Вышэйшая ваенная ўлада ў княстве належала прызначанаму 8 ліпеня 1812 г. генерал-губернатару графу Дзірку ван Гогендорпу, а ў кожным дэпартаменце дзейнічаў ваенны губернатар. Для Віцебскай і Магілёўскай губерняў было вызначана асобнае, “польскае праўленне”. Неўзабаве Расійскі герб быў заменены на польскага белага арла.

Французскай арміі патрэбны былі салдаты і афіцэры, харчаванне, коні і фураж. Марыянетачны Часовы ўрад ВКЛ павінен быў перш за ўсе забяспечваць усім гэтым войскі Напалеона. Палякі заклікалі аднавіць Польскае каралеўства ў старых межах. Аднак Напалеон ухіляўся ад прамога адказу – ён не жадаў, каб паміж ім і Аляксандрам І паўставала непераадольная перашкода для заключэння міру. Да таго ж літоўска-беларуская шляхта не жадала аб’яднання з Польшчай, бо марыла аб стварэнні самастойнай дзяржавы. Менавіта таму Напалеон не далучыў тэрыторыю Вялікага княства Літоўскага да герцагства Варшаўскага, праігнараваўшы просьбы польскага сейма.

3. Адносіны насельніцтва да вайны і яго удзел у баявых дзеяннях

Прыход французскай арміі насельніцтва Беларусі сустрэла неадназначна. Гараджане ўрачыста віталі французаў. Шляхта амаль усюды сустракала

французскія войскі як вызваліцеляў ад расійскіх захопнікаў. Падтрымку Напалеону аказала і каталіцкая царква. Аднак па меры прасоўвання французскіх войск на ўсход Беларусі шляхта, асабліва ў Віцебскай і Магілёўскай губернях, пачынае выказваць свае пачуцці ўсё больш стрымана. Масавыя рэквізіцыі, недастаткова паважлівыя адносіны французаў да мясцовых органаў улады, ваенныя няўдачы прывялі да ахаладжэння ў адносінах шляхты да французаў. Захапленне змянілася трывожным чаканнем.

Асноўны цяжар вайны лёг на плечы сялян. Новая ўлада не толькі не адмяніла прыгон, але і павялічыла паборы з сялян, чым выклікала ўзмоцненае супрацьдзеянне і варожасць апошніх. Жыхары многіх вёсак пакідалі хаты, забіралі маёмасць і ўцякалі ў лясы, стваралі ў тыле акупантаў партызанскія атрады. Вядомы партызанскія атрады вёсак Стараселле, Мажаны, Есьманы і Кляўкі ў Барысаўскім, Варанкі ў Дрысенскім, Жарцы ў Полацкім паветах і інш. 18 ліпеня Аляксандр I падпісаў у Полацку маніфест аб скліканні народнага апалчэння. Трэба адзначыць, што ў чэрвені – ліпені 1812 г. разам з выступленнямі сялян супраць французскай арміі шырока распаўсюдзіліся выступленні сялян супраць памешчыкаў.

4. Ваенныя дзеянні восенню 1812 г. і выгнанне французаў. Вынікі вайны для Беларусі

22 ліпеня 1812 г. арміі Баграціёна і Барклая дэ Толі злучыліся пад Смаленскам. У пачатку жніўня адбылася Смаленская бітва, у якой Напалеон страціў больш за 14 тыс. чалавек. Пасля Смаленска рускую армію ўзначаліў М.І. Кутузаў. Генеральная бітва адбылася 26 жніўня каля вёскі Барадзіно. На Барадзінскім полі супраць французаў актыўна змагаліся ўраджэнцы Беларусі. Так, сфарміраваныя на Віцебшчыне чатыры палкі 3-й пяхотнай дывізіі, абаранялі вядомыя Баграціёнавы флешы, а 24-я пяхотная дывізія, складзеная з ураджэнцаў Мінскай губерні, гераічна змагалася каля батарэі Раеўскага.

Аднак Барадзінская бітва не прынесла перамогі ніводнаму з бакоў. М.І. Кутузаў дзеля далейшага захавання арміі пакінуў Маскву, якую хутка занялі французы. Не дачакаўшыся адказу Аляксандра I на прапановы аб міры, Напалеон у пачатку кастрычніка 1812 г. пачаў адступаць з Масквы па спустошанай Смаленскай дарозе. 7 кастрычніка 1812 г. рускія войскі вызвалілі Полацк, 26 кастрычніка – Віцебск, 4 лістапада – Мінск, 9 лістапада – Барысаў, 12 лістапада – Магілёў.

Завяршальны ўдар па французах быў нанесены рускімі войскамі ў лістападзе 1812 г. пры іх пераправе праз Бярэзіну, каля вёскі Студзёнка непадалёку ад Барысава. Тут загінула 20 тыс. іншаземных захопнікаў, 50 тыс. трапілі ў палон. Пасля гэтага напалеонаўская армія фактычна перастала існаваць. Галодныя і замёрзлыя салдаты кідалі зброю і натоўпамі рухаліся да Вільні. 23 лістапада ў Смаргоні Напалеон, даручыўшы камандаванне Мюрату, пакінуў армію і паехаў у Парыж.

Вайна прынесла Беларусі велізарныя людскія, матэрыяльныя і культурныя страты. Многія гарады і вёскі былі разбураны і знішчаны. У гарадах Беларусі колькасць насельніцтва зменшылася ў 2 – 3 разы. У Мінску,

напрыклад з 11 200 чалавек да 3 480. У Гродзенскай губерні загінула звыш 37 тыс. душ мужчынскага насельніцтва. Прыйшла ў заняпад сельская гаспадарка. Амаль напалову скараціліся пасяўныя плошчы і пагалоўе жывёлы. У грашовым вылічэнні страты Беларусі ад вайны, паводле няпоўных звестак, складалі каля 52 млн. руб. серабром.

Ад французаў пацярпелі помнікі царкоўнага дойлідства: Сафійскі сабор у Полацку, Барысаглебская царква ў Віцебску, Екацярынінскі храм у Мінску. Свята-Духаў храм у Вільні быў ператвораны захопнікамі ў звычайную стайню.

Расійскія ўлады не спяшаліся палепшыць становішча ў Беларусі. Прыгоннае права было захавана, працягваліся рэкруцкія наборы, падаткі амаль не зменшыліся. Негатыўныя наступствы падзей 1812 г. адчуваліся ў Беларусі на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. У той жа час мясцовая шляхта, нават скампраметаваная супрацоўніцтвам з Напалеонам, у большасці захавала свае правы і прывілеі. Маніфестам Аляксандра I ад 12 снежня 1812 г. калабарацыяністам абвяшчалася "уселітасцівейшае дараванне" і "вечнае забыццё" мінулага. Пачатыя да маніфеста канфіскацыі былі адменены і памешчыкам былі вернуты іх маёнткі. Напрыклад, С. Камінскі, які ўзначальваў створаную Напалеонам "Камісію Вялікага княства Літоўскага", захаваў пасаду старшыні ў мінскім галоўным судзе. В. Гяцэвіч, член савета ў Вільні, стаў мінскім віцэ-губернатарам і г. д.

Тэма 26. Палітыка царскага ўрада у першай палове XIX ст.

1. Эвалюцыя саслоўнай палітыкі. Палажэнне аб яўрэях. Ваенныя пасяленні. Актуалізацыя сялянскага пытання.

Саслоўная палітыка, якая праводзілася на тэрыторыі Беларусі, была скіравана на ўмацаванне пазіцый Расіі. Першым крокам у гэтым напрамку стала ўвядзенне ў Беларусі землеўладання рускага дваранства за кошт дзяржаўнага фонду. Яшчэ Кацярынай II асноўная частка дзяржаўных зямель разам з сялянамі (звыш 180 тыс. чалавек мужчынскага полу) была раздадзена рускім дваранам і чыноўнікам. Павел I аддаў рускім памешчыкам яшчэ каля 28 тыс. сялян-мужчын. Пасля 1801 г. раздача маёнткаў у Беларусі была спынена ўрадам Аляксандра I з-за супраціўлення дзяржаўных сялян пераводу іх у разрад памешчыцкіх.

У адносінах да беларускага дваранства ўрад ўлічваў гістарычныя асаблівасці, якія склаліся на працягу стагоддзяў.

У Расіі не існавала такой сацыяльнай групы як дробная шляхта. Яе эканамічнае становішча часам набліжалася да становішча селяніна-аднадворца. Аднак збяднелая шляхта фармальна не адрознівалася ад магнатаў і юрыдычна мела з імі аднолькавыя правы. Таму ўдзельная вага дваранства ў беларускіх губернях была самай высокай у імперыі – 5 – 6 % (у сярэднім 1,5 % па Еўрапейскай Расіі).

Палітыка расійскага ўрада ў адносінах да дваранства Беларусі вызначалася надзвычайнай асцярожнасцю. Мясцовым дваранам надаваліся ўсе правы і прывілеі, якімі валодала расійскае дваранства, але дазвалялася карыстацца

“мясцовымі законамі”, калі яны не супярэчылі расійскім. Так, да 1831 г. Статут Вялікага княства Літоўскага дзейнічаў ва ўсіх беларускіх губернях, а ў Мінскай, Гродзенскай і Віленскай – да 1840 г.

Новым ва ўрадавай палітыцы быў дыферэнцыраваны падыход да розных груп беларускага дваранства. У адносінах да дробнай шляхты, якая складала абсалютную большасць мясцовага прывілеяванага саслоўя, праводзіўся так званы “разбор шляхты”: шляхціцы, якія не змаглі дакументальна пацвердзіць сваё дваранскае паходжанне, прыпісваліся да розных груп падатковага саслоўя. Хоць “разбор” шляхты быў дэкларавaны яшчэ ў 1772 г., яго рэалізацыя праводзілася марудна, непаслядоўна, у асноўным з-за складанай юрыдычнай сістэмы доказаў дваранскага паходжання.

З пачатку новага стагоддзя адным са шляхоў паслаблення пазіцый дробнага дваранства была змена заканадаўства ў сістэме выбарных судовых органаў. Змяненні ажыццяўляліся ў напрамку скарачэння органаў дваранскага самакіравання.

Важным крокам, які павінен быў умацаваць пазіцыі расійскага ўрада на беларускіх землях, была канфіскацыя маёнткаў за ўдзел у антыўрадавай дзейнасці. Канфіскацыі праводзіліся ў некалькі этапаў. З 1773 па 1775 г. яны былі накіраваны супраць той часткі магнатаў і шляхты, якія не захацелі прынесці прысягу новаму гаспадару, а пазней – супраць удзельнікаў паўстання Тадэвуша Касцюшкі. У 1812 – 1813 гг. пачалася новая хваля канфіскацый, яна была звязана з вайной 1812 г. У выніку становішча магнатаў і шляхты пагоршылася, а іх імкненне да аднаўлення Рэчы Паспалітай узмацнілася.

Частка буйных землеўласнікаў звязвала надзеі на аднаўленне Рэчы Паспалітай з аўтаноміяй у складзе Расіі. У канцы 1811 – пачатку 1812 г. М. Агінскі па прапанове Аляксандра I падрыхтаваў праект аб адраджэнні Вялікага княства Літоўскага пад пратэктаратам Расіі (па прыкладу Фінляндыі). План не быў рэалізаваны, але разам з тым адыграў пэўную ролю ў фарміраванні ўрадавай палітыкі на тэрыторыі заходніх губерняў імперыі.

Пры Аляксандры I урад лічыўся толькі з дваранствам. Мерапрыемствы расійскага ўрада па сялянскаму пытанню не маглі не зацікавіць беларускіх памешчыкаў. “Вызваленне сялян” у Остзейскім краі (частка Латвіі) ў 1816 – 1819 гг., дзе сяляне атрымлівалі асабістую свабоду, а памешчык заставаўся ўласнікам усіх зямельных угоддзяў, умацавала памешчыкаў памежных раёнаў у жаданні беззямельнага вызвалення сялян. Так, дваранства Віцебскай губерні стварыла камітэт для выпрацоўкі адпаведнага палажэння, але яго распрацоўка зацягнулася і не была даведзена да канца.

Адным са сродкаў рашэння сялянскага пытання было ўвядзенне з 1810 г. ваенных пасяленняў (ініцыятарам гэтай палітыкі быў А. Аракчэеў). Мэтай іх арганізацыі было стварэнне з сялян ізаляванай ваеннай касты, якая б забяспечвала сябе харчаваннем і фуражом і з’яўлялася б апорай ураду. Аднак вопыт іх стварэння ў Магілёўскай і Віцебскай губернях быў няўдалы. Яны не здзейснілі ніводнай з пастаўленых задач.

Значныя абмежаванні ўводзіліся толькі ў адносінах да аднаго народа – яўрэяў. У Рэчы Паспалітай яўрэі не былі запрыгонены і не атрымалі права сяліцца на зямлі. У выніку гэтага яны прывыклі пастаянна перамяшчацца і

займацца часовай дзейнасцю (Асноўная частка яўрэйскага насельніцтва жыла ў гарадах і таму запісвалася ў лік мяшчан або купцоў). Гэта з'ява супярэчыла парадкам у Расійскай дзяржаве, дзе ўсё насельніцтва рэгістравалася і пражывала ў канкрэтным месцы.

Расійскія ўлады імкнуліся зберагчы інтарэсы свайго карэннага насельніцтва. Калі яўрэйскія купцы пачалі канкурыраваць з рускімі, то Кацярына II указам ад 23 снежня 1791 г. забараніла яўрэям запісвацца ў купецтва ва ўнутраных расійскіх гарадах. Яўрэям дазвалялася жыць толькі ў межах беларускіх губерняў і Таўрычаскай вобласці. З гэтага ўказа пачалося фарміраванне "мяжы аселасці" яўрэйскага насельніцтва. Указам ад 23 верасня 1794 г. права аселага жыхарства і купецка-мяшчанскіх заняткаў для яўрэяў дазволена ў 10 заходніх губернях (беларускіх, літоўскіх і часткі ўкраінскіх). Яўрэям дазвалялася сяліцца ў гарадах, займацца рамяством і гандлем. Яўрэі маглі запісвацца ў мяшчанскія і купецкія саслоўі з умовай, што будуць плаціць падвойны дзяржаўны падатак у параўнанні з хрысціянскім насельніцтвам. Каб забяспечыць паступленне падаткаў, урад пакінуў кагал у якасці органа абшчыннага яўрэйскага самакіравання. У 1795 г. яўрэям-купцам і мяшчанам было забаронена перамяшчацца з губерні ў губерню. "Палажэнне аб уладкаванні яўрэяў" ад 9 снежня 1804 г. захоўвала мяжу аселасці, адмяняла падвоены падатак з фабрыкантаў, рамеснікаў і землеўладальнікаў. Выбарчыя пасады ў гарадскім самакіраванні было дазволена займаць толькі адукаваным яўрэям, якія ведалі рускую, польскую або нямецкую мову. Па гандлёвых справах яўрэі маглі прыязджаць ва ўнутраныя губерні, але толькі па асобных пашпартах. "Палажэнне…" прадугледжвала новую дыскрымінацыйную меру – ссяленне да 1 студзеня 1808 г. яўрэйскага сельскага насельніцтва ў гарады і мястэчкі. Гэта акцыя мела цяжкія наступствы для яўрэяў, паколькі многія з іх гублялі сродкі для існавання – арэнду зямлі, корчмаў і г. д.

2. Люстрацыя дзяржаўных маёнткаў. Інвентарная рэформа.

Барацьба дзяржаўных і памешчыцкіх сялян за паляпшэнне свайго становішча прымусіла расійскі ўрад змяніць сялянскую палітыку ў Беларусі. У гэтых умовах урад праводзіць рэформы, мэтай якіх было захаваць сістэму феадальнага землеўладання, падняць прыбытковасць памешчыцкай і дзяржаўнай вёскі, ураўнаваць гаспадарчы ўзровень сялян. Аўтарам адной з рэформ быў граф П.Д. Кісялёў – кіраўнік Міністэрства дзяржаўных маёмасцей, прыхільнік абмежавання прыгоннага права.

Рэформа ў сістэме феадальнага землеўладання пачалася з дзяржаўнай вёскі, становішча якой у Расіі і Беларусі было розным. У Расіі інстытут "дзяржаўнага феадалізму" выступаў як сістэма эксплуатацыі, пад якую непасрэдна падпадалі дзяржаўныя сяляне з боку казённага ведамства. Нормы эксплуатацыі дзяржаўных сялян тут абмяжоўваліся інвентарамі, ніхто не меў права іх перавышаць. У Беларусі ж дзейнічала сістэма часовага ўладання. Дзяржаўныя маёнткі здаваліся ў арэнду мясцовым памешчыкам.

Розным было і прававое становішча дзяржаўных сялян Расіі і Беларусі. У Расіі з паскарэннем тэмпаў развіцця капіталізму значна пашырыліся саслоўныя

правы дзяржаўных сялян. Яны былі абвешчаны вольнымі грамадзянамі, маглі мяняць месца жыхарства, пераходзіць у іншыя саслоўі, мяняць накірунак дзейнасці, звяртацца са скаргамі ў судовыя інстанцыі. У Беларусі прававое становішча дзяржаўных сялян нічым не адрознівалася ад становішча памешчыцкіх. Часовы ўладар быў надзелены адміністрацыйнай, судовай і эканамічнай уладай над сялянамі. Але галоўнае адрозненне двух рэгіёнаў было ў сістэме збору феадальнай рэнты: у Расіі дзяржаўныя маёнткі былі на падушным аброку, у Беларусі – на паншчыне.

Першай часткай рэформы дзяржаўнай вёскі стала перабудовы яе апарату кіравання. Агульнае кіраванне было сканцэнтравана ў Дэпартаменце дзяржаўных маёмасцей Міністэрства фінансаў. З 1 студзеня 1836 г. яны перадаваліся новаму Міністэрству дзяржаўных маёмасцей, першым міністрам якога быў прызначаны П.Д. Кісялёў. Замест чатырох’яруснай сістэмы мясцовага кіравання, уведзенай у расійскіх губернях, у Беларусі ўстанаўліваліся тры адміністрацыйныя ярусы: губерня – акруга – сельская ўправа. У выніку рэформы абшчына ў Беларусі была максімальна набліжана да агульнарасійскага ўзору. Было ўпарадкавана кіраванне дзяржаўнымі маёнткамі, уведзены жорсткі адміністрацыйны кантроль за часовымі ўладальнікамі, павышаны статус сельскай абшчыны.

Другой часткай рэформы П.Д. Кісялёва з’яўлялася палітыка “апякунства” над дзяржаўнымі сялянамі. Прадугледжвалася арганізацыя дапамогі сялянам на выпадак неўраджаяў, эпідэмій, падзяжу жывёлы і іншых бедстваў. Акрамя гэтага, ставілася пытанне аб арганізацыі пачатковага навучання дзяцей дзяржаўных сялян, аказання медыцынскай дапамогі, правядзення розных агранамічных мерапрыемстваў, актывізацыі гандлю, развіцця сістэмы страхавання, барацьбы з п’янствам. Аднак недахоп сродкаў, жаданне палепшыць сялянскі побыт цалкам за кошт сялян перашкаджалі ажыццяўленню планаў рэфарматараў.

Трэцяя і галоўная частка рэформы П.Д. Кісялёва – люстрацыя дзяржаўных маёмасцей. Гэта было мерапрыемства, якое ставіла тры мэты: дакладны ўлік дзяржаўных маёмасцей, выраўноўванне гаспадарчага ўзроўню сялян шляхам скасавання малазямелля і рэгламентацыі павіннасцей, павышэнне плацежаздольнасці дзяржаўных сялян. У працэсе люстрацый у Беларусі знішчаюцца фальваркова-паншчынная сістэма і сістэма часовага ўладання. Дзяржаўныя сяляне паскоранымі тэмпамі пераводзяцца на пазямельны аброк. З фальварковых зямель ім былі зроблены прырэзкі да надзелаў. Да канца 1857 г. на аброк пераведзены ўсе дзяржаўныя маёнткі Мінскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў.

Адмова ад фальваркова-паншчыннай сістэмы і перавод дзяржаўных сялян на аброк з’явіліся галоўнымі вынікамі рэформы, якія вызначылі яе буржуазна-прагрэсіўны характар. Агульная плошча сялянскага надзельнага фонду ў выніку рэформы П.Д. Кісялёва павялічылася на 10,73 %. І хоць гэта мала што змяніла ў забяспечанасці сялян зямлёй (за гады рэформы колькасць рэвізскіх душ узрасла на 38,5 %), але затое было некалькі ўраўнавана становішча сялян, знізіўся цяжар павіннасцей. Асабліва значныя перамены адбыліся ў прававым статусе дзяржаўных сялян. За імі прызнавалася

грамадзянская свабода, што выгадна адрознівала іх ад бяспраўных памешчыцкіх сялян. Прынцыповае значэнне мелі правы ўступлення ў шлюб, бацькоўскія і апякунскія правы, правы атрымання спадчыны і ўласнасці, правы на занятак гандлем і промысламі.

З 1840 г. П.Д. Кісялёў пачаў займацца падрыхтоўкай інвентарнай рэформы з мэтай падцягнуць узровень памешчыцкай вёскі да дзяржаўнай. Памешчыкі рашуча сталі на абарону сваёй уласнасці. З-за супраціўлення памешчыкаў інвентарная рэформа ў памешчыцкай вёсцы была значна менш радыкальнай. Яна ўніфікавала памер павіннасцей сялян шляхам увядзення ў памешчыцкіх маёнтках абавязковых інвентароў па адзіных правілах. Па сутнасці, ў становішчы сялян мала што змянілася, значнага скарачэння павіннасцей не адбылося. У адрозненне ад дзяржаўнай вёскі, пераведзенай на аброк, у памешчыцкай засталіся многія ранейшыя павіннасці: паншчына (штодзённая), згоны, шарваркі, жаночая праца, старажоўства, даніна. Агульны памер павіннасцей складаў 1/3 частку валавога даходу з надзелу.

Інвентарная рэформа не вырашыла найважнейшага пытання – аб сялянскім землекарыстанні. Сцвярджалася толькі, што сялянскія надзелы не павінны змяншацца, але гэта з самага пачатку не было замацавана заканадаўствам. Толькі 14 мая 1855 г. Аляксандр II зацвердзіў перагледжаныя ў інвентарных камітэтах правілы для маёнткаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў, у якіх вызначаўся мінімальны сялянскі надзел у 4,75 дзесяціны на рэвізскую душу, а паншчына – 3 дні ў тыдзень.

У цэлым рэформы 1830 – 1850-х гг. мелі дваранскую скіраванасць. Прынцыпы рэфармавання дзяржаўнай вёскі былі прызнаны памешчыкамі занадта радыкальнымі. Сацыяльна-прававое становішча памешчыцкіх сялян змянілася мала. Феадальная ўласнасць засталася некранутай.

3. Канфесіянальная палітыка ў Беларусі. Полацкі царкоўны сабор.

У канцы XVIII ст. на беларускіх землях пражывала каля 39 % уніятаў, 38 – католікаў, 10 – іудзеяў, 6,5 – праваслаўных, 4 – стараверaў, астатнія 2,5 % прыходзіліся на пратэстантаў, мусульман і караімаў. Расійскі ўрад дазволіў дзейнасць усіх канфесій, аднак верацярпімасць была адноснай. Галоўнай задачай канфесійнай палітыкі на тэрыторыі Беларусі было ўзмацненне пазіцый праваслаўя. З далучэннем Беларусі да Расійскай імперыі мясцовая праваслаўная царква перайшла пад юрысдыкцыю Святейшага Сінода. Сінод з’яўляўся вышэйшым органам кіравання ў Рускай праваслаўнай царкве. Яго ўзначальваў обер-пракурор – свецкі чыноўнік, які прызначаўся імператарам. На беларускіх землях існавалі Магілёўская (створана ў 1632 г.) і Мінская (створана ў 1793 г.) епархіі, куды ўваходзілі тэрыторыі Міншчыны, Віленшчыны, і Гродзеншчыны. Нягледзячы на сваё пануючае становішча, праваслаўная царква знаходзілася ў цяжкім матэрыяльным стане. Праваслаўнымі вернікамі ў асноўным былі прыгонныя сяляне, бедная шляхта і мяшчане. Дваране (у большасці сваёй католікі) мала клапаціліся пра ўладкаванне праваслаўных прыходаў.

Каталіцтва і пратэстантызм карысталіся шырокай свабодай на тэрыторыі беларускіх губерняў. Расійскі ўрад улічваў, што практычна ўсе беларускія магнаты і шляхта з'яўляліся католікамі. Таму за католікамі захоўвалася права на свабоднае выкананне абрадаў, маёмасць каталіцкіх касцёлаў і кляштараў захоўвалася ў недатыкальнасці. Згодна з даравальнай граматай Кацярыны II ад 1774 г. засноўвалася Беларуская каталіцкая епархія з цэнтрам у Магілёве, што адпавядала інтарэсам польскага і апалячанага беларускага дваранства. Адзінае, што катэгарычна забаранялася каталіцкаму духавенству – гэта схіляць да сваёй веры праваслаўных.

Забаронены рымскім папам у 1773 г. ордэн езуітаў знайшоў сабе часовы прытулак на землях Беларусі. Езуіты з дазволу ўлад маглі займацца місіянерскай дзейнасцю па ўсёй Беларусі. Езуіцкія калегіі былі адкрыты ў Магілёве, Мсціслаўлі, Чачэрску, Віцебску, Дзвінску і Оршы. 12 студзеня 1812 г. Полацкай езуіцкай калегіі быў нададзены статус акадэміі з правамі універсітэта. Толькі пасля вайны 1812 г., у ходзе якой каталіцкае духавенства супрацоўнічала з французскай акупацыйнай адміністрацыяй, езуіты былі выгнаны з Расіі, а іх маёмасць канфіскавана. У 1820 г. была зачынена і Полацкая езуіцкая акадэмія.

У 1827 – 1830 гг. праводзяцца мерапрыемствы, накіраваныя на паступовае далучэнне уніяцкай царквы да праваслаўнай. Была створана асобная грэка-уніяцкая калегія, чатыры уніяцкія епархіі рэарганізаваны ў Беларускую і Літоўскую. У практыцы богаслужэння прадугледжвалася выкарыстоўваць "мясцовы дыялект". У аснову адукацыі дзяцей уніятаў была пакладзена праваслаўная сістэма навучання. У Віленскую каталіцкую семінарыю забаранялася прымаць уніятаў. Для іх у 1828 г. была створана асобная семінарыя ў Жыровічах (каля Слоніма).

Польскае паўстанне 1830 – 1831 гг. вызначыла лёс уніяцкай царквы. У 1836 г. ствараецца Сакрэтны камітэт па уніяцкіх справах. У студзені 1837 г. кіраванне уніяцкай царквой пераходзіць да Свяцейшага Сінода. У лютым 1838 г. памёр уніяцкі мітрапаліт І. Булгак, які быў апошняй перашкодай у справе скасавання уніі. Грэка-уніяцкую калегію ўзначаліў літоўскі епіскап І. Сямашка, які разам з епіскапамі В. Лужынскім і А. Зубко падтрымлівалі ідэю ліквідацыі уніяцтва. 12 лютага 1839 г. ў Полацку ў прысутнасці вышэйшага уніяцкага духавенства быў падпісаны "Саборны Акт" з просьбай на вышэйшае імя аб далучэнні уніяцкай царквы да праваслаўнай. Да прашэння быў прыкладзены спіс 1 305 свяшчэннікаў, якія падтрымалі аб'яднанне. "Сінадальны ўчынак" зацвердзіў Мікалай І. Усяго ў 1839 г. да праваслаўнай царквы далучылася каля 1,5 млн. вернікаў.

4. Змяненні ўрадавай палітыкі ў галіне асветы.

Адной з важнейшых задач расійскі ўрад лічыў рэарганізацыю адукацыі, на асновах, якія б адпавядалі яго інтэрэсам. Сістэма адукацыі Беларусі ў першай чвэрці XIX ст. была пабудавана згодна з рэформай адукацыі 1802 г. Уся тэрыторыя Беларусі ўвайшла ў склад Віленскай навучальнай акругі (1803-1824 гг.), якую ўзначальваў князь А. Чартарыйскі. Навучальная акруга мела

поўную самастойнасць і кіравалася асобным «Статутам» (1803 г.). А. Чартарыйскі карыстаўся неабмежаваным даверам Аляксандра I і мог праводзіць ідэі аднаўлення самастойнасці Польшчы.

У аснову сістэмы адукацыі Беларусі, як і Расіі, былі пакладзены прынцыпы бессаслоўнасці, бясплатнасці навучання на ніжэйшых яго ступенях, пераемнасці навучальных праграм.

Згодна з рэформай ствараласа некалькі тыпаў навучальных устаноў. Пачатковая школа была прадстаўлена аднакласнымі прыхадскімі вучылішчамі для ніжэйшых саслоўяў. Сярэднюю адукацыю давалі павятовыя вучылішчы і гімназіі. У першыя дзесяцігоддзі XIX ст. у Беларусі таксама дзейнічала сетка вучылішчаў пры каталіцкіх і базыліянскіх манастырах. Яны давалі сярэднюю адукацыю і прыраўноўваліся да павятовых вучылішчаў і гімназій. Колькасць іх на працягу першай трэці XIX ст. паступова скарачалася, а ў 1832 г. у сувязі з закрыццём каталіцкіх манастыроў яны былі пераўтвораны ў свецкія.

Вышэйшую адукацыю даваў Віленскі ўніверсітэт. Ен меў 4 факультэты, бібліятэку, батанічны сад, астранамічную абсерваторыю, анатамічны музей, лабараторыі. Першымі рэктарамі ўніверсітэта былі браты І. і Я. Снядэцкія. У функцыі ўніверсітэта ўваходзіла арганізацыя навучальнага працэсу ў навучальнай акрузе наогул. Універсітэт павінен быў распрацоўваць навучальныя праграмы, выпускаць падручнікі, прызначаць настаўнікаў у гімназіі і вучылішчы. З 1805 г. універсітэт выдаваў штомесячны навукова-літаратурны часопіс «Dziennik Wilenski» і быў своеасаблівым цэнтрам культурнага жыцця края, вакол якога згуртоўвалася мясцовая інтэлігенцыя.

З ўступленнем на прастол імператара Мікалая I у Расіі пачалося рэфармаванне сістэмы асветы. У аснову народнай асветы быў пакладзены прынцып строгай саслоўнасці. Гэта адлюстроўваў выдадзены ў 1828 г. “Статут навучальных устаноў”. Згодна з ім пачатковая і сярэдняя адукацыя падзялялася на тры катэгорыі: для дзяцей ніжэйшага саслоўя (сялян) прызначаліся аднакласныя прыходскія вучылішчы з элементарнай праграмай навучання; для сярэдняга саслоўя – трохкласныя вучылішчы з больш шырокай праграмай пачатковага навучання; для дзяцей дваран і чыноўнікаў уводзіліся сямікласныя гімназіі, заканчэнне якіх давала права для паступлення ва універсітэты. Статут ліквідаваў пераемную сувязь паміж ступенямі. Такім чынам, узровень адукацыі павінен быў адпавядаць сацыяльнаму становішчу вучня. Згодна з новым палажэннем аб навучальных акругах (1835 г.) яны выключаліся з-пад улады універсітэтаў, істотна пашыраліся правы папячыцеляў навучальных акруг.

У поўнай адпаведнасці з палажэннем “Статута” 1828 г. была створана Беларуская навучальная акруга (1829 г.). Дадатковыя палажэнні Статута 1828 г. так тлумачылі мэту стварэння акругі: “неабходнасць навучання юнакоў у адпаведнасці з асаблівасцямі Беларусі” і прадпісвалі “навучаць роднай мове”. У новую навучальную акругу ўвайшлі Віцебская, Магілёўская, а ў 1831 г. – і Мінская губерні.

Пасля паўстання 1830 – 1831 гг. апекуну Беларускай навучальнай акругі рэкамендавалася найхутчэй перайсці да выкладання ў свецкіх вучылішчах усіх прадметаў на рускай мове ў мэтах збліжэння тутэйшых жыхароў з “прыроднымі рускімі”. У маі 1832 г. у сувязі з закрыццём Віленскага

універсітэта была ліквідавана Віленская навучальная акруга. Навучальныя ўстановы Віленскай, Гродзенскай губерняў і Беластоцкай вобласці ўвайшлі ў склад Беларускай навучальнай акругі. Цэнтр навучальнай акругі знаходзіўся ў Віцебску, яго папячыцелямі былі вядомы матэматык Р.І. Карташэўскі (1829 – 1835 гг.) і былы дырэктар вучылішчаў Закаўказскай вобласці і Тыфліскага шляхецкага пансіёна Е.А. Грубер (1836 – 1850 гг.).

Замест закрытага Віленскага універсітэта планавалася адкрыць у Оршы вышэйшае вучылішча для дзяцей дваран з далейшым яго пераўтварэннем у вышэйшую навучальную ўстанову. Але ў ходзе паўстання пачатая справа была спынена. Асігнаваныя для гэтага грошы былі пераведзены ў Кіеў на будаўніцтва універсітэта Святога Уладзіміра.

Дзеля абмежавання польскага ўплыву польская мова была выключана з праграм адукацыі. Толькі ў заходніх губернях акругі яна вывучалася як асобны прадмет па скарочанай праграме. У мясцовых школах забаранялася выкладаць выпускнікам Віленскага універсітэта. Падрыхтоўку выкладчыкаў для Беларусі пачала весці настаўніцкая семінарыя, створаная ў 1834 г. у Віцебску.

Важнай падзеяй у галіне асветы на Беларусі было адкрыццё ў 1840 г. Горы-Горацкай земляробчай школы, пераўтворанай у 1848 г. ў земляробчы інстытут. На пачатку 60-х гг. усяго на Беларусі налічвалася 567 навучальных устаноў усіх тыпаў, у тым ліку адно вышэйшае, 12 сярэдніх, 21 духоўнае вучылішча, звыш 400 пачатковых школ.

Адметнай рысай сістэмы асветы ў беларускіх губернях стала пашырэнне ваенна-вучэбных устаноў. Калі ў эпоху Аляксандра I, яны былі прадстаўлены юнкерскімі вучылішчамі ў Бабруйску, Дзінабургу і Магілёве, то пры Мікалаі I дадаткова адкрыліся кадэцкія карпусы ў Полацку (1835 г.) і Брэсце (1842 г.). Расійскім урадам яны разглядаліся як сродак выхавання дваранства ў духу вернасці самадзяржаўю і таму напалову камплектаваліся з дваранства беларускіх губерняў.

5. Русіфікацыя і яе сутнасць.

Адносіны самаўладства да пануючага саслоўя былі лаяльнымі, але ў шляхецкай свядомасці жыла ідэя былой незалежнасці ВКЛ, якая яскрава адлюстроўвалася ў так званым літвінскім патрыятызме. Расійскі ўрад дакладна рэагаваў на гэту асаблівасць менталітэту мясцовага дваранства і па-рознаму падыходзіў да вырашэння амаль усіх найбольш істотных праблем былога ВКЛ і Польшчы. Напярэдадні вайны з Францыяй імператар Аляксандар I, каб забяспечыць падтрымку з боку дваранства Літвы і Беларусі, знізіў падаткі, які паступалі ў казну з Беларусі, і выказаў жаданне аднавіць цэласнасць ВКЛ пад эгідай Расіі. Па даручэнню імператара ў 1811 г. магнаты М.К. Агінскі, К. Любецкі, К. Пляцер, К. Любамірскі, С. Грабоўскі склалі праект «Палажэння аб кіраванні аўтаномным Вялікім Княствам Літоўскім», у склад якога павінны былі ўвайсці ўсе тэрыторыі, што адышлі да Расіі ад былой Рэчы Паспалітай.

Акрамя ідэі аўтаноміі Вялікага княства Літоўскага Аляксандр I меў план, прапанаваны князем Адамам Чартарыйскім. Ён прапанаваў аднавіць усё Каралеўства Польскае ў межах 1772 г., не звяртаючы ўвагі на ВКЛ. Гэты план

падтрымліваўся большасцю польскай і апалячанай шляхты Літвы і Беларусі. Ажыццяўленне праектаў зацягвалася, а вайна з Напалеонам наогул іх перакрэсліла.

Паўстанне 1830-1831 гг. поўнасцю пахавала ідэю аўтаноміі. Урад імператара Мікалая I распрацаваў праграму зліцця беларускіх зямель з імперыяй. Яна супадала з уніфікацыяй агульнарасійскага заканадаўства і кадыфікацыяй законаў Расійскай імперыі. 1 студзеня 1831 г. расійскае заканадаўства было ўведзена ў Магілёўскай і Віцебскай губернях, а 25 чэрвеня 1840 г. – у Мінскай, Віленскай, Гродзенскай губерняў і Беластоцкай вобласці, дзейнасць Статута 1588 г. была адменена. У 1840-1842 гг. урадам былі праведзены шэраг мерапрыемстваў па ўпарадкаванню мясцовага справаводства. Замест агульнага наймення Беларускіх і Літоўскіх губерняў выкарыстоўваць іх асобныя назвы: Віцебская, Магілёўская, Віленская і Гродзенская. Мінская губерня афіцыяльна не адносілася ні да Беларускіх, ні да Літоўскіх. Назвы «Украіна» і «Літва» замяняліся на Паўднёва-Заходні і Паўночна-Заходні край.

Тэма 27. Грамадска-палітычнае жыццё.

1. Тайныя таварыствы на Беларусі і іх дзейнасць.

У канцы 1817 г. студэнты Віленскага універсітэта А. Міцкевіч, Я. Чачот, Ю. Яжоўскі і інш. заснавалі тайнае патрыятычнае Таварыства філаматаў (прыхільнікаў ведаў), члены якога першапачаткова ставілі асветніцка-культурныя мэты. Паступова філаматы прыйшлі да ідэі карэнных сацыяльна-эканамічных рэформ: ліквідацыі прыгоннага права, увядзення канстытуцыйнага кіравання. У праграме таварыства выказвалася ідэя аб праве народаў на незалежнае існаванне. У 1818 г. філаматы пашыраюць сферу сваёй дзейнасці. Яны засноўваюць філіялы – “Таварыства прамяністых” і “Саюз літаратараў”. У 1819 г. у Свіслацкай гімназіі ўзнікае “Таварыства аматараў навук”, члены якога прапаведавалі ідэі волі і роўнасці. На працягу 1817 – 1823 гг. у асяроддзі студэнцкай моладзі Каралеўства Польскага і заходніх губерняў Расіі існавала каля 50 тайных згуртаванняў.

У канцы 1820 г. філаматы заснавалі новую тайную арганізацыю філарэтаў (аматараў дабрачыннасці). Гэта таварыства ўключала ў сябе больш шырокія колы моладзі, ў тым ліку за межамі Вільні. Галоўная мэта філарэтаў – аднаўленне Рэчы Паспалітай і адмена прыгоннага права. Члены таварыства займаліся вывучэннем беларуска-літоўскага краю, яго гісторыі, фальклору, побыту насельніцтва. У асяроддзі віленскай моладзі выказваліся і планы ўзброенага выступлення. Аднак уладам стала вядома аб існаванні тайных студэнцкіх арганізацый. Дзевяць філарэтаў і адзінаццаць філаматаў былі высланы ва ўнутраныя губерні Расіі, у тым ліку А. Міцкевіч, Т. Зан, І. Дамейка. Ад працы ў Віленскім універсітэце былі адхілены І. Лялевель, І. Даніловіч, М. Баброўскі. Сваіх пасад пазбавіліся рэктар універсітэта Ю. Твардоўскі і папячыцель Віленскай навучальнай акругі А. Чартарыйскі.

У 1824 – 1825 гг. урад, улічваючы, што цэнтрамі большасці тайных таварыстваў былі навучальныя ўстановы, прымае меры па наглядзе за

навучэнцамі. У адпаведнасці з указам Аляксандра І жыхарам Беларусі і Літвы забаранялася адпраўляць дзяцей на вучобу ў Гейдэльбергскі, Іенскі, Гесенскі і Вюртэмбергскі універсітэты. Чыноўнікі абавязаны былі даваць падпіску аб непрыналежнасці студэнтаў і настаўнікаў да тайных суполак.

2. Дзекабрысцкі рух і Беларусь.

Пасля паўстання Сямёнаўскага палка ў Пецярбургу ў 1820 г. у Беларусь былі пераведзены гвардзейскія часці, у якіх служылі будучыя дзекабрысты А. Бястужаў, М. Лунін, А. Адаеўскі, К. Рылееў і інш. М. Мураўёў, кіраўнік "Паўночнага таварыства", падчас знаходжання ў Мінску, напісаў свой першы варыянт "Канстытуцыі". У Віцебску жыў і вучыўся вядомы дзекабрыст, сябра "Таварыства з'яднаных славян" І. Гарбачэўскі. Дзекабрыстамі распрацоўваўся план паўстання ў Бабруйскай крэпасці, якое павінна было даць штуршок дзяржаўнаму перавароту ў Расіі. Дзекабрысты і члены мясцовых тайных таварыстваў спрабавалі наладзіць супрацоўніцтва. Аднак пытанне аб самастойным развіцці Беларусі не ўздымалася.

У 1825 – 1826 гг. у Магілёве існавала ўправа Паўночнага таварыства, арганізаваная па ініцыятыве М. Нарышкіна ад'ютантамі галоўнакамандуючага 1-й арміі В.А. Мусіным-Пушкіным і П.П. Цітовым. У Гродзенскай губерні дзейнічалі два тайных дзекабрысцкіх таварыствы – "Таварыства сяброў" (1822 – 1826 гг.) і "Таварыства ваенных сяброў" (1825 – 1826 гг.). Апошняе па ініцыятыве К.Г. Ігельстрома і А.І. Вягеліна, 24 снежня 1825 г. падняло паўстанне Літоўскага піянернага (сапёрнага) батальёна. У пачатку лютага 1826 г. спрабаваў падняць паўстанне ў Бабруйскай крэпасці С. Трусаў.

Пасля разгрому дзекабрыстаў праз ваенна-судовую камісію, якая працавала ў Магілёве, прайшлі 15 чалавек. Другім цэнтрам следства і суда над дзекабрыстамі быў Беласток. Бабруйская крэпасць стала "турмой на Бярэзіне" для 20 дзекабрыстаў, у тым ліку І. Бурцова, В. Норава, С. Трусава і інш.

Разгром дзекабрыстаў у Расіі прывёў да росту апазіцыйнага руху ў Царстве Польскім. Ідэі ўзброенага паўстання супраць самадзяржаўя, якія існавалі ў польскіх тайных таварыствах, знаходзілі водгук і сярод студэнцкай моладзі Віленскага універсітэта.

3. Шляхецкае паўстанне 1830-1831 гг.

Набліжэнне паўстання ў Каралеўстве Польскім паскорылі рэвалюцыя ў Францыі, нацыянальна-вызваленчыя рухі ў Бельгіі і Італіі. У ноч на 29 лістапада 1830 г. пачалося паўстанне ў Варшаве. Галоўнымі прычынамі паўстання былі незадаволенасць шляхты падзеламі Рэчы Паспалітай і парушэнне расійскім урадам польскай Канстытуцыі 1815 г. Рэвалюцыйна-дэмакратычныя сілы Польшчы адстойвалі лозунгі буржуазна-дэмакратычных пераўтварэнняў. Але кіраўніцтва паўстаннем апынулася ў руках польскіх арыстакратаў. Яны імкнуліся дабіцца незалежнасці Рэчы Паспалітай у межах 1772 г., абапіраючыся на армію Царства Польскага і дапамогу заходнееўрапейскіх краін. Ні правыя, ні левыя не ўздымалі пытання

нацыянальнага вызначэння беларускага народа. На іх думку, Беларусь павінна была ўліцца ў склад незалежнай Польшчы.

Расійскі ўрад імкнуўся не дапусціць пашырэння паўстання на тэрыторыю Беларусі, Літвы і Украіны. Тут у снежні 1830 г. было ўведзена ваеннае становішча. На гэтых тэрыторыях павялічвалася колькасць войска. На маёнткі памешчыкаў, якія з'ехалі ў Каралеўства Польскае, быў накладзены арышт, звольнены многія з мясцовых чыноўнікаў. Аднак у пачатку красавіка 1831 г. паўстанне дасягнула Літвы і Паўночна-Заходняй Беларусі – Ашмянскі, Браслаўскі, Дзісненскі і Вілейскі паветы. Паўстанне развівалася тут пераважна стыхійна, хоць у студзені 1831 г. пры падтрымцы эмісараў з Варшавы і быў створаны Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт. Камітэт распрацаваў план паўстання, згодна з якім для падрыхтоўкі паўстання на месцах было вырашана стварыць тайныя павятовыя паўстанцкія камітэты. У лютым 1831 г. Цэнтральны камітэт сабраў у Вільні прадстаўнікоў павятовых камітэтаў. Пачаць паўстанне было вырашана з Віленскай губерні, дзе знаходзілася невялікая колькасць расійскіх войск.

У канцы сакавіка 1831 г. пачалося паўстанне ў Літве і Заходняй Беларусі. Віленскі цэнтральны камітэт не здолеў кантраляваць ход гэтага паўстання. У кожным павеце быў створаны свой павятовы ўрад, які ўзначальвалі мясцовыя памешчыкі. Урад кожнага павета пры дапамозе каталіцкага духавенства прыводзіў насельніцтва да прысягі, аб'яўляў рэкруцкі набор ў войска, выдаваў розныя звароты да насельніцтва. Сяляне і мяшчане мабілізоўваліся ў паўстанцкія атрады пераважна пад прымусам і не былі зацікаўлены ваяваць без вырашэння сваіх сацыяльных праблем. У той жа час імперскія ўлады абяцалі ім вызваленне ад паноў-паўстанцаў. Ядро паўстанцаў складалі шляхта, навучэнцы, афіцэры-палякі, каталіцкае і ўніяцкае духавенства. Увогуле ў Літве і Беларусі ў паўстанні прымалі ўдзел каля 10 тыс. чалавек. Вузкія палітычныя мэты кіраўнікоў паўстання абумовілі той факт, што яно не атрымала значнай падтрымкі насельніцтва.

У красавіку паўстанне ахапіла ўсю Віленскую губерню, але сувязь паміж паветамі была перарвана. Таму Віленскі Цэнтральны камітэт вырашыў пачаць падрыхтоўку да захопу Вільні і стварыць аб'яднанае войска. Бітва за Вільню 19 чэрвеня 1831 г. стала кульмінацыяй паўстання, у якой аб'яднаныя паўстанцкія сілы краю разам з прысланым на дапамогу польскім корпусам (12 тыс. чалавек) не змаглі дасягнуць перамогі над расійскім войскам. Тым не менш, у Беларусі і Літве было арганізавана каля трыццаці партызанскіх атрадаў, якія налічвалі 12 тыс. чалавек. Найбольш буйнымі былі атрады пад агульным кіраўніцтвам С. Радзішэўскага ў Вілейскім павеце (3,3 тыс. чалавек), В. Брахоцкага ў Дзісненскім павеце (3 тыс. чалавек), К. Пшаздзецкага ў Ашмяскім павеце (2,5 тыс. чалавек), Ю. Кашыца і М. Мяржэўскага ў Навагрудскім (1 тыс. чалавек). На дапамогу ім прыйшлі рэгулярныя польскія войскі на чале з генераламі Д. Хлапоўскім і А. Гелгудам.

У жніўні 1831 г. паўстанне было падаўлена па ўсёй Беларусі і Літве, а потым і ў Польшчы. Указам 6 мая 1831 г. былі выдзелены тры разрады "злачынцаў": да першага адносілі кіраўнікоў, да другога – тых, хто ўдзельнічаў у баявых дзеяннях, да трэцяга – усіх іншых. Сялянам, якія вярталіся да свайго

памешчыка, давалася дараванне. Маёнткі абвінавачаных падлягалі секвестру. Ад секвестру пазбаўляліся тыя, хто сам з'явіўся на працягу месяца пасля публікацыі ўказа і пакаяўся або даказаў, што яго прымусілі далучыцца да паўстання. Да следства за ўдзел у паўстанні ў беларуска-літоўскіх губернях

было прыцягнута 2 878 чалавек. Сваіх маёнткаў пазбавіліся магнаты, якія валодалі тысячамі прыгонных (Агінскія, Плятэры, Радзівілы, Сапегі, Чартарыйскія і інш.). На тэрыторыі Беларусі ў 1837 г. лічыліся канфіскаванымі 115 маёнткаў з больш як 38 тыс. сялян мужчынскага полу, яны папоўнілі дзяржаўны фонд.

4. Дэмакратызацыя грамадскага руху. Уплыў рэвалюцыйных падзей у Заходняй Еўропе на грамадска-палітычны рух на Беларусі.

Але і пасля падзей 1830 – 1831 гг. рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Беларусі і Літве не спыніўся. Адна з найбольш радыкальных у Беларусі і Літве тайных суполак – "Дэмакратычнае таварыства" – была створана ў 1836 г. па ініцыятыве Ф. Савіча пры Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі. У 1837 г. Ф. Савіч наладзіў сувязі з Пінскай і Слуцкай ячэйкамі тайнага таварыства "Садружнасць польскага народа", якое ўзначальваў польскі рэвалюцыянер-дэмакрат Ш. Канарскі. У статуце "Дэмакратычнага таварыства" – "Прынцыпах дэмакратызму" – былі абвешчаны ідэі сацыяльнай роўнасці, вызвалення сялян з зямлёй ад прыгоннай залежнасці, права кожнага народа на нацыянальную самастойнасць. У 1838 г. "Дэмакратычнае таварыства" было выкрыта, а праз год Ф. Савіч быў высланы на Каўказ у дзеючую армію.

У 1846 – 1849 гг. у Ашмянах, Вільне, Гродне, Лідзе і Мінску дзейнічалі суполкі тайнай арганізацыі "Саюз свабодных братоў". Ён меў на мэце сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, барацьбу за свабодную Польшчу і Расію.

Тэма 28. Культура ў першай палове XIX ст.

1. Уплыў польскай і рускай культур на культуру беларускага народу. Нацыянальна-культурная палітыка ўрада.

Падзелы Рэчы Паспалітай абумовілі ўзнікненне "польскага пытання", сутнасць якога заключалася ў пастаянным імкненні пераважнай большасці польскага грамадства да аднаўлення страчанай дзяржаўнасці. У шматнацыянальных заходніх губернях Расійскай імперыі "польскае пытанне" было амаль што самым вострым і аказвала ўплыў на ўсе сферы ўрадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі.

У пачатку XIX ст. па ініцыятыве Аляксандра I пачала абмяркоўвацца магчымасць аднаўлення дзяржаўнасці Польшчы. Гэта дапамагло прыцягнуць да супрацоўніцтва з імперскімі ўладамі польскіх дзеячаў, у тым ліку А. Чартарыйскага і М. Агінскага. У 1815 г. Каралеўству Польскаму, створанаму

паводле пастановы Венскага кангрэсу, была падаравана Канстытуцыя, у адпаведнасць з якой у Польшчы ствараласа мясцовая адміністрацыя.
Канстытуцыйныя імкненні Аляксандра I (ёсць звесткі, што ён нават планаваў перадаць у склад будучай Польшчы заходнія губерні Беларусі) выклікалі ў польскім грамадстве хвалю паланафільскіх настрояў і падагравалі надзею на хуткае аднаўленне дзяржаўнай самастойнасці. Узмацненню польскага ўплыву ў галіне культуры і мовы, умацаванню пазіцый каталіцызму ў беларускіх губернях спрыяла і тое, што ўся тэрыторыя Беларусі была ўключана ў склад Віленскай навучальнай акругі, польскай па характару сваёй дзейнасці.

Аднак выкрыццё ў пачатку 1820-х гадоў у Віленскім універсітэце тайных студэнцкіх гурткоў польскай моладзі выклікала змены ва ўрадавай палітыцы ў Беларусі. З гэтага часу асноўным яе кірункам стала паслабленне польскага палітычнага і культурнага ўплыву. Менавіта гэтай мэце адпавядала перадача ў 1824 г. з Віленскай навучальнай акругі ў Пецярбургскую дзвюх беларускіх губерняў – Віцебскай і Магілёўскай, а таксама замена А. Чартарыйскага М. Навасільцавым на пасадзе папячыцеля Віленскай навучальнай акругі.

Курс на аслабленне польскага ўплыву на беларускіх землях яшчэ больш узмацніўся ў канцы 20-х гадоў і асабліва ў сувязі з польскім нацыянальным паўстаннем 1830 – 1831 гг.

2. Асвета і навука.

З пункту гледжання асветнікаў стварыць ідэальнае грамадства можна перш за ўсё з дапамогай правільнага выхавання і адукацыі. Пад уплывам асветніцкіх ідэй адукацыя паступова пазбаўлялася царкоўнага ўплыву, пераходзіла ў падпарадкаванне да дзяржавы і набывала свецкі характар. Гэта абумовіла правядзенне ў апошняй трэці XVIII – пачатку XIX ст. шэрагу рэформ у галіне адукацыі Расійскай імперыі.Да гэтага часу ў Беларусі склалася даволі заблытаная сетка навучальных устаноў, пазбаўленых адзінага кіраўніцтва і не звязаных паміж сабой.

У 1802 г. было ўтворана Міністэрства народнай асветы. Еўрапейская частка Расіі дзялілася на 6 навучальных акруг, кожную з якіх узначальваў папячыцель. Віцебская, Гродзенская, Мінская, Магілёўская губерні ўвайшлі ў склад Віленскай навучальнай акругі, якую ўзначаліў магнат Адам Чартарыйскі. Навуковым і адміністрацыйным цэнтрам акругі быў Віленскі універсітэт, створаны ў 1803 г. на базе рэарганізаванай Галоўнай Віленскай школы. Ва універсітэце меліся 4 факультэты: маральных і палітычных навук, фізіка-матэматычны, медыцынскі, літаратурны і вольных мастацтваў. Ва універсітэце працавалі такія вядомыя вучоныя як І. Страйноўскі, Я. Снядэцкі, І. Даніловіч, М. Баброўскі, І. Лялевель і інш. Пры універсітэце дзейнічалі медыцынскі, ветэрынарны, агранамічны інстытуты, астранамічная абсерваторыя, адзін з самых багатых у Еўропе батанічных садоў, першы ў Расіі заалагічны музей, тры клінікі, аптэка, бібліятэка. З’яўляючыся цэнтрам Віленскай навучальнай акругі, універсітэт распрацоўваў праграмы і падручнікі для падначаленых школ. Адукацыя, атрыманая ў Віленскім універсітэце, не саступала адукацыі ў

лепшых заходнееўрапейскіх інстытутах. У 1832 г. універсітэт быў закрыты за ўдзел выкладчыкаў і студэнтаў у паўстанні 1830 – 1831 гг.

Паводле Статута 1804 г., які складзены ў адпаведнасці з французскай асветніцкай філасофіяй XVIII ст., школьная сістэма будавалася па прынцыпе адзінства і пераемнасці: кожная школьная ступень была звязана з папярэдняй і наступнай, пераход у школу ажыццяўляўся без экзамена, на падставе дакумента аб заканчэнні папярэдняй школы. Навучанне аб'яўлялася бясплатным. Сістэма адукацыі ўключала ў сябе прыходскія вучылішчы з гадавым тэрмінам навучання (пачатковая школа), двухгадовыя павятовыя вучылішчы, чатырохгадовыя гімназіі і універсітэты. Станоўчымі вынікамі рэформы на Беларусі з'явіліся рост свецкіх агульнаадукацыйных школ і колькасці навучэнцаў, увядзенне ў навучальныя планы прыродазнаўчых дысцыплін, развіццё жаночай адукацыі.

У 1828 г. быў выдадзены новы статут навучальных устаноў. Замест адзінай сістэмы пераемна звязаных паміж сабой тыпаў школ, створанай паводле Статута 1804 г., уводзіліся дзве сістэмы, сфарміраваныя па саслоўным прынцыпе: адна з іх павінна была даваць элементарную адукацыю для ніжэйшых саслоўяў (прыходскае вучылішча з 1 – 2 гадамі навучання, затым трохгадовае павятовае вучылішча), другая – сярэдняй і вышэйшай адукацыі – пераважна для дваран (дамашняе навучанне, сямігадовая гімназія, універсітэт).

Важную ролю ў сістэме школьнай адукацыі працягвалі адыгрываць каталіцкія навучальныя ўстановы, якія належалі розным каталіцкім ордэнам. Значная частка гэтых навучальных устаноў падпарадкоўвалася ордэну езуітаў. У 1818 – 1820 гг. дзейнічала Полацкая езуіцкая акадэмія, якая мела правы вышэйшай навучальнай установы і была цэнтрам асобай езуіцкай навучальнай акругі. Каталіцкія навучальныя ўстановы імкнуліся выхаваць у навучэнцаў прапольскі настрой. Мовай навучання была польская. Прапольскай арыентацыі прытрымлівалася і кіраўніцтва Віленскага універсітэта. Усё гэта спрыяла паланізацыі пераважнай часткі адукаванага насельніцтва Беларусі.

Расійскі ўрад добра разумеў небяспечнасць такой сітуацыі ў галіне адукацыі, асабліва пасля паўстання 1830 – 1831 гг. У шэрагу мерапрыемстваў, накіраваных на пашырэнне рускага ўплыву ў краі, было закрыццё ў 1832 г. Віленскага універсітэта і часовая ліквідацыя Віленскай навучальнай акругі (да 1850 г.). У школах у абавязковым парадку ўводзілася навучанне на рускай мове. Аб'яднанне уніяцкай царквы з праваслаўнай паскорыла закрыццё каталіцкіх манастыроў і іх навучальных устаноў.

Адбывалася зараджэнне прафесіянальнай адукацыі ў Беларусі. У 1840 г. пачала дзейнічаць Горы-Горацкая земляробчая школа. У 1848 г. на яе базе адкрыўся Горы-Горацкі земляробчы інстытут – першая ў Расіі і адна з першых у Еўропе вышэйшых сельскагаспадарчых навучальных устаноў. Горы-Горацкі земляробчы інстытут узнік у 1848 г. у выніку рэарганізацыі Горы-Горацкай земляробчай школы, што пераўтварыла яе ў вышэйшую сельскагаспадарчую навучальную ўстанову. Тэрмін навучання ў інстытуце працягваўся чатыры гады. Тут выкладаліся агульнаадукацыйныя і спецыяльныя сельскагаспадарчыя дысцыпліны. Пры інстытуце дзейнічаў завод па вырабе цэглы і дрэнажных труб, майстэрня сельскагаспадарчых машын, сыраварня, вучэбны пчальнік,

музеі, батанічны сад, бібліятэка. Студэнты і выкладчыкі займаліся навукова-даследчай дзейнасцю, удзельнічалі ў сельскагаспадарчых з'ездах і выставах. За ўдзел студэнтаў і выкладчыкаў у паўстанні 1863 – 1864 гг. інстытут быў пераведзены ў Пецярбург. Вышэйшая сельскагаспадарчая навучальная ўстанова аднавіла сваю дзейнасць у Горках толькі ў 1919 г. Зараз тут дзейнічае Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія.

Першая палова XIX ст. – час узнікнення навуковага беларусазнаўства. Вывучэнне Беларусі ажыццяўлялі Расійская акадэмія навук, Рускае геаграфічнае таварыства, Віленскі універсітэт, Маскоўскае таварыства аматараў старажытнасцей расійскіх, створаныя па ініцыятыве Я. Тышкевіча Віленскі музей старажытнасцей і Віленская археалагічная камісія.

Гісторыю, этнаграфію, фальклор беларусаў яшчэ ў 1780 г. пачала вывучаць экспедыцыя рускага акадэміка І.І. Ляпёхіна. Гэта было знаёмства рускіх вучоных з Беларуссю пасля далучэння яе да Расійскай імперыі. Праца рускага вучонага К.Ф. Калайдовіча "Пра беларускую гаворку" (1822) уяўляла сабой першую спробу навуковага даследавання мовы беларусаў.

Вялікі інтарэс да Беларусі праявілі польскія вучоныя. Лінгвіст С. Ліндэ і гісторык Т. Чацкі першымі загаварылі пра самабытнасць беларускай мовы і неабходнасць яе вывучэння.

У першай палове XIX ст. убачылі свет шматлікія дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі: "Беларускі архіў" І.І. Грыгаровіча, "Летапісец Літвы і руская хроніка" І. Даніловіча, "Акты Заходняй Расіі", "Кнігі пасольскія Метрыкі Вялікага княства Літоўскага" і інш. Выдадзены "Помнікі гісторыі Літвы" Т. Нарбута, выйшлі ў рускім друку Статуты Вялікага княства Літоўскага.

Значны ўклад у развіццё беларусазнаўства ўнеслі ўраджэнцы Беларусі: гісторыкі Іван Грыгаровіч, Ігнат Даніловіч, аўтар дзевяцітомнай "Гісторыі літоўскага народа" Тэадор Нарбут, Міхаіл Без-Карніловіч, які ў 1855 г. выдаў у Пецярбургу "Гістарычныя звесткі аб знамянальных мясцінах у Беларусі", лінгвісты Іван Насовіч і Станіслаў Мікуцкі. Пісьменнік-этнограф Павел Шпілеўскі з'яўляўся аўтарам навукова-пазнавальных твораў "Падарожжа па Палессі і беларускім краі" і "Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках". На карысць беларускай гісторыі, археалогіі, этнаграфіі і краязнаўства працавалі браты Яўстафій і Канстанцін Тышкевічы, вучоны і грамадскі дзеяч Адам Кіркор, публіцыст і адзін з першых даследчыкаў беларускай літаратуры Рамуальд Падбярэзскі.

3. Станаўленне новай беларускай мовы і літаратуры.

Беларуская літаратура першай паловы XIX ст. адлюстравала перапляценне ідэй Асветніцтва і рамантызму, хаця вызначальнымі былі рамантычныя прынцыпы. Менавіта рамантычны светапогляд з яго ўвагай да нацыянальнай культуры спрыяў развіццю фальклярыстыкі, выкарыстанню ў мастацкай творчасці народных песень, казак, паданняў, што і прывяло да ўзнікнення першых твораў на беларускай мове.

Праблемы народнасці, нацыянальнай самабытнасці ставіліся лепшымі літаратурнымі творамі таго часу, у прыватнасці ананімнымі паэмамі "Энеіда

навыварат” і “Тарас на Парнасе”. У першым творы ў сатырычным выглядзе паказаны прыгонніцкі лад, упершыню загучала жывая гутарковая беларуская мова, у другім – адлюстравана жыццё беларускай вёскі: антычныя героі і багі паводзілі сябе, апраналіся, весяліліся і бедавалі, як беларускія сяляне і збяднелыя шляхціцы.

Варта адзначыць, што частка ўраджэнцаў Беларусі працавала на карысць польскай культуры. Найбольш вядомай постаццю сярод іх з’яўляецца Адам Міцкевіч. Свае творы ён пісаў на польскай мове, выкарыстоўваючы сюжэты беларускай гісторыі і фальклору. Як прадстаўнік рамантызму ў польскай літаратуры Адам Міцкевіч паўплываў на творчую дзейнасць пачынальнікаў беларускай літаратуры.

У першай палове XIX ст. з асяроддзя апалячанай беларускай шляхты з’яўляюцца паэты і празаікі, якія ствараюць беларускамоўныя творы. Так, паэт і фалькларыст Ян Чачот выдаў 6 фальклорных зборнікаў, дзе змясціў беларускія песні ў польскім перакладзе і арыгінале. На іх узор ён і сам пісаў вершы на беларускай мове, у якіх заклікаў гуманна адносіцца да прыгонных сялян. Ян Баршчэўскі амаль усё сваё жыццё прысвяціў збіранню народнай творчасці. Ён стварыў некалькі вершаў на беларускай мове і паэму “Рабункі мужыкоў”. У сваім галоўным творы “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”, напісаным на польскай мове, аўтар літаратурна перапрацаваў фальклорны матэрыял. Сюжэты і вобразы беларускага фальклору шырока выкарыстоўваў Уладзіслаў Сыракомля. Большасць яго твораў напісана на польскай мове, аднак захаваліся і некаторыя беларускамоўныя вершы паэта. Менавіта Сыракомля падтрымаў імкненне Дуніна-Марцінкевіча пісаць па-беларуску.

Паэт і драматург Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч ажыццявіў пераход ад польскай літаратурнай традыцыі да ўласна беларускай. Пры стварэнні беларускамоўных твораў перад аўтарам паўставала пытанне, для каго ён піша па-беларуску. Ва ўмовах, калі шляхта грэбавала “мужыцкай” мовай, а асноўная маса насельніцтва была непісьменнай, ён мог разлічваць толькі на невялікую групу патрыятычна настроеных інтэлігентаў. Аднак паэт усё ж стаў на шлях выкарыстання беларускага слова як мастацкага сродку.Вершаваныя аповесці “Вечарніцы”, “Гапон”, “Купала”, “Шчароўскія дажынкі”, “Халімон на каранацыі” і іншыя склалі сапраўдны вершаваны эпас. У іх пісьменнік паказаў духоўную прыгажосць і высакароднасць беларускага селяніна, яго побыт, лад жыцця і думкі, а таксама гістарычнае мінулае свайго краю. Дунін-Марцінкевіч з’яўляецца аўтарам славутых драматычных твораў: камедыі “Пінская шляхта” і “Залёты”.

4. Мастацтва, музыка, тэатр.

У музычна-тэатральнай культуры канца XVIII – першай паловы XIX ст. вылучаецца сваёй адметнасцю прыгонны прафесійны тэатр магнатаў, у якім адпаведна тагачасным дваранскім густам вялікае месца адводзілася спектаклям. Гэты тэатр меў змешаныя оперна-драматычныя трупы, у якіх адны і тыя ж акцёры выконвалі ролі ў оперы, драме, камедыі. Оперы ставілі ў

Нясвіжскім і Слуцкім тэатрах Радзівілаў, Ружанскім і Дзярэчынскім (Зэльвенскі р-н) тэатрах Сапегаў і інш.

Значную частку рэпертуару Гродзенскага, Слонімскага і Шклоўскага тэатраў складалі балеты. Пры некаторых магнацкіх тэатрах існавалі балетныя школы. Высокае прафесійнае майстэрства беларускіх артыстаў балета пацвярджаецца тым, што яны папаўнялі трупы варшаўскіх і пецярбургскіх тэатраў. У 1785 г. гродзенская трупа стала асновай польскага "Таварыства танцораў Яго Каралеўскай Вялікасці", а 14 прыгонных танцораў Шклоўскага тэатра графа С.Зорыча ўвайшлі ў склад пецярбургскіх тэатраў.

Прыватныя магнацкія тэатры дзейнічалі таксама і ў іншых гарадах і мястэчках Беларусі: В. Тышкевіча – у Свіслачы і Плешчаніцах, Л. Ракіцкага – у Гарадзішчы пад Мінскам, А. Буйніцкага – у Забор'і, А. Галіцына – у Віцебску, З. Чарнышова – у Магілёве. Пры многіх магнацкіх тэатрах, у панскіх сядзібах існавалі аркестры, харавыя капэлы і іншыя музычныя калектывы. Напрыклад, маёнтак Гарадзец у Магілёўскай губерні, які належаў рускаму арыстакрату, кампазітару-аматару У.Р. Кастрыёту-Скандэрбеку, сябру М.І. Глінкі і А.С. Даргамыжскага, славіўся адным з лепшых у Расіі прыгонным квартэтам.

Разам з прафесійным тэатрам развіваўся аматарскі, які быў папулярны ў шляхецкім, чыноўніцкім і афіцэрскім асяроддзі. На аматарскай сцэне рабіў першыя крокі беларускі нацыянальны тэатр. Ля яго вытокаў стаялі В. Дунін-Марцінкевіч і тыя мінскія акцёры і музыканты-аматары, якія гуртаваліся вакол гэтага выдатнага драматурга, рэжысёра і акцёра. 23 верасня 1841 г. адбылася прэм'ера аматарскага спектакля – камічнай оперы "Рэкруцкі яўрэйскі набор", музыку для якой напісалі С. Манюшка і К. Кжыжаноўскі, а лібрэта – В. Дунін-Марцінкевіч. 9 лютага 1852 г. мінскія аматары паставілі "Ідылію" Дуніна-Марцінкевіча на музыку С. Манюшкі і К. Кжыжаноўскага.

Глыбокі след у беларускай музычнай культуры пакінуў класік польскай музыкі, ураджэнец Ігуменскага (цяпер Чэрвеньскі р-н) павета Мінскай губерні Станіслаў Манюшка. У Мінску ў таленавітага музыканта і выкладчыка Д. Стэфановіча ён атрымаў пачатковую музычную адукацыю. З Мінскам звязана стварэнне і пастаноўка яго першых вадэвіляў, музычных камедый і камічных опер. Творчая дружба С. Манюшкі з В. Дуніным-Марцінкевічам прынесла вялікі плён: на лібрэта апошняга былі напісаны оперы "Спаборніцтва музыкантаў", "Чарадзейная вада", "Сялянка", пастаўленыя ў Мінску і іншых беларускіх гарадах. Беларускія народныя песні і мелодыі арганічна ўвайшлі ў творы С. Манюшкі.

Сярод вядомых дзеячаў музычнай культуры, якія працавалі на Беларусі, Міхал Клеафас Агінскі, аўтар славутага паланеза "Развітанне з Радзімай"; Фларыян Міладоўскі, аўтар пастаўленай у Мінску аперэты "Канкурэнты"; Міхаіл Ельскі, мінскі скрыпач і кампазітар; І. Глінскі, гродзенскі спявак і кампазітар; Тэафіля Юзафовіч, скрыпачка; дзеці Дуніна-Марцінкевіча Каміла і Міраслаў, бліскучыя піяністы; Міхаіл Гузікаў, ксілафаніст з еўрапейскім імем; браты Дамінік і Вікенцій Стэфановічы, дырыжоры мінскага духавога аркестра, кіраўнікі фартэпіянных класаў і інш.

5. Архітэктура, жывапіс, графіка, скульптура.

У выяўленчым мастацтве Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. наглядалася ўзаемадзеянне дзвюх плыняў – класіцызму і рамантызму. Класіцызм быў афіцыйным стылем, якога прытрымлівалася Пецярбургская акадэмія мастацтваў. Аднак у выяўленчае мастацтва пранікаюць і элементы рамантызму.

Перапляценне рысаў класіцызму і рамантызму наглядаецца ў творчасці беларускага мастака Іосіфа Аляшкевіча. Мастак жыў у Пецярбургу, аднак часта прыязджаў у Беларусь. Тут ён стварыў шэраг партрэтаў. Некаторыя з іх выкананы ў стылі класіцызму (партрэт А. Чартарыйскага). Асобныя творы І. Аляшкевіча адлюстравалі рамантычныя павевы.

Валенцій Ваньковіч увайшоў у гісторыю беларускага жывапісу як прадстаўнік рамантызму. Майстэрня Ваньковіча ў Мінску была цэнтрам, вакол якога групаваліся лепшыя мастацкія сілы горада. Яе часта наведвалі мастакі Я. Дамель, М. Кулеша. Сярод знаёмых і сяброў В. Ваньковіча было шмат дзеячаў літаратуры і мастацтва Беларусі, Літвы, Польшчы, у тым ліку і Адам Міцкевіч. Мастак стварыў шэраг іх партрэтаў у стылі рамантызму. Палатно В. Ваньковіча “Міцкевіч на скале Аюдаг” з’яўляецца тыповым прыкладам рамантычнага партрэта.

Таленавіты мастак, этнограф і кампазітар Н. Орда абышоў і аб’ездзіў амаль усю Беларусь, Польшчу і Літву, зрабіў каля 500 акварэляў і малюнкаў з натуры, захаваўшы такім чынам для нашчадкаў аблічча цудоўных помнікаў архітэктуры, замкаў, палацаў, вуліц гарадоў, гістарычных мясцін. Яго акварэлі і малюнкі пераводзіліся ў літаграфіі, выдаваліся альбомамі, графічнымі серыямі. Вялікае грамадскае прызнанне атрымалі карціны Н. Орды “Лагойск”, “Крыжоўка”, “Руіны замка ў Лідзе”, “Мір”, “Нясвіж”, “Белая вежа” і інш.

Мастак Ян Дамель пакінуў значны след амаль ва ўсіх жанрах выяўленчага мастацтва. Найбольш вядомы ён як майстар гістарычнага жанру. Ян Дамель добра ведаў айчынную і антычную гісторыю, валодаў некалькімі замежнымі мовамі. У сваіх палотнах ён імкнуўся адлюстраваць найбольш яркія, кульмінацыйныя моманты гістарычнага развіцця краю. Мастак стварыў такія карціны, як “Смерць князя Панятоўскага”, “Смерць Глінскага ў няволі”, “Вызваленне Т. Касцюшкі з цямніцы”, “Адступленне французаў праз Вільню ў 1812 г.” і інш. Акрамя гістарычных палотнаў, Я. Дамель напісаў шэраг партрэтаў і пейзажаў.

Вікенцій Дмахоўскі вядомы як стваральнік рамантычных пейзажаў. Мастак у асноўным маляваў месцы, звязаныя з жыццём і дзейнасцю А. Міцкевіча, сябрам якога ён быў (“Возера Свіцязь”, “Дом Міцкевіча ў Навагрудку”, “Заход сонца” і інш.). У пейзажах В. Дмахоўскага няма акадэмічнай умоўнасці і скаванасці, яны простыя і звычайныя, але разам з тым паэтычныя і хвалюючыя.

Іван Хруцкі ўвайшоў у гісторыю мастацтва як заснавальнік рэалістычнага нацюрморта. І.Ф. Хруцкі нарадзіўся ў сям’і уніяцкага святара ў мястэчку Ула Лепельскага павету Віцебскай губерні. Адукацыю мастак атрымаў у Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Творы мастака прасякнуты паэтычным адчуваннем быту, вызначаюцца дакладнасцю ў перадачы натуры. У 1839 г. за

нацюрморт “Кветкі і садавіна” ён атрымаў званне акадэміка Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Акрамя нацюрмортаў і пейзажаў І. Хруцкі напісаў шмат партрэтаў, у тым ліку “Сямейны партрэт”, “Партрэт хлопчыка ў саламяным брылі”.

Прадстаўнікамі бытавога жанру ў выяўленчым мастацтве былі выхаванцы Віленскай школы жывапісу К. Кукевіч, К. Русецкі, Ю. Карчэўскі, Ц. Бычкоўскі і інш. Выразнай манерай пісьма вылучаюцца творы К. Русецкага: “Жняя”, “Вербная нядзеля”, пейзажы ваколіц Навагрудка, Ашмяншчыны, Белавежскай пушчы.

У першай палове XIX ст. у мастацтве Беларусі вырасла папулярнасць графікі. Гэта было выклікана развіццём паліграфічнай вытворчасці, выданнем масавымі тыражамі друкаваных твораў. Звярталіся да мастацкага прыёму графікі ілюстратары, картографы. Найбольш вядомымі графікамі былі М. Падалінскі, Ю. Главацкі, Ю. Азямблоўскі, Б. Клямбоўскі.

З эпохай Асветніцтва звязана ўсталяванне стылю класіцызму ў архітэктуры. Архітэктары паступова адмаўляліся ад празмернай складанасці і заблытанасці архітэктурных форм, характэрных для стыляў барока і ракако. У архітэктурных кампазіцыях пачалі выкарыстоўвацца выразныя геаметрычныя формы. Набывалі распаўсюджанне антычная ордэрная сістэма і простыя дэкаратыўныя ўпрыгожванні. Класічны ордэрны порцік станавіўся характэрнай часткай палацаў, сядзіб некаторых культавых пабудоў.

Станаўленне класіцызму найперш было звязана з інтэнсіўным развіццём горадабудаўніцтва. У беларускіх гарадах пачалі з’яўляцца новыя тыпы жылых і грамадскіх будынкаў (канцылярыі, бальніцы, гімназіі), якія вылучаліся на фоне сярэдневяковай забудовы сваімі правільнымі абрысамі. Упершыню горадабудаўніцтва стала разглядацца як адзіная прасторавая сістэма, спланаваная на рацыянальных пачатках. Горадабудаўніцтва станавілася дзяржаўнай справай. У першай палове XIX ст. былі распрацаваны планы забудовы звыш 40 беларускіх гарадоў.

Яскравае адлюстраванне класіцызм знайшоў у палацава-сядзібнай архітэктуры. Дыяпазон палацава-сядзібнага будаўніцтва быў вельмі шырокі – ад невялікіх сядзіб дробнай шляхты да манументальных пабудоў буйных магнатаў. Сярод выдатных помнікаў беларускага класіцызму вылучаюцца Гомельскі, Жыліцкі (Кіраўскі раён), Сноўскі (Нясвіжскі раён) палацы. Будаўніцтва палаца ў Гомелі пачалося ў 1785 г., калі яго ўладальнікам стаў вядомы рускі палкаводзец граф П. Румянцаў. Палац быў выкананы ў стылі класіцызму з выкарыстаннем такіх яго характэрных элементаў як порцік і каланада. Велічная класічная пабудова сімвалізавала высокі сацыяльны статус яе ўладальніка. У 1834 г. гомельскі маёнтак набыў фельдмаршал граф І. Паскевіч, які ажыццявіў рэканструкцыю палаца з элементамі рамантызму. У выніку палац захаваў свае класічныя рысы, аднак некаторыя элементы дэкору набылі рысы рэнесанснай ці гатычнай архітэктуры. У гэты ж час быў створаны пейзажны парк, аздоблены гротамі, мосцікамі, керамічнымі вазамі, штучнымі вадаёмамі і іншымі ўпрыгажэннямі.Пры гэтых збудаваннях звычайна ствараліся паркі ў стылі рамантызму, аздобленыя штучнымі гротамі, каскадамі, руінамі. Найбольш значная з культавых пабудоў эпохі класіцызму ў Беларусі –

Петрапаўлаўскі сабор у Гомелі. Петрапаўлаўскі сабор у Гомелі быў пабудаваны ў 1809 – 1819 гг. па праекту англійскага архітэктара Дж. Кларка. Сабор быў створаны ў той час, калі ідэі класіцызму атрымалі перавагу над традыцыямі будаўніцтва праваслаўных храмаў, што існавалі на працягу стагоддзяў. Характэрныя прыёмы кампазіцыі – шасцікалонныя порцікі дарычнага ордэра, трохвугольныя франтоны. Велічнае ўяўленне стварае прарэзаны 12 вокнамі барабан, які завяршаецца паўсферычным купалам.

Класіцызм панаваў у архітэктуры Беларусі да сярэдзіны XIX ст. Альтэрнатывай класіцызму выступаў рамантызм, які праявіўся пераважна ў пейзажна-паркавым мастацтве. Рамантычныя пейзажныя паркі ствараліся па прынцыпе свабоднай кампазіцыі, аздабляліся штучнымі гротамі, каскадамі, руінамі (Гомельскі, Лагойскі, Жыліцкі, Савейкаўскі паркі).

Тэма 29. Адмена прыгоннага права ў Беларусі

1. Перадумовы і падрыхтоўка сялянскай рэформы

Адмену прыгоннага права ў Расійскай імперыі абумовілі дзве галоўныя прычыны: існаванне прыгонніцтва стрымлівала эканамічнае развіццё дзяржавы; узрастанне антыпрыгонніцкага руху, перш за ўсё сярод сялянства, пагражала моцным сацыяльным выбухам. У сярэдзіне XIX ст. Расія заставалася адной з нямногіх вялікіх дзяржаў, дзе захавалася права адных людзей валодаць другімі. Ужо не менш як пяць дзесяцігоддзяў пытанне аб прыгонніцтве займала цэнтральнае месца ў ідэалагічных спрэчках розных кірункаў грамадскай думкі Расіі. Але толькі паражэнне ў Крымскай вайне 1853 – 1856 гг. здолела прымусіць кіраўніцтва імперыі перайсці да непасрэднага вырашэння сялянскай праблемы. Ва ўрадавых колах разумелі, што рэформу лепш правесці “зверху”, інакш можна дачакацца адмены прыгонніцтва “знізу”.

Новы ўрад Расіі на чале з імператарам Аляксандрам II пачаў падрыхтоўку да скасавання прыгону. Спачатку падрыхтоўка сялянскай рэформы вялася ў сакрэце ад шырокіх колаў грамадскасці. У студзені 1857 г. быў створаны Сакрэтны камітэт “для абмеркавання мер па ўладкаванні побыту памешчыцкіх сялян”. Члены камітэта спрачаліся наконт умоў адмены прыгоннага права. Адны прапаноўвалі остзейскі варыянт, г. зн. вызваленне сялян без зямлі; іншыя жадалі, каб цар узяў ініцыятыву на сябе і дараваў вольнасць сялянам ад свайго імя; некаторыя лічылі, што ўмовы вызвалення сялян павінны выпрацаваць памешчыкі.

Рэформу было вырашана пачынаць з заходніх губерняў. Па-першае, мясцовыя памешчыкі былі значна больш, чым памешчыкі ў іншых раёнах Расіі, уцягнуты ў таварна-грашовыя адносіны з прычыны блізкасці да заходнееўрапейскага рынку. Па-другое, увядзенне ў 1840-я гг. абавязковых інвентароў у тутэйшых памешчыцкіх гаспадарках прывяло памешчыкаў Беларусі да ўсведамлення хуткай і непазбежнай страты імі сваёй улады над сялянамі і, разлічваючы на больш выгадныя для сябе ўмовы адмены прыгонніцтва, яны мусілі першымі адгукнуцца на прапанову ўрада. Па-трэцяе,

для самадзяржаўя апазіцыйна настроенае польскае дваранства ўяўляла палітычную небяспеку, таму неабходна было найхутчэй пазбавіць яго магчымасці выкарыстаць сялянскія хваляванні ў сваіх нацыянальных інтарэсах.

Для расійскага ўрада было важна, каб ініцыятыва адмены прыгоннага права зыходзіла ад памешчыкаў – галоўнай сацыяльнай апоры ўлады. Паколькі памешчыкі асабліва не спяшаліся з прапановамі аб скасаванні прыгонніцтва, памешчыцкую "ініцыятыву" трэба было арганізаваць. Зрабіць гэта аказалася не вельмі цяжка. Яшчэ ў маі 1856 г. генерал-губернатар Віленскай, Ковенскай і Гродзенскан губерняў У.І. Назімаў на сустрэчы з Аляксандрам II у Брэсце запэўніў імператара, што дваране яго генерал-губернатарства, бачачы вынікі вызвалення сялян у суседніх прыбалтыйскіх губернях, дзе сяляне атрымалі асабістую свабоду яшчэ ў пачатку XIX ст., пагадзіліся б на падобную рэформу. Летам 1857 г. Аляксандр II зноў сустрэўся з У.І. Назімавым, цяпер ужо ў Вільні, і генерал-губернатар пацвердзіў, што памешчыкі паўночна-заходніх губерняў гатовы выступіць з ініцыятывай адмовы ад прыгоннага права.

Пад уплывам У.І. Назімава інвентарныя камітэты Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў прынялі рашэнне не займацца пытаннямі рэгулявання адносін паміж памешчыкамі і сялянамі, для чаго яны і былі калісьці створаны, а пагадзіліся бязвыплатна вызваліць сялян, пакінуўшы памешчыкам усю зямлю, у тым ліку і сялянскія надзелы. Гэта рашэнне У.І. Назімаў у верасні 1857 г. накіраваў міністру ўнутраных спраў. У кастрычніку ён асабіста прыехаў у Пецярбург і папрасіў даць яму далейшыя інструкцыі. 20 лістапада 1857 г. Аляксандр II падпісаў і накіраваў рэскрыпт (прадпісанне) генерал-губернатару Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай губерняў У.І. Назімаву аб заснаванні з прадстаўнікоў мясцовых памешчыкаў трох губернскіх камітэтаў і адной агульнай камісіі ў Вільні для падрыхтоўкі мясцовых праектаў паляпшэння побыту памешчыцкіх сялян. Крыху пазней падобныя камітэты былі створаны і ў іншых губернях Расіі.

2. Рэалізацыя "Палажэнняў" 19 лютага 1861 г. і асаблівасці правядзення аграрнай рэформы ў Беларусі

19 лютага 1861 г. Аляксандр II падпісаў "Маніфест" і зацвердзіў усе заканадаўчыя акты (іх было 17), якія тычыліся адмены прыгоннага права. Але апублікаваны гэтыя дакументы былі толькі 5 сакавіка 1861 г. Такі значны разрыў паміж датамі зацвярджэння царом заканадаўчых актаў і іх апублікаваннем для ўсеагульнага азнаямлення тлумачыцца тым, што патрэбна было не толькі надрукаваць неабходную колькасць экземпляраў гэтых аб'ёмных дакументаў, але і прыняць шэраг прэвентыўных (папераджальных) захадаў на выпадак сялянскіх хваляванняў, якія небеспадстаўна прагназаваліся ўладамі. Былі падрыхтаваны неабходныя вайсковыя часці ў сталіцах, а ў губерні для нагляду за парадкам накіраваны флігель-ад'ютанты, якія ў неабходных выпадках мелі права дзейнічаць ад імя цара.

Усе дакументы, апублікаваныя 5 сакавіка 1861 г., можна падзяліць на тры групы: агульныя палажэнні, мясцовыя палажэнні, дадатковыя правілы. З мясцовых палажэнняў непасрэдна тэрыторыі Беларусі тычыліся два: “Мясцовае палажэнне аб пазямельным уладкаванні сялян, якія паселены на памешчыцкіх землях у губернях: Вялікарасійскіх, Новарасійскіх і Беларускіх” (пад гэта палажэнне падпадалі Магілёўская губерня і большая частка Віцебскай) і “Мясцовае палажэнне аб пазямельным уладкаванні сялян, якія паселены на памешчыцкіх землях у губернях: Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і частцы Віцебскай” (ахоплівала астатнюю тэрыторыю Беларусі).

Устаўныя граматы і выкупныя акты. У маніфесце і агульных палажэннях былі заканадаўча замацаваны ўсе агульныя для сялян асабістыя і маёмасныя правы, правы грамадскага кіравання, дзяржаўныя і земскія павіннасці. Галоўным звяном у заканадаўчых актах рэформы былі асабістыя правы сялян. У маніфесце падкрэслівалася, што адмена прыгоннага права з’яўлялася вынікам добраахвотнай ініцыятывы “шляхетнага дваранства”. У адпаведнасці з маніфестам былыя памешчыцкія сяляне абвяшчаліся асабіста свабоднымі і атрымлівалі шэраг грамадзянскіх правоў: заключаць ад свайго імя розныя грамадзянскія і маёмасныя пагадненні, адкрываць гандлёвыя і прамысловыя прадпрыемствы, пераходзіць у іншыя саслоўі.

Агульныя палажэнні ўводзілі новую сістэму кіравання вёскай. Яна была заснавана на выбарнасці ніжэйшых службовых асоб. Сяляне, якія жылі на зямлі аднаго памешчыка, складалі сельскую грамаду (абшчыну). На сходзе сельскай грамады выбіраўся староста. Некалькі сельскіх абшчын, якія адносіліся да аднаго царкоўнага прыхода, стваралі воласць. На валасным сходзе сельскія старасты і ўпаўнаважаныя ад кожных 10 двароў выбіралі валасное праўленне, валаснога старшыню і суддзю. Сельскія і валасныя праўленні займаліся раскладкай і зборам падаткаў, выконвалі распараджэнні мясцовых улад, рэгулявалі пазямельныя адносіны сялян, сачылі за парадкам у вёсцы. За своечасовае выкананне ўсіх павіннасцей сяляне неслі адказнасць на аснове кругавой парукі. Валасны сялянскі суд вырашаў дробныя крымінальныя і грамадзянскія справы сялян і дзейнічаў паводле норм і традыцый звычаёвага права.

Першай інстанцыяй па ўрэгуляванні адносін паміж сялянамі і памешчыкамі з’яўляліся міравыя пасрэднікі, якія выбіраліся з мясцовых дваран і зацвярджаліся сенатам. Асноўным абавязкам міравых пасрэднікаў было садзейнічанне складанню ўстаўных грамат – нарматыўных актаў, дзе вызначаліся пазямельныя адносіны сялян і памешчыкаў. На складанне і падпісанне ўстаўных грамат адводзіліся два гады. Для непасрэднага правядзення рэформы на месцах ствараліся спецыяльныя органы – павятовыя міравыя з’езды і губернскія па сялянскіх справах установы, дзейнасць якіх кантралявалі губернатары.

Спецыфіка “Мясцовых палажэнняў…” для беларускіх губерняў. Пазямельнае ўладкаванне сялян Беларусі ажыццяўлялася на аснове двух “Мясцовых палажэнняў…”. У Віцебскай і Магілёўскай губернях, дзе захавалася абшчыннае землекарыстанне, устанаўлівалася ніжэйшая (ад 1 да 2

дзесяцін) і вышэйшая (ад 4 да 5,5 дзесяціны) плошча зямлі на адну мужчынскую душу. Калі да рэформы ў карыстанні селяніна зямлі было больш за вышэйшую норму, то памешчык меў права адрэзаць лішак на сваю карысць. У Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губернях існавала падворнае землекарыстанне. Тут сялянам пакідаўся іх дарэформенны надзел. Адрэзкі дазвалялася рабіць, калі ў памешчыка заставалася менш за 1/3 усёй зямлі, але сялянскі надзел не мог быць скарочаны больш як на 1/6.

Уся зямля ў маёнтку прызнавалася ўласнасцю памешчыка, ў тым ліку і тая, якая знаходзілася ў карыстанні сялян. За карыстанне сваімі надзеламі асабіста свабодныя сяляне на працягу не менш як 9 гадоў (да правядзення выкупной аперацыі) павінны былі адбываць паншчыну або плаціць памешчыку аброк, гэта значыць выконваць фактычна тыя ж павіннасці, што і ў часы прыгоннага права. Адмяняліся толькі дадатковыя зборы (яйкі, масла, лён, палатно і да т.п.), крыху скарачалася фурманачная павіннасць, забараняўся перавод сялян з аброку на паншчыну і ў дваровыя. Такое становішча сялян закон прызнаваў часовым. Таму асабіста свабодныя сяляне, якія працягвалі выконваць павіннасці на карысць памешчыка, называліся часоваабавязанымі.

Да правядзення выкупной аперацыі ў Магілёўскай і Віцебскай губернях паншчына за вышэйшы надзел складала 40 мужчынскіх і 30 жаночых дзён у год (ці 8 рублёў аброку). У заходняй частцы Беларусі павіннасці памяншаліся на 10 % супраць інвентароў і вызначаліся наступным чынам: для паншчыны – не больш за 23 дні, для аброку – не больш як 3 рублі з дзесяціны ў год.

Свой палявы надзел зямлі сяляне выкуплялі ва ўласнасць. Правілы выкупной аперацыі былі аднолькавыя для ўсёй Расіі. Выкупная сума за сялянскі надзел вылічвалася так, каб, паклаўшы яе ў банк пад 6 % гадавых, памешчык мог штогод атрымліваць даход, роўны гадавому аброку з гэтага надзела. Напрыклад, калі аброк з сялянскага надзелу складаў 6 рублёў у год, то агульная сума, якую селяніну трэба было заплаціць, складала 100 рублёў (6 р. – 6 %, 100 р. – 100 %). Ад 20 да 25 % выкупной сумы (у залежнасці ад велічыні надзелу) сяляне плацілі непасрэдна памешчыку. Астатнюю частку памешчыкі атрымлівалі ад дзяржавы ў выглядзе каштоўных папер, якія можна было прадаваць, ці закладваць. У выніку такой аперацыі сяляне станавіліся даўжнікамі дзяржавы. На працягу 49 гадоў трэба было вярнуць доўг у выглядзе выкупных плацяжоў, куды ўключаліся яшчэ і працэнты за пазыку. За гэты час сялянам даводзілася выплаціць да 300 % пазычанай ім сумы.

Такім чынам, агульная сума, якую сяляне вымушаны былі заплаціць за атрыманыя надзелы, значна перавышала рыначны кошт гэтай зямлі (у Беларусі – у 3 – 4 разы). Выходзіла, што сяляне не толькі выкуплялі зямлю, але і кампенсавалі памешчыкам страту іх уласнасці ў асобе селяніна. Праводзячы выкупную аперацыю, казна вырашыла і праблему спагнання дарэформенных даўгоў з памешчыкаў. У Беларусі, паводле даных за 1859 г., 59,8 % прыгонных сялян (увогуле па Расіі – 65 %) былі закладзены іх уладальнікамі ў розных крэдытных установах. Гэты доўг утрымліваўся з выкупной пазыкі памешчыкам, што вызваліла іх ад даўгоў і выратавала ад фінансавага банкруцтва.

3. Рэформа аграрных адносін дзяржаўных сялян. Вынікі і значэнне аграрных рэформ.

Пасля 1863 г. перагледзелі землеўпарадкаванне і дзяржаўных сялян (20% сельскага насельніцтва Беларусі). З 16 мая 1867 г. яны адразу пераводзіліся з аброку на выкуп зямлі і станавіліся прыватнымі ўладальнікамі зямельныз надзелаў.

У выніку аграрнай рэформы 1861 г. памешчыкі на тэрыторыі Беларусі захавалі ў сваёй уласнасці больш за палову ўсіх зямель; прыкладна ў 2 разы больш, чым у іншых губернях еўрапейскай часткі Расіі. Сялянскія надзелы ў Беларусі складалі толькі 1/3 усёй зямлі. Захоўвалася адпрацовачная форма гаспадаркі, характэрная для феадальнага ладу.

Аднак разам з тым, сялянская рэформа 1861 г. паклала пачатак новаму, капіталістычнаму ладу. У выніку рэформы ў краіне склаліся спрыяльныя ўмовы для развіцця буржуазных формаў гаспадарання. Разам з тым рэформа мела і адмоўныя бакі. Яна была праведзена з максімальнымі выгодамі для памешчыкаў. Наяўнасць шматлікіх перажыткаў прыгонніцтва (выкупныя плацяжы, адрэзкі, цераспалосіца, палітычная нераўнапраўнасць і інш.) стрымлівалі развіццё капіталізму.

Тэма 30. Паўстанне 1863 г. на Беларусі.

1. Актывізацыя грамадскага жыцця напярэдадні паўстання. К. Каліноўскі. “Мужыцкая праўда”

Абвастрэнне сітуацыі ў беларускай вёсцы ў сувязі з адменай прыгоннага права і чаканнем сялян сапраўднай волі па часе супала з ажыўленнем нацыянальнага руху на тэрыторыях былой Рэчы Паспалітай з цэнтрам у Царстве Польскім. У 1860 г. тут прайшлі народныя патрыятычныя маніфестацыі. Выбух абурэння выклікаў расстрэл 27 лютага 1861 г. патрыятычнай працэсіі ў Варшаве. Актыўнасць палякаў працягвала нарастаць і перакідвацца на беларускія, літоўскія і правабярэжнаўкраінскія землі.

У нацыянальна-вызваленчым руху аформіліся дзве палітычныя групоўкі: "чырвоныя" і "белыя". "Чырвоныя" меркавалі аднавіць незалежнасць Польшчы праз народнае паўстанне, найболып радыкальныя з іх (левыя) выказваліся за рэспубліканскі і дэмакратычны лад, самавызначэнне народаў, разлічвалі на падтрымку рэвалюцыйных сіл Расіі. "Белыя", што прадстаўлялі інтарэсы буйных землеўладальнікаў і вярхоў буржуазіі, імкнуліся не дапусціць, каб паўстанне перарасло ў сялянскую рэвалюцыю, а спадзяванні на ад-наўленне незалежнасці звязвалі з націскам на Расію заходнееўрапейскіх дзяржаў. Яны наладзілі сувязь з арыстакратычнай эміграцыяй у Парыжы і праз князя Чартарыйскага падтрымлівалі адносіны з урадамі Францыі і Англіі. "Белыя" планавалі аднавіць Польшчу ў межах Рэчы Паспалітай. Для кіравання і каардынацыі падрыхтоўкі паўстання ў Варшаве ў сакавіку 1862 г.

быў створаны Цэнтральны нацыянальны камітэт (ЦНК) на чале з "чырвонымі" Я. Дамброўскім, З. Серакоўскім, В. Урублеўскім.

Пад уплывам гэтых падзей складвалася сітуацыя ў Бе-ларусі, дзе найбольш актыўную ролю адыгрываў Кастусь Каліноўскі (1838-1864), шляхціч з Гродзеншчыны, рэвалюцыянер-дэмакрат, публіцыст і паэт. Ён скончыў юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта, удзельнічаў там у рэвалюцыйных гуртках. Вярнуўся ў 1861 г. на радзіму і ў хуткім часе стаў адным з правадыроў вызваленчага руху. Сумесна з В. Урублеўскім і Ф. Ражанскім выдаваў нелегальную газету "Мужыцкая праўда", якая стала рупарам рэвалюцыйна-дэмакратычнага крыла "чырвоных". На працягу 1862-1863 гг. выйшла сем нумароў у выглядзе лістовак. Сваім змес-там газета растлумачвала сялянам прыгонніцкі характар аграрнай рэформы, раскрывала імперскую палітыку самадзяржаўя, абараняла скасаваную ўладамі уніяцкую царкву.

Летам 1862 г., з мэтай падрыхтоўкі паўстання ў Беларусі і Літве, у Вільні стварыўся Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК), фармальна падначалены ЦНК. У ім былі прадстаўлены літоўска-беларускія "чырвоныя", а старшынёй з кастрычніка 1862 г. стаў К. Каліноўскі

2. Ход паўстання. Тактыка “белых”.

Паўстанце выбухнула ў Царстве Польскім у ноч з 22 на 23 студзеня 1863 г., калі адначасова напалі на рускія гарнізоны ў розных частках краіны. 1 лютага 1863 г. ЛПК абвясціў сябе Часовым правінцыяльным урадам Літвы і Беларусі і абнародаваў праграмныя дакументы, што дубліравалі праграму польскіх паўстанцаў. Насельніцтва заклікалася падняцца на ўзброеную барацьбу, жыхары аб'яўляліся раўнапраўнымі грамадзянамі, незалежна ад саслоўнай прыналежнасці, нацыянальнасці і веравызнання. Ва ўласнасць сялян бязвыплатна перадаваліся зямельныя надзелы, якія знаходзіліся ў іх карыстанні, а з памешчыкамі за зямлю разлічвалася дзяржава. Беззямельныя сяляне, але толькі ўдзельнікі паўстання, павінны былі атрымаць па тры маргі зямлі (1 морг роўны 0,71 га). Рэкруцтва замянялася трохгадовай усеагульнай вайсковай павіннасцю. Аднаўлялася уніяцкая царква. Па сутнасці гэта была буржуазная праграма.

Першыя атрады паўстанцаў з'явіліся ў заходніх паветах Беларусі з Польшчы ўжо ў канцы студзеня 1863 г. Большасць мясцовых атрадаў сфарміраваліся ў сакавіку-красавіку. У іх склад увайшлі дробная шляхта, навучэнцкая моладзь, рамеснікі, сяляне, афіцэры, што пакінулі царскую ар-мію. Агульнага плана дзеянняў і ўзаемнай каардынацыі не было. Не хапала таксама зброі. Дзейнічалі партызанскімі метадамі. Усяго на Беларусі (у сучасных яе межах) з лютага па жнівень 1863 г. зафіксавана 46 баёў і баявых сутычак паўстанцаў з царскімі войскамі; 2/3 з іх адбыліся на Гродзеншчыне і Віленшчыне.

Калі першапачаткова ініцыятыва належала "чырвоным" і прычым іх радыкальнай, левай частцы, то з развіццём паўстання да яго далучыліся "белыя", каб пазбавіць рэвалюцыйнай накіраванасці, а толькі справакаваць ваеннае

ўмяшальніцтва Англіі і Францыі. "Белыя" ўстанавілі кантроль над кіруючымі органамі ў Варшаве і ў сакавіку 1863 г. па ўказанні адтуль быў створаны Аддзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы на чале з памешчыкам Я. Гейштарам. Каліноўскі, пасля рэзкага пратэсту супраць гэтай акцыі, не знай-шоўшы дастатковай апоры, прыняў пасаду гродзенскага ваяводскага камісара. Прыход "белых" да кіраўніцтва кампраметаваў справу ў вачах сялянскіх мас. У выніку, асноўная маса беларускага сялянства не далучылася да паўстанцаў, іх доля склала каля 18%.

3. Падаўленне паўстання і прычыны яго паражэння.

У маі паўстанне ў Мінскай, Магілеўскай і Віцебскай губернях было падаўлена. Цэнтрам паўстанцкага руху становіцца Гродзенская губерня, дзе ваяводскім камісарам пасля сакавіцкага пераваротy стаў Каліноўскі. У цэлым становішча паўстанцаў усе больш пагаршалася, рабілася безнадзейным. Для расправы з паўстанцамі былі кінуты буйныя сілы. Генерал-губернатарам, якому былі дадзены неабмежаваныя паўнамоцтвы, быў прызначаны М.М.Мураўеў. Акрамя таго, для заспакаення сялян, былі ўнесеы змяненні ў “Палажэнні” 19 лютага. Для Беларусі і Літвы быў уведзены абавязковы выкуп сялянскіх надзелаў і прадугледжвалася неадкладнае вяртанне сялянскіх адрэзкаў, памяньшэнне выкупных плацяжоў на 20%. Беззямельным сялянам давалі па 3 дзесяціны зямлі. Была разгорнута шырокая антыпольская і антыпаўстанцкая агітацыя.

Гэтыя меры, а таксама нерашучая аграрная палітыка ЦНК значна звузілі сялянскі рух. Асноўная маса сялян не прымала ўдзел у паўстанні (сяляне складалі не больш 16% паўстанцаў). Акрамя таго, кіраўнікі “Літоўскага аддзела” пакідалі свае пасады, баючыся рэпрэсій. Адначасова страчвалася вера ў дапамогу з боку Англіі і Францыі, урады якіх адкрыта спачувалі, але нічога не рабілі дзеля таго, каб падтрымаць паўстанне.

Каліноўскі працягваў рэвалюцыйную дзейнасць, спрабаваў выратаваць людзей і арганізацыі, каб зноў выступіць вясною 1864 г. Доўгі час удавалася канспіравацца, але адзін з членаў арганізацыі на допыце выдаў яго. 10 сакавіка Каліноўскі быў публічна павешаны на Лукішскай плошчы ў Вільні. Паводле афіцыйных дадзеных, у Беларусі і Літве 128 паўстанцаў былі пакараны смерцю, больш 850 асуджаны на катаргу, каля 12 тыс. чалавек сасланы і выселены. У Беларусі і Літве быў устаноўлены рэжым выключных законаў, накіраваны на змяншэнне польскага уплыву і ўзмацненне русіфікацыі краю.

Тэма 31. Буржуазныя рэформы 60-70 гг. XIX ст. і ўрадавая палітыка ў Беларусі

1. Рэформа дзяржаўных інстытутаў і мясцовага кіравання. Контррэформы

Але калі адмена прыгонніцтва прайшло на больш спрыяльных умовах, то буржуазныя рэформы 60-70-х гг. на Беларусі мелі значныя абмежаванні.

Гарадская рэформа 1870 г. (праведзена на Беларусі ў 1876 г.) мела мэтай упарадкаваць кіраванне гарадамі. Ствараліся органы кіравання – гарадскія думы і ўправы. На чале ўправы стаяў гарадскі галава, ён адначасова з'яўляўся і старшынёй гарадской думы. Выбары праходзілі на аснове маёмаснага цэнзу. Выбарчым правам карысталіся толькі плацельшчыкі гарадскіх падаткаў. У беларускіх гарадах, дзе большасць насельніцтва складалі "іншаверцы" – яўрэі, былі ўведзены абмежаванні для гэтай катэгорыі гараджан. Спачатку яны мелі права займаць 1/3 частку месцаў у органах гарадскога самакіравання, а ў выніку конррэформы – па новаму Гарадавому палажэнню 1892 г. – толькі 1/10 частку месц.

У распараджэнні гарадскіх дум і ўпраў былі пытанні развіцця прамысловасці і гандлю; арганізацыі адукацыі і медыцынскага абслугоўвання; утрымання пажарнай аховы, паліцыі і казармаў. Думы і ўправы не мелі органаў выканаўчай улады і падпарадкоўваліся губернатарам і міністру ўнутраных спраў.

У выніку судовай рэформы 1864 г. (на Беларусі пачалася ў 1872 г.) ліквідаваліся саслоўныя суды; утвараліся акруговыя суды і судовыя палаты; судовыя палаты разглядалі апеляцыі і займаліся палітычнымі справамі, абслугоўвалі некалькі губерняў; акруговыя суды ўтвараліся ў кожнай губерні; міравы суд разбіраў дробныя правапарушэнні. Суд станавіўся адкрытым, галосным і незалежным ад ураду; ствараўся інстытут адвакатуры і прысяжных засядацеляў, для засведчання розных актаў была ўведзена пасада натарыўса.

На Беларусі міравыя суддзі не выбіраліся, а прызначаліся МУС. У 1900 г. у Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях быў уведзены інстытут земскіх начальнікаў. Яны прызначаліся з мясцовага дваранства і мелі права караць сялян без рашэння міравых судоў.

Судовая рэформа была значным крокам наперад у параўнанні з дарэформенным судом і адыграла вялікую ролю ў станаўленні буржуазных адносін у Расійскай імперыі.

Ваенная рэформа 1862 г. мела мэтай стварэнне арміі буржуазнага тыпу з кваліфікаваным асабістым саставам, сучаснай зброяй, добра падрыхтаванымі афіцэрскімі кадрамі. Імперыя была падзелена на 15 ваенных акруг (Віленская ўключала ўсю Беларусь). Адкрываліся ваенныя навучальныя ўстановы, на Беларусі гэта кадэцкія корпусы ў Полацку і Брэсце.

У 1874 г. быў выдадзены закон аб усеагульнай воінскай павіннасці мужчын, якія дасягнулі 20-гадовага ўзросту. Армія скарачалася ў мірны час і павялічвалася ў перыяд ваенных дзеянняў за кошт запаснікаў. Уводзіўся скарочаны тэрмін службы: для сухапутных войскаў – 6 гадоў службы і 9 гадоў запасу, для флоту 7 гадоў службы і 3 гады запасу. Для асоб, якія мелі адукацыю, тэрмін службы значна скарачаўся.

З мэтай пашырэння магчымасцяў друку, у тым ліку мясцовага, была праведзена цэнзурная рэформа 1865 г. Згодна з ёй была адменена папярэдняя цэнзура для твораў аб'емам больш 10 друкаваных аркушаў, але заставалася абавязковая папярэдняя цэнзура для твораў меньшага аб'ему; абавязковая

папярэдняя цэнзура існавала для правінцыяльных органаў перыядычнага друку.

Пасля рэформы актыўна пачалі адкрываца прыватныя тыпаграфіі, якія мелі сучаснае абсталяванне, з'яўляліся перадавымі прадпрыемствамі і склалі новую галіну вытворчасці.

Рэформа адукацыі прадугледжвала ўвядзенне новага ўніверсітэцкага статута, а так сама новага статута гімназіі (уводзіліся з 1864 г.). Атрымліваць адукацыю зараз маглі прадстаўнікі ўсіх саслоўяў. Гімназіі былі двух тыпаў: класічныя і рэальныя. Класічная гімназія рыхтавала сваіх выхаванцаў да паступлення ва ўніверсітэты. Рэальныя гімназіі рыхтавалі вучняў да работы ў прамысловасці і гандлі.

У 1864 г. было зацверджана «Палажэнне аб пачатковых народных вучылішчах». Грамадскія ўстановы і прыватныя асобы з дазволу ўлад маглі адкрываць пачатковыя вучылішчы. Але на Беларусі народныя вучылішчы знаходзіліся пад дадатковым наглядам паліцыі і праваслаўнай царквы.

Рэформы 60-70-х гг. не краналі асноў самадзяржаўя і ў значнай ступені захоўвалі прывілеі дваранства, аднак садзейнічалі пераўтварэнню Расійскай дзяржавы з феадальнай манархіі ў буржуазную. І яшчэ, – на Беларусі буржуазныя рэформы былі праведзены з абмежаваннямі.

2. Барацьба з "польскасцю" і пашырэнне рускага землеўладання. Змены ва ўрадавай палітыцы ў Беларусі па нацыянальным і рэлігійным пытаннях.

Нацыянальная палітыка Расійскага ўрада ў дачыненні да Беларусі вызначалася ў большай ступені спецыфічнымі чым агульнымі рысамі. Прычыны гэтага былі абумоўлены неабходнасцю змагання расійскага самадзяржаўя з уплывам польскага нацыянальна-вызваленчага руху і рэжымам абмежавальных законаў, асабліва ў дачыненні яўрэйскага насельніцтва.

Абмежавальныя законы прывялі да штучнай канцэнтрацыі яўрэяў у гарадах і мястэчках Беларусі, колькаснай перавагі іх сярод гарадскога пралетарыяту і гандлёва-прамысловага насельніцтва, адбіліся на ўзроўні канцэнтрацыі прадпрыемстваў і дэфармавалі структуру прамысловай і гандлёвай буржуазіі, пралетарыяту, затрымлівалі іх кансалідацыю як сацыяльных груп. Яны абвастрылі аграрную перанаселенасць у Беларусі, прывялі да зніжэння кошту зямлі, перашкаджалі яе вольнай куплі-продажу, спрыялі захаванню дваранскага землеўладання ў беларускіх губернях.

Кантынгент чыноўнікаў у Беларусі другой паловы XIX ст. фарміраваўся ў асноўным за кошт прысланых з унутраных губерняў Расіі дзяржаўных служачых. З1863 па 1865 гг. у беларускіх губернях было прызначана на службу звыш 4600 новых чыноўнікаў. Пераважная большасць з іх з'яўлялася ўраджэнцамі велікарускіх губерняў. Каб утрымаць запрошаных чыноўнікаў на новым месцы, ім на льготных умовах прадаваліся казёныя і канфіскаваныя маёнткі, устанаўліваліся павышаныя аклады. Так, у

1866-1873 гг. у Віленскай, Мінскай і Гродзенскай губернях 300 чыноўнікаў купілі 329 зямельных уладанняў агульнай плошчай 146,3 тыс. дзесяцін. Наогул,для службы ў заходняй частцы Расійскай імперыі заахвочваліся ўраджэнцы велікарускіх губерняў. Трэба зазначыць, што далёка не заўсёды прынятыя льготы апраўдваліся. Нярэдка губернатары скардзіліся на тое, што прыезджыя чыноўнікі характарызаваліся нізкімі маральнымі і прафесійным і якасцямі. Ахвочымі да прапанаваных прывілеяў былі чыноўнікі авантурыскага складу, якія не ствараліаўтарытэту расійскім уладам сярод мясцовага грамадства.

Росту аграрнай перанаселенасці ў беларускай вёсцы садзейнічала абмежаванне перасялення сялян на слабанаселеныя і вольныя землі Расійскай імперыі. Яно праводзілася з мэтай захавання таннай рабочай сілы і ўмацавання "рускага элемента" ў беларускіх губернях за кошт праваслаўнага сялянства. Гэта падмацоўваў закон 13 ліпеня 1889 г. і пазней крыху яго аблегчыў цыркуляр 2 ліпеня 1894 г., які стварaў больш спрыяльныя ўмовы перасялення.

Урадавая палітыка ў дачыненні да дваранства Беларусі змянялася ў залежнасці ад нацыянальна-канфесійнай прыналежнасці яго прадстаўнікоў, пашырэння польскага нацыянальнага руху і рэвалюцыйнага руху ў Расіі, змен у адносінах дваранства да ўрадавых мерапрыемстваў, асабліва рэалізацыі рэформы 1861 г. і аграрнага заканадаўства.

У першыя гады пасля падаўлення паўстання 1863 г. урад ставіўся з недаверам да каталіцкага дваранства; гэта вызначалася рэпрэсіўнымі мерамі ў сферы землеўладання і землекарыстання, некаторым абмежаваннем саслоўных правоў. Мясцовае дваранства ўрадам было як бы падзелена на часткі. Большасць дваран каталіцкага веравызнання лічыліся нядобранадзейнымі ў палітычных адносінах, меншасць – праваслаўнага веравызнання, нямецкія памешчыкі, дваране прыбалтыйскага паходжання – былі прызнаны апорай самадзяржаўя.

Пасля паўстання 1863 г. урад вярнуўся да палітыкі прыпіскі да падатковых саслоўяў беззямельнай і неаселай шляхты, якая актыўна праявіла сябе ў нацыянальным руху. У новых правілах 1864 г. ускладніліся шляхі пацвярджэння шляхтай сваёй дваранскай годнасці, што скарачала колькасць прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя. У беларускіх губернях была прыпынена дзейнасць дваранскіх сходаў – саслоўных выбарных органаў, а таксама зачынены дваранскія вучылішчы, заканчэнне якіх давала права паступаць на дзяржаўную службу. У дваранскія вучылішчы паступалі пераважна дзеці маламаёмаснай шляхты, сацыяльная і палітычная актыўнасць якіх выклікала асаблівую заклапочанасць ва ўрада.

Уведзены былі абмежаванні пры паступленні католікаў у вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы. Да 1868 г. на тэрыторыі Беларусі захоўвалася ваеннае становішча. Дваранству ў час яго дзеяння забаранялася збірацца разам па не калькі чалавек, нават на сямейныя ўрачыстасці, без асобага дазволу мясцовых уладаў. Захоўваліся штрафы і

кантрыбуцыйныя зборы, якія спачатку накладваліся бескантрольна і ператварыліся ў крыніцу дадатковых даходаў мясцовых уладаў, а з 1866 г. накладваліся толькі са згоды губернатара.

Тэма 32. Сельская гаспадарка Беларусі ў 60-90 гг. XIX ст.

1. Памешчыцкае і сялянскае землеўладанне, рост бессаслоўнай зямельнай уласнасці

Памешчыцкая гаспадарка. У 60-70-я гг. у памешчыцкай гаспадарцы ўсталявалася пераходная сістэма гаспадарання – адработачная сістэма, якая спалучала рысы феадальнай і капіталістычнай сістэм. Яе сутнасць – сяляне з прычыны эканамічнай неабходнасці арандавалі зямлю ў памешчыкаў, за што працавалі на зямлі памешчыка са сваім інвентаром і рабочай жывёлай. Пры капіталістычнай сістэме гаспадарання памешчыцкая зямля апрацоўвалася ўжо інвентаром і цяглай жывёлай уладальніка. Дэфіцыт сродкаў у часткі памешчыкаў не дазволіў ім адразу перайсці да капіталістычнага спосабу вытворчасці. Капіталістычная сістэма гаспадарання пераважала на захадзе Беларусі, а на ўсходзе – змешаная адработачна-капіталістычная.

Памешчыкам у другой палове 70-х гг. належала 8,7 млн. (50,5%) дзесяцін зямлі, казне – 1,6 млн. (9,9%), цэрквам і манастырам – 122,9 тыс. (0,7%) дзесяцін. Пераважала буйное землеўладанне (звыш 500 дзесяцін на ўладальніка).

Працэс пераходу да бессаслоўнага землеўладання адбываўся замаруджана. Прычынамі гэтага былі эканамічная ўстойлівасць буйных памешчыцкіх гаспадарак, арганізаваных на капіталістычны лад; абмежаванні, уведзеныя ўрадам пасля 1863 г., якія забаранялі каталікам набываць зямлю, сялянам-каталікам купляць больш за 60 дзесяцін на аднаго чалавека, і забараняла мець зямлю яўрэям; мэтанакіраванае насаджэнне землеўладання рускіх памешчыкаў.

Павелічэнне вытворчасці ішло экстэнсіўным шляхам, у выніку пашырэння пасяўных плошчаў. Вядучай галіной, як і раней, заставалася вытворчасць збожжа. Беларусь у 60–70-я гг. становіцца важным рэгіёнам экспарту збожжа (жыта, авёс, ячмень)за мяжу. Адначасова на Беларусь увозілася пшаніца.

Пачалі распаўсюджвацца мнагапольныя севазвароты, выкарыстоўвацца сельскагаспадарчыя машыны (у Мінскай губерні ў 20% абследаваных маёнткаў). Капіталізм у памешчыцкай гаспадарцы рабіў першыя крокі.

Сярэдні надзел былых памешчыцкіх сялян вагаўся ад 3,9 да 5,1 дзесяцін на рэвізскую душу, а былых дзяржаўных ад 5,5 да 6 дзесяцін, а пражытачны мінімум забяспечваў надзел больш 8 дзесяцін зямлі на душу. Па дэмаграфічных прычынах надзелы хутка скарачаліся – да 1900 г. на душу прыходзілася ад 2,1 да 3,2 дзесяціны.

Галоўная галіна сялянскай гаспадаркі – земляробства. Раслі пасевы і ўраджайнасць збожжавых культур. Але хутчэй пашыраліся плошчы і раслі

зборы кармавых і тэхнічных раслін. У гаспадарках заможных сялян выкарыстоўваліся палепшаныя прылады працы, штучныя ўгнаенні, сартавое насенне. За 60-90-х гг. пагалоўе буйной рагатай жывёлы ў сялян павялічылася на 50%, галоўным чынам у гаспадарках заможных сялян.

У другой палове XIX ст. на Беларусі сялянства давала каля 25% таварнага збожжа, 75% таварнага льну, значную частку бульбы, прадуктаў мясной і малочнай жывёлагадоўлі. Тым не меньш, сялянская гаспадарка заставалася адсталай, аб гэтым сведчыць ручная праца, трохпольная сістэма, састарэлыя прылады працы – драўляная саха і барана.

Стрымліваючымі фактарамі развіцця сялянскай гаспадаркі былі: існаванне буйнога памешчыцкага землеўладання; шматлікія павіннасці; захаванне абшчыны; захаванне сервітутаў – уласнасці памешчыкаў, якой сяляне карысталіся на пэўных умовах; захаванне церазпалосіцы (на Беларусі пашырана больш, чым у Расіі).

Маёмаснае і класавае расслаенне сялянства паскорылася пасля рэформы 60-х гг., калі зямля стала аб'ектам свабоднай куплі-продажу. Яе сяляне набывалі праз Сялянскі банк, заснаваны ў 1882 г. Мэтамі дзейнасці банка былі выдача доўгатэрміновых пазык сялянам з мэтай куплі зямлі; дапамога памешчыкам у выгадным продажы зямлі сялянам па завышаных цэнах; банкаўская ацэнка прадаваемай зямлі. Да 1890 г. сялянскія таварыствы ў пяці беларускіх губернях набылі праз Сялянскі банк каля мільёна дзесяцін зямлі.

2. Аграрны крызіс 80-х гг. XIX ст. і змены ў спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі

У развіцці сельскай гаспадаркі Беларусі ў другой палове XIXст. трэба вылучыць два перыяды. Першы з іх ахоплівае 60-70-я гады, другі прыпадае на 80-90-я гады. Першы перыяд з'явіўся часам пакутлівага выспявання капіталістычных адносін, шырокім распаўсюджваннем адработачнай сістэмы, сутнасць якой заключалася ў апрацоўцы зямлі памешчыка сялянскім інвентаром за прадастаўленне яму ў арэнду ворыўнай зямлі і іншых угоддзяў.

Адработачная сістэма асабліва прыжылася ў Віцебскай і Магілёўскай губернях. У Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях памешчыкі шырока выкарыстоўвалі працу наёмных рабочых. Але і ў гэтых губернях адработкі займалі значнае месца, асабліва падчас збору збожжа і сенажаці. Трэба адзначыць, што ў цэлым тэхнічная ўзброенасць у земляробстве як у памешчыцкай, так і ў сялянскай гаспадарках амаль нічым не адрознівалася ад дарэформеннай. Нягледзячы на рэшткі феадальна-прыгонніцкіх адносін, капіталізм у сельскай гаспадарцы Беларусі развіваўся адносна хутка ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі. Гэтаму садзейнічалі развіццё прамысловасці, сістэмы капіталістычнага крэдыту, чыгуначнае будаўніцтва, рост гарадоў, канцэнтрацыя войскаў на тэрыторыі Беларусі. Усё гэта стварала спрыяльныя ўмовы таварнага земляробства і рынкавых адносін. Моцным каталізатарам эвалюцыі сельскай гаспадаркі Беларусі з'явіўся сусветны аграрны крызіс 80-90-х гадоў, які выклікаў рэзкае зніжэнне цэн на

хлеб. Крызіс прывёў да карэнных змяненняў у эканамічнай арганізацыі і тэхнічнай аснашчапасці сельскай гаспадаркі, да канчатковай перамогі таварнага зе мляробства і павелічэння рынкавага попыту.

Прычына крызісу: ўвоз у Еўропу таннага збожжа з Амерыкі, Канады, Аргенціны і Аўстраліі, гэта вызвала рэзкае падзенне цаны на збожжа. На Беларусі з 1881 да 1887 г. цэны на жыта знізіліся ў сярэднім у 2 разы.

Вынікі крызісу для Беларусі былі вызначальныя. Адбылася пераарыентацыя памешчыцкай гаспадаркі на вытворчасць жывёлагадоўчай прадукцыі. Для гэтага заводзілі жывёлу палепшаных парод. Пашырылася вытворчасць масла і сыру. Беларусь заняла трэцяе месца ў імперыі ў гэтай галіне вытворчасці. Памешчыкі пачалі шырока ўкараняць машынную тэхніку. Паскорыўся пераход да шматпольных севазваротаў, больш увагі надавалася несеннявodству.

Не ўсе памешчыцкія гаспадаркі здолелі выйсьці з крызіса, так у 1899 г. у банкі было закладзена 56,8% панскіх маёнткаў. У выніку памяньшалася дваранскае землеўладанне і павялічвалася сялянскае – за 1877-1905 гг. імі куплена 1,6 млн. дзесяцін. Паскорылася дыферэнцыяцыя сялян (10% – заможныя, сераднякі – 32%, беднота – 60% на пачатак XX ст.). Пашырылася здача ў арэнду дваранскай зямлі (у 1887 г. – 2,5 млн. дзесяцін).

Яшчэ больш выразнай стала спецыялізацыя сельскай гаспадаркі. Асноўныя галіны для Беларусі – малочная жывёлагадоўля, ільнаводства, бульбаводства. Ільнаводства было пашырана ў Віленскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях. Лён прадаваўся на ўнутраным рынку і за мяжой у Германіі, Аўстра-Венгрыі. Канапляводства было пашырана ў Магілёўскай губерні. Рынак збыту пянькі – Англія (праз Рыгу) і Германія (праз Польшчу і Лібаву). Бульбаводства пашыралася па ўсіх беларускіх губернях. Бульба ўжывалася ў ежу, была асноўнай сыравінай для вінакурнай прамысловасці. Гандлёвае агародніцтва і садоўніцтва існавала ў асобных гаспадарках памешчыкаў і заможных сялян і адыгрывала прыкметную ролю на мясцовым узроўні.

Пасля рэформы 1861 г. поспехі ў развіцці сельскай гаспадаркі стрымліваліся перажыткамі прыгонніцтва. Тым не менш, гаспадарка Беларусі здолела выйсці з ціскоў крызісу, знайсці сваё месца як ў расійскай, так і сусветнай гаспадарцы.

3.Сацыяльнае расслаенне сялянства і фарміраванне аграрнай буржуазіі.

Развіццё капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы ўзмацніла працэс сацыяльнага расслаення сялянства. З аднаго боку, расла колькасць заможных сялян, а з другога, павялічвалася маламаёмаснае сялянства. Надзельная зямля, атрыманая ў 60-х гадах па ўраўняльнаму прынцыпу, ужо к канцу 70-х гадоў была размеркавана нераўнамерна. Павялічылася колькасць беззямельных двароў. Малазямельыіыя і бсззямельныя сяляне, вымушаныя наймацца да памешчыкаў або да заможных сялян, па сутнасці, рабіліся наёмнымі сельскагаспадарчымі рабочымі.

Тысячы сялян-беднякоў ішлі ў адыходныя промыслы – набудаўніцтва чыгунак, на шахты Данбаса, на заводы прамысловых цэнтраў Расіі. Заможныя сяляне вялі сваю гаспадарку, выкарыстоўваючы наёмную працу, нярэдка спалучалі таварнае земляробства і жывёлагадоўлю з ліхвярскімі аперацыямі. Такі селянін выступаў і як капіталіст-фермер, і як гандляр, і як ліхвяр. Гэта сведчыла пра тое, што на Беларусі магчымы працэс фермерскага
("амерыканскага") шляху развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Аднак ажыццявіць гэта перашкаджала наяўнасць памешчыцкага землеўладання.

Захаванне буйнога памешчыцкага землеўладання, абеззямель-ванне сялян абумовілі і развіццё сялянскага руху Беларусі ў парэфор-менны час. Асноўнымі патрабаваннямі сялян былі вяртанне зямель, адрэзаных памешчыкамі падчас рэформы, памяншэнне падаткаў і павіннасцяў, пазбаўленне ад памешчыцкай апекі і саслоўнага нераўнапраўя. Дынаміка сялянскіх выступленняў была нераўна-мернай. Калі ў першыя гады пасля падаўлення паўстання 1863 г. адбыўся спад сялянскіх хваляванняў, то ў 70-х гг. наглядаўся іх значны пад'ём. Асаблівую вастрыню і размах сялянскі рух набыў у сярэдзіне 80-90 гг., калі побач з традыцыйнымі канфліктамі сялян з памешчыкамі, з'яўляюцца новыя – паміж сельскай буржуазіяй і беднатой. Своеасаблівай формай пратэсту быў масавы рух сялян, адзначаны найперш у Магілёўскай, Віцебскай губсрнях і асобных паветах Мінскай за перасяленне ў Сібір і паўднёвыя расійскія губерні.

Паступова элементы арганізаванасці і самасвядомасці пранікалі ў сялянскае асяроддзе, адбіваліся на светапоглядзе селяніна, узмацнялі ў ім пачуццё грамадзянскасці. Стандартным адказам мясцовай адміністрацыі на сялянскія хваляванпі было прыцягненне воінскіх каманд.

Тэма 33. Прамысловасць і гарады Беларусі ў другой палове XIX ст.

1. Спецыялізацыя прамысловасці і яе галіновая структура ў перыяд прамысловай рэвалюцыі

Пасля 1861 г. прамысловасць Беларусі пачала ўваходзіць ў трэцюю стадыю развіцця – фабрычна-заводскай вытворчасці (буйной машыннай індустрыі). Але важную ролю мелі іншыя формы вытворчасці.

Рамесная вытворчасць на Беларусі мела свае асаблівасці развіцця. Выросла прыкладна ў тры разы колькасць прадпрыемстваў (58,1 тыс.), рабочых (110 тыс.) і сумы вытворчасці (14,1 млн. руб.); адбывалася спецыялізацыя рамяства; побач з рамеснікам дзейнічаў пасрэднік – скупшчык.

Дробнакапіталістычныя прадпрыемствы (без паравых рухавікоў і з колькасцю наёмных рабочых ад 5 да 16 чалавек) пераважалі ў харчовай, гарбарнай і тэкстыльнай вытворчасці; выросла іх колькасць да 17,1 тыс.; колькасць рабочых і сума вытворчасці (44 млн. руб.) Да 90-х гг. Дробнакапіталістычныя прадпрыемствы вырабляліпалову прамысловай прадукцыі Беларусі.

Перавага дробнакапіталістычных прадпрыемстваў на Беларусі мела свае падставы. Гэта існаванне “мяжы аседласці яўрэйскага народа”. Яўрэі не мелі права валодаць зямлёй і пражываць на вёсцы, таму асноўнае іх заняцце – рамяство і дробны гандаль. Іншыя прычыны – адсутнасць на Беларусі буйных радовішчаў сыравіны для развіцця цяжкай прамысловасці; большая мабільнасць дробных прадпрыемстваў, што працавалі па перапрацоўцы мясцовай сельскагаспадарчай сыравіны; суседства Беларусі з буйнымі прамысловымі раёнамі царскай Расіі: Цэнтральным, Пецярбургскім, Прыбалтыйскім, Польскім, у якіх буйная прамысловасць пераважала над сярэдняй і дробнай.

Капіталістычная мануфактура – гэта прадпрыемствы з больш чым 16 рабочымі, дакладным падзелам працы, без паравых рухавікоў. На працягу разглядаемага перыяду выросла іх колькасць – з 140 да 760. На канец стагоддзя мануфактуры пераважалі ў гарбарнай, цагельнай, ганчарнай вытворчасці. Колькасць рабочых склала 28,8 тыс.

Фабрычна-завадская прамысловасць. Трэба выдзяліць два перыяды ў развіцці фабрычна-заводскай вытворчасці. 60-70-я гг. вызначаліся павольным ростам вытворчасці, панаваннем дробнатаварнай вытворчасці. 80-90-я гг. вызначаліся прамысловым пад’ёмам, ростам колькасці фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў.

Прамысловы пераварот (шырокае выкарыстанне паравых рухавікоў) пачаўся на Беларусі ў дарэформенны час. На Беларусі ён пачаўся ў металаперапрацоўчай і вінакурнай прамысловасці. Крычны спосаб атрымання жалеза быў заменены пудлінгавым у домнах. Прадпрыемствы з домнамі і паравымі рухавікамі – гэта Старынкаўскі чыгуналіцейны завод, Барысаўшчынскі металургічны завод, Налібоцкі металургічны камбінат. На першых двух да 1861 г. выраблялiся паравыя машыны. Асаблівасці прамысловага пераваротy на Беларусі: ён завяршыўся на 10 гадоў пазней, чым у Расіі, толькі ў канцы 90-х гг. бо асноўная колькасць буйных прадпрыемстваў была пабудавана ў 80-90-я гг., на сродкі акцыянерных кампаніі і банкаў. У 1890 г. фабрыкі і заводы Беларусі давалі 47,8% усёй прамысловай прадукцыі з рэгіёну, але захоўваўся нізкі ўзровень канцэнтрацыі вытворчасці, пераважалі малыя і сярэднія прадпрыемствы (да 50 рабочых). Прадпрыемстваў з колькасцю рабочых больш за 500 было толькі 1% (па Расіі 3,5%).

Акцыянерныя кампаніі з’явіліся як вынік канцэнтрацыі вытворчасці. На Беларусі да 1900 г. дзейнічала каля 10 акцыянерных таварыстваў, якія адкрывалі буйныя прадпрыемствы. У стварэнні акцыянерных кампаній актыўны ўдзел прымалі банкі, якія валодалі значнымі капіталамі. Галоўныя сферы ўкладання сродкаў для камерцыйных банкаў – гандаль, пярвічная апрацоўка лесу і льну. Найбольш уплывовыя банкі: Мінскі камерцыйны банк (1873 г.) – вядучы ў рэгіёне; Азова-Данскі камерцыйны банк (з 1871 г. філіялы ў Мінску, Магілёве, Пінску); Пецярбургска-Азоўскі банк у 90-я гг. меў аддзяленне ў Мінску; Дзяржаўны банк меў 5 аддзяленняў у губернскіх гарадах; Віленскі прыватна-камерцыйны банк (філіялы ў Бабруйску, Гомелі, Гродне і Слоніме); Камерцыйны банк у Беластоку.

Фабрычна-заводская прамысловасць садзейнічала росту гарадоў. Але буйныя прамысловыя цэнтры на Беларусі не сфарміраваліся. Беларуская прамысловасці спецыялізавалася на перапрацоўцы сельскагаспадарчай, лясной і мінеральнай сыравіны, прадпрыемствы размяшчаліся пераважна ў сельскай мясцовасці.

Галоўныя галіны вытворчасці на Беларусі – гэта харчовая (пераважна вінакурная) прамысловасць; дрэваапрацоўчая (запалкавая і папярова-друкарская); тэкстыльная; металаапрацоўчая прамысловасць разам з чыгуначнымі майстэрнямі; сілікатна-керамічная і будаўніча-рамонтная прамысловасць, выраб шкла; гарбарная; хімічная прамысловасць.

Прамысловасць Беларусі знаходзілася ў залежнасці ад сусветных эканамічных крызісаў. Пад час крызісаў 1873-1875 і 1881-1882 гг. на Беларусі найбольшыя страты панеслі дробная вытворчасць і мануфактуры, але фабрычна-заводская прамысловасць не была закранута. Крызісы з'явіліся штуршком да замены дробнай і мануфактурнай прамысловасці фабрычнай. Бурны прамысловы ўздым прыйшоўся на 90-я гг. Пад час яго сярэднегадавыя тэмпы прыросту прадукцыі склалі 8,2%. Асабліва хутка развівалася буйная прамысловасць (рост на 13,3%). З 1890 да 1900 г. узнікла 16 тыс. новых прадпрыемстваў; удзельная вага беларускай прамысловасці ў прамысловасці Расіі склала каля 5%, колькасць рабочых 10%. У цэлым прамысловасць Беларусі ў параўнанні з іншымі раёнамі Расіі дасягнула сярэдняга ўзроўню развіцця.

2. Рост гарадоў. Мястэчкі. Транспарт. Гандаль. Крэдыт. Фарміраванне адзінага эканамічнага рэгіёна.

Тэмпы ўрбанізацыі ў Беларусі былі даволі інтэнсіўнымі. Гарадское насельніцтва за другую палову XIX ст. павялічылася ў 2,2 раза. Гарадское насельніцтва ў 1858 г. склала 293,6 тыс. чалавек (9% ад агульнай колькасці жыхароў), а ў 1897 г. – 655,1 тыс. чалавек (10,3%). Каля 500 тыс. чалавек жыло ў канцы XIX ст. у мястэчках Беларусі. Інтэнсіўна працэсы ўрбанізацыі праходзілі ў 60-х – першай палове 80-х гг., калі гарадское насельніцтва павялічвалася за кошт шляхты, абеззямеленага сялянства і выгнаных з сельскіх паселішчаў яўрэяў. У другой палове 80-90-х гг. назіралася змяншэнне тэмпаў росту гарадоў, што было звязана з іх перанаселенасцю, складанасцямі пераарыентацыі іх гандлёва-прамысловай спецыялізацыі на агульнарасійскі рынак.

Абмежаванні ў рассяленні яўрэяў прывялі да штучнай канцэнтрацыі іх у гарадах і мястэчках Беларусі і дэфармавалі нацыянальны і часткова саслоўны склад насельніцтва. Гэтая сітуацыя ўскладнялася адноснай слабасцю і невялікімі патрэбамі гарадской прамысловасці ў наёмнай рабочай сіле. Сотні тысяч беларускіх сялян вымушаны былі знаходзіць сабе працу на прадпрыемствах і гаспадарках у сельскай мясцовасці ці перасяляцца ў іншыя рэгіёны Расійскай імперыі.

Працэсы горадаўтварэння найбольш інтэнсіўна ішлі ў цэнт-ральнай і заходняй частках Беларусі, што ў значнай меры было звязана з

чыгуначным будаўніцтвам і больш цеснымі сувязямі з агульна-расійскім і замежным рынкамі. Эканамічная інтэграцыя беларускіх гарадоў у сістэму агульнарасійскага рынку больш заўважна пачала рэалізоўвацца ў 80-90-х гг. XIX ст. У выніку пераарыентацыі гаспадарчых сувязяў Беларусі з Польшы на Расію знікла фактычна традыцыйная структура гарадскіх цэнтраў, узнікла новая, арыентаваная на агульнарасійскія эканамічныя патрэбы. Адна з прычын гэтага – інтэнсіўнае чыгуначнае будаўніцтва. Беларускія гарады станавіліся важнымі вузламі пасрэдніцкага гандлю. Прычым іх значэнне ў азначанай сферы было вышэй, чым у прамысловай, гандаль прыносіў большыя прыбыткі. Прамысловасць Беларусі наогул развівалася ў адпаведнасці з попытам мясцовага рынку, без уздзеяння мэтанакіраванай урадавай палітыкі. Яшчэ адной асаблівасцю урбанізацыйных працэсаў на Беларусі ў XIX – пачатку XXстст. з'яўляецца адсутнасць буйных гарадскіх цэнтраў. У канцы XIX ст. толькі ў Мінску і Віцебску налічвалася ад 50 да 100 тыс. жыхароў, а Брэст, Гродна, Гомель, Магілёў мелі ад 20 да 50 тыс. жыхароў.

Прамежкавае становішча паміж горадам і вёскай займалі мястэчкі. Яны не мелі заканадаўча аформленага дакладнага вызначэння. Гэта была спецыфічная з'ява, характэрная для заходніх губерняў Расійскай імперыі. Каля паловы мястэчак знаходзілася на тэрыторыі Беларусі. Тут пераважалі па колькасці дробныя мястэчкі (да 2 тыс. жыхароў), але налічвалася каля ста населеных пунктаў з насельніцтвам ад 2 да 5 тыс. чалавек і нават вышэй.

У 80-х гг. XIX ст. з'явілася неабходнасць размежавання мястэчак і сельскіх паселішчаў у сувязі з забаронай у 1882 г. яўрэям сяліцца па-за межамі гарадоў і мястэчак. Мястэчкі мелі пераважна прыватна-ўласніцкі характар і шматэтнічны склад насельніцтва. 82,5% мястэчак Беларусі ў пачатку 60-х гг. знаходзілася на памешчыцкіх землях, астатнія – на дзяржаўных, у той час як вёскі стаялі пераважна на сялянскіх землях. У 1863 г. для мяшчан замест падушнага падатку быў уведзены падатак з нерухомай маёмасці.

Разам з мяшчанамі гэты падатак павінны былі плаціць таксама і жыхары (у тым ліку сяляне) мястэчак. Акрамя таго, пасля 1875 г. з'явілася местачковае мяшчанскае самакіраванне. У пачатку 60-х гг. у беларускіх губернях налічвалася 418 мястэчак, у канцы стагоддзякаля 320. Мястэчкі адыгрывалі значную ролю ў эканамічным жыцці. Каля паловы ўсіх занятых у сферы прамысловасці Беларусі канцэнтравалася ў мястэчках, у гарадах – прыкладна 30% , у сельскіх населеных пунктах – каля 18% .

Транспартная сетка на Беларусі ў гэты перыяд складалася з водных шляхоў, сухапутных шасэ, чыгунак.

Чыгуначнае будаўніцтва пачалося ў 60-я гг. Як вынік – паскорылася развіццё прамысловасці, пашырыўся гандаль, вырасла таварнасць сельскай гаспадаркі, пашырыўся тэхнічны прагрэс, паскорылася спецыялізацыя эканомікі раёнаў, сфарміраваліся ўсерасійскі і абласныя рынкі, акрэсліўся грамадскі падзел працы, больш актыўнай стала міграцыя насельніцтва.

Пецярбургска-Варшаўская чыгунка – першая на Беларусі (прайшла праз Гродна ў 1862 г.). У 1866 г. адкрыты Дзвінска-Полацка-Віцебскі ўчастак Рыга-Арлоўскай чыгункі працягласцю 245 вёрстаў. Чыгунка склала значную

канкурэнцыю суднаходству па Заходняй Дзвіне, паскорыла эканамічнае развіццё рэгіёну. Маскоўска-Брэсцкая чыгунка (70-я гг.) – важнейшая ў эканамічных і ваенных адносінах. Лібава-Роменская чыгунка (1871-1874 гг.) прайшла праз Вільню, Маладзечна, Мінск, Асіповічы, Бабруйск, Жлобін. Мела важнае эканамічнае значэнне. Прывіслінская чыгунка (1873 г.) прайшла праз Брэст на Кіеў. Палескія чыгункі (80-я гг.) складаліся з некалькіх ліній, звязалі Пінск, Жабінку, Лунінец, Гомель, Беласток, Баранавічы, Бранск, Асіповічы, Старыя Дарогі паміж сабой і раней пабудаванымі чыгункамі. Мелі важнае эканамічнае значэнне. Пецярбургска-Адэская чыгунка (1902 г.) прайшла праз Віцебск, Оршу, Магілёў, Жлобін.

У пачатку XX ст. Беларусь была на адным з першых месцаў па насычанасці чыгункамі ў Расіі. Узніклі буйныя чыгуначныя вузлы: Мінск, Віцебск, Гомель, Орша, Брэст, Баранавічы.

Водныя шляхі зносін атрымалі другараднае значэнне. Тым не менш, грузапаток на іх таксама павялічваўся. Па Прыпяці, Бярэзіне, Сожы плавала ў 1900 г. 310 непаравых і 23 паравыя судны. Хутка развівалася паравое суднаходства на Немане і Заходняй Дзвіне.

У гандлі на гэты час памяншацца роля кірмашоў, расце роля крамнага і магазіннага гандлю, у канцы XIX ст. склаліся мясцовыя (абласныя) рынкі. Цэнтрамі абласных рынкаў становяцца найбольш буйныя гарады: Мінск, Віцебск, Магілёў, Гомель, Гродна, Брэст і Пінск. Характар сувязяў паміж рынкамі вызначаўся асаблівасцю эканамічнага развіцця (спецыялізацыяй) кожнага з раёнаў. Да пачатку XX ст. Беларусь мела трывалыя гандлёвыя сувязі з рознымі рэгіёнамі Расіі, стала часткай усерасійскага рынку. Для гандлю Беларусі была характэрна перавага вывазу сельскагаспадарчай сыравіны і лясных матэрыялаў, увоз прамысловых тавараў і збожжа.

Развіццё капіталістычных адносін стымулявала сацыяльныя працэсы – фарміраванне грамадскіх класаў буржуазіі і пралетарыяту. Крыніцы фарміравання прамысловай буржуазіі – гэта: дваране (уладальнікі вінакурань, лесапільных, цукровых, крухмала-патачных, мукамольных, вінакурных, смола-шкіпідарных, суконных, металаапрацоўчых, цагельных, кафляных, шкляных і іншых прадпрыемстваў); заможныя мяшчане (гандляры-скупшчыкі), што арандавалі і выкуплялі прамысловыя прадпрыемствы; купцы; заможныя рамеснікі; сяляне (валодалі 16 мануфактурамі і фабрыкамі ў харчовай, гарбарнай, тэкстыльнай, дрэваапрацоўчай і сілікатнай галінах).

Згодна з перапісам 1897 г. ў пяці заходніх губернях да дробнай буржуазіі адносіліся 103 тыс. чал., сярэдняй 47 тыс., буйной 33 тыс. чал. Па нацыянальным складзе гэта яўрэі – 60%, беларусы – 17%, рускія – 10%, палякі – 10%, іншыя нацыянальнасці да 3%.

Асноўныя крыніцы фарміравання пралетарыяту – гэта: збяднелыя сяляне; члены сем'яў рабочых; рамеснікі; дробныя гандляры; рабочыя рамесных майстэрань і мануфактур.

У трох апошніх катэгорыях пераважалі прадстаўнікі яўрэйскага насельніцтва, гэта адбілася на нацыянальным складзе пралетарыяту. Увогуле, асаблівасць беларускага пралетарыяту – яго шматнацыянальны склад (беларусы, рускія, палякі, яўрэі, украінцы, літоўцы, латышы, татары). Сярод

рабочых чыгуначных майстэрань і дэпо, паравозных машыністаў, тэлеграфістаў пераважалі рускія. На лесапавале, будаўніцтве і рамонце чыгуначных і шашэйных дарог, прамысловых прадпрыемствах у сельскай мясцовасці працавалі перважна беларусы. У запалкавай, тытунёвай, гарбарна-абутковай галінах вытворчасці, у друкарнях пераважалі яўрэйскія рабочыя.

На пачатак XX ст. на Беларусі было 178,8 тыс. рабочых, занятых у прамысловасці, у тым ліку 33,6 тыс. у фабрычна-заводскай і 116,3 тыс. у рамеснай і дробна-капіталістычнай вытворчасці. Акрамя таго, у памешчыцкіх і кулацкіх гаспадарках працавала шмат батракоў. Усяго на Беларусі налічвалася прыкладна 400 тыс. пастаянных наёмных работнікаў.

У сярэдзіне XIX ст. пачалі з'яўляцца на тэрыторыі Беларусі крэдытныя кааператывы, аб'яднанні дробных гандляроў, рамеснікаў, сялян і г. д. У 1870 г. У Гомелі, а затым у 1874 г. – у Полацку, 1882 г. – у Віцебску былі адкрыты гарадскія грамадскія банкі, якія належалі органам гарадскога самакіравання. У 1873 г. быў створаны першы прыватны банк на тэрыторыі Беларусі – Мінскі камерцыйны. Ён займаўся пераважна крэдытаваннем гандлю сельскагаспадарчай прадукцыяй, лесам. Аддзяленні банка дзейнічалі ў Гомелі, Магілёве, а таксама за межамі Беларусі – у Лібаве, Навазыбкаве. У 1881-1884 гг. у Мінску, Віцебску, Магілёве, Гродне пачалі дзейнічаць аддзяленні Дзяржаўнагабанка Расіі, якія крэдытавалі багатых кліентаў. Ва ўсіх беларускіх губернях дзейнічалі аддзяленні Дваранскага зямельнага банка, які быў створаны для льготнага крэдытавання памешчыкаў пад заклад зямлі і будынкаў. У Мінску, Віцебску і Магілёве былі адчынены аддзяленні Сялянскага зяме льнага банка, куды, як і ў Дваранскі зямельны банк, доступ мелі асобы праваслаўнага веравызнання. У 1874 г. з'явіліся Мінскае і Магілёўскае таварыствы ўзаемнага крэдыту, да капца XIX ст. іх колькасць павялічылася да 9.

Асобныя з іх мелі не меншы аб'ём аперацый, чым філіялы буйных агульнарасійскіх банкаў. Па крэдытных аперацыях у сярэдзіне XIX ст. Беларусь залежала ад Германіі і яе пасрэдніцы Польшчы. У апошняй чвэрці XIX ст. асноўны накірунак унлыву ў крэдытнай сферы перамясціўся з захаду на ўсход. У гэты час ужо склалася агульнарасійская крэдытная сістэма. У 90-х гадах XIX ст. у гарадах Беларусі пачалі працаваць аддзяленні Маскоўскага міжнароднага гандлёвага банка (Віцебск, Брэст), Пецярбургска-Азоўскага (Мінск), Арлоўскага (Гомель, Орша, Бабруйск), Паўднёва-Рускага (Магілёў), Віленскага (Бабруйск), Паўднёвага (Гродна) камерцыйных банкаў. Усе беларускія губерні былі ўключаны ў раён дзейнасці Віленскага зямельнага банка. Акрамя таго, Віцебская, Магілёўская і Мінская губерні ўваходзілі ў сферу ўплыву Маскоўскага, а Віленская і Гродзенская – падпадалі над уплыў Пецярбургска-Тульскага зямельных банкаў.

Пасля сялянскай рэформы да пачатку XX ст. капіталістычны спосаб вытворчасці паступова ўсталёўваўся ва ўсіх галінах гаспадаркі Беларусі.

Тэма 34. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі ў 60-90 гг. XIX ст.

1. Ідэалогія монархізму. “Заходнерусізм”. Станаўленне ліберальнай думкі. Рэвалюцыйна-дэмакратычная думка.

У другой палове XIX - пачатку XX стст. формай этнічнай самасвядомасці некаторай часткі гарадскога насельніцтва, асабліва ва Усходняй Беларусі (праваслаўная інтэлігенцыя, чыноўнікі, святары і інш.), быў "западнорусизм". У пачатку XX ст. ён стаў ідэалогіяй вялікадзяржаўна-чарнасоценнага руху, які вёў актыўную барацьбу супраць беларускага нацыянальнага адраджэння.Сярод прыхільнікаў гэтай ідэалогіі вылучыліся дзве плыні:больш памяркоўная, ліберальная (М. Каяловіч, А. Пшчолка) і кансерватыўная (К.Гаворскі). Лібералы –"западнорусы" зрабілі шмат для даследавання нацыянальнай спадчыны беларусаў і першыя звярнулі ўвагу ўрадавых колаў на тое, што Беларусь, насуперак панаваўшаму ў той час меркаванню, не з'яўляецца часткай Польшчы. Прыхільнікі кансерватыўнай плыні лічылі этнічныя асаблівасці беларусаў лакальна-дыялектнымі і вынікам польска-каталіцкай экспансіі, вартымі знішчэння для аднаўлення "рускага" характару краю.

“Западнороссы” прызнавалі беларусаў народнасцю, але разглядалі іх як складовую частку рускага народа, у які ўключалі яшчэ вялікарусаў і ўкраінцаў. Галоўнай сваёй мэтай“западнорусизм” лічыў барацьбу супраць польскага і каталіцкага ўплыву на беларусаў. Актыўным дзеячам і ідэолагам “западнорусизма” быў Л. Саланевіч. Ён з’яўляўся адным з арганізатараў “Белорусского общества”, выдаваў газеты “Белорусская жизнь” (1909 – 1911 гг.) і “Северо-западная жизнь” (1911 – 1915 гг.). Л. Саланевіча актыўна падтрымліваў П.А. Сталыпін.

У другой палове 1880-х– 1890-я гг. пануючым накірункам у народніцтве з’яўляўся ліберальны. Ліберальныя народнікі адмовіліся ад рэвалюцыйных метадаў барацьбы і галоўную ўвагу звярнулі на рэфармаванне зямельнага заканадаўства з мэтай павялічыць сялянскае землеўладанне і захаваць абшчыну ў вёсцы. Гэтым яны спадзяваліся вырашыць аграрную праблему. Разам з тым беларускія ліберальныя народнікі цікавіліся гісторыяй і культурай свайго краю, спрыялі развіццю нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

У другой палове 1880-х гадоў у Мінску ўзнікла група ліберальнай інтэлігенцыі (М.В.Доўнар-Запольскі, У.З.Завітневіч, А.І.Слупскі, Я.Лучына) якія імкнуліся абудзіць нацыянальную самасвядомасць легальнымі сродкамі. Для гэтага выкарыстоўвалася першая прыватная (недзяржаўная) газета на Беларусі “**Мінскі лісток**” і календары. На іх старонках друкаваліся матэрыялы А.Багдановіча, І.Янчука, М.Доунар-Запольскага пра гісторыю, мову, беларускі этнас, а так сама літаратурныя творы Янкі Лучыны і Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Гэтыя выданні па сведчанні сучаснікаў, абудзілі беларускі нацыянальны рух. Да з’яўлення “Мінскага лістка” перыядычны друк Беларусі быў прадстаўлены толькі ўрадавымі “Губернскімі ведамасцямі...” і “Епархіальнымі ведамасцямі”, якія кантралявала праваслаўная царква.

2. Вытокі ідэалогіі беларускага нацыянальнага руху. Польскі і яўрэйскі нацыянальныя рухі.

Позняе ўзнікненне і параўнальная слабасць беларускага нацыянальнага руху былі абумоўлены, сярод іншага, слаба развітай нацыянальнай беларускай самасвядомасцю часткі насельніцтва. Яшчэ ў 1-й палове XIX ст. Цэнтральную і За-ходнюю Беларусь нярэдка называлі Літвой. Толькі ў 2-й палове XIX ст. назва "Беларусь" замацавалася за ўсёй яе сучаснай тэрыторыяй. Адпаведна, мясцовыя саманазвы ("ліцвіны", "тутэйшыя") былі выціснуты этнонімам "беларусы". Перапіс 1897 г. засведчыў, што большасць жыхароў Беларусі ўжо засвоіла і трымалася яго.

Беларускі нацыянальны рух стаў прыкметны ў сярэдзіне XIX ст. Паўстанне стала прыкметным этапам у распаўсюджанні ідэй беларускага нацыянальнага руху. Упершыню ж тэарэтычнае абгрунтаванне існавання асобнага беларускага этнасу было распрацавана бела-рускімі народнікамі. У двух нумарах свайго часопіса "Гоман", якія выйшлі ў 1884 г. у Санкт-Пецярбургу, а таксама ў іншых пу.бліцыстычных творах яны прапанавалі цэльны, канцэптуальны погляд на Беларусь і беларускі народ, іх мінулае, сучасны стан і будучыню.

Толькі ў 1902 годзе ў Пецярбургу ўзнікла сацыялістычная нацыянальная беларуская партыя – Беларуская рэвалюцыйная грамада, якая ў 1903 годзе была перайменавана ў Беларускую сацыялістычную грамаду – БСГ. Заснавалі партыю прадстаўнікі беларускай студэнцкай моладзі – браты Іван і Антон Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі, А.Бурбіс, К.Кастравіцкі, В.Іваноўскі, А.Пашкевіч і інш. у сваёй праграмме партыя выступала за звяржэнне самадзяржаўя, змену капіталізму сацыялістычным ладам, за беларускую культурна-нацыянальную аўтаномію ў складзе дэмакратычнай Расіі з мясцовым сеймам у Вільні. Прыватная маёмасць на зямлю павінна быць адменена і праведзена ўраўняльнае землеразмеркаванне сярод сялян. БСГ супрацоўнічала з ППС, эсэрамі і Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыяй.

Грамадой была заснавана газета "Наша ніва", якая на пачатку XX ст. была самым аўтарытэтным цэнтрам беларускага нацыянальнага адраджэння, асяродкам нацыянальнай інтэлігенцыі. Публікацыя твораў на беларускай мове была фактычна забаронена. Выключэнне складалі толькі этнаграфічныя матэрыялы.

У другой палове 1890-х гг. сярод сацыял-дэмакратаў шматнацыянальных заходніх губерняў пераважала тэндэнцыя да стварэння рабочых арганізацый па нацыянальнай прыкмеце. Такую пазіцыю заняла ЛСДП. Узаемадзеянне з расійскім пралетарыятам адмаўляла Польская сацыялістычная партыя (ППС). У верасні 1897 г. на з’ездзе яўрэйскіх сацыял-дэмакратычных арганізацый у Вільні ўтварыўся Бунд – Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі. Яго лідэрам стаў А. Крэмер. Бунд лічыў, што абараніць інтарэсы яўрэйскіх рабочых можа толькі іх нацыянальная арганізацыя. Але з пазіцыяй Бунда пагадзіліся не ўсе яўрэйскія рабочыя арганізацыі.

На тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст. дзейнічалі невялікія групы Сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ), створанай у 1900 г. на з'ездзе прадстаўнікоў РСЛ і сацыял-дэмакратаў Польшчы. Яе кіраўнікамі былі Ф. Дзяржынскі і С. Трусевіч. СДКПіЛ падзяляла ідэі рэвалюцыйнай палітычнай барацьбы пралетарыяту і імкнулася да аб'яднання з РСДРП. У 1902 г. была ўтворана ППС у Літве. Яна склалася з груп ППС, якія дзейнічалі на тэрыторыі Літвы і Заходняй Беларусі. Гэтая партыя грунтавалася на леванародніцкіх ідэалах сацыялізму, выступала за незалежнасць Беларусі і Літвы.

3. Вытокі і сутнасць народніцтва. Народніцкія арганізацыі на Беларусі. Група "Гоман".

У 1870-х гг. самым радыкальным кірункам апазіцыйнай грамадскай думкі ў Расіі было народніцтва. Ідэалагічна яно грунтавалася на тэорыі сялянскага сацыялізму, заснавальнікамі якой былі А. Герцэн і М. Чарнышэўскі. Народнікі лічылі, што Расія мае магчымасць пазбегнуць капіталістычнай стадыі развіцця і, абапіраючыся на сялянскую абшчыну, перайсці адразу да сацыялізму. Сваіх прыхільнікаў народніцтва знайшло перш за ўсё сярод разначыннай інтэлігенцыі.

З самага пачатку ў народніцтве існавалі дзве плыні – рэвалюцыйная і рэфарматарская. Прадстаўнікі першай асноўным сродкам дасягнення сваіх мэт лічылі сялянскую рэвалюцыю і рабілі ўсё магчымае, каб падштурхнуць сялян да рашучай барацьбы супраць самадзяржаўя і перажыткаў прыгонніцтва.

Памяркоўныя народнікі хацелі перайсці да сацыялізму шляхам паступовага рэфармавання існуючага ладу Расіі. Народніцкі рух у Беларусі быў ідэйна і арганізацыйна звязаны з агульнарасійскім. Сярод вядомых расійскіх народнікаў 1870-х гг. былі ўраджэнцы Беларусі М. Судзілоўскі, С. Кавалік, І. Грынявіцкі, Р. Ісаеў, К. Брэшка-Брэшкоўская, А. Бонч-Асмалоўскі. У другой палове 1870-х – пачатку 1880-х гг. у Мінску, Магілёве, Гродне, Віцебску, Пінску, Оршы, Слуцку і іншых гарадах Беларусі дзейнічалі народніцкія гурткі. Іх наведвалі ў першую чаргу навучэнцы, якія пад выглядам самаадукацыі вывучалі забароненую літаратуру; меліся спробы весці агітацыю сярод сялян. Магчымасці гэтых гурткоў былі вельмі абмежаваныя. Іх удзельнікі не бачылі асаблівасцей гістарычнага, сацыяльна-эканамічнага і нацыянальнага развіцця краю.

Калі летам 1879 г. пецярбургская арганізацыя "Зямля і воля" раскалолася на "Народную волю" і "Чорны перадзел", большасць народнікаў у Беларусі падтрымала "Чорны перадзел", які кіраваўся старой прапагандысцкай тактыкай. У 1879 і 1880 гг. у Беларусь двойчы прыязджаў лідэр "Чорнага перадзелу" Г.В. Пляханаў. У сваёй дзейнасці народавольцы рабілі стаўку на індывідуальны палітычны тэрор супраць прадстаўнікоў улады. 1 сакавіка 1881 г., пасля некалькіх няўдалых спроб, яны забілі Аляксандра II. Бомбу ў цара кінуў ураджэнец Мінскай губерні І. Грынявіцкі. Кіраўнікі "Народнай волі" спадзяваліся, што забойства цара з'явіцца сігналам да народнага паўстання ў Расіі. Аднак паўстанне не адбылося, а рэпрэсіі супраць

рэвалюцыянераў у хуткім часе прывялі да знішчэння цэнтральных і многіх правінцыяльных Арганізацый “Народнай волі”.

У першай палове 1880-х гг. у Пецярбургу існавалі студэнцкія гурткі народавольніцкага і ліберальна-асветніцкага кірункаў, удзельнікамі якіх былі выхадцы з Беларусі. Падпольна яны выдалі некалькі публіцыстычных твораў, напісаных на рускай мове. У 1884 г. члены групы “Гоман”(А. Марчанка, Х. Ратнер і інш.) выступілі з ініцыятывай аб’яднання ўсіх народніцкіх гурткоў Беларусі. Яны выдалі два нумары гектаграфічнага часопіса “Гоман” (на рускай мове). Гоманаўцы аб’явілі сябе“Беларускай сацыяльна-рэвалюцыйнай групай”. Іх ідэалам была вольная ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту Расія, пабудаваная на аснове федэрацыі самакіруемых абласцей. Яны мелі сувязі з народніцкімі гуркамі Мінска, Віцебска, Магілёва, але аб’яднаць усіх рэвалюцыйных народнікаў Беларусі ў той час не здолелі.

4. Эвалюцыя рабочага руху. Распаўсюджанне марксізму.

Пасля рэформы 1861 г. у Беларусі значна паскорыўся працэс фарміравання класа наёмных рабочых. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх губерняў: адсутнасць буйных і перавага дробных рамесных прадпрыемстваў з невялікай колькасцю працуючых на іх рабочых, сялянскае малазямелле і мноства яўрэйскай беднаты ў горадзе – стваралі лішак рабочай сілы і пашыралі магчымасці эксплуатацыі пралетарыяту. Заработная плата беларускіх рабочых у параўнанні з агульнарасійскім паказчыкам у канцы XIX– пачатку XX ст. была амаль на1/3 ніжэй. У першыя два дзесяцігоддзі пасля адмены прыгонніцтва ўмовы працы рабочых ніяк не рэгламентаваліся, адсутнічала іх сацыяльная абарона. Тым не менш выступленняў рабочых у Беларусі было няшмат. У 1870-я гг. іх зарэгістравана 7, у 1880-я – 10. Толькі ў 1890-я гг. пачаўся ўздым стачачнай барацьбы (адбылося 59 выступленняў, прычым 53 з іх – у другой палове дзесяцігоддзя). Паступова рабочы рух стаў больш арганізаваным і ў канцы XIX ст. вылучыўся ў самастойную плынь.

У гэты ж час ідэалогія народніцтва пачала саступаць месца марксізму. Першае знаёмства з марксісцкай літаратурай адбылося яшчэ ў гуртках народнікаў. Узнікненне самастойнага сацыял-дэмакратычнага руху ў Беларусі звязана з дзейнасцю польскай партыі “Пралетарыят” (утварылася ў 1882 г.) і пляханаўскай групы “Вызваленне працы” (утворана ў1883 г. у Швейцарыі).

Прыхільнікі марксізму верылі ў непазбежнасць гібелі капіталістычнага ладу, лічылі пралетарыят галоўным рэвалюцыйным атрадам, увасабленне дыктатуры якога - вызначыць шлях да перамогі сацыялістычнага грамадства.

У другой палове 1880-х– пачатку 1890-х гг. у некаторых гарадах Беларусі былі арганізаваны гурткі, у якіх вывучалі працы К. Маркса, Ф. Энгельса і іх паслядоўнікаў. Першыя марксісцкія гурткі ў Беларусі былі нешматлікія і амаль не звязаныя з масавым рабочым рухам. Аднак ужо з сярэдзіны 1890-х гг. у сацыял-дэмакратычным руху Расіі адбыліся значныя змены. Пачаўся пераход ад вузкай гуртковай прапаганды марксізму да масавай

эканамічнай і палітычнай агітацыі. У Беларусі гэтаму пераходу садзейнічала рукапісная брашура А. Крэмера“Аб агітацыі”(1893).

У верасні 1897 г. у Вільні адбыўся з'езд прадстаўнікоў яўрэйскіх сацыял-дэмакратычных арганізацый Вільні, Мінска, Віцебска, Беластока і Варшавы, на якім утварыўся Бунд - Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Полыпчы і Расіі.

ў Мінску ў пачатку сакавіка 1898 г. быў скліканы з'езд прадстаўнікоў пецярбургскага, маскоўскага, кіеўскага і екацярынаслаўскага "Саюзаў барацьбы", кіеўскай "Рабочай газеты" і Бунда. З'езд прыняў рашэнне аб аб'яднанні прадстаўленых на ім арганізацый у Расійскую сацыял-дэмакратычную рабочую партыю. У 1903 г. спачатку ў Бруселі, а потым у Лондане адбыўся II з'езд РСДРП, які прыняў Першую праграму партыі. Канчатковай мэтай расійскіх сацыял-дэмакратаў абвяшчалася пабудова сацыялістычнага фамадства праз пралетарскую рэвалюцыю і дыктатуру пралетарыяту.

З'езд раскалоўся на дзве фракцыі - бальшавікоў і меншавікоў, якія мелі спачатку розныя погляды на тактычныя і арганізацыйныя пытанні. А потым яны склалі два напрамкі, фактычна дзве партыі ў расійскай сацыял-дэмакратыі.

Тэма 35. Культура Беларусі ў 60-90 гг. XIX ст. і фарміраванне беларускай нацыі

1. Умовы ўтварэння беларуская нацыі. Фарміраванне этнічнай тэрыторыі. Агульнасць эканамічнага жыцця. Сацыяльна-класавыя асаблівасці. Этнічная самасвядомасць.

Дзейнасць даследчыкаў і культурна-асветніцкіх гурткоў паспрыяла росту этнічнай самасвядомасці беларусаў у другой палове XIX стагоддзя. Так, згодна з дадзенымі ўсерасійскага перапісу 1897 года (нацыянальная прыналежнасць вызначалася па роднай мове) 74% насельніцтва беларускіх губерняў лічылі роднай мовай беларускую, у тым ліку 43% дваран лічылі сябе беларусамі. Да гэтага часу зніклі такія варыянты саманазваў беларусаў як “чорнарусы”, “ліцвіны”. Аднак і саманазва “беларусы” яшчэ не была трывалай. Вялікую ролю адыгрывалі канфесіянізмы – калі этнічная прыналежнасць вызначалася ад канфесійнай прыналежнасці (католік – значыць “паляк”, а праваслаўны – гэта “рускі”). Перашкаджала нацыянальнай кансалідацыі палітыка царскага ўрада на асіміляцыю беларусаў. Так, на працягу другой паловы XIX стагоддзя вага “рускага” насельніцтва павялічылася ў 12 разоў і склала на 1897 год 3,6% жыхароў Беларусі. Русіфікацыя закранула пануючыя саслоўі – дваран і буржуазію, духавенства. Найбольш інтэнсіўна гэты працэс ішоў у гарадах.

Тэрыторыя пераважнага рассялення беларусаў уваходзіла ў межы пяці губерняў так званага Паўночна-заходняга края – Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай. Згодна з перапісам 1897 года

насельніцтва Беларусі ў яе сучасных межах налічвала 6.387 тыс. чалавек. Але згодна з дадзенымі тагож перапісу былі паветы ў Смаленскай, Чарнігаўскай, Ковенскай і інш. губернях, дзе пераважную большасць (болей за 50%) складала беларускае насельніцтва. Асаблівасцю нацыянальнага складу жыхароў Беларусі было тое, што беларусы жылі пераважна ў сельскай мясцовасці. Гарадское насельніцтва было пераважна яўрэйскім (дзяржаўныя законы Расійскай імперыі забаранялі ім пасяляцца ў сельскай мясцовасці а так сама за межамі губерній, уключаных у "мяжу аседласці"), а так сама рускім і польскім. Па сутнасці, не існавалі ні беларускай прамысловай буржуазіі (яна яўрэйская і польская), ні беларускага прамысловага пралетарыята (ён пераважна яўрэйскі, рускі і польскі). Толькі сельская буржуазія была амаль выключна беларускай (але яшчэ не ўсведамляла нацыянальнага адзінства, бо была падзелена па рэлігійных прыкметах) і сельскі пралетарыят (батракі) – так сама быў беларускім па складзе. Вядома, гэта вельмі адмоўна сказалася на тэмпах і характары культурнага адраджэння беларускай нацыі.

Беларуская нацыянальная інтэлігенцыя была нешматлікай і неўплывовай. Адсутнічала пераемнасць паміж рознымі яе пакаленнямі – гэта было вынікам рэпрэсій супраць удзельнікаў паўстанняў і тайных таварыстваў, масавай эміграцыі, ссылак. Тым не меньш, пэўную эвалюцыю можна праследзіць – ад "краёвага" патрыятызму прафесараў Віленскага ўніверсітэта, студэнтаў-філаматаў да лібералізму дзеячаў сярэдзіны стагоддзя (А.Кіркор, В.Дуніна-Марцінкевіча), дэмакратычных поглядаў і ўсведамлення нацыянальных беларускіх інтарэсаў у К.Каліноўскага, В.Урублеўскага, гоманаўцаў, Ф.Багушэвіча. адной з асноўных прыкмет нацыі з'яўляецца існаванне развітай літаратурнай мовы. Станаўленне беларускай мовы адбывалася на рубяжы XIX-XX стагоддзяў. З сярэдзіны XIX стагоддзя рабіліся спробы напісаць граматыку мовы – П.Шпілеўскім у 1846 і К.Нядзвецкім у 1854 гадах. Аднак рукапісы не былі надрукаваны. У 1862 годзе А.Аскерка, мінскі маршалак, выдаў у Варшаве беларускі буквар (лемантар). Тармазіла развіццё правіл пісьмовай мовы тое, што выкарыстоўвалася пісьменнікамі як кірылічны, так і лацінскі алфавіты. Толькі ў пачатку XX стагоддзя са з'яўленнем газеты "Наша ніва" і пашырэннем магчымасцяў для беларускага друку, выпрацоўка навуковай тэрміналогіі і вырміраванне літаратурнай мовы паскорылася.

Супрацьстаяла стварэнню беларускай нацыі і афіцыйная ідэалогія "заходнерусізму". Распрацаваная ў сярэдзіне XIX стагоддзя праваслаўнымі дзеячамі І.Сямашкай і М.Каяловічам яна сцвярджала, што беларусы, як і ўкраінцы і вялікарусы – частка адзінай рускай нацыі. Беларусы маюць толькі нязначныя лакальна-дыялектныя адрозненні ад рускіх. У межах "заходнерусізму" аформілася дзве плыні – кансерватыўная, прыхільнікі якой імкнуліся як мага хутчэй гэтыя адрозненні ліквідавац і ліберальная – прыхільнікі якой імкнуліся як мага паўней гэтыя адрозненні вывучыць і гэтым узбагаціць вялікарускую культуру. Але абодвы бакі адмаўлялі беларусам у праве лічыцца самастойнай нацыяй.

Кансалідацыя беларускага этнасу ў нацыю суправаджалася ростам нацыянальнай самасвядомасці. З другой паловы XIX ст. сталі ўсё больш актыўна ўжывацца назва"Беларусь" і этнонім"беларусы". Паводле перапісу

1897 г., беларускую мову лічылі роднай 74 % насельніцтва Беларусі. Этнонім “беларусы” паступова выцясняў лакальныя тэрміны “ліцвіны” і інш. Аднак ён не меў яшчэ агульнаэтнічнага зместу. Існавалі рэгіянальныя назвы (палешукі), канфесіянізмы (рускія і палякі). Фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці садзейнічалі публікацыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. фундаментальных навуковых прац, прысвечаных беларускаму народу, яго мове, культуры і гістарычнаму мінуламу. Працы І.І. Насовіча, М.А. Дзмітрыева, Ю.Ф. Крачкоўскага, А.М. Семянтоўскага, М.Я. Нікіфароўскага, Я.Ф. Карскага, Е.Р. Раманава і іншых аўтараў аб’ектыўна засведчылі факт існавання самастойнага беларускага этнасу. Важнае значэнне на шляху абуджэння нацыянальнай самасвядомасці беларусаў адыгралі працы В.Ю. Ластоўскага, асабліва яго“Кароткая гісторыя Беларусі”, дзе ўпершыню беларускі этнас разглядаўся як суб’ект гістарычнага працэсу.

Такім чынам, у другой палове XIX – пачатку XX ст. працягваўся і ўасноўным завяршыўся працэс фарміравання беларускай нацыі як сялянскай па сваёй прыродзе. Адмоўнае ўздзеянне на гэты працэс аказвалі слабасць нацыянальнай буржуазіі, беднасць і непісьменнасць большасці беларусаў, рэлігійны раскол і антыбеларуская скіраванасць праваслаўнай царквы і каталіцкага касцёла, школы, друку, дзяржаўных устаноў, якія адмаўлялі існаванне беларускага этнасу і ўсіх беларусаў лічылі альбо рускімі, альбо палякамі. Да пачатку XX ст. цалкам не завяршыліся складванне нацыянальнай літаратурнай мовы і фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Гэтыя працэсы працягваліся ў наступныя дзесяцігоддзі XX ст.

2. Асвета і палітыка ўрада ў галіне школьнай справы

На Беларусі правядзенне Адукацыйнай рэформы 1864 года супала з пераадоленнем наступстваў паўстання 1863 года, у якім актыўны ўдзел узялі навучэнцы Горы-Горацкага земляробчага інстытута і сярэдніх навучальных устаноў. Гэта абумовіла асаблівасці рэфармавання адукацыі на Беларусі. Так, у 1864 г. быў зачынены земляробчы інстытут – апошняя вышэйшая навучальная ўстанова на Беларусі часоў імперыі. З гэтага часу вышэйшую адукацыю беларусы атрымлівалі за межамі Радзімы. Зачыняліся так сама некаторыя гімназіі – Навагрудская і Свіслацкая. Забаранялася выкладанне на польскай і беларускай мовах. Пачатковых школ было вельмі мала. Таму абвешчаныя прынцыпы рэформы – усесаслоўнасць, свецкасць, даступнасць, пераемнасць адукацыі, на Беларусі не дзейнічалі.

На Беларусі не была праведзена Земская рэформа – таму не існавалі земскія пачатковыя школы для сялянскіх дзетак. А царкоўна-прыхадскія школы былі пастаўлены пад нагляд паліцыі і праваслаўнай царквы, а не міністэрства адукацыі. Сярэднюю адукацыю атрымлівалі ў павятовых вучылішчах (няпоўную) ці гімназіях, але навучанне там было платным і для большасці жыхароў з гэтай нагоды недаступным. Да тагож, у 1887 годзе з’явіўся ўказ “Аб кухарчыных дзецях”, згодна з якім у гімназіі недапушчаліся дзеці прыслугі. Асобнымі ўказамі ўводзіўся цэнз на навучанне ў гімназіях і вну

для асоб яўрэйскага паходжання. З гэтай нагоды на Беларусі заставаўся высокі ўзровень непісменнасці.

Класічныя мужчынскія гімназіі давалі грунтоўную гуманітарную падрыхтоўку, асаблівая ўвага надавалася выкладанню так званых класічных моў– грэчаскай і лацінскай. Толькі выпускнікі гімназій мелі выключнае права паступлення ва універсітэты. У рэальных вучылішчах галоўнае месца адводзілася дысцыплінам прыродазнаўча-матэматычнага цыкла. Выпускнікі рэальных вучылішч маглі паступаць у тэхнічныя, гандлёвыя вышэйшыя навучальныя ўстановы. Выхаванкі жаночых гімназій атрымлівалі атэстат на званне настаўніцы пачатковай школы. Выпускніцам восьмага педагагічнага класа жаночых гімназій давалася права працаваць у якасці дамашніх настаўніц.

У пачатку XX ст. у Расійскай імперыі ў цэлым, а таксама і на тэрыторыі Беларусі адбываецца імклівы рост колькасці пачатковых(народных вучылішч і царкоўна-прыходскіх школ) і сярэдніх(гімназій і рэальных вучылішч) агульнаадукацыйных школ. Пры гэтым разам з дзяржаўнымі навучальнымі ўстановамі адкрываюцца прыватныя школы і вучылішчы.

У гэты перыяд склалася сістэма прафесійнай адукацыі. Колькасны рост агульнаадукацыйных школ вылучаў на першы план праблему падрыхтоўкі настаўнікаў. Калі да 1900 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала4 настаўніцкія семінарыі, то ў 1916 г. іх было ўжо 12. Для падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў былі адкрыты тры настаўніцкія інстытуты – у Віцебску, Мінску, Магілёве. Акрамя таго, падрыхтоўка спецыялістаў у галіне народнай гаспадаркі і культуры ажыццяўлялася ў рамесных, сельскагаспадарчых, камерцыйных, медыцынскіх, музыкальных і мастацкіх навучальных установах. Вышэйшых навучальных устаноў у Беларусі не было. Расійскія ўлады неаднаразова адхілялі хадайніцтвы грамадскасці Беларусі аб адкрыцці універсітэта ці політэхнічнага інстытута.

Пачатак XX ст. звязаны з пашырэннем грамадска-педагагічнага руху за стварэнне беларускай нацыянальнай школы. Прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі засноўвалі тайныя школы, дзе навучанне вялося на беларускай мове. Там выкарыстоўваліся падручнікі Каруся Каганца“Першая навука чытання”, Цёткі “Першае чытанне для дзетак беларусаў”, Якуба Коласа “Другое чытанне для дзетак-беларусаў”.

Вышэйшая адукацыя была пастаўлена пад больш жорсткі кантроль з боку ўрадавай адміністрацыі. Універсітэцкі статут 1884 г. фактычна ліквідаваў аўтаномію універсітэтаў у кіраванні. З 1887 г. каб паступіць ва універсітэт, трэба было прадставіць характарыстыку аб “добранадзейнасці”, а плата за год навучання павялічвалася з 10 да 50 рублёў. Усё гэта, безумоўна, закранала інтарэсы жыхароў Беларусі, дзе пасля закрыцця ў1864 г. Горы-Горацкага земляробчага інстытута не засталося ніводнай вышэйшай навучальнай установы і, каб атрымаць вышэйшую адукацыю, трэба было ехаць у Пецярбург, Маскву ці Кіеў.

3. Навука і развіццё навуковага беларусазнаўства

З другой паловыXIX ст. пачалося свядомае вывучэнне Беларусі. Расійскі ўрад пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. ахвяруе значныя сродкі для дасягнення гэтай мэты, каб не дапусціць у далейшым праяў польскага руху на Беларусі і абгрунтаваць непарыўную гістарычную сувязь гэтай тэрыторыі з Расіяй. Значную ролю ў вывучэнні Беларусі адыграў Паўночна-Заходні аддзел Рускага геаграфічнага таварыства. Былі арганізаваны навуковыя экспедыцыі ў розныя рэгіёны Беларусі, падчас якіх збіраліся разнастайныя матэрыялы па гісторыі, этнаграфіі, фальклору. Навуковы аналіз гэтых матэрыялаў аб'ектыўна сведчыў аб самабытнасці Беларусі.

У 1855 г. на аснове ўласнай археалагічнай калекцыі Яўстафій Тышкевіч з дапамогай свайго брата Канстанціна Тышкевіча стварыў Віленскі музей старажытнасцей. Браты таксама працавалі ў Віленскай археалагічнай камісіі.

Плённа працаваў на ніве збірання і публікацыі фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў Павел Шэйн. Ён распрацаваў падрабязную праграму па збіранню фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў і стварыў шырокую сетку карэспандэнтаў з ліку настаўнікаў, вучняў і іншых асоб, якія іх дасылалі. З карэспандэнтамі Шэйн падтрымліваў пастаянную сувязь, зрабіў некалькі паездак па Беларусі. Вынікі гэтай працы даследчык апублікаваў у трохтомніку "Матэрыялы для вывучэння быту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю", дзе змешчаны каштоўныя звесткі па духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў другой паловыXIX ст.

Іван Іванавіч Насовіч – беларускі мовазнавец, этнограф, фальклярыст з'яўляецца складальнікам"Слоўніка беларускай мовы" (1870). У слоўнік ўключана больш за30 тыс. слоў, запісаных у Магілёўскай, Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай губернях, выбраных з вуснай народнай творчасці, старабеларускіх пісьмовых крыніц. Былы настаўнік змясціў у гэтым выданні больш за 30 тыс. слоў з грунтоўнымі тлумачэннямі.

Значнай постаццю сярод этнографаў з'яўляецца Мікалай Якаўлевіч Нікіфароўскі. Ураджэнец Віцебшчыны, ён працаваў настаўнікам народных вучылішчаў, гімназій, Свіслацкай і Маладзечанскай настаўніцкіх семінарый. З 60-х гг. вывучаў побыт і культуру Беларусі. М.Я. Нікіфароўскаму належаць шматлікія працы, дзе ўтрымліваюцца апісанні паўсядзённага жыцця, звычаяў, абрадаў, прыкмет і павер'яў беларускіх сялян. Звыш 20 гадоў ён працаваў у якасці актыўнага карэспандэнта Шэйна. Нарэшце ён стварыў і самастойныя працы, выдадзеныя пераважна ў90-я гг.: "Нарысы простанароднага жыцця-быцця ў Віцебскай Беларусі і апісанне прадметаў ужытку", "Нарысы Віцебскай Беларусі" і інш.

Е.Р.Раманаў у 1886-1891 гадах выдаў першыя пяць выпускаў "Беларускага зборніка". Руская адміністрацыя садзейнічала выданням гэтых навуковых прац, бо лічыла, што яны падтрымліваюць тэзіс аб "рускім" характары краю. Тым часам змест прац паказваў, што Беларусь – самастойны ў этнічным плане рэгіён.

4. Развіццё мастацкай літаратуры

Пасля падаўлення паўстання 1863 года значныя перашкоды зведала развіццё беларускай культуры. Ва ўмовах ваеннага становішча, якое дзейнічала на Беларусі, любая грамадская дзейнасць, не адобраная ўрадам, была амаль немагчымай. Таму часта культурная дзейнасць беларусаў разгортвалася за межамі беларускіх губерняў. Так, у 1868 годзе ў Пецярбурге паэт В.Савіч-Заблоцкі стварыў асветніцкую арганізацыю "Крывіцкі вязок", у межах якой меўся намер наладзіць выданне літаратуры на беларускай мове, у тым ліку падручнікаў для простых людзей. Але з-за праследванняў з боку ўлад культурны гурток распаўся.

Беларуская літаратура развівалася ў другой палове стагоддзя ў неспрыяльных умовах. Забарона на выданне польскіх кніг недазволіла друкаваць беларускія творы на "лацінке", найбольш пашыранай у тыя часы сярод простага народа і інтэлігенцыі. Да тагож, літаратура развівалася разам з сацыяльнай самасвядомасцью творцаў – гэта азначае, што літаратурныя творы мелі дэмакратычны характар, антыўрадавы па сваёй сутнасці.

Бацькам беларускага культурнага адраджэнне стаў Францішак Багушэвіч, які адным з першых абгрунтаваў самастойнасць беларускай мовы. Яго зборнікі вершаў "Дудка беларуская" і "Смык беларускі" выйшлі за межамі Радзімы – у Кракаве і Познані (тэрыторыя Аўстра-Венгерскай імперыі, дзе нацыянальныя меншасці мелі права на культурную аўтаномію). У прадмовах да зборнікаў паэт адстойваў роўнасць роднай мовы з іншымі еўрапейскімі, заклікаў шанаваць і захоўваць яе. У вершах Ф.Багушэвіч галоўным чынам пісаў пра гаротнае жыццё беларускага сялянства, абрабленага пад час рэформы 1861 года і прыгнятаемага як эканамічна – панамі, так і нацыянальна – царскім урадам. Багушэвіч стварыў у паэзіі напрамак рэалізму і народнасці. Вядома, такія вершы ў Расійскай імперыі друкаваць было нельга. Паслядоўнікамі Ф.Багушэвіча былі Янка Лучына (Іван Неслухоўскі) і Адам Гурыновіч.

Янка Лучына аднолькава добра пісаў на некалькіх мовах – рускай, польскай і беларускай. Але яго беларускія вершы доўгі час не друкаваліся, што не дало раскрыцца паэту цалкам як таленту і вялікай постаці беларускай літаратуры. Толькі пасля яго смерці гурток беларускага студэнцтва выдаў у Пецярбургу яго беларускамоўны зборнік "Вязанка". А.Гурыновіч замацаваў у беларускай паэзіі пазіцыі рэалізму і народнасці. Ён адводзіў паэзіі важную ролю – будзіць у народа прагі да лепшага жыцця, да барацьбы за гэтае жыццё. У 1890-я гады ў беларускую літаратуру прыйшлі такія новыя імёны, як Карусь Каганец (Казімір Кастравіцкі), Цётка (Элаіза Пашкевіч), талент якіх яскрава раскрыецца ў пачатку XX стагоддзя.

5. Тэатр і музыка, архірхітэктура і горадабудаўніцтва. Выяўленчае мастацтва.

Тэтральнае жыццё беларускіх гарадоў было звязана галоўным чынам з паказам твораў рускай і сусветнай класікі лепшымі трупамі Расіі, якія гастралявалі па Беларусі. Асабліва актывізавалася тэтральнае жыццё Мінска пасля ўзвядзення асобнага будынка тэатра ў 1890 годзе на тэрыторыі Аляксандраўскага сквера. Так, у 1890-я гады тут паказвалі спектаклі трупы

знакамітай А.Яблачкінай, А.Южынай, Пецярбургская оперная трупа Я.Ізмайлова, украінская трупа М.Старыцкага. З гастролямі выдатных выканаўцаў была звязана актывізацыя музычнага жыцця ў беларускіх губернях. Беларусь у 1890-я гады наведалі Ф.Шаляпін, Л.Собінаў, А.Мазіні, С.Рахманінаў, Л.Скрабін, А.Зілоці і інш. Высокая музычная культура беларускай публікі прываблівала сюды выдатных спевакоў і выканаўцаў. Яе атрымлівалі ў навучальных установах – у навучальных праграмах семінарый і гімназій музычнай адукацыі надавалася значная ўвага. У 1871 годзе было створана Мінскае музычнае вучылішча арганістаў, адзінае на Беларусі. Да таго, у буйных беларускіх гарадах дзейнічалі музычныя таварыствы, якія ставілі мэтай падняцце ўзроўню музычнай культуры насельніцтва. У 1898 годзе ў Мінску ўзнікла культурна-асветніцкая арганізацыя “Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў”, якая складалася з літаратурнай, драматычнай, мастацкай і музычнай секцый. Арганізацыя стала цэнтрам літаратурнага і тэатральнага жыцця Мінска, наладжвала выставы, літаратурные чытанні і г.д.

Выяўленчае мастацтва другой паловы XIX стагоддзя развіваецца ў межах рэалізму. Выдатным беларускім мастаком гэтага перыяду лічыцца К.Э.Альхімовіч (1840-1916), які працаваў у жанрах гістарычным (“Пахаванне Гедыміна”, “Смерць Глінскага ў турме”), бытавым, а так сама ў графіке (ілюстрацыі да твораў А.Міцкевіча). На гэты час прыходзіцца росквіт дзейнасці акадэміка Акадэміі мастацтваў, мазаіста і мастака Н.Ю.Сілівановіча (1830-1918). Ён спецыялізаваўся ў бытавым жанры – “Дзеці ў двары”, “У школу”, “Салдат з хлопчыкам” – у гэтых картынах выяўляюцца сацыяльныя сімпатыі мастака. Сярод беларускіх пейзажыстаў трэба адзначыць А.Гараўскага (1833-1900). Пейзажыст імкнуўся пісаць маляўнічыя краявіды беларускай зямлі (“Вечар у Мінскай губерніі”, “Бераг ракі Свіслач”), тым самым зрабіць сваё мастацтва зразумелым для шырокіх колаў простага насельніцтва.

На развіццё архітэктуры значны ўплыў аказала хуткае развіццё прамысловасці і рост гарадоў менавіта ў другой палове стагоддзя. Вялікую ролю набыло грамадзянскае, жыллёвае і прамысловае будаўніцтва, якое вялося згодна з тыпавымі праектамі. Развівалася будаўнічая тэхніка, шырока выкарыстоўваліся новыя будаўнічыя матэрыялы – бетон, металічныя канструкцыі. Гэта суправаджалася пошукам новага архітэктурнага стылю, які павінен быў адпавядаць новым умовам, новым каштоўнасцям капіталітычнай гаспадаркі і буржуазнай ідэалогіі. А пакуль ішлі пошукі – у архітэктуры панавала эклектыка – спалучэнне элементаў разных архітэктурных стыляў (готыкі, барока, класіцызму, старажытнарускага дойлідства і г.д.) пры будаўніцтве і ў афармленні аднаго будынка.

Пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. шырокае распаўсюджанне набыў рэтраспектыўна-рускі стыль у праваслаўным культавым дойлідстве. Рускія архітэктары распрацавалі тыпавыя варыянты праваслаўных цэркваў, скапіраваныя з візантыйскіх храмаў і рускіх бажніц XIV і XVII стст., каб паказаць пераемнасць рускага дойлідства ад візантыйскай архітэктуры. Ініцыятарам будаўніцтва падобных храмаў быў граф Мураўёў, таму ў народзе яны набылі назву “мураўёвак”. Цэрквы,

пабудаваныя ў рэтраспектыўна-рускім стылі, можна сустрэць у многіх гарадах і мястэчках Беларусі.

У каталіцкай культавай архітэктуры наглядаецца росквіт неагатычнага стылю. Неагатычныя пабудовы ўзводзіліся з чырвонай добра абпаленай цэглы, прычым фасады не атынкоўваліся. Найбольш багатыя храмы мелі вітражы, падлогу з паліраваных керамічных плітак, фрэскавы роспіс.

Тэма 36. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў пачатку XX ст.

1. Сацыяльны і нацыянальны склад насельніцтва Беларусі.

У канцы XIX ст. на тэрыторыі пяці беларускіх губерняў пражывала больш за 8,5 млн. чалавек, у тым ліку 5,4 млн. беларусаў, 1,2 млн. яўрэяў, 493 тыс. рускіх, 424 тыс. палякаў, 377 тыс. украінцаў, а таксама прадстаўнікі іншых нацыянальных меншасцяў.

Акрамя 5 беларускіх губерняў больш за 300 тыс. беларусаў кампактна пражывала на сумежных тэрыторыях. У Краснінскім павеце Смаленскай губерні беларускае насельніцтва складала 90% , у Суражкім павеце Чарнігаўскай губерні – 70% , у Аўгустоўскім павеце Сувалкскай губерні –32,5% .

Характэрнай асаблівасцю беларускага этнасу з'яўлялася тое, што больш за 90% беларусаў пражывала ў сельскай мясцовасці і працавала на зямлі. У параўнанні з яўрэямі, рускімі, палякамі, якія мелі сваю монарэлігію, беларусы былі падзелены па веравызнанню на праваслаўных і католікаў. Безумоўна, гэта не садзейнічала кансалідацыі беларускага этнасу.

На другім месцы па колькасці насельніцтва ў Беларусі былі яўрэі. У 1897 г. у Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях налічвалася больш за 1 млн. 200 тыс. чалавек. Яўрэйскае насельніцтва ў асноўным пражывала ў гарадах і мястэчках. На тэрыторыі Беларусі пражывала амаль 500 тыс. рускіх. У сялянскім асяроддзі рускія складалі 5% , сярод патомных дваран – 16% , асабістых дваран – 51,8% , духавенства – 61,5%. Павелічэнне колькасці рускага насельніцтва было звязана з урадавай палітыкай у другой палове XIX ст. У выніку на тэрыторыю Беларусі перасяліліся рускія памешчыкі, чыноўнікі, часткова сяляне. У канцы XIX ст. у Беларусі пражывала 424 тыс. палякаў. Найбольшая іх колькасць была ў Гродзенскай і Віленскай губернях.

Сацыяльная структура насельніцтва Беларусі ў пачатку XX ст. была разнастайнай і даволі складанай. старычныя, палітычныя абставіны, нацыянальныя фактары, якія ўздзейнічалі на фарміраванне структуры грамадства, ускладнялі стварэнне адзінай і закончанай яе схемы. З аднаго боку, існавалі даволі жорсткія саслоўныя абмежаванні, а з другога, прамысловы рост, урбанізацыя, змяненне адукацыйнага ўзроўню насельніцтва мянялі грамадскі статус, лад мыслення і жыцця людзей. Таму ў беларускім грамадстве можна вызначыць некалькі сацыяльных груп

насельніцтва: дваранства, буржуазія, інтэлігенцыя (чыноўнікі, служачыя, настаўнікі, урачы, афіцэры і інш.), сялянства і рабочыя.

У сацыяльнай структуры беларускага грамадства значная роля адводзілася дваранству, якое было апорай дзяржаўнай улады. У канцы XIX ст. у заходніх губернях налічвалася 205 тыс. дваран, спадчынных і асабістых.

Працэс фарміравання прамысловай буржуазіі пачаўся яшчэ ў дарэформенны перыяд. Фабрыкі, буйныя мануфактуры, якія ў асноўным належалі дваранам, прызначаліся для перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі памешчыцкіх гаснадарак. Паступова гэтую групу прадпрымальнікаў папаўняюць прадстаўнікі гандлёвага капіталу. У канцы XIX ст. удзельная вага дваранскага прадпры-мальніцтва панізілася. Між тым многія буйныя прадпрыемствы належалі памешчыкам: папяровая фабрыка князя Паскевіча ў Добрушы, суконная фабрыка і цукровы завод Скірмунта ў Парэччы Пінскага павета.

Набірала сілу сельская буржуазія. На рубяжы стагоддзяў яна складала 8-10% ад агульнай колькасці сельскіх двароў, а гэта прыкладна 65,7 тыс. гаспадарак. Сельская буржуазія валодала большасцю купчых і арэндных зямель.

Інтэлігенцыя на Беларусі не была шматлікай. Да яе можна аднесці не толькі дзсячаў культуры, вучоных, работнікаў адукацыі, медыцыны, прадстаўнікоў тэхнічнай інтэлігенцыі, але і чыноўнікаў, служачых, ваенных, духавенства. Паводле звестак Усеагульнага нерапісу насельніцтва 1897 г. у 35 беларускіх паветах налічвалася 12 367 чыноўнікаў (з сем'ямі – 37 327 чал.), 6198 прадстаўнікоў духавенства (з сем'ямі –21 067 чал.), 21 434 прадстаўнікоў "вольных прафесій". Да апошніх адносілі работнікаў розных педагагічных, медыцынскіх устаноў, літаратараў, юрыстаў, дзеячаў культуры. На тэрыторыі Беларусі знаходзілася 69 412 ваеннаслужачых (74 585 чал. з сем'ямі). Сярод іх быў афіцэрскі корпус, які таксама трэба аднесці да інтэлігенцыі.

Агульную характарыстыку тагачаснай інтэлігенцыі даць вельмі складана, бо яна была неаднолькавай па свайму адукацыйнаму і прафесійнаму ўзроўню, матэрыяльнаму дабрабыту, палітычных поглядах. Што тычыцца нацыянальнай інтэлігенцыі, то яна была нешматлікай і недастаткова арганізаванай. У 80-90-я гады XIX ст. з вялікімі цяжкасцямі ідзе фарміраванне беларускай інтэлігенцыі з асяроддзя шляхты, сялян, мяшчан.

Рабочы клас, як самастойная сацыяльная група, узнікае яшчэ ў другой палове XVIII ст. На вотчынных мануфактурах Беларусі працавалі рабочыя, большасць якіх з'яўлялася прыгоннымі сялянамі. Пасля адмены прыгоннага права, прадпрыемствы, заснаваныя на прымусовай працы, былі пераведзены на вольнанаёмныя адносіны. Прамысловасць атрымала велізарны рэзерв рабочай сілы з ліку беззямельнага сялянства, яўрэйскай гарадской беднаты, рамеснікаў, сялян-саматужнікаў, якія не вытрымалі канкурэнцыі з прывазнымі таварамі фабрычна-заводскай вытворчасці.

Найбольш масавай сацыяльнай базай пралетарыяту з'яўлялася бяднейшае сялянства.

У пачатку XX ст. на Беларусі колькасць пастаянных наёмных рабочых склала больш за 400 тыс. чалавек, у тым ліку ў прамыс-ловасці працавала каля 180 тыс. чалавек, на чыгунцы – 25 тыс., на рачным і гужавым транспарце, у будаўніцтве, гандлі, сельскай гаспадарцы налічвалася больш за 200 тыс. чалавек.

Найбольш значным класам беларускага грамадства ў колькасным складзе было сялянства. На рубяжы стагоддзяў іх налічвалася 6,42 млн. чалавек, альбо (75,3%). Пасля адмены прыгоннага права ў Беларусі адбываецца працэс капіталізацыі вёскі. Скарачалася дваранскае землеўладанне, фарміравалася буржуазная ўласнасць на зямлю. Сельская гаспадарка арыентавалася на развіццё мясамалочнай жывёлагадоўлі. Павялічваліся пасяўныя плошчы сельскагаспадарчых культур. Беларускае сялянства на рубяжы стагоддзяў не было адзінай сацыяльнай групай. У 90-я гг. сяляне валодалі, напрыклад, 16 фабрыкамі і мануфактурамі. Больш за тысячу сялянскіх гаспадарак былі на ўзроўні памешчыцкіх. Яны валодалі зямельнымі надзеламі звыш 100 дзесяцін. У багатых сялян працавала 55 тыс. сельскагаспадарчых наёмных рабочых. Але быў і супрацьлеглы полюс беларускай вёскі. Гэта мільёны сялян, якія ледзь зводзілі канцы з канцамі. У 1893 г. з 668,7тыс. сялянскіх двароў каля 54,5 тыс. (8,8%) не мелі сваёй зямлі. Найбольшая колькасць беззямельных сялян была ў Віцебскай (9,7%) і Віленскай губернях (9,6%).

Вясковае насельніцтва заставалася найбольш сацыяльна неабароненым саслоўем. Яно не мела права свабодна пакінуць сельскую грамаду, падпарадкоўвалася саслоўнаму кіраўніцтву, падвяргалася публічнаму фізічнаму пакаранню. Непасільныя падаткі і павіннасці, саслоўнае нераўнапраўе, абмежаванасці ў культурным і палітычным развіцці сялянства ставілі праблемы беларускай вёскі ў якасці галоўных.

2. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Стан і развіццё прамысловасці.

Прамысловы пад'ём, які пачаўся ў Расійскай імперыі ў 1893 г., аказаў значны ўплыў на развіццё ўсіх галін народнай гаспадаркі. Пры актыўнай дзяржаўнай падтрымцы на працягу 90-х гг. адбылося хуткае развіццё айчыннай прамысловасці.

На рубяжы стагоддзяў дынамічна развіваліся беларускія губерні. Прамысловасць мела тут значную колькасць свабоднай рабочай сілы, крыніцы мясцовай сыравіны. Хуткімі тэмпамі ствараласа транспартная інфраструктура. Чыгуначныя дарогі ў беларускіх губернях павялічыліся ў шмат разоў і склалі ў пачатку XX ст. больш за 2800 вёрст. Шашэйныя, палепшаныя грунтавыя дарогі Беларусі складалі 18% дарог 50 еўрапейскіх губерняў Расійскай імперыі. Да гэтага трэба дадаць разгалінаваную сетку водных камунікацый.

Танныя сыравіна і працоўныя рэсурсы, досыць добра развітая сетка шляхоў зносін садзейнічалі ўстойлівай вытворчасці і збыту прадукцыі. Паступова прамысловыя тавары фабрычна-заводскай вытворчасці нацяснілі цэлыя галіны мясцовай вытворчасці, разбурылі цэхавую сістэму рамяства. Алс сумарная ўдзельная вага рамесніцкай, дробнакапіталістычнай вытворчасці ў пачатку XX ст. яшчэ перавышала фабрычную.

Характэрнай рысай прамысловага развіцця Расійскай імперыі ў пачатку XX ст. была высокая ступень канцэнтрацыі вытворчасці. Расійскія прадпрымальнікі выкарыстоўвалі лепшыя сусветныя тэхналогіі, інжынерныя кадры, значныя фіпансавыя рэсурсы для прамысловага будаўніцтва. Пад дзяржаўны заказ расійскі ўрад даваў субсідыі, налогавыя льготы, праводзіў традыцыйную пратэкцыяналісцкую палітыку ў адносінах да фінансавых і прамысловых магнатаў.

У беларускіх губернях таксама праходзіў працэс стварэння манапалістычных аб'яднанняў. У 1905 г. узнік Заходні камітэт запалкавых фабрыкантаў, ствараліся акцыянерныя таварыствы з удзелам замежнага і мясцовага капіталу. У 1900-1908 іт. узнікла 13 акцыянерных таварыстваў. Ім належалі Віцебская льнопрадзільная фабрыка "Дзвіна", у Аршанскім павеце Выдрыцкі завод сухой перагонкі дрэва, самы буйны ў Расіі завод па вырабу крухмалу ў Мінску. Акцыянернае таварыства валодала тытунёвай фабрыкай "Нёман" у Гродне.

Хутка развівалася тэкстыльная прамысловасць. У 1900-1908 гг. з'явілася 8 новых прадпрыемстваў. Аб'ём вытворчасці ў гэтай галіне з 1908 па 1913 гг. павялічыўся ў 1,6 раза.

Традыцыйнымі галінамі харчовай прамысловасці былі піваварная, маслабойная, крухмала-патачная, мукамольная, тытунёвая.

Асобае значэнне мела вінакурства. Колькасць вінакурных заводаў павялічылася з 470 у 1900 г. да 603 у 1908 г. Яны выраблялі каля 10% спірту ў агульным аб'ём е яго вытворчасці ў Расійскай імперыі.

На пачатку XX ст. даволі няпростыя адносіны склаліся ў беларускай вёсцы. Нягледзячы на тое, што пануючым заставалася памешчыцкае землеўладанне, вёска ўсё больш уцягвалася ў капіталістычныя эканамічныя адносіны. Павялічвалася колькасць дваранскіх гаспадарак, якія выкарыстоўвалі наёмную працу, сельскагаспадарчую тэхніку, новыя агратэхнічныя прыёмы апрацоўкі зямлі. Памешчыкі куплялі жалезныя плугі, сеялкі, жняяркі, сенакасілкі. Малатарні і веялкі былі даволі распаўсюджанымі ў гаспадарках заможных сялян. Такіх машын сяляне мелі нават больш, чым памешчыкі.

Пашырэнню землеўладання прадпрымальніцкага характару садзейнічаў пераход памешчыцкіх гаспадарак у рукі купцоў, банкіраў, фабрыкантаў, багатых сялян. Працэс куплі-продажу паскорыўся ў гады рэвалюцыйных зрухаў, калі дваране, чыноўнікі, афіцэры прадалі ў 5 заходніх губернях 1,5 млн.дзесяцін зямлі. Сяляне купілі 714,1 тыс. дзесяцін, купцы і мяшчане – 241,6 тыс. дзесяцін зямлі. Абсалютная большасць купленых зямель пераходзіла ва ўласнасць заможных людзей. Прадаўцамі зямлі выступалі і

бяднейшыя сяляне, якія ў ходзе аграрнай рэформы атрымалі права ўласнасці. У 1907-1914 гг. імі было прададзена 187,8 тыс. дзесяцін зямлі.

Капіталістычная сістэма ўмацавалася ў сельскай гаспадарцы, пацясніла паўпрыгонніцкія формы гаспадарання. Тым не менш развіццё капіталізму па прускаму шляху не прывяло да вырашэння аграрнага пытання. У 1905 г. дваранства беларускіх губерняў мела 41% усёй зямлі. Многія буйныя памешчыцкія гаспадаркі прыстасоўваліся да рынку.

У 1901-1913 гг. валавы збор бульбы павялічыўся на 37,6% . На Беларусь прыпадала 17,2% усёй плошчы, занятай бульбай у 50 еўрапейскіх губернях Расійскай імперыі. Вінакурныя заводы ў 1913 г. перапрацоўвалі на спірт 32 млн. пудоў бульбы і каля 3 млн. пудоў зерня. Адходы ад вінакурства ішлі на корм жывёле. У пачатку ХХст. на Беларусі было 2,8 млн. галоў буйной рагатай жывёлы, з іх прыблізна 1,4 млн. складалі дойныя каровы. Пашыралася прамысловая вытворчасць масла і сыру. У адзначаны час на Беларусі працавала каля 300 масларобчых і сыраварных заводаў.

Але традыцыйныя сялянскія адносіны не ўкладваліся ў капіталістычны рынак. Спадзяванні, што сялянская грамада ўтрымае вёску ад пралетарызацыі, не апраўдала сябе. Даволі хуткімі тэмпамі адбывалася дыферэнцыяцыя сялянства. З'явіўся клас сельскай буржуазіі, а з другога боку – павялічылася колькасць беззямельнага сялянства.

Працэс капіталізацыі вёскі быў замаруджаны нявырашанымі праблемамі феадальнага мінулага. Пры складанні ўстаўных грамат, якія рэгулявалі пазямельныя адносіны памешчыкаў і сялян, не было прынята Палажэнне аб сервітутах. Пачаліся канфлікты адносна сервітутных зямель. Сур'ёзнай праблемай з'яўлялася цераспалосіца, шнуравое карыстанне зямлёй, што не давала магчымасці прымяняць новую агратэхніку. Да таго ж трэба дадаць падаці і павіннасці сялянства. Усё гэта сведчыла аб сур'ёзных супярэчнасцях у грамадстве.

3. Сталыпінская рэформа і яе сутнасць. Асаблівасці рэалізацыі ў Беларусі.

У рэвалюцыі 1905-1907 гг. своеасаблівую вастрыню набыў сялянскі рух і аграрнае пытанне. Таму ўрад прапанаваў свой шлях яго вырашэння - праз аграрную рэформу. Яе ажыццяўленне было звязана з імем прэм'ер-міністра Расійскай імперыі П. Сталыпіна.

Мэты рэформы:

• адцягнуць сялян ад удзелу ў рэвалюцыі;

• павялічыць сярэдні слой сялянства і ўмацаваць слой сялянскай буржуазіі, якія створаць апору царскаму самадзяржаўю на вёсцы;

• даць магчымасць малазямельным і беззямельным сялянам выйсці на працу ў горад і павялічыць колькасць прамысловых рабочых;

• запэўніць паскоранае развіццё капіталізму ў вёсцы пры захаванні памешчыцкіх латыфундый.

Згодна са сталыпінскай аграрнай рэформай кожны селянін мог аб'явіць прыватнай уласнасцю надзел зямлі, які знаходзіўся ў яго карыстанні; кожны селянін мог свабодна выйсці з абшчыны, свабодна выбраць месца жыхарства і род заняткаў; любы селянін, які замацаваў зямлю ў прыватную ўласнасць, мог патрабаваць аб'яднання ўсіх яго раскіданых палосак у адзіны водруб. Калі на водруб пераносілася сядзіба, то ўзнікаў хутар. У сувязі з малазямеллем сялянам дазвалялася перасяляцца за Урал і атрымліваць невялікія "пад'ёмныя" і пазыкі на ўладкаванне.

Рэформа ажыццяўлялася ў два этапы. Першы пачаўся з Указа ад 9 лістапада 1906 г. Згодна з ім кожны селянін мог выйсці з абшчыны і замацаваць свой надзел у прыватную ўласнасць. Санкцыю на гэта павінен быў даць агульны сход сельскай грамады на працягу аднаго месяца. Калі сход не задавальняў просьбу, то канчаткова вырашаў пытанне земскі начальнік. Дазвалялася ствараць хутары, што садзейнічала ліквідацыі цераспалосіцы.

Другі этап пачынаецца з Указа ад 29 мая 1911 г. Землеўпарадкавальныя камісіі атрымалі права прымусова - у мэтах ліквідацыі цераспалосіцы - выдзяляць сялянам зямлю ў адным участку і такім чынам штурхаць іх да перасялення на хутары. Да 1915 г. у Магілёўскай губерні выйшлі з абшчыны 56,8% гаспадароў, а ў Віцебскай губерні - 28,9%.

Можна вызначыць наступныя вынікі рэформы. За 1906-1915 гг. на Беларусі было створана 12,8 тыс. хутароў (12% ад агульнай колькасці гаспадарак). Паскорыўся працэс распаду феадальнай і рост буржуазнай зямельнай уласнасці. Дваране, чыноўнікі, афіцэры прадавалі сваю зямлю Пераважная большасць гэтых зямель пераходзіла ў рукі сялян-прадпрымальнікаў, якія ствараліі гаспадаркі фермерскага тыпу. У той жа час больш за 40 тыс. двароў сялян-беднякоў і сераднякоў не змаглі наладзіць гаспадарку і былі вымушаны прадаць сваю зямлю.

Істотна ўзрасла тэхнічная ўзброенасць памешчыцкіх і пэўнай часткі заможных сялянскіх гаспадарак. Назіраўся рост сельскагаспадарчай вытворчасці, пасяўныя плошчы пашыраліся за кошт пасеваў тэхнічных і кармавых культур.

Сталыпінская аграрная рэформа не атрымала свайго лагічнага завяршэння. Забойства прэм'ер-міністра і пачатак Першай сусветнаи вайны не далі магчымасці рэалізаваць паступовы пераход да амерыканскаи мадэлі развіцця сельскай гаспадаркі.

4. Прычыны і мэты правядзення земскай рэформы ў Беларускіх губернях, яе асаблівасці.

Земская рэформа. 1 студзеня 1864 г. у Расійскай імперыі пачалася рэформа органаў мясцовага самакіравання. Былі ўтвораны земствы, выбары ў якія ажыццяўляліся на падставе саслоўнага і маёмаснага цэнзу, што забяспечвала ў іх пануючае становішча памешчыкаў. Земствы займаліся мясцовымі гаспадарчымі справамі і былі падкантрольныя губернатару. Земствы не атрымлівалі фінансавых сродкаў са скарбу, а асновай іх бюджэту было абкладанне падаткамі нерухомай маёмасці: зямель, дамоў, фабрычна-

заводскіх прадпрыемстваў, гандлёвых устаноў. На атрыманыя сродкі яны адкрывалі школы, бальніцы, праводзілі агранамічныя мерапрыемствы, займаліся статыстыкай і ўвогуле садзейнічалі развіццю мясцовай ініцыятывы, гаспадаркі і культуры.

Размах нацыянальна-вызваленчага руху на тэрыторыі Літвы і Беларусі напалохаў царскі ўрад, які разумеў, што ў выпадку правядзення на гэтых тэрыторыях выбараў у земствы пераважную большасць галасоў атрымалі б памешчыкі, якія з'яўляліся ўдзельнікамі ці прыхільнікамі паўстання 1863–1864 г. Па гэтай прычыне земская рэформа ў Беларусі і Літве была адкладзена і пачалася толькі ў 1911 г. Але і тады органы мясцовага самакіравання былі створаны толькі ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях (у 25 беларускіх паветах з 35). На захадзе Беларусі, дзе апазіцыя ўрадавай палітыцы была найбольш моцнай, земствы так і не былі ўтвораны.

Замест саслоўных курый выбаршчыкаў у органы земскага самакіравання ствараліся дзве – "руская" і "польская", а каб павялічыць прадстаўніцтва праваслаўнага "рускага" сялянства маёмасны цэнз для іх панізілі ў 2 разы. Гэтыя меры павінны былі недапусціць панавання ў земствах каталіцкіх "польскіх" памешчыкаў.

Тэма 37. Рэвалюцыйныя падзеі 1905—1907 гг. у Беларусі.

1. Пачатак рэвалюцыі.

Феадальна-прыгонніцкія перажыткі ў палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сферах стрымлівалі развіццё Расіі па буржуазным шляху. Таму галоўнымі мэтамі і задачамі расійскай рэвалюцыі з'яўляліся знішчэнне гэтых перажыткаў і стварэнне ўмоў для больш хуткага, свабоднага і бесперашкоднага развіцця капіталізму ў Расіі. Мэты і задачы, якія стаялі перад рэвалюцыяй, вызначылі яе буржуазны характар.

Напярэдадні і ў ходзе рэвалюцыі сфарміраваліся тры грамадска-палітычныя лагеры: урадавы, ліберальна-буржуазны і дэмакратычны. Кожны з іх меў сваю сацыяльную базу, мэты і задачы. Урадавы лагер абапіраўся на дваранства, вышэйшыя пласты чыноўніцтва і арміі, яго падтрымлівала буйная манархічна настроеная буржуазія. Усе яны імкнуліся захаваць самадзяржаўе і не дапусціць карэнных змен у дзяржаўна-палітычным ладзе Расіі. У ліберальна-буржуазны лагер уваходзілі буйная і сярэдняя буржуазія, некаторыя прагрэсіўныя памешчыкі, буржуазная інтэлігенцыя. Лібералы марылі аб палітычных свабодах, жадалі ліквідаваць перажыткі феадалізму, але баяліся рэвалюцыі і абмяжоўваліся толькі мірнымі сродкамі ўздзеяння на самадзяржаўе. Дэмакратычны лагер складалі пралетарыят, сялянства, радыкальна настроеная інтэлігенцыя, шырокія непралетарскія дэмакратычныя пласты горада і вёскі. Іх агульнай найбліжэйшай мэтай было знішчэнне ўсіх рэшткаў феадалізму, у тым ліку і памешчыцкага землеўладання, звяржэнне самадзяржаўя і ўсталяванне дэмакратычнай рэспублікі.

9 студзеня 1905 г. у Пецярбургу было расстраляна мірнае шэсце рабочых, якія накіроўваліся да цара з просьбай палепшыць становішча народа. Гэтая

падзея(“Крывавая нядзеля”) выклікала магутную хвалю пратэсту. Стачкі, дэманстрацыі і мітынгі рабочых пракаціліся па ўсей краіне. Іх размах сведчыў аб тым, што ў Расіі пачалася буржуазна-дэмакратычнвая рэвалюцыя.

У студзеньскія дні 1905 г. ў 30 гарадах і мястэчках Беларусі адбыліся забастоўкі салідарнасці, у якіх удзельнічала 34 тыс. чалавек. Ініцыятарамі і кіраўнікамі рэвалюцыйных выступленняў рабочых былі найперш Бунд і РСДРП, у некаторых месцах – эсэры і БСГ. У студзені забастоўкі рабочых мелі выразна палітычны характар.

2. Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. Адступленне рэвалюцыі.

У канцы верасня ў Маскве распачалася гарадская стачка, якая перарасла ў Усерасійскую – так пачаўся новы этап рэвалюцыі. 7-17 кастрычніка дзяржава знаходзілася ў стане калапсу. Спыніліся чыгункі, прадпрыемствы, амаль не працавала сувязь. 17 кастрычніка кіраўнік урада С.Віттэ прымусіў Мікалая II падпісаць маніфест аб абвяшчэнні дэмакратычных свабод (свободы слова, друка, сходаў, саюзаў, веравызнанняў) і наданні Думе права заканадаўчай ініцыятывы.

18 кастрычніка 1905 года ў гарадах адбыліся шматлюдныя мітынгі і дэманстрацыі з нагоды выдання маніфеста. Але па ўзгадненню з цэнтральнымі ўладамі гэтыя дэманстрацыі былі разагнаныя з прымяненнем зброі. Расстралялі дэманстрацыі ў Віцебску і Гомелі, у Мінску пад час “курлоўскага расстрэлу” загінула каля 100 чалавек. У цэлым кастрычніцкі націск працоўных аслаб, бо сваю ролю адыграў Маніфест аб свабодах. Ад рэвалюцыі адыйшлі ліберальныя і буржуазныя дзеячы, якія цалкам дасягнулі сваіх мэтаў. На гэтым скончыўся трэці этап рэвалюцыі. Яго вынікам было стварэнне новых палітычных партый, якія пачалі палітычную дзейнасць у рамках парламенцкай барацьбы.

У канцы 1905 г. была створана партыя "Саюз 17 кастрычніка", якая без агаворак падтрымала царскі ўрад і яго праграму, выкладзеную ў маніфесце

У лістападзе 1905 г. лібералы стварылі канстытуцыйна-дэмакратычную партыю (кадэтаў). Яна адстойвала канстытуцыйную манархію, выкуп часткі памешчыцкай зямлі сялянамі, свабоду і садзейнічанне прадпрымальніцтву. У канцы 1905 г. гурткі кадэцкай партыі ўзніклі ў Вільні, Магілёве.

Партыі сацыялістычнага напрамку адмоўна сустрэлі Маніфест 17 кастрычніка.

Правы ўрадавы палітычны лагер, каб абараняцьінтарэсы самадзяржаўя ва ўмовах адкрытай палітычнай барацьбы, таксама пачаў фарміраваць свае палітычныя партыі. Самай уплывовай зіх быў “Саюз рускага народа”. Яго членаў рэвалюцыянеры называлі чарнасоценцамі. У канцы 1905 – пачатку 1906 г. арганізацыі “Саюза рускага народу” былі створаны ў Мінску, Гомелі, Віцебскуі іншых гарадах Беларусі. Да партый правага кансерватыўнага накірунку адносіліся таксама“Партыя рускага сходу”, “Партыя народнага цэнтра” і шэраг іншых. Усе яны займалі крайне манархічныя пазіцыі, абаранялі інтарэсы памешчыкаўі праваслаўнай царквы, выступалі за непарушнасць самадзяржаўнай улады, захаванне памешчыцкага землеўладання, за тэрытарыальнае адзінства Расіі.

3. Выбары ў I і II Дзяржаўныя думы Расіі. Трэцячэрвеньскі дзяржаўны пераварот 1907 г.

У красавіку адбыліся выбары ў Думу, і яна пачала дзейнасць з 27 красавіка 1906 года. Выбары былі непрамыя, шматступенчатыя. Законам вызначалася розная якасць галасоў выбаршчыкаў (1 голас памешчыка = 3,5 голаса буржуазіі = 15 галасам сялян = 45 галасам рабочых). Асобы, якія не мелі маёмасці, выбарчых правоў не атрымалі. Сацыял-дэмакратычныя партыі байкатавалі выбары ў першую Думу. Але сарваць выбары яны не здолелі. У выбарах удзельнічала шырокае кола партый, створаных пасля маніфеста 17 кастрычніка 1905 года.

Партыя канстытуцыйных дэмакратаў (кадэтаў) была створана на з'ездзе земскіх дзеячоў, які праходзіў у Маскве з 12 па 18 кастрычніка і пераўтварыўся ў I з'езд партыі кадэтаў. Партыя стаяла на пазіцыі будаўніцтва ў Расіі парламенцкай дзяржавы на заходні манер, выступала супраць федэралізму але дапускала культурную аўтаномію народаў імперыі.

На Беларусі дзейнічала аналагічная мясцовая партыя – Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і Беларусі, якую ў канцы 1905 года стварыў віленскі каталіцкі біскуп Э.Роп. Гэты дзеяч вызначаўся ліберальнымі поглядамі і блізкасцю да беларускага нацыянальнага руху, быў прыхільнікам увядзення беларускай мовы ў касцёл.

"Саюз 17 кастрычніка" ці акцябрысты стварылі партыю ў лістападзе 1905 года. На Беларусі былі ўтвораны адзелы ў Віцебске, Мінске, Гродна, Магілёве. Акцябрысты кантралявалі такіе выданні, як «Минская речь», «Витебский голос». Падтрымлівалі партыю мясцовае чыноўніцтва, русскае насельніцтва. Патрыя абмяжоўвалася падтрымкай выканання палажэнняў маніфеста 17 кастрычніка, адвяргала ідэю любой нацыянальнай аўтаноміі ў імперыі акрамя Фінляндыі.

На Беларусі мелі свае аддзелы іншыя арганізацыі – Партыя мірнага абнаўлення, блізкая да кадэтаў, манархічны "Саюз русского народа" (лістапад 1905 года), які ствараў "чорныя сотні" і чыніў пагромы ў яўрэйскіх гарадах, кансерватыўны Усерасійскі нацыянальны саюз (чэрвень 1908 года), які прапаведаваў ідэі нацыяналізму, гасподства рускіх у імперыі, падтрымліваў неабмежаванае самадзяржаўе.

Утвараліся і мясцовыя арганізацыі. Так, "Белорусское общество" (з 1908 года), якое складалася з ліберальнай інтэлігенцыі і заможнага сялянства, выступала за саюз з урадам супраць каталіцкіх памешчыкаў. Таварыствы "Крестьянин" і «Русский окраинный союз» (з кастрычніка 1906 года) падтрымлівалі лозунг – "Расія для рускіх і кіраваць ёю павінны рускія". Выступалі за ліквідацыю ў краі эканамічнай перавагі "польскіх" памешчыкаў і яўрэйскай буржуазіі. Ідэі прпагандавалі праз газеты «Виленский вестник», «Минское слово».

У першую Думу ад Беларусі было абрана 36 дэпутатаў, у тым ліку 13 сялян. Пачатак дзейнасці парламента супаў з новым ростам выступленняў

працоўных, якія зараз кантралявaліся прафсаюзамі. Ад Думы чакалі вырашэння зямельнага пытання, таму наглядаўся актыўны рух сярод сялянства і салдат, якія амаль цалкам паходзілі з сялянскага саслоўя. У красавіку-ліпені сходкі салдат адбываліся ў Мінску, Баранавічах, Бабруске, Брэсце, Кобрыне. Пад час працы ў Думе дэпутаты прапанавалі некалькі варыянтаў зямельнай рэформы, але яны былі з боку гледжання ўрада празмерна радыкальнымі, бо прапанавалі ліквідаваць памешчыцкае землеўладанне (праз нацыяналізацыю ці паступовы выкуп дзяржавай). Прапанаваны ўрадам праект Дума рыхтавалася адхіліць. Што цікава, дэпутаты-сяляне ад Беларусі, падманутыя сваімі землякамі, галасавалі супраць нацыяналізацыі зямлі, гэта азначае, супраць сваіх інтарэсаў. Да тагож фракцыя аўтанамістаў – куды ўвайшлі большасць абраных ад Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі дэпутатаў патрабавалі права на шырокае самакіраванне для Польшчы. 9 ліпеня 1906 года Мікалай II распусціў парламент, распачаў рэпрэсіі і прызначыў новыя выбары.

У гэтых умовах націску на працоўных адбыліся выбары ў другую Думу. У іх прынялі ўдзел усе сацыял-дэмакратычныя партыі. Адзіным блокам на выбары пайшлі правыя арганізацыі – акцябрысты, Расійскі акраінны саюз, манархісты. У выніку ад Беларусі было абрана 15 дэпутатаў ад правага блока, 11 аўтанамістаў, 2 кадэта і 8 беспартыйных. Такім чынам, перамогу атрымалі дзве групоўкі, якія адмаўлялі ў існаванні беларускаму народу. Сацыял-дэмакратычныя партыі не здолелі правесці сваіх дэпутатаў, бо перамога іх кандадатаў аб’яўлялася несапраўднай і анулявалася. У Расіі наглядалася крыху іншая сітуацыя – там левыя партыі дамагліся значных перамог.

Другая Дума дзейнічала так сама кароткі тэрмін – з 20 лютага да 3 чэрвеня 1907 года. Зноў абвастрыліся спрэчкі па аграрнаму пытанню. Але зараз партыя кадэтаў не атрымала большасці ў Думе і ўрад праігнараваў іх варыянт рэфармавання. Паколькі ў Думе ніводны бок не атрымаў перавагі, Думу палічылі няздольнай на сур’ёзныя справы і па патрабаванню правых партый распусцілі зноў. Але адначасова Мікалай II змяніў выбарчае заканадаўства (17 чэрвеня), чаго не меў права рабіць без згоды парламента, таму роспуск другой Думы лічыцца чэрвеньскім дзяржаўным пераваротам. Ім скончылася рэвалюцыя 1905-1907 гадоў.

4. Беларускі нацыянальны рух у перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг.

Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у пачатку XX ст. быў часткай агульнага рэвалюцыйнага руху ў Расійскай імперыі. Арганізатарам, а таксама ідэйным і палітычным натхняльнікам яго была Беларуская сацыялістычная грамада. Яна ставіла сваёй мэтай нацыянальнае адраджэнне народа, яго мовы і культуры, даказвала права беларусаў на самавызначэнне і на ўласную дзяржаўнасць. Абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці садзейнічалі шматлікія публікацыі, прысвечаныя беларускай мове, культуры, гісторыі.

Рэвалюцыйныя падзеі 1905 г. і ўвядзенне Маніфестам ад 17 кастрычніка дэмакратычных правоў і свабод адмянілі на тэрыторыі Беларусі папярэднюю цэнзуру і стварылі магчымасці для заснавання

нацыянальных выдавецтваў. Першае беларускае легальнае выдавецкае таварыства было створана ў Пецярбургу ў 1906 г. і мела назву «Загляне сонца і ў наша аконца». У верасні 1906 г. актывісты БСГ пачалі выдаваць у Вільні штотыднёвую грамадска-палітычную і літаратурную беларускую газету «Наша доля». Радыкальныя рэвалюцыйныя погляды, якія прапагандаваліся на старонках гэтай газеты, палохалі царскія ўлады, таму чатыры з шасці яе нумароў былі канфіскаваныя, далейшы выпуск газеты забаронены. Аднак у лістападзе 1906 г. у свет выйшаў першы нумар новай газеты «Наша ніва». Менавіта ёй належыць вялікая роля ў згуртаванні ўсіх нацыянальных сіл, якія на пачатку XX ст. змагаліся за нацыянальнае адраджэнне Беларусі. На старонках газеты друкаваліся творы Максіма Багдановіча, Максіма Гарэцкага, Змітрака Бядулі, Цішкі Гартнага, Уладзіслава Галубка і шэрагу іншых беларускіх пісьменнікаў. Пры газеце існавала выдавецтва, якое з 1910 г. наладзіла выпуск папулярнага сярод вяскоўцаў «Беларускага календара», з 1912 г. — сатырычнага часопіса «Крапіва», сельскагаспадарчага часопіса «Саха», літаратурнага штомесячніка для моладзі «Лучынка» і інш.

Беларускія выдавецтвы існавалі таксама і ў Мінску. У 1910 г. у Вільні выйшла кніга Вацлава Ластоўскага «Кароткая гісторыя Беларусі», якая паклала пачатак афармленню нацыянальнай канцэпцыі беларускай гісторыі. Усяго за 1906−1915 г. было выдадзена каля 160 беларускіх кніг. Нягледзячы на пэўныя поспехі і дасягненні, у нацыянальным руху Беларусі меліся аб'ектыўныя цяжкасці. Яны былі выкліканы тым, што, па-першае, доўгі час у Расійскай імперыі не было ўмоваў для развіцця беларускай мовы. Па-другое, беларуская інтэлігенцыя, як правіла, складалася з выхадцаў з вёскі і была інтэлігенцыяй першага пакалення. Па нацыянальнаму складу беларусамі былі пераважна сяляне, якія з прычыны сваёй неадукаванасці не маглі адстойваць нацыянальную ідэю. Не было зваротнай сувязі паміж нацыянальна арыентаванай інтэлігенцыяй і сялянствам. Адмоўным момантам на шляху нацыянальнага развіцця з'яўляўся таксама той факт, што генератарам нацыянальнай ідэі не мог стаць горад, паколькі сярод яго жыхароў на пачатку XX ст. беларусы складалі толькі каля 17 %.

Разам з тым першае дзесяцігоддзе XX ст. яскрава сведчыла, што насуперак розным перашкодам адбывалася згуртаванне беларускіх нацыянальных сіл. За вялікую ролю, якую ў нацыянальна-вызваленчым і культурна-асветніцкім руху ў Беларусі адыграла газета «Наша ніва», перыяд 1906−1915 г. у беларускай гісторыі атрымаў назву «нашаніўскага».

Тэма 38. Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў 1907—1914 гг.

1. Грамадска-палітычнае жыццё. Грамадска-палітычны рух у Беларусі ў час выбараў у III і IV Дзяржаўныя думы.

Рэвалюцыя 1905-1907 гг. была этапнай з'явай у гісторыі Расійскай імперыі. Ва ўмовах рэвалюцыі ўрад, прадпрымальнікі вымушаны былі пайсці на прыняцце шэрагу мер па паляпшэнню эканамічнага становішча

працоўных. Былі зроблены захады па фарміраванню ў краіне канстытуцыйнай манархіі, пашырэнню дэмакратычных свабод, стварэнню палітычных партый, грамадскіх і прафесійных арганізацый. Адбылася актывізацыя рабочага, сялянскага і нацыянальна-вызваленчага руху.

Новы выбарчы закон ад 3 чэрвеня 1907 г. пашырыў прадстаўніцтва памешчыкаў, буйной буржуазіі. Выбаршчыкі, як і раней, падзяляліся на 4 курыі. Але землеўладальніцкай курыі давалася 49,6% выбаршчыкаў у еўрапейскіх губернях Расійскай імперыі замест 32,7% на выбарах у папярэднія Думы. Скарачалася колькасць выбаршчыкаў ад сялян (з 42,3% да 21,8%) нацыянальных рэгіёнаў. У беларускіх губернях улады паспрабавалі супрацьпаставіць выбаршчы-каў па нацыянальнаму прызнаку. У Віленскай губерні была створана асобная руская курыя з перадачай ёй 2 дэпутацкіх месцаў. У Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай губернях павятовыя з'езды памешчыкаў былі падзелены на рускае і польскае аддзяленні. У гарадах Мінскай губерні курыя буйной буржуазіі (першая) дзялілася на рускую, польскую і яўрэйскую. Курыя дробнай буржуазіі (другая) у розных паветах таксама дзялілася на нацыянальныя аддзяленні. Усё гэта рабілася з мэтай, каб правесці ў Думу прадстаўнікоў урадавых партый.

На справе так і адбылося. У III Дзяржаўную думу было абрана 268 прадстаўнікоў урадавых партый (61%), 115 – лібералаў (26%), 27 – дэмакратаў (6%). Ад беларускіх губерняў 80,5% дэпутатаў прадстаўлялі ўрадавы лагер. III Дзяржаўная дума працавала на працягу 5 гадоў, разглядзела 2197 законапраектаў.

На выбарах у IV Думу ў 1912 г. беларускае насельніцтва падзялялася на 3 курыі: рускую, польскую і яўрэйскую. Беларусаў-праваславаўных запісалі ў рускую, католікаў – у польскую курыі. Царская палітыка расколу беларускага этнасу па веравызнанню падтрымлівалася, з аднаго боку, акцябрысцка-чарнасоценнымі, з другога –польскімі клерыкальнымі арганізацыямі.

Партыі ліберальнага лагера, рэвалюцыйна-дэмакратычныя партыі, якія згарнулі сваю дзейнасць у перыяд рэакцыі, на выбарах у IV Думу актывізаваліся. Так, бундаўцы на IX канферэнцыі ў Вене (чэрвень 1912 г.) прынялі палітычную платформу па выбарах у Думу, у якой патрабавалі ўстанаўлення дэмакратычнай рэспублікі, нацыянальнага раўнапраўя і скасавання надзвычайнага становішча, мяжы аседласці і г. д. Бальшавікі на Пражскай канферэнцыі (1912) вырашылі выстаўляць сваіх кандыдатаў, каб з думскай трыбуны прапагандаваць свае ідэі. Але вынікі выбараў былі прадказальнымі.

Па партыйнаму складу дэпутаты ад беларускіх губерняў амаль не адрозніваліся ад папярэдняйДумы (27 правых, 5 краёўцаў, 3 акцябрысты, 1 прагрэсіст). Такім чынам, ад Беларусі ніхто з левых кандыдатаў не трапіў у IV Дзяржаўную думу, якая праіснавала да кастрычніка 1917 г.

Паражэнне першай расійскай рэвалюцыі азначала наступленне новага этапа ў гісторыі дзяржавы, сістэме яе грамадскіх адносін. Буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя насіла незавершаны характар, але гэта не азначала, што яна закончылася безвынікова. Рэвалю-цыйныя падзеі

абудзілі ў мільёнаў людзей цікавасць да сацыяльна-палітычнага і культурнага жыцця. Царскі ўрад пасля 3 чэрвеня 1907 г. перайшоў да больш жорсткіх формаў кіравання. У 1907-1910 гг. на Беларусі было забаронена больш за 40 прафесійных саюзаў, якія ўзніклі ў час рэвалюцыі. На становішчы надзвычайнай і ўзмоцненай аховы знаходзіліся Мінская і Магілёўская губерні, Віцебскі павет, гарады Віцебск, Гродна, Смаргонь.

Дзейнічала Дзяржаўная дума, існавалі легальныя магчымасці работы прафсаюзаў, грамадскіх арганізацый. Царскі ўрад быў вымушаны палітыку рэпрэсій супраць вальнадумцаў праводзіць разам з палітыкай лавіравання і рэформаў.

2. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух.

Беларускі нацыянальны рух пасля рэвалюцыі апынуўся ў цяжкім становішчы. Беларуская сацыялістычная грамада як палітычная партыя перастала існаваць. Яе кіраўнікі сканцэнтравалі сваю ўвагу на легальнай дзейнасці. У гэты час даводзілася весці барацьбу на два фронты – супраць рускіх і польскіх нацыяналістаў, якія не жадалі прызнаваць самастойнасць беларускага народа.

У паслярэвалюцыйны перыяд цэнтрам беларускага нацыянальна-культурнага руху стала газета “Наша ніва”. Яна выдавалася з лістапада 1906 г. па жнівень 1915 г. у Вільні. У склад рэдакцыі ўваходзілі браты Іван і Антон Луцкевічы, В. Ластоўскі, В. Іваноўскі, А. Уласаў. Газета друкавалася кірыліцай (для праваслаўных беларусаў) і лацінкай (для беларусаў-католікаў). “Наша ніва” займала ліберальныя асветніцкія пазіцыі. Галоўным у сваёй дзейнасці “нашаніўцы” лічылі барацьбу за захаванне адзінства беларускага народа, пераадоленне яго рэлігійнага расколу. Значную ўвагу рэдакцыя “Нашай нівы” надавала прапагандзе беларускай нацыянальнай культуры, развіццю беларускай мовы. Пры газеце ствараўся беларускі нацыянальны музей.

З 1910 г. “Наша ніва” выдавала адрасаваны сялянам “Беларускі каляндар”, з 1912 г. сельскагаспадарчы аддзел газеты быў пераўтвораны ў самастойны часопіс “Саха”, а для моладзі пачаў выдавацца літаратурны месячнік “Лучынка”. “Наша ніва” разам з другім буйным беларускім выдавецтвам “Загляне сонца і ў наша ваконца” забяспечвала выхад мастацкай і навукова-папулярнай кніжнай прадукцыі. “Наша ніва” выхавала шэраг беларускіх пісьменнікаў, грамадска-палітычных дзеячаў, навукоўцаў, сярод якіх былі Я. Колас і Я. Купала, А. Пашкевіч (Цётка) і М. Багдановіч, А. Гарун і М. Гарэцкі, З. Бядуля і Ц. Гартны.

Беларуская інтэлігенцыя рабіла намаганні, каб стварыць падмурак для развіцця нацыянальнай школы. З 1906 г. у Пецярбургу пачало дзейнічаць выдавецтва "Загляне сонца і ў наша ваконца", якое займалася выданнем дзіцячай літаратуры і за 8 гадоў надрукавала 38 кніг тыражом больш за 100 тыс. экземпляраў. Кнігі на беларускай мове друкавалі таксама выдавецтвы "Наша ніва", "Беларускае выдавецкае таварыства ў Вільні", "Наша хата", "Палачанін", "Мінчук", "Вясёлкі' "Агранамічнае бюро К. Карповіча".

На Беларусі развіваўся перыядычны друк. Напрацяг 1901-1914 гг. колькасць перыядычных выданняў павялічыла ся з 15 да 125 найменняў. Большасць іх друкавалася на рускай мове, але ў перыядычным друку на беларускай мове выходзілі газеты "Гоман", "Вольная Беларусь", “Грамада”; часопісы "Лучына", "Крапіва", "Раніца", а таксама календары, альманахі.

Тэма 39. Культура Беларусі ў пачатку XX ст.

1. Палітыка ўрада ў галіне адукацыі.

Нягледзячы на станоўчыя дасягненні народнай асветы, як Расійская імперыя ў цэлым, так і Беларусь адставалі ад краін Заходняй Еўропы па асноўных паказчыках развіцця адукацыі. Так, па перапісу 1897 г. Агульная колькасць пісьменных у Беларусі складала толькі 25,7 %. Працэнт навучэнцаў сярод дзяцей школьнага ўзросту быў невысокі.

У галіне пачатковай адукацыі ўрадавая палітыка была накіравана на тое, каб значную частку затрат на ўтрыманне народных вучылішч перакласці на сялян. Шырока практыкаваўся збор сельскай грамадой грашовых сродкаў на будаўніцтва і ўтрыманне народных вучылішч. У выніку большая частка школ знаходзілася ў непрыстасаваных для заняткаў сялянскіх хатах, адчуваўся недахоп вучэбных дапаможнікаў, а таксама кваліфікаваных настаўніцкіх кадраў. Акрамя гэтага, рознатыповасць пачатковых школ, розныя навучальныя праграмы і тэрміны навучання зніжалі якасць падрыхтоўкі, ставячы вучняў у нераўнапраўнае становішча. Толькі выпускнікам гарадскіх чатырохкласных вучылішч дазвалялася паступаць у сярэднія навучальныя ўстановы, але пры ўмове дадатковай падрыхтоўкі па замежных мовах. Выхаванцы астатніх пачатковых школ такога права не мелі.

Сярэдняя адукацыя заставалася прывілеяй пануючых класаў. Навучанне ў сярэдніх навучальных установах з’яўлялася платным. Плата за навучанне ў прыватных школах была значна вышэйшай, чым у дзяржаўных навучальных установах. Сацыяльны склад навучэнцаў сярэдніх школ быў абумоўлены абмежаванасцю колькасці асоб з неабходнай адукацыяй, даволі высокай платай за навучанне, некаторымі пастановамі ўрада. Напрыклад, цыркуляр ад 1887 г., празваны ў народзе“цыркулярам пра кухарчыных дзяцей”, прадпісваў не прымаць у гімназіі і прагімназіі дзяцей кучараў, лакеяў, пароў, прачак, дробных крамнікаў.

Класічныя мужчынскія гімназіі давалі грунтоўную гуманітарную падрыхтоўку, асаблівая ўвага надавалася выкладанню так званых класічных моў – грэчаскай і лацінскай. Толькі выпускнікі гімназій мелі выключнае права паступлення ва універсітэты. У рэальных вучылішчах галоўнае месца адводзілася дысцыплінам прыродазнаўча-матэматычнага цыкла. Выпускнікі рэальных вучылішч маглі паступаць у тэхнічныя, гандлёвыя вышэйшыя навучальныя ўстановы. Выхаванкі жаночых гімназій атрымлівалі атэстат на званне настаўніцы пачатковай школы. Выпускніцам восьмага педагагічнага класа жаночых гімназій давалася права працаваць у якасці дамашніх настаўніц.

У пачатку XX ст. у Расійскай імперыі ў цэлым, а таксама і на тэрыторыі Беларусі адбываецца імклівы рост колькасці пачатковых (народных вучылішч і царкоўна-прыходскіх школ) і сярэдніх (гімназій і рэальных вучылішч) агульнаадукацыйных школ. Пры гэтым разам з дзяржаўнымі навучальнымі ўстановамі адкрываюцца прыватныя школы і вучылішчы.

У гэты перыяд склалася сістэма прафесійнай адукацыі. Колькасны рост агульнаадукацыйных школ вылучаў на першы план праблему падрыхтоўкі настаўнікаў. Калі да 1900 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 4 настаўніцкія семінарыі, то ў 1916 г. іх было ўжо 12. Для падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў былі адкрыты тры настаўніцкія інстытуты – у Віцебску, Мінску, Магілёве. Акрамя таго, падрыхтоўка спецыялістаў у галіне народнай гаспадаркі і культуры ажыццяўлялася ў рамесных, сельскагаспадарчых, камерцыйных, медыцынскіх, музыкальных і мастацкіх навучальных установах. Вышэйшых навучальных устаноў у Беларусі не было. Расійскія ўлады неаднаразова адхілялі хадайніцтвы грамадскасці Беларусі аб адкрыцці універсітэта ці політэхнічнага інстытута.

Пачатак XX ст. звязаны з пашырэннем грамадска-педагагічнага руху за стварэнне беларускай нацыянальнай школы. Прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі засноўвалі тайныя школы, дзе навучанне вялося на беларускай мове. Там выкарыстоўваліся падручнікі Каруся Каганца “Першая навука чытання”, Цёткі “Першае чытанне для дзетак беларусаў”, Якуба Коласа “Другое чытанне для дзетак-беларусаў”.

2. Перыядычны друк і выдавецкая справа.

У пачатку XX ст. працягвалася выданне першай у Беларусі незалежнай ад урада газеты “Минский листок” (пачала выходзіць у 1886 г.). У газеце змяшчаліся матэрыялы беларускіх літаратараў, гісторыкаў, фальклярыстаў. Тут друкавалася паэма “Тарас на Парнасе”, змяшчаліся творы Янкі Лучыны, Каруся Каганца, публікаваліся артыкулы беларускага этнографа М. Янчука, работы па гісторыі і этнаграфіі Беларусі М. Доўнар-Запольскага. У якасці літаратурна-краязнаўчага дадатка да “Минского листка” публікаваўся “Северо-Западный календарь”, які змяшчаў шмат этнаграфічных матэрыялаў. З 1902 г. газета пачала выходзіць пад назвай “Северо-Западный край”. Менавіта на яе старонках з’явіўся першы друкаваны верш Янкі Купалы.

У мясцовых выдавецтвах выходзіла пераважна рэлігійная і багаслоўская літаратура, граматыкі і азбукі, даведнікі, невялікія зборнікі вершаў. Кнігі выдаваліся галоўным чынам на рускай, яўрэйскай і польскай мовах, некалькі кніг у год выходзіла на літоўскай мове.

У канцы XIX– пачатку XX ст. пачынаюць больш шырока друкавацца беларускамоўныя творы. Некалькі асобных выданняў вытрымала паэма “Тарас на Парнасе”, у Пецярбурку выйшаў з друку зборнік вершаў Янкі Лучыны “Вязанка” і некаторыя іншыя творы. У 1906 г. у першым легальным беларускім выдавецтве “Загляне сонца і ў наша ваконца” у Пецярбургу былі выпушчаны “Беларускі лемантар, або Першая навука чытання” Каруся Каганца і “Першае

чытанне для дзетак беларусаў” Цёткі. За выданне зборнікаў вершаў“ Дудка беларуская”, “Смык беларускі” Багушэвіча і “Жалейка” Купалы. Пецярбургскі камітэт па справах друку распачаў крымінальнае праследаванне выдавецтва.

У перыяд рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. з’явілася шмат новых газет і часопісаў розных палітычных напрамкаў, зарадзіўся легальны перыядычны друк на беларускай мове. Напрацягу 1901-1914 гг. колькасць перыядычных выданняў павялічыла ся з 15 да 125 найменняў. Большасць іх друкавалася на рускай мове, але ў перыядычным друку на беларускай мове выходзілі газеты "Наша доля" і "Наша ніва", "Гоман", "Вольная Беларусь", “Грамада”; часопісы "Саха", "Лучына", "Крапіва", "Раніца", а таксама календары, альманахі. Развіццё беларусазнаўства. Выключную ролю ў развіцці культуры беларускай нацыі адыгралі газеты “Наша доля” і“Наша ніва”.

3. Развіццё беларускай літаратуры.

У канцы XIX ст. пачатку XX ст. пачынаецца новы этап у развіцці беларускай літаратуры. Пісьменнікі паступова пераадольвалі вузкае фальклорнае апісальніцтва сваіх папярэднікаў, станавіліся на шлях стварэння развітой літаратуры. Ішоў працэс жанравага ўзбагачэння літаратуры, удасканальвалася вершаскладанне. У гэты час закладваліся асновы сучаснай беларускай літаратуры.

Асноўным жанрам творчасці Янкі Лучыны (І. Неслухоўскага) з’яўляецца лірычны верш. Аўтар пісаў на беларускай мове. Вершы паэта былі сабраны ў зборніку “Вязанка”, які быў выдадзены пасля яго смерці ў 1903 г.

На лепшыя дасягненні літаратуры другой паловы XIX ст. абапіралася беларуская літаратура пачатку XX ст. Новыя тэмы, матывы і вобразы прынесла ў беларускую літаратуру Цётка (А. Пашкевіч). Яе кнігі “Скрыпка беларуская” і “Хрэст на свабоду” сталі першымі арыгінальнымі зборнікамі беларускай паэзіі XX ст. Цётка з’явілася адной з пачынальнікаў апавядальнага жанру. Як таленавіты паэт-наватар, адзін з пачынальнікаў беларускай драматургіі і заснавальнікаў нацыянальнай школы перакладу ўвайшоў у гісторыю беларускай літаратуры Янка Купала (І. Луцэвіч). Ён узняў беларускую літаратуру на якасна новы ўзровень, садзейнічаў фарміраванню і развіццю беларускай літаратурнай мовы. Разам з Янкам Купалам заснавальнікам новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы стаў Якуб Колас (К. Міцкевіч).

Адзіны паэтычны зборнік “Вянок” належыць Максіму Багдановічу, аднак ён дазволіў паэту заняць пачэснае месца сярод класікаў беларускай літаратуры. У пачатку XX ст. раскрыліся творчыя здольнасці Максіма Гарэцкага, Змітрака Бядулі, Цішкі Гартнага, Каруся Каганца і інш. Беларуская літаратура пачала знаходзіць прызнанне ў суседніх, перш за ўсё славянскіх, народаў, паступова ўключацца ў сусветны гісторыка-літаратурны працэс.

Беларускія пісьменнікі неслі ідэі сацыяльнага і нацыянальнага адраджэння, актыўна ўплывалі на духоўнае жыццё народа. "Беларускі народ не tabula rasa, - пісаў М. Багдановіч, - а самастойная нацыянальная велічыня". Ідэі беларускага адраджэння падтрымліваліся дэмакратычнай грамадскасцю ў Расіі, Украіне. Паэтычныя творы беларускіх паэтаў

выдаваліся ў Маскве, Кіеве, Львове і іншых гарадах. "У Беларусі ёсць два паэты: Якуб Колас і Янка Купала - вельмі цікавыя хлопцы. Проста пішуць, так ласкава, журботна, шчыра. Нашым бы крыху такіх якасцей", - такую характарыстыку паэтам даў у свой час М. Горкі.

4. Тэатр і музыка. Архітэктура, выяўленчае мастацтва.

Пад уздзеяннем прафесійнага тэатра ў асяроддзі беларускай інтэлігенцыі наспявала ідэя неабходнасці стварэння беларускага нацыянальнага тэатра прафесійнага тыпу. У пачатку XX ст. арганізоўваюцца шматлікія музычна-драматычныя гурткі і так званыя "беларускія вечарынкі". Там звычайна выступалі хары, чыталіся беларускія літаратурныя творы, ставіліся п'есы.

На традыцыях "беларускіх вечарынак" у 1907 г. узнікла "Першая беларуская трупа" Ігната Буйніцкага. Землямер па прафесіі, сапраўдны патрыёт Ігнат Цярэнцьевіч Буйніцкі на ўласныя сродкі стварыў тэатральную трупу ў асабістым фальварку Палевачы Дзісенскага павета. У 1907 г. замацаваўся пастаянны склад удзельнікаў гэтага калектыву, а ў 1910 г. Пасля ўдзелу ў "Першай беларускай вечарынцы" у Вільні тэатр І. Буйніцкага пераўтварыўся ў прафесійны. У рэпертуары "Першай беларускай трупы" былі песні, танцы, пастаноўкі п'ес, дэкламацыя твораў беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. І. Буйніцкі і яго акцёры займаліся актыўнай гастрольнай дзейнасцю. У час гастроляў па Беларусі І. Буйніцкі дапамагаў мясцовым гурткам, што спрыяла пашырэнню тэатральнага аматарства. У 1911 і 1912 гг. трупа І. Буйніцкага выступіла ў Пецярбургу, у 1913 г. калектыў наведаў Варшаву. Такім чынам І. Буйніцкі знаёміў гледачоў з мастацкай культурай беларускага народа, звяртаў увагу на яе своеасаблівасці і непаўторны нацыянальны каларыт. Энтузіязм І. Буйніцкага, удалы падбор акцёраў і рэпертуара склалі трывалы падмурак поспеху гэтага калектыва. Аднак матэрыяльныя цяжкасці прымусілі І. Буйніцкага ў 1913 г. закрыць тэатр.

З канца XIX ст. ў выяўленчым мастацтве Беларусі з'яўляюцца новыя імёны. Вельмі заметна быў прадстаўлены пейзажны жывапіс. У творчасці таленавітага беларускага мастака Вітольда Бялыніцкага-Бірулі развіваюцца традыцыі рускага лірычнага пейзажу. Ён набыў адукацыю ў Кіеўскай рысавальнай школе і Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства. З 1904 г. ён з'яўляўся членам Таварыства перасоўных выставак. У сваёй творчасці развіваў традыцыі рускага лірычнага пейзажу. Эмацыянальныя і змястоўныя творы мастака вылучаюцца мяккім каларытам. У ранні перыяд былі напісаны пейзажы "З ваколіц Пяцігорска", якую набыў П. Траццякоў для сваёй калекцыі, "Вясна ідзе", што прынесла аўтару першую прэмію Маскоўскага таварыства аматараў мастацтваў. Шчырыя сяброўскія адносіны звязвалі мастака з І. Рэпіным.

Віды беларускай прыроды натхнялі ўраджэнца Ашмянскага павета Фердынанда Рушчыца. У яго лепшых работах "Зямля", "Стары млын", "Эмігранты" спалучаюцца пейзажны і бытавы жанры. У работах Сяргея Жукоўскага пейзажны жывапіс цесна звязаны з інтэр'ерам і нацюрмортам.

Вядомасць набылі пейзажныя палотны Генрыха Вейсенгофа “Снег”, “Могілкі ў Русаковічах”, на якіх мастак адлюстраваў віды мястэчка Русаковічы Мінскай губерні, дзе ён жыў працяглы час.

Партрэтны і бытавы жанры былі прадстаўлены ў творчасці Юдаля Пэна. Яго палотны“Аўтапартрэт у саламяным капелюшы”, “Гадзіншчык”, “Стары кравец” выкананы ў рэалістычнай манеры і адлюстроўваюць яўрэйскі побыт і традыцыі. Творчая спадчына мастака вельмі вялікая і разнастайная. Пэн набыў вядомасць і ў якасці педагога. Яго намаганнямі ў Віцебску была адкрыта прыватная мастацкая школа. Самым вядомым вучнем Пэна стаў Марк Шагал. Вялікае месца ў яго творчасці займаў родны Віцебск з яго яўрэйскім местачковым побытам, які мастак адлюстроўваў у сімвалічна-містычным духу. Тэмы і матывы беларускай гісторыі выкарыстоўваў таленавіты мастак Я. Драздовіч, стварыўшы серыю графічных работ і скульптурных партрэтаў дзеячаў гісторыі Беларусі.

У пачатку XX ст. у архітэктуры Беларусі працягваў існаваць стыль гістарызм. Архітэктары па-ранейшаму займаліся стылізатарствам, выкарыстоўваючы прыёмы і формы, уласцівыя дойлідству папярэдніх перыядаў.

У каталіцкай культавай архітэктуры наглядаецца росквіт неагатычнага стылю. Неагатычныя пабудовы ўзводзіліся з чырвонай добра абпаленай цэглы, прычым фасады не атынкоўваліся. Найбольш багатыя храмы мелі вітражы, падлогу з паліраваных керамічных плітак, фрэскавы роспіс. Праваслаўная культавая архітэктура, як і ў папярэдні перыяд, знаходзілася пад уплывам візантыйскага і старажытнарускага дойлідства. Мемарыяльная капліца ў в. Лясная. Мемарыяльная капліца ў в. Лясная (цяпер Слаўгарадскі раён) была ўзведзена архітэктарам А. Гогенам у гонар 200-годдзя перамогі рускіх войскаў над шведамі ў бітве, якая адбылася ў1708 г. Лаканічнасць і манументальнасць помніка надаюць яму асаблівую велічнасць.

У архітэктуры Беларусі склаўся неараманскі стыль. Найбольш вядомы помнік, які спалучае матывы раманскай і гатычнай архітэктуры, – Чырвоны касцёл у Мінску(касцёл Сымона і Алены). Пабудова вытрымана ў раманскім стылі з дабаўленнем некаторых элементаў готыкі і мадэрна. Кампазіцыя касцёла складаецца з некалькіх злучаных паміж сабой аб’ёмаў і трох вежаў (дзвюх маленькіх і адной вялікай). Касцёл быў пабудаваны з чырвонай цэглы, якая шырока выкарыстоўвалася ў архітэктуры неаготыкі і мадэрна. Фундатарамі пабудовы Мінскага касцёла выступілі памешчык Эдвард Вайніловіч і яго жонка, якія вырашылі ўзвесці касцёл у памяць аб сваіх памершых дзецях.

Побач з “архітэктурай гістарызму” з канца XIX ст. Адбываецца станаўленне новага стылю – мадэрна. Для помнікаў мадэрна характэрны пераплеценыя лініі, асіметрычныя кампазіцыі, багаты ляпны дэкор. Мадэрн прынёс новыя тыпы пабудоў(чыгуначныя вакзалы, масты, прамысловыя збудаванні), новыя будаўнічыя матэрыялы і канструкцыі(цэмент, металічная арматура, фабрычная дахоўка). У стылі мадэрн у Беларусі ўзводзіліся вакзалы, банкі, навучальныя ўстановы, даходныя дамы, сядзібы, некаторыя культавыя пабудовы. Прыкладамі архітэктуры мадэрна

з’яўляюцца гасцініца “Еўропа” у Мінску, будынак Лужаснянскага сельскагаспадарчага вучылішча і інш. Гасцініца “Еўропа” была пабудавана ў 1906 – 1907 гг. Яе шасціпавярховы будынак з’яўляўся адным з найбольш значных дасягненняў архітэктуры мадэрна ў Мінску. Мадэрн праіснаваў на тэрыторыі Беларусі да Першай сусветнай вайны, аднак шырокага распаўсюджання не набыў.

Тэма 40. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны і Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.

1. Прычыны і пачатак вайны. Ваенныя дзеянні на германска-расійскім (Усходнім) фронце ў 1914—1916 гг.

У пачатку XX стагоддзя ў Еўропе склалася два ваенна-палітычных саюза – Антанта (Англія, Францыя, Расія) і Траісты саюз (Германія, Аўстра-Венгрыя, Італія). Краіны Траістага саюза, асабіста Германія, лічылі, што яны несправядліва абдзелены калоніямі і рынкамі збыту. Краіны ўпарта рыхтаваліся да вайны. Зачэпкай для яе з’явілася забойства тэрарыстамі наследнага прынца Аўстра-Венгрыі, эрцгерцага Фердынанда. 1 жніўня 1914 года пачаліся ваенныя дзеянні, у якія хутка ўцягнулася 33 краіны з насельніцтвам 1,5 млрд. чалавек.

Згодна з распрацаванымі планамі ваенных дзеянняў Германія разлічвала спачатку разбіць Францыю, а затым Расію. Уварваўшыся праз тэрыторыю нейтральнай Бельгіі ў межы Францыі, немцы стварылі рэальную пагрозу для Парыжа.

Расія планавала нанесці галоўны ўдар па Аўстра-Венгрыі ў напрамку Галіцыі, што давала магчымасць пранікнуць на Балканы і да праліваў Басфор і Дарданелы.

З пачатку 1915 г. асноўныя сілы Германіі знаходзіліся на Усходнім фронце. У выніку нямецкага наступлення расійскія войскі ў чэрвені 1915 г. пакінулі Галіцыю, страціўшы каля 600 тыс. палоннымі, забітымі, параненымі. Захапіўшы Галіцыю, Германія сканцэнтравала галоўныя сілы на польскім тэатры ваенных дзеянняў. Расійскія войскі, церпячы паражэнне за паражэннем у Польшчы, у ліпені 1915 г. здалі Варшаву. Пры наступленні на Варшаву германскае камандаванне ўпершыню выкарыстала газавую атаку, у выніку якой загінула 9 тыс. расійскіх салдат.

Акупацыя немцамі Заходняй Беларусі. Фронт імкліва набліжаўся да Беларусі. У жніўні 1915 г. пачалося нямецкае наступленне ў напрамку Коўна– Вільня– Мінск. Пасля няўдалай спробы ўзяць Вільню нямецкія войскі пачалі новае наступленне і 9 верасня 1915 г. прарвалі фронт у ваколіцах Свянцян. Пранікнуўшы ў тыл расійскіх войск, немцы захапілі Вілейку і наблізіліся да Маладзечна. Асобныя нямецкія злучэнні дайшлі аж да Смалявіч і Барысава. Стаўка расійскага Вярхоўнага галоўнакамандуючага была пераведзена з Баранавіч у Магілёў.

У сярэдзіне верасня 1915 г. наступленне нямецкіх войск было спынена. У ваколіцах Маладзечна, Вілейкі і Смаргоні вораг быў разбіты. Немцы

адступілі ў раён азёр Нарач– Свір. 810 дзён і начэй ішлі ўпартыя баі за г. Смаргонь, які быў цалкам разбураны і ўвайшоў у гісторыю як “мёртвы горад” і “месца жорсткіх газавых атак немцаў”. Нездарма тады салдаты гаварылі: “Кто под Сморгонью не бывал, тот войны не видал”. У кастрычніку 1915 г. фронт стабілізаваўся па лініі Дзвінск– Смаргонь– Баранавічы– Пінск.

Ліквідаваць наступствы Свянцянскага прарыва нямецкай арміі павінна было наступленне рускай арміі летам 1916 года. Аднак яно было дрэнна падрыхтавана, пачалося раней прызначанага тэрміну па просьбе саюзнікаў, якія цярпелі паражэнне пад Вердэнам. З гэтых прычын Нарачанская наступальная аперацыя рускай арміі была амаль безвыніковай. Страты арміі склалі каля 90 тыс. чалавек. Безвынікова скончылася і Баранавіцкая наступальная аперацыя ў червені-ліпені 1916 года. Пасля гэтага лінія фронту стабілізавалася да канца 1917 года.

2. Становішча на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі.

Напярэдадні і ў першыя дні вайны заходнія, у тым ліку беларускія губерні, былі аб’яўлены на ваенным становішчы. Забараняліся забастоўкі, сходы, шэсці, маніфестацыі, уводзілася ваенная цэнзура. У сувязі з наступленнем германскіх войск рушыў на ўсход вялікі паток бежанцаў з Польшчы, Літвы і заходніх паветаў Беларусі (больш за 1,3 млн. чалавек). На абаронныя работы(капанне акопаў, будаўніцтва мастоў, рамонт дарог, ахову вайсковых аб’ектаў і інш.) прыцягвалася ўсё насельніцтва прыфрантавой паласы. Пачаліся масавыя рэквізіцыі жывёлы, прадуктаў харчавання і фуражу.

Рэквізіцыі і прымусовыя работы на патрэбу фронту праводзілі і германскія ўлады. Акупанты сілай забіралі ў сялян коней, кароў, іншую жывёлу, прадукты, фураж, адзенне, абутак, прымушалі выконваць розныя павіннасці. Асабліва цяжка адбівалася вайна на гаспадарцы. На неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў 1914 – 1917 гг. з-за адсутнасці сыравіны і паліва колькасць буйных прадпрыемстваў скарацілася з 829 да 297, а рабочых з – 37,7 тыс. Да 25,1 тыс. Разам з тым асобныя галіны (швейная, абутковая, металаапрацоўчая і інш.), што выконвалі ваенныя заказы, значна павялічылі выпуск прадукцыі. Былі перабудаваны многія фабрыкі і заводы, а таксама створана шмат часовых прадпрыемстваў і майстэрань, якія абслугоўвалі армію.

На вытворчасць боепрыпасаў, транспартных сродкаў і іншага вайсковага рыштунку былі пераключаны ўсе прадпрыемствы металаапрацоўчай прамысловасці. Снарады і гранаты выраблялі5 заводаў у Мінску і тры ў Гомелі. Бомбы выраблялі Рэчыцкі і Аршанскі драцяна-цвіковыя заводы. У Гомелі, Оршы, Віцебску, Мінску і іншых пунктах былі створаны майстэрні для вырабу і рамонту зброі і транспартных сродкаў.

У некалькі разоў павялічылі аб’ём вытворчасці прадпрыемствы хлебапякарна-сухарнай прамысловасці. Вялікія заказы ваеннага ведамства па забеспячэнні арміі вопраткай і абуткам выконваліся на Віцебскай ільнопрадзільнай фабрыцы “Дзвіна”, Дубровенскай бавоўна-прадзільнай

фабрыцы, Магілёўскай панчошнай фабрыцы, іншых прадпрыемствах, а таксама ў дробных майстэрнях і асобнымі саматужнікамі.

У выключна цяжкім становішчы апынулася сельская гаспадарка Беларусі. Больш за палову ўсіх працаздольных мужчын беларускай вёскі было мабілізавана і адпраўлена на фронт. Толькі з Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў было прызвана ў армію 634 400 чалавек. За гады вайны скараціліся пасяўныя плошчы Беларусі: жыта – на18,7 %, пшаніцы– на22,1 %, бульбы – на 34,2 %.

З-за моцнага заняпаду сельскай гаспадаркі амаль перасталі паступаць на рынак прадметы першай неабходнасці, што выклікала рост цэн, зніжэнне жыццёвага ўзроўню народа. Цэны на прадукты харчавання і адзенне ў Беларусі да 1917 г. павялічыліся ў 5 – 8 разоў у параўнанні з 1913 г. Ва ўмовах надзвычайнай галечы, вялікай скучанасці насельніцтва і голаду ў прыфрантавых губернях шырока распаўсюдзіліся розныя эпідэмічныя хваробы – тыф, халера і інш. Пачынаючы з 1915 г., у Беларусі нарастаў рабочы рух. У красавіку 1915 г. адбылося выступленне рабочых і служачых Гомельскага чыгуначнага вузла. Летам таго ж года баставалі рабочыя дэпо Лібава-Роменскай чыгункі ў Гомелі. У 1916 г. стачачны рух ахапіў 11 населеных пунктаў Беларусі, у ім удзельнічала 1 800 чалавек. Асноўным патрабаваннем стачачнікаў з'яўлялася павышэнне заработнай платы.

Аднак стачкі ў Беларусі адбываліся разрознена, у іх удзельнічала толькі частка рабочых. Масавага рабочага руху не назіралася. Гэта было абумоўлена прыфрантавым становішчам Беларусі, перанасычанасцю яе тэрыторыі войскамі, паліцыяй, жандармерыяй. Арганізатараў стачак арыштоўвалі і накіроўвалі на фронт.

Сялянскі рух у Беларусі ў гады вайны набыў своеасаблівую форму – разгром памешчыцкіх маёнткаў, харчовых магазінаў і лавак. У пачатку вайны падобныя выпадкі адбыліся ў 20 з 35 паветаў Беларусі. Па сутнасці, гэта былі стыхійныя пагромы, якія суправаджаліся рабаваннем маёмасці памешчыкаў і гандляроў. Значна пашырыліся сялянскія хваляванні ў1915 г. у сувязі з перанясеннем баявых дзеянняў на тэрыторыю Беларусі і ростам рэквізіцый. На працягу 1915 г. Адбылося 99 сялянскіх выступленняў. У 1916 г. іх колькасць зменшылася да 60, у студзені – лютым 1917 г. – да 7.

Ваенныя паражэнні расійскай арміі, велізарныя людскія страты выклікалі незадаволенасць салдат. У войсках успыхнулі хваляванні, звязаныя з дрэнным забеспячэннем прадуктамі харчавання і абмундзіраваннем, недахопам зброі і боепрыпасаў. Усяго ў Беларусі ў перыяд вайны адбыліся 62 значныя хваляванні салдат. Павялічвалася дэзерцірства. Цэлыя вайсковыя часці і злучэнні адмаўляліся ісці ў наступленне. Узмацнілася антыўрадавая агітацыя сярод салдат.

22 кастрычніка 1916 г. адбылося паўстанне салдат, казакоў і матросаў на размеркавальным пункце ў Гомелі. Паўстанне ўспыхнула ў сувязі з арыштам аднаго з казакоў. На яго абарону выступілі каля 4 тыс. салдат і матросаў, якія абяззброілі каравул гаўптвахты і вызвалілі з-пад арышту больш за 800 чалавек. 26 кастрычніка салдаты-паўстанцы разагналі паліцэйскі атрад, які займаўся вобыскамі. Паустанцы былі жорстка пакараны. Да суда было прыцягнута 16

чалавек. З іх 9 было расстраляна, а астатнія адпраўлены на катаргу і ў арыштанцкія роты. Але спыніць працэс разлажэння арміі ўжо было нельга, яна паступова станавілася небаяздольнай.

3. Палітыка нямецкай акупацыйнай адміністрацыі. Беларускі нацыянальны рух у гады вайны.

Пад акупацыяй аказалася чацьвёртая частка Беларусі, якая была ўключана ў склад "зямлі Обер-Ост". Акупацыйны рэжым характаразаваўся ўзмоцненай эканамічнай эксплуатацыяй рэгіёна з наступнай яго каланізацыяй.

Ва ўмовах вайны на Беларусі эканамічная сітуацыя мела свае адметнасці. Тэрыторыя Беларусі была падзелена на дзве часткі – заходнюю пад нямецкай акупацыяй, і ўсходнюю, якая кантралявалася рускай арміяй. На Заходнім фронце было каля 1,5 млн. салдат і афіцэраў, утрыманне іх было ўскладзена на беларускую гаспадарку. На акупаванай намцамі тэрыторыі быў устаноўлены рэжым канфіскацый (сістэма падаткаў і штрафаў). Натуральны падатак уключаў воўну, авёс, скуры, масла, метал, паперу і інш. Падаткамі абкладаліся бойні, рынкі, відовішчныя ўстановы, бальніцы і г.д.

Шырокі размах набыло бежанства. Яно было вынікам прымусовага высялення сялян з пакідаемых арміяй тэрыторый (маёмасць знішчалася ваеннымі) і дабравольнага перасялення. Колькасць бежанцаў дасягнула 1,3 млн. чалавек. Перасяленне беларускіх гарадоў выклікала скучанасць, рост цэн на харчаванне, эпідэміі тыфу і халеры. У кастрычніку 1915 г. быў дадзены загад перасяліць бежанцаў у прымусовым парадку за Днепр.

Немцы захапіўшыя заходнюю частку Беларусі, імкнуліся дзейнічаць больш гнутка ў параўнанні з царскім урадам у адносінах да нацыянальных праблем. Больш таго, нямец-кая адміністрацыя паспрабавала выкарыстаць беларускі нацыянальны рух у сваіх мэтах.

У пачатку 1916 г. фельдмаршал Гіндэнбург у загадзе пра школы ў акупірава-ным краі абвясціў беларускую мову раўнапраўнай з польскай, літоўскай і яўрэйскай мовамі.

На захопленай Германіяй тэрыторыі вядомыя беларускія дзеячы, браты Іван і Антон Луцкевічы, В. Ластоўскі і іншыя выступілі з ідэяй стварэння канфедэрацыі Літвы і Заходняй Беларусі ў форме Вялікага княства Літоўскага з сеймам у Вільні. У лютым 1916 г. была распаўсюджана адозва "Грамадзяне!", у якой намячалася стварэнне самастойнай дзяржавы з соймам у Вільні. Аднак утварыць канфедэрацыю не ўдалося. Германскі ўрад не быў зацікаўлены ў такой дзяржаве. Акупіраваўшы Вільню, германскае камандаванне абвясціла аб тым, што беларускія землі будуць падпарадкоўвацца "Польскай Кароне". У сувязі з гэтым польскія памешчыкі і ксяндзы, карыстаючыся падтрымкай акупантаў, пачалі настойліва ажыццяўляць паланізацыю беларускага насельніцтва. На акупіраванай беларускай тэрыторыі была створана шырокая сетка польскіх школ, розных згуртаванняў польскай "злучнасці". Прымусовая паланізацыя выклікала абурэнне мясцовага насельніцтва. Пачаліся спрэчкі паміж палякамі і беларусамі. Гэта прывяло да адмаўлення ідэі ўтварэння канфедэратыўнай

дзяржавы Польшчы і Беларусі. Больш таго, у самім беларускім нацыянальным руху адбыўся раскол. Група беларускіх дзеячаў на чале з В. Ластоўскім заснавала тайную арганізацыю “Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі”, якая ставіла сваёй мэтай утварыць незалежную Беларусь у яе этнаграфічных межах.

Германія, намагаючыся ўмацаваць сваю ўладу на акупіраванай тэрыторыі, ажыццявіла адпаведныя захады, каб, з аднаго боку, не даць магчымасці стварыць тут самастойную дзяржаву, а з другога– прадухіліць польскае засілле на гэтых землях. У пачатку 1916 г. у германскім загадзе аб школах акупіраванага краю беларуская мова абвяшчалася раўнапраўнай з польскай, літоўскай і яўрэйскай мовамі. Беларускі нацыянальны рух значна ажывіўся.

На акупіраванай тэрыторыі былі адчынены беларускія школы, створаны выдавецтвы. Пачалося выданне на беларускай мове газет, часопісаў. Стала выходзіць газета “Гоман”. У Вільні былі створаны “Беларускі клуб”, згуртаванне “Золак”, “Навуковае таварыства”, “Беларускі вучыцельскі саюз” і інш. Кіраваў усёй гэтай работай створаны ў 1915 г. у Вільні Беларускі народны камітэт, які ўзначальваў А. Луцкевіч. Прадстаўнікі камітэта прынялі ўдзел у рабоце канферэнцый прыгнечаных народаў Расіі, якія былі арганізаваны немцамі ў Стакгольме і Лазане ў красавіку і чэрвені 1916 г. Там яны прасілі дапамогі ў народаў Еўропы ў вызваленні беларускага народа “з-пад расійскай акупацыі”.

У канцы 1916 г. Беларускі народны камітэт спрабаваў дамовіцца з Літоўскім нацыянальным камітэтам аб утварэнні агульнай літоўска-беларускай дзяржавы. Аднак Літоўскі нацыянальны камітэт адмовіўся ад перагавораў, канчаткова разарваў сувязь не толькі з Беларускім народным камітэтам, але і з польскім і яўрэйскім нацыянальнымі камітэтамі і ўтварыў у Вільні Літоўскую дзяржаўную раду (Тарыбу) як вярхоўны дзяржаўны орган Літвы. У склад гэтай літоўскай дзяржавы былі ўключаны і акупіраваныя Германіяй беларускія землі. Беларусь атрымала ў Тарыбе два месцы.

Паступова галоўнымі цэнтрамі беларускага нацыянальнага руху па-за межамі краю сталі Петраград, Масква і іншыя расійскія гарады, дзе бежанцы-беларусы ўтварылі свае суполкі. У кастрычніку 1916 г. Міністэрства ўнутраных спраў Расіі дазволіла выданне ў Петраградзе беларускіх газет “Дзянніца” і “Светач”.

Газета “Светач” прапагандавала ідэі адзінства беларусаў незалежна ад іх класавай прыналежнасці, заклікала ўсе грамадскія сілы да ажыццяўлення “беларускага нацыянальнага ідэалу”. Аднак газета не мела вялікага ўплыву на развіццё беларускага нацыянальнага руху. У пачатку 1917 г. яе выданне спынілася.

Газету “Дзянніца” выдаваў на свае сродкі З. Жылуновіч. Яна ўздымала вострыя сацыяльныя праблемы, пытанні развіцця беларускай культуры, асуджала палітыку нямецкіх акупацыйных улад, прапагандавала думку, што свабоднае развіццё беларускага народа магчыма толькі ў саюзе з рускім народам. У газеце друкаваліся творы З. Жылуновіча, К. Буйло, К. Чарнушэвіча, Ф. Шантыра і іншых дзеячаў, якія стаялі на рэвалюцыйна-дэмакратычных

пазіцыях. Рэвалюцыйна-нацыянальны кірунак газеты выклікаў падазронасць у цэнзуры. Цэнзары выкідалі з газеты ўсе матэрыялы аб становішчы ў Беларусі, абвінавачвалі газету ў тым, што яна нібыта служыла Германіі. У снежні 1916 г. “Дзянніца” перастала выходзіць. Далейшай актывізацыі беларускага нацыянальнага руху спрыяла Лютаўская рэвалюцыя 1917 г.

Тэма 40. Беларусь ў час Лютайўскай рэвалюцыі 1917 г.

1. Падзеі Лютаўскай рэвалюцыі на Заходнім фронце. Палітычнае развіццё.

Сацыяльна-эканамічны лад, стан гаспадаркі не вытрымалі таго напружання, якога патрабавала небывалая па маштабах вайна. Гаспадарчая разруха ўсё больш паглыблялася. Фронт, не атрымліваючы самага неабходнага, ледзь трымаўся. У многіх гарадах Расіі рэальнай стала пагроза голаду і галодных бунтаў даведзеных да адчаю людзей. Народныя масы патрабавалі міру, хлеба і свабоды. Зняць напружаныя абставіны цар і яго ўрад не маглі.

Пачатак рэвалюцыі паклалі забастоўкі, вулічныя мітынгі і дэманстрацыі ў Петраградзе, праведзеныя 23 лютага 1917 г. у сувязі з Міжнародным жаночым днём. Неўзабаве выступленні рабочых і салдат перараслі ва ўзброенае паўстанне. 2 сакавіка цар Мікалай II адрокся ад прастола на карысць брата Міхаіла, які на другі дзень таксама адмовіўся ад прастола.

Рэальная ўлада ў сталіцы перайшла да Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, які сфарміраваўся ў ходзе паўстання і абапіраўся на яго ўзброеныя сілы. Вядучыя пазіцыі ў Савеце занялі эсэры і меншавікі. Адначасова, пры актыўным удзеле ранейшай думскай апазіцыі, сфарміраваўся Часовы ўрад, які ўзначаліў князь Г. Львоў. Болыяасць месцаў у ім занялі кадэты. Дэмакратычны лагер ва ўрадзе прадстаўляў міністр юстыцыі сацыяліст А. Керанскі, які адначасова з'яўляўся намеснікам старшыні Петраградскага савета. Савет падтрымаў Часовы ўрад, стварыўшы пры гэтым назіральны камітэт за яго дзейнасцю. Узгодненая праграма Часовага ўрада і Петраградскага савета складалася з наступных палажэнняў: амністыя палітычным вязням, свабода слова, друку і г. д., скасаванне нацыянальных абмежаванняў, падрыхтоўка да склікання Устаноўчага сходу (парламента), замена паліцыі народнай міліцыяй, выбары ў орга ны мясцовага самакіравання, невывад войскаў рэвалюцыйнага Петраградскага гарнізона на фронт, прадстаўленне салдатам грамадзянскіх правоў. Канчаткова пытанне аб будучым дзяржаўным ладзе павінна было вырашыцца ва Устаноўчым сходзе.

Звесткі аб перамозе рэвалюцыі ў Петраградзе прыйшлі на Беларусь 1 сакавіка. Па прыкладу Петраграда ў гарадах і мястэчках Беларусі ствараліся саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў, народная міліцыя

Асаблівая ўвага была звернута на ўтварэнне Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У Мінску ўжо4 сакавіка адбылося першае пасяджэнне выбраных дэпутатаў, дзе быў створаны Мінскі Савет рабочых дэпутатаў і яго выканаўчы камітэт. Каб аб’яднаць сілы пралетарыяту і салдат, 8 сакавіка быў створаны адзіны Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў і адзіны выканаўчы камітэт.

Саветы былі створаны і ў іншых гарадах Беларусі. На працягу сакавіка–красавіка 1917 г. арганізацыйна аформілася 37 Саветаў. Сваю асноўную задачу Саветы бачылі ў арганізацыі рабочых і салдат, у абароне іх эканамічных інтарэсаў і палітычных правоў. Саветы актыўна ўдзельнічалі ў стварэнні народнай міліцыі, фабрычна-заводскіх камітэтаў і прафсаюзаў рабочых і служачых, салдацкіх камітэтаў у войску, сялянскіх у вёсцы. Саветы ў Беларусі прызнавалі кіруючую ролю Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Разам з тым яны прызнавалі і Часовы ўрад. Больш таго, яны дапамагалі Часоваму ўраду ствараць яго мясцовыя органы ўлады. Амаль ва ўсіх гарадах Беларусі былі створаны буржуазныя "грамадскія камітэты парадку".

Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў не толькі прызналі іх, але нават накіравалі сваіх прадстаўнікоў у гэтыя камітэты, фактычна падпарадкоўваючыся ім. Правадзнікамі такой палітыкі ў Саветах былі эсэры, меншавікі і бундаўцы, якія складалі пераважную большасць дэпутатаў. 4 сакавіка 1917 г. ў Мінску быў створаны "Часовы грамадскі камітэт парадку", у склад якога ўвайшлі і прадстаўнікі Мінскага Савета. 6 сакавіка 1917 г. Часовы ўрад перадаў уладу ў губернях і паветах сваім камісарам, якія выконвалі функцыі губернатараў. Ім падпарадкоўваліся ўсе мясцовыя органы ўлады.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі фактычна склаліся два лагеры буржуазна-памешчыцкі, які быў супраць радыкальных сацыяльна-эканамічных пераўтварэшіяў, і рэвалюцыйна-дэмакратычны, які адстойваў інтарэсы незаможных і маламаёмасных слаёў насельніцтва.

Палітычны працэс на Беларусі меў свае асаблівасці. Пачынаючы з сакавіка 1917 г., тут адбываўся інтэнсіўны працэс утварэння беларускіх нацыянальных партый. Акрамя іх, актыўна дзейнічалі губернскія арганізацыі агульнарасійскіх партый кадэтаў, сацыялістаў-рэвалюцыянераў, меншавікоў, бундаўцаў, народных сацыялістаў, анархістаў і інш. Адзіных кіруючых і нават каардынуючых цэнтраў, акрамя бальшавікоў, бундаўцаў і эсэраў, гэтыя партыі не мелі.

Палітыку Часовага ўрада на Беларусі актыўна праводзілі арганізацыі партыі кадэтаў, якая пасля Лютаўскай рэвалюцыі фактычна стала кіруючай. Кадэтаў падтрымлівалі эсэры і меншавікі, якія складалі левы спектр палітычных сіл Беларусі. Эсэры пасля звяржэння царызму схілілі на свой бок частку рабочых, вялікую колькасць сялян і салдат.

Партыя эсэраў лічыла неабходным "устанаўленне дэмакра-тычнай рэспублікі з шырокай аўтаноміяй абласцей і абшчын, як гарадскіх, так і сельскіх". Пры гэтым эсэры дапускалі федэрацыю толькі ў адносінах паміж некаторымі нацыянальнасцямі, прызнавалі за імі
права на самавызначэнне.

Меншавікі, як і бундаўцы, першапачаткова ўваходзілі ў склад аб'яднаных сацыял-дэмакратычных арганізацый. Аднак пасля VII Усерасійскай канферэнцыі РСДРП(б) (красавік 1917 г.) пачаўся працэс размежавання бальшавікоў з меншавікамі і бундаўцамі.

Уплыў бальшавікоў у параўнанні з іншымі партыямі першапачаткова

на Беларусі быў нязначным. Малалікія бальшавіцкія групы ўваходзілі ў склад аб'яднаных сацыял-дэмакратычных арганізацый.У практычнай дзейнасці бальшавікі Беларусі зыходзілі з ленінскай стратэгіі перарастання рэвалюцыі ў сацыялістычную, з апорай на пралетарыят і незаможных сялян.

2. Рабочы рух. Дэмакратызацыя арміі. Абуджэнне вёскі.

Рабочыя працягвалі ствараць свае прафесійныя саюзы. Паспяхова працавалі прафсаюзы чыгуначнікаў, друкароў, пекараў, краўцоў. У маі 1917 г. у Мінску было арганізавана 20 прафсаюзаў, якія аб'ядналі каля 10 тыс. рабочых. Прафесійныя саюзы былі створаны ў Гомелі, Віцебску, Оршы, Полацку, Рагачове і іншых гарадах Беларусі.

У першыя дні рэвалюцыі пачалі стварацца прафсаюзы, якія павялі барацьбу за паляпшэнне эканамічнага становішча працоўных, скарачэнне рабочага дня, павелічэнне зарплаты і інш.

Рэвалюцыя паклала пачатак дэмакратызацыі войска. Сталі ствараццa выбарныя салдацкія камітэты, якія павінны былі забяспечыць магчымасць для салдат удзельнічаць у палітычным жыцці краіны, садзейнічаць росту іх культурнага ўзроўню і палітычнай свядомасці.

7–17 красавіка 1917 г. у Мінску адбыўся I з'езд ваенных і рабочых дэпутатаў армій і тылу Заходняга фронту. Адным з галоўных арганізатараў з'езда быў Мінскі Савет рабочых і салдатскіх дэпутатау. З'езд прызнаў неабходным для Расіі працягваць вайну з мэтай абароны рэвалюцыі.

20 красавіка 1917 г. у Мінску адкрыўся з'езд сялянскіх дэпутатаў Мінскай і неакупіраваных Германіяй паветаў Віленскай губерні. Старшыней з'езда быу абраны М. Фрунзе. Дэлегаты з'езда выступілі за пераход усёй зямлі ў агульнанародную ўласнасць і ўраўняльнае землекарыстанне па працоўнай норме, за адмену прыватнай уласнасці на зямлю, забарону яе куплі-продажу. Канчатковае заканадаўчае вырашэнне аграрнага пытання з'ездам адкладвалася да Устаноўчага сходу. Як бачна, у вырашэнні аграрнага пытання з'езд стаяў на эсэраўскіх пазіцыях. За эсэрамі пайшлі сялянскія з'езды Магілёўскай і Віцебскай губерняў.

3. Канец дваеўладдзя.

Новая хваля рэвалюцыйнага руху ў чэрвені з'явілася адказам народа на падрыхтоўку Часовым урадам летняга наступлення на фронце. Выконваючы пастанову Мінскага савета, адзінаццаць палкоў 2-й арміі, 2-гі каўказскі корпус, шэраг палкоў 10-га армейскага корпуса, 724-ты полк 181-й дывізіі 3- й арміі адмовіліся выконваць загад аб наступленні.

Наступленне рускіх войскаў на Паўднёва-Заходнім фронце закончылася няўдачай. На працягу 10 дзён было забіта і паранена каля 60 тыс. салдат і афіцэраў. Цяжкія страты панеслі і арміі Заходняга фронту. Толькі адна 10-я армія страціла дзесяткі тысяч чалавек. Міністры-кадэты 2 ліпеня выйшлі з Часовага ўрада, імкнучыся перакласці на сваіх былых партнёраў – меншавікоў і эсэраў – адказнасць за крызіс, які яшчэ

працягваўся, і правал наступлення на фронце. У час дэманстрацыі 3-4 ліпеня ў Петраградзе супраць маніфестантаў Часовым урадам была ўжыта зброя. Больш за 400 чалавек было забіта і паранена.

Ліпеньскі палітычны крызіс быў больш глыбокі ў параўнанні з папярэднімі і азначаў канец двоеўладдзя. Ён сведчыў, што падстаў для прымірэння не было. Нават тое, што 8 ліпеня старшынёй Часовага ўрада стаў эсэр А. Керанскі, а ЦВК Саветаў аб'явіў Часовы ўрад "урадам выратавання рэвалюцыі", не азначала змены ў палітычным жыцці краіны.

Пасля ліпеньскіх падзей у Петраградзе, пачалося наступленне правых і ў Бе ларусі. Праводзіліся арышты бальшавікоў, рэвалюцыйна настроеных салдат. Толькі ў мінскай турме на гаўптвахтах і спецыяльна прыстасаваных памяшканнях утрымлівалася халя 3 тыс. зняволеных.

Падзеі 3–4 ліпеня1917 г. (правал наступлення на фронце, расстрэл дэманстрацыі ў Петраградзе) змянілі сітуацыю ў краіне. Двоеўладдзе скончылася поўнай перамогай часовага урада. Перыяд мірнага развіцця рэвалюцыі (27 лютага– 4 ліпеня 1917 г.) быў завершаны.

Тэма 41. Беларускі нацыянальны рух у перыяд ад лютага да кастрычніка 1917 г.

1. Утварэнне беларускіх нацыянальных партый і арганізацый. Аднаўленне дзейнасці БСГ.

Пасля падзення самаўладдзя беларускі нацыянальны рух уступіў у якасна новы этап развіцця. Адмена Часовым урадам 3 сакавіка нацыянальных, саслоўных і рэлігійных абмежаванняў дала магчымасць арганізавацца беларускім грамадска-палітычным партыям, розным па сваёй сацыяльна-класавай сутнасці і палітычнай арыентацыі. З сакавіка па лістапад 1917 г. на Беларусі і сярод бежанцаў-беларусаў дзейнічала каля 26 палітычныіх партый і арганізацый. У іх ліку 14 беларускіх нацыянальных партый, якія з пэўнай доляй умоўнасці можна падзяліць на кансерватыўна-клерыкальныя, ліберальна-дэмакратычныя, рэвалюцыйна-дэмакратычныя і сацыялістычныя накірункі.

Кансерватыўныя, памешчыцка-клерыкальныя партыі і арганізацыі – Беларускі саюз зямельных уласнікаў, Саюз беларускага праваслаўнага духавенства, Заходне-Рускае таварыства ў Петраградзе з'яўляліся выразнікамі інтарэсаў буйных і сярэдніх землеўласнікаў, праваслаўнага духавенства і вышэйшага чыноўніцтва. Асновай ідэалогіі гэтага тыпу арганізацый быў так званы "заходнерусізм", паводле якога беларусы лічыліся не самастойным этнасам, а адгалінаваннем рускага народа.

Партыі ліберальна-дэмакратычнага накірунку – Беларускі народны саюз, Магілёўскі беларускі нацыянальны камітэт, Гомельскі саюз беларускай дэмакратыі, Віцебскі саюз беларускага народа, Аршанскі беларускі народны камітэт, Беларуская партыя народных сацыялістаў, Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Беларуская партыя аўтанамістаў – адлюстроўвалі інтарэсы галоўным чынам заможных слаёў беларускага

грамадства, духавенства, чыноўніцтва, сярэдняй і дробнай буржуазіі і беларускай інтэлігенцыі. Іх нацыянальныя праграмы вызначаліся супярэчлівасцю і непаслядоўнасцю, зыходзілі з ідэі адміністрацыйна-гаспадарчай самастойнасці ў межах Расійскай дзяржавы і ідэалогіі "заходнерусізму". Вырашэнне аграрнага пытання яны адкладвалі да Устаноўчага сходу.

Больш дэмакратычных поглядаў у нацыянальным пытанні прыгрымлівалася БХД, заснавальнікамі якой былі беларускія ксяндзы Ф. Абрантовіч, А. Станкевіч, В. Гадлеўскі, К. Сваяк (К. Стаповіч) і інш. У рэзалюцыі першага з'езда БХД (май 1917 г.) вылучалася патрабаванне "шырокай аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай дэмакратычнай рэспублікі", навучанне ў школах на беларускай мове і паступовы пераход на беларускую мову ў набажэнствах. Такое ж палажэнне змяшчаў праект праграмы БПНС, у склад якой уваходзіла група памешчыкаў на чале з дэпутатам Дзяржаўнай думы Р. Скірмунтам. У ім патрабавалася аб'явіць Расію федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікай, у якой Беларусь павінна мець статус аўтаноміі.

Больш паслядоўна праблема будучага дзяржаўнага ўладкавання краю была распрацавана ў праграмных дакументах Беларускай партыі аўтанамістаў, арганізацыі якой узніклі вясной 1917 г. у Петраградзе, Маскве, Мінску і іншых гарадах. У зацверджаным у верасні на канферэнцыі праекце платформы беларускіх аўтанамістаў вылучалася патрабаванне права на нацыянальнае, культурнае і палітычнае самавызначэнне Беларусі, але з захаваннем федэратыў-нага саюза з Расіяй.

Патрабаванне аўтаноміі Беларусі ў складзе Федэратыўнай Расійскай Рэспублікі было цэнтральным і ў праграме найбольш уплывовай беларускай партыі – Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ), якая аднавіла сваю дзейнасць адразу пасля падзення самаўладдзя.

У першай палове 1917 г. арганізацыі гэтай партыі дзейнічалі ў Мінску, Віцебску, Гомелі, Слуцку, Оршы, Буда-Кашалёве, сярод бежанцаў-беларусаў у Петраградзе, Маскве, Казані, Сарataве, Яраслаўлі і Адэсе. У ліпені ў яе шэрагах налічвалася каля 5 тыс. членаў і спачуваючых. а ў кастрычніку колькасць іх узрасла да 10 тыс. Палітычны курс БСГ адлюстроўва ў інтарэсы пераважна сярэдніх слаёў, якія былі зацікаўлены ў ажыццяўленні дэмакратычных пераўтварэнняў, але асцерагаліся рэвалюцыйнай ломкі грамадскіх адносін. Так, канферэнцыя БСГ у сакавіку 1917 г. выступіла ў падтрымку Часовага ўрада, заклікаўшы працоўны народ аказваць на яго "арганізаваны націск". Яна салідарызавалася з лозунгам "рэвалюцыйнага абаронніцтва", выставіла патрабаванне аўтаноміі Беларусі ў складзе Федэратыўнай Расійскай Рэспублікі.

У аграрным пытанні канферэнцыя выказалася за агульнанародную ўласнасць на зямлю і перадачу яе сялянам для карыстання ў адпаведнасці з працоўнай нормай.

2. З'езд беларускіх нацыянальных арганізацый 25—27 сакавіка 1917 г.

Важнае значэнне ў развіцці беларускага нацыянальнага руху мела стварэнне яго каардынацыйных органаў. Па шіцыятыве Беларускага таварыства (перайменаваны Мінскі аддзел Беларускага камітэта дапамогі пацярпелым ад вайны) 25-27 сакавіка ў Мінску быў скліканы з'езд беларускіх нацыянальных партый і арганізацый, бежанскіх камітэтаў, камітэтаў дапамогі ахвярам вайны ў колькасці да 150 чалавек. У парадак дня з'езда былі вынесены: бягучы момант, адносіны да расійскіх і нацыянальных сацыялістычных партый і арганіза цыйныя пытанні. Большасць выступленняў была пранікнута ідэяй грамадзянскага прымірэння ўсіх класаў і сацыяльных слаёў.

Прадстаўнік Часовага ўрада эсэр І. Метлін, які заявіў аб несвоечасовым вырашэнні нацыянальнага пытання, і што беларускі нацыянальны рух не падтрымліваюць народныя масы, быў вымушаны пакінуць з'езд. У прынятых пастановах з'езд вітаў Лютаўскую рэвалюцыю, якая наблізіла волю народа і аўтаномію Беларусі, абавязваўся падтрымліваць Часовы ўрад. Быў абраны Беларускі нацыянальны камітэт (БНК) у складзе 18 чалавек, дзесяць з
якіх з'яўляліся прадстаўнікамі БСГ.

Абранне старшынёй БНК Р. Скірмунта, а яго намеснікам адваката П. Алексюка (абодва прадстаўнікі БПНС) мела розныя водгукі ў беларускім нацыянальным руху. Напрыклад, вядомы беларускі нацыянальны дзеяч К. Кастравіцкі склаў паўнамоцтвы старшыні прэзідыума з'езда пасля абрання Р. Скірмунта ў прэзідыум з'езда. Асноўнай задачай БНК абвясціў культурна-нацыянальнае адраджэнне беларускага народа. Яго канкрэтная праграма прадугледжвала федэратыўна-дэмакратычную рэспубліку ў Расіі, а ў яе складзе – аўтаномію Беларусі. Адносна вайны БНК падтрымаў Часовы ўрад, а вырашэнне зямельнага пытання адклаў да Устаноўчага сходу. Па двух найбольш злабадзённых праблемах БНК фактычна не падтрымаў беларускае сялянства.

Не мела станоўчага выніку наведванне Часовага ўрада дэлегацыяй БНК, якая перадала міністру-старшыні Часовага ўрада кн. Львову дакладную запіску з пераказам рэзалюцын з'езда. Дэлегатаў прынялі міністр народнай асветы А. Мануйлаў, таварыш міністра ўнутраных спраў Лявонцеў. Аднак канкрэтныя прапановы дэлегацыі не знайшлі падтрымкі ва ўрадавых колах. У маі БНК стаў выдаваць газету "Вольная Беларусь". Левая частка БНК, галоўным чынам прадстаўнікі БСГ, настойвалі на спалучэнні ў яго дзейнасці палітычнай і нацыянальна-культурнай працы з праграмай сацыяльна-культурных пераўтварэнняў.

3. II з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый і партый 8—10 ліпеня 1917 г. Размежаванне ў беларускім нацыянальным руху

Рознагалоссі паміж Р. Скірмунтам і яго прыхільнікамі і прадстаўнікамі левай плыні БСГ (З.Жылуновіч і А. Бурбіс), прывялі да скасавання БНК у час другога з'езда прадстаўнікоў беларускіх партый і арганізацый, што праходзіў з 8 па 10 ліпеня 1917 года ў Мінску.

Большасць дэлегатаў падтрымала ідэю ажыццяўлення нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай дзяржавы.

Аднак практычных мер па яе рэалізацыі з'езд не выпрацаваў. У склад створанай замест БНК Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый увайшлі ў асноўным прадстаўнікі БСГ. Пад націскам прадстаўнікоў рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку Рада заявіла, што будзе дабівацца перадачы зямлі працоўнаму народу і абараняць інтарэсы рабочага класа.

У рабоце першай сесіі Рады, якая адбылася ў Мінску 5-6 жніўня 1917 г., удзельнічалі з правам рашаючага голасу прадстаўнікі 23 беларускіх арганізацый. У іх радах налічвалася звыш 23 тыс. чалавек. Згодна з прынятым сесіяй Статутам Рада складалася з дэпутатаў, што дэлегіраваліся ўсімі беларускімі арганізацыямі, гарадамі, паветамі, мястэчкамі, бежанскімі арганізацыямі і воінскімі часцямі, якія "прызнаюць патрэбу аўтаноміі Беларусі, роднай мовы і развіцця беларускай нацыянальнай культуры".

У новых умовах кіраўніцтва Цэнтральнай рады (Я. Лёсік – старшыня, А. Смоліч, У. Фальскі, В. Лявіцкі, У. Галубок – члены Выканкама Рады) актывізавала сваю дзейнасць па стварэнню нацыянальнага беларускага фронту на аснове рэалізацыі ідэі нацыянальна-культурнай аўтаноміі ў рамках дэмакратычнай Расіі. Цэнтральная рада звязваецца з бежанскімі камітэтамі, раскіданымі па ўсёй Расіі, умацоўваюцца яе сувязі з беларускімі гурткамі ў арміі і на флоце, у якіх хутка расце колькасць прыхільнікаў БСГ і беларускага нацыянальнага руху наогул.

Перабудову цэнтральных органаў беларускага нацыянальнага руху, якая праходзіла летам 1917 г., можна разглядаць як пэўны крок у напрамку да яго далейшай класавай дыферэнцыяцыі. Прадстаўнікі левай плыні ўсё больш схіляліся ў бок бальшавікоў. Але некаторыя аспекты нацыянальнага пытання, якія абараняў З. Жылуновіч, адрозніваліся ад бальшавіцкіх. У прыватнасці, ён выступаў супраць забыцця беларускімі пралетарыямі свайго нацыянальнага пачуцця на карысць агульнарэвалюцыйных інтарэсаў.

Ідэю нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі Беларусі адстойвала дэлегацыя Цэнтральнай рады ў складзе І. Варонкі (старшыня), З. Жылуновіча, К. Душэўскага, І. Мамонькі, З. Сабалеўскага, У. Фальскага на Дэмакратычнай нарадзе ў Петраградзе. Яны адзначалі нежаданне "расійскай дэмакратыі" прадаставіць народам сапраўдную свабоду. Характарызуючы пазіцыю Рады ў адносінах да ўлады, І. Варонка зазначыў, што "Цэнтральная рада беларускіх арганізацый стаіць за канструяванне ўлады без усялякіх кааліцый з буржуазіяй".

На сесіі Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый і партый (15 кастрычніка 1917 г.) прадстаўнікі левага крыла БСГ у знак пратэсту супраць палітыкі правых адмовіліся ад удзелу ў сесіі. БСГ раскалолася на дзве часткі.

Такім чынам, напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі адбыўся раскол у беларускім нацыянальным руху на правую і левую плыні. Калі правыя былі задаволены вынікамі Лютаўскай рэвалюцыі, прасілі ў Часовага ўрада аўтаноміі для Беларусі, то левыя патрабавалі ажыццяўлення ў краіне радыкальных пераўтварэнняў.

Тэма 42. Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і ўсталяванне савецкай улады ў Беларусі і на Заходнім фронце.

1 Абвастрэнне палітычнай сітуацыі. Пераход улады да Саветаў і ваенкомаў у Беларусі і на Заходнім фронце.

24 – 25 кастрычніка 1917 г. у Петраградзе перамагла чарговая рэвалюцыя. Часовы ўрад быў скінуты. ІІ Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў стварыў новы ўрад – Савет Народных Камісараў на чале з У. Леніным. 25 кастрычніка аб перамозе ўзброенага паўстання ў Петраградзе стала вядома ў Мінску. Улада ў горадзе перайшла ў рукі Савета. Выканкам Мінскага савета выдаў загад №1, у якім абвяшчалася аб пераходзе ўлады ў Мінску да Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. З былых вязняў турмы – рэвалюцыйных салдат (якія былі ў свой час арыштаваны Часовым ўрадам) быў сфарміраваны 1-шы імя Мінскага Савета рэвалюцыйны полк. Быў арганізаваны кантроль над поштай, тэлеграфам, чыгункай, штабам Заходняга фронту.

27 кастрычніка1917 г. у Мінску быў створаны "Камітэт выратавання рэвалюцыі" на чале з эсэрам Т. Калатухіным. У яго склад увайшлі прадстаўнікі франтавога камітэта, пераважна меншавікі і эсэры, а таксама прадстаўнікі, якія не прызналі ўлады Саветаў. Камітэт увёў у Мінск часці Каўказскай дывізіі і запатрабаваў ад Савета перадаць яму ўсю ўладу ў горадзе і Заходнім фронце. Сітуацыя абвастрылася. 1 лістапада 1917 г. у Мінск прыбылі атрады рэвалюцыйных салдат 2-й арміі, а таксама браняпоезд на чале з бальшавіком У. Пралыгіным, членам ВРК 2-й арміі. У Мінск былі накіраваны зводны атрад салдат 2-й Сібірскай дывізіі і 1-ы рэвалюцыйны полк імя Мінскага Савета. Хутка да Мінска падышлі і іншыя вайсковыя часці з фронту. Іх прыбыццё змяніла суадносіны сіл на карысць бальшавікоў.

2 лістапада прайшоў пашыраны сход Мінскага Савета з удзелам вайсковых і фабрычна-заводскіх камітэтаў. Сход прыняў рэзалюцыю аб устанаўленні савецкай улады ў Мінску. ВРК Заходняга фронту дапоўнены прадстаўнікамі ад рэвалюцыйных арганізацый, узяў усю ўладу ў свае рукі і стаў найвышэйшым паўнамоцным органам улады на ўсёй свабоднай ад немцаў тэрыторыі Заходняга краю. "Камітэт выратавання рэвалюцыі" быў распушчаны, а яго старшыня Т. Калатухін і камісар Заходняга фронту У. Жданаў арыштаваны.

Значна пазней перамагла новая ўлада ў Магілёве. Гэта тлумачыцца тым, што вакол Стаўкі вярхоўнага галоўнакамандуючага былі сканцэнтраваны контррэвалюцыйныя арганізацыі, кіруючыя органы буржуазных і дробнабуржуазных партый, іх лідэры. Контррэвалюцыйныя намеры Стаўкі падтрымлівала эсэра-меншавіцкая большасць Магілёўскага Савета. 28 кастрычніка1917 г. адбылася нарада палітычных і грамадскіх арганізацый горада. Меншавікі і эсэры асудзілі ўзброенае паўстанне ў Петраградзе і патрабавалі стварэння"дэмакратычнага міністэрства". Бальшавікі, якія таксама

прынялі ўдзел у рабоце нарады, заявілі, што яна контррэвалюцыйная, і пакінулі яе. Кадэты пры актыўнай падтрымцы дробнабуржуазных партый на гэтай нарадзе арганізавалі “Грамадскі камітэт выратавання рэвалюцыі” і сталі цэнтрам усіх контррэвалюцыйных сіл Магілёва.

Для ліквідацыі Стаўкі савецкі ўрад прыняў шэраг рашучых мер: назначыў новага галоўнакамандуючага бальшавіка М. Крыленку, накіраваў з Петраграда салдат Літоўскага палка, матросаў Балтыйскага флоту. ВРК Заходняга фронту сфарміраваў атрад з салдат 1-га палка імя Мінскага Савета. Для барацьбы са Стаўкай былі сфарміраваны рэвалюцыйныя атрады ў Віцебску, Гомелі, Оршы, Полацку і іншых гарадах Беларусі. Усе спробы Стаўкі аказаць супраціўленне заканчваліся правалам. Салдаты Магілёўскага гарнізона адмовіліся змагацца з бальшавікамі. Гэта змяніла суадносіны сіл у горадзе. 18 лістапада выканком Магілёўскага Савета прыняў рашэнне аб прызнанні савецкай улады, тут жа быў створаны і ВРК, які ўстанавіў кантроль над Стаўкай. 19 лістапада рэвалюцыйныя атрады рабочых, салдат і матросаў уступілі ў горад. З імі ўвайшоў і новы галоўнакамандуючы М. Крыленка, 20 лістапада ў Магілёве пачала дзейнічаць савецкая ўлада. На працягу кастрычніка – лістапада1917 г. савецкая ўлада была ўстаноўлена на ўсёй свабоднай ад ворагаў тэрыторыі Беларусі. З’езды Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, якія адбыліся ў лістападзе 1917 г., сваімі рашэннямі замацавалі перамогу савецкай улады на Беларусі.

2 Утварэнне і дзейнасць Аблвыканкамзаха і СНК Заходняй вобласці. Першыя сацыяльна- эканамічныя пераўтварэнні.

27 лістапада 1917 г. выканаўчыя камітэты, абраныя з’ездамі Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці, Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, Заходняга фронту, аб’ядналіся і ўтварылі выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту(Аблвыканкомзах). Яго старшынёй быў абраны бальшавік М. Рагазінскі. Для кіравання вобласцю і фронтам быў створаны абласны Савет Народных Камісараў(СНК) на чале з бальшавіком К. Ландарам. Трэба адзначыць, што ў склад гэтых органаў увайшлі ў асноўным людзі не мясцовыя, далёкія ад разумення нацыянальных патрэб краю. Таму з боку гэтых органаў адразу ж выявіліся абыякавыя адносіны да пытанняў нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння беларускага народа, яго нацыянальна-культурнага адраджэння.

Разам з утварэннем на Беларусі новых савецкіх органаў улады былі ліквідаваны органы, створаныя Часовым урадам. Аднак фарміраванне новых органаў улады ў Заходняй вобласці не было завершана. Справа ў тым, што ў стварэнні Аблвыканкомзаха і СНК вобласці і фронту Саветы рабочых і сялянскіх дэпутатаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў не ўдзельнічалі. З’езды Саветаў указаных губерняў адбыліся ў снежні 1917 г. – студзені1918 г. і не прымалі рашэнняў аб злучэнні выбраных імі выканаўчых органаў з Аблвыканкомзахам, не выбіралі сваіх прадстаўнікоў у выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і ў склад абласнога СНК. Завяршальным этапам гэтай працы павінен быў стаць Усебеларускі з’езд Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх

дэпутатаў. Аднак з'езд не быў скліканы. Першым крокам на шляху зацвярджэння савецкай улады было ўвядзенне рабочага кантролю над вытворчасцю і размеркаваннем. Галоўная задача гэтага органа заключалася ў тым, каб забяспечыць бесперабойную работу прамысловасці як асноўнай эканамічнай базы дыктатуры пралетарыяту.

Напрыканцы 1917 г. на Беларусі былі сфарміраваны мясцовыя органы рабочага кантролю. Яны прымалі актыўны ўдзел у вырашэнні пытанняў найму і звальнення рабочых, уводзілі новыя расцэнкі, змагаліся з сабатажам, патрабавалі ўстанаўлення 8-гадзіннага рабочага дня і інш. Органы рабочага кантролю вырашалі складаную і цяжкую задачу па арганізацыі фінансавай дзейнасці. На тэрыторыі Заходняй вобласці кантроль праводзіў банкаўска-крэдытны аддзел Аблвыканкомзаха. Ён канцэнтраваў сродкі бягучых рахункаў прадпрыемстваў, банкаўскія пазыкі, выдачу грошай з казначэйства.

На Беларусі нацыяналізацыя буйных прамысловых прадпрыемстваў ажыццяўлялася, як і па ўсёй краіне, у адпаведнасці з дэкрэтам УЦВК, прынятым у снежні 1917 г. Усе нацыяналізаваныя Саветамі заводы і фабрыкі пераходзілі ва ўласнасць дзяржавы і паступалі ў падпарадкаванне савецкіх дзяржаўных органаў.

Ужо ў снежні 1917 г. былі нацыяналізаваны фабрыка"Везувій" у Навабеліцы Магілёўскай губерні, суконная фабрыка ў маёнтку Якаўлевічы, друкарня Кагана ў Магілёве, лесапільныя заводы ў Полацкім, Аршанскім, Быхаўскім паветах і інш. Былі нацыяналізаваны і буйныя майстэрні Лібава-Роменскай, Маскоўска-Брэсцкай і Паўночна-Заходняй чыгунак.

Пачалі праводзіцца рэвалюцыйныя пераўтварэнні і ў вёсцы. На Беларусі, дзе сялянства складала пераважную большасць насельніцтва, гэта было адным з найвастрэйшых пытанняў. Першым крокам у гэтым напрамку былі канфіскацыя ўсёй зямлі. Была разгорнута вялікая агітацыйная работа сярод сялянства. ВРК Заходняй вобласці распрацаваў спецыяльную інструкцыю для ўпаўнаважаных, у якой рэкамендаваў ім надаваць асабістую ўвагу рабоце па ўліку памешчыцкіх маёнткаў, інвентару, збожжа, арганізацыі аховы маёмасці.

У сярэдзіне лютага 1918 г. на Беларусі былі ў асноўным завершаны канфіскацыя прыватных гаспадарак і ўлік маёмасці ў памешчыцкіх маёнтках. Паводле няпоўных звестак, было канфіскавана 13 тыс. прыватных гаспадарак. Сяляне Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай губерняў атрымалі 1645,8 тыс. дзесяцін зямлі і амаль на 33 % павялічылі сваё землеўладанне. Была анулявана штогадовая арэндная плата памешчыкам у памеры 50 млн рублёў золатам. У снежні 1917 г. – лютым 1918 г. на тэрыторыі Беларусі з'явіліся першыя калектыўныя гаспадаркі сялян. У асноўным яны ствараліся на базе канфіскаваных памешчыцкіх маёнткаў.

3 Стаўленне беларускіх нацыянальных партый да савецкай улады.

Пад уплывам Кастрычніцкай рэвалюцыі беларускі нацыянальны рух падзяліўся на дзве асноўныя часткі. Адна падтрымлівала рэвалюцыю, другая выступала супраць Кастрычніка. Розныя пазіцыі беларускага нацыянальнага руху ў адносінах да Кастрычніцкай рэвалюцыі былі

абумоўлены яго сацыяльнай неаднароднасцю, вострымі супярэчнасцямі паміж рознымі сацыяльнымі пластамі гэтага руху.

Найбольш уплывовай нацыянальнай партыяй заставалася Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ). Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі раскол гэтай партыі на памяркоўных, прыхільнікаў рэфармісцкага шляху, і левых радыкалаў, прыхільнікаў бальшавіцкага кірунку, паглыбіўся. Акрамя таго, многія дзеячы БСГ схіляліся да ідэі дзяржаўнага адасаблення Беларусі ад Расіі, што, на іх думку, магло засцерагчы бацькаўшчыну ад знішчэння. Гэтыя настроі выразна выявіліся на III з'ездзе БСГ (кастрычнік 1917 г.). З'езд прыняў новую праграму і абраў ЦК на чале з Я. Дылам. У склад ЦК увайшлі вядомыя беларускія дзеячы А. Прушынскі(А. Гарун), А. Смоліч, В. Адамовіч, П. Бадунова, Я. Варонка, З. Жылуновіч, Я. Мамонька, С. Рак-Міхайлоўскі, Б. Тарашкевіч і інш. З-за адсутнасці адзінства БСГ не выпрацавала агульнапартыйнай лініі ў адносінах да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Памяркоўныя лідэры Грамады ўспрынялі рэвалюцыю як"праяву анархіі, у віхуры якой загінуць справа вольнасці і нацыянальных правоў беларускага народа". Петраградская арганізацыя БСГ, ухіліўшыся ад прамой ацэнкі рэвалюцыі, выказалася за фарміраванне "аднароднага сацыялістычнага ўрада".

Асноўныя нацыянальныя партыі ў гэты час гуртаваліся вакол Цэнтральнай беларускай рады, якая з кастрычніка 1917 г. стала называцца Вялікай беларускай радай (ВБР).

27 кастрычніка 1917 г. Вялікая беларуская рада звярнулася да беларускага народа з "Граматай". Гэты дакумент падпісалі акрамя Вялікай рады Беларускі выканаўчы камітэт Заходняга фронту, Беларуская сацыялістычная грамада, Беларуская народная партыя сацыялістаў і інш.

Палітычная праграма ВБР прадугледжвала: абвяшчэнне Беларускай дэмакратычнай рэспублікі, "спаянай з Велікаросіяй і іншымі суседнімі рэспублікамі Расіі на аснове федэрацыі"; наданне ўсёй улады на Беларусі краявой радзе, выбранай усеагульным, роўным, тайным галасаваннем; уключэнне ў кампетэнцыю вышэйшага заканадаўчага органа Расійскай дэмакратычнай федэратыўнай рэспублікі пытанняў уседзяржаўнага будаўніцтва, міжнародных зносін і гандлёвых дагавораў з іншаземнымі дзяржавамі; выданне мясцовых законаў; развіццё, распрацоўка і прымяненне да мясцовых умоў законаў, выдадзеных вышэйшым заканадаўчым органам Расійскай дэмакратычнай рэспублікі; вышэйшае распараджэнне зямельным, водным і лясным багаццем Беларусі; аднясенне пытанняў народнай адукацыі і культурнага будаўніцтва і іншых да кампетэнцыі краявой рады.

Са змяненнем палітычных умоў паступова праходзіла пераарыентацыя ў беларускім нацыянальным руху. Калі пасля Лютаўскай рэвалюцыі ўсе беларускія нацыянальныя партыі, і ў першую чаргу Цэнтральная беларуская рада, патрабавалі краявой аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай федэратыўнай рэспублікі, то ўжо пасля Кастрычніка іх барацьба разгортвалася пад лозунгам "поўнага нацыянальнага самавызначэння".

У адпаведнасці з выдадзенай бальшавікамі 2 лістапада 1917 г. «Дэкларацыі правоў народаў Расіі», дзе абвяшчалася права кожнага народа на

самавызначэнне, ВБР пачала актыўную працу па скліканні І Усебеларускага з'езда для вырашэння пытання беларускай дзяржаўнасці. З'езд праходзіў у Мінску з 7 па 17 снежня 1917 г., і ў яго рабоце прынялі ўдзел 1 872 дэлегаты, якія прадстаўлялі ўсе колы беларускага грамадства, розныя палітычныя арганізацыі з Віленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай і Смаленскай губерняў. У ноч з 17 на 18 снежня ўдзельнікі з'езда прынялі рэзалюцыю, у якой абвяшчаліся ўсталяванне на тэрыторыі Беларусі рэспубліканскага ладу і ўтварэнне Усебеларускай Рады сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў. Дэлегаты выказаліся за аўтаномію Беларусі ў складзе Савецкай Расіі. Але гэта не ўваходзіла ў планы бальшавікоў, і па рашэнню Аблвыканкамзаха з'езд быў разагнаны сілай.

Дэлегаты з'езда ратаваліся ад арышту ў мінскім дэпо, дзе працягнулі сваю работу і выбралі Раду Усебеларускага з'езда ў складзе 56 чалавек на чале з Язэпам Лёсікам. 21 снежня 1917 г. Рада абрала Выканаўчы камітэт, які ўзначаліў Язэп Варонка. У пытанні аб дзяржаўным будучым Беларусі Рада і Выканкам перайшлі ад ідэі аўтаноміі ў складзе Расіі да ідэі поўнага суверэнітэту.

Тэма 43. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.

1 Палітычнае становішча на беларускіх землях у пачатку 1918 г. Падпісанне Брэсцкага мірнага дагавора 3 сакавіка 1918 г. і яго наступствы для Беларусі.

Дэкрэты Савецкай улады аб міры і зямлі задавальнялі інтарэсы большасці насельніцтва краіны. Найважнейшым і самым неадкладным было пытанне аб спыненні ваенных дзеянняў. ВРК Заходняга фронту дамовіўся з камандаваннем германскіх войскаў пачаць перагаворы аб міры (генерал Духонін адмовіўся выканаць загад Саўнаркама пачаць перагаворы). Першым 14 лістапада было заключана перамір'е вайсковым камігэтам Грэнадзёрскага корпуса 2-й арміі з прадстаўнікамі германскай арміі, затым карпуснымі камітэтамі 3-й і 4-й армій. Начальнік штаба германскай групы армій Усходняга фронту генерал фон Эйхгорн 18 лістапада даў згоду на перагаворы з прадстаўнікамі Заходняга фронту і месцы іх правядзення.

Перагаворы пачаліся раніцай 20 лістапада ў мястэчку Солы (што ў 15 кіламетрах ад Смаргоні). Нямецкую дэлегацыю ўзначаліў начальнік групы армій германа- аўстрыйскіх войскаў генерал-маёр фон Заўберцвейг. Перагаворы насілі ў асноўным харакгар дыялога двух асоб: фон Заўберцвейга і (285) члена ВРК Заходняга фронту С. Шчукіна, які ўмела, з тактам і годнасцю вёў складаную дыпламатычную місію. Падпісаны дагавор аб перамір'і ўступаў у сілу з 12 гадзін дня 23 лістапада (5 снежня) 1917 г. тэрмінам на два месяцы па 24 студзеня (6 лютага) 1918 г., або да заключэння агульнага перамір'я на ўсім працягу руска-германскага фронту. З гэтага часу прыпыняліся ваенныя дзеянні на ўсім фронце ад мястэчка Відзы да ракі Прыпяць.

Перагаворы і перамір'е на Заходнім фронце мелі выключнае значэнне. Для расійскага боку яны сведчылі абпоўнай дэзарганізацыі арміі і стваралі небяспеку ваеннага паражэння. Таму мірныя перегаворы ўрадавых дэлегацый былі паскораны. Перагаворы пачаліся 20 лістапада (3 снежня) 1917 г. у Брэст-Літоўску, дзе размяшчалася камандаваннне нямецкіх войскаў на Усходні м фронце. 2(15) снежня савецкай урадавай дэлегацыяй быў падпісаны дагавор аб перамір'і, а потым пачаліся мірныя перагаворы. Савецкая дэлегацыя ў складзе А.А. Іофе (старшыня), Н.А. Біцэнкі, Л.Б. Каменева, Л.М. Карахана (сакратар), М.М. Пакроўскага выступіла за заключэнне дэмакратычнага міру без анексій і кантрыбуцый.

27 студзеня (9 лютага) 1918 г. Кюльман ва ўльтыматыўнай форме патрабаваў ад савецкай дэлегацыі даць адказ на прапанаваныя раней умовы міру. Троцкі прыняў да ведама заяву Кюльмана, што непадпісанне Расіяй мірнага дагавору аўтаматычна спыняе перамір'е, і савецкая дэлегацыя пакінула Брэст. Троцкі і яго прыхільнікі зыходзілі з таго, што аўстра-германскія войскі не змогуць выступіць супраць Савецкай Расіі з-за рэвалюцыйнага ўздыму ў Германіі і Аўстра-Венгрыі. Аднак аўстра-германскія войскі 18 лютага пачалі наступленне на ўсім фронце. У той самы дзень на пасяджэнні ЦК РСДРП(б) пасля вострай барацьбы з "левымі камуністамі" большасць (7 – "за", 5 –"супраць", Троцкі ўстрымаўся) выказалася за падпісанне міру.

Раніцай 19 лютага Ленін ад імя СНК РСФСР накіраваў германскаму ўраду радыёграму са згодай падпісання міру. Аднак наступленне працягвалася. Былі заняты Дзвінск, Мінск, акупіравана большая частка Беларусі.

Для падпісання дагавору 24 лютага ў Брэст-Літоўск выехала савецкая дэлегацыя. 1 сакавіка яна атрымала канчатковы тэкст мірнага дагавору, які складаўся з 14 артыкулаў і розных дадаткаў. Ад Расіі аддзяліліся Курляндыя, Літва, Ліфляндыя, Эстляндыя і частка Беларусі. На Каўказе да Турцыі адыходзілі Карс і Батумі. Украіна і Фінляндыя прызнаваліся самастойнымі дзяржавамі. Усяго Расія страчвала тэрыторыі каля 1 млн. км 2 з насельніцтвам больш за 50 млн. чалавек. Савецкая Расія абавязана была дэмабілізаваць армію і флот, прызнаць дагавор Цэнтральнай украінскай рады з Германіяй і яе саюзнікамі, заключыць мірны дагавор з Радай і вызначыць мяжу паміж Расіяй і Украінай. Брэсцкі мір навязваў нераўнапраўныя эканамічныя пагадненні. Брэсцкі мір фармальна завяршыў перыяд удзелу Расіі ў Першай сусветнай вайне 1914-1918 гг. Інтарэсы Беларусі не былі прыняты пад увагу ніводным з бакоў. Паводле ўмоў Брэсцкага міру тэрыторыя Беларусі была падзелена на лініі Дзвінск-Свянцяны-Ліда-Пружаны-Брэст. Немцы арыентаваліся на стварэнне "малой Літвы" з далучэннем да этнічнай Літвы часткі беларускіх зямель, у тым ліку Віленшчыныі Гродзеншчыны. Землі на поўдзень ад Палескай чыгункі па дамоўленасці з Цэнтральнай украінскай радай перадаваліся УНР. Беларусь не атрымлівала нічога на аднаўленне разбуранай у час вайны гаспадаркі, таму што Германія і Расія ўзаемна адмовіліся пагасіць страты, прычыненыя вайной насельніцтву гэтых дзяржаў.

2 Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Устаўныя граматы.

На захопленай нямецкімі акупантамі тэрыторыі Беларусі значна актывізаваўся беларускі нацыянальны рух. 19 лютага1918 г., яшчэ да захопу нямецкімі войскамі Мінска, выканком Савета Усебеларускага з'езда выдаў загад №1 па гарнізону аб тым, што нямецкая армія павінна ўбачыць спакойнае мірнае жыццё насельніцтва, якое не жадае бязглуздай вайны. У другім параграфе загада гаварылася аб увядзенні ваеннага становішча. 21 лютага выканком звярнуўся з Устаўной граматай да народаў Беларусі. Выканком утварыў урад – Народны сакратарыят. Старшынёй урада стаў адзін з кіраўнікоў Беларускай сацыялістычнай грамады. Я. Варонка. У склад урада ўвайшло 15 народных сакратароў. Былі ўтвораны сакратарыяты: унутраных спраў, асветы, юстыцыі, народнай гаспадаркі, шляхоў зносін, фінансаў, велікарускіх спраў, пошты і тэлеграфа, кантролю, сельскай гаспадаркі і інш.

9 сакавіка 1918 . адбылося пашыранае пасяджэнне выканкома Савета Усебеларускага з'езда(тады ў яго складзе быў71 чалавек). На пасяджэнні была прынята2-я Устаўная грамата да народа Беларусі. У гэтым дакуменце Беларусь абвяшчалася Народнай Рэспублікай. Прэзідыум выканкома ўзначаліў І. Серада, які, як і Я. Варонка, прадстаўляў правае крыло БСГ. Апрача агульнапалітычнага ўступу, грамата змяшчала8 пунктаў, у якіх вызначаліся асноўныя задачы абвешчанай рэспублікі. 1-я і2-я Устаўныя граматы да народа Беларусі вызначалі асноўныя прынцыпы дзяржаўнага ладу рэспублікі, яе тэрыторыю, правы і свабоды грамадзян, а таксама формы ўласнасці. Аднак трэба адзначыць, што ў граматах не былі дастаткова выразна акрэслены сацыяльна-палітычныя задачы.

Устаўныя граматы падтрымалі эсэры і меншавікі, якія да гэтага часу адмаўлялі саму ідэю беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Тамму выпрацоўваецца агульная тактыка ў нацыянальным пытанні. На яе аснове стаў умацоўвацца саюз беларускіх палітычных партый з расійскімі сацыялістычнымі партыямі. Агульным для іх было тое, што яны выступалі за ідэю склікання Устаноўчага схода, парламенцкую рэспубліку, супраць курсу бальшавікоў на сусветную рэвалюцыю, класавую барацьбу. Па ініцыятыве ЦК БСГ 19 сакавіка 1918 г. выканком быў перайменаваны ў Раду БНР.

25 сакавіка 1918 г. на сесіі Рады была абмеркавана і прынята 3-я Устаўная грамата. Грамата павінна была завяршыць працэс самавызначэння і канчаткова канстытуіраваць утварэнне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Галоўным у грамаце было абвяшчэнне незалежнасці Беларусі.

3 Узаемаадносіны Рады і ўрада БНР з германскімі акупацыйнымі ўладамі. Аднаўленне савецкай улады ў Беларусі.

Якія адносіны да БНР і яе кіруючых органаў былі з боку кайзераўсай Германіі? Перш-наперш трэба адзначыць, што германская акупацыйная адміністрацыя спакойна рэагавала на акт абвяшчэння БНР. Яна добра разумела, што ідэя нацыянальнай дзяржаўнасці ва ўмовах

грамадзянскай вайны і супрацьстаяння розных палітычных і сацыяльных сіл ніякіх поспехаў мець не будзе. Таму галоўнай лініяй у нямецкай акупацыйнай палітыцы ў адносінах да БНР было непрызнанне яе афіцыйным Берлінам. Гэта палітыка грунтавалася на ўзятым Германіяй абавязацельстве не падтрымліваць ніякіх сепаратысцкіх тэндэнцый у расійскіх межах, зафіксаваным Брэсцкім мірным дагаворам. Аднак найбольшую самастойнасць Рада БНР атрымала ў галіне культуры і адукацыі. На працягу ўсяго 1918 г. у Мінску і Вільні на старонках перыядычнага друку ішла распрацоўка беларускай літаратурнай мовы. Пэўны ўклад у гэта ўнеслі Я. Станкевіч, А. Луцкевіч, Я. Лёсік і інш. Вынікам дадзенай працы з'явілася абвяшчэнне ў пачатку красавіка 1918 г. на адным з пасяджэнняў Рады БНР беларускай мовы дзяржаўнай. З пачатку красавіка 1918 г. пры Народным сакратарыяце асветы БНР сталі працаваць курсы беларусазнаўства, дзе чыталіся лекцыі па беларускай гісторыі, геаграфіі, мове, літаратуры. За месяц на іх паступіла каля 200 чалавек. Важнай галіной дзейнасці Сакратарыята асветы было адраджэнне нацыянальнай школы. Калі на пачатку 1918 г. у Мінску налічвалася толькі 4 нацыянальныя школы, то ужо ў чэрвені іх колькасць вырасла да 20. Шырока ажыццяўлялася выдавецкая справа. У 1918 г. Працавала 11 выдавецтваў. У Мінску адкрыліся Беларускі педагагічны інстытут, рэктарам якога стаў прафесар В. Іваноўскі, выкладчыкамі – Я. Карскі, Б. Тарашкевіч, У. Ігнатоўскі і інш. Працавалі беларускі тэатр і іншыя ўстановы культуры. Выдаваліся беларускамоўныя газеты і часопісы.

Народны сакратарыят БНР атрымаў ад нямецкага камандавання некаторыя правы і ў галіне міжнароднай палітыкі. БНР мела сваіх прадстаўнікоў на Украіне, у Літве, працавалі дыпламатычныя місіі ў Варшаве і Берліне. Увогуле ж міжнародныя справы БНР складваліся вельмі дрэнна. Ва ўмовах вайны з Германіяй і грамадзянскай вайны ў Расіі ўрады краін Антанты і ЗША не праявілі зацікаўленасці да БНР, каб не пазбавіць сябе адчыненых дзвярэй для інтэрвенцыі ў Савецкую Расію. Безвыніковым быў зварот урада БНР да ўрада Германіі з просьбай аб прызнанні самастойнасці Беларусі і ўстанаўленні з мясцовымі нямецкімі ўладамі такіх адносін, якія дазволілі б БНР мець войска для ўмацавання сваёй улады. На пасланыя ў Берлін тры граматы рэйхсканцлер паведаміў Народнаму сакратарыяту, што Берлін лічыць Беларусь часткай Савецкай Расіі і што без урада Леніна вырашыць гэта пытанне не можа.

Пасылка Радай тэлеграмы выклікала востры палітычны крызіс у самой Радзе, яе пакінулі эсэры, меншавікі, яўрэйскія сацыялісты. Стаў распадацца Народны сакратарыят. Адзін з лідэраў БСГ, народны сакратар па справах земляробства Т. Грыб, заявіў: "Я пратэстую супраць такой тэлеграмы… і лічу здрадай рэвалюцыйнаму сацыялізму ўваходзіць у саюз з манархам і аддаваць пад апеку імперыялістычнай буржуазіі Германіі наш шматмільённы працоўны сялянскі народ…".

Крызіс прывёў да расколу БСГ. З яе прыхільнікаў утварыліся новыя партыі: сацыялістаў-рэвалюцыянераў, сацыял-дэмакратаў, сацыялістаў-федэралістаў. Тэлеграма выклікала новую хвалю пратэсту амаль усяго грамадства. У выніку складаных абставін у Радзе сталі замацоўвацца

кансерватыўныя сілы. Вымушаны быў скласці свае паўнамоцтвы Народны сакратарыят. Па прапанове акупацыйнай адміністрацыі фарміраванне новага складу сакратарыята ўзяў на сябе Р. Скірмунт.

Між тым летам 1918 г. рэзка змянілася міжнароднае становішча. Поспехі Чырвонай Арміі на франтах грамадзянскай вайны, барацьба працоўных у тыле акупантаў, узмацненне рэвалюцыйных настрояў сярод нямецкіх салдат вымусілі ўрад Германіі пайсці на тое, каб вывесці войскі з часткі захопленай тэрыторыі.

Заканчэнне першай сусветнай вайны і Лістападаўская рэвалюцыя Германіі далі магчымасць савецкаму ўраду13 лістапада1918 г. Скасаваць Брэсцкі мірны дагавор. Паводле дэкрэта УЦВК, усе абавязацельствы савецкай улады наконт тэрытарыяльных уступак і выплаты кантрыбуцыі аб'яўляліся несапраўднымі. Германскае камандаванне, баючыся канчатковага развалу акупацыйнай арміі, 16 лістапада1918 г. аддало загад вывесці яе з Расіі. З гэтага моманту пачаўся новы этап у вызваленні беларускай зямлі ад акупантаў. Прасоўваючыся за нямецкімі войскамі, Заходняя армія хутка займала тэрыторыю Беларусі. 21 лістапада1918 г. былі вызвалены Полацк, Жлобін, 28 лістапада– Бабруйск, 2 снежня– Барысаў, 5 снежня– Асіповічы і Калінкавічы, 8 снежня– Слуцк, 10 снежня Чырвоная Армія вызваліла большую частку Украіны, Эстоніі і Літвы. На вызваленай тэрыторыі Беларусі была адноўлена савецкая ўлада. Ствараліся яе органы: ваенныя саветы, рэвалюцыйныя камітэты, выканкомы Саветаў.

4 Месца БНР у гісторыі нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва беларускага народа.

Такім чынам, абвяшчэнне БНР з'явілася першай спробай рэалізацыі на практыцы беларускай ідэі, што ўзнікла яшчэ на пачатку XIX ст., сукупнасці ўсіх трох яе асноватворных элементаў – нацыянальнай свядомасці, нацыянальна-культурнага адраджэння і нацыянальнай дзяржаўнасці.

У такіх умовах жорсткага акупацыйнага рэжыму Рада БНР не магла аказаць сваім грамадзянам дзейснай дапамогі, выратаваць іх ад знішчэння, вывазу ў Германію, прадухіліць разбурэнне нацыянальнага багацця. БНР не магла здзяйсняць свае функцыі і таму, што яе Рада аб'явіла аб разрыве сувязей з Расіяй, не ўлічваючы настрою беларускага народа. Гэта рашэнне было прынята палітычнай нацыянальнай элітай без актыўнага ўдзелу народа.

Нельга адмаўляць, што Рада БНР і яе Народны сакратарыят утварылі пэўную палітычную структуру з зародкамі дзяржаўнай арганізацыі. Аднак у прамым сэнсе БНР дзяржавай не была. Дзяржаўнасць патрабуе не толькі абвяшчэння дэкларацый, якімі б добрымі яны ні былі, але галоўнае – функцыяніравання сапраўднай сістэмы органаў заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады на канкрэтнай тэрыторыі, распрацоўкі і прыняцця законаў і іх выканання, г. зн. праватворчай дзейнасці, забеспячэння правоў і свабод сваіх грамадзян. Хоць рэспубліка і абвяшчалася ў этнаграфічных межах пражывання беларусаў, юрысдыкцыю на гэтай тэрыторыі яна не здзяйсняла. Не было войска, адсутнічала фінансавая сістэма, не склаліся мясцовыя органы ўлады.

Функцыі ўрада БНР абмяжоўваліся паўнамоцтвамі нацыянальнага прадстаўніцтва пры германскай акупацыйнай адміністрацыі і рашэннем некаторых задач у культурна-асветнай галіне.

Аднак гэта быў першы крок барацьбы за беларускую дзяржаўнасць. Незалежнасць і свабода, аб'яўленыя 25 сакавіка 1918 г., так і засталіся жаданнем і надзеяй.

Тэма 44. Утварэнне БССР і Літоўска-Беларускай ССР.

1. Барацьба па пытанні аб беларускай савецкай дзяржаўнасці.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў і аднаўлення савецкай улады зноў паўстала пытанне аб утварэнні беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Але па гэтым пытанні не было адзінай думкі. Існавала некалькі пазіцый:

1. Пазіцыя кіраўніцтва Паўночна-Заходняга абкома РКП(б), Аблвыканкомзаха і Абласнога Савета Народных Камісараў. Узначальвалі гэтыя органы не беларусы(А. Мяснікоў, К. Ландар, В. Кнорын, М. Калмановіч, У. Алібегаў, С. Берсан і інш.). Ім цяжка было зразумець нацыянальныя інтарэсы беларускага народа. Яны лічылі, што Беларусь павінна быць тэрытарыяльнай адміністрацыйна-гаспадарчай адзінкай РСФСР. Іх погляды складваліся пад уздзеяннем многіх фактараў, у тым ліку і ідэі сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі, а самавызначэнне народаў, утварэнне нацыянальных дзяржаў, іх межы– перашкода на гэтым шляху.

2. Іншую пазіцыю па пытанні аб нацыянальным лёсе Беларусі адстойваў Беларускі нацыянальны камісарыят(Белнацком), утвораны31 студзеня1918 г. пры камісарыяце па справах нацыянальнасцей РСФСР. Кіраўнікі Белнацкома А. Чарвякоў, З. Жылуновіч і іншыя лічылі неабходным стварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і ўстанаўленне цесных сувязей з РСФСР (на прынцыпах аўтаноміі). Гэту пазіцыю падтрымлівала Цэнтральнае бюро беларускіх секцый РКП(б), арганізаваных з бежанцаў-беларусаў у розных гарадах Расіі – Маскве, Петраградзе, Сарataве, Тамбове, Казані і інш. Усяго ў Расіі знаходзілася1,5 млн беларусаў-бежанцаў.

Белнацком і кіраўнікі беларускіх секцый зрабілі шмат намаганняў, каб здзейсніць свае планы. Пытанне аб неабходнасці стварэння беларускага савецкага ўрада разглядалася і на канферэнцыі беларускіх камуністычных секцый, якая адбылася ў Маскве 21–23 снежня 1918 г. У рабоце канферэнцыі ўдзельнічалі прадстаўнікі ад маскоўскай, петраградскай, саратаўскай, тамбоўскай і мінскай секцый. У прывітальных тэлеграмах ЦК партыі, УЦВК, Саўнаркому, Наркомнацу канферэнцыя выказала надзею, што ідэя беларускай савецкай дзяржаўнасці сустрэне падтрымку вышэйшага кіраўніцтва. Сярод прынятых канферэнцыяй рашэнняў важнейшай была рэзалюцыя аб утварэнні беларускага савецкага ўрада. Дэлегацыя канферэнцыі на чале з З. Жылуновічам звярнулася з дадзенай прапановай да І. Сталіна. Але І. Сталін, які падтрымліваў пазіцыю Паўночна-Заходняга камітэта РКП(б) і Аблвыканкомзаха, зноў не адрэагаваў на гэту ініцыятыву.

Пытанне аб лёсе Беларусі стала прадметам тэрміновага разгляду ў ЦК РКП(б). Ёсць падставы сцвярджаць, што гэта адбылося па ініцыятыве У. Леніна. 24 снежня1918 г. Пленум ЦК РКП(б) прыняў пастанову аб утварэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі(БССР). Пленум абавязаў Паўночна-Заходні абком РКП(б) правесці партыйна-арганізацыйную работу па нацыянальна-дзяржаўнаму будаўніцтву на Беларусі.

Такім чынам, пад уздзеяннем ЦК РКП(б) Наркомнац, а затым і Паўночна-Заходні абком РКП(б), Аблвыканкомзах, СНК Заходняй вобласці памянялі свае адносіны да лёсу Беларусі. Яны нават пайшлі далей у вызначэнні юрыдычнага статусу Беарусі, як Белнацком і беларускія камуністычныя секцыі, якія прытрымліваліся прынцыпу аўтаноміі Беларусі ў складзе РСФСР.

2. Абвяшчэнне Беларускай ССР. Першая Канстытуцыя Савецкай Беларусі.

30 снежня1918 г. Адкрылася VI Паўночна-Заходняя абласная партыйная канферэнцыя. Дэлегаты канферэнцыі аднагалосна выказаліся за абвяшчэнне БССР. Канферэнцыя абвясціла сябе І з'ездам Кампартыі бальшавікоў Беларусі. Быў створаны кіруючы орган КП(б)Б– Цэнтральнае бюро КП(б)Б. 31 снежня1918 г. ЦБ КП(б)Б абмеркавала пытанне аб складзе Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада БССР. Было вырашана, што ва ўрад увойдуць прадстаўнікі ад Белнацкома і Цэнтральнага бюро беларускіх секцый РКП(б), ад Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б) і Аблвыканкомзаха.

Старшынёй урада быў зацверджаны З. Жылуновіч, членамі– А. Мяснікоў, А. Чарвякоў і іншыя, усяго17 чалавек. У складзе ўрада было створана 16 аддзелаў (наркаматаў) і 2 калегіі – надзвычайная і па справах палонных і бежанцаў.

1 студзеня1919 г. Часовы ўрад Беларусі абнародаваў маніфест у сувязі з утварэннем БССР. "З сённяшняга дня Беларусь, – гаварылася ў ім, – Савецкая рэспубліка, становіцца рэспублікай працоўнага народа, рабочых, сялянскай беднаты і чырвонаармейцаў". З гэтага дня ўся ўлада на Беларусі, адзначалася ў маніфесце, належыць Саветам рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Зямля з жывым і мёртвым інвентаром, лясы, воды і нетры зямлі, чыгункі, фабрыкі і заводы, банкі становяцца ўласнасцю народа. Маніфест абвясціў раўнапраўе працоўных усіх нацыянальнасцей на тэрыторыі Беларусі, адмяніў усе загады і распараджэнні акупацыйных улад, аб'явіў па-за законам Беларускую раду.

У сувязі з абвяшчэннем БССР вышэйшая ўлада на тэрыторыі рэспублікі перайшла да Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада. Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці склаў свае паўнамоцтвы. Толькі губвыканком Віцебскай і Магілёўскай губерняў, якія ў перыяд утварэння БССР знаходзіліся ў складзе РСФСР, па-ранейшаму кіравалі народнай гаспадаркай гэтых губерняў. Заходняя вобласць была скасавана.

5 студзеня 1919 г. Часовы рэвалюцыйны рабоча-сялянскі ўрад БССР, ЦБ КП(б)Б пераехалі ў Мінск, які з гэтага часу стаў сталіцай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

2–3 лютага 1919 г. у Мінску адбыўся I Усебеларускі з’езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. З’езд абмеркаваў наступныя пытанні: аб бягучым моманце, справаздачу Часовага ўрада Беларусі, аб адносінах да савецкіх рэспублік, аб Канстытуцыі БССР, выбары ЦВК БССР. Старшыня УЦВК Я. Свярдлоў, які прысутнічаў на з’ездзе, абвясціў пастанову прэзідыума УЦВК “Аб прызнанні незалежнасці Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі”.

3. Стварэнне і сутнасць Літоўска-Беларускай ССР. Ліквідацыя Літбела і яе прычыны.

У першай палове лютага1919 г. Польшча з дапамогай Антанты пачала ваенныя дзеянні супраць Савецкай Расіі. І першай ахвярай на шляху польскіх войск была Беларусь. Ужо да сярэдзіны сакавіка 1919 г. былі захоплены Брэст, Ваўкавыск, Слонім, Скідаль, Шчучын, Пінск, Баранавічы. Літоўска-Беларуская Савецкая рэспубліка аб’яўлена на ваенным становішчы. Быў сфарміраваны Савет абароны, праведзены ўсе неабходныя мерапрыемствы. Вялікае значэнне для арганізацыі адпору інтэрвентам мелі пастановы ЦВК Украіны, Літвы і Беларусі, прынятыя ў маі 1919 г. аб неабходнасці ваенна-палітычнага саюза. На аснове гэтых пастаноў ЦВК Расіі прыняў 1 чэрвеня 1919 г. пастанову аб аб’яднанні ваенных сіл савецкіх рэспублік.

I Усебеларускі з’езд Саветаў прыняў рашэнне аб аб’яднанні Беларускай ССР і Літоўскай ССР у адну дзяржаву – Літоўска-Беларускую ССР(Літбел). Гэта рашэнне зноў жа было праведзена паводле ўказання ЦК РКП(б). 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) патрабаваў прыняць на з’ездзе Саветаў Беларусі пастанову аб аб’яднанні Беларусі з Літвой. Літоўцам таксама прапанавалася як мага хутчэй склікаць свой з’езд і прыняць такое ж рашэнне.

27 лютага 1919 г. ствараюцца ЦВК Літоўска-Беларускай ССР і яго прэзідыум на чале з К. Цыхоўскім, урад аб’яднанай рэспублікі– Савет Народных Камісараў на чале з В. Міцкявічусам-Капсукасам. Для кіраўніцтва народнай гаспадаркай быў створаны Вышэйшы Савет народнай гаспадаркі. У склад Літбела ўвайшла тэрыторыя Мінскай, Гродзенскай, Віленскай, Ковенскай і частка Сувалкаўскай губерняў з больш як 4-мільённым насельніцтвам. У сувязі з утварэннем Літоўска-Беларускай ССР узнікла неабходнасць зліць і камуністычныя партыі Літвы і Беларусі. На аб’яднальным з’ездзе (4–6 сакавіка 1919 г.) быў абраны ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі(ЦК КП(б) ЛіБ). 6 сакавіка 1919 г. Пленум ЦК КП(б) ЛіБ стварыў прэзідыум ЦК КП(б) ЛіБ. Старшынёй прэзідыума быў выбраны В. Міцкявічус-Капсукас, сакратаром В. Кнорын. Сталіцай аб’яднанай дзяржавы стаў г. Вільня.

Так Беларуская Савецкая Рэспубліка праз месяц пасля абвяшчэння незалежнасці і ўтварэння сваёй дзяржаўнасці стала часткай аб’яднанай дзяржавы – Літбела.

4. Беларусь у час польска-савецкай вайны.

Пачатак 1919 г. быў перыядам дзяржаўна-тэрытарыяльнай перабудовы пасляваеннай Еўропы і часам спадзяванняў для многіх еўрапейскіх народаў на стварэнне ўласных незалежных дзяржаў. Беларусь чарговы раз апынулася ў сферы спаборніцтва геапалітычных інтарэсаў Расіі і Польшчы. Прэтэнзіі прадстаўнікоў урада БНР на незалежнасць не былі падтрыманы на Версальскай канферэнцыі ў студзені 1919 г. Для барацьбы з савецкай уладай вядучыя краіны Еўропы і ЗША пайшлі на палітычны саюз з А.Калчаком, які на той час з'яўляўся кіраўніком белага руху ў Расіі, і выказаліся толькі за магчымасць аўтаномій народаў у складзе Расіі. З другога боку, Юзаф Пілсудскі, кіраўнік адноўленай польскай дзяржавы, чарговы раз агучыў ідэю польскага нацыянальна-вызваленчага руху XIX ст. — аднаўлення Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. У адозве «Да насельніцтва былога Вялікага княства Літоўскага» Ю.Пілсудскі запэўніваў, што «польскае войска нясе ўсім вольнасць і свабоду». Насельніцтва Беларусі, якое ў большасці было незадаволенае палітыкай «ваеннага камунізму», мабілізацыяй у Чырвоную Армію і рэквізіцыямі (у Расіі ішла грамадзянская вайна), з пэўным энтузіязмам успрыняло абяцанні Ю.Пілсудскага.

Наступленне польскай арміі на беларускія землі пачалося ў лютым 1919 г. і мела вельмі імклівы характар: у сакавіку палякі ўжо кантралявалі тэрыторыю на захад ад лініі рэк Піна − Ясельда, 21 красавіка была занята Вільня, у жніўні — Мінск, а ў верасні польскае войска апынулася на лініі Дзвінск − Полацк − Барысаў − Любань. Лідэры ўрада БНР спадзяваліся на магчымасць аднаўлення рэспублікі, аднак незалежная Беларусь не ўваходзіла ў планы Ю.Пілсудскага. На захопленай тэрыторыі быў усталяваны польскі акупацыйны рэжым: ліквідаваны органы мясцовага кіравання, аднаўлялася памешчыцкае землеўладанне, праводзіліся рэквізіцыі, а многія дзеячы беларускага нацыянальнага руху апынуліся ў турмах.

Такая палітыка польскіх уладаў выклікала масавы рух супраціву, які ўзначаліла самая ўплывовая на той час партыя на тэрыторыі Беларусі − БПС-Р (беларускія эсэры).

Супраціўленне польскім акупантам арганізоўвалі таксама і бальшавікі. 14 мая 1920 г. Чырвоная Армія пад камандаваннем М.Тухачэўскага перайшла ў контрнаступленне. Пасля вызвалення Мінска 31 ліпеня 1920 г. адбылося другое абвяшчэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (ССРБ). У жніўні 1920 г. быў вызвалены Брэст. Апанаванае ідэяй «сусветнай рэвалюцыі» войска М. Тухачэўскага рушыла далей на Захад, але было спынена пад Варшавай і вымушана было адступаць.

Адначасова на беларускіх землях актывізаваўся антысавецкі ўзброены рух. На Палессі дзейнічаў атрад генерала С.Булак-Балаховіча, а ў лістападзе 1920 г. адбылося ўзброенае паўстанне на Случчыне. 14−15 лістапада 1920 г. адбыўся І беларускі з'езд Слуцка і Случчыны, які выказаўся за прызнанне ўлады БНР. Была створана Першая Слуцкая брыгада стральцоў войск БНР, якая налічвала каля дзесяці тысяч добраахвотнікаў і ўтрымлівала ўладу ў 15 валасцях Слуцкага і Бабруйскага паветаў у перыяд з 27 лістапада па 28 снежня 1920 г. Паўстанні адбыліся таксама ў

Койданаўскім, Ігуменскім і іншых паветах. Ва ўмовах польскага контрнаступлення і ўзмацнення антысавецкага руху на тэрыторыі Беларусі ўвосень 1920 г. савецкі ўрад пайшоў на мірныя перагаворы з Польшчай.

5. Другое абвяшчэнне БССР, заканчэнне вайны.

Пасля паспяховага ліпеньскага (1920) наступлення Чырвонай Арміі, калі ўся тэрыторыя Беларусі была вызвалена ад польскіх захопнікаў, практычна пыўстала пытанне пра аднаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Але сярод кіраўніцтва Літбела па-ранейшаму не было адзінай думкі па гэтым пытанні. Члены ЦК КП(б) ЛіБ В. Кнорын, М. Калмановіч, Р. Пікель, І. Рэйнгольд і іншыя, якія ў 1918 г. падзялялі пазіцыю А. Мяснікова, і цяпер не лічылі неабходным ствараць суверэнную Беларускую Савецкую Рэспубліку.

Яны абмяжоўваліся наданнем беларусам культурна-нацыянальнай аўтаноміі ў межах Мінскай губерні, якая павінна была ўвайсці ў склад РСФСР як адміністрацыйная адзінка. Яны не ўлічвалі настрою беларускага народа, які хацеў аднавіць сваю дзяржаўнасць. Па-ранейшаму рашэнне “беларускага пытання” яны ставілі ў залежнасць ад вынікаў сусветнай рэвалюцыі. Гэтай ідэяй кіраваліся тады многія партыйныя дзеячы.

Другая частка членаў ЦК КП(б) ЛіБ на чале з А. Чарвяковым настойліва патрабавала ад ЦК РКП(б) тэрмінова разгледзець беларускае пытанне. У маі 1920 г. па ініцыятыве А. Чарвякова, які ўзначальваў савецкі аддзел Рэўваенсавета Заходняга фронту, праходзілі нарады камуністаў-беларусаў з абмеркаваннем аднаго і таго ж пытання: “Аб аднаўленні савецкай улады і самавызначэнні Беларусі”.

Нарэшце, улічваючы настрой працоўных мас, ЦК КП(б) ЛіБ 6 ліпеня 1920 г., калі Чырвоная Армія перайшла ў наступленне, выказаўся за аднаўленне беларускай савецкай дзяржаўнасці. Тым часам Чырвоная Армія працягвала наступленне.

12 ліпеня 1920 г. у Маскве быў падпісаны дагавор паміж Літвой (сталіца – г. Коўна) і РСФСР. Разлічваючы на перамогу савецкай улады ў Літве і яе магчымыя сутыкненні з Польшчай, урад РСФСР пайшоў на тое, каб уключыць частку тэрыторый з гарадамі Гродна, Шчучын, Ашмяны, Смаргонь, Браслаў у межы Літвы. Віленскі край з Вільняй таксама быў прызнаны часткай Літвы.

У сувязі з падпісаннем гэтага дагавора юрыдычна перастала існаваць Літоўска-Беларуская ССР. Пачалася практычная работа па аднаўленні беларускай дзяржаўнасці. 30 ліпеня1920 г. замест Мінскага губрэўкома быў створаны Ваенрэўком Беларускай Рэспублікі. У яго ўвайшлі А. Чарвякоў – старшыня, В. Кнорын – намеснік старшыні, І. Адамовіч– намеснік старшыні па ваенных справах. Членамі рэўкома таксама з’яўляліся У. Ігнатоўскі, А. Вайнштэйн і інш. Белваенрэўком з’яўляўся часовым органам улады на вызваленай ад інтэрвентаў тэрыторыі Беларусі.

Вельмі складаным было тэрытарыяльнае пытанне адноўленай рэспублікі. Канкрэтна яе межы не былі вызначаны. І зрабіць гэта было вельмі цяжка. У

ліпені 1920 г., калі Чырвоная Армія паступова прасоўвалася на захад, з'явілася рэальная магчымасць аднавіць рэспубліку ў тых межах, якія былі вызначаны камісіяй І з'езда КП(б)Б. Але і ў дадзеным выпадку зрабіць гэта было немагчыма. У выніку вельмі цяжкіх унутраных і знешнепалітычных абставін, паражэння Чырвонай Арміі на Заходнім фронце Беларуская Рэспубліка аднаўлялася ў межах адной Мінскай губерні, а дакладней, толькі 6 яе паветаў. На іх тэрыторыі налічвалася 1 млн 635 тыс. жыхароў.

Тым часам Чырвоная Армія працягвала свой паход на захад. У канцы ліпеня 1920 г. яна ўступіла на тэрыторыю Польшчы. Пад яе ўздзеяннем значна ўзмацніўся рэвалюцыйны рух польскага пралетарыяту. У населеных пунктах, занятых Чырвонай Арміяй, ствараліся рэвалюцыйныя камітэты. 30 ліпеня 1920 г. у Беластоку польскімі рэвалюцыянерамі быў створаны Часовы рэвалюцыйны камітэт Польшчы (Польрэўком).

У гэтых умовах ЦК РКП(б), савецкі ўрад далі ўказанне прадоўжыць наступленне Чырвонай Арміі. Аднак, плануючы далейшыя баявыя дзеянні, савецкае камандаванне ў сваіх разліках недаацаніла здольнасць польскай арміі абараняцца і перабольшыла наступальныя магчымасці Чырвонай Арміі. Сілы Заходняга фронту значна аслаблі. 13 жніўня 1920 г. Чырвоная Армія аднавіла наступленне, але няўдала. 16 жніўня польскія войскі перайшлі ў контрнаступленне і авалодалі ініцыятывай. 17 жніўня Чырвоная Армія пачала адступаць. Пры адыходзе войскі фронту неслі значныя страты.

18 сакавіка 1921 г. у Рызе быў падпісаны мірны дагавор паміж Савецкай Расіяй, Украінай і Польшчай. Згодна з дагаворам, заходнія землі Беларусі, тэрыторыі сучасных Брэсцкай і Гродзенскай абласцей, частка Мінскай вобласці (без Мінска) і Віцебскай адышлі да Польшчы. Тэрыторыя склала больш за 100 тыс. км 2, на ёй жыло звыш 4 млн чалавек. Акупацыя гэтых тэрыторый Польшчай працягвалася да 17 верасня 1939 г.

Тэма 45. Грамадска-палітычнае жыццё і нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва Беларусі ў 20-я гг. XX ст.

1 Палітыка «ваеннага камунізму». Абвастрэнне сацыяльнай напружанасці.

Сацыяльна-эканамічнае становішча на беларускіх землях было вельмі складанае. У Савецкай Расіі бальшавікамі была ўведзена палітыка «ваеннага камунізма» (1918 − сакавік 1921), якая грунтавалася на сістэме надзвычайных мер і мела на мэце ўсталяваць дыктатуру пралетарыяту ў краіне з перавагай дробна-буржуазнага насельніцтва. Сваю назву палітыка атрымала з-за адмены таварна-грашовых адносін, свабоднага гандлю і прыватнай уласнасці і ўвядзення натуралізацыі аплаты працы. У прамысловасці была праведзена нацыяналізацыя ўсіх прадпрыемстваў, уведзены ўсеагульная абавязковая працоўная павіннасць («кто не работает, тот не ест»), а таксама цэнтралізацыя і камандна-адміністрацыйны стыль кіравання прамысловасцю.

Найбольш цяжкая сітуацыя склалася ў сельскай гаспадарцы. Для таго, каб пракарміць армію, рабочых і непрацаздольнае насельніцтва гарадоў, улада ўвяла манаполію хлебнага гандлю і харчразвёрстку. Сяляне абавязаны былі здаваць дзяржаве ўсе лішкі хлеба і іншых прадуктаў па фіксаваных цэнах. На самай справе ў сялян забіраліся не толькі лішкі, але і частка неабходных для спажывання прадуктаў. У большасці выпадкаў іх забіралі ў доўг, або за папяровыя грошы, якія не мелі ніякай пакупной здольнасці. Праводзілі харчразвёрстку спецыяльныя харчатрады і прадстаўнікі мясцовых саветаў. Тых, хто адмаўляўся падпарадкавацца, хаваў збожжа, аказваў супраціўленне, па ўмовах ваеннага часу чакаў расстрэл. У Беларусі палітыка «ваеннага камунізму» ажыццяўлялася на тэрыторыі, якая ў той час кантралявалася бальшавікамі.

У выніку гэтай палітыкі за два гады была зруйнавана гаспадарка былой Расійскай імперыі. Пагаршэнне становішча насельніцтва выклікала сацыяльную напружанасць у грамадстве і прыводзіла да антыбальшавіцкіх выступленняў сялян і салдат.

2 Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў БССР у 1921—1927 гг.

Пасля завяршэння грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі, а так сама правалу спадзяванняў бальшавікоў на “сусветную пралетарскую рэвалюцыю” паўстала пытанне далейшага існавання савецкіх рэспублік, створаных на тэрыторыі былой Расійскай імперыі. Ваенны саюз 1919 года страціў актуальнасць, а ярка акрэсленых форм палітычнага суіснавання пакуль не існавала. Зразумела, што вяртання да ўнітарнай дзяржавы накшталт былой імперыі так сама не магло быць. У кіраўніцтве РСФСР аформілась дзве тэндэнцыі аб’яднальнай дзейнасці – сталінская “аўтанамізацыі” і ленінская “саюзная”. І.Сталін прапаноўваў дамагацца ўключэння савецкіх рэспублік у склад Расійскай Федэрацыі як аўтаномных адзінак. Гэта стварала падставы для ўзнікнення сепаратысцкіх памкненняў і росту супярэчнасцяў у сацыялістычным лагеры. Ленінскі план прадугледжваў стварэнне саюзу незалежных самастойных савецкіх рэспублік (з правам выхаду), і гэты план атрымаў падтрымку ў рэспубліках. Але яшчэ да стварэння саюза рэспублік пачалося іх збліжэнне.

У студзені 1921 года згодна з дагаворам БССР і РСФСР ствараліся аб’яднаныя наркаматы (ваенны, знешняга гандлю, фінансаў, ВСНГ, працы, шляхоў зносін, сувязі) – на базе адпаведных наркаматаў у СНК РСФСР. Пры ўрадзе Расіі стваралася Паўнамоцнае прадстаўніцтва БССР. У лютым 1922 года савецкія рэспублікі, у тым ліку БССР даверылі Савецкай Расіі прадстаўляць іх інтарэсы на сусветнай канферэнцыі ў Генуі, дзе вырашаліся пытанні пасляваеннага жыцця ў Еўропе. Актыўна праводзілася агітацыя за стварэнне саюзнай дзяржавы. У выніку большасць дэлегатаў IV Усебеларускага з’езда Саветаў (снежань 1922 г.) выказалася за стварэнне СССР. Была выбрана дэлегацыя на X Усерасійскі з’езд Саветаў (узначаліў А.Чарвякоў). Усерасійскі з’езд пачаў працу 30 снежня 1922 года, ён пераўтварыўся ў I з’езд Саветаў СССР. Былі абраны кіруючыя органы, у склад якіх увайшло 7 прадстаўнікоў

БССР, у тым ліку А.Чарвякоў. Колькасць асоб у кіраўніцтве СССР вызначалася адпаведна колькасці насельніцтва рэспублік, таму РСФСР мела значную перавагу над астатнімі рэспублікамі. Да кампетэнцыі саюзнага ўрада адносіліся пытанні знешняй палітыкі, гандлю, фінансаў, узброеных сіл, шляхоў зносін, сувязі. Вырашэнне астатніх пытанняў заставалася за ўрадамі рэспублік і саюзнай Канстытуцыяй 1924 года не рэгламентаваліся.

Пасля ўваходжання БССР у склад СССР паўстала новая праблема – неадпаведнасць тэрыторыі БССР і тэрыторыі, заселенай пераважна беларусамі, да тагож, на гэтай тэрыторыі існаваў склаўшыйся стагоддзямі гаспадарчы комплекс. БССР у 1922 годзе – гэта 6 паветаў былой Мінскай губерні з колькасцю насельніцтва 1,5 млн. чалавек. У сакавіку 1923 года кампартыя Беларусі звярнулася да кіраўніцтва РСФСР з прапановай вярнуць у склад БССР адабраныя ў студзені 1919 года тэрыторыі. ЦК РКП(б) згадзілася з гэтай прапановай, але кіруючыя партыйныя работнікі беларускіх губерняў (Смаленскай, Віцебскай і Гомельскай)у складзе РСФСР выказаліся супраць. Патрабаваліся вялікія намаганні, актыўная раз'ясняльная праца, каб пераканаць іх у неабходнасці аб'яднання з БССР.

У сакавіку 1924 года VI Надзвычайны з'езд Саветаў БССР ухваліў аб'яднанне тэрыторый, праведзенае адпаведна рашэнню ЦВК РСФСР ад 3 сакавіка 1924 года. Да БССР было далучана 15 паветаў Віцебскай, Гомельскай (былой Магілёўскай) і Смаленскай губерняў. Тэрыторыя павялічылася крыху болей, чым ў два разы, насельніцтва вырасла да 4,2 млн. чалавек.

У жніўні 1924 года пачалася адміністрацыйная рэформа. Тэрыторыя БССР была падзелена на 10 акруг па 10 раёнаў. У межах кампактнага пражывання нацыянальных меньшасцяў ствараліся нацыянальныя Саветы (яўрэйскія, польскія, рускія, латышскія, нямецкія, украінскія). Аднак па-за межамі БССР засталася большая частка Гомельскай губерні і частка Віцебскай – Веліжскі, Себежскі і Невельскі паветы). У лістападзе 1926 года пасля вывучэння гэтага пытання Палітбюро ЦК УКП(б) прыняў рашэнне аб перадачы БССР Гомельскага і Рэчыцкага паветаў, у перадачы паўночных паветаў было адмоўлена. З 1926 года БССР уяўляла больш-менш адзіны культурны і гаспадарчы рэгіён, на тэрыторыі якого пражывала пераважная большасць прадстаўнікоў адной нацыі – беларусаў.

3 Палітыка беларусізацыі. Становішча нацыянальных меншасцей у БССР.

Значнай з'явай у нацыянальных адносінах у20–30-я гады была палітыка беларусізацыі. Многія здабыткі гэтай палітыкі, яе станоўчы вопыт і трагічны лёс маюць і сёння вялікае значэнне для нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі. Патрэбна адзначыць, што амаль да сярэдзіны 80-х гадоў афіцыйная гістарычная літаратура амаль нічога не гаварыла аб гэтай з'яве ў нацыянальным развіцці беларускага народа альбо трактавала адмоўна тэндэнцыі нацыянальнага адраджэння на Беларусі ў 20-я гады.

Разглядаючы перадумовы палітыкі беларусізацыі, неабходна мець на ўвазе асаблівасці нацыянальных адносін на Беларусі на пачатку 20-х гадоў

і праблемы, якія існавалі ў гэтым пытанні. Па-першае, ішоў працэс тэрытарыяльнага самавызначэння беларускага народа, беларускай нацыі. У1920–1923 гг. тэрыторыя БССР уключала толькі 6 паветаў былой Мінскай губерні: Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі (з 1924 г. – Чэрвеньскі), Мазырскі, Мінскі, Слуцк і (усяго 52 402 км 2, каля 1,5 млн чалавек насельніцтва). Ужо ў верасні– лістападзе 1921 г. кіруючыя органы Беларусі ўзнімалі пытанне аб вяртанні БССР паветаў, у якіх большасць насельніцтва складалі беларусы.

3 сакавіка 1924 г. было заключана пагадненне паміж ЦВК РСФСР і ЦВК БССР аб перадачы(а лепш гаварыць – аб вяртанні) БССР 16 паветаў Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай губерняў. У снежні 1926 г. Беларускай ССР былі вернуты яшчэ 2 паветы: Гомельскі і Рэчыцкі. У выніку тэрыторыя БССР склала 152 854 км 2 , а колькасць насельніцтва – 5 млн чалавек.

Па-другое, важна ўявіць асаблівасці нацыянальнага складу тагачаснага насельніцтва Беларусі. Паводле перапісу 1926 г., беларусы складалі 80,6 %, яўрэі – 8,2, рускія – 7,7, палякі – 2, украінцы – 0,7, латышы – 0,3, літоўцы, немцы і татары – па 0,1 %. Такім чынам, можна гаварыць аб нацыянальна-беларускім характары асноўнай масы насельніцтва Беларусі з улікам наяўнасці шматнацыянальнай меншасці, якая складала амаль пятую частку насельніцтва.

Трэба ўлічваць і тую акалічнасць, што беларусы ў асноўнай масе жылі ў вёсцы. Гарады былі населены значнай часткай рускіх, яўрэяў, якія складалі ў некаторых гарадах і мястэчках да 40–60 % жыхароў. Іншыя нацыянальныя меншасці жылі як у гарадах, так і ў вёсках даволі кампактнымі этнічнымі групамі. Такое рассяленне стварала пэўнае размежаванне паміж рускамоўным горадам і беларускамоўнай вёскай, што ўносіла спецыфіку ў моўную сітуацыю і патрабавала ўлічваць гэта ў нацыянальнай палітыцы.

Па-трэцяе, палітыка беларускага адраджэння ва ўмовах савецкай улады пачала ажыццяўляцца раней афіцыйна абвешчанай беларусізацыі перш за ўсё намаганнямі дзеячаў нацыянальна-дэмакратычнага руху. У снежні 1920 г. загадчык беларускага аддзела Наркамата асветы П. Ільючонак звярнуўся да кіраўніцтва Кампартыі Беларусі з запіскай, у якой абгрунтаваў неабходнасць пераводу навучання ў школах на беларускую мову, а таксама арганізацыі школ для нацыянальных меншасцей. Гэта ініцыятыва была падтрымана. У пачатку 1921 г. у Камісарыяце земляробства, які ўзначальваў У. Ігнатоўскі, для супрацоўнікаў былі арганізаваны курсы па вывучэнні беларускай мовы і ўсё справаводства пераведзена на беларускую мову. Па ініцыятыве А. Бурбіса ажыццяўлялася беларусізацыя ў Наркамаце замежных спраў. Такім чынам, намаганнямі вядомых дзеячаў беларускага нацыянальнага адраджэння закладваліся асновы нацыянальнай палітыкі, якая пазней была аформлена як дзяржаўная палітыка беларусізацыі.

Варта зазначыць, што на пачатку 20-х гадоў савецкія органы і Кампартыя рэспублікі як кіруючая сіла палітычнай сістэмы даволі рэалістычна вызначалі праблемы нацыянальнага адраджэння беларускай нацыі. У распрацоўцы палітычнай лініі па гэтым пытанні прыкметнае месца належыцьVII з’езду КП(б) Беларусі (красавік 1923 г.), на якім з дакладам “Нацыянальныя моманты ў дзяржаўным і партыйным будаўніцтве” выступіў старшыня ЦВК і СНК БССР

А. Чарвякоў. У чэрвені 1923 г. прынята пастанова Пленума ЦБ КП(б) Беларусі, у якой даволі дакладна быў намечаны комплекс практычных мерапрыемстваў па ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі: гаспадарчае адраджэнне краю, тэрытарыяльнае самавызначэнне беларускага народа, развіццё беларускай мовы і пашырэнне сферы яе ўжывання, развіццё нацыянальнай культуры і павышэнне культурнага ўзроўню насельніцтва, вылучэнне і выхаванне кадраў партыйнага, дзяржаўнага і іншага апарату з карэннага насельніцтва, прыцягненне да актыўнага ўдзелу ў нацыянальным адраджэнні дэмакратычныхэлементаў.

Аб'ектыўны падыход да гісторыі патрабуе прызнаць, што КП(б) Беларусі на працягу 1923–1925 гг. надавала значную ўвагу нацыянальнай палітыцы. На Пленуме ЦБ КП(б)Б у чэрвені 1924 г. разглядалася пытанне аб праграме правядзення нацыянальнай палітыкі ў Беларусі; у1925 г. пытанні нацыянальнай палітыкі разглядаліся на пленумах ЦК КП(б)Б у студзені, маі, кастрычніку; у рэзалюцыі апошняга быў вызначаны раздзел "Беларусізацыя". У кастрычніку 1926 г. абмеркавана пытанне "Аб ходзе ажыццяўлення ў рэспубліцы нацыянальнай палітыкі". Аднак сярод кіраўніцтва рэспублікі былі і праціўнікі беларусізацыі, што стварала цяжкасці.

Пачатак палітыкі беларусізацыі варта аднесці да чэрвеня1924 г., калі сесія ЦВК БССР прыняла пастанову аб утварэнні спецыяльнай камісіі на чале з А. Хацкевічам па ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі. Такія ж камісіі ўтвараліся і пры акруговых выканаўчых камітэтах.

З сярэдзіны 1923 г. і да сярэдзіны 1924 г. працэс беларусізацыі прайшоў першую фазу, на працягу якой вялася ў асноўным яе палітычная і ідэалагічная падрыхтоўка. Была разгорнута тлумачальная работа сярод насельніцтва аб неабходнасці і сэнсе беларусізацыі, распрацаваны погляды на змест гэтай палітыкі, прымаліся дырэктыўныя дакументы, пастановы. Лета 1924 г. - прыкладна да 1928 г. – час актыўнай практычнай рэалізацыі вызначаных напрамкаў дзейнасці ў палітыцы беларусізацыі.

З улікам інтарэсаў і патрабаванняў нацыянальных меншасцей (карыстанне роднай мовай, захаванне здабыткаў нацыянальнай культуры, звычаяў і г.д.) у месцах іх кампактнага пражывання ўтвараліся нацыянальныя Саветы. У 1928 г. Налічвалася 23 яўрэйскія, 19 польскіх, 16 рускіх, 5 латышскіх, 2 украінскія і 2 нямецкія саветы. У 1932 г. быў утвораны нацыянальны (польскі) раён з цэнтрам у Дзяржынску. Палітыка беларусізацыі не азначала прыніжэння ці ўшчамлення правоў і інтарэсаў нацыянальных меншасцей.

Адным з напрамкаў нацыянальнай палітыкі з'яўлялася беларусізацыя дзяржаўных устаноў, грамадскіх арганізацый, якая мела на мэце вывучэнне супрацоўнікамі беларускай мовы і перавод на яе справаводства. Усім дзяржаўным і грамадскім установам, а таксама прадпрыемствам і кааператыўным аб'яднанням былі ўстаноўлены канкрэтныя тэрміны пераводу іх працы на беларускую мову. У 1927 г. беларускай мовай валодалі ў цэнтральных дзяржаўных установах 80 % служачых, у акруговых і раённых установах – каля 70 %. Асноўныя рэспубліканскія дакументы выдаваліся на

беларускай мове, а таксама на адной з трох іншых моў: рускай, польскай і яўрэйскай.

У ходзе беларусізацыі вырашалася задача больш актыўнага вылучэння на кіруючыя пасады прадстаўнікоў карэннага(не толькі беларускага) насельніцтва. У выніку за 1926–1927 гг. сярод кіраўнікоў акруговага і раённага ўзроўню ўдзельная вага беларусаў павялічылася з 30,3 да 46 %, гарсаветаў – з 43,8 да 45 %. У складзе сельскіх Саветаў колькасць беларусаў была 90 %.

Важным напрамкам беларусізацыі з'яўлялася нацыянальна-культурнае будаўніцтва. Калі ў 1921 г. беларускія школы складалі 1,5 % ад агульнага ліку школ на Беларусі, то ў 1931 г. – 83,5 %. У 1930 г. 76,6 % студэнтаў вышэйшай школы рэспублікі былі беларусамі, выкладанне больш за 80 % вучэбных дысцыплін вялося на беларускай мове.

У Беларускай акадэміі навук працавалі нацыянальныя сектары – яўрэйскі, польскі, латышскі, а таксама Камісія па вывучэнні Заходняй Беларусі, сектар масавай работы і краязнаўства. Сярод навуковых супрацоўнікаў акадэміі ў пачатку 30-х гадоў колькасць беларусаў складала 45 %.

Шмат што было зроблена ў напрамку беларусізацыі ў выдавецкай справе. У 1924 г. заснавана Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі. Апрача таго, працавалі выдавецтвы тэхнічнай літаратуры, вайсковай літаратуры і інш. У 1931 г. Было выдадзена на беларускай мове 1069 назваў кніг. У перыядычным друку выходзіла 13 рэспубліканскіх газет, з іх 6 – на мовах нацыянальных меншасцей, 64 – раённыя і гарадскія газеты, 30 часопісаў.

Не заўсёды існавалі ўмовы для вывучэння беларускай мовы – не хапала выкладчыкаў, падручнікаў. Здараліся выпадкі звальнення з пасады за невалоданне беларускай мовай. Усё гэта выклікала незадаволенасць пэўнай часткі насельніцтва, садзейнічала ажыўленню антыбеларускіх настрояў, кампраметавала сутнасць палітыкі беларусізацыі.

Але, нягледзячы на супярэчнасці, цяжкасці і недахопы, палітыка беларусізацыі з'явілася практычнай спробай ва ўмовах савецкай улады ажыццявіць беларускае нацыянальнае адраджэнне. Да яе істотных станоўчых вынікаў у 20-я гады можна аднесці пэўную дэмакратызацыю грамадскага жыцця, калі нацыянальны момант, нацыянальныя пытанні прывялі да аб'яднання даволі разнастайных палітычных сіл. Кампартыя (бальшавікоў) Беларусі рабіла пэўныя крокі да супрацоўніцтва з больш шырокімі нацыянальнымі коламі. Аб прычынах згортвання палітыкі беларусізацыі ў канцы 20 – пачатку 30-х гадоў будзе сказана ў параграфе, прысвечаным палітычным рэпрэсіям.

4 Усталяванне аднапартыйнай сістэмы. Прыняцце Канстытуцыі БССР 1927 г.

З пачаткам НЭПа ў 1921 годзе адбылася адносная дэмакратызацыя жыцця, наколькі гэта дазваляла аднапартыйная сістэма. Аднак гэта не адзначала змяншэння пастаяннага націска кампартыі на сваіх палітычных апанентаў. У выніку, у 1921 годзе самаліквідаваліся ці распаліся Бунд, Яўрэйская камуністычная партыя, была разгромлена Беларуская партыя

сацыялістаў-рэвалюцыянераў (беларускія эсэры). Паступова аслаблі пазіцыі ўрада БНР у эміграцыі. Амністыя 1923 года асобам, якія не выступалі супраць савецкай улады са зброяй стварыла ўмовы для вяртання на радзіму часткі нацыянальных дзеячоў. А пачатак палітыкі “беларусізацыі” ў 1924 годзе паклаў канец існаванню палітычных цэнтраў БНР. На Берлінскай канферэнцыі ў кастрычніку 1925 года Рада БНР аб’явіла аб спыненні барацьбы супраць савецкай ўлады і аб самароспуску.

5-12 красавіка 1927 года на чарговым VIII з’ездзе Саветаў БССР была прынята новая Канстытуцыя БССР, якая замацавала тэрытарыяльныя змяненні і адзначыла некаторыя асаблівасці дзяржаўнага будаўніцтва на Беларусі. Вышэйшым органам улады з’яўляўся Усебеларускі з’езд Саветаў. Дзяржаўнымі мовамі былі зацверджаны беларуская, руская, польская і яўрэйская. Мовай міжнацыянальных зносін вызначалася беларуская.

Тэма 46. Пераход да Новай эканамічнай палітыки (НЭПа).

1 Ажыццяўленне мерапрыемстваў новай эканамічнай палітыкі ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы.

У надзвычайных умовах замежнай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны надзвычайныя метады кіравання гаспадаркай былі апраўданы, але з усталяваннем міру насельніцтва не згаджалася з працягам “ваеннага камунізму”. Расла незадаволенасць рэквізіцыямі сярод сялянства. На мяжы 1920-1921 гг. краіну ахапіў цяжкі эканамічны крызіс, звязаны з памылкамі ў празмерна цэнтралізаваным кіраванні гаспадаркай краіны.

На X з’ездзе РКП(б) у сакавіку 1921 г. пачалося афармленне новай эканамічнай палітыкі (НЭПа). НЭП – гэта сістэма мер, разлічаных на пераходны перыяд ад капіталізму да сацыялізму. Харчразвёрстка замянялася харчовым падаткам, які паступова зніжаўся з 20% прадукцыяй у 1921 г. да 5% грашыма ў 1925 г. Абвяшчалася свабоды форм землекарыстання. Законнымі прызнаваліся арцель, абшчына, прыватнае ўладанне ў выглядзе вотрубаў ці хутароў. Дазвалялася арэнда і наёмная праца. Замацаваны гэтыя прынцыпы былі ў Законе аб працоўным землекарыстанні (верасень 1922 г.). Заахвочвалася кааперацыя. Развіццё атрымалі збытавыя, забеспячэнскія, крэдытныя аб’яднанні. Да канца 20-х гг. імі была ахоплена большая палова ўсіх сялянскіх гаспадарак. Дазваляўся з мая 1921 года прыватны гандаль лішкамі сельскагаспадарчай прадукцыяй. Свабодны гадаль патрабаваў стабільнай грашовай сістэмы, таму з 1922 года пачалася грашовая рэформа.

Быў адноўлены Дзяржбанк у 1921 годзе і дазволена стварэнне акцыянерных і камерцыйных банкаў. Развіваўся знешні гандаль, стымуляваўся экспарт. З 1922 года Дзяржбанк пачаў эмісію чырвонцаў, якія мелі намінальнае залатое забеспячэнне (1 чырвонец = 10 дарэвалюцыйных залатых рублёў = 7,74 г золата). Для падтрымання валютнага курсу чырвонца збіраліся валютныя рэзервы. Але адразу перайсці на цвердыя грошы краіна не здолела, былі ўведзены “пераходныя” грошы – “саўзнакі”, з дапамогай іх ліквідаваўся бюджэтны дэфіцыт (“саўзнак” – рубель 1923 г. быў роўны 1 млн. рублёў эмісіі

да 1922 г.). З лютага 1924 года быў спынены выпуск саўзнакаў. Замест іх уводзілі казначэйскія білеты вартасцю 1, 3, 5 руб. з намінальным залатым зместам, разменная сярэбраная і медная манеты. Адмяняліся ўсе абмежаванні для прыватных асоб на сумы ў ашчадных касах, гарантавалася тайна ўкладаў і немагчымасць іх канфіскацый.

У сваю чаргу, зрухі ў сельскайгаспадарке і гандле, стабілізацыя грашовай сістэмы стымулявалі развіццё прамысловасці.

Былі адменены дэкрэты, якія абмяжоўвалі свабоду дзеяння дробных і сярэдніх прадпрыемстваў, аказвалася падтрымка гэтым мерапрыемствам. Прамысловым кааператывам надавалі правы юрыдычных асоб, яны маглі выкарыстоўваць наёмную працу, атрымліваць доўга- і кароткатэрміновыя крэдыты. Дазвалялася арэнда прыватным асобам і кааператывам прамысловых прадпрыемстваў. Даваўся дазвол на канцэсіі – здачу ў арэнду прадпрыемстваў замежным фірмам (на Беларусі канцэсіі не былі пашыраны). У буйной вытворчасці ліквідавалі глаўкі, стваралі трэсты – аб'яднанні аднародных прадпрыемстваў, якія здымаліся з дзяржаўнага забеспячэння, атрымалі поўную гаспадарчую і фінансавую незалежнасць: права вырашаць, што выпускаць і дзе рэалізоўваць прадукцыю, права выпускаць доўгатэрміновыя аблігацыйныя пазыкі, самастойна выкарыстоўваць прыбытак і г.д.

Усерасійскі Савет Народнай Гаспадаркі болей не мог умешвацца ў бягучую дзейнасць прадпрыемстваў і трэстаў, ён ператварыўся ў каардынацыйны цэнтр. Ствараліся сіндыкаты – аб'яднанні трэстаў на аснове кааперацыі. Яны займаліся збытам, забеспячэннем, крэдытаваннем, знешнегандлёвымі аперацыямі ў межах асобна ўзятай галіны прамысловасці. Уводзілася матэрыяльнае стымуляванне працы: была адноўлена грашовая аплата працы, уведзены тарыфы што выключала ўраўнілаўку, зняты абмежаванні на павелічэнне заробкаў, ліквідаваны працоўныя арміі, адменены абавязковая працоўная павіннасць і абмежаванні на перамену месца работы.

Эканамічны механізм будаваўся на рыначных прынцыпах. НЭП пачаўся з сельскагаспадарчай палітыкі, затым развіўся ў палітыку заахвочвання гандлю, што патрабавала стабілізацыі валюты, стаў прамысловай палітыкай, што дазволіла павялічыць вытворчасць у прамысловасці.

Галоўнымі мэтамі НЭПа лічыліся максімальна хуткае пераадольванне гаспадарчага заняпаду і стварэнне ўмоў для пабудовы аднароднага сацыялістычнага грамадства.

На пачатак 20-х гг. 89% насельніцтва БССР жыло на вёске, дзе нагладалася значная перанаселенасць – шчыльнасць насельніцтва на 1 кв.км складала 33,2 чалавек (самая высокая ў СССР). Да таго большая частка зямель была нізкай якасці.

Увядзенне НЭПа супала па часе з перадачай зямлі сялянам згодна з Дэкрэтам аб зямлі пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх і польскіх акупантаў. Аднак "прырэзка" зямлі аказалася нязначнай – да 1917 г. на адзін двор прыходзілася 8,35 дзесяціны зямлі, у 1924 г. – 8,41 дзесяціны. За кошт прырэзак у асноўным ствараліся новыя гаспадаркі. Землезабяспечанасць сярэдняй беларускай сялянскай гаспадаркі была ніжэй сярэдняй па СССР амаль на 1/3. У выніку перараз меркавання зямлі адбылося змяненне сацыяльнага

складу сельскага насельніцтва. Найбольш шматлікай групай сталі серадняцкія гаспадаркі (іх 65%), якім належала 75% пасяўной плошчы.

На 1925/26 гг. сельскагаспадарчая вытворчасць у агульным дасягнула даваеннага ўзроўню. Удзельная вага сельскай гаспадаркі ў вытворчасці склала 71,6%, прамысловасці – 22,3%, лясной гаспадаркі – 6,1%. Пераважала развіццё жывёлагадоўлі з малочным і свінагадоўчым ухілам. Значныя плошчы займалі пасевы тэхнічных культур. Аднак беларуская сялянская гаспадарка з'яўлялася маламоцнай: кожная пятая гаспадарка была бясконнай, з адным канём – 67,8%; бескароўных – 6,1%, з адной каровай – 58%.

Зямельны кодэкс БССР прыняты ў красавіку 1925 г. пасля ўзбуйнення БССР замацаваў участкава-падворны парадак землекарыстання ў БССР (замест абшчыннага ў РСФСР), захаваў свабоду выбару формы землекарыстання, але з абмяжаваннямі для хутароў і вотрубаў, зацвярджаў нормы зямельнага надзела, у каго было звыш – лішкі адразалі. Дзяржавай рэкамендаваліся калектыўныя формы землекарыстання.

Сельскагаспадарчая палітыка ў 1925/1928 гг. абазначаецца тэрмінам "прышчэпаўшчына". Д.Ф.Прышчэпаў, наркам земляробства БССР, быў прыхільнікам стварэння хутароў і пасёлкаў па тыпу вотрубаў. Як вынік – на 1928 гг. у рэспубліцы было землеўладкавана 2.344 тыс. гектараў зямлі, з іх хутары і вотрубы склалі 23%. На хутары і вотрубы заахвочвалі перасяляцца беззямельных і малазямельных сялян, іх надзелы часта ствараліся за кошт адрэзкоў ад надзелаў заможных сялян-кулакоў.

Сельскагаспадарчая кааперацыя ў БССР развівалася галоўным чынам у крэдытнай сферы, забеспячэнні і збыце прадукцыі вытворчасці. Ступень кааперыравання да кастрычніка 1927 г. дасягнула 37% сялянскіх гаспадарак. Аднак вытворчая кааперацыя амаль не развівалася.

Развіццё прамысловасці ў БССР у пачатку 20-х гадоў праходзіла на фоне ўзбуйненняў тэрыторыі рэспублікі. У 1924 годзе яна павялічыла сваю магутнасць на 90% (далучана Віцебшчына), у 1926 годзе выросла яшчэ на 45% (далучана Гомельшчына).

Аднаўляліся буйныя прадпрыемствы, за 1922-1927 гг. пераабсталявана 1, расшырана 119 фабрык і заводаў. Адноўлена палова буйных прадпрыемстаў, што дзейнічалі да першай сусветнай вайны, колькасць рабочых дасягнула 93,9% ад даваеннага ўзроўню, выпуск валавай прадукцыі перавысіў даваенны на 41,7%. Аднаўляліся і дробныя саматужна-рамесніцкія прадпрыемствы. У 1927 г. іх дзейнічала 85,7% ад даваеннай колькасці, выпуск валавай прадукцыі склаў 62,5% даваеннага ўзроўню.

Згодна з прынцыпамі НЭПа, да канца 1922 г. дзяржаўная прамысловасць Беларусі была знята з дзяржзабеспячэння і пераведзена на дзяржразлік. Да верасня 1924 г. трэсты былі арганізаваны па ўсёй тэрыторыі рэспублікі, сярод іх: Скуратрэст, Папératрэст, Шклотрэст, Харчтрэст, Дзяржспірт, Металатрэст і інш., усяго 9 трэстаў. Праводзілася электрыфікацыя гаспадаркі. У 1925-1926 гг. у Беларусі дзейнічала 40 электрастанцый.

Буйных прадпрыемстваў на Беларусі ў 1925 г. налічвалася 76, з іх дзейнічала 67, у харчовай, дрэваапрацоўчай, папяровай галінах. Да 1925 г. валавая прадукцыя буйной прамысловасці перавысіла ўзровень 1913 г. на 28,5%. Доля дзяржаўнага сектара склала 96,8%. Найбольш хуткімі тэмпамі развіваліся металаапрацоўчая прамысловасць, вытворчасць якой за 1923-1925 гг. павялічылася больш чым у 5 разоў, але яе ўдзельная вага яшчэ заставала нязначнай. Хуткімі тэмпамі расла выпрацоўка торфу, яна перавысіла даваенны ўзровень у 2,3 раза.

Дробная прамысловасць пераважала ў эканоміцы БССР. На 1926 г. у ёй было занята 73% рабочых, валавай прадукцыі яна вырабляла 58% усёй прамысловасці. Дамінуючымі галінамі былі харчовая, вытворчасць адзення, гарбарна-футравая, апрацоўка металаў, дрэва, воўны, мінералаў. Большая частка дробнай вытворчасці – гэта недзяржаўны сектар. У 1925 г. быў створаны «Белсаматужпрамсаюз», які займаўся пытаннямі каардынацыі і кааперыравання дробнага таваравытворцы. Дзейнасць прыватнакапіталістычных прадпрыемстваў абмяжоўвалася і рэгулявалася дзяржавай. Іх патрэбы ў абсталяванні, матэрыялах, атрыманні крэдытаў у апошнія гады існавання НЭПа задавальняліся ў апошнюю чаргу, да таго, прыватныя прадпрыемствы выплачвалі вялікія падаткі. Таму ўдзельная вага прыватнай прамысловасці паступова зніжалася. Прадпрыемствы, якія здаваліся ў арэнду, былі невялікія (каля 15 чалавек). Найбольшую распаўсюджанасць набыла арэнда ў харчовай, гарбарнай, лесапільнай, смалакурна-шкіпідарнай і цэглавай прамысловасцях. Памер арэнднай платы вызначаўся ў залежнасці ад кошту маёмасці.

Магчымасці далейшага развіцця прамысловасці на базе створаных яшчэ ў часы імперыі вытворчых магутнасцях былі абмежаванымі. Для забеспячэння эканамічнай стабільнасці неабходна было правядзенне індустрыялізацыі. З 1926 г. разгарнулася будаўніцтва шэрага буйных прадпрыемстваў: Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату, Гомсельмашу, Магілёўскай фабрыкі штучнага шоўку, запалкавай фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» ў Новабарысаве, металаапрацоўчага завод «Камунар» у Мінску, БелДРЭС, а так сама вялікай колькасці цэглавых заводаў.

2. Згортванне НЭПу і пераход да адміністрацыйна-камандных метадаў кіравання эканомікай.

Восенью 1923 г. – распачаўся першы крызіс нэпа. Пачынаючы са жніўня 1922 г. сталі ўтварацца «нажніцы цэн» – калі кошты на прамысловыя вырабы пераўзышлі кошты на сельскагаспадарчую прадукцыю ў параўнанні з даваенным узроўнем больш чым у 3 разы. Сялянам стала нявыгадна прадаваць сваю прадукцыю і купляць тавары прамысловасці. «Крызіс збыту» адбыўся, калі прамысловыя прадпрыемствы яшчэ толькі пачалі аднаўляцца, толькі пачалі наладжваць выпуск прадукцыі, яле яна ўжо не раскупалася, а склады прадпрыемстваў затаварваліся. Прычынамі крызісу было больш хуткае аднаўленне сельскай гаспадаркі, манапольнае ўзняцце цэн на прамысловыя вырабы з боку трэстаў і сіндыкатаў; рэзкае зніжэнне цэн на хлеб пасля добрага

ўраджаю 1923 года, а, так сама, неразвітасць гандлёвага апарату і памяншэнне крэдытавання гандлю ў верасні-кастрычніку 1923 годзе.

Меры па пераадоленню крызісу былі пераважна эканамічныя: дзяржава ўстанавіла дырэктыўныя цэны на прадметы спажывання, была праведзена грашовая рэформа 1924 г.

Рубеж 1925/26 гг. – гэта другі крызіс, сутнасць якога была ў вострым дэфіцыце тавараў. Дэфіцыт узнік у выніку хуткага росту вытворчых сіл. Прычыны крызісу былі ў праліках у планаванні. Дзяржава не змагла закупіць хлеб у сялян па нізкіх цэнах, таму што 1925 г. быў неўраджайны. Рынак прамтавараў БССР залежыў ад іх паступлення з-за мяжы, а памеры экспарту хлеба былі невялікімі. Да таго, значна выросла пакупніцкая здольнасць сельскага і гарацкога насельніцтва, якую прамысловасць не паспявала задавальняць.

Меры пераадолення былі пераважна эканамічныя: быў скарочаны імпарт, замарожаны новабудоўлі, павялічаны ўскосныя падаткі; з 1925 г. уведзены дзяржаўны продаж гарэлкі; павялічана нарыхтоўчая цана на зерне, адноўлена дзейнасць закансерваваных тэхнічна адсталых прадпрыемстваў.

Крызіс 1925 года паказаў розніцу паміж мэтамі савецкай дзяржавы і прыватнага сектара, дрэннае валоданне кіраўніцтвам эканамічнымі рычагамі.

Рубеж 1927/28 гг. – трэці крызіс, які меў больш сацыяльна-палітычную сутнасць. Прычынамі крызісу было невыкананне дзяржаўнага плана хлебанарыхтовак па танных коштах, што вызвала недахоп сродкаў для індустрыялізацыі.

Меры пераадолення мелі надзвычайны характар, блізкі да метадаў «ваеннага камунізму». Такім чынам, НЭП страціў актуальнасць.

Агульныя прычыны крызісаў – памкненне партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва да паскоранай мадэрнізацыі грамадства пад лозунгам «рыўка ў сацыялізм», што дэфарміравала эканоміку. Існуючая ў краіне аўтарытарная палітычная сістэма неадпавядала рыначным метадам кіравання эканомікай. Адсутнічалі трывалыя сувязі з сусветнай эканомікай, бо існавала манаполія дзяржавы на знешні гандаль.

Гаспадарчае развіццё было падпарадкавана інтарэсам унутрыпартыйнай барацьбы. Апарат кіравання, больш звыклы да метадаў “ваеннага камунізму” праяўляў у большасці некампетэнтнасць. Адбываўся хуткі рост адміністрацыйна-бюракратычнага апарату, які бачыў у адраджэнні рынку небяспеку сваім прывілеям. Да таго ж, ў масавай свядомасці савецкіх грамадзян узніклі супярэчлівыя меркаванні. Па сутнасці, пасля рэвалюцыі 1917 г. адбылася “рэстаўрацыя” капіталізму. Як вынік – незадаволенасць працоўных НЭПам, арыентацыя іх на агульную грамадзянскую роўнасць.

Былі і станоўчыя вынікі правядзення НЭПа на Беларусі. Была адноўлена сельская гаспадарка рэспублікі, адноўлена прамысловасць, узрасла колькасць прадпрыемстваў і працуючых на іх. Спажывецкі рынак быў напоўнены асноўнымі таварамі, павялічыўся абарот гандлю. Тым не менш, Беларусь заставалася індустрыяльна слабаразвітай рэспублікай СССР, удзельная вага яе прамысловасці ў 1926 годзе склала менш аднаго працэнта ад усёй прамысловасці СССР.

Пасля правалу “сусветнай рэвалюцыі” ў кіраўніцтве краіны стала пашырацца ідэя аб магчымасці пабудовы сацыялізму ў адной асобна ўзятай краіне. Існавала дзве праграмы сацыялістычнага будаўніцтва, розніца паміж імі знаходзілася ў пытанні аб суадносінах долі назапашання і спажывання.

Праграма «аптымальнага спалучэння» М.І.Бухарына і спецыялістаў Дзяржплана (А.І.Рыкаў, М.П.Томскі і інш.) прадугледжвала павышэнне жыццёвага ўзроўню і культуры рабочых і сялянскіх мас; рост дзяржаўнай прамысловасці ў народнай гаспадарцы; больш высокія, чым у капіталістычных краінах, тэмпы развіцця гаспадаркі; павышэнне ўдзельнай вагі сацыялістычнага гаспадарчага сектара; аптымальнае спалучэнне ў развіцці цяжкай і лёгкай прамысловасці; аптымальнае спалучэнне ў развіцці прамысловасці і сельскай гаспадаркі. У межах выканання праграмы прадугледжвалася захаванне асабістай уласнай гаспадаркі ў сельскай гаспадарцы; пераадоленне павышэння прамысловых ці рэзкага зніжэння сельскагаспадарчых цэн; пераадоленне значнага павышэння падатковага абкладання сялянства; павышэнне пакупной здольнасці чырвонца; прыцягненне дробных зберажэнняў грамадзян для ўнутраных інвестыцый (да індустрыялізацыі); устанаўленне сувязі эмісіі грошай з ростам тавараабароту; распрацоўка пяцігадовага плана як дакладнага прагноза асноўных тэндэнцый у развіцці эканомікі з папраўкамі пад уплывам міжнародных і ўнутраных умоў.

Гэта была праграма развіцця рэгулюемага рынку з выкарыстаннем таварна-грашовых адносін і пераадоленнем дыспрапорцый развіцця эканамічнымі метадамі. Праграма прадугледжвала існаванне агульнадэмакратычных нормаў, магчымасць з’яўлення новых палітычных аб’яднанняў.

Праграма “вялікага скачка” І.Сталіна (В.Куйбышаў, В.Молатаў, А.Андрэеў, Л.Кагановіч, С.Кіраў, А.Мікаян, Г.Арджанікідзе і інш.) мела крыху іншыя мэты: паскораную індустрыялізацыю народнай гаспадаркі; паскоранае кааперараванне сялянства і сярэдніх слаёў горада; пад’ём дабрабыту і культуры мас; пабудову сацыялізму. Праграма будавалася на прынцыпах адмаўлення адначасовага і раўнамернага развіцця ўсіх галін гаспадаркі; выкарыстання энтузіязму рабочага класу; умацавання партыйна-дзяржаўнай сістэмы, усталявання адміністрацыйна-каманднай сістэмы кіраўніцтва гаспадаркі; адмены плюралізму ў грамадска-палітычным жыцці.

У студзені 1928 г., прынятае рашэнне Палітбюро ЦК УКП(б) аб правядзенні хлебанарыхтоўкі адміністрацыйна-прымусовымі мерамі выклікала адкрытае сутыкненне дзвюх праграм. Прыхільнікі Бухарына былі зняты з пасад і пазней знішчаны. У краіне ўсталявалася таталітарная сістэма кіравання. Таталітарызм – гэта цэласная ідэалагічная, палітычная і арганізацыйная структура, у якой эканоміка мае падпарадкаваную да ідэалогіі ролю.

Тэма 47. Індустрыялізацыя ў Беларускай ССР.

1. Прычыны, мэты і задачы індустріялізацыі. Рэсурсы і сродкі.

У другой палове 1920-х г. на змену эканамічнаму лібералізму перыяду НЭПа ў прамысловасці прыйшла палітыка індустрыялізацыі, прыярытэтным накірункам якой стала стварэнне ў СССР машыннай вытворчасці. Правядзенне індустрыялізацыі тлумачылася неабходнасцю пераадолення тэхнічнай адсталасці і залежнасці СССР ад імпарту прадукцыі цяжкай прамысловасці. Індустрыялізацыя ў БССР была часткай агульнасавецкага працэсу ў прамысловасці, але пры гэтым мела свае асаблівасці. Яе правядзенне звязвалася з шырокім выкарыстаннем значных прыродных багаццяў Беларусі — лесу і торфу, а таксама рэзерваў рабочай сілы ў сельскай мясцовасці, таму вялікая ўвага надавалася харчовай, тэкстыльнай і гарбарнай галінам.

Курс на індустрыялізацыю быў узяты бальшавікамі на XIV з'ездзе ВКП(б) у 1925 г., але фактычнае яе ажыццяўленне пачалося з абвяшчэння першага пяцігадовага плана 1928−1932 г. Для стварэння машыннай вытворчасці патрабаваліся вялікія сродкі. Сярод асноўных крыніц індустрыялізацыі можна вызначыць наступныя:

• калектывізацыя вёскі, у выніку якой былі створаны калгасы — вялікія фабрыкі па вытворчасці збожжа, якое прадавалася за мяжу, а аплата працы калгаснікаў была натуральная і адбывалася раз у год пасля збору ўраджаю, што дазваляла дзяржаве эканоміць вялікія грашовыя сродкі;

• дзяржаўныя абавязковыя ўнутраныя пазыкі і жорсткая эканомія пры аплаце працы рабочых;

• сацыялістычнае спаборніцтва («стаханаўскі рух»), якое патрабавала вялікай мабілізацыі сіл працоўных і арганізоўвала працу рабочых пад лозунгам: «Выканаць план − доўг, перавыканаць − гонар!»;

• продаж матэрыяльных каштоўнасцей за мяжу, сярод якіх у асноўным былі прадметы мастацтва: залатыя і сярэбраныя вырабы, карціны заходнееўрапейскіх майстроў і інш.;

• барацьба з рэлігіяй, якая яшчэ раней была абвешчана «опіумам для народа», а закрыццё царквоў, касцёлаў і іншых рэлігійных установаў і канфіскацыя прадметаў рэлігійнага культу ў канцы 1920-х – 1930-я г. давала дадатковыя сродкі для правядзення індустрыялізацыі;

• бясплатная праца зняволеных ГУЛАГА.

Сацыялістычная індустрыялізацыя – гэта палітыка Камуністычнай партыі і савецкага ўрада, якая мела галоўнай мэтай стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы сацыялізму, пераўтварэнне СССР у эканамічна незалежную дзяржаву з магутным эканоміка-вытворчым, навукова-тэхнічным і абаронным патэнцыялам, забеспячэнне росту прадукцыйнасці працы і на гэтай аснове няўхільнае павышэнне матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню працоўных.

Сутнасць індустрыялізацыі, як адзначалася ў рашэннях XIV з'езда ВКП(б), заключалася ў наступным: "весці эканамічнае будаўніцтва пад такім вуглом гледжання, каб СССР з краіны, якая ўвозіць машыны і абсталяванне, ператварыць у краіну, якая выпускае машыны і абсталяванне". Дзеля таго, каб забяспечыць пераўзбраенне народнай гаспадаркі, падняцце яе на новы тэхнічны ўзровень, аб'яўлялася пераважным развіццё цяжкай

індустрыі, асабліва тых яе галін, што выраблялі сродкі вытворчасці. З'езд заклікаў развіваць "сацыялістычную прамысловасць на аснове павышанага тэхнічнага ўзроўню, аднак у строгай адпаведнасці як з ёмістасцю рынку, так і фінансавымі магчымасцямі дзяржавы". Пры гэтым падкрэслівалася, што поспех індустрыялізацыі будзе залежаць ад умацавання "змычкі" рабочага класа і сялянства, г. зн. удзелу вёскі ў фінансаванні прамысловасці цераз збалансаваную палітыку ў вобласці падаткаў і цэн як на сельскагаспадарчую, так і на прамысловую прадукцыю.

2. Стварэнне новых галін прамысловасці.

Індустрыялізацыя ў БССР з'яўлялася часткай адзінага працэсу індустрыялізацыі СССР. Разам з тым яна мела і свае асаблівасці правядзення.

Па-першае, улічваючы дастатковыя запасы мясцовай сыравіны, патрэбу ў таварах народнага спажывання, зручныя шляхі зносін і вытворчыя традыцыі, асноўная ўвага ў БССР аддавалася паліўнай, дрэваапрацоўчай, папяровай, гарбарнай, швейнай, абутковай і харчовай прамысловасці. У рэспубліцы былі пабудаваны торфапрадпрыемства "Асінторф" каля Оршы, Бабруйскі і Гомельскі дрэваапрацрўчыя камбінаты, Аршанскі льнокамбінат, гарбарны завод "Бальшавік" у Мінску, фабрыка штучнага валакна ў Магілёве, швейная фабрыка "Знамя індустрыялізацыі" і панчошна-трыкатажная фабрыка імя КІМ у Віцебску.

Па-другое, прыгранічнае становішча БССР, неразведанасць яе прыродных багаццяў, недахоп сыравіны, інжынерна-тэхнічных і рабочых кадраў не дазвалялі разгарнуць буйнамаштабнае будаўніцтва аб'ектаў цяжкай прамысловасці, як гэта рабілася ў іншых рэгіёнах СССР. Тым не менш частка капіталаўкладанняў накіроўвалася на развіццё энергетыкі, машынабудавання і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. У гады першай (1928–1932 гг.), другой (1933–1937 гг.) і трэцяй (1938 – чэрвень 1941 гг.) пяцігодак уступілі ў строй Беларуская дзяржаўная раённая электрастанцыя (БелДРЭС), Гомельскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання ("Гомсельмаш"), Мінскі радыёзавод, магілёўскія трубаліцейны і аўтарамонтны заводы, Гомельскі шкляны і Крычаўскі цэментны заводы. Былі створаны таксама станкабудаўнічыя заводы імя К.Е. Варашылава і імя С.М. Кірава ў Мінску і станкабудаўнічыя заводы ў Віцебску і Гомелі.

Па-трэцяе, з-за недахопу ў рэспубліцы ўласных фінансавых рэсурсаў частку сродкаў на патрэбы індустрыялізацыі выдзяляў урад СССР. 3338 млн. руб., укладзеных у прамысловасць БССР за гады першай пяцігодкі, каля1/3 паступіла з саюзнага бюджэту. З рэспублік Савецкага Саюза ў Беларусь завозілася прамысловае абсталяванне, чорныя і каляровыя металы, каменны вугаль, нафтапрадукты. На новабудоўлях рэспублікі працавалі спецыялісты і рабочыя з Масквы, Ленінграда, Кіева, Харкава, прамысловых цэнтраў Урала. У той жа час тэхнічнае абсталяванне, станкі, зробленыя ў БССР, паступалі на фабрыкі і заводы Масквы, Украіны, Урала.

Па-чацвёртае, у БССР былі створаны новыя галіны прамысловасц – паліўная, машынабудаўнічая, радыётэхнічная, хімічная, наладзілася

вытворчасць штучнага валакна і трыкатажу. Сфарміраваліся інжынерна-тэхнічныя кадры, выраслі кадры рабочага класа. Мноства спецыялістаў і кваліфікаваных рабочых было падрыхтавана ў прафесійна-тэхнічных навучальных установах, а таксама на фабрыках і заводах.

Шляхі і метады ажыццяўлення індустрыялізацыі, з улікам асаблівасцей Беларусі, намеціў Пленум ЦК КП(б)Б, які адбыўся 27–29 красавіка 1926 г. плануючы стварэнне прамысловасці па вырабу сродкаў вытворчасці, пленум прызнаў неабходным і хуткае развіццё галін, якія базіраваліся на перапрацоўцы мясцовай сыравіны: керамічнай, шкляной, запалкавай, дрэваапрацоўчай, ільнопрадзільнай, папяровай, гарбарнай, харчовай і інш. Курс на развіццё гэтых галін адпавядаў структуры прамысловасці рэспублікі, што склалася гістарычна, яе эканамічным і фінансавым магчымасцям, сыравінным і працоўным рэсурсам.

Як і ў даваенны час, перапрацоўка прадукцыі сельскай гаспадаркі займала вядучае месца ў прамысловасці БССР. У 1927/28 гаспадарчым годзе на яе долю прыпадала 56,6 % агульнай прамысловай вытворчасці.

3. Развіццё прамысловасці ў гады першай і другой пяцігодкі.

У маі 1929 г. IX Усебеларускі з’езд Саветаў зацвердзіў першы пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі і культуры БССР на 1928-1932 гг. Яго асноўным прынцыпам была збалансаванасць і дакладная абгрунтаванасць мэт і задач пяцігодкі. Вынікі пяцігодкі можна падзяліць на станоўчыя (да фарсіравання індустрыялізацыі) і адмоўныя (з абвяшчэннем “вялікага скачка” – на XII з’ездзе КП(б)Б у чэрвені 1930 г.).

Капіталаўкладанні ў прамысловасць за пяцігодку склалі 243 млн. руб., гэта ў 5,3 разы болей чым за папярэднія 10 гадоў. Пераважнае развіццё атрымалі дрэваапрацоўчая, запалкавая, папяровая, харчовая, льняная і швейная галіны прамысловасці. Было пабудавана 78 буйных і 480 дробных і сярэдніх новых прамысловых прадпрыемстваў, сярод якіх швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» і панчошна-трыкатажная фабрыка «КІМ» у Віцебску, фабрыка штучнага валакна і трубаліцейны завод у Магілёве, бабруйскі, барысаўскі і гомельскі дрэваапрацоўчыя камбінаты, буйнейшая ў рэспубліцы ГРЭС і інш. У 3,8 раза павялічыўся аб’ём вытворчасці прамысловай прадукцыі, але больш хуткімі тэмпамі развіваліся галіны лёгкай, а не металаапрацоўчай прамысловасці. Узніклі новыя галіны прамысловасці: сельскагаспадарчае машынабудаванне, станкабудаванне, хімічная (вытворчасць штучнага валакна і хіміка-фармацэўтычная), вытворчасць стандартных будынкаў, вытворчасць маргарыну і інш.

Адбыліся змены ў структуры прамысловасці. На буйных прадпрыемствах вырабляласа 57,3% прадукцыі, на іх занята больш паловы прамысловых рабочых. У 1931 г. аб’ём валавай прадукцыі прамысловасці перавысіў аб’ём валавай прадукцыі сельскай гаспадаркі – Беларусь стала індустрыяльна-аграрнай рэспублікай.

Аднак, адначасова эканамічныя стымулы і гаспадарчы разлік саступаюць месца каманднай эканоміцы, выкарыстоўваюцца валюнтарысцкія

метады кіраўніцтва эканомікай. Увогуле выкананне пяцігадовага плана было правалена нават па мінімальным паказчыкам, але абвешчана аб яго выкананні за чатыры гады і тры месяцы. Пачаліся чысткі сярод мясцовых партыйных, дзяржаўных і гаспадарчых кадрах, абвінавачванні іх у нацыянал-ухілізме і шкодніцтве на падставе невыканання планаў.

Другі пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі і культуры БССР на 1933-1937 гг. быў зацверджаны ў студзені 1934 г.

Згодна з ім вядучае месца надавалася развіццю цяжкай прамысловасці, ствараліся два энергетычных вузла – Гомельскі і Мінскі. Далейшае развіццё атрымала лёгкая і харчовая прамысловасць. Шырока выкарыстоўваліся метады сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Пад час выканання плана другой пяцігодкі былі пабудаваны новыя буйныя прадпрыемствы: Гомельскі шклозавод, Крычаўскі цэментны завод, Аршанскі льнокамбінат, Магілёўскі трубаліцейны завод, Магілёўскі аўтарэмонтны, дрэваапрацоўчы камбінат, завод ізаляцыйных пліт у Нова-Беліцы, ацэтонавы завод у Быхаве і інш. Усяго пабудавана 1700 прадпрыемстваў, каля 90 – рэканструявана. Уведзены новыя электрастанцыі: Мінская ЦЭЦ-2, Слуцкая, Мазырская, Полацкая, Барысаўская, Заслаўская, Дзяржынская, Дрысенская, Нараўлянская.

Валавая прадукцыя гаспадаркі павялічалася ў 1,9 раза (запланавана ў 3,8 разы). Адбыліся змены ў структуры рабочага класа – 2/3 ад яго колькасці – гэта былыя сяляне, якіе не мелі дастатковай кваліфікацыі. Адначасова атрымалі шырокае распаўсюджанне судовыя працэсы над шкоднікамі, яны былі “знойдзены” ў Віцебскім чыгуначным дэпо, на фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі», Гомельскім вагонарамонтным заводзе і г.д. Атрымала шырокае развіццё “лагерная эканоміка”. У 30-40-я гг. 600 тыс. беларусаў працавалі ў рамках лагернай сістэмы НКУС, але на тэрыторыі БССР вялікіх лагераў не было.

4. Падрыхтоўка кадраў. Стаханаўскі рух у Беларусі.

Паспяховае ажыццяўленне індустрыялізацыі, эфектыўнае функцыяніраванне прадпрыемстваў патрабавалі кваліфікаваных інжынерна-тэхнічных і рабочых кадраў, якія добра ведалі б вытворчасць, маглі кіраваць навейшай тэхнікай, рацыянальна яе выкарыстоўваць.

Падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых кадраў ажыццяўлялася перш за ўсё праз сетку прафесійных навучальных устаноў: вучэбна-практычныя майстэрні, школы фабрычна-заводскага навучання і прафесійна-тэхнічныя. У 1930 г. У сістэме прафтэхадукацыі рэспублікі было96 навучальных устаноў. Рабочыя кадры для прамысловасці рыхтаваліся таксама шляхам брыгаднага і індывідуальнага вучнёўства.

З 1935 года стаў развівацца стаханаўскі рух. У лістападзе 1936 г. 33% усіх рабочых рэспублікі з’яўляліся стаханаўцамі, многія з іх па афіцыйных звестках выконвалі па дзве і больш норм за дзень. У 1933–1937 гг. 76% рабочых на вядучых прадпрыемствах Мазыра з’яўляліся ўдзельнікамі

сацыялістычнага спаборніцтва. Напрыканцы 30-х гадоў большасць рабочых фабрыкі “Профінтэрн” былі стаханаўцамі.

Заработная плата – асноўная частка даходу рабочых і служачых. Кожны год на працягу 1930 гадоў яна расла прыкладна на 1/6, але гэты рост ануляваўся высокай інфляцыяў, таму рэальная заработная плата працоўных часам не толькі не расла, а нават паніжалася. Значны рост заработнай платы адбываўся ў перадавікоў і наватараў вытворчасці. Заработная плата стаханаўцаў і ўдарнікаў у некалькі разоў перавышала зарплату звычайных рабочых. Уводзіліся прэміі за перавыкананне вытворчых планаў, выплаты за ўкараненне рацыяналізатарскіх прапаноў і вынаходніцтваў, а, так сама, іншыя грашовыя заахвочванні.

5. Вынікі індустріялізацыі ў БССР.

Вынікі індустрыялізацыі не былі адназначнымі:

станоўчыя:

у 1931 г. былі ліквідаваны біржы працы і знікла беспрацоўе. У БССР узніклі новыя галіны прамысловасці, такія як сельскагаспадарчае машынабудаванне, станкабудаванне, хімічная вытворчасць і інш. За гады першай пяцігодкі былі пабудаваны швейная і панчошна-трыкатажная фабрыкі ў Віцебску, фабрыка штучнага валакна і трубаліцейны завод у Магілёве, дрэваапрацоўчыя камбінаты ў Гомелі, Бабруйску і Барысаве, завод сельскагаспадарчых машын у Гомелі і інш.; у другой пяцігодцы (1933 − 1937) былі пабудаваны Гомельскі шклозавод, Крычаўскі цэментны завод, Аршанскі льнокамбінат, Магілёўскі аўтаматорны завод і інш. З аграрнай краіны БССР ператварылася ў аграрна-індустрыяльную;

адмоуныя:

індустрыялізацыя праводзілася фарсіраваннымі тэмпамі і камандна-адміністрацыйнымі метадамі. Фактычна аднаўлялася жорсткая цэнтралізаваная сістэма кіравання прамысловасцю перыяду «ваеннага камунізму». Прамысловасць Беларусі стала часткай адзінага эканамічнага арганізма Савецкага Саюза і магла функцыяніраваць толькі ў ім, паколькі гаспадарчыя сувязі паміж прадпрыемствамі былі жорстка рэгламентаваны цэнтрам.

Сацыялістычнае спаборніцтва суправаджалася павелічэннем норм выпрацоўкі і зніжэннем расцэнак выпускаемай прадукцыі, што патрабавала неверагоднага напружання сіл працоўных. Невыкананне плана разглядалася як наўмыснае «шкодніцтва», і па ўсёй краіне разгарнуліся масавыя кампаніі па выкрыцці «контррэвалюцыйных элементаў». У ходзе індустрыялізацыі пагоршылася матэрыяльнае становішча ўсіх слаёў насельніцтва і у першую чаргу сялянства ў час правядзення калектывізацыі.

Нягледзячы на гэта, XVIII з’езд партыі (сакавік 1939 г.) заявіў, што “пастаўленая другім пяцігадовым планам задача павышэння ўзроўню народнага спажывання ў два разы і болей … выканана”. Скажэнне рэчаіснасці, замоўчванне цаны і сродкаў дасягненняў садзейнічалі ўмацаванню

дырэктыўнага механізма кіравання і гаспадарання, развіццю культу асобы Сталіна.

Тэма 48. Калектывізацыя ў Беларускай ССР.

1 Курс на сацыялістычную перабудову вёскі.

Калектывізацыя — палітыка ў СССР у канцы 1920-х − 1930-я г., якая заключалася ў масавым пераводзе сялянскіх гаспадарак з індывідуальнай сістэмы гаспадарання на калектыўную і стварэнні калгасаў.

Прычыны калектывізацыі былі абумоўлены неабходнасцю пошукў сродкаў для правядзення індустрыялізацыі. Разам з тым бальшавікамі была пастаўлена задача ліквідацыі прыватнай уласнасці ў вёсцы, а для гэтага неабходна было ліквідаваць заможныя (кулацкія) сялянскія гаспадаркі. Іх уласнікі, як свабодныя таваравытворцы, не «ўпісваліся» ў рамкі адміністрацыйнага рэгламентавання эканомікі, паколькі выкарыстоўвалі ў сваёй гаспадарцы наёмную сілу, мелі прыбытак і таму разглядаліся бальшавікамі як класавыя ворагі.

Кааперыраванне сялянскіх гаспадарак адбывалася і раней у розных формах: спажывецкай, збытавай, вытворчай. Яны былі распаўсюджаны ў перыяд НЭПа, а галоўным прынцыпам была добраахвотнасць. Курс на калектывізацыю быў узяты ў 1927 г. на XV з'ездзе ВКП(б), а з 1928 г. аб'яднанне сялянскіх гаспадарак у буйныя калгасы стала генеральнай лініяй партыі.

Да канца 20-х гг. сельскагаспадарчая вытворчасць пераважала ў народнай гаспадарцы БССР. Але агульны ўзровень развіцця сельскай гаспадаркі заставаўся нізкім, у 20-я гг. частымі былі неўраджаі. Тэмпы росту таварнай прадукцыі, пачынаючы з 1927-1928 гг. зніжаліся, бо дробнатаварная аднаасобная гаспадарка знаходзілася на мяжы сваіх вытворчых магчымасцяў. Узніклі супярэчнасці паміж патрабаваннямі да вёскі і яе магчымасцямі. На гэты час перад сельскай гаспадаркай былі пастаўлены задачы – задаволіць павышаны попыт горада і прамысловасці на сельскагаспадарчую прадукцыю і сыравіну, удзельнічаць у фінансаванні індустрыялізацыі (праз рэалізацыю сялянам прамысловых тавараў).

Да 1927 г. гэтыя задачы вырашаліся пераважна рынкавымі метадамі. Пасля хлебанарыхтоўчага крызісу зімой 1927/28 гг., метады кіравання вёскай кардынальна змяніліся. Шляхі пераадолення крызісу кіраўніцтва бачыла ў бязлітасным знішчэнні ўнутраных ворагаў, сярод якіх на першым месцы стаялі кулакі. Быў адкінуты і першы пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі і культуры БССР на 1928-1933 гг., які прадугледжваў дасягнуць пад'ёму вытворчасці ў асабістым сектары.

Супраць такой калектывізацыі выступіла значная колькасць беларускіх камуністаў, сярод якіх быў наркам земляробства БССР Д.Ф. Прышчэпаў. Таму ажыццяўленне калектывізацыі на тэрыторыі Беларусі стала магчымым толькі пасля іх арышту.

2 Пераход да масавай калектывізацыі.

Артыкул І. Сталіна «Год вялікага пералому» (7 лістапада 1929 г.) абгрунтаваў неабходнасць масавай калектывізацыі. Публікацыя І.Сталіна стала пераломнай з'явай у палітыцы ў адносінах да вескі. Пачалася масавая калектывізацыя метадам адміністрацыйнага прымусу. Яна суправаджалася палітыкай "раскулачвання". Пад час яе першай хвалі ў лютым - мае 1930 г. у БССР было раскулачана больш за 15 тыс. гаспадарак. Выкарыстоўвалі гвалтоўныя метады – арышт, пазбаўленне права голасу, высылку. Дапамагчы хуткаму правядзенню калектывізацыі і раскулачванню былі прызваныя ўпаўнаважаныя, "брыгады дапамогі калектывізацыі", "дваццаціпяцітысячнікі" з ліку прамысловых рабочых. Гвалтоўныя метады калектывізацыі мелі вынікам супраціўленне сялян. Адбыўся масавы забой свойскай жывёлы, якая падлягала абагульненню. А за 1930 г. адбылося 520 антысавецкіх узброеных сялянскія выступленняў.

Дэталі стварэння калектыўных гаспадарак распрацаваны не былі. Жывёла і інвентар абагульняліся бясплатна. Унесены пай не ўлічваўся пры размеркаванні вырабленай прадукцыі. Адсутнічалі формы рацыянальнай арганізацыі вытворчасці працы, яе ўліку і аплаты.

За тры месяцы 1930 г. (студзень - сакавік) у Беларусі ў калгасы прыцягнулі каля 430 тыс. сялянскіх гаспадарак, працэнт калектывізацыі (колькасць калектывізаваных сялянскіх гаспадарак) склаў 58%. На гэтай хвалі студзеньскі (1930 г.) пленум ЦК КП(б)Б пастанавіў скончыць суцэльную калектывізацыю да 1931 г., у той час як Масквой завяршэнне калектывізацыі для Беларусі прадугледжвалася ў 1932-1933 гг.

Рост сялянскіх хваляванняў па СССР напалохаў кіраўніцтва, і 2 сакавіка 1930 г. быў надрукаваны артыкул І.Сталіна «Галавакружэнне ад поспехаў». У ім асуджалася практыка прымусовай калектывізацыі, давалася ўказанне весці работу ў адпаведнасці з мясцовымі ўмовамі, не абагульняць прысядзібныя землі, агароды, жылыя будынкі, пэўную частку малочнай жывёлы, хатнюю птушку і г.д. У сітуацыі, якая склалася ў сельскай гаспадарцы, абвінавачваліся мясцовыя савецкія і партыйныя органы. Побач быў змешчаны "Прыкладны статут сельскагаспадарчай арцелі". У выніку з'яўлення артыкула рэзка ўпаў працэнт калектывізацыі з 58% да 11%. Аднак гэта быў толькі тактычны крок – бо адразу пачалася другая хваля прымусовай калектывізацыі (1930-1934 гг.).

Асаблівая роля тут надавалася МТС (машынна-трактарным станцыям). Мэтай іх стварэння было пераканаць сялянскія масы ў перавазе сацыялістычнага спосабу вытворчасці, а палітаддзелы пры МТС праводзілі раскулачванне і наглядалі за мясцовым партыйным кіраўніцтвам.

Да канца 1930 г. на Беларусі было створана 6 МТС, у 1932 г. дзейнічала 57 МТС (1469 трактароў абслугоўвалі 33% калгасаў). У выніку новага наступлення на сялян працэнт калектывізацыі на пачатак 1932 г. склаў 50,4%, а адміністрацыйныя меры па стварэнню калгасаў былі дапоўнены эканамічнымі мерапрыемствамі.

Адначасова ўлады працягвалі ўціск і праз метады адміністрацыйнага прымусу, яны былі ўдасканалены і пашыраны. Вясной 1931 г. адбылася другая хваля раскулачвання. У выніку яе на Беларусі было разбурана прыкладна 95.500 сялянскіх гаспадарак, а 600-700 тыс. чалавек саслана ў іншыя мясціны.

За гады першай пяцігодкі было калектывізавана палова сялянскіх двароў, створана каля 9 тыс. калгасаў. Адначасова рост вытворчасці валавай прадукцыі пасля 1930 г. стаў хутка скарачацца. Пагалоўе буйной рагатай жывёлы і свіней у 1932 годзе скарацілася больш чым на трэць у параўнанні з 1928 годам, статак авечак скараціўся на палову.

3 Завяршэнне калектывізацыі беларускай вёскі, яе палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя вынікі.

Адмоўныя вынікі першых гадоў калектывізацыі не пераканала кіраўніцтва ў памылковасці выбранага шляху. Наадварот, у планах развіцця сельскай гаспадаркі на другую пяцігодку (1933-1937 гг.) прадугледжвалася паскарэнне калектывізацыі.

Дзяржава змяніла форма нарыхтоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. У 1932 г. замест кантрактных былі ўведзены абавязковыя пастаўкі мяса і малака, у 1933 г. – збожжа, бульбы і іншых прадуктаў земляробства, у 1940 г. – агародніны, сена, насенне-алейных культур, у 1941 г. – яек. Продаж дзяржаве лішкаў прадукцыі ажыццяўляўся па цэнах, ніжэйшых за рыначныя ў 10 - 12 разоў (гэта тая самая крыніца індустрыялізацыі, якая адначасова выключала магчымасць развіцця калгасаў).

Дзеля павялічэння гэтых дзяржаўных прыбыткаў, стымулявалася развіццё жывёлагадоўлі. У 1934 г. у калгасах было створана 7368 малочнатаварных, 4079 свінаводчатаварных і 3482 авечкатаварных фермаў. Ствараліся новыя МТС, у 1937 г. іх 200 з колькасцю трактараў 8,1 тыс. шт. і 674 камбайнаў. Адбываўся працэс узбуйнення калгасаў, іх агульная колькасць паменьшылася на 1,2 тыс. гаспадарак. Усяго ў калгасы да канца 1937 г. было аб’яднана 685 тыс. аднаасобных гаспадарак, або 87,5% ад іх агульнага ліку. Адначасова раслі пасяўныя плошчы калгасаў. Толькі за кошт росту плошчаў павялічыўся валавы збор галоўных культур, бо вытворчасць працы як раз рэзка зніжалася. Гэта сведчыць аб пераважна экстэнсіўным шляхе развіцця калгаснай сельскай гаспадаркі ў БССР ў 1930-я гады.

У люты 1935 г. быў праведзены Другі Ўсесаюзны з’езд калгаснікаў-ударнікаў, які прыняў Прыкладны статут сельскагаспадарчай арцелі. У ім зямля замацоўвалася за калгасамі, уводзілася здзельная аплата працы, прадугледжвалася асабістая гаспадарка ў кожным калгасным двары. Адначасова калгаснікі былі замацаваны за калгасамі. Яны не мелі пашпартоў і поўнасцю залежалі ад старшыні. Старшыня падпарадкаваўся райкаму партыі.

Па агульных паказчыках другі пяцігадовы план для сельскай гаспадаркі выкананы не быў. Але калектывізацыя на Беларусі ў асноўным была завершана, сацыялістычны спосаб вытворчасці ў сельскай гаспадарцы стаў пануючы.

Згодна з планам на трэцюю пяцігодку (1938-1942 гг.), да сельскай гаспадарцы БССР выдвігаліся патрабаванні павелічыць ураджай і валавы збор прадукцыі сельскай гаспадаркі ў 2 разы; пашырыць пасевы тэхнічных культур; павелічэнне выкарыстоўвання арганічных угнаенняў у 2 разы, мінеральных - у 3; дасягнуць росту пагалоўя буйной рагатай жывёлы; правесці меліярацыю на 300 тыс.га тарфянікаў; павялічыць колькасць МТС да 300 у 1942 г.

Пад час выканання плана ў 1939 г. была далучана Заходняя Беларусь. Там было ліквідавана 3.325 панскіх маёнткаў і кулацкіх гаспадарак. У Заходняй Беларусі пачалася калектывізацыя, але пакуль яшчэ не масавая. Да мая 1940 г. створана 430 калгасаў (32 тыс. сялянскіх гаспадарак) і 28 саўгасаў (гэта 6,7% зямельнай плошчы).

На 1940 г. у карыстанні грамадскіх гаспадарак (калгасаў) БССР было 57,1% пасяўных плошчаў. Адначасова іх удзельная вага ў вытворчасці мяса – 11,4%, малака – 13,2%, бульбы – 34%, воўны – 12,2%, збожжавых культур – 51,2%. Калектыўныя гаспадаркі былі невялікіх памераў. Да пачатку 1941 г. на Беларусі было 10.165 калгасаў і 92 саўгасаў. На адзін калгас у сярэднім прыходзілася 75 двароў, 285 га пасеваў, 75 галоў буйной рагатай жывёлы і 56 коней, на адзін саўгас – 900 га пасяўной плошчы, звыш 400 галоў буйной рагатай жывёлы, 400 свіней, 7 трактароў.

Вынікі калектывізацыі. Да 1939 г. у калгасах на тэрыторыі БССР было аб’яднана больш за 90 % сялянскіх гаспадарак. Усталявалася калгасная ўласнасць, і калгаснікі фактычна былі адхілены ад валодання сродкамі вытворчасці. Невялікі працэнт аднаасобнікаў быў абкладзены нязноснымі падаткамі. У БССР было раскулачана 34 тыс. сялянскіх гаспадарак, каля 700 тыс. вяскоўцаў былі высланы на Поўнач.

Такім чынам, за кошт каласальных ахвяраў да 1939 г. калектывізацыя ў БССР была завершана. Аднак вытворчасць у створаных калектыўных гаспадарках падала, скарачалася колькасць цяглавай і прадукцыйнай жывёлы, а праца, нягледзячы на стварэнне МТС, заставалася ў асноўным ручной.

Але сваёй галоўнай мэты калектывізацыя дасягнула — прыватная ўласнасць на вёсцы была ліквідавана; за кошт стварэння калгасаў і арганізацыі калектыўнай працы дзяржава атрымала вялікія сродкі, неабходныя для правядзення індустрыялізацыі.

Тэма 49. Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё Беларускай ССР.

1 Карэнны паварот у грамадска-палітычным і культурным жыцці ў пачатку 30-х гг. Разгортванне ідэйна-палітычнай барацьбы з беларускім «нацыянал-дэмакратызмам».

Сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае развіццё СССР прыняло пад канец 20-х гадоў і асабліва ў пачатку 30-х гадоў выразна акрэсленыя камандна-адміністрацыйныя рысы, якія ў рэшце рэшт прывялі да ўсталявання таталітарнага рэжыму.

Пераход да таталітарызму праяўляўся ў далейшым па-ніжэнні ролі і ўдзелу у справах грамадства дэмакратычных, прадстаўнічых органаў, поўным іх падпарадкаванні партыйнаму апарату. Саветы ў 30-я гады ўжо толькі стваралі бачнасць улады працоўных. Іх фарміраванне і дзейнасць адбываліся на падставе дырэктыўных указанняў, якія выключалі крытыку партыйна-дзяржаўных органаў, спаборнасць кандыдатур, плюралізм думак. Гэта датычылася дзейнасці не толькі Саветаў, але і прафсаюзаў, камсамола, якія канчаткова страцілі нават мізэрныя рэіткі самастойнасці.

Канстытуцыя Беларускай ССР 1927 г. замацоўвала палажэнне аб тым, што БССР з'яўляецца "сацыялістычнай дзяржавай дыктатуры пралетарыяту", у якой ад імя пралетарыяту дыктатуру ажыццяўляе Камуністычная партыя. Таму ўсе дзяржаўныя органы былі падпарадкаваны партыйным установам і павінны былі выконваць дырэктывы і пастановы партыйных з'ездаў, канферэнцый і іх выканаўчых органаў.

3 прыняццем Канстытуцыі СССР 1936 г. была праведзена больш жорсткая цэнтралізацыя дзяржаўнага апарату, абмяжоўваліся правы саюзных рэспублік. У лютым 1937 г. была прынята новая Канстытуцыя БССР. Яна была падрыхтавана ў адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР і паўтарала ўсе асноўныя палажэнні саюзнай Канстытуцыі. У ей пацвярджалася ўсеўладзе камуністычных партыйных кіруючых органаў.

У Канстытуцыі абвяшчалася свабода слова, свабода друку, свабода сходаў і мітынгаў, свабода вулічных шэсцяў і дэманстрацый, але толькі на паперы, бо ў той жа час разгарнуліся масавыя рэпрэсіі, калі людзей знішчалі без усялякай віны з іх боку.

Яшчэ ў 1927 г. Асобаму дзяржаўнаму палітычнаму ўпраўленню (прадвесніку Наркамата ўнутраных спраў) давалася права разглядаць у пазасудовым парадку, аж да прымяненння вышэйшай меры пакарання, справы аб дыверсіях, падпалах, псаванні машынных установак як са злым намерам, так і без яго.

У канцы 1920-х − сярэдзіне 1930-х г. з прыходам да ўлады Сталіна ў БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, адбывалася ўсталяванне таталітарнага рэжыму.

Таталітарызм — гэта тып палітычнай і грамадскай сістэм, які характарызуецца імкненнем дзяржавы да поўнага (татальнага) кантролю над усімі сферамі жыцця грамадства, забаронай дэмакратычных арганізацый і ліквідацыяй канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян. Сутнасцю таталітарызму з'яўляецца яго ідэалогія. У адрозненне ад іншых сацыяльных сістэм, напрыклад, феадалізму або капіталізму, якія ўзніклі натуральным шляхам развіцця гісторыі, таталітарны строй ствараўся мэтанакіравана на падставе вызначанай ідэалагічнай дактрыны.

Ёй з'яўлялася ідэя аб непазбежнасці пабудовы «светлай будучыні» — камунізму. Для гэтага неабходна было адмовіцца ад мінулага, а цяперашняе жыццё падпарадкаваць ажыццяўленню вышэйзгаданай ідэі.

Таталітарызму ўласцівы наступныя прыкметы, якія мелі месца ў Савецкай Беларусі разглядаемага часу:

• манаполія дзяржаўнай уласнасці на сродкі вытворчасці і вынікі працы. Такая сітуацыя стала магчымай з ліквідацыяй НЭПа і ажыццяўленнем палітыкі індустрыялізацыі і калектывізацыі, пры якіх быў поўнасцю ліквідаваны прыватны капітал у прамысловасці і сельскай гаспадарцы, а непасрэдны вытворца − рабочы і селянін — адхілены ад валодання сродкамі вытворчасці;

• жорсткая дзяржаўная сістэма размеркавання матэрыяльных даброт. У выніку правядзення індустрыялізацыі ўзмацнілася эканамічная залежнасць БССР ад цэнтра. Усе даходы пералічваліся ў саюзны бюджэт, а там адвольна вырашалі, колькі сродкаў выдзеліць на развіццё народнай гаспадаркі Беларусі. Размеркаванне ажыццяўлялася і сярод кіраўнікоў партыйных і савецкіх органаў. Простае насельніцтва (рабочыя і сяляне) пераводзілася на сістэму самазабеспячэння за кошт выдзялення ім невялікіх зямельных надзелаў і прысядзібных участкаў;

• культ асобы — рэжым асабістай улады, пры якім узвялічвалася роля аднаго чалавека (Сталіна), яму ж прыпісвалася магчымасць вызначальна ўплываць на ход гістарычных падзей. Замацаванне культу асобы ў БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, фактычна адбылося да сярэдзіны 1930-х г.;

• наяўнасць камандна-адміністрацыйнай сістэмы — іерархічна арганізаванай сістэмы кіравання грамадствам, якая заснавана на прынцыпах бюракратычнага цэнтралізму. У СССР характарызавалася непадзельнай уладай адной партыі — партыі камуністаў. У рамках камандна-адміністрацыйнай сістэмы дзейнічаў прынцып: «Забаронена ўсё, што не загадана». Узаемадзеянне апарата кіравання і мас ажыццяўлялася праз іерархічную сістэму сувязяў «загад — выкананне», прычым зваротнай сувязі не існавала. Гэтая сістэма выхоўвала паслухмяных выканаўцаў, якія павінны былі верыць у бязгрэшнасць і беспамылковасць вышэйшага кіраўніцтва партыі і дзяржавы. У такіх умовах страчвалася роля саветаў, грамадскіх арганізацый, нізавых органаў самой партыі. Затое павялічылася роля Народнага камісарыята ўнутраных спраў (НКУС), які выкарыстоўваўся для расправаў з праціўнікамі сталінскага курса. Дзяржава з грамадска-палітычна інстытута ператваралася ў нейкі механізм, у якім чалавек, пазбаўлены ўласнасці, улады і кіравання, станавіўся простым «вінцікам» велізарнай машыны пад назвай «дзяржава»;

• адсутнасць дэмакратычных правоў і свабод. У 1936 г. у СССР была прынята Канстытуцыя, якая прадэкларавала права савецкіх грамадзян на свабоду слова, недатыкальнасць асобы, тайну перапіскі, незалежны суд і інш. дэмакратычныя правы. Але на самай справе гэта не выконвалася. Побач з усімі пералічанымі ў Канстытуцыі правамі ў Савецкім Саюзе існавала бязлітасная рэпрэсіўная машина, прымяняліся арышты і расстрэлы;

• масавыя рэпрэсіі з'яўляліся важным атрыбутам функцыяніравання таталітарнай сістэмы. У краіне не існавала прэзумпцыі невінаватасці: на людзей прычэплівaўся ярлык «ворагаў народа», яны падвяргаліся рэпрэсіям. Часта канчатковае рашэнне аб лёсе чалавека прымалі знакамітыя «тройкі». Яшчэ хутчэй закруціла рухавік масавых рэпрэсій пастанова ЦВК СССР ад 1 снежня 1934 г., якая прадпісвала праводзіць следства па

справах тэрарыстычных арганізацый у 10-дзённы тэрмін, разглядаць іх у судзе без прысутнасці адвакатаў, а прысуды выконваць адразу пасля іх абвяшчэння. Па абвінавачванню ў тэрарызме і супрацоўніцтве з варожымі разведкамі (у БССР — пераважна з Польшчай) былі рэпрэсіраваны сотні тысяч людзей.

У 1932 – 1933 гг. у СССР і БССР быў устаноўлены пашпартны рэжым. Пашпарты ўводзіліся для жыхароў гарадоў, рабочых пасёлкаў, раённых цэнтраў, новабудоўляў, саўгасаў, МТС, прыгранічных зон, абаронных аб'ектаў і інш. Сельскае насельніцтва(калгаснікі) пашпартаў не атрымлівалі і ўлічваліся па спісах, якія вялі сельсаветы. Калгаснікі маглі прымацца на работу на прадпрыемствы ў гарадах толькі пры наяўнасці ў іх спраўкі ад праўлення калгаса аб яго згодзе на адыход калгасніка. Па сутнасці, правы калгаснікаў былі абмежаваны. Яны прымацоўваліся да калгаса, які вызначаў іх лёс, іх будучае.

Барацьба з нацдэмамі. Сталіну для таго, каб трывала замацаваць свае пазіцыі, трэба было знішчыць найбольш адукаваную частку грамадства, здольную разабрацца ў рэальнай сітуацыі — інтэлігенцыю. На беларускую інтэлігенцыю прычапілі ярлык «нацыянал-дэмакратызму» (нацдэмаў), абвінаваціўшы ў варожай савецкаму ладу дзейнасці з мэтай рэстаўрацыі капіталізму ў Беларусі. Ужо ў канцы 1920-х г. арыштам падвергліся тыя дзеячы, якія актыўна праводзілі палітыку беларусізацыі: быў змешчаны з пасады старшыня ўрада БССР І. Адамовіч, пераследу падвергліся прэзідэнт Акадэміі навук БССР У. Ігнатоўскі і першы старшыня СНК БССР З. Жылуновіч. З больш чым 800 удзельнікаў беларускага нацыянальнага руху 1917 − 1927 г. былі рэпрэсіраваны ўсе, хто не з'ехаў у эміграцыю.

Вышэйшай кропкай барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам стала сфабрыкаваная справа, якая атрымала назву «Саюз вызвалення Беларусі» (СВБ). У 1931 г. за «прыналежнасць» да яе было асуджана 90 чалавек, галоўным чынам работнікаў культуры, навукі, мастацтва. Роля кіраўніка СВБ адводзілася народнаму пісменніку Янку Купалу, але спробай самагубства ён сябе «рэабілітаваў» у вачах дзяржаўнай улады.

2 Палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі ў 30-я гг.

"Справа СВБ" была пачаткам сістэматычных рэпрэсій у Беларусі. Адначасова з СВБ у 1930 г. Былі "раскрыты" і іншыя "контррэвалюцыйныя, шкодніцкія і дыверсійна-шпіёнскія арганізацыі", у прыватнасці беларускі філіял "Працоўнай сялянскай партыі", па гэтай "справе" было асуджана 59 чалавек); беларускі філіял "Прампартыі" – асуджана 30 чалавек; беларускі філіял "Саюзнага бюро РСДРП (меншавікоў)" – асуджана 30 чалавек.

Гэтыя вынікі дзейнасці АДПУ адразу адчуліся – неставала работнікаў навучальных устаноў, органаў кіравання, устаноў культуры і г.д. Аднак пошук "ворагаў народа" працягваўся. У снежні 1933 г. былі арыштаваны 84 працаўнікі сістэмы Наркамзема БССР і Белтрактарацэнтра. Ім ставілася ў віну імкненне сарваць развіццё цяжкай прамысловасці, падарваць эканамічную магутнасць Савецкай дзяржавы, аслабіць яе ў барацьбе з капіталістычным

асяроддзем, а потым звергнуць савецкую ўладу, захапіць кіраўніцтва ў свае рукі.

Акрамя гэтага, “контррэвалюцыйныя арганізацыі” шкоднікаў і нацдэмаў у гэты час былі “выкрыты” ў Белдзяржснабе, Дзяржплане, у Беларускім нацыянальным цэнтры і г.д. У першым квартале1933 г. у БССР да вышэйшай меры пакарання і да 10 гадоў пазбаўлення волі было асуджана больш за 5,5 тыс. чалавек. Толькі “тройкай” НКУС БССР у1935 г. было асуджана 8074 чалавекі, а ў 1936 – 12 371 чалавек. Агентаў “варожых разведак” знаходзілі і выкрывалі сярод самых розных сацыяльных груп насельніцтва – ад высокапастаўленыхдзяржаўных, партыйных і ваенных дзеячаў да простых рабочых і сялян.

У 1934 г. быў утвораны Наркамат ўнутраных спраў (НКУС) СССР. У яго кампетэнцыю ўваходзілі дзяржаўная бяспека, грамадскі парадак, пагранічная і ўнутраная ахова. Вядучая роля здзяйсненні рэпрэсій належала такім падраздзяленням наркамата, як Галоўнае ўпраўленне дзяржаўнай бяспекі, Галоўнае ўпраўленне папраўча-працоўных лагераў і пасяленняў, а такса-ма органу пазасудовай расправы - Асобай нарадзе пры НКУС і падпарадкаваным ей "тройкам" на месцах.

У чэрвені 1937 г. Адбыўся XVI з’езд КП(б) Беларусі, якому належыць асобнае месца ў нагнятанні атмасферы страху і беззаконня. Тэма выкрыцця ворагаў народа была галоўнай у справаздачным дакладзе першага сакратара В. Шаранговіча і ў прамовах фактычна ўсіх выступаўшых.

29 ліпеня 1937 г. адбыўся III Пленум ЦК КП(б)Б, рашэнні якога адыгралі ролю своеасаблівага дэтанатара, выклікалі абвальны працэс агульнага выкрыцця, масавага псіхозу ў пошуках “ворагаў народа”. Выступаючыя на пленуме прадстаўнікі партыйных органаў прызналі наяўнасць у іх арганізацыях і раёнах “актыўна дзеючых контррэвалюцыянераў, польскіх шпіёнаў і дыверсантаў”.

Выкананне рашэнняў III Пленума ЦК КП(б)Б прывяло да таго, што з сярэдзіны1937 г. да ліпеня1938 г. было арыштавана2570 удзельнікаў т. зв. “аб’яднанага антысавецкага падполля”. Месцамі іх канцэнтрацыі, як адзначаецца ў даведцы УДБ НКУС, былі ЦВК, СНК БССР, ЦК КП(б)Б, Дзяржплан, наркаматы і іншыя ўстановы. Было арыштавана: 40 наркомаў і іх намеснікаў, 179 кіруючых работнікаў савецкага і гаспадарчага апарату, 1 акадэмік, 25 навукоўцаў, 41 выкладчык ВНУ, 23 супрацоўнікі ЦК КП(б)Б, 16 супрацоўнікаў Саўнаркома.

У 1939 г., у час знаходжання на пасадзе кіраўніка НКУС БССР Л.Цанавы, было арыштавана 27 тыс. чалавек — амаль па 900 чалавек у дзень. Толькі ў адным месцы — ва ўрочышчы Курапаты пад Мінскам — было знойдзены тысячы пахаваных ахвяр сталінскіх рэпрэсій.

Усяго ў 20-50-х гг. у Беларусі было неабгрунтавана рэпрэсіравана ў адміністрацыйным парадку звыш 349 тыс. чалавек, а агульная колькасць ахвяр палітычных рэпрэсій склада каля 600 тыс. чалавек.

З пачатку 50-х гадоў да1994 г. у Рэспубліцы Беларусь рэабілітавана больш за 160 тыс. грамадзян.

3 Фарсіраванне савецкай сістэмы адукацыі. Барацьба з непісьменнасцю.

Пачатак паходу супраць непісьменнасці пакладзены дэкрэтам Саўнаркома РСФСР ад 26 снежня 1919 г. “Аб ліквідацыі непісьменнасці сярод насельніцтва РСФСР”, які падпісаў У. Ленін. У Беларусі гэта работа ў поўную сілу пачалася з канца 1920 г., калі тэрыторыя рэспублікі была вызвалена ад польскіх акупантаў.

У гэты час 52,6 % насельніцтва ва ўзросце ад 9 да 49 гдоў з’яўлялася непісьменным. Была створана Рэспубліканская надзвычайная камісія па ліквідацыі непісьменнасці. Да вырашэння гэтай задачы прыцягваліся грамадскія арганізацыі. У 1926 г. аформілася таварыства “Прэч непісьменнасць”, якое ўзначаліў старшыня ЦВК БССР А. Чарвякоў. Калі ў 1929 г. у рэспубліцы дзейнічала 951 ячэйка гэтага таварыства з 59 тыс. чалавек, дык у 1932 г. Ужо налічвалася 10 тыс. ячэек і ў іх працавала 156 тыс. чалавек.

У ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці прымалі ўдзел калектывы фабрык і заводаў, калгасаў і саўгасаў, настаўнікі, студэнты, школьнікі, камсамольцы і інш.

Інтарэсы індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі патрабавалі значнага паляпшэння агульнаадукацыйнай і культурна-тэхнічнай падрыхтоўкі насельніцтва. Умення чытаць, пісаць, лічыць цяпер было недастаткова. У жніўні 1932 г. Саўнарком БССР прыняў пастанову “Аб увядзенні ўсеагульнага абавязковага навучання для малапісьменных”.

Пастановай урада рэспублікі ад 25 ліпеня1932 г. была зацверджана новая сістэма навучання дарослых. Яе пачатковым звяном сталі ўводныя курсы ў вытворчасць, якія знаёмілі рабочага з тэхніка-эканамічнай і грамадска-палітычнай дзейнасцю прадпрыемства. Наступная ступень – пачатковая політэхнічная вытворчая школа (тэрмін навучання – 1,5 года), якая будавалася на базе лікпункта, забяспечвала не толькі ліквідацыю малапісьменнасці, але і падрыхтоўку кадраў масавых прафесій (3–4-ы разрад) і іх перакваліфікацыю. З 1934/35 навучальнага года ўстанаўлівалася адзіная пачатковая вячэрняя школа з трохгадовым тэрмінам навучання. Яе асаблівасцю было тое, што агульнаадукацыйная падрыхтоўка навучэнцаў сумяшчалася з тэхнічнай падрыхтоўкай, або агразаалагічнай вучобай.

Яшчэ больш увагі навучанню дарослых сталі ўдзяляць пасля апублікавання 27 лютага 1936 г. пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) “Аб рабоце па навучанні непісьменных і малапісьменных”. Толькі за гады другой пяцігодкі ў Беларусі амаль 249 тыс. чалавек ліквідавалі непісьменнасць і больш за 1 млн – малапісьменнасць. Паводле звестак Усесаюзнага перапісу 1939 г. пісьменнасць насельніцтва БССР ва ўзросце 9 гадоў і старэй (без заходніх абласцей) павялічылася з 53,1 % у 1926 г. да 78,9 % у 1939 г. Масавая непісьменнасць у БССР была ліквідавана.

Але ў канцы 30-х гадоў частка дарослага насельніцтва рэспублікі, асабліва на вёсцы і сярод жанчын, яшчэ заставалася неахопленай навучаннем.

У красавіку 1939 г. Саўнарком БССР прыняў пастанову “Аб ходзе ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці ў БССР”. Ставілася задача канчатковай ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці ў рэспубліцы. Гэта работа працягвалася да самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

4 Развіццё мастацкай літаратуры, тэатра ва ўмовах савецкай улады. Выяўленчае і музычнае мастацтва.

Развіццё літаратуры і мастацтва адбывалася ў складаных умовах, час узнікнення і ідэйнай барацьбы розных плыняў і груповак, абумоўленай сацыяльнай неаднароднасцю грамадства і абвастрэннем супярэчнасцей паміж сіламі новага і старога свету.

Асаблівасцю з’яўлялася тое, што ў асяроддзе пісьменнікаў улілася вялікая група маладых талентаў з вёскі, прыхільнікаў сацыялістычнай рэвалюцыі.

У20-я гады дзейнічалі некалькі літаратурных аб’яднанняў, сярод іх “Маладняк”, “Узвышша”, “Полымя” і інш. У1921–1925 гг. на ўсю моц загучалі галасы пісьменнікаў старэйшага пакалення– Я. Купалы, Я. Коласа, Ц. Гартнага, З. Бядулі і інш. Чалавек працы, змагар, будаўнік заставаўся галоўным героем літаратурна-мастацкіх твораў. У1922 г. выйшаў зборнік вершаў Я. Купалы “Спадчына”, а ў1925 г. – паэма“Безназоўнае”. У1923–1925 гг. Я. Колас апублікаваў паэмы“Новая зямля” і“Сымон музыка”. Беларуская паэзія вітала рэвалюцыю. Для яе характэрны былі аптымізм, дух змагання за новае жыццё.

Гэта быў час агульнага духоўнага ўздыму, час надзей, веры і мар. У другой палове20-х гадоў развіццё беларускай савецкай літаратуры адбывалася ў вострай барацьбе ідэйна-эстэтычных тэндэнцый, розных літаратурных груповак.

У канцы 1927 г. аформілася літаратурнае аб’яднанне“Полымя”. У ім працавалі Я. Купала, Я. Колас, Ц. Гартны і інш. У лістападзе 1928 г. Усебеларускі з’езд“Маладняку” вырашыў утварыць Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў(БелАПП). З гэтага часу“Маладняк” спыніў сваё існаванне.

У 30-я гады завяршыўся працэс стварэння адзінай пісьменніцкай арганізацыі Беларусі. У сувязі з ростам колькасці пісьменнікаў, а таксама для ўзмацнення партыйнага ўплыву на літаратурны працэс ЦК ВКП(б) вырашыў ліквідаваць шматлікія пісьменніцкія арганізацыі і аб’яднаць усіх пісьменнікаў, якія падтрымліваюць платформу савецкай улады, у адзіны саюз савецкіх пісьменнікаў. 23 красавіка1932 г. была прынята пастанова ЦК ВКП(б) “Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый”. Аналагічную пастанову неўзабаве прыняў ЦК КП(б) Беларусі.

У чэрвені1934 г. у Мінску адбыўся І з’езд пісьменнікаў Беларусі, на якім прысутнічала больш за 100 дэлегатаў. З’езд арганізацыйна аформіў стварэнне Саюза пісьменнікаў БССР.

У вострай барацьбе розных мастацкіх школ і плыняў ствараласяя беларускае савецкае тэатральнае, музычнае і выяўленчае мастацтва. У верасні 1920 г. быў адкрыты Першы Беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ-1), у 1926 г. –

БДТ-2 і Беларускі вандроўны тэатр, які ў 1932 г. быў рэарганізаваны ў Трэці Беларускі дзяржаўны тэатр (з базай у Гомелі). У 30-я гады былі створаны Рускі драматычны і Тэатр юнага гледача, тэатры рабочай моладзі ў Мінску, Гомелі і Віцебску, калгасна-саўгасныя тэатры ў Мінску, Барысаве, Мазыры, Слуцку, Бабруйску, Рэчыцы і Дзяржынску. Усяго ў рэспубліцы працавала 14 тэатраў. На іх сцэнах ішлі такія п'есы, як "Паўлінка", "Раскіданае гняздо", "Сон на кургане" Я.Купалы, "На дне" М. Горкага, "Партызаны" К. Крапівы і інш.

У сярэдзіне 20-х гадоў першыя поспехі былі дасягнуты ў развіцці беларускага музычнага мастацтва, у якім усё яшчэ пераважала самадзейная творчасць музычных, харавых і танцавальных калектываў. У пачатку 20-х гадоў у Мінску, Віцебску, Гомелі былі створаны музычныя тэхнікумы, якія сталі цэнтрамі музычнага жыцця. У 1924 г. у Гомелі, а затым у Магілёве былі арганізаваны невялікія сімфанічныя аркестры.

Значны крок наперад зрабіла музычнае мастацтва ў30-я гады. У 1932 г. адкрылася Беларуская дзяржаўная кансерваторыя, у1933 г. – Беларускі тэатр оперы і балета, а ў1937 г. – Беларуская дзяржаўная філармонія. У яе склад увайшлі сімфанічны аркестр і аркестр народных інструментаў, ансамбль народнай песні і танца, харавая капэла. У гэты час сталі добра вядомы імёны такіх кампазітараў, як М. Аладава, А. Багатырова, В. Залатарова, І. Любана, А. Туранкова, М. Чуркіна і інш.

Паспяхова развівалася кінамастацтва. Ствараліся дакументальныя і мастацкія фільмы, кінахроніка. Сярод іх"Залатыя агні" У. Корш-Сабліна, "Балтыйцы" А. Файнцымера. Да ліку лепшых належалі таксама фільмы І. Бахара і Л. Малчанава"Палескія рабінзоны" (1935) і "Канцэрт Бетховена" (1937).

5 Абвастрэнне ідэйна-палітычнай барацьбы сярод беларускіх літаратараў. Архітэктура, мастацтва. Укараненне "пралетарскай" культуры.

У 1930-я г. вялікі ўрон быў нанесены беларускай культуры, навуцы і беларускай нацыянальнай ідэі. Пасля палітыкі беларусізацыі, у канцы 1920-х − 1930-я г., савецкі ўрад праводзіў на тэрыторыі БССР цэлы комплекс мерапрыемстваў у галіне навукі і культуры, які атрымаў назву «культурнай рэвалюцыі». З аднаго боку, гэтыя мерапрыемствы садзейнічалі павышэнню адукаванасці насельніцтва і павышэнню культурнага ўзроўню мас, а з другога — рабілася ўсё для таго, каб знішчыць адметнасць і самабытнасць беларускага народа. Нават выкладанне на беларускай мове ў 1930-я г. магло быць пастаўлена ў віну і кваліфікавана як нацдэмаўшчына. Так здарылася з рэктарам БДУ У.Пічэтам.

У 1933 г. была праведзена рэформа беларускай мовы, у выніку чаго яна значна наблізілася да рускай. 1 778 найменняў кніг на беларускай мове падлягалі знішчэнню. Былі расстраляныя больш за 100 навуковых супрацоўнікаў Акадэміі навук БССР, большасць выкладчыкаў БДУ, з 238 беларускіх пісьменнікаў больш за 200 былі рэпрэсіраваны. Чарговы раз у

гісторыі Беларусь па сутнасці апынулася без нацыянальнай эліты. Акрамя таго, рэпрэсіі зведала і простае насельніцтва: сяляне-«кулакі» і абвінавачаныя ў «шкодніцтве» рабочыя. Ад маршала да хатняй гаспадыні — ніхто не быў застрахаваны ад арышту.

Неад'емнай часткай нацыянальнай беларускай культуры з'яўляецца архітэктура – своеасаблівы "мураваны летапіс" гісторыі і культуры нашай краіны. Сярод іншых відаў мастацтваў яна вызначаецца тым, што арганічна спалучае эстэтычныя ідэалы і дасягненні тэхнічнага прагрэсу ў будаўнічай справе канкрэтнай эпохі.

Першымі ўзорамі прамысловай архітэктуры былі карпусы папяровай фабрыкі "Папірус" і хрусталёвага завода ў Барысаве, металаапрацоўчага завода "Энергія" у Мінску і іншых прадпрыемстваў.

У цэлым для прамысловай архітэктуры 20-х гадоў характэрна выкарыстанне жалезабетонных і металічных канструкцый. Фасады будынкаў не ўпрыгожвалі дэкаратыўнай муроўкай, пілястрамі, складанымі карнізамі. Уладкаванне металічных пераплётаў у светлавых праёмах і ліхтарах дало магчымасць значна павялічыць асветленасць вытворчых памяшканняў.

Архітэктурнае аблічча прамысловых будынкаў з кожным годам станавілася ўсё больш выразным і лаканічным.

З сярэдзіны 20-х гадоў у рэспубліцы прыняты меры да рэгулявання забудовы гарадоў. У 1925 г. па даручэнні ўрада БССР вядомы савецкі горадабудаўнік У. Сямёнаў прапанаваў праект развіцця Мінска і Оршы. Сярод невялікіх па плошчы ансамбляў забудовы гарадоў(1,5–2 га) прадугледжваліся зялёныя ўчасткі, скверы ці бульвары.

Для архітэктурна-мастацкага аблічча жылых дамоў таго часу характэрна лаканічнасць вырашэння аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі. У пластыцы фасадаў пераважалі спрошчаныя формы з перавагай гарызантальных чляненняў.

У канцы 20-х гадоў рабіліся спробы распрацаваць тып дома з агульнымі бытавымі элементамі. Такія будынкі атрымалі назву дамоў-камун. Адной з першачарговых задач было пашырэнне школьнай сеткі, будаўніцтва школ. Узводзіліся ў асноўным невялікія па аб'ёму, разлічаныя на 240–280 вучняў двухпавярховыя будынкі, прамавугольныя ў плане, з размяшчэннем па абодва бакі калідора вучэбных памяшканняў.

Развіццё навукі і вышэйшай адукацыі прадвызначыла будаўніцтва ў рэспубліцы шэрага ВНУ і комплексаў навуковых устаноў. У аснову кампазіцыі Універсітэцкага гарадка ў Мінску лягла распаўсюджаная ў тыя гады павільённая сістэма, пры якой асобныя карпусы прызначаліся для падрыхтоўкі спецыялістаў па адпаведных прафесіях.

У другой палове 20-х гадоў рэканструяваліся і расшыраліся гарадскія бальніцы ў Гомелі, Віцебску, Оршы. У гады першай пяцігодкі ў буйных гарадах Беларусі разгарнулася будаўніцтва бальнічных комплексаў на 600–1000 ложкаў.

Сярод іх найбольш значнай была1-я клінічная бальніца ў Мінску(1928–1931, архітэктар Г. Лаўроў). У першыя гады савецкай улады значнае пашырэнне атрымала арганізацыя культурна-асветных устаноў, рабочых клубаў, дамоў культуры, хат-чытальняў, чырвоных куткоў, бібліятэк. З

сярэдзіны 20-х гадоў пачалося будаўніцтва клубаў пры буйных прамысловых прадпрыемствах, прафесійных саюзах, а ў малых гарадах і раённых цэнтрах яны прызначаліся для абслугоўвання ўсіх жыхароў. У большасці сваёй гэта былі невялікія па ўмяшчальнасці будынкі, дзе галоўнае месца адводзілася відовішчнай групе памяшканняў.

Значнай падзеяй у жыцці рэспублікі было стварэнне ў1934 г. Саюза архітэктараў БССР. На з'ездах саюза (1935, 1937, 1941) абмяркоўваліся пытанні накіраванасці архітэктурнай творчасці, рэканструкцыі і развіцця гарадоў.

Галоўнымі задачамі архітэктуры Беларусі ў перадваенныя пяцігодкі (1933–1941) сталі рэканструкцыя і развіццё гарадоў, абумоўленыя шэрагам аб'ектыўных прычын. Па-першае, гарады ў існуючым тады стане стрымлівалі развіццё народнай гаспадаркі і культуры. Па-другое, эканамічна ўзмацнелая дзяржава атрымала з пачатку 30-х гадоў магчымасць прыступіць да пераўладкавання гарадоў, карэннага паляпшэння камунальнай гаспадаркі.

У сувязі з вырашэннем гэтых задач пачалася распрацоўка генеральных планаў беларускіх гарадоў. Генеральны план г. Мінска распрацоўваўся ў Ленінградзе архітэктарам Ю. Кілеватавым пад кіраўніцтвам прафесара У. Вітмана.

У канцы 20 – пачатку30-х гадоў у краіне былі праведзены конкурсы і распачата будаўніцтва шэрага буйных адміністрацыйных будынкаў. Сярод іх – Дом урада ў Мінску (1929–1933, архітэктар І. Лангбард). Гэта і на сённяшні дзень буйнейшае грамадскае збудаванне ў рэспубліцы, па сваіх мастацкіх і горадабудаўнічых якасцях адзін з лепшых узораў савецкай архітэктуры, адзін з першых вопытаў стварэння адміністрацыйнага збудавання.

Будаўніцтва дзіцячых садкоў і ясляў ішло па двух напрамках. Яны размяшчаліся на першых паверхах жылых дамоў або ў асобных будынках, узведзеных па тыпавых праектах. У Мінску ў 1936 г. на базе незавершанага на той час клуба будаўнікоў быў створаны рэспубліканскі Палац піянераў (архітэктары А. Воінаў, У. Вараксін).

Развіццё вышэйшай адукацыі і навукі абумовіла ўзвядзенне значнай колькасці разнастайных будынкаў навучальных і навуковых устаноў. Створаны галоўны корпус АН БССР (1934–1939, архітэктар І. Лангбард), будынак партыйных курсаў (1933–1938, архітэктар А. Воінаў).

У даваенныя гады былі пабудаваны дамы Чырвонай Арміі ў гарадах Мінску, Бабруйску, Слуцку, Полацку.

Тэма 50. Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы.

1 Тэрыторыя Заходняй Беларусі, яе адміністрацыйны падзел.

Згодна з другім артыкулам Рыжскага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. да Польшчы адышлі Гродзенская губерня, Навагрудскі, Пінскі, частка Слуцкага, Мазырскага і Мінскага ўездаў Мінскай губерні, а таксама

Ашмянскі, Лідскі, Вілейскі і Дзісненскі ўезды Віленскай губерні. Яшчэ раней у пачатку кастрычніка 1920 г. захопленыя Л. Жалігоўскім тэрыторыі Віленскага, Свянцянскага і Трокскага ўездаў Віленскай губерні, т. зв. Сярэдняя Літва таксама былі далучаны да Польшчы. Гэтыя тэрыторыі атрымалі ў гістарычнай літаратуры назву Заходняя Беларусь. У афіцыйных польскіх дакументах ужываецца назва "крэсы ўсходнія", што азначае "ўсходнія ўскраіны" Другой Рэчы Паспалітай.

Пастановай польскага ўрада яны былі раздзелены на 4 ваяводствы: Палескае, Навагрудскае, Беластоцкае і Віленскае (апошняе да снежня 1925 г. насіла афіцыйную назву Віленская адміністрацыйная акруга). У ранейшай беларускай гістарычнай літаратуры па Заходняй Беларусі тэрыторыя, якая павінна была адпавядаць гэтай назве, і адпаведна колькасны лік насельніцтва штучна перабольшваліся, што выклікае крытычныя заўвагі польскіх гісторыкаў. У яе склад уключаліся некаторыя этнічныя польскія паветы Беластоцкага ваяводства, а таксама Камень-Кашырскі Палескага ваяводства з пераважаючым складам украінскага насельніцтва, на якія распаўсюджвалася сфера дзейнасці Кампартыі Заходняй Беларусі.

Гаворка можа весціся толькі аб усіх сямі паветах Навагрудскага ваяводства, пяці ўсходніх паветах Беластоцкага ваяводства (Гродзенскім, Ваўкавыскім, Аўгустоўскім, часткова Беластоцкім і Сакольскім), васьмі з дзевяці паветаў Палескага і чатырох паветаў Віленскага ваяводства (Аш мянскім, Браслаўскім, Вілейскім і Дунілавіцкім), часткова Віленска-Трокскім, Свянцянскім і Дзісненскім. Тэрыторыя гэтых паветаў паводле падлікаў беларускага даследчыка 20-х гадоў Р. Паўстынскага, які ўлічваў дадзеныя перапісу 1919 г. па Віленскай адміністрацыйнай акрузе і перапісу 1921 г., складала 98 815 квадратных кіламетраў (25,4% тэрыторыі Польшчы) з насельніцтвам 3171 тыс. чалавек.

2 Сістэма кіравання, сацыяльны, нацыянальны і канфесійны склад насельніцтва.

Колькасць беларускага насельніцтва па перапісу 1921 года штучна заніжана, што прызнаюць і многія польскія даследчыкі. Называюцца лічбы ад 1,5 млн. чалавек (К. Сракоўскі), да 2 млн. (Е. Тамашэўскі). Згодна з падлікамі беларускага даследчыка Р. Паўстынскага беларусы складалі 2 млн. 371 тыс. чалавек (звыш 74% насельніцтва краю). Яны ў асноўнай сваёй масе (каля 88%) пражывалі ў вёсцы. Яўрэйскае насельніцтва пражывала найбольш у гарадах і мястэчках і складала – 385 109 чалавек (12,1%). Польскае насельніцтва на азначанай вышэй тэрыторыі налічвала звыш 311 тыс. чалавек. Літоўцы пражывалі ў асноўным у Віленскім ваяводстве.

Дэмаграфічная структура насельніцтва краю ў сярэдзіне 20-х гг. змянілася ў сувязі з рэпатрыяцыяй часткі бежанцаў, галоўным чынам, беларускага паходжання, якія ў гады першай сусветнай вайны былі выселены ў глыб Расіі. На 1 ліпеня 1924 г. вярнулася на Радзіму каля 500 тыс. чалавек.

Сацыяльная напружанасць у заходнебеларускім грамадстве паглыблялася рэжымам жорсткай палітычнай і нацыянальнай дыскрымінацыі. Згодна з дадатковым пратаколам да 93 параграфа Версальскага трактата, падпісанага ў чэрвені 1919 г. паміж Польшчай і краінамі Антанты, нацыянальным меншасцям гарантавалася права на маёмасць і ахову яе з боку дзяржавы, свабода веравызнання, права навучання на роднай мове, ужыванне яе ў судах і г. д. Гэтыя правы гарантаваліся таксама артыкулам VII Рыжскага дагавора, Канстытуцыяй Рэчы Паспалітай 1921 г. Аднак на практыцы ўсё было інакш. Беларусаў вельмі рэдка прымалі на працу ў адміністрацыю, дзяржаўныя ўстановы. У дзяржаўных установах не дазвалялася карыстацца беларускай мовай.

Рабочыя і служачыя беларускай і яўрэйскай нацыянальнасцяў на чыгунцы, камунальных прадпрыемствах замяняліся палякамі. У гмінных радах, павятовых сеймiках кіравалі назначаныя адміністрацыйнымі ўладамі асобы польскай нацыянальнасці.

Адной з праяў нацыянальнага ўціску была рэлігійная не -цярпімасць польскага ўрада да праваслаўнага насельніцтва Заходняй Беларусі. У 1924 г. ураду ўдалося дамагчыся аб'яўлення аўтакефаліі праваслаўнай царквы і вывядзення праваслаўя ў Польшчы з-пад юрысдыкцыі Маскоўскага патрыярхату. Праваслаўная царква апынулася ў поўнай залежнасці ад адміністрацыйных уладаў. Да 1936 г. больш 1300 праваслаўных цэркваў былі пераўтвораны ў касцёлы. Каталіцкае польскае духавенства стала моцным сродкам паланізацыі насельніцтва.

Палітыка прававой дыскрымінацыі нацыянальных меншасцяў атрымала сваё лагічнае завяршэнне ў афіцыйнай заяве міністра замежных спраў Ю. Бека на пасяджэнні Лігі Нацый у Жэневе ў верасні 1934 г., што Польшча адмаўляецца ад дадзеных раней гарантый аб ахове правоў нацыянальных меншасцяў. Гэты дэмарш санацыйнага рэжыму з'явіўся высновай па актывізацыі дзеянняў у правядзенні масіраванай палітыкі далейшага апалячвання беларускага насельніцтва. У кастрычніку 1936 г. Міністэрства ўнутраных спраў падрыхтавала праект паскарэння асіміляцыі беларусаў. Пачаўся ўзмоцнены працэс закрыцця беларускіх нацыянальных арганізацый. У канцы 1938 г. у Польшчы іх фактычна не засталося. У чэрвені 1939 г. беластоцкі ваявода Генрых Асташэўскі падаў у Міністэрства ўнутраных спраў дэталёвую запіску па канчатковай паланізацыі "ўсходніх крэсаў".

3 Сельская гаспадарка Заходняй Беларусі. Аграрная палітыка польскіх улад.

Між тым сяляне пакутавалі ад малазямелля і беззямелля, падатковага прыгнёту і чыноўніцкага самавольства. Больш паловы ўсёй зямлі краю належала 3866 памешчыкам, зямельныя ўладанні складалі 4 209 584 га. Гэтая група памешчыкаў у асноўным польскага паходжання налічвала толькі каля 1% зямельных уласнікаў. Такой канцэнтрацыі зямельнай уласнасці не было ні ў адной з тагачасных краін Еўропы. Асобныя зямельныя магнаты, як

Радзівіл, Патоцкі, Сапега, Тышкевіч, Мейштовіч, Рачкевіч і іншыя, валодалі дзесяткамі тысяч гектараў зямлі. Уладанні князя К. Радзівіла ў Столінскім павеце складалі 155 200 га. Гаспадарак дробных памешчыкаў, заможных сялян плошчай у 50-100 гектараў налічвалася 2912 (зямельная плошча такіх гаспадарак складала 197 000 гектараў).

Найбольшую групу 450 591 прыватных сялянскіх гаспадарак у сярэдзіне 20-х гадоў складалі ўладанні памерам менш 50 га. Ім належала 3066886 га зямлі, г. зн. 41% прыватнага землеўладання. Прычым гаспадарак, якія мелі ад 20 да 50 га зямлі,налічвалася толькі 4,2 % (18 827).

Гаспадарак, якія мелі надзелы ад 8 да 18 га і ўтрымлівалі 2-3 каровы, аднаго-двух коней, налічвалася каля 13% . У перыяд сезонных работ частка іх карысталася наёмнай працай.

Большую групу складалі гаспадаркі зямельнай плошчай ад 2 да 5 га - 34,2% (153944) і ад 5 да 10 га - 32,8 (147961) . Гаспадаркі з зямельнымі надзеламі ніжэй 7-8 га не заўсёды мелі магчымасць пракарміць сям'ю. Гаспадаркі ніжэй2 га зямлі складалі 14,3% (64 417 сялянскіх гаспадарак). Гэта была паўпралетарская група катэгорыі сялян.

Лішак свабодных рабочых рук у сялянскіх гаспадарках з'яўляўся крыніцай папаўнення таннай "арміі" сельскагаспадарчых рабочых, якіх у розныя гады налічвалася ад 80 да 100 тыс. чалавек. Існавалі рэшткі феадальных адносін: арэнда зямлі за адпрацоўкі або за частку ўраджаю, адпрацоўкі за права карыстання пашай, нарыхтоўкі дроў, натуральная плата за працу, наяўнасць сервітутаў, сістэма павіннасцяў па пракладцы новых дарог, будаўніцтву і рамонту мастоў.

Усё гэта перашкаджала развіццю прадукцыйных сіл заходнебеларускай вёскі. Каб знізіць сацыяльную напружанасць, польскі ўрад пайшоў на аграрныя пераўтварэнні. Яны знайшлі сваё здзяйсненне ў парцэляцыі (продажы праз зямельны банк часткі памешчыцкай і дзяржаўнай зямлі), камасацыі (звядзенне ў адзін участак дробных сялянскіх палосак з адначасовым высяленнем на хутар) і ліквідацыі сервітутаў (сумеснае карыстанне сялян і памешчыкаў выганамі, сенажацямі, пашамі).

Закон аб аграрнай рэформе быў прыняты польскім сеймам яшчэ ў 1919 г. Ён прадугледжваў стварэнне дзяржаўнага зямельнага фонду са свабодных зямель, што засталіся без гаспадароў, а таксама дзяржаўных і часткі памешчыцкіх, якія складалі лішак над устаноўленым максімальным памерам маёнтка. Гэтыя невялікія ўчасткі (парцэлы) прызначаліся для свабоднага продажу. У ліпені 1925 г. быў прыняты "Закон аб ажыццяўленні зямельнай рэформы".

Змест гэтай рэформы заключаўся ў продажы дробнымі ўчасткамі некаторай часткі памешчыцкіх зямель і камасацыі (хутарызацыі) сялянскіх гаспадарак з ліквідацыяй сервітутаў. На аснове закона "Аб надзяленні зямлёй салдат польскай арміі" (снежань 1920 г.) польскі ўрад праводзіў палітыку засялення заходнебеларускіх зямель ваеннымі каланістамі, былымі а фіцэрамі і унтэр-афіцэрамі польскай арміі, так званымі "асаднікамі". Яны атрымлівалі дарма ці па невысокай цане зямельныя ўчасткі памерам ад 15 да 45

га. Ужо да канца 1924 г. у Заходняй Беларусі налічвалася звыш 5 тыс. асаднікаў. Асаднікі былі узброеныя, сяліліся хутарамі, найчасцен выконвалі абавязкі солтысаў, войтаў, засядацеляў, з'яўляліся палітычнай апорай польскай улады на "ўсходніх крэсах".

Большасць з іх здавалі зямлю ў арэнду сялянам, што яшчэ больш абвастрала сацыяльную напружанасць. Распрадажа ішла па двух напрамках. Па лініі дзяржаўнай парцэляцыі праз сельскагаспадарчы банк і спекуляцыйнай парцэляцыі, якой займаліся памешчыкі і гандляры. Пры гэтым урад прадастаўляў, галоўным чынам, зямельныя ўчасткі асобам польскай нацыянальнасці. Так, у Навагрудскім і Віленскім ваяводствах сярод тых, хто атрымаў зямлю ў 1919-1932 гг., беларусаў было толькі 42,1% .

Купіць зямлю незаможным сялянскім гаспадаркам было вельмі складана з-за яе вялікага кошту. Сярэдняя цана 1 гектара зямлі па прыватнай парцэляцыі дасягала610-830 злотых. Дзяржаўны банк за крэдыты на куплю зямлі браў не менш 12% гадавых. Акрамя таго памешчыкі выкарыстоўвалі права выбару пакупніка і патрабаваліза зямлю больш высокую цану, і нярэдка ў доларах.

Згодна з афіцыйнымі дадзенымі заходнебеларуская вёска да 1935 г. у параўнанні з 1921 г. у сярэднім павялічыла свае землеўладанні: бядняцкія гаспадаркі – 2,1 га, серадняцкія – 2,7 га, заможныя – 3,9 га. Буйное памешчыцкае землеўладанне ў выніку праведзенай дзяржаўнай і ўласнай парцэляцыі скарацілася прыкладна на 17% .

Камасацыя праводзілася на аснове закона аб ліквідацыі цераспалосіцы, прынятага сеймам у 1923 г. Аб'ектыўна камасацыя была прагрэсіўнай з'явай і з'яўлялася працягам вядомай сталыпінскай аграрнай рэформы. Аднак усе расходы, звязаныя з правядзеннем камасацыі, дзяржава ўсклала на сялянства. Сяляне павінны былі плаціць за камасацыю кожнага гектара ад 14 да 20 злотых, за складанне праектаў меліярацыі, утрыманне землеўпарадчыкаў, перанясенне дарог і г. д. Пагэтаму камасацыя першапачаткова праходзіла марудна. Да 1927 г. ёю было ахоплена больш за 60 тыс. гаспадарак, якія атрымалі каля 600 тыс. га хутарской зямлі. Аднак у мэтах пашырэння сацыяльнай базы сярод заходнебеларускага сялянства ўрад паскорыў правядзенне хутарызацыі як праз эканамічныя рычагі (выдача грашовых ссуд праз крэдытныя таварыствы пад паручыцельства багатага селяніна), так і ў прымусовым парадку. У выніку да 1935 г. было хутарызавана каля 50% сялянскіх гаспадарак.

Аграрная рэформа садзейнічала ліквідацыі паўпрыгонніцкіх адносін, канцэнтрацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Умацаваліся пазіцыі заможнага сялянства, паскорыўся працэс расслаення вёскі. Частка бяднейшых сялян у пошуках лепшай долі выехала ў Заходнюю Еўропу, ЗША, Канаду, краіны Лацінскай Амерыкі. Толькі ў першыя гады эканамічнага крызісу 1929-1931 гг. з Заходняй Беларусі ў пошуках працы выехала 53 тыс. чалавек. Па розных падліках з 1921 па 1939 гг. былі вымушаны пакінуць Заходнюю Беларусь каля 130 тыс. чалавек. Гэта была другая вялікая хваля беларускай эміграцыі.

4 Адметныя рысы эканомікі Заходняй Беларусі.

Сярод польскіх і беларускіх гісторыкаў ідуць вострыя дыскусіі аб эканамічным становішчы заходнебеларускіх зямель у міжваенны перыяд. Некаторыя з іх імкнуцца даказаць, што не ўсё было дрэнна на "ўсходніх крэсах", а эканоміка краю ў той час развівалася па законах рынку ў залежнасці ад эканамічнай кан'юнктуры. Таму такія з'явы, як згортванне традыцыйных галін прамысловасці ў Заходняй Беларусі, продаж яе прыродных багаццяў замежным манаполіям, тлумачаць эканамічнай інтэграцыяй, сусветным эканаміч ным крызісам, нежаданнем інвестараў укладваць свае капіталы ў развіццё заходнебеларускіх зямель. З такімі аргументамі можна пагадзіцца толькі часткова. Галоўную ролю ў цяжкім эканамічным становішчы Заходняй Беларусі адыгралі не гэтыя з'явы, а канкрэтныя мерапрыемствы польскіх уладаў, якія разглядалі анексіраваныя землі як сыравінны прыдатак.

Пасля далучэння Заходняй Беларусі да Польшчы адбыўся фактычны эканамічны падзел дзяржавы на: а) цэнтральныя і заходнія ваяводствы, б) усходнія "крэсы" (ускраіны). У першай частцы Польшчы заахвочвалася развіццё прамысловасці, транспарту і гандлю. У другой – эканоміка аднаўлялася марудна, новыя прадпрыемствы амаль не будаваліся. На эканоміцы краю адмоўна адбіліся ўведзеныя льготныя чыгуначныя тарыфы па вывазу з Заходняй Бе ларусі сыравіны і ўвозу туды прамысловых тавараў з цэнтральных і заходніх ваяводстваў Польшчы. Пераважная большасць прамысловых прадпрыемстваў Заходняй Беларусі насіла дробны характар. Так, у 1928 г., найлепшай эканамічнай кан'юнктуры, дзейнічала каля 2 тыс. прадпрыемстваў. Большасць з гэтых прадпрыемстваў былі дробнымі, на 80 працэнтаў з іх працавала ад 5 да 20 чалавек. Згодна з афіцыйнай статыстыкай удзельная вага буйных прадпрыемстваў была вельмі нязначнай. Было зарэгістравана ў 1928 г. адно буйное прадпрыемства ў Навагрудскім ваяводстве з колькасцю звыш 1000 рабочых; 8 прадпрыемстваў ад 500 да 1000 чалавек (Беластоцкім ваяводстве – 4, Віленскім – 2).

У дрэваапрацоўчай, тэкстыльнай, будматэрыялаў і галінах лёгкай прамысловасці налічвалася толькі 89 прадпрыемстваў з колькасцю 100 і больш рабочых. На долю харчовай, мясаперапрацоўчай прамысловасці прыходзілася 2/3 прадпрыемстваў і рабочых.

Разам з тым польскі ўрад з улікам стратэгічных інтарэсаў сваёй дзяржавы ўносіў змены ў эканамічную палітыку ў Заходняй Бе ларусі. У лістападзе 1936 г. быў прыняты дэкрэт аб накіраванні інвестыцыйнага руху ва ўсходнія ваяводствы. Прадугледжвалася змяншэнне тэрмінам на 5 гадоў падаткаў з прыбыткаў ва "ўсходніх крэсах" Намячалася будаўніцтва дарог. Адзінай галіной прамысловасці краю, якая набыла значнае развіццё, была дрэваапрацоўчая, што прывяло да нястрымнай эксплуатацыі лясных багаццяў замежнымі манаполіямі.

З 1921 па 1936 гг. плошча лясоў краю зменшылася на 400 тыс. га. Выключнае месца займалі прадпрыемствы па вырабу фанеры, паколькі 3/4 усёй іх прадукцыі ішло на экспарт. Фабрыкі размяшчаліся ў асноўным у

Белавежскай пушчы і на Палессі. Яны бесперапынна працавалі нават у гады эканамічнага крызісу. На лесараспрацоўках у Белавежскай пушчы ў асобныя гады працавала да 17 тыс. чалавек. Найбольш буйнымі прадпрыемствамі з'яўляліся запалкавая фабрыка "Прагрэс-Вулкан" у Пінску, тытунёвая і фанерная ў Гродне, фанерная фабрыка ў Мастах, шклозавод "Нёман" у Лідскім павеце і фабрыка гумавых вырабаў "Ардаль" у Лідзе.

Самым буйным прамысловым цэнтрам краю быў Беласток і яго прыгарады, дзе канцэнтраваліся прадпрыемствы тэкстыльнай прамысловасці. На іх працавала ў сярэднім да 5 тыс. чалавек. У прамысловасці, на транспарце колькасць рабочых у паўночна-ўсходніх ваяводствах згодна з перапісам 1931 г. складала 128 тыс. Гэта было значна менш у параўнанні з агульнапольскімі паказчыкамі. Большасць з іх было занята ў дрэваапрацоўчай і харчовай прамысловасці. Прычым, эканамічнае становішча рабочых гэтага рэгіёна было горшым, чым у цэнтральных і заходніх ваяводствах краіны. Яго характэрнымі рысамі з'яўляліся дамінаванне ручной працы, амаль поўная адсутнасць тэхнікі бяспекі, фактычна неабмежаваны рабочы дзень, антысанітарныя ўмовы працы, нізкі ўзровень заработнай платы. У 1925 г. зарплата рабочых-паліграфістаў у Вільні складала 9,38 злотых, а ў Варшаве - 16,72 злотых у тыдзень. На жнівень 1935 г. сярэдні заробак па Беластоцкаму ваяводству складаў 0,55 злотых, Віленскаму – 0,58 злотых, Навагрудскаму – 0,28 злотых, Палескаму – 0,42 злотых, у той час як у Варшаўскім - 0,66 злотых, а для ўсёй Польшчы – 0,63 злотых у гадзіну. Шырока распаўсюджаная сістэма штрафаў яшчэ больш змяншала заробкі рабочых.

Пастаянным спадарожнікам прамысловага развіцця было хранічнае беспрацоўе. У выніку крызісу 1929-1933 гг. Спынілі працу 230 прадпрыемстваў, а колькасць рабочых у 1933 г. зменшылася больш чым на 40% . Пераход ад эканамічнага крызісу да ажыўлення прамысловасці праходзіў марудна. Толькі ў 1938 г. колькасць прамысловых рабочых наблізілася да ўзроўню 1928 г. і склала 83,5% упараўнанні з 1913 г. Трэба адзначыць, што прыкметна развівалася ў краі мясная і малочная прамысловасць. У Баранавічах, Беластоку і Ваўкавыску працавалі мясакансервавыя заводы, якія належалі англійскай фірме "Крэсэкспарт".

Тэма 51 Рэвалюцыйна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі. Культура Заходняй Беларусі.

1 Палітыка польскіх улад у Заходняй Беларусі. Нацыянальны прыгнёт.

Сацыяльная напружанасць у заходнебеларускім грамадстве паглыблялася рэжымам жорсткай палітычнай і нацыянальнай дыскрымінацыі. Згодна з дадатковым пратаколам да 93 параграфа Версальскага трактата, падпісанага ў чэрвені 1919 г. паміж Польшчай і краінамі Антанты, нацыянальным меншасцям гарантавалася права на

маёмасць і ахову яе з боку дзяржавы, свабода веравызнання, права навучання на роднай мове, ужыванне яе ў судах і г. д. Гэтыя правы гарантаваліся таксама артыкулам VII Рыжскага дагавора, Канстытуцыяй Рэчы Паспалітай 1921 г. Аднак на практыцы ўсё было інакш. Беларусаў вельмі рэдка прымалі на працу ў адміністрацыю, дзяржаўныя ўстановы. У дзяржаўных установах не дазвалялася карыстацца беларускай мовай.

Рабочыя і служачыя беларускай і яўрэйскай нацыянальнасцяў на чыгунцы, камунальных прадпрыемствах замяняліся палякамі. У гмінных радах, павятовых сеймiках кіравалі назначаныя адміністрацыйнымі ўладамі асобы польскай нацыянальнасці.

Рэакцыйная палітыка асабліва востра праявілася ў справе школьнай адукацыі. Да ўключэння ў склад Польшчы на беларускіх землях функцыяніравала 359 беларускіх школ, 2 настаўніцкія семінарыі ў Барунах і Свіслачы, 5 агульнаадукацыйных гімназій у Вільні, Радашковічах, Навагрудку, Клецку і Нясвіжы. Урад і снаванне беларускіх навучальных устаноў палічыў несумяшчальным з інтарэсамі дзяржавы. Таму да 1924 г. засталося толькі 37 беларускіх школ і 4 гімназіі з абмежаванымі правамі. Пад націскам нацыянальна-вызваленчага руху польскі сейм вымушаны быў прыняць 31 ліпеня 1924 г. распрацаваны ўрадам У. Грабскага "Закон аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцяў". Беларуская дзяржаўная школа магла быць адкрыта ў паветах, дзе беларусы складалі 25% насельніцтва, і калі гэтага жадалі не менш 40 бацькоў дзяцей школьнага ўзросту. Аднак закон замацаваў няр оўнасць беларускай і польскай школ. Пры наяўнасці 20 подпісаў за навучанне па- польску адкрывалася двухмоўная (польска-беларуская) школа. Але нават і гэтае заканадаўства з перашкодамі ўводзілася ў дзеянне.

2 Асноўныя палітычныя партыі і арганізацыі ў Заходняй Беларусі.

У пачатку і сярэдзіне20-х гадоў сацыяльная і нацыянальная барацьба характарызавалася не толькі эканамічнымі забастоўкамі і антыўрадавымі дэманстрацыямі, але і праявамі ўзброеных выступленняў у форме партызанскага руху. У барацьбе прымалі ўдзел працоўныя гарадоў і вёсак, сельская інтэлігенцыя. Гэта былі людзі розных палітычных поглядаў – ад камуністаў да нацыянал-дэмакратаў. Там, дзе кіравалі партызанскімі атрадамі камуністы, рух насіў ярка акрэслены антыпамешчыцкі, класавы характар.

А там, дзе задавалі тон людзі з нацыяналістычнымі настроямі, партызанская барацьба насіла антыпольскі напрамак. Такое назіралася на Гродзеншчыне і Беласточчыне. На Віленшчыне, Палессі, Навагрудчыне дзякуючы кіраўніцтву такіх камуністаў, як К.П. Арлоўскі, С.А. Ваўпшасаў, В.З. Корж і іншыя, партызанская барацьба набыла шырокі размах. Агульная колькасць партызан налічвала 5–6 тыс. У1924–1925 гг. было праведзена каля300 баявых аперацый.

Польскія ўлады вымушаны былі ўвесці надзвычайнае становішча ў краі, кааб рэпрэсіямі і тэрорам ліквідаваць гэты рух. Ва ўзмацненні сацыяльнага і нацыянальна-вызваленчага руху значную ролю адыгралі партыі і

арганізацыі камуністычнага і нацыянальна-дэмакратычнага напрамку. Сярод іх галоўнае месца займала Камуністычная партыя Заходняй Беларусі(КПЗБ). Яна была створана ў кастрычніку1923 г. Нягледзячы на нелегальны характар работы, рады партыі пашыраліся. У 1923 г. яна налічвала523 камуністы, у1928 г. – 3 тыс., у 1934 г. – 4 тыс. Акрамя таго, каля3 тыс. членаў партыі знаходзілася пастаянна ў турмах. Друкаванымі органамі ЦК КПЗБ былі газета“Чырвоны сцяг” і часопіс“Бальшавік”. У розныя гады ЦК КПЗБ выдаваў на беларускай, польскай, рускай і яўрэйскай мовах газеты“Партработнік”, “Да барацьбы”, “Весткі з СССР”, “Куйце зброю”, “Голас салдата”, “Чырвоны сцяг” і інш.

КПЗБ была часткай Кампартыі Польшчы на правах тэрытарыяльнай нацыянальнай арганізацыі, таму яна не мела сваёй праграмы і статута, а кіравалася дакументамі КПП. Такая ж сітуацыя была і ў Камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі(КСМЗБ), які з’яўляўся аўтаномнай арганізацыяй камсамола Польшчы. Створаны КСМЗБ у студзені1924 г. ўвесь час заставаўся верным і надзейным памочнікам КПЗБ, яе рэзервам. Да4 тыс. чалавек аб’ядноўваў камсамол Заходняй Беларусі, пераважна сялянскую моладзь.

КПЗБ і КСМЗБ аказвалі моцны ўплыў на розныя масавыя арганізацыі дэмакратычнага і нацыянальна-вызваленчага напрамку.

Набірала моц Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), створаная яшчэ ў маі 1917 г. Яна прайшла складаны эвалюцыйны шлях развіцця ад нешматлікай клерыкальнай арганізацыі ў 20-я гады да масавай свецкай партыі ў сярэдзіне 30-х гадоў. Ідэолагі і арганізатары партыі каталіцкія ксяндзы, беларусы па паходжанню, Ф. Абрантовіч, Ад. Станкевіч, В. Гадлеўскі, Л. Хвецька, адмаўляючы капіталізм як лад жыцця, разам з тым негатыўна ставіліся да савецкай улады і тэорыі класавай барацьбы. У пачатку 30-х гадоў выступілі з абгрунтаваннем трэцяга, прамежкавага, эвалюцыйнага шляху развіцця грамадства.

У аснову практычнай дзейнасці БХД была пакладзена тэорыя самабытнасці развіцця беларускай нацыі, прынцып самавызначэння народаў, адмаўленне класавай барацьбы. Беларускі народ разглядаўся як бясклассавы, цалкам працоўны, "сярмяжны" люд. Патрабаванні перадачы зямлі беззямельным і малазямельным сялянам без выкупу ва ўласнасць, 8-гадзіннага рабочага дня, дэмакратычных свабод, адстойванне права беларускага народа на самастойнасць у яго этнаграфічных межах мелі водгук сярод насельніцтва краю, у першую чаргу каталіцкага веравызнання. БХД выступала супраць аддзялення царквы ад дзяржавы, супраць выкарыстання рэлігіі ў палітычных мэтах, за абавязковасць вывучэння рэлігіі ў школах. У 1926 г. дзеячы БХД разам з кіраўнікамі Беларускага сялянскага саюза (БСС) стварылі арганізацыю культурна-гаспадарчага характару "Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры". Шляхам арганізацыі сельскагаспа-дарчай асветы, заснаваннем сельскагаспадарчых кааператываў, стварэннем машынных станцый на вёсках кіраўнікам БХД удалося значна паўплываць на бядняцка-серадняцкія сялянскія масы, частку беларускай інтэлігенцыі каталіцкага веравызнання. Да 1930 г. функцыяніравала 51

аддзяленне Інстытута ў розных мясцовасцях Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў.

3 Арганізацыя Беларускай сялянска-работніцкай Грамады (БСРГ), яе праграма і дзейнасць.

Асабліва значным поспехам было кіраўніцтва масавай легальнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыяй Беларуская сялянска-рабочая грамада(БСРГ), створанай у 1925 г. Яе праграма мела наступныя патрабаванні: самавызначэнне Заходняй Беларусі, аб'яднанне яе з БССР, стварэнне сялянска-рабочага ўрада, канфіскацыя памешчыцкіх і царкоўных зямель, пераход іх ва ўласнасць дзяржавы, падзел зямель без выкупу паміж малазямельнымі сялянамі і парабкамі, ліквідацыя асадніцтва, 8-гадзінны працоўны дзень, нацыянальная роўнасць і навучанне на роднай мове, свабода сумлення, аддзяленне царквы ад дзяржавы і іншыя патрабаванні. Галоўным сродкам вызвалення працоўных была абвешчана адкрытая барацьба з эксплуататарамі на аснове саюзу рабочых і сялян. БСРГ праводзіла мітынгі, дэманстрацыі, выступленні сялян супраць абшарнікаў, кулакоў і асаднікаў, падатковага ўціску і аграрнай палітыкі польскіх улад, за вызваленне палітычных вязняў, за стварэнне беларускіх школ і інш.

ЦК Грамады выдаваў газеты, якія па прычыне праследавання ўладамі часта закрываліся, таму выходзілі пад новымі назвамі: "Жыццё беларуса", "Беларуская ніва", "Беларуская справа", "Народная справа", "Наша справа", "Наш голас", "Наша воля", "Народны звон". Выходзіў таксама сатырычны часопіс "Маланка".

У студзені 1927 г. Грамада аб'ядноўвала больш за 2 тыс. суполак, у якіх налічвалася каля 120 тыс. чалавек, дзейнічала 18 павятовых камітэтаў БСРГ. Бурны рост Грамады, яе поспехі ў кіраўніцтве барацьбой працоўных супраць эканамічнага, нацыянальнага і палітычнага прыгнёту непакоілі памешчыкаў, асаднікаў і акупацыйныя ўлады. Паліцыя і дэфензіва нават дазволеныя вышэйшымі ўладамі з'езды, мітынгі і нарады разганяла, а іх удзельнікаў збівала і арыштоўвала.

У студзені 1927 г. улады пачалі ліквідацыю гурткоў і камітэтаў БСРГ. Па ўсім краі прайшлі масавыя арышты яе актывістаў. Грамада была забаронена афіцыйна, больш за400 яе кіраўнікоў і актывістаў прыцягнуты да судовай адказнасці. У1927–1929 гг. адбываліся судовыя працэсы над членамі БСРГ.

Пасля разгрому Грамады яе традыцыі былі прадоўжаны сфарміраванай пры ўдзеле КПЗБ новай арганізацыяй – "Змаганне за інтарэсы сялян і рабочых". Палітычная платформа"Змагання" вылучала ў першую чаргу дэмакратычныя патрабаванні: спыненне нацыянальнага прыгнёту, паланізацыі, палітыкі мілітарызацыі, фашызацыі грамадскага жыцця, палітычнага тэрору, падпісанне Польшчай Дагавора з СССР аб ненападзенні, увядзенне 8-гадзіннага працоўнага дня і інш. Праграмныя мэты ўключалі і рэвалюцыйныя патрабаванні: нацыяналізацыю фабрык і заводаў, аб'яднанне беларускіх зямель у рэспубліку рабочых і сялян, г. зн. уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

Польскія ўлады чынілі розныя перашкоды для стварэння сеткі гурткоў на месцах, а таксама ажыццяўлялі жорсткі ўціск на перыядычныя выданні “Змаганння”. 30 студзеня1930 г. паліцыя правяла масавыя арышты актывістаў “Змаганння”, ліквідавала цэнтральны і павятовыя сакратарыяты. Гродзенскі акруговы суд восенню1930 г. асудзіў лідэраў гэтай арганізацыі да8 гадоў турмы.

4 Уздым рабочага і сялянскага руху ў пачатку 1930-х гг.

Забастовачны рух рабочага класа, нягледзячы на кароткачасовы спад у 1929- 1930 гг., нарастаў. Мяняўся характар эканамічных забастовак. Калі ў 1929-1930 гг. яны былі накіраваны на абарону раней дасягнутых заваёў, то ў 1931-1933 гг. забастоўкімелі папяраджальны характар. Бастуючыя выкарыстоўвалі спецыфічны метад – заняцце прадпрыемстваў. У 1932 г. узмацнілася барацьба супраць прыняцця антырабочага заканадаўства.

З кастрычніка 1932 г. па люты 1933 г. праходзіла забастоўка рабочых лясной прамысловасці Белавежскай пушчы, у якой удзельнічала больш 7 тыс. чалавек (4 тыс. рабочых і 3 тыс. сялян-сезоннікаў). Яна была спынена пасля павышэння заработнай платы на 30% . Праз год (з лістапада 1933 г. па люты 1934 г.) рабочыя лясной галіны зноў аб'явілі масавую забастоўку. Усяго ў 1932 г. у Заходняй Беларусі адбылася 51 забастоўка, з удзелам 32,4 тыс. рабочых, у 1933 г. –81 забастоўка і адпаведна 36,7 тыс. рабочых.

Эканамічныя стачкі ўсё часцей перарасталі ў палітычныя. Яны праходзілі пад знакам пралетарскага адзінства, супраць урадавай знешняй і ўнутранай палітыкі. У 1933 г. адбылося звыш 14 палітычных забастовак, якія суправаджаліся шматлюднымі мітынгамі і дэманстрацыямі, нярэдка завяршаліся сутычкамі з паліцыяй.

Выступленні сялян супраць памешчыкаў, камасацыі і ліквідацыі сервітутаў, падатковага цяжару ў 1931-1932 гг. адбыліся больш чым у 160 сёлах Беластоцкага, Брэсцкага, Гродзенскага, Віленскага, Пінскага і Навагрудскага паветаў. Каб задушыць сялянскія выступленні, улады пасылалі карныя экспедыцыі, праводзілі "пацыфікацыі", якія ператвараліся ў бязлітасныя расправы над сялянамі. У верасні 1931 г. былі ўведзены надзвычайныя, фактычна ваенна- палявыя суды, бо іх прыгаворы абскарджанню не падлягалі. У адказ на дзеянні паліцыі сяляне стваралі атрады самаабароны, а ў некаторых выпадках станавіліся на шлях партызанскай барацьбы.

У сакавіку 1932 г. адбылося ўзброенае выступленне сялян вёскі Асташына. Паліцыя жорстка расправілася з сялянамі. На дапамогу асташынцам прыбылі жыхары з 8 навакольных вёсак. Па прыгавору надзвычайнага суда сяляне І. Бахар, А. Гаўраш, А. Малец, В. Стасевіч былі павешаны, пяць чалавек прыгавораны да пажыццёвага зняволення, 44 чалавекі атрымалі па 5-6 гадоў турмы. У ліпені 1933 г. адбылося ўзброенае выступленне сялян Кобрынскага павета. Кобрынскі і суседнія з ім паветы былі аб'яўлены на асадным становішчы, а 8 арганізатараў узброенага выступлення, у

тым ліку і сакратар Брэсцкага акруговага камітэта КПЗБ Рэгіна Каплан, былі аддадзены ваенна- палявому суду. У выніку разгорнутай кампаніі салідарнас ці, праведзенай не толькі ў краі, але таксама ў Варшаве і Лодзі, смяротная кара была заменена пажыццёвым турэмным зняволеннем. У чэрвені 1934 г. быў створаны лагер "ізаляцыі" ў Бярозе Картузскай. Праз лагер да 1939 г. "прайшло" звыш 10 тыс. чалавек, у асноўным удзельнікі рэвалюцыйна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

5 Умовы развіцця культуры. Таварыства беларускай школы і інш.

Важную ролю ў грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі адыграла культурна-асветная арганізацыя– Таварыства беларускай школы(ТБШ), створаная ў 1921 г. з адзінай мэтай: “распаўсюджваць і дапамагаць асвеце сярод беларусаў, пашыраць беларускія школы і беларускую асвету наогул”. Так сказана ў статуце ТБШ.

За перыяд свайго існавання (да1937 г.) ТБШ заваявала вялікую любоў насельніцтва Заходняй Беларусі. Аб гэтым сведчыць тое, што да пачатку 30-х гадоў яна стала масавай прагрэсіўнай культурна-асветнай арганізацыяй і налічвала каля500 гурткоў і 30 тыс. актывістаў. ТБШ змагалася за пісьменнасць насельніцтва, за беларускія школы, стварала бібліятэкі, хаты-чытальні, арганізоўвала мастацкую самадзейнасць, выдавала падручнікі, песеннікі. Мясцовыя аддзелы ТБШ стваралі драматычныя гурткі, якія актыўна працавалі сярод насельніцтва.

Заслуга ТБШ была не толькі ў асветніцкай ролі, але і ў тым, што яна падрыхтавала і выхавала ў вельмі цяжкіх умовах нацыянальнага прыгнёту значную колькасць беларускай творчай інтэлігенцыі. Гэтаграмадскі дзеяч Браніслаў Тарашкевіч, музыкант і кіраўнік народнага хору Рыгор Шырма, паэты Яўген Скурко (Максім Танк) і Валянцін Таўлай, пісьменнік Піліп Пестрак і многія іншыя.

6 Літаратура, друк, мастацтва.

Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, культурнае жыццё ў краі працягвала развівацца. Заставаўся галоўны яе носьбіт –народ. Цэнтрамі культурна-асветніцкага жыцця краю з'яўляліся
нешматлікія беларускія гімназіі: у Вільні, Навагрудку, Клецку і Радашковічах. Яны фарміравалі кадры нацыянальнай інтэлігенцыі. Віленскую гімназію скончылі ў розныя часы мастакі М. Васілеўскі, Р. Семашкевіч, В. Сідаровіч, паэты Н. Арсеннева, Х. Ільяшэвіч, А. Салагуб, дзеячы грамадска-палітычнага і культурнага жыцця Заходняй Беларусі І. Дварчанін, Я. Шутовіч, А. Клімовіч і інш. З Радашковіцкай гімназіяй звязаны жыццёвы шлях М. Таіжа. У Навагрудскай гімназіі вучыліся сусветнавядомыя вучоныя Л. Барысаглебскі, Б. Кіт.

З канца 20-х гадоў нязначныя ўступкі ў галіне асветы змяніліся хваляй рэпрэсій. Так у 1931 г. больш за 20 навучэнцаў Клецкай гімназіі за ўдзел у нацыянальна-вызваленчым руху былі асуджаны на розныя тэрміны турэмнага

зняволення. Палітычныя мэты ўладаў сталі асноўнымі задачамі школьнай рэформы 30-х гадоў і прывялі да поўнага заняпаду беларускія школы. Ідэя выхавання моладзі ў "актыўных лаяльных адносінах да польскай дзяржавы" стала асноўнай у дзейнасці навучальных устаноў. Заходнебеларускае грамадства страціла шанцы значна паправіць свой адукацыйны ўзровень.

Шматступеньчатае навучанне, высокая плата за вучобу і іншыя новаўвядзенні яшчэ больш абмежавалі доступ у сярэднія школы, ВНУ. У Заходняй Беларусі разгортвалі сваю дзейнасць розныя польскія культурна-асветніцкія арганізацыі і ўстановы, якія прапагандавалі шавіністычныя, вялікадзяржаўныя ідэі.

У процівагу гэтаму курсу вялікую асветніцкую работу праводзіла культурна-асветніцкая арганізацыя – Таварыства беларускай школы. Акрамя правядзення школьных кампаній, таварыства дапамагала ўтрымліваць беларускія гімназіі, адкрывала клубы, бібліятэкі, хаты-чытальні, стварала гурткі мастацкай самадзейнасці, народныя хоры.

Культурна-асветніцкую работу праводзіў Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры, адчынены ў 1926 г. Пад яго эгідай дзейнічала ў 1927 г. 22 бібліятэкі-чытальні, а ў 1929 г. – 37 бібліятэк. Інстытут праводзіў мерапрыемствы, прыстасаваныя да розных падзей беларускай гісторыі і культуры. У 1930 г. урачыста былі адзначаны 30-я ўгодкі смерці Ф. Багушэвіча, 25-я ўгодкі творчасці Я. Купалы, творчыя вечары, прысвечаныя памяці В. Эпімах - Шыпілы, М. Нікіфароўскага, мерапрыемствы з нагоды абвяшчэння БНР.

Значная ўвага надавалася арганізацыі самадзейных і музычных калектываў. У 20-30-я гг. плённа працаваў рэлігійны хор у Вільні. Летам 1927 г. пры віленскім гуртку БІГіК быў створаны народны тэатр, а ў 1929 г. гургкі вёсак Шатвічы, Свірыдавічы і Галяшчынкі Ашмянскага павета заснавалі тэатральную аб'яднаную трупу пад кіраўніцтвам Войцэха Шутовіча. Рэпертуар драматычных суполак звычайна складаўся з п'ес К. Каганца, Я. Купалы, Л. Родзевіча, Рушчанца, Ф. Аляхновіча і іншых аўтараў. У 30-я гг. арганізацыя паказу беларускіх спектакляў натыкаецца на перашкоды мясцовай адміністрацыі. Гэта прывяло да таго, што ўдругой палове 30-х гг. дзейнасць тэатральных суполак амаль спынілася.

У Вільні працавала Беларускае навуковае таварыства (БНТ). У вытокаў гэтай установы былі дзеячы нацыянальнага адраджэння В. Ластоўскі, Іван і Антон Луцкевічы. Члены БНТ займаліся распрацоў-кай беларускай навуковай тэрміналогіі, перакладам на беларускую мову педагагічнай, мастацкай літаратуры, выступалі з дакладамі і паведамленнямі па гісторыі, літаратуры, фальклору і этнаграфіі Беларусі.

Пры таварыстве ў 1921 г. быў адкрыты Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны музей імя Івана Луцкевіча. На працягу свайго існавання фонды музея істотна папаўняліся. З археалагічных знаходак тут былі каменныя сякеры, пярсцёнкі з пячаткамі полацкіх князёў Усяслава і Барыса, пячатка Міндоўга і іншыя матэрыялы з раскопак 18 беларускіх паветаў. У музеі была цікавая калекцыя манет, медных крыжоў XI ст., старадаўняй зброі, калекцыі кніг і грамат. Сярод апошніх былі такія

каштоўныя экспанаты, як Наваградскае Евангелле XIV ст., ілюстраванае Жухавіцкае Евангелле XIV ст., рукапісныя кнігі XVI ст., Аль-Кітаб, шэраг іншых грамат вялікіх князёў літоўскіх, каралёў Рэчы Паспалітай, частка пражскага выдання Бібліі Ф. Скарыны, Статут ВКЛ 1588 г. з друкарні Мамонічаў і іншыя каштоўныя экспанаты. Бібліятэка музея налічвала больш за 14 тыс. тамоў. Пры музеі існаваў багаты беларускі архіў. Музей шмат зрабіў у справе папулярызацыі культурна-гістарычнай спадчыны. У чэрвені 1945 г. як адзінае цэлае музей быў ліквідаваны, калекцыі падзелены паміж шэрагам музеяў, архіваў і бібліятэк.Да актывістаў БНТ належаў грамадска-палітычны дзеяч, гісторык і публіцыст Ад. Станкевіч. Яго намаганнямі была створана ў Вільні беларуская друкарня імя Ф. Скарыны. Няпоўны спіс выдадзеных у ёй кніг складаў больш 146 назваў. Ад. Станкевіч унёс пэўны ўклад у грамадскую думку Заходняй Беларусі. З'явіліся яго працы "Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення" (Вільня, 1934) і "Хрысціянства і беларускі народ. Спробы сінтэзы" (Вільня, 1940). У іх паказана месца беларускага народа, яго дзяржаўнасці і культуры ў агульнаеўрапейскай супольнасці. Не страцілі сваёй навуко-вай вартасці і працы В. Гадлеўскага – "Патрэба нацыянальнай ідэі", "Народ-нацыя", "Аб славянскай ідэі" і іншыя, апублікаваныя ў другой палове трыццатых гадоў.

Значны ўплыў на грамадскую думку аказала беларуская літаратура. Ігнат Абдзіраловіч (сапр. Ігнат Канчэўскі) у сваёй кнізе "Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага сьветагляду" (1921) падсумаваў уклад беларусаў у анталогію сусветнай думкі. Працы Максіма Гарэцкага "Гісторыя беларускай літаратуры" (1920), і "Хрэстаматыя беларускае літаратуры:, XI век – 1905 год" (1922) шырока выкарыстоўвалі ся ў нацыянальных гімназіях.

Галоўнай тэндэнцыяй у літаратуры 20-х гг. стаў рамантызм. Станоўчы ўплыў на беларускую паэзію аказала творчасць Уладзіміра Жылкі (1900-1933) . Вершы яго зборнікаў "На ростані", "З палёў Заходняй Беларусі" ўзбагацілі патрыятычную сімволіку лірыкі.

Уздым нацыянальна-вызваленчага руху ў другой палове 20-х гадоў выклікаў ажыўленне літаратурнага жыцця. У паэзію прыйшла кагорта маладых сіл – Міхась Васілёк, Алесь Салагуб, Піліп Пестрак, Валянцін Таўлай, Міхась Машара. Новая плынь мела рэвалюцыйна-дэмакратычны характар і знаходзілася пад уплывам Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). Вершы Міхася Васілька "У бой на акупанта", "Як я пана перанёс" і іншыя сталі праграмнымі творамі вызваленчага руху.

Моцнае ўздзеянне на свядомасць грамадства аказала публіцыстыка. Сярод твораў заходнебе ларускай публіцыстыкі ў першую чаргу трэба назваць працы Б. Тарашкевіча. Знаходзячыся ў польскай турме, ён перапрацаваў "Беларускую граматыку для школ", пераклаў на беларускую мову "Пана Тадэвуша" А. Міцкевіча, "Іліяду" Гамера.

Публіцыстычнай завостранасцю і навуковай дакладнасцю вызнача-ліся таксама многія артыкулы палітычнага сакратара ЦК КПЗБ І. Лагіновіча, якія змяшчаліся пад псеўданімамі: Лаўрыновіч, Кумельган у беларускіх дэмакратычных выданнях. У жанры публіцыстыкі выступалі таксама М.

Краўцоў (Касьцевіч), У. Самойла. Верш М. Краўцова "Мы выйдзем шчыльнымі радамі" (на музыку У. Тэраўскага) стаў своеасаблівым гімнам у Заходняй Беларусі.

У творчасці заходнебеларускіх мастакоў П. Сергіевіча, Я. Драздовіча, М. Сеўрука, Р. Семашкевіча, М. Васілеўскага адл юстроўвалася прыгажосць роднай прыроды, самабытнасць беларускай культуры. У пачатку 30-х гадоў Я. Драздовіч карцінамі-цыкламі "Жыццё на Марсе", "Жыццё на Сатурне", "Жыццё на Месяцы" першым паклаў пачатак касмічнай тэме ў беларускім выяўленчым мастацтве.

У культурным жыцці Заходняй Беларусі значнае месца займала тэатральнае мастацтва. Тэатральныя пастаноўкі ў пачатку 20-х гг. у Вільні ладзіла Беларуская драматычная майстроўня, якую ўзначальваў Л. Родзевіч. Яе традыцыі ў другой палове 20-х гадоў працягвалі гурткі ТБШ, БІГіК. У сельскай мясцовасці значна пашырыўся рух мастацкай самадзейнасці. Найбольш вядомым сярод самадзейных калектываў быў хор з в. Нягневічы на Навагрудчыне. Аматарскія спектаклі і канцэрты ператвараліся ў сапраўдныя святы. Шмат карыснага ў справе прапаганды беларускай народнай музыкі зрабіў Рыгор Шырма. Ён стварыў некалькі мастацкіх калектываў, кіраваў хорамі ў Пружанах, у Віленскай беларускай гімназіі.

Тэма 52 Беларусь у пачатку Другой сусветнай вайны.

Пачатак Другой сусветнай вайны. Паход Чырвоная армії ў Заходнюю Беларусь.

23 жніўня 1939 г. быў падпісаны савецка-германскі дагавор аб ненападзенні тэрмінам на 10 гадоў. Да дагавора быў прыкладзены “Сакрэтны дадатковы пратакол”, якім размяжоўваліся “сферы інтарэсаў” абодвух бакоў. СССР атрымаў Фінляндыю, Эстонію, Латвію, Бесарабію і “права” пашырацца на поўдзень у бок Персідскага заліва праз Іран, Афганістан і Турцыю.

Сам факт размежавання інтарэсаў сацыялістычнай і фашысцкай дзяржаў сакрэтным пратаколам, прынятым у абход законаў СССР і ў парушэнне дагаворных абавязацельстваў перад трэцімі краінамі, адлюстроўваў грэбаванне нормамі права і маралі.

Кульмінацыяй гэтага працэсу стаў Дагавор аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй ад 28 верасня 1939 г. Быў таксама падпісаны сакрэтны дадатковы пратакол, паводле якога Літва ўключалася ў сферу інтарэсаў СССР, а Германія ўзамен атрымлівала частку Польшчы, якая па ранейшай дамоўленасці ўваходзіла ў сферу інтарэсаў СССР.

Германія лічыла, што пакт ад 23 жніўня 1939 г. развязаў ёй рукі на Усходзе, і 1 верасня яна напала на Польшчу. Англія і Францыя, звязаныя з Польшчай саюзнымі дагаворамі, 3 верасня1939 г. аб’явілі вайну Германіі. У той жа дзень у вайну ўступілі Аўстралія, Новая Зеландыя і Індыя. Пачалася другая сусветная вайна.

Маючы велізарную эканамічную і ваенную перавагу, фашысцкія войскі імкліва рухаліся па тэрыторыі Польшчы да граніцы СССР. Урады Англіі і

Францыі, аб'явіўшы вайну Германіі, не пачыналі актыўных ваенных дзеянняў на Захадзе. У выніку Германія хутка акупіравала ўсю тэрыторыю Польшчы, яе войскі падступілі да межаў Заходняй Беларусі, занялі некаторыя яе населеныя пункты, у тым ліку Брэст.

Гераічнай старонкай удзелу беларусаў у польска-нямецкай вайне 1939 г. стала абарона Брэсцкай крэпасці. У час вераснёўскіх баёў 1939 г. гарнізон Брэсцкай крэпасці амаль на 40% быў з рэзервістаў-беларусаў, якія замянілі кадравыя часці 9-й, 20-й і 30-й польскіх пяхотных дывізій. Баі за крэпасць вяліся з 14 па 18 верасня 1939 г. Абаронцы на чале з брыгадным генералам К. Плісоўскім адбілі 7 варожых атак. Аднак, не атрымаўшы падмацавання, гарнізон крэпасці быў вымушаны з 17 на 18 верасня пакінуць пазіцыі і адысці ў паўднёва-заходнім накірунку. Дакладных звестак аб стратах, якія панеслі абаронцы Брэсцкай крэпасці, няма. З польскіх і нямецкіх крыніц вядома, што польская вайсковая групоўка "Брэст", якая з баямі пакінула крэпасць, налічвала каля 2 тыс. салдат і афіцэраў з ранейшых 4 тыс. абаронцаў. Нямецкі генерал Г. Гудэрыян у сваіх успамінах аб баях за Брэст у 1939 г. адзначыў, што падначаленыя яму войскі ў час штурму крэпасці ўзялі ў палон 8 афіцэраў і 980 салдат і малодшых камандзіраў польскай арміі.

Такім чынам, для беларусаў узброенае змаганне з нямецкімі войскамі пачалося яшчэ амаль за 2 гады да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. З 300 тыс. польскіх вайскоўцаў, што трапілі ў нямецкі палон, 40 тыс. назваліся беларусамі. 17 верасня 1939 г. па распараджэнні савецкага ўрада войскі Чырвонай Арміі перайшлі савецка-польскую граніцу. Да25 верасня 1939 г. Чырвоная Армія цалкам заняла Заходнюю Беларусь. Нямецкім войскам давялося адысці на ўзгодненую на вышэйшым узроўні мяжу, якая і была замацавана адпаведным дагаворам ад 28 верасня 1939 г. паміж СССР і Германіяй.

2 Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

28–30 кастрычніка 1939 г. у Беластоку адбыўся Народны сход Заходняй Беларусі. Ён аднагалосна прыняў па дакладу С.В. Прытыцкага дэкларацыю аб устанаўленні савецкай улады на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі. Аднадушна дэлегаты выказаліся і за ўваходжанне ў БССР. 2 лістапада1939 г. Нечарговая V сесія Вярхоўнага Савета СССР і 12 лістапада Нечарговая III сесія Вярхоўнага Савета БССР адпаведна прынялі законы аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз'яднанні яе з БССР. У выніку тэрыторыя БССР павялічылася са 125,6 тыс. км 2 да 225,6 тыс., насельніцтва рэспублікі – з 5 млн 562 тыс. чалавек да10 млн 239 тыс.

У апошні дзень работы сходу 30 кастрычніка таксама адзінагалосна былі прыняты дэкларацыі аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці і канфіскацыі памешчыцкіх зямель. Сход выбраў паўнамоцную камісію ў складзе 66 чалавек для паездкі ў Маскву, каб перадаць рашэнне адносна ўступлення Заходняй Беларусі ў склад Савецкага Саюза. 17 верасня Народны сход абвясціў Днём усенароднага свята.

Але разам са станоўчымі момантамі ў жыцці жыхароў краю

паявіліся некаторыя праблемы. У шэрагу выпадкаў накіраваныя на працу ў Заходнюю Беларусь работнікі ігнаравалі мясцовы лад жыцця, традыцыі насельніцтва. Здаралася неабаснаванае адхіленне ад працы спецыялістаў польскай нацыянальнасці, прымусовая рэарганізацыя польскіх школ у беларускія ці рускія, ігнараванне патрэб гаспадарак аднаасобнікаў.

На тэрыторыі былой Заходняй Беларусі было ліквідавана ранейшае адміністрацыйнае дзяленне і створана 5 абласцей (Баранавіцкая, Брэсцкая, Вілейская, Пінская і Беластоцкая).

Адначасова з вызваленнем Заходняй Беларусі і далучэннем яе да БССР была вызвалена Віленшчына. На вызваленых землях наладжвалася новае жыццё. Узмацніліся эканамічныя і культурныя сувязі з БССР, былі адкрыты беларускія школы, аднавіла работу беларуская гімназія, сталі выходзіць на беларускай мове часопісы і газеты, была створана беларуская тэатральная трупа і іншыя культурныя таварыствы.

У пачатку кастрычніка 1939 г. Віленская ўправа прыняла рашэнне ўдзельнічаць у выбарах Народнага схода Заходняй Беларусі. Аднак насельніцтву Вільні і Віленшчыны ўдзельнічаць у іх не давялося. Справа ў тым, што3 кастрычніка 1939 г. у Маскве пачаліся перагаворы паміж урадамі СССР і Ковенскай Літвы (сталіцай Літвы ў той час быў г. Коўна) адносна лёсу Віленшчыны, а 10 кастрычніка 1939 г. быў падпісаны Дагавор аб далучэнні Вільні і Віленшчыны да Літвы.

15 кастрычніка1939 г. прадстаўнікі ўрада Літвы выехалі ў Вільню для прыняцця спраў ад савецкага камандавання і адміністрацыі, а 27 кастрычніка літоўскае войска ўступіла на тэрыторыю Віленскай вобласці. 29 кастрычніка 1939 г. у Вільні адбылася ўрачыстая цырымонія ўзняцця літоўскага флага на гары Гедыміна.

Супраць далучэння Вільні і Віленшчыны да Літвы выступіў урад Польшчы. Не падтрымалі дагавор буйныя еўрапейскія дзяржавы, у тым ліку Англія і Францыя.

Менш чым праз год пасля далучэння Віленшчыны да Літвы адбыліся новыя тэрытарыяльныя змены. 1 жніўня 1940 г. Працавала VII сесія Вярхоўнага Савета СССР, на якой вырашалася пытанне аб уваходжанні Прыбалтыйскіх рэспублік у склад СССР. У выніку ад Беларусі на карысць Літвы ў лістападзе 1940 г. былі адлучаны Свянцяны (зараз Швянчоніс), Салечнікі (зараз Шальчынінкай) і курорт са стогадовай гісторыяй Друскенікі (зараз Друскенінкай), які спрадвеку знаходзіўся ў Гродзенскай губерні. Гэта тэрыторыя складала 2600 км 2 з насельніцтвам 65 тыс. чалавек.

Гісторыкі выказваюць розныя меркаванні адносна тэрытарыяльных змен, праведзеных у1939–1940 гг. Аднак большасць з іх аднадушны ў тым, што гэтыя змены праводзіліся ў палітычных мэтах.

3 Асноўныя накірункі і вынікі развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў 1938-1941 гг.

БССР у перадваенныя гады.За два перадваенныя дзесяцігоддзі БССР дасягнула значных поспехаў у развіцці народнай гаспадаркі, культуры і адукацыі. Яна ператварылася з аграрнай у індустрыяльна-аграрную краіну. З'явіліся машынабудаўнічая, дрэваапрацоўчая, тэкстыльная і іншыя новыя галіны прамысловасці.

Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР паскорыла эканамічнае развіццё гэтага рэгіёна. На прамысловае будаўніцтва ў заходніх абласцях былі асігнаваны значныя сумы. Аднаўляліся і пашыраліся прамысловыя прадпрыемствы, вялося будаўніцтва новых. Праз год пасля ўз'яднання ў заходніх абласцях рэспублікі дзейнічалі 392 прадпрыемствы, на кожным з якіх працавала рабочых больш чым па 20 чалавек. Аб'ём прамысловай прадукцыі павялічыўся ў канцы 1940 г. амаль у 2 разы ў параўнанні з 1938 г. і склаў 27,6% прамысловай вытворчасці рэспублікі. У другой палове 1940 г. у заходніх абласцях пачалося інтэнсіўнае будаўніцтва аэрадромаў, мастоў, віядукаў, пад'язных дарог.

Разам з тым прамысловасць Беларусі перад вайной сутыкнулася з пэўнымі цяжкасцямі і складанасцямі. Павялічылася колькасць недабудаваных прамысловых і сацыяльных аб'ектаў. Многія прадпрыемствы працавалі нерытмічна. У 1940 г. Прамысловасць будаўнічых матэрыялаў, папяровая і лясная галіны не выканалі пастаўленых планаў.

Галоўнай праблемай беларускай вёскі ў даваенны час было тое, што калектыўныя гаспадаркі былі рэзка абмежаваны ў самастойнасці. Сістэма дырэктыўнага планавання, абавязковыя пастаўкі прадукцыі дзяржаве, бюракратычнае камандаванне калгасамі – вось асноўныя прычыны іх маруднага развіцця.

Афіцыйная статыстыка ў даваенныя гады паказвала рост рэальных даходаў працоўных. Аднак матэрыяльнае становішча ўсіх слаёў савецкага грамадства, у тым ліку і насельніцтва Беларусі, не палепшылася. У параўнанні з перыядам нэпа беларускі селянін у канцы 30-х гг. меней ужываў хлеба, мяса, малака. Цэны на збожжа і шэраг іншых прадуктаў харчавання не кампенсавалі выдаткаў на іх вытворчасць. Яны былі ў 10-12 разоў ніжэйшыя за рыначныя. Пагоршылася становішча і гарадскога насельніцтва. Індэкс рознічных цэн у 1940 г. быў у 6,3 раза вышэйшы ў параўнанні з 1928 г., павялічыліся цэны на асноўныя харчовыя прадукты, прамысловыя тавары. Рэальная заработная плата дасягнула ўзроўню 1928 г. толькі ў 1940 г.

Сваю незадаволенасць выказвалі жыхары заходніх абласцей Беларусі. Вялікай памылкай з'явілася нацыяналізацыя аб'ектаў гандлю, дробных прадпрыемстваў. Гэта прывяло да дэфіцыту тавараў шырокага спажывання, росту цэн на іх.

Тэма 53. Беларусь у пачатку Вялікай айчыннай вайны.

1 Прыгранічныя баі на тэрыторыі БССР. Абарона Брэсцкай крэпасці.

22 чэрвеня 1941 г. на світанку нямецкія ўзброеныя сілы атакавалі дзяржаўную граніцу СССР ад Чорнага да Баранцава мораў. Асабліва трагічная абстаноўка ў першыя дні і нават гадзіны Вялікай Айчыннай вайны склалася для савецкіх войскаў на Беларусі. Тут на 450-кіламетровым участку дзяржаўнай граніцы германскае ваеннае камандаванне выкарыстала сваю самую магутную групоўку войскаў – групу армій "Цэнтр" (камандуючы генерал- фельдмаршал фон Ф. Бок). Групоўка "Цэнтр" налічвала 50 дывізій, укамплектаваных па штату ваеннага часу (з іх 9 танкавых і 6 матарызаваных), або 820 тыс. салдат і афіцэраў, 1800 танкаў, 14 300 гармат і мінамётаў, 1680 баявых самалётаў.

Германскім войскам з савецкага боку супрацьстаялі войскі Заходняй Асобай ваеннай акругі, якая 22 чэрвеня 1941 г. стала называцца Заходнім фронтам (камандуючы генерал арміі Д.Р. Паўлаў да 30 чэрвеня 1941 г.). У колькасных адносінах Заходні фронт складаў 44 дывізіі (24 стралковых, 12 танкавых, 6 матарызаваных і 2 кавалерыйскія), 3 брыгады, 8 умацаваных раёнаў і Пінская ваенная флатылія. Агульная колькасць войскаў Заходняга фронту складала 627 300 салда т і афіцэраў, 2202 танкі, 10 087 гармат і мінамётаў, 1789 баявых самалётаў. Пры гэтым адзначым, што самалётаў новых канструкцый (МІГ-3 і ЯК-1) на ўзбраенні савецкіх войскаў у Беларусі было толькі 303 адзінкі, танкавы парк Заходняй Асобай ваеннай акругі налічваў 383 машыны маркі КВ і Т -34.

Пралікі ў палітыцы кіраўніцтва СССР у перадваенны час у значнай ступені абумовіла трагедыю краіны і яе ўзброеных сіл у першыя месяцы савецка-германскай вайны.

Сталін і яго паплечнікі, безумоўна, рыхтаваліся да вялікай вайны. Уся палітыка індустрыялізацыі была скіравана на стварэнне цяжкай прамысловасці, ваенна-прамысловага комплексу. У канцы 30-х гг. распачалося пераўзбраенне арміі, значна павялічана яе колькасць, тэрмін ваеннай службы пра цягнуты да трох гадоў.

Галоўны ўдар па савецкіх войсках у Беларусі германская армія нанесла ў раёнах Брэста і Гродна ў паласе абароны 3- й і 4- й савецкіх армій. Тут колькасць нямецкіх войскаў у жывой сіле і тэхніцы пераўзыходзіла савецкія войскі ў 5 разоў. Гэтыя два ўдарныя кулакі павінны былі зламаць супраціўленне Чырвонай Арміі з наступным выхадам на аператыўную прастору і авалоданнем гарадамі Мінск і Смаленск.

З самага пачатку нападу германскія войскі адчулі на сабе моц супраціўлення, чаго яны не сустракалі ў час ваенных дзеянняў у Еўропе. Ужо ў першыя гадзіны інтэрвенцыі на Гродзенскім напрамку для нямецкіх войскаў склалася неспрыяльная абстаноўка. Нягледзячы на тое, што часці Чырвонай Арміі 23 чэрвеня 1941 г. пакінулі Гродна і адышлі за раку Нёман, 29-я танкавая дывізія контратакавала праціўніка і адкінула яго на некалькі кіламетраў на захад. Тэмп германскага наступлення ўдалося замарудзіць. Генерал-інспектар пяхоты От паведамляў галоўнаму камандаванню вермахта аб баях у раёне Гродна наступнае: "Упартае супраціўленне рускіх прымушае нас весці бой па ўсіх правілах нашых баявых статутаў. У Польшчы і на Захадзе мы маглі дазваляць сабе пэўныя вольнасці і

адыходы ад статутных прынцыпаў, цяпер гэта рабіць стала ўжо немагчыма".

На шэрагу ўчасткаў Брэсцкага накірунку, дзе дыслацыраваліся войскі 4-й арміі (камандуючы генерал-маёр А.А.Карабкоў), нямецкія войскі таксама сустрэлі ўпартае супраціўленне. Асабліва жорсткія баі вяліся ў раёне Брэсцкай крэпасці. Колькасць абаронцаў крэпасці. што на доўгі час прыкавала 45-ю, 31-ю і 34-ю нямецкія пяхотныя і 2-ю танкавую дывізіі, складала ўсяго каля 4 тыс. байцоў. Праціўнік меў амаль у дзесяць разоў большую перавагу. Гарнізон крэпасці з першых гадзін вайны змагаўся ў поўным акружэнні. Баі ў Брэсцкай крэпасці працягваліся даканца ліпеня 1941 г.

2 Мерапрыемствы па мабілізацыі насельніцтва і эвакуацыя ў савецкі тыл.

Адначасова з ваеннымі дзеяннямі ішла інтэнсіўная работа па мабілізацыі людскіх і тэхнічных рэсурсаў рэспублікі. неабходных для барацьбы з германскімі захопнікамі. З першага дня вайны раённыя ваенкаматы і пункты мабілізацыі на Бе ларусі распачалі прызыў усіх рэзервістаў у дзеючую армію.

Звыш 27 тыс. жыхароў беларускай сталіцы з 23 па 27 чэрвеня 1941 г. папоўнілі колькасны склад 2-га і 44-га стралковых корпусаў, якія абаранялі горад. Частка з іх увайшла ў склад 1-га Мінскага палка, які быў сфарміраваны 27 чэрвеня на чыгуначнай станцыі Калодзішчы. Многія з іх загінулі, абараняючы родны горад.

Мабілізацыя прайшла на тэрыторыі Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай і Палескай абласцей. У заходніх абласцях былі прызваны толькі асобныя катэгорыі камандна-палітычнага складу. Хуткі рух нямецкіх войскаў не дазволіў адпаведным чынам рэалізаваць мабілізацыйны план на ўсёй тэрыторыі рэспублікі. У ліпені-жніўні часці Чырвонай Арміі папоўніліся амаль на 500 тыс. чалавек з ліку прызваных у дзеючую армію жыхароў Беларусі.

Чырвоная Армія атрымала ад гаспадарчых прадпрыемстваў і ўстаноў Беларусі ў чэрвені-жніўні 1941 г. звыш 20 тыс. аўтамашын, каля 10 тыс. трактароў, 35 тыс. коней, 20 тыс. тон прадуктаў харчавання і фуражу. Акрамя таго, на будаўніцтве абарончых аб'ектаў працавалі каля 2 млн. жыхароў Беларусі. За кароткі прамежак часу былі створаны абарончыя рубяжы вакол Магілёва, Гомеля, Віцебска, Оршы, Быхава, а таксама на берагах Дняпра, Заходняй Дзвіны і Сожа. Так, за некалькі дзён жыхары г. Гомеля выкапалі вакол горада процітанкавы роў працягласцю звыш 25 кіламетраў. Штодзённа на будаўніцтве абарончых аб'ектаў горада працавала болей 10 тыс. гамяльчан.

У адпаведнасці з дырэктывай ЦК КП(б)Б аб арганізацыі барацьбы з варожымі дыверсантамі і парашутыстамі ад 23 чэрвеня 1941 г. пачалі ствараць знішчальныя батальёны і атрады самааховы. 15 ліпеня 1941 г. на тэрыторыі Беларусі ўжо дзейнічала 78 знішчальных батальёнаў (13 067 чал.), 300 атрадаў і груп самааховы (26 862 чал.). Аднак самаахова была недастаткова забяспечана ўзбраеннем для ўдзелу ў баявых дзеяннях супраць вайсковых

фарміраванняў працiўніка.

Трагічнай была абстаноўка і ў самім Мінску ў час яго абароны. На горад часта налятала нямецкая авіяцыя, усё навокал гарэла. Эвакуацыя з горада не праводзілася, кожны ратаваўся як мог. 24 чэрвеня штаб Заходняга фронту, кіраўнікі кампартыі і ўрада рэспублікі накіраваліся ў г. Магілёў. Аб тым, наколькі спешным быў ад'езд, сведчыць той факт, што не эвакуіравалі нават архіў Савета Народных Камісараў БССР, а Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Н.Я. Наталевіч у спешцы не паспеў забраць са свайго сейфа спіскі членаў урада, кіруючых работнікаў Вярхоўнага Савета, ЦК ЛКСМБ з указаннем хатніх адрасоў і пералічэннем членаў іх сем'яў. Гэтыя дакументы каштавалі жыццяў многіх людзей.

У ліпені-жніўні 1941 г. было эвакуіравана ў тыл 1,5 млн. спецыялістаў народнай гаспадаркі і членаў іх сямей, 124 буйныя прамысловыя прадпрыемствы, у тым ліку 37 з Віцебскай вобласці, 38 –Гомельскай, 15 – Магілёўскай і 19 – Палескай вобласці. Сярод іх былі "Гомсельмаш", гомельскі станкабудаўнічы імя С.М.Кірава і паравоза-рамонтны заводы, Магілёўскі завод авіяцыйнага маторабудавання, віцебскія абутковыя фабрыкі "Прагрэс" і "Чырвоны Кастрычнік", Аршанскі льнокамбінат і іншыя. Эвакуіраваныя прадпрыемствы да вайны выраблялі 46,6% усёй электраэнергіі, 40,9% машынабудавання і металаапрацоўкі, 63,7% тэкстылю.

Эвакуіраваныя з Беларусі прадпрыемствы размяшчаліся пераважна ў Паволжы, на Урале, у Сібіры. Рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі на новых месцах паказвалі прыклад сапраўднага працоўнага гераізму. Ужо ў пачатку 1942 г. большасць эвакуіраваных беларускіх прадпрыемстваў пачалі выпуск ваеннай прадукцыі, за адзін месяц правялі мантаж абсталявання, перабудавалі тэхналогію вытворчасці і наладзілі, як, напрыклад, гомсельмашаўцы, выпуск у Чалябінскай вобласці мінамётаў. У складаных умовах беларускае сялянства праводзіла эвакуацыю матэрыяльных каштоўнасцяў.

Вяскоўцы Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай, Мінскай і Палескай абласцей эвакуіравалі і перадалі насельніцтву звыш 750 тыс. галоў жывёлы з грамадскага сектара ўласнасці. Акрамя таго ў савецкі тыл вывезена 93,6 тыс. Тон збожжа, каля 5 тыс. трактароў, 600 камбайнаў і іншай сельскагаспадарчай тэхнікі. У 1941 г. з Беларусі былі эвакуіраваны 60 навукова-даследчых інстытутаў і лабараторый, 20 вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, 6 тэатраў.

З Абарончыя баі летам 1941 г. Прычыны паражэння савецкіх войскаў у першы перыяд вайны.

І ўсё ж, нягледзячы на ўпартае супраціўленне часцей За ходняга фронту, войскі вермахта за два дні прасунуліся ў глыб тэрыторыі Беларусі больш чым на 100 кіламетраў. У першыя дні вайны быў дапушчаны стратэгічны пралік савецкага ваеннага камандавання. На Беластоцкім выступе было сканцэнтравана 26 савецкіх дывізій, у тым ліку 8 танкавых і 4 матарызаваных (каля 2 тыс. танкаў і 350 тыс. салдат і афіцэраў).

Флангавыя ўдары германскіх войскаў на Брэсцкім і Гродзенскім напрамках прывялі да таго, што гэтыя сілы трапілі ў аператыўнае акружэнне і амаль не паўнлывалі на падзеі ў заходніх прыгранічных раёнах Беларусі ў пачатку вайны.

26 чэрвеня 1941 г. нямецкія механізаваныя часці ўжо падступілі да сталіцы Беларусі. Пачалася бітва за Мінск. Войскі 13-й арміі (камандуючы генерал-лейтэнапт П.М. Філатаў), асабліва 64-я, 108-я, 161-я стралковыя дывізіі ўгрымлівалі рубяжы да 28 чэрвеня. Гераічна змагаліся воіны 100-й стралковай дывізіі пад камандаваннем генерал-маёра І.М. Русіянава, якія ў баях за Мінск знішчылі больш як 100 танкаў і бронемашын праціўніка. Аднак становішча абаронцаў Мінска пагаршалася. З паўднёвага захаду да сталіцы прарваўся 47-мы матарызаваны корнус з групы Гудэрыяна. 28 чэрвеня для войскаў 13-й арміі ўзнікла пагроза акружэння. Адзіным рашэннем у гэтых умовах быў адвод войскаў арміі на Усходнім напрамку. Лёс Мінска ў ваенна-стратэгічных адносінах быў вырашаны, хаця баі ў горадзе і яго прыгарадах працягваліся яшчэ некалькі дзён.

Са стратай Мінска ў акружэнне трапілі войскі 3-й, 4-й, 10-й і значная частка сіл 13-й савецкіх армій. Па звестках нямецкага камандавання ў аперацыях пад Беластокам, Брэстам і Мінскам часці вермахга захапілі ў палон 330 тыс. ваеннаслужачых, больш за 3000 гармат і 3332 танкі, а таксама шмат боепрыпасаў і вайсковай маёмасці. У выніку гэтага баяздольнасць Заходняга фронту істотна паменшылася.

Між тым праціўнік працягваў тараніць танкавымі клінамі савецкую абарону на асобных участках фронту. Але з кожным днём супраціўленне Чырвонай Арміі ўзмацнялася, і павялічваліся страты вермахта. Нягледзячы на тое, што германскія войскі акружылі савецкую групоўку каля Мінска, спроба з ходу фарсіраваць водны рубеж на Бярэзіне і выйсці да Дняпра не завяршылася поспехам. Баі ў раёне Барысава ішлі тры дні, і толькі 1 ліпеня часці 47-га германскага танкавага корпуса змаглі авалодаць пераправай і прарвацца на ўсходні бераг Бярэзіны.

Вельмі напружаныя баі вяліся на Смаленскім накірунку. 12-16 ліпеня цяжкія баі за Оршу вялі войскі 18-й (камандзір палкоўнік П.К. Жывалёў) і 73-й (камандзір палкоўнік А.І. Акімаў) стралковых дывізій са складу 20-й арміі Заходняга фронту, а таксама знішчальны батальён з ліку 1200 мясцовых жыхароў. Пад Оршай 14 ліпеня ўпершыню нанесла ўдар па ворагу батарэя рэактыўных установак ("кацюш") пад камандаваннем капітана І.А. Флёрава.

З 3 па 26 ліпеня савецкія войскі гераічна абаранялі Магілёў. Каб хутчэй захапіць горад, праціўнік сканцэнтраваў тут 4 пяхотныя і 1 танкавую дывізіі, матарызаваны полк "Вялікая Германія" і іншыя вайсковыя фарміраванні. Ім супрацьстаялі часці 61-га стралковага корпуса (камандзір генерал- маёр Ф.А. Бакунін) і байцы народнага апалчэння. У гэты ж час кровапралітныя баі ішлі на подступах да Віцебска і Гомеля.Адначасова з абарончымі баямі камандаванне Чырвонай Арміі

летам 1941 г. правяло шэраг наступальных аперацый. З мэтай умацавання сваіх пазіцый на рубяжы рэк Заходняя Дзвіна- Днепр 6 ліпеня

1941 г. войскі 20-й арміі (камандуючы генерал-лейтэнант П.А. Курачкін) сіламі 5-га і 7-га механізаваных корпусаў нанеслі контрудар у напрамку Сянно-Лепель. Адбылася буйнейшая танкавая бітва з пачатку Другой сусветнай вайны, у якой з абодвух бакоў удзельнічала больш як 1500 танкаў і бронемашын. Праціўнік быў адкінуты ў напрамку Лепеля на 30-40 кіламетраў. Нягледзячы на тое, што германскія войскі панеслі тут значныя страты, савецкім войскам дасягнуць пастаўленай задачы ў поўным аб'ёме не ўдалося. 7-мы механізаваны корпус быў спынены войскамі 47-га нямецкага матарызаванага корпуса на подступах да Лепеля, а 5-ты савецкі корпус апынуўся ў складаных умовах аператыўнага акружэння. У ходзе цяжкіх кровапралітных баёў напрыканцы дня 10 ліпеня 1941 г. з акружэння ў раён Оршы выйшла толькі частка савецкіх войскаў, што ўдзельнічалі ў аперацыі.

Другой значнай наступальнай аперацыяй савецкіх войскаў на Беларусі летам 1941 г. з'яўляецца Рагачоўска- Жлобінская аперацыя, праведзеная войскамі 21-й арміі (камандуючы генерал-палкоўнік Ф.І.Кузняцоў). На вастрыні ўдару знаходзіўся 63-ці стралковы корпус пад камандаваннем генерал-лейтэнанта Л.Р. Пятроўскага. 13 ліпеня ён правёў контрудар, вызваліў гарады Рагачоў і Жлобін. Нямецкія войскі былі адкінуты на 20-30 кіламетраў у напрамку Бабруйска, але ў баі загінуў генерал Пятроўскі. Контрудар войскаў 21-й арміі скаваў сілы 8 нямецкіх дывізій, што не дазволіла ім хутка фарсіраваць Днепр і выйсці на аператыўную прастору ў напрамку Рослаўль-Смаленск.

У першай дэкадзе жніўня нямецкае камандаванне, сканцэнтраваўшы супраць войскаў фронту звыш 25 дывізій, галоўным чынам танкавых і матарызаваных, разгарнула наступленне.

Баі за Гомель працягваліся амаль 20 дзён. І толькі ў ноч з 19 на 20 жніўня 1941 г. Гомель быў пакінуты савецкімі войскамі і апалчэнцамі. Да пачатку верасня 1941 г. уся тэрыторыя Беларусі была акупіравана нямецкімі войскамі.

Апраўдваючы няўдачы і страты на пачатковым этапе вайны, кіраўніцтва Савецкага Саюза на чале з Сталіным абвінаваціла ва ўсіх грахах камандаванне Заходняга фронту з яго камандуючым Д.Р. Паўлавым. Военачальнікі былі асуджаны і расстраляны.

У ходзе абарончых баёў войскі Чырвонай Арміі страцілі 1,5 млн. чалавек забітых, параненых і тых, што трапілі ў палон, а таксама 10 тыс. гармат і мінамётаў, 5 тыс. танкаў і 2 тыс. баявых самалётаў.

Прычыны паражэння савецкіх войскаў у першы перыяд вайны. Кіраўнікі Савецкага Саюза далёка не ў поўнай меры скарысталі тыя перавагі, што меліся ў іх. Не быў выкарыстаны такі важны тэрытарыяльны фактар, як далучэнне да СССР Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Прыбалтыкі, калі граніца СССР адсунулася далёка на Захад. Распачатае будаўніцтва абарончых аб'ектаў на новай савецка- германскай мяжы ішло марудна, прычым адначасова суправаджалася актыўным дэмантажом аналагічных умацаванняў на старой савецка- польскай дзяржаўнай мяжы. Напярэдадні

вайны войскі Чырвонай Арміі нават не былі прыведзены ў стан баявой гатоўнасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу.

Сталін меў рацыю, калі лічыў, што Германія не можа выйграць вайну ў Еўропе на два франты. На Захадзе яе моцным праціўнікам заставалася Англія, якая да таго ж карысталася падтрымкай ЗША. Суадносіны сіл паміж Германіяй і СССР не давалі падстаў спадзявацца на хуткую і лёгкую перамогу Германіі. А па ацэнках савецкага Генштаба суадносіны ўвогуле былі на карысць СССР. Сталін ігнараваў верагоднасць хуткага нападу гітлераўскай Германіі на Савецкі Саюз. Данясенні савецкіх разведчыкаў, дзе ўказ-валіся дні і нават гадзіны пачатку вайны, патанулі ў хвалі нямецкай дэзінфармацыі. Быў стратэгічны пралік у тэрмінах магчымага пачатку вайны, зроблены асабіста Сталіным і яго акружэннем. Савецкія войскі на пачатку вайны не былі гатовыя да адбіцця нападу фашысцкай Германіі. Дырэктыва Наркамата абароны і Генштаба, накіраваная позна вечарам у ваенныя акругі 21 чэрвеня "быць у поўнай баявой гатоўнасці, сустрэць магчымыраптоўны ўдар немцаў або іх саюзнікаў", ужо нічога не магла вырашыць. Адначасова ў гэтай дырэктыве гаварылася, што нападзенне можа пачацца з правакацыйных дзеянняў, "Задача нашых войскаў – не паддавацца ніякім правакацыйным дзеянням, якія могуць выклікаць вялікія ўскладненні...".

Рэпрэсіі супраць афіцэрскіх кадраў Чырвонай Арміі ў канцы 30-х гг. пазбавілі Узброеныя Сілы краіны значнай колькасці камандзіраў.

Маршал Савецкага Саюза А.М. Васілеўскі, згадваючы гэтыя абставіны пасля вайны, зазначыў, што каб не масавыя рэпрэсіі камандуючых кадраў, то, "мабыць, і не было б увогуле вайны ў сорак першым годзе". Германская разведка і генштаб добра ведалі пра становішча і цалкам выкарысталі ўсе сродкі, каб здзейсніць свае планы ў 1941 г.

Тэма 54 Акупацыйны рэжым.

1 Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі. Сістэма акупацыйнай улады.

У пачатку верасня 1941 г. на ўсёй тэрыторыі Беларусі ўсталяваўся нямецкі акупацыйны рэжым. Акупацыйная палітыка нямецкіх уладаў была загадзя распрацавана ў "Інструкцыі аб асобных абласцях да дырэктывы № 21" (план "Барбароса"), выдадзенай яшчэ 13 сакавіка 1941 г. На нарадзе вышэйшых службовых асоб 16 ліпеня 1941 г. Гітлер заявіў, што савецкія тэрыторыі павінны быць навечна далучаны да рэйха.

Нямецкія ўлады ўвялі свой адміністрацыйны падзел Беларусі. Частка яе разам з Літвой, Латвіяй, Эстоніяй восенню 1941 г. была ўключана ў склад рэйхскамісарыята "Остланд". Яго адміністрацыйны цэнтр знаходзіўся ў г. Рызе. Беластоцкую вобласць акупацыйныя ўлады далучылі да Усходняй Прусіі. На гэтан тэрыторыі дзейнічалі нормы нямецкага права. Кіраўніцтва ва ўсіх структурах улады ажыццяўлялі нямецкія чыноўнікі.

Паўднёвыя раёны Брэсцкай, Гомельскай, Палескай і Пінскай абласцей

былі далучаны да рэйхскамісарыята "Украіна". Туды ж адышлі гарады Брэст, Пінск, Мазыр, а таксама ўсе раёны, што знаходзіліся на поўдзень ад чыгункі Брэст-Гомель. Усё справаводства на гэтых тэрыторыях вялося толькі на ўкраінскай і нямецкай мовах. Беларуская мова была забаронена. Разліковым грашовым сродкам былі нямецкія акупацыйныя маркі і ўкраінскія карбованцы, якія ўвёў у абарачэнне Ровенскі эмісійны банк.

На тэрыторыі Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай абласцей і ўсходніх раёнаў Мінскай акупанты ўтварылі так званую вобласць армейскага тылу групы армій "Цэнтр", якая падпарадкоўвалася нямецкай ваеннай адміністрацыі. Ваенна-адміністрацыйныя функцыі тут выкопвалі створаныя вермахтам палявыя і мясцовыя камендатуры.

У склад генеральнай акругі "Беларусь" былі ўключаны Баранавіцкая, значная частка Вілейскай, заходнія і паўночныя раёны Мінскай вобласці, а таксама паўночныя раёны Пінскай вобласці (усяго 68 раёнаў з 192, што былі ў складзе БССР перад пачаткам вайны). Плошча генеральнай акругі "Беларусь" складала не больш трэці даваеннай тэрыторыі Беларусі. Паводле звестак акупацыйных уладаў на 4 снежня 1941 г. тут пражывала 3 млн. 138 тыс. чалавек. Нямецкую акупацыйную адміністрацыю на Беларусі з 17 ліпеня 1941 г. да апошняга дня свайго жыцця (22 верасня 1943 г.) узначальваў генеральны камісар (гаўляйтэр) В. Кубэ. Пасля таго, як партызаны забілі В. Кубэ, генеральны камісарыят узначаліў генерал паліцыі К. Готберг.

Уся тэрыторыя так званай "генеральнай акругі" была падзелена на 10 акруг (гебітскамісарыятаў): Баранавіцкую, Барысаўскую, Вілейскую, Ганцавіцкую ("Прыпяць"), Глыбоцкую, Лідскую, Мінскую, Навагрудскую, Слонімскую і Слуцкую. На чале гэтых акруг стаялі нямецкія чыноўнікі (гебітскамісары). Горад Мінск знаходзіўся ў час нямецкай акупацыі на палажэнні асобнага камісарыята і падпарадкоўваўся толькі генеральнаму камісарыяту Беларусі. Апарат генеральнага і акружных камісарыятаў камплектаваўся выключна нямецкімі служачымі. Разам з органамі нямецкага кіравання ў акругах ствараліся ўправы, у якіх працавалі прадстаўнікі мясцовай калабарацыі. Звычайна аддзелы ўправы дубліравалі назвы і функцыі нямецкіх аддзелаў акруговых камісарыятаў. Напрыклад, у складзе Мінскай гарадской управы былі створаны аддзелы прамысловасці, гаспадаркі, працы і аховы здароўя. Аднак без санкцыі нямецкіх акупацыйных уладаў адміністрацыя ўправы не магла вырашаць нават самыя звычайныя пытанні гаспадарчага і грамадскага жыцця ў гарадах і іншых населеных пунктах адміністрацыйных акруг.

Адміністрацыя ў раёнах ствараласяз ліку мясцовых калабарацыяністаў. На чале ўсёй раённай адміністрацыі стаяў бургамістр. Звычайна бургамістры прызначаліся з ліку беларускіх эмігрантаў.

На тэрыторыі сельсаветаў акупанты стварылі воласці, якія ўзначальвалі прызначаныя імі бургамістры. У вёсках акупацыйную ўладу прадстаўлялі старасты. Уся вертыкаль створанай сістэмы ўлады кантралявалася нямецкімі чыноўнікамі.

2 Рабаванне гітлераўцамі гаспадарчых і культурных каштоўнасцей.

Адначасова са стварэннем структуры "новай" улады, акупанты пачалі займацца і гаспадаркай. Каб паставіць на службу рэйха эканоміку Беларусі, акупанты ўжо на працягу ліпеня 1941 г. правялі рэгістрацыю працаздольнага насельніцтва ў гарадах. Усе прадпрыемствы і ўстановы Беларусі былі ўзяты на ўлік, была праведзена іх дэталёвая інвентарызацыя. Напрыклад, у г. Мінску гэта акцыя была завершана да 20 ліпеня 1941 г. У выніку праведзеных акупантамі мерапрыемстваў ужо 1 снежня 1941 г. у Мінску працавала 73 прадпрыемствы, у снежні 1942 г. – 117, а ў красавіку 1943 г. – 150. Сярод іх было 20 прадпрыемстваў металургічнага профілю, 14 тэкстыльных, 21 транспартнае, 7 хімічнай і будаўнічай вытворчасці, 6 дрэваапрацоўчых, 3 электрастанцыі і г. д. Рабочыя і служачыя падвяргаліся жорсткай эксплуатацыі. Працоўны дзень у сярэднім складаў 12 гадзін у суткі.

Трэба адзначыць, што разам з камандна-адміністрацыйнымі метадамі акупанты выкарыстоўвалі і эканамічныя метады кіравання гаспадаркай. На 1 ліпеня 1942 г. на тэрыторыі генеральнай акругі "Беларусь" працавала 33 банкі, а ў 1943 г. іх было ўжо каля 100.

Акрамя збору грашовых лішкаў банкі праводзілі крэдытаванне гаспадаркі, узаемаразлікі паміж прадпрыемствамі розных рэгіёнаў Беларусі, праводзілі аперацыі з каштоўнымі паперамі і г.д.

Вясной 1942 г. на тэрыторыі генеральнай акругі "Беларусь" акупацыйныя ўлады правялі зямельную рэформу. Усе калгасы былі ліквідаваны, а іх зямля і інвентар перайшлі да ўжытку сялян у рамках так званых "кааператываў". На тэрыторыі Усходняй Беларусі калгасы па-ранейшаму існавалі. Яны, па меркаванню акупацыйных уладаў, былі надзейным сродкам забеспячэння харчовых патрэб Германіі і фронту.

3 Стварэнне канцлагераў. Яўрэйскія гета. Угон насельніцтва ў Германію.

У адносінах да мясцовага насельніцтва нямецкія ўлады з першых дзён свайго гаспадарання распачалі палітыку генацыду. Праграма каланізацыі акупіраваных усходнеславянскіх тэрыторый прадугледжвала прымусовае высяленне і знішчэнне 75% насельніцтва Беларусі і засяленне "вызваленых" зямель нямецкімі каланістамі. Яшчэ ў маі 1940 г. Г. Гімлер у службовай запісцы "Аб некаторых думках пра адносіны да мясцовага насельніцтва ўсходніх абласцей" паведамляў, што важнейшай справай усходняй палітыкі з'яўляецца ачышчэнне далучаных да рэйха тэрыторый на Усходзе ад асоб "чужой расы". У гэтым самым дакуменце патрабавалася не лічыцца з абставінамі, выкарыстоўваючы сілу, і сці напралом пры ажыццяўленні каланізацыі і вынішчэнні славянскіх народаў.

У "Загадзе аб выкарыстанні ваеннай юрысдыкцыі ў раёне "Барбароса" і аб асобных мерапрыемствах у войсках ад 13 мая 1941 г." паведамлялася: "За дзеянні, учыненыя супраць варожых грамадзянскіх асоб, не існуе ніякага прымусовага праследавання нават у тым выпадку, калі дзеянні з'яўляюцца

адначасова ваенным злачынствам або правапарушэннем".

Практычнаму ажыццяўленню злачынных задум нямецкага фашызму супраць славянскіх народаў спрыяла бесперапынная ідэалагічная апрацоўка салдаг вермахта і войскаў СС. Магутны апарат нацысцкай прапаганды на працягу некалькіх гадоў метадычна атручваў свядомасць грамадзян рэйха ідэямі ваеннай агрэсіі і расавай перавагі. За 1941 г. нямецкія акупанты знішчылі на беларускай зямлі каля 100 тыс. мірных жыхароў, спалілі 120 вёсак разам з 3945 іх жыхарамі.

У 1942 г. забойствы і катаванні мірнага насельніцтва Бе ларусі пабылі сістэмны характар. За акрэслепы перыяд акупанты спалілі 772 вёскі, разам з 46 992 жыхарамі. Беларуская зямля ў час вайны была пакрыта густой сеткай лагераў смерці, дзе за гады варожага панавання было знішчана звыш мільёна савецкіх ваеннапалонных і жыхароў Беларусі. Для яўрэйскага насельніцтва былі створаны гета. Яны сталі месцам масавай бойні, дзе загінулі сотні тысяч яўрэяў.

З набліжэннем лініі фронту да Беларусі акупанты ўзмацнілі расправу над насельніцтвам, вывозілі ў рэйх тэхналагічнае абсталяванне і сыравіну. 7 верасня 1943 г. нямецкая армія атрымала загад ператварыць тэрыторыю, якую яна пакідае, у "зону пустыні". У загадзе, у прыватнасці, гаварылася: "Усе без выключэння дамы неабходна паліць, печы ў дамах падрываць з дапамогай ручных гранат. Калодзежы прыводзіць у непрыгоднасць шляхам знішчэння пад'ёмных прыстасаванняў, а таксама кідаючы ў іх нечыстоты. Стагі саломы і сена, а заадно ўсялякага роду запасы паліць, сельскагаспа-дарчыя машыны і тэлеграфныя слупы падрываць, паромы, лодкі тапіць". Адступаючы, нямецкія войскі з педантычнасцю выконвалі гэты загад. І, як вынік, у 1943 г. акупанты спалілі 2653 вёскі разам з 84 188 жыхарамі. Асабліва цярпелі ад ворага прыфрантавыя раёны.

За перыяд нямецкага генацыду на Беларусі гарадское насельніцтва рэспублікі страціла звыш 1063 тыс. жыхароў, беларуская вёска – 445594 мірных жыхароў, 155 594 з якіх згарэлі разам з 5454 вёскамі. На беларускай зямлі нямецкія акупанты закатавалі звыш 810 тыс. савецкіх ваеннапалонных.

Значныя страты ў вайне супраць СССР патрабавалі ад Германіі вялікіх падмацаванняў для дзеючай арміі. Кіраўніцтва рэйха выкарыстоўвала працоўныя рэсурсыакупіраваных тэрыторый, у тым ліку і Беларусі, у якасці рабочай сілы для прамысловасці і сельскай гаспадаркі Германіі. Працэс гэты пачаўся з канца 1941 г., але буйныя памеры набыў на пачатку 1943 г. Дастаткова адзначыць, што толькі гаспадарчая інспекцыя групы армій "Цэнтр" і генеральнай акругі "Беларусь" штодзённа накіроўвалі на працу ў рэйх 500-1000 рабочых. Усяго за гады вайны нямецкія акупацыйныя ўлады накіравалі на работы ў Германію звыш 400 тыс. жыхароў Беларусі, з якіх прымусовым шляхам былі накіраваны каля 380 тыс. чалавек.

4 Калабаранцкія арганізацыі і іх дзейнасць.

Калабарацыяністы (ад франц. collaboration-супрацоўнітцтва) - асобы, якія

супрацоўнічалі з акупацыйнымі ўладамі. У гістарыяграфіі заходнееўрапейскіх краін і ЗША дзейнасць калабарацыяністаў класіфікуецца як палітычнае, ідэалагічнае і ваеннае супрацоўніцтва з акупантамі. Айчынная гістарыяграфія разглядае калабарацыю як здраду сваёй радзіме і пераход на шлях супрацоўніцтва з ворагам. Такім чынам, згодна з крытэрыямі айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, да калабарацыяністаў на Беларусі можна аднесці супрацоўнікаў інстытутаў мясцова-га самакіравання і паліцыі, у іх ліку Беларускай народнай самапо-мачы (БНС), Беларускага корпуса самааховы (БКС), Саюза беларускай моладзі (СБМ). Беларускай цэнтральнай рады (БЦР) і Беларускай краёвай абароны (БКА). Па розных звестках, калабарацыянісцкі рух на Беларусі налічваў 80-100 тыс. чалавек, значная колькасць з якіх была далучана да яго акупантамі і іх памагатымі шляхам прымусу.

Беларуская народная самапомач была створана 22 кастрычніка 1941 г. па загаду генеральнага камісара Беларусі В. Кубэ. Ствараючы Беларускую народную самапомач, нямецкія акупацыйныя ўлады хацелі паказаць пэўным колам мясцовага насельніцтва, шго на Беларусі пачалося будаўніцтва нацыянальнага інстытута самакіравання.

Кіруючым органам Беларускай ыароднай самапомачы з'яўлялася Цэнтральная рада, якой падпарадкоўваліся акруговыя, раённыя і валасныя аддзелы. Склад Цэнтральнай рады БНС зацвярджаў В. Кубэ.

Акруговыя і раённыя праўленні, а таксама старшыні валасных аддзелаў прызначаліся адпаведнымі кіраўнікамі мясцовай нямецкай адміністрацыі.Практычна БНС займалася вырашэннем толькі сацыяльных пытанняў: зборам грашовых і матэрыяльных каштоўнасцяў, прадуктаў харчавання і вопраткі, аказвала матэрыяльную дапамогу пацярпелым ад вайны. Напачатку такая дзейуасць БНС у пэўнай ступені адпавядала інтарэсам германскіх акупацыйных уладаў. Але паступова Беларуская народная самапомач ператварылася ў палітычны рух.

У сакавіку 1943 г. на з'ездзе Цэнтральнай рады і акруговых кіраўнікоў БНС быў выпрацаваны мемарандум, які патрабаваў ад нямецкіх уладаў аўтаноміі Беларусі і стварэння беларускага ўрада і беларускага войска. Падкрэслівалася, што "ўрад абвесціць аддзяленне Беларусі ад СССР і аб'явіць яму вайну, як ворагу беларускага народа".

Падобныя дзеянні кіраўніцтва БНС не спадабаліся нямецкай адміністрацыі. У выніку кіраўнік БНС І. Ермачэнка быў зняты з пасады і высланы з Беларусі. Яго месца заняў В. Іваноўскі. Паводле распараджэння германскіх уладаў ад 18 сакавіка 1943 г., дзейнасць БНС у далейшым абмяжоўвалася толькі аховай здароўя і матэрыяльнай дапамогай насельніцтву. У чэрвені 1943 г. Беларуская народная самапомач была рэарганізавана ў Беларускую самапомач, дзейнасць якой была абмежавана зборам ахвяраванняў, вярбоўкай новых членаў.

Асаблівая ўвага з боку нямецкіх акупацыйных уладаў і кіруючых колаў калабарацыі надавалася стварэнню Беларускага корпуса самааховы (БКС), які пачаў фарміравацца летам 1942 г., як вайсковая структура беларускіх калабарацыяністаў. Гэта была ініцыятыва генеральнага камісара Беларусі В.

Кубэ. У афіцыйным пасланні В. Кубэ да старшыні БНС І. Ермачэнкі ад 29 чэрвеня 1942 г. адзначалася: "Вы павінны падрыхтаваць са сваімі супрацоўнікамі зварот да беларускага насельніцтва з заклікам да ўступлення мужчынскага насельніцтва ў беларускі вольны корпус самааховы".

Практычная работа па арганізацыі БКС даручалася вайсковай камісіі, якая была ўтворана загадам І. Ермачэнкі. Адпаведныя камісіі былі арганізаваны і ў акругах генеральнага камісарыята "Беларусь". Планавалася стварыць у кожным раёне адзінкі БКСад роты да батальёна, усяго 3 дывізіі. І. Ермачэнка, які быў прызначаны камандуючым БКС,і яго паплечнікі разгарнулі актыўную дзейнасць.

Былі арганізаваны курсы па падрыхтоўцы афіцэраў-беларусаў, праводзілася шырокая прапагандысцкая кампанія. Германскія акупацыйныя ўлады не бачылі ў БКСнейкай баяздольнай узброенай сілы для барацьбы супраць партызан і Чырвонай Арміі. Створаныя фарміраванні самааховы так і не былі ўзброены немцамі належным чынам. Усяго ж з чэрвеня 1942 па красавік 1943 гг. было створана 20 батальёнаў самааховы. У выніку слабага ўзбраення атрады БКС былі небаяздольнымі і лёгка разганяліся партызанамі.

Восенню 1942 г. цікавасць немцаў да БКС пачала слабець. Замест гэтаіа яны вырашылі стварыць беларускія паліцэйскія батальёны на чале са сваім камандным складам. Вясной 1943 г. германскія ўлады наогул расфарміравалі атрады БКС. Актыўную пазіцыю займалі кіруючыя колы калабарацыі ў справе ажыццяўлення прагерманскай маладзёжнай палітыкі. 22 чэрвеня 1943 г. у Мінскім гарадскім тэатры адбылося ўрачыстае пасяджэнне, на якім было аб'яўлена аб стварэнні Саюза беларускай моладзі. На ім прысутнічалі В. Кубэ і іншыя вышэйшыя кіра ўнікі нямецкай акупацыйнай адміністрацыі. На гэтым пасяджэнні былі прыняты статут і праграма СБМ, зацверджаныя пасля гаўляйтэрам Беларусі.

Вышэйшым кіруючым органам СБМ з'яўляўся Цэнтральны штаб на чале з М. Ганько і Н. Абрамавай, які знаходзіўся да ліпеня 1944 г. у Мінску, а потым перабраўся ў Берлін. Пры штабе было 4 аддзелы, у тым ліку і "Працоўная група" па вярбоўцы і адпраўцы моладзі на работу ў Германію. На месцах былі створаны акруговыя і раённыя штабы СБМ.

Дзейнасць гэтай маладзёжнай арганізацыі вызначалі нямецкія акупацыйныя ўлады: выхаванне праваднікоў германскай палітыкі, падрыхтоўка беларускай моладзі для працы на ваенных заводах Германіі, служба ў ваенна-дапаможных чао цях вермахта. Члены арганізацыі насілі спецыяльную форму, мелі свой друкаваны часопіс "Жыве Беларусь" і інш. Саюз беларускай моладзі знаходзіўся пад кантролем аддзела моладзі генеральнаг а камісарыята "Беларусь".

СБМ налічваў у 1944 г. 12 635 чалавек, з якіх, па розных звестках, ад 3,5 да 5 тыс. былі накіраваны на работу і вучобу ў Германію. У снежні 1943 г., калі быў вызвалены ад нямецкіх акупантаў шэраг раёнаў Усходняй Беларусі, акупацыйныя ўлады аб'явілі аб стварэнні дапаможнага дарадчага органа нямецкага кіравання на Беларусі – Беларускай Цэнтральнай Рады. У БЦР акупанты бачылі сродак мабілізацыі сіл

беларускага народа для барацьбы з партызанамі і Чырвонай Арміяй і больш эфектыўнага выкарыстання беларускай эканомікі ў сваіх інтарэсах. Пэўныя колы беларускай калабарацыі, з свайго боку, спадзяваліся стварыць беларускую дзяржаўнасць пад пратэктаратам Германіі.

У склад БЦР уваходзіла 14 чалавек. Яе кіруючым органам быў прэзідыум, у які ўваходзілі Р. Астроўскі (прэзідэнт), С. Кандыбовіч, Ф. Кушаль, У. Родзька, Ю. Сабалеўскі, М. Шкялёнак. Структурна БЦР складалася з 12 аддзелаў.

Фармальна германскія акупацыйныя ўлады перадалі ў сферу падпарадкавання БЦР справы сацыяльнага забеспячэння, культуры, адукацыі і Беларускай краёвай абароны, хаця на месцах усе гэтыя накірункі па-ранейшаму знаходзіліся ў руках германскай акупацыйнай адміністрацыі.

Адным з найбольш значных мерапрыемстваў БЦР быў II Усебеларускі кангрэс, які адбыўся 27 чэрвеня 1944 г. у Мінску. Ён быў скліканы па прапанове Р. Астроўскага з дазволу генеральнага камісара Беларусі К. фон Готберга. Удзельнікі II Усебеларускага кангрэса накіравалі прывітальную тэлеграму А. Гітлеру.

Калі ўлічыць ваенна- палітычнае становішча ў 1944 г., то можна зрабіць выснову, што II Усебеларускі кангрэс больш нагадваў спектакль, які паставілі акупацыйныя ўлады разам з артыстамі з БЦР.

30 чэрвеня 1944 г. большасць членаў БЦР пакінула Мінск і накіравалася ў Кёнігсберг, а адтуль у Берлін. З'яўленне Беларускай краёвай абароны (БКА) звязана з загадам гаўляйтэра фон Готберга ад 23 лютага 1944 г., у якім гаварылася: "На прапанову Прэзідэнта Беларускай Цэнтральнай Рады ад 18.02.44 г. загадваю аб утварэнні Беларускай краёвай абароны для барацьбы супраць бальшавізму". Аналагічны загад БЦР, якая называла сябе беларускім урадам, аб стварэнні БКА быў выдадзены 6 сакавіка 1944 г.

Аснову БКА складала прымусова мабілізаванае мужчынскае насельніцтва 1908-1924 гг. нараджэння. За няяўку ў вызначаны тэрмін прадугледжвалася смяротная кара. У выніку праведзенай мабілізацыі Беларуская краёвая абарона на канец красавіка-май 1944 г. складала 45 батальёнаў (39 стралковых і 6 сапёрных), якія налічвалі прыкладна каля 30 тыс. чалавек. Але, як сведчыць хроніка Беларускай Цэнтральнай Рады, пераважная большасць структур БКА ў гэты час знаходзілася толькі ў стадыі арганізацыі. Шэфам галоўнага камандавання БКА быў прызначаны маёр Ф. Кушаль, а яго намеснікам – лейтэнант В. Мікула.

Галоўная мэта БКА – барацьба разам з паліцыяй супраць партызан. Але створаныя батальёны не апраўдалі надзей немцаў. Большасць беларускага насельніцтва адмоўна ставілася да ідэй стварэння БКА. Многія з тых, каму пагражала мабілізацыя, уцякалі ў лясы да партызан. Пад уплывам агітацыі партызан і падпольшчыкаў адбылося масавае дэзерцірства вайскоўцаў з пераходам іх са зброяй да партызан. Відаць, таму немцы перасталі забяспечваць створаныя батальёны зброяй і ваеннай амуніцыяй. Фарміраванні БКА выкарыстоўваліся ў асноўным для аховы складоў і іншых гаспадарчых мэт.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў частка фарміраванняў БКА апынулася ў Германіі. Калі ў 1945 г. у Германіі кіраўнікі БЦР пачалі ствараць брыгаду СС "Беларусь", у яе ўступіла 1094 чалавекі. Палову з іх склалі былыя вайскоўцы з БКА. Перамога Чырвонай Арміі на франтах вайны, актыўная дзейнасць беларускіх партызан і падпольшчыкаў, патрыятызм і разважлівасць насельніцтва рэспублікі не дазволілі нямецкім акупантам і мясцовай калабарацыі ажыццявіць у поўнай меры свае мэты на беларускай зямлі.

Тэма 55 Барацьба супраць фашісцкіх захопнікаў на акупіраванай тэрыторыі. Вызваленне Беларусі.

1 Стварэнне антыфашысцкага падполля.

На захопленай ворагам тэрыторыі ствараліся сетка падпольных цэнтраў, арганізацый і груп. Важную ролю ў станаўленні і ўмацаванні падполля і партызанскага руху адыгралі першыя падпольныя партыйныя камітэты: Пінскі, Гомельскі і Мінскі абкомы, Мінскі і Гомельскі гаркомы, Багушэўскі, Барысаўскі, Ельскі, Лоеўскі, Петрыкаўскі, Рагачоўскі, Расонскі, Рудзянскі, Чэрыкаўскі, Чырвонаслабодскі і іншыя райкомы.

Трагічнай старонкай ў гісторыю барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў увайшло Мінскае падполле, арганізатарамі якога былі І.К. Кавалёў, І.П. Казінец, У.С. Амельянюк, І.І. Матусевіч і інш. З першых дзён акупацыі Мінска, які гітлераўцы ахрысцілі “страляючым горадам”, падпольшчыкі ажыццяўлялі дыверсіі на чыгуначным вузле, прадпрыемствах і ў фашысцкіх установах, збіралі і перадавалі цераз сувязных у партызанскія атрады зброю, медыкаменты, звесткі аб руху нямецкіх ваенных эшалонаў, планы размяшчэння ваенных аб’ектаў у горадзе і г.д.

У мінскім падполлі змагалася звыш 9 тыс. чалавек. Толькі ў другой палове1943 г. яны правялі больш за50 дыверсій, у тым ліку дыверсійную акцыю, у выніку якой быў знішчаны генеральны камісар Беларусі В. Кубэ. Непасрэднымі выканаўцамі былі А. Мазанік і М. Осіпава.

Змагаліся з ворагам падпольшчыкі Магілёва, Віцебска, Оршы, Жлобіна, Брэста, Гродна і іншых гарадоў і пасёлкаў рэспублікі. У ноч на 30 ліпеня 1943 г. на Асіповіцкім чыгуначным вузле Ф. Крыловіч узарваў дзвюма магнітнымі мінамі эшалон з гаручым, у выніку чаго ўзнік пажар, які знішчыў 4 эшалоны, у тым ліку 1 з танкамі “Тыгр”, 63 вагоны са снарадамі, авіябомбамі, мінамі, 31 цыстэрну з гаручым. Былі таксама пашкоджаны вугальны склад, блокпост, дэпо. Гэта– адна з найбуйнейшых дыверсійных аперацый другой сусветнай вайны.

У рабоце сярод насельніцтва вялікае значэнне надавалася сродкам масавай інфармацыі і распаўсюджванню цэнтральных газет, зводак Саўінфармбюро, выданню падпольных газет і лістовак. У маі 1942 г. мінскія падпольшчыкі выпусцілі першы нумар газеты “Звязда”. У пачатку1943 г. было адноўлена выданне “Звязды” як цэнтральнага органа КП(б)Б. Усяго ў акупіраванай Беларусі выдавалася больш за 170 падпольных часопісаў і газет.

Усяго ў Беларусі дзейнічала пад кіраўніцтвам падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый каля 70 тыс. падпольшчыкаў.

2 Разгортванне партызанскага руху.

Ужо на пачатку нямецкай акупацыі Беларусі ў чэрвені 1941 г. пачалі дзейнічаць першыя партызанскія атрады. Сярод арганізатараў былі Ц. П. Бумажкоў, В. З.Корж, Ф. І. Паўлоўскі і інш.

26 чэрвеня 1941 г. першы сакратар Акцябрскага РК КП(б)Б Гомельскай вобласці Ц.П. Бумажкоў і ўпаўнаважаны Наркамата нарыхтовак па Акцябрскаму раёну Ф.І. Паўлоўскі стварылі партызанскі атрад "Чырвоны Кастрычнік". Сумесна з часцямі Чырвонай Арміі ён вёў баі з нямецкімі войскамі на р. Пціч.

За гераізм і ўмелае кіраўніцтва партызанскай барацьбой камандзіру атрада Ц. П. Бумажкову і камісару Ф. І. Паўлоўскаму, першым з беларускіх партызан, 6 жніўня 1941 г. было прысвоена званне Герояў Савецкага Саюза.

Нягледзячы на вышэй прыгаданыя факты, колькасныя памеры і баяздольнасць антыфашысцкага супраціўлення на Беларусі ў 1941 г. была нязначнай. Зімой 1941 г. колькасць партызан не перавышала 3 тыс. чалавек. Насельніцтва Беларусі на працягу першых месяцаў нямецкай акупацыі было ў разгубленасці.

Вялікі ўплыў на ўздым народнага руху супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў аказала бітва пад Масквой. Контрнаступленне савецкіх войск пад Масквой перайшло ў агульнае наступленне па ўсяму фронту і працягвалася да красавіка 1942 г. У канцы 1941 г. – пачатку 1942 г. савецкія войскі выйшлі да граніцы Беларусі, і з імі на Віцебскім напрамку ў непасрэднае ўзаемадзеянне ўступілі партызанскія атрады Я.З. Захарава, Д.Ф. Райцава, М.П. Шмырова і інш.

У выніку сумесных дзеянняў часцей Чырвонай Арміі Калінінскага фронту і партызанскіх атрадаў быў вызвалены тракт Усвяты–Сураж і ўтвораны 40-кіламетровы праход у лініі нямецкага фронту (“Суражскія”, альбо “Віцебскія”, вароты). Цераз іх на акупіраваную ворагам тэрыторыю з Вялікай зямлі накіроўваліся арганізатарскія і дыверсійныя групы, узбраенне, боепрыпасы і інш.

Для кіраўніцтва ўсімі партызанскімі сіламі краіны пастановай Дзяржаўнага Камітэта Абароны ад 30 мая 1942 г. пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання быў створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху, які ўзначаліў сакратар ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнка. Некалькі пазней былі арганізаваны Беларускі, Украінскі і іншыя штабы партызанскага руху.

Удасканальвалася і аператыўнае кіраўніцтва падпольнымі арганізацыямі і партызанскімі фарміраваннямі. У савецкім тыле была створана спецыяльная школа (Асобы беларускі збор) для падрыхтоўкі падпольшчыкаў і партызан.

3 Партызанскія зоны. Партызанскія рэйды. “Рэйкавая вайна”.

У ходзе барацьбы з ворагам партызанскія атрады і брыгады вызвалілі тысячы населеных пунктаў, у тым ліку шэраг райцэнтраў. На вызваленай тэрыторыі ўтварыліся партызанскія зоны. Першыя з іх на Беларусі ўзніклі ўвосень 1941 г. У канцы 1943 г. партызаны кантралявалі ўжо каля 58 % тэрыторыі рэспублікі. Існавала больш за 20 партызанскіх зон: Акцябрска-Любанская, Барысаўска-Бягомльская, Клічаўская, Полацка-Лепельская, Расонска-Асвейская, Івянецка-Налібоцкая, Сенненска-Аршанская, Суражская і інш.

Значны ўрон акупантам наносілі партызанскія рэйды, якія не толькі дэзарганізоўвалі тыл праціўніка, але і садзейнічалі развіццю партызанскага руху.

Рэйды партызанскіх фарміраванняў займалі важнае месца ў разгортванні партызанскага руху ў заходніх абласцях Беларусі. Да зімы 1943/44 г. Баявымі рэйдамі выйшлі ў заходнія вобласці рэспублікі 12 брыгад, 14 асобных атрадаў, больш за 7 тыс. партызан. Партызанскія фарміраванні замацаваліся ў Баранавіцкай, Брэсцкай, Вілейскай, Беластоцкай абласцях і разам з мясцовымі партызанамі ўтварылі ўздоўж заходніх граніц Беларусі амаль суцэльны партызанскі фронт.

Значнай па маштабах і эфектыўнай па выніках была“рэйкавая вайна” – масавы падрыў чыгунак з мэтай дэзарганізацыі ваенных перавозак для гітлераўскай арміі. Першы этап яе пачаўся ў час контрнаступлення савецкіх войск пад Курскам і працягваўся з3 жніўня да сярэдзіны верасня 1943 г. У другой палове верасня – кастрычніку 1943 г., калі Чырвоная Армія ўступіла на тэрыторыю Беларусі, прайшоў другі этап “рэйкавай вайны”. У выніку двух этапаў перавозкі для групы армій “Цэнтр” значна скараціліся, да таго ж праціўнік вымушаны быў павялічыць колькасць дывізій для аховы сваіх камунікацый. Трэці этап“рэйкавай вайны”, які праводзіўся напярэдадні і ў ходзе вызвалення Беларусі, таксама меў важнае аператыўна-стратэгічнае значэнне.

4 Дзейнасць Арміі Краёвай на тэрыторыі Беларусі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі14 тыс. чалавек польскай Арміі Краёвай (АК – акаўцаў). Кіраўніцтва Польшчы ў эміграцыі ў Лондане, а таксама польскія буржуазныя партыі, якія дзейнічалі ў падполлі, афіцэрства і каталіцкае духавенства расцэньвалі дзеянні СССР і Германіі як несправядлівыя і агрэсіўныя. Яны ставілі сваёй мэтай падняць народ на ўсеагульнае паўстанне, аднавіць Польскую дзяржаву і вярнуць ёй тэрыторыі ў межах да 1 верасня 1939 г., у тым ліку тэрыторыі Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Літвы (Віленскага краю). Ужо з восені 1939 г. на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі дзейнічалі польскія антысавецкія падпольныя арганізацыі, якія накоплівалі зброю, распаўсюджвалі антысавецкую літаратуру, выступалі за аднаўленне “Другой Рэчы Паспалітай” (1918–1939) і разлічвалі на дапамогу ўрадаў Англіі і ЗША.

Цэнтр камандавання Арміяй Краёвай знаходзіўся ў Варшаве, падпарадкоўваўся ўраду У. Сікорскага ў Лондане. Мясцовае насельніцтва

заходніх абласцей Беларусі савецкіх партызан называла “чырвонымі”, удзельнікаў Арміі Краёвай – “белымі” альбо легіянерамі, польскіх партызан, якія падпарадкоўваліся камандаванню Войска Польскага і Чырвонай Арміі, – “зялёнымі” партызанамі. Акрамя нешматлікіх сутычак, адкрытай барацьбы з савецкімі партызанамі ў 1941 г. – пачатку 1943 г. польскія ваенныя фарміраванні не вялі, іншы раз нават сябравалі з беларускімі партызанамі, ратавалі палонных, раненых.

Пасля разрыву адносін паміж СССР і Польшчай у красавіку 1943 г. становішча змянілася. Армія Краёва прытрымлівалася лозунга “двух ворагаў” і вяла барацьбу на два фронты – супраць немцаў і супраць бальшавікоў. У студзені 1945 г. Армія Краёва была афіцыйна распушчана. Дзеянні акаўцаў у Беларусі працягваўся аж да пачатку 50-х гадоў, пакуль яны не былі вылаўлены савецкімі сілавымі структурамі і аддадзены пад суд.

5 Пачатак вызвалення Беларусі ў канцы 1943.

Разгром нямецкіх войскаў летам 1943 г. на Курска-Арлоўскай дузе дазволіў Чырвонай Арміі перайсці ў стратэгічнае наступленне і ўжо ў верасні 1943 г. распачаць шырокамаш-табную аперацыю вызвалення Украіны і Беларусі. 23 верасня 1943 г. часці Цэнтральнага фронту фарсіравалі Днепр і вызвалілі ад нямецкіх акупантаў першы раённы цэнтр Палескай вобласці – гарадскі пасёлак Камарын. А праз некалькі дзён злучэнні 65-й арміі на ўчастку Карповічы-Уборкі фарсіравалі раку Сноў і з баямі 27 верасня вызвалілі раёны цэнтр Церахоўка Гомельскай вобласці.

У ходзе правядзення Смаленскай аперацыі войскі Заходняга і Бранскага франтоў 26 верасня ўступілі на зямлю Беларусі і вызвалілі раённы цэнтр Хоцімск Магілёўскай вобласці. Праз два дні ў час цяжкіх баёў войскі 49-й арміі фарсіравалі раку Сож і вызвалілі г. Мсціслаў. 29 верасня войскі 50-й арміі Бранскага фронту авалодалі г. Крычавам. 1 кастрычніка былі вызвалены райцэнтры Магілёўскай вобласці Чэрыкаў і Краснаполле.

Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання паставіла задачу перад войскамі трох франтоў: Калінінскага, Заходняга і Цэнтральнага (апошні 20 кастрычніка 1943 г. перайменаваны ў Бсларускі фронт) – разграміць нямецкую армейскую групоўку "Цэнтр" і вызваліць ад ворага ўсю тэрыторыю Беларусі. У адпаведнасці з дырэктывай Стаўкі Калінінскаму фронту прадпісвалася нанесці ўдар у напрамку Віцебск-Полацк-Даўгапілс, маючы на мэце авалоданне сталіцай Латвіі. Войскі Заходняга фронту павінны былі нанесці ўдар у напрамку Орша-Магілёў, вызваліць гэтыя гарады і ў далейшым працягваць наступленне на Барысаў, Маладзечна, авалодаць Вільнюсам. Беларускаму фронту ставілася задача наступаць на Жлобін, Бабруйск і ў далейшым вызваліць Мінск.

Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання зыходзіла з меркавання, што вермахт у летняй кампаніі 1943 г. панёс вялікія страты, канчаткова дэмаралізаваны і таму не зможа стрымаць пераможнага наступлення Чырвонай Арміі на беларускім напрамку. Аднак вермахт восенню 1943 г. паказаў, што яшчэ не страціў сваёй баяздольнасці. 6 кастрычніка 1943 г.

пачалося наступленне савецкіх войскаў на Віцебскім напрамку. Ужо на другі дзень часці 3-й і 4-й савецкіх армій вызвалілі ад немцаў Невель і 320 іншых населеных пунктаў. Войскі Калінінскага фронту атрымалі плацдарм для наступлення на Віцебск і Полацк. Аднак замацаваць свой поспех яны не здолелі. Германскае камандаванне перакінула ў раён Гарадка з іншых участкаў фронту 7 пяхотных і 1 танкавую дывізіі. Наступленне войскаў Калінінскага фронту было спынена. У дырэктыве Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакаман-давання ад 16 кастрычніка 1943 г. адзначалася: "Войскі Калінінскага фронту сваёй задачы не выканалі. Да 10 кастрычніка г. Віцебскам не авалодалі".

Гарадоцкая наступальная аперацыя была адноўлена толькі ў снежні 1943 г. Гарадок быў вызвалены 24 снежня 1943 г. часцямі 11-й гвардзейскай і 43-й армій. Страты войскаў Калінінскага фронту на Віцебскім напрамку ў кастрычніку-снежні 1943 г. склалі 169 тыс. чалавек.

У асенне - зімовай кампаніі 1943-1944 гг. войскі Беларускага фронту (камандуючы генерал арміі К. К. Ракасоўскі) удала правялі Гомельска-Рэчыцкую і Калінкавіцка-Мазырскую аперацыі, у выніку якіх 18 лістапада 1943 г. быў вызвалены горад Рэчыца, 26 лістапада – Гомель і 14 студзеня 1944 г. – Мазыр. На поўдні рэспублікі войскі Беларускага фронту прасунуліся больш як на 200 кіламетраў у глыб варожай абароны ў паласе шырынёй звыш 100 кіламетраў. У той самы час савецкія войскі вызвалілі яшчэ некалькі раёнаў Віцебскай і Магілёўскай абласцей.

6 Аперацыя "Баграціён".

У 1944 г. пачаўся завяршальны этап Вялікай Айчыннай вайны. Адной з буйнейшых падзей гэтага этапа з'явілася Беларуская наступальная аперацыя, якая ўвайшла ў гісторыю пад кодавай назвай"Баграціён".

Да пачатку бітвы гітлераўцы сканцэнтравалі на лініі фронту найбольш буйную групоўку сваіх войск (група армій "Цэнтр" і на флангах часці груп "Поўнач", "Паўночная Украіна") колькасцю 1,3 млн чалавек, 9500 гармат і мінамётаў, 900 танкаў і штурмавых гармат, 1350 самалётаў. Створаную ў Беларусі глубокаэшаланіраваную сістэму абароны, якая прыкрывала галоўныя стратэгічныя напрамкі (усходне-прускі і варшаўска-берлінскі), гітлераўцы называлі "Фатэрлянд" (Айчына), паказваючы, што тут іх армія адстойвае рубяжы самой Германіі.

Савецкае камандаванне, улічваючы важнасць і складанасць задачы, прыняло ўсе неабходныя меры для забеспячэння поспеху аперацыі па вызваленні Беларусі: на працягу красавіка – мая1944 г. быў дэталёва распрацаваны план аперацыі "Баграціён"; праведзена ўсебаковая падрыхтоўка да наступлення – савецкія войскі былі аб'яднаныя ў чатыры фронты, забяспечаны ў дастатковай ступені тэхнікай, боепрыпасамі, гаручым, харчаваннем. Раніцай 23 чэрвеня 1944 г. пачалася бітва за поўнае вызваленне Беларусі. У наступленне перайшлі войскі 1-га Прыбалтыйскага (камандуючы І.Х. Баграмян), 2-га Беларускага (Г.Ф. Захараў) і 3-га Беларускага (І.Д. Чарняхоўскі) франтоў. На другі дзень да іх далучыліся войскі 1-га Беларускага фронту (камандуючы К.К. Ракасоўскі). У аперацыі ўдзельнічалі

таксама Дняпроўская ваенная флатылія, авіяцыя далёкага дзеяння і процівапаветранай абароны, першы асобны французскі добраахвотніцкі знішчальны авіяполк “Нармандыя-Нёман”.

Актыўны ўдзел прымалі партызанскія злучэнні. Каардынавалі дзеянні франтоў маршалы А.М. Васілеўскі і Г.К. Жукаў.

Войскі 2-га Беларускага фронту, фарсіраваўшы водныя перашкоды, 28 чэрвеня штурмам авалодалі Магілёвам. Тады ж была завершана ліквідацыя варожых войск, акружаных пад Бабруйскам(Бабруйскі кацёл). Гітлераўцы, пацярпеўшы паражэнні на галоўнай абароннай паласе, спрабавалі замацавацца на рубяжы Бярэзіны. Аднак іх спроба была сарвана войскамі3-га Беларускага фронту, якія фарсіравалі Бярэзіну і 1 ліпеня вызвалілі Барысаў.

Разгарнуліся баі за сталіцу Беларусі – Мінск. Баі за вызваленне Мінска пачаліся на досвітку 3 ліпеня і паспяхова завяршыліся да канца таго ж дня. Першым уварваўся ў Мінск танк камандзіра ўзвода Д.Г. Фролікава. У баях за горад вызначыліся многія байцы 2-га Тацынскага гвардзейскага танкавага корпуса генерала А.С. Бурдзейнага, 1-га гвардзейскага танкавага корпуса генерала М.Ф. Панова, 5-й гвардзейскай танкавай арміі маршала бранятанкавых войск П.А. Ротмістрава, 3-й арміі генерала А.В. Гарбатава, 31-й арміі генерала В.В. Глаголева і інш.

Каля Мінска ў акружэнні апынулася больш чым 100-тысячная групоўка ворага (“Мінскі кацёл”). Гітлер звярнуўся да камандавання групоўкі з загадам, у якім патрабаваў зрабіць усё, каб выйсці з акружэння. Аднак фашысцкім войскам не ўдалося вырвацца з акружэння: 70 тыс. было забіта, 30 тыс. узята ў палон.

У той час як частка савецкіх войск разам з партызанамі заканчвалі ліквідацыю акружанай групоўкі праціўніка пад Мінскам, галоўныя сілы трох беларускіх франтоў рухаліся на захад. Былі вызвалены 4 ліпеня– Полацк, 5 – Маладзечна, 16 – Гродна, 28 – Брэст. Такім чынам, да канца ліпеня 1944 г. нямецка-фашысцкія захопнікі былі поўнасцю выгнаны з беларускай зямлі.

Разгром нямецка-фашысцкіх войск у Беларусі ўвайшоў у гісторыю як адна з важнейшых бітваў Вялікай Айчыннай і другой сусветнай вайны. Паражэнне гітлераўцаў на Беларусі ў1944 г. многія гісторыкі ацэньваюць як катастрофу вермахта. Сапраўды, бітва за Беларусь у 1944 г. стала адной з буйнейшых ваенных катастроф Германіі.

У ходзе аперацыі “Баграціён” савецкія войскі разбілі 28 дывізій групы “Цэнтр” з 38. Агульныя страты гітлераўцаў у Беларусі летам 1944 г. перавысілі тыя, якія панеслі яны ў бітве на Волзе: было забіта звыш 381 тыс. і ўзята ў палон 158 тыс. салдат, афіцэраў і генералаў. За месяц наступлення савецкія войскі ачысцілі ад ворага тэрыторыю працягласцю з поўначы на поўдзень больш як на 400 км і з усходу на захад больш як на 500 км. У выніку беларускай аперацыі была вызвалена не толькі ўся Беларусь, але і большая частка Літвы, частка Латвіі, усходнія раёны Польшчы. Савецкія войскі падышлі да граніц Усходняй Прусіі, што стварыла спрыяльныя ўмовы для вызвалення шэрага краін Еўропы і разгрому фашысцкай Германіі.

Тэма 56. Пераход да мірнага будаўніцтва.

1 Страты ў народнай гаспадарцы і культуры Беларусі. Пачатак аднаўлення.

СССР у цэлым і БССР у прыватнасці ўнеслі важкі ўклад у збаўленне свету ад пагрозы фашысцкага панавання. Але перамога дасталася дарагой цаной. СССР страціў каля 1/3, а БССР больш паловы нацыянальнага багацця. Нічым нельга вымераць чалавечыя страты. А на Беларусі загінуў амаль кожны трэці яе жыхар.

Па агульнаму ўзроўню развіцця эканоміка рэспублікі была адкінута да ўзроўню 1928 г., поўнасцю альбо часткова разбураны гарады і больш 9000 сельскіх населеных пунктаў. Пасля вызвалення ўрад БССР запатрабаваў ад Германіі выплаты рэпарацый на суму 1 млрд. 500 млн. долараў ЗША, што складала каля 10% панесеных рэспублікай страт. БССР змагла атрымаць толькі нязначную частку запатрабаваных сродкаў.

Аднаўленне народнай гаспадаркі пачалося адразу пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў усходніх раёнаў рэспублікі (восень 1943 г.) і працягвалася да пачатку 1950 г. Адраджэнне разбуранай вайною гаспадаркі вызначылася як працяг адкрэсленага яшчэ XVIII з'ездам кампартыі (1939) курсу на завяршэнне пабудовы сацыялізму і паступовы пераход да камуністычнага грамадства. Гэтаму тэзісу надавалася вялікае прапагандысцкае значэнне. Ён закліканы быў стаць сродкам мабілізацыі працоўных намаганняў народа на выкананне грандыёзных заданняў чацвёртай пяцігодкі (1946-1950). Умовы былі больш складаныя, чым на пачатку 1920-х гг. (памеры разбурэнняў, недахоп рабочых рук, сыравіна). Але змены ў геапалітычным становішчы Беларусі (савецкія войскі ў цэнтры Еўропы, фарміраванне там прасавецкіх урадаў, імкненне прадэман-страваць перавагу сацыялізму) садзейнічалі таму, што ў БССР пачаў імкліва разгортвацца працэс пасляваеннай індустрыялізацыі. Кіраў -ніцтва Савецкага Саюза выкарыстала ў гэтых мэтах рэпарацыі з Германіі ў выглядзе машын, станкоў, абсталявання і нават цэлых заводаў.

У верасні 1946 г. адбылася VIII сесія Вярхоўнага Савета БССР першага склікання, на якой быў прыняты Закон аб плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі на 1946-1950 гг. Новы пяцігадовы план з'яўляўся састаўной часткай агульна-саюзнага плана. Да заканчэння 4-й пяцігодкі прамысловая прадукцыя БССР павінна была не толькі дасягнуць даваеннага ўзроўню, але і перавысіць яго. Істотнай асаблівасцю

пяцігадовага плана стала стварэнне ў рэспубліцы аўтамабілебудавання, выпуск гідратурбін, матацыклаў, веласіпедаў і іншых вырабаў, што было немагчыма без узнаўлення энергетыкі. Планавалася поўнасцю аднавіць БелДРЭС, пабудаваць новыя буйныя электрастанцыі, увесці ў строй шэраг торфапрадпрыемстваў.

2 Пасляваенная індустрыялізацыя.

Эканоміка Беларусі аднаўлялася і развівалася ў першыя пасляваенныя гады як частка народнагаспадарчага комплексу Савецкага Саюза. Развіццё цяжкай індустрыі ў БССР забяспечвалася пераважна за кошт сродкаў саюзнага бюджэту. На ўскраіне Мінска на базе аўтазборачнага завода хуткімі тэмпамі будаваўся аўтамабільны завод па выпуску грузавых машын. І ўжо ў 1947 г. з варот завода выйшлі першыя пяць шасцітонных грузавых аўтамабіляў.

У адпаведнасці з пастановай Савета МіністраўСССР ад 29 мая 1946 г. пачалося будаўніцтва Мінскага трактарнага завода. У 1948 г. навукова-тэхнічны Савет аўтатрактарнай прамысловасціСССРухва-ліў праект колавага трактара, падрыхтаваны групай інжынераў і кан-структараў. У наступным годзе ў эксперыментальным цэху быў сабра-ны першы трактар, а ў лістападзе 1950 г. завод пачаў серыйны вы-пуск трактароў "Кіравец Д-35". Напачатку гэта былі гусенічныя машыны (тралёвачныя і іншыя) для патрэб лясной гаспадаркі. Першыя колавыя трактары "Беларусь" выйшлі з варот завода ў 1953 г. Летам 1947 г. непадалёку ад чыгуначнай станцыі Жодзіна і аўтастрады Мінск-Масква пачалося будаўніцтва завода тарфянога машынабудавання, які ў 1951 г. быў пераўтвораны ў завод дарожных і меліярацыйных машын "Дормаш". Праз 7 год менавіта на базе "Дормаша" і быў створаны Беларускі аўтамабільны завод (БелАЗ) па вытворчасці цяжкавагавых аўтамабіляў.

У 1947 г. далі прадукцыю веласіпедны і інструментальны заводы ў Мінску, лакамабільны завод і металаапрацоўчы камбінат у Магілёве, гомельскі завод "Рухавік рэвалюцыі", швейная фабрыка "Сцяг індустрыялізацыі" ў Віцебску, абутковая фабрыка ім. Калініна ў Мінску, пачала працаваць БелДРЭС.

Беларусь паступова пераўтваралася ў зборачны цэх СССР. Безумоўна, хуткі рост цяжкай нрамысловасці садзейнічаў аднаўленню народнай гаспадаркі. Дзякуючы намаганням усіх рэспублік СССР, прамысловасць Беларусі была адноўлена на даволі высокім тэхнічным і тэхналагічным узроўні. Калі прасачыць за паказчыкамі, то можна заўважыць, што эканамічнае развіццё заходніх абласцей БССР ішло больш хуткімі тэмпамі, чым у цэлым па рэспубліцы. Тут аднаўляліся старыя і будаваліся новыя прадпрыемствы машынабудавання, будаўнічай індустрыі, дрэваапрацоўчай, гарбарнай, абутковай, харчовай і іншых галін. У іх ліку былі Ваўкавыскі цэментны завод, Лідскі завод сельска-гаспадарчага машынабудавання, Мастоўскі фанерны камбінат, шклозавод "Нёман", тонкасуконны камбінат і інш. Ужо ў 1948 г. валавая прадукцыя прамысловасці заходніх абласцей

БССР амаль у 1,5 раза перавысіла даваенны ўзровень, а яе ўдзельная вага ў агульным аб'ёме прадукцыі рэспублікі павялічылася ў 2,5 раза.

Адзначаючы пэўныя поспехі ў аднаўленні і развіцці прамыс-ловасці ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, неабходна падкрэсліць арганізатарскую ролю партыйных камітэтаў у спалучэнні з цвёрдай вытворчай дысцыплінай, што захавалася з ваенных часоў. Нельга таксама адмаўляць і значнасць розных формаўспаборніцтваў: рух за эканомію сыравіны, матэрыялаў, выпуск дадатковай прадукцыі, за калектыўнасць наватарства – пераход ад дасягненняў асобных рабочых да высокапрадукцыйнай працы брыгад, цэхаў, прадпры-емстваў. Энтузіязм адраджэння ўмела выкарыстоўваўся партыйна-савецкім кіраўніцтвам, што дазволіла ў сціслыя тэрміны вырашыць праблемы аднаўлення і развіцця прамысловасці.

Дзякуючы развіццю машынабудавання і металаапрацоўкі прамысловасць рэспублікі ў 1950 г. перавысіла даваенны ўзровень на 20% . Але перакос убок вытворчасці сродкаў вытворчасці прывёў да таго, што ў заняпадзе засталіся традыцыйныя для Беларусі лёгкая, харчовая галіны, прамысловасць будаўнічых матэрыялаў. Абсталяванне прадпрыемстваў азначаных галін фізічна і маральна састарэла, не адпавядала патрабаванням навукова-тэхнічнага прагрэсу. Гэта негатыўна адбівалася на забеспячэнні насельніцтвасамым неабходным.

3 Становішча сельскай гаспадаркі. Адраджэнне калгасна-саўгаснай сістэмы. Калектывізацыя ў Заходніх абласцях БССР.

Складаным было становішча ў сельскай гаспадарцы. Пасяўныя плошчы да пачатку пяцігодкі ў калгасах складалі толькі59% даваеннага ўзроўню, у саўгасах– 70%. Былі прыняты меры па матэрыяльна-тэхнічнаму ўмацаванню сельскай гаспадаркі. За тры пасляваенныя гады калгасы БССР атрымалі 160 тыс. т харчовага збожжа і насення, 122 тыс. коней, 113 тыс. галоў буйнай рагатай жывёлы і інш. У1948 г. Савет Міністраў СССР прыняў рашэнне аб мерах дапамогі сельскай гаспадарцы Беларусі, на падставе якога рэспубліка атрымала 3 тыс. трактараў, 200 збожжакамбайнаў, 2 тыс. трактарных плугоў, 1,2 тыс. трактарных збожжавых сеялак і іншую тэхніку.

У калгасах і саўгасах аднаўляліся пасяўныя плошчы, павялічваліся ўраджайнасць, пагалоўе жывёлы, паляпшалася арганізацыя працы. Сярэднегадавыя тэмпы прыросту вытворчасці збожжа ў чацвёртай пяцігодцы склалі12%, бульбы– 15%, ільновалакна– 36%, малака– 22%. Асноўны цяжар пасляваеннага аднаўлення вёскі вынеслі на сваіх плячах жанчыны, старыя і падлеткі. У 1947 г. працаздольнае насельніцтва вёскі складала 46% (гэта людзі ад 12 да 60 гадоў, у тым ліку жанчыны ад 16 да 60 гадоў– 25%).

У цэлым жа сялянства рэспублікі змагло, нягледзячы на цяжкія ўмовы, дасягнуць пэўных поспехаў. У канцы чацвёртай пяцігодкі агульная пасяўная плошча дасягнула91,4% даваеннай, а пасевы збожжавых– 97,1%. Многія калгасы і саўгасы не толькі дасягнулі, але і перавысілі даваенны ўзровень па колькасці пагалоўя жывёлы і прадукцыйнасці жывёлагадоўлі. Аднак большасць калгасаў былі нерэнтабельнымі і стратнымі.

Буйным недахопам, які адчувальна адбіваўся на эканоміцы калгасаў, было тое, што сродкі ад рэалізацыі дзяржаве сельскагаспадарчай прадукцыі пакрывалі толькі невялікую частку выдаткаў гаспадаркі. Сельскагаспадарчая прадукцыя пастаўлялася дзяржаве па цэнах намнога ніжэйшых яе сабекошту. Асабліва значным быў разрыў паміж дзяржаўнымі закупачнымі цэнамі і сабекоштам прадукцыі жывёлагадоўлі. Малако калгасы павінны былі пастаўляць па цэнах у пяць разоў ніжэйшымі за сабекошт. Яшчэ большай была разніца паміж дзяржаўнымі закупачнымі цэнамі і сабекоштам прадукцыі па мясу. Яна дасягала двух дзесяткаў разоў. Цэны на прадукты жывёлагадоўлі на калгасным рынку былі ў 10-12 разоў вышэйшыя за закупачныя, але ніжэйшымі сабекошту прадукцыі і для калгасаў і саўгасаў, і для сялян. У грамадстве шмат гаварылася аб дапамозе вёсцы. Але, па сутнасці, у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе вынікі развіцця сельскай гаспадаркі былі нездавальняючымі. На пачатку 1950-х гг. паказчыкі развіцця сельскай гаспадаркі БССР былі ніжэй, чым у першы пасляваенны 1946 год. Яна аказалася ў крызісным стане не толькі ў выніку ваенных разбурэнняў, але і страт, нанесеных ёй калектывізацыяй. У заходнебеларускай вёсцы стварэнне калгасаў пачалося ў 1939-1940 гг. У першыя пасляваенныя гады гэты працэс праходзіў даволі марудна. Да канца 1946 г. было адноўлена і арганізавана ўсяго 133 калгасы (0,56% усіх сялянскіх гаспадарак).

Аднак у лютым 1949 г. XIX з'езд КП(б)Б абвясціў у заходніх абласцях масавую калектывізацыю. Для ажыццяўлення справы пераўтварэння сельскай гаспадаркі па вопыту 1930-х гг. былі створаны палітаддзелы МТС (студзень 1950 г.).

Калектывізацыя праводзілася даволі энергічна. На працягу 1949 г. узровень калектывізацыі дасягнуў 40% , на 1 студзеня 1950 г. у заходніх абласцях налічвалася каля 5000 калгасаў. Да канца 1950 г. калгасы аб'ядналі больш 80% усіх сялянскіх гаспадарак. Згодна афіцыйных звестак калектывізацыя ў заходняй частцы Беларусі была завершана на працягу 1951-1952 гг. У гэты ж час была сселена большасць хутароў, лі квідаваны заможныя гаспадаркі, узмоцнены падатковы прэс на аднаасобнікаў. Разбураўся жыццёвы ўклад сялянства. У нядаўна створаных калгасах адносіны сялян да працы былі не лепшымі. Звыклыя шмат працаваць і працаваць на сябе, калгаснікі заўважалі, што ў выніку ўсім трапляе пароўну: і абібокам, і руплівым. Яшчэ большае расчараванне чакала іх восенню, калі калгаснікі амаль нічога не атрымалі на свае працадні.

Дадаткова прадуманым з'явілася так званае ўзбуйненне калгасаў. Яно ажыццяўлялася ва ўмовах, калі тэхніка знаходзілася ў падначаленні МТС. Таму стварэнне калгасаў-гігантаў нічога па сутнасці не змяняла. Сельскагаспадарчая вытворчасць на пачатку 1950-х гг. была ў крызісным стане. Збожжавая гаспадарка знаходзілася на самым нізкім узроўні за ўсе пасляваенныя гады. Палі засяваліся тытунём, кок-сатызам (каўчукавая культура), а кармоў не хапала. Надоі ад каровы ў сярэднім не перавышалі 800 кг (узровень пачатку XX ст.). Рэзка скарачалася вытворчасць у падсобных гаспадарках калгаснікаў (яна ў 1953 г. усё ж давала каля 2/3

вытворчасці мяса і 4/5 малака).

4 Матэрыяльнае становішча насельніцтва.Жыллёвае будаўніцтва. Адмена картачнай сістэмы. Наладжванне медыцынскага і сацыяльнага забеспячэння.

Нямецка-фашысцкая акупацыя, ваенныя дзеянні на Беларусі цяжка адбіліся на матэ-рыяльным становішчы насельніцтва. Мільёны людзей засталіся без прытулку, не хапала адзення, абутку, іншых прадметаў, неабходных для забеспячэння элементарнай жыццядзейнасці чалавека. Дапамога накіроўвалася з іншых рэспублік СССР, але ў большасці эканоміка СССР у 1944-1945 гг. працавала на армію. Паляпшэнне матэрыяльнага становішча насельніцтва Беларусі найперш магло адбыцца толькі за кошт аднаўлення народнай гаспадаркі.

У першым пасляваенным плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі заяўлялася аб тым, што на аснове росту вытворчасці да 1950 г. даваенны ўзровень дабрабыту народа будзе не толькі дасягнуты, але і перавышаны. Ажыццявіць гэта было складаней.

Развіццё народнай гаспадаркі БССР пасля сусветнай вайны характарызавалася рэзкім паваротам у бок сродкаў вытворчасці. На гэтых напрамках акцэнтавалася ўвага савецкіх і партыйных органаў, сюды накіроўваліся асноўныя людскія і матэрыяльныя рэсурсы, што не магло не адбіцца на развіцці лёгкай прамысловасці і забеспячэнні насе льніцтва таварамі масавага спажывання. На дабрабыт жыхароў Беларусі адмоўна ўплывалі і цяжкасці ў развіцці сельскай гаспадаркі.

Да таго ж паўднёвыя раёны СССР (у тым ліку і частку Гомельскай вобласці) у 1946 г. ахапіла засуха. Таму першыя пасляваенныя гады былі асабліва цяжкімі. У 1946-1947 гг. захоўвалася нарміраванае забеспячэнне. Хлебныя карткі ў ліпені 1946 г. атрымлівалі звыш 2,3 млн. чалавек. Іншымі харчовымі таварамі забяспечвалася толькі насельніцтва Мінска.

Паступова асноўнай крыніцай даходаў жыхароў горада станавілася заработная плата. У 1946 г. яна была павялічана ў вядучых галінах прамысловасці. Нізкааплатныя катэгорыі рабочых і служачых, студэнты і пенсіянеры атрымалі так званую "хлебную надбаўку". Яна была ўведзена адначасова з павышэннем пайковых цэн на хлеб у сувязі з падрыхтоўкай да адмены картачнай сістэмы (снежань 1947 г.) і пераходам да "свабоднага гандлю". Адмена картачнай сістэмы спалучалася з грашовай рэформай. Апошняя ўключала, па-першае, замену старых грашовых знакаў новымі, па-другое , ліквідацыю вынікаў інфляцыі часоў вайны шляхам скасавання так званых "непрацоўных даходаў" на ашчадных кніжках (толькі ўклады да 3 тыс. рублёў абменьваліся 1:1); па-трэцяе, устанаўленне адзіных дзяржаўных цэн (да 1948 г. існавалі два ўзроўні: камерцыйныя і пайковыя). У выніку грашовай рэформы адбылося зніжэнне цэн. Потым цэны зніжаліся на большасць тавараў у 1949-1950 гг. Гэта з'яўлялася ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе асноўнай крыніцай павышэння дабрабыту гарадскога насельніцтва.

Аднак трэба звярнуць увагу на тое, што за гады вайны і першыя пасляваенныя гады да грашовай рэформы цэны ўзраслі настолькі, што нават пасля трохразовага (1947, 1949, 1950 гг.) зніжэння яны былі яшчэ значна вышэй даваенных. Пакупная здольнасць беларускіх гараджан да пачатку 1950-х гг. не падымалася вышэй мяжы гараджан у другой палове 1920-х гг.

Аб'ём рознічнага таваразвароту дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю ў БССР у 1950 г. пры павялічанай наяўнасці грошай у звароце (у 1,5 раза) узняўся толькі крыху больш за 90% даваеннага ў зроўню. Нават у 1950 г. на яго долю прыпадала толькі чвэрць агульнага рознічнага таваразвароту. Тлумачылася гэта тым, што вясковае насельніцтва, якое складала больш за дзве трэці ад усяго насельніцтва БССР, не мела шмат карысці ад грашовай рэформы. Больш таго, пры яе правядзенні страты ў 20% ад усёй колькасці выдаткаў спісваліся за кошт грошай, авансаваных на развіццё вёскі: лічылася, што яна "нажылася" за гады камерцыйнага гандлю.

У першыя пасля вайны гады дэмабілізаваныя воіны імкнуліся вяртацца ў горад. Неадбылося істотных змен і з адменай картачнай сістэмы. Калгасам даводзілася выдаткоўваць асноўную частку грашовых даходаў на вытворчыя патрэбы, набыццё жывёлы і сельскагаспадарчых прылад, гаспадарчае і грамадскае будаўніцтва. Фонд аплаты працы аказваўся нязначным, і энтузіязм калгаснікаў слаба падмацоўваўся матэрыяльнымі стымуламі. Не зацікаўлены быў селянін і ў развіцці сваёй асабістай гаспадаркі, бо кожнае новае дрэўца, жывёліна і іншае прыводзілі да значнага росту падаткаў. Толькі ў сярэдзіне 1950-х гг., калі было зменена падаткаабкладанне, апошнія адчулі істотнае паляпшэнне свайго жыцця.

Адной з асноўных праблем на вёсцы і ў горадзе, быў недахоп жылля. У разглядаемы перыяд жыллёвае будаўніцтва ішло высокімі тэмпамі. Дзяржаўныя і кааператыўныя арганізацыі (без калгасаў) на гэтыя мэты затрацілі на 53% больш сродкаў, чым за ўсе папярэднія гады Савецкай улады. Толькі ў 1946-1950 гг. з зямлянак і неўпарадкаваных памяшканняў перасялілася ў адбудаваныя дамы каля 2 млн. жыхароў рэспублікі. Але жыллёвае будаўніцтва стрымлівалася адсутнасцю будаўнічых матэрыялаў і рабочай сілы, якая накіроўвалася найперш на прамысловае будаўніцтва, нізкай механізацыяй работ, а таксама нездавальняючай арганізацыяй працы. У выніку даваенны жыллёвы фонд Мінска быў адноўлены крыху больш за 80% , а ў іншых гарадах –толькі на 50% .

Праблемай, што патрабавала першачарговага вырашэння, з'яўлялася ахова здароўя. За гады вайны было разбурана больш за 80% медыцынскіх устаноў, на 60% скарацілася колькасць дактароў. У многіх раёнах лютавалі масавыя інфекцыйныя захворванні, асабліва тыф і малярыя. Улічваючы гэта, урад БССР выдзеліў значныя сродкі на ахову здароўя. У Беларусь ішла дапамога з іншых рэспублік, з боку ААН. У выніку ўжо да 1949 г. поўнасцю аднавілася сетка медыцынскіх устаноў. Але забяспечанасць бальнічнымі ложкамі і медыцынскім персаналам у рэспубліцы заставалася ніжэй сярэднесаюзнага ўзроўню.

Тэма 57. Грамадска-палітычнае жыццё.

1 Умацаванне адміністрацыйна-камандной сістэмы.

У пасляваенны час, як і ў 1930-40-я гг., уся паўната ўлады была сканцэнтравана ў руках камуністычнай партыі і, у выніку спецыфічнай пабудовы апошняй, у руках яе кіраўніка –І. Сталіна. Адзяржаўленне і ідэалагізацыя ўсіх сфер жыцця вызначалі шырокі спектр палітычнай дзейнасці КПБ: сельская гаспадарка, культура, адукацыя і іншыя сферы жыцця. Кіраўніцтва Камуністычнай партыі аператыўна рэагавала на змены ў настроях грамадства. Дзеля гэтага мелася мноства каналаў інфармацыі і рычагоў уздзеяння: ад рэпрэсіўных да прапагандысцкіх мер.

Першы пасляваенны 1946 год пачынаўся разам з агітацыйнай кампаніяй па выбарах у Вярхоўны Савет СССР. Па ўсёй рэспубліцы, на прадпрыемствах і ва ўстановах праходзілі мітынгі, на якіх вылучаліся кандыдаты ў дэпутаты. На пачатку студзеня 1946 г. усе калектывы прадпрыемстваў і ўстаноў у лі ку першых кандыдатаў называлі Сталіна, Молатава, Варашылава, Жданава, Берыю, Малянкова, Хрушчова. Кіраўнікі дзяржавы 9 студзеня 1946 г. накіравалі пі-сьмо выбаршчыкам, дзе паведамлялі, у якіх акругах яны будуць балаціравацца. К. Варашылаў праходзіў па Мінскай выбарчай акрузе. З гэтай нагоды на большасці прадпрыемстваў Мінска прайшлі мітынгі, дзе рабочыя слухалі ўсхваляваныя прамовы аб сваім выбранніку.

Сапраўды, выбары ў Вярхоўны Савет СССР (1946), у Вярхоўны Савет БССР (1947), у мясцовыя Саветы (1948), вызначаліся партыйнымі ўладамі як шырокая прапагандысцкая акцыя, як свята. Насельніцтва ж, змарнаванае вайной, разглядала іх як першую рэальную прыкмету мірнага жыцця. Здавалася, самае страшнае мінула – астатняе будзе дасягнута працай. Жаданне гэтай працы, жаданне хутчэй аднавіць разбуранае вайной ахоплівала пераважную большасць беларусаў. Многія з той моладзі, што не трапіла на фронт, з зайздрасцю сустракалі сваіх аднагодкаў з баявымі ўзнагародамі і імкнуліся вызначыцца ў працы. У студзені 1946 г. адбыўся пленум ЦК ЛКСМБ, які заслухаў пытанне "Аб удзеле камсамольцаў і моладзі Полацкай вобласці ў падрыхтоўцы выбараў у Вярхоўны Савет СССР". З дакладам выступіў першы сакратар ЦК ЛКСМБ К.Т. Мазура ў. На ўрачыстым пасяджэнні пленума Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Н.Я. Наталевіч уручыў Ленінскаму Камуністычнаму Саюзу моладзі Беларусі ордэн Чырвонага Сцяга "за мужнасць, самаадданасць, праяўленую камсамолам у гады вайны". У канцы лютага 1946 г. былі зніжаны цэны ў камерцыйным гандлі харчовымі таварамі ад 10-20% (мяса) да 40-50% (кава, гарбата, хлеб). Адначасова акрэслівалася неабходнасць падпіскі на пазыку, што мела добраахвотна- прымусовы характар. Прапагандаваліся прыклады С. Станюты, якая ахвяравала два сваіх заробкі, Я. Коласа, які падпісаўся на 30 тыс. рублёў і г. д.

Праяўляючы клопат аб насельніцтве, улады яшчэ раз падкрэслівалі, што магло б быць лепш, каб не ворагі ў краіне і па-за яе межамі. Час сапраўды быў складаны і супярэчлівы. Былым саюзнікам ужо не патрэбна была моц краіны Саветаў. У ЗША паступова разгортвалася антыкамуністычная істэрыя. Разам з тым І. Сталін дзейнічаў таксама з пазіцыі сілы.

Цэнтральныя ўлады акрэслівалі асабісты недавер і падазронасць да вызваленых народаў. Л. Цанава, які напярэдадні і ў першыя пасляваенныя гады ўзначальваў рэпрэсіўны апарат НКУС БССР, лічыў: усе тыя, хто не прымаў актыўнага ўдзелу ў партызанскай барацьбе –здраднікі. У той самы час без удакладнення фактаў альбо на сфальсіфікаванай падставе ў турму былі кінуты многія мінскія падпольшчыкі, партызанскія сувязныя, былыя ваеннапалонныя (для прыкладу – герой абароны Брэсцкай крэпасці маёр П.М . Гаўрылаў).

Асабліва напружаным было становішча ў заходніх абласцях Беларусі, дзе пад час вайны і ў першыя пасляваенныя гады дзейнічалі атрады Арміі Краёвай. Менавіта тут бачылася НКУС "гняздо нацыяналізму і кулацтва". Недавер распаўсюджваўся нават на партызан і партыйных кіраўнікоў – мясцовых ураджэнцаў. Быў арыштаваны шэраг дзеячаў Кампартыі Заходняй Беларусі. Сітуацыя яшчэ больш ускладнілася з пачаткам масавай калектывізацыі ў гэтых раёнах.

Новае кіраўніцтва разумела сваё прызначэнне: актывізаваць барацьбу з нацыянальным рухам і паскорыць працэсы калектыві-зацыі ў заходніх абласцях Беларусі. Сапраўды, у 1944-1946 гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічалі не толькі атрады Арміі Краёвай. У розных кутках яе – у Слоніме, Навагрудку, Баранавічах, Глыбокім, Паставах, Брэсце і ў іншых гарадах і мястэчках ствараліся групоўкі, а потым і арганізацыі апазіцыйна настроенай беларускай моладзі. Так, вясной 1946 г. была створана беларуская патрыятычная арганізацыя ў Слоніме (для канспірацыі яе назвалі "Чайка"). Арганізацыя павінна была аб'яднаць "перадавое студэнцтва, беларускую інтэлігенцыю, свядомую рабочую і сялянскую моладзь". Галоўнай мэтай была абарона нацыянальных правоў і свабод, барацьба за захаванне і развіццё беларускай культуры, мовы і гісторыі. Распрацоўваліся таксама і праекты пабудовы незалежна й Беларусі. У хуткім часе "Чайка" аб'ядналася з патрыятычнай групай у Баранавіцкім настаўніцкім інстытуце, што пашырала сферу яе ўплыву.

Пераважная частка ўдзельнікаў беларускіх арганізацый самастойна прыходзіла да ўсведамлення сваёй адказнасці за лёс краіны. Калі б 20 мая 1947 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР не адмяніў смяротную кару, многія з удзельнікаў паплаціліся б жыццём за сваю апазіцыйную дзейнасць. Аднак гады сібірскай катаргі вытрымалі далёка не ўсе.

На пачатку 1947 г. у ЦК КП(б)Б быў утвораны аддзел культуры. 27-28 жніўня на сходзе партыйнага актыву Мінскай гарадской арганізацыі КП(б)Б выступіў сакратар ЦК КП(б)Б М.Г. Іаўчук. Ён заклікаў пакончыць з нізкапаклонствам перад Захадам, з памыл-ковым поглядам на тое, што нібы менавіта адтуль ішло святло куль-туры на Беларусь, выступіў супраць

тэорыі "залатога веку" (перыяд Вялікага княства Літоўскага. - Заўвага аўт.) як "нацыяналістычнай ідэалагізац ыі мінулага". Выступаўшы на нарадзе прэзідэнт АН БССР А.Н. Жэбрак ухіліўся ад пастаноўкі такога пытання. Аднак ужо ў снежні 1947 г. А. Н. Жэбрак не выбіраецца нават у акадэмікі АН БССР. Пад лозунгам барацьбы супраць "праяўленняў безыдэйнасці і апалітычнасці", "за чысціню марксісцка-ленінскага светапогляду", "за няўхільнае кіраванне ленінскімі прынцыпамі класавасці і партыйнасці" ліквідаваліся цэлыя навуковыя галіны і школы, укараняўся дагматызм, падаўляліся любыя праяўленні іншадумства.

У лютым 1948 г. на адной з вуліц Мінска быў знойдзены мёртвым кіраўнік маскоўскага дзяржаўнага тэатра, былы старшыня яўрэйскага антыфашысцкага камітэта ў 1941-1945 гг. С. Міхоэлс. Як сведчаць дакументы, гэта была аперацыя па забойству.

У лютым 1949 г. упершыню пасля вайны адбыўся чарговы XIX з'езд Камуністычнай партыі Беларусі, на якім побач з гаспадарчымі разглядаліся і ідэалагічныя пытанні. З'езд вырашыў распачаць калектывізацыю ў заходніх абласцях Беларусі. Ён ухваліў барацьбу з касмапалітызмам, з "ворагам савецкага рэалістычнага мастацтва Меерхольдам". На арганізацыйным Пленуме Першым сакратаром ЦК КПБ(б) зноў быў абраны М. Гусараў.

Гэты ж 1949 г. святкаваўся як год 70-годдзя Сталіна. Ён спалучаўся з другім святам -800-годдзем сталіцыСССР – Масквы. 1 студзеня 1950 г. многія рэспубліканскія выданні побач са штогадова традыцыйным навагоднім партрэтам І. Сталіна змясцілі яму віншаванне ад імя беларускага народа.

2 Формы і метады дзейнасці партыйных, савецкіх, камсамольскіх, прафсаюзных і грамадскіх арганізацый.

У студзені 1947 г. першым сакратаром КП(б)Б быў прызначаны сакратар Пермскага абкама партыі М. Гусараў. П. Панамарэнка захаваў на працягу 1947 г. толькі пасаду Старшыні Савета Міністраў. Разгарнулася закулісная барацьба паміж гэтымі кіраўнікамі, што, дарэчы, адлюстроўвала барацьбу ў Маскве за ўплыў на І. Сталіна. М. Гусараў паступова фарміруе сваю партыйную каманду. Ад абавязкаў сакратара ЦК КП(б)Б па кадрах быў вызвалены М. Аўхімовіч (замест яго прызначаны М. Зімянін), з Бюро ЦК КП(б)Б быў выведзены і Г. Эйдзінаў –да гэтага часу Старшыня Дзяржплана БССР. Абодва яны – вядомыя арганізатары падпольнай і партызанскай барацьбы на Беларусі. Беларусы ў групоўцы М. Гусарава прысутнічалі. Найбольш яркай асобай з іх быў на той час М. Іаўчук, які адказваў за ідэалагічную работу. Ён нарадзіўся ў 1908 г. у в. Занужаўе (сучаснага Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці). Пасля заканчэння Акадэміі камуністычнага выхавання і работы ў ЦК УКП(б) у 1947 г. быў прызначаны сакратаром ЦК КП(б)Б. Былых партызанскіх кіраўнікоў паступова замянялі маладыя кадры, не звязаныя асабістымі адносінамі з П. Панамарэнкам. Прысутнічалі таксама і тыя, хто быў запрошаны М. Гусаравым з Пермскай вобласці. Дарэчы, М. Гусараў (па словах П.

Панамарэнкі) так акрэсліваў кадравую палітыку свайго папярэдніка: "Як на Беларусі ўзніклі органы ўлады? Узялі па Ваньку ад партызанскага атрада – вось і ўсё".

У студзені 1950 г. было надрукавана новае Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Савет БССР. Выбарам быў прысвечаны сход актыву Мінскай вобласці, на якім выступіў М. Г усараў, шматлікія мітынгі, арганізаваныя на прадпрыемствах і ўстановах. Аднак вылучэнне кандыдатаў адбывалася па старому сцэнарыю. Першым усюды вылучаўся І. Сталін, толькі зараз больш спрактыкавана: унізе пад яго прозвішчам пісалі прозвішча рэальнага кандыдата, і гэта ўжо нагадвала пэўны рытуал.

Выбары 14 сакавіка 1950 г. праходзілі як свята, пад музыку і песні. А напярэдадні для святочнага настрою на ўсю шырыню першых старонак газет было змешчана разам з партрэтам І. Сталіна паведамленне аб зніжэнні цэн на ўсе харчовыя і прамысловыя тавары. 15 сакавіка ў звестках аб выбарах называліся лічбы ўдзельнікаў галасавання між 99-100%.

6 ліпеня 1950 г. пачалося пасяджэнне VIII сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. Толькі з 1950 па 1956 гг. Вярхоўны Савет БССР прыняў звыш 90 законаў і пастаноў. Нягледзячы на некаторыя хібы, яны сталі важным сродкам рэгулявання і ўдасканалення грамадскіх адносін, гаспадарчых, сацыяльна-культурных працэсаў.

Спецыфічнай заставалася роля камсамола і прафсаюзаў, якія не столькі павінны былі выяўляць і абараняць інтарэсы працоўных, моладзі, колькі накіроўваць іх гераічную працу. Адначасова камсамол з'яўляўся кузняй кадраў для партыі. Вядома, што першыя пасляваенныя кіраўнікі камсамола Беларусі (у 1945-1947 гг. – К.Т. Мазураў, са снежня 1947 па ліпень 1954 гг. – П.М. Ма шэраў) сталі вядомымі палітычнымі дзеячамі.

Акрамя прафсаюзаў і камсамола ў рэспубліцы дзейнічалі агульнасаюзныя грамадскія арганізацыі (ДТСААФ – добраахвотнае таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту, спартыўныя і культурныя ўстановы і іншыя), членства ў якіх для большасці працаздольнага насельніцтва было абавязковым.

3 Беларусь – адна з краін заснавальніц ААН. Роль і месца БССР на міжнароднай арэне ў другой палове 40-х – першай палове 80-х гг. XX ст.

Кіраўніцтва СССР добра разумела неабходнасць належнага прадстаўніцтва на міжнароднай арэне і вырашае тэрмінова выправіць становішча. Праблема разглядаецца на студзеньскім (1944 г.) Пленуме ЦК УКП(б), рашэнні якога заканадаўча афармляе ў лютым 1944 г. X сесія Вярхоўнага Савета СССР 1-га склікання. Канстытуцыя СССР карэктуецца, у яе ўносіцца палажэнне аб тым, што саюзныя рэспублікі маюць права: "уступаць у непасрэдныя зносіны з замежнымі дзяржавамі, заключаць з імі пагадненні і абменьвацца дыпламатычнымі прадстаўнікамі".

У сакавіку 1944 г. VI сесія Вярхоўнага Савета БССР 1-га склі кан-ня прымае Закон аб утварэнні Народнага камісарыята замежных спраў БССР.

Канстытуцыйна былі замацаваны знешнепалітычныя прэрагатывы вышэйшых уладных інстанцый рэспублікі. БССР улетку 1944 г. праводзіць непасрэдныя перагаворы з Польшчай, звязаныя са зменамі дзяржаўнай мяжы паміж краінамі-суседзямі. Тым не менш гэта не вырашала праблему прызнання БССР у якасці суб'екта міжнароднага права. 28 жніўня 1944 г. кіраўнік дэлегацыі СССР на канферэнцыі ў Думбартан- Оксе (ЗША) А.А. Грамыка ўнёс прапанову аб уключэнні ўсіх 16 савецкіх рэспублік у лік першапачатковых членаў будучай ААН. Ініцыятыва СССР выклікала адмоўную рэакцыю як з боку дэлегацый Вялікабрытаніі і ЗША, так і кіраўніцтва гэтых краін. Прэзідэнт ЗША Ф. Рузвельт у пасланні І. Сталіну адзначаў, што савецкія прапановы ставяць пагрозу ўтварэнню міжнароднай арганізацыі, і вылучыў прапанову звярнуцца да гэтай праблемы пасля стварэння ААН. Савецкі бок не прыняў амерыканскія прапановы і падкрэсліў, што шэраг савецкіх рэспублік, у першую чаргу УССР і БССР, значна пераўзыходзяць памерам, колькасцю насельніцтва асобныя краіны, чыё членства ў ААН не выклікае ніякіх спрэчак.

Праблема была перанесена на Крымскую канферэнцыю (Ялта, люты 1945 г.) кіраўнікоў Вялікабрытаніі, ЗША і СССР. Вынікам напружаных перагавораў і ўзаемных кампрамісаў стала рашэнне аб тым, штоСССРадмаўляецца ад членства 16 рэспублік і прапануе 2-3 рэспублікі, сярод якіх БССР і УССР. Менавіта гэтыя дзяр жавы сталі першымі ахвярамі германскай агрэсіі, панеслі выключныя страты і ўнеслі вялікі ўклад у барацьбу з фашысцкім блокам. Дамоўленасць аб БССР і УССР была ўнесена ў сакрэтны пратакол канферэпцыі.

Звяртае на сябе ўвагу тая акалічнасць, што гэтыя ініцыятывы кіраўніцтваСССРпрапаноўваліся без ведама кіраўніцтва беларускага і ўкраінскага народаў. Нарэшце пачалі дзейнічаць і самі рэспублікі. У сакавіку 1945 г. улады БССР і УССР, якія не былі запрошаны на ўстаноўчую канферэнцыю Аб'яднаных Нацый у Сан-Францыска, абвясцілі, што накіруюць туды свае дэлегацыі. Гэта выклікала ўсплёск дыпламатычных перагавораў, якія скончыліся згодай Вялікабрытаніі, ЗША і Кітая падтрымаць ініцыятыву СССР аб афіцыйным запрашэнні прадстаўнікоў БССР і УССР на канферэнцыю.

27 красавіка 1945 г., праз два дні пасля пачатку працы, канферэнцыя прымае рашэнне аб уключэнні УССР і БССР у лік першапачатковых членаў арганізацыі. 30 красавіка прымаецца рашэнне аб запрашэнні дэлегацый БССР і УССР на ўстаноўчую канферэнцыю ААН. У хуткім часе дэлегацыя БССР –К.В. Кісялёў, нарком замежных спраў БССР (кіраўнік), А.Р. Жэбрак, В.Н. Перцаў, Г.І. Байдукоў, Ф.П. Шмыгаў – удзельнічала ў рабоце ўстаноўчай сесіі ААН. 26 чэрвеня 1945 г. дэлегацыя БССР падпісала Статут Усеагульнай міжнароднай арганізацыі для падтрымкі міру і бяспекі; яго ратыфікацыя Вярхоўным Саветам БССР адбылася 30 жніўня таго года. БССР станавілася паўнамоцным суб'ектам міжнароднага права.

Аб'ектыўна шлях БССР у ААН быў адлюстраваннем яе ўкладу ў барацьбу Аб'яднаных Нацый з гітлераўскай кааліцыяй. Варта адзначыць, гэта адбылося не з-за натуральнага асэнсавання краінамі сусвету гэтага факта,

а тлумачыцца складанымі геапалітычнымі разлікамі вялікіх краін.

Ёсць падстава гаварыць аб тым, што існавалі планы знешне самастойных паводзін дэлегацый БССР і УССР, нават магчымасць усталявання дыпламатычных адносін БССР з замежнымі краінамі. Аб гэтым сказаў кіраўнік беларускай дэлегацыі К.В. Кі сялёў на сваёй першай прэс-канферэнцыі. Аднак рэчаіснасць была іншай. Ва ўмовах цэнтралізаванай партыйна-дзяржаўнай сістэмы знешнепалітычная дзейнасць была манаполіяй саюзнага цэнтра, а рэспубліканскія наркаматы (з 1946 г. – міністэрствы) замежных спраў, іх прадстаўнікі на міжнародных форумах павінны былі ісці ў фарватэры саюзнай палітыкі. Напрыклад, на пасяджэнні Палітычнага камітэта, дзе абмяркоўвалася карэйскае пытанне, кіраўнік беларускай дэлегацыі Кісялёў зімправізіраваў і вельмі негатыўна выказаўся аб выступленні кітайскага дэлегата (ад урада Чан-Кай-Шы). Хаця выступленне цалкам супадала з генеральнай пазіцыяй СССР, кіра ўнік дэлегацыі СССР А.Я. Вышынскі застаўся вельмі незадаволеным тым, што з ім не ўзгаднілі змест выступлення беларускага дыпламата. І толькі нечаканае адабрэнне выступлення К. Кісялёва з боку І. Сталіна ўратавала яго ад расправы.

БССР актыўна ўдзельнічала ў вырашэнні надзённых і складаных праблем міжнароднага супольніцтва. Беларуская дэлегацыя стала ініцыятарам прыняцця на І сесіі Генеральнай Асамблеі ААН (1946) рэзалюцыі аб выдачы і пакаранні ваенных злачынцаў. БССР становіцца членам многіх спецыялізаваных міжнародных устаноў: Міжнароднага саюза электрасувязі (1947), Сусветнай метэа-ралагічнай арганізацыі (1948), Сусветнай арганізацыі працы (1948), Міжнароднай арганізацыі працы (1954), Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах адукацыі, навукі і культуры – ЮНЕСКА (1954). Але прадстаўнікі БССР дзейнічалі выключна ў накірунку саюзных ініцыятыў.

4 “Хрушчоўскай адліга”.

У гісторыі кр аіны прамежак часу пасля смерці Сталіна (5 сакавіка 1953 г.) і да адстаўкі М.С. Хрушчова ў кастрычніку 1964 г. называюць дзесяцігоддзем палітычнай "адлігі". Жыццё паставіла ў парадак дня неабходнасць рашэння комплексу пытанняў: ліквідацыя таталітарнага рэжыму і пераход да калектыўнага кіраўніцтва, спыненне масавых рэпрэсій і рэабілітацыі ахвяр сталінскага тэрору, змяненне эканамічнай палітыкі, змяненне знешнепалітычнай дактрыны і многае іншае. Рашэнні XX з'езда КПСС (люты 1956 г.) пацвердзілі змяненні палітычнага курсу, разрыў з многімі сталінскімі пастулатамі і традыцыямі. На закрытым пасяджэнні з’езда з дакладам "Аб культе асобы і яго выніках" выступіў М.С. Хрушчоў. Гэта была першая спроба палітычнага кіраўніцтва краіны падняць заслону над сталінскімі злачынствамі, паказаць шкоду, якую прынёс культ асобы развіццю грамадства. Вынясенне даклада на з'езд азначала пачатак пераходу ад таталітарызму да лібералізацыі.

Спроба зрабіць больш глыбокі аналіз культу асобы Сталіна ў жыцці грамадства была зроблена ў пастанове ЦК КПСС "Аб пераадоленні культу

асобы і яго вынікаў" (30 чэрвеня 1956 г.). Але да канца раскрыць гэты феномен не ўдалося. У вышэйшых органах партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва стаялі людзі, якія неслі адказнасць за злачынствы. Іх выкрыццё не закранала сутнасці аўтарытарна-бюракратычнай сістэмы, яе сацыяльнай прыроды.

Пасля XX з'езда КПСС на Беларусі пачаўся працэс рэабілітацыі ахвяр сталінскіх рэпрэсій. З 1955 па 1963 гг. было рэабілітавана 5619 чалавек. Сярод іх партыйныя, дзяржаўныя, ваенныя і грамадскія дзеячы В.Г.Кнорын, М.Ф. Гікала, М.М. Галадзед, А.І. Крыніцкі і інш. Была рэабілітавана група работнікаў навукі, культуры, рабочых і сялян. Аднак рэабілітацыя праходзіла складана, выбарачна. Да 1988 г. улады не згаджаліся на партыйную рэабілітацыю Дз. Жылуновіча. У першую хвалю рэабілітацыі цалкам не была адноўлена справядлівасць у адносінах да В. Ластоўскага, Я. Лёсіка, У. Ігнатоўскага, А. Баліцкага і інш . З прыходам да вышэйшай улады Л.І. Брэжнева рэабілітацыя была амаль спынена. З 1972 па 1988 гг.было рэабілітавана толькі 169 чалавек.

Грамадска-палітычнае жыццё тых часоў было складаным і супярэчлівым, адлюстроўвала барацьбу двух тэндэнцый: дэмакратычнай, якая імкнулася да вызвалення ўсіх сфер жыцця ад скажэнняў сталінскай эпохі, і кансерватыўнай, якая імкнулася зберагчы і прыстасаваць старыя рычагі да новых рэалій грамадскай свядомасці. Пачаўся складаны, для многіх людзей і трагічны, працэс разбурэння стэрэатыпаў і поглядаў, якія склаліся.

Працэс лібералізацыі, што закрануў розныя сферы грамадскага жыцця, пачаўся перш за ўсё з дэмакратызацыі дзейнасці партыі. Было наладжана рэгулярнае скліканне партыйных з'ездаў і пленумаў ЦК КПСС і саюзных рэспублік. Стала шырока практыкавацца абмеркаванне партыйных і дзяржаўных дакументаў у друку і на сходах прац оўных калектываў. Па важнейшых пытаннях развіцця розных галін народнай гаспадаркі пачалі склікацца нарады з прыцягненнем шырокага кола спецыялістаў.

У тыя часы партыйную арганізацыю Беларусі ўзначальвалі К.Т. Мазураў, П.М. Машэраў, Савет Міністраў – Ц.Я. Кі сялёў, Вярхоўны Савет – С.В. Прытыцкі, Ф.А. Сурганаў. Усе яны шмат зрабілі для развіцця эканомікі, культуры, паляпшэння дабрабыту насельніцтва,
мелі свае погляды на вырашэнне тых ці іншых праблем развіцця Беларусі, карысталі ся павагай народа.

У дзейнасці кампартыі Беларусі, саветаў, прафсаюзаў, камсамола паглыблялася калегіяльнасць і рабіліся пэўныя захады па пашырэнню ўдзелу насельніцтва ў іх рабоце. У 1957-1958 гг. Вярхоўны Савет БССР зацвердзіў палажэнне аб сельскім, пасялковым, раённым, гарадскім Саветах дэпутатаў працоўных. Яно было накіравана на паляпшэнне дзейнасці Саветаў у эканоміцы і грамадска-палітычным жыцці. У выніку Саветы атрымалі больш шырокія правы. У практыцы іх работы вялікае значэнне набылі шматлікія камісіі, да ўдзелу ў якіх на грамадскіх пачатках прыцягваліся прадстаўнікі рабочых, сялянства і інтэлігенцыі. Аднак карэнных змен у дзейнасці Саветаў не адбылося. Яны па-ранейшаму рэальнай уладай не валодалі.

Курс на дэмакратызацыю грамадства павінен быў знайсці адпаведны працяг і ў эканоміцы. Эканамічныя перабудовы былі накіраваны на пашырэнне гаспадарчых правоў саюзных рэспублік шляхам перадачы ім пытанняў, якія раней вырашаліся ў цэнтры. Толькі ў 1956 г. у распараджэнне ўрада БССР было перададзена 356 прадпрыемстваў, а ў 1957 – больш 500 прадпрыемстваў. 11 сакавіка 1957 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў закон, паводле якога рэспублікі самі маглі вырашаць пытанні абласнога і краявога адміністрацыйна-тэрытарыяльнага будаўніцтва. Пашырыліся заканадаўчыя правы саюзных рэспублік. У іх кампетэнцыю ўвайшло прыняцце грамадзянскага, крымінальнага і працэсуальнага кодэксаў.

У 1962 г. была праведзена рэарганізацыя кіруючых органаў кампартыі Беларусі. Яны падзяляліся на прамысловыя і сельскія. Былі створаны Прэзідыум ЦК КПБ, Бюро ЦК па кіраўніцтву прамысловасцю і будаўніцтвам, Бюро ЦК па кіраўніцтву сельскай гаспадаркай, а таксама адзіны кантрольны орган – Камітэт партыйна-дзяржаўнага кантролю ЦК КПБ і СМ БССР. Былі арганізаваны 12 абкамаў, 25 гаркамаў, 23 камітэты па прамысловых зонах і 77 –па вытворчых калгасна-саўгасных упраўленнях. Па такому прынцыпу былі падзелены савецкія, камсамольскія, прафсаюзныя і грамадскія арганізацыі. Гэта структура не апраўдала сябе і ў 1964 г.
была ліквідавана. Многія эканамічныя праблемы тых гадоў спрабавалі вырашыць чыста палітычнымі прыёмамі і метадамі. Выкарыстоўваліся прыёмы непасрэднага звароту да свядомасці. У 1959 г. камсамольскія арганізацыі Беларусі накіравалі на будоўлі Сібіры, Закаўказзя 7,5 тыс. юнакоў і дзяўчат, у наступным годзе яшчэ 3,9 тыс.У 1959 г. у краіне набірала сілу новая грамадзянская ініцыятыва – нараджаўся рух за камуністычную працу. Ён праходзіў у прывычных традыцыях сацыялістычнага спаборніцтва. Спробы рэальна звязаць энтузіязм і эканамічную зацікаўленасць (пачатак брыгаднага падраду) успрымаліся галоўным чынам як "сквапнасць" і амаль што "капіталізм" у эканоміцы.

Адміністрацыйна-камандная сістэма не магла функцыянаваць без штодзённых мабілізацый сваіх грамадзян для дасягнення самых розных мэт. Вось чаму ў кастрычніку 1961 г. на XXII з'ездзе КПСС была прынята новая партыйная праграма, якая паставіла мэту ўжо праз 20 гадоў пабудаваць камуністычнае грамадства і "забяспечыць самы высокі жыццёвы ўзровень у параўнанні з любой іншай краінай капіталізму". Пастаноўка непрадуманых задач прыводзіла да расчаравання ў грамадстве. Адсутнасць рэальнай справы змянялася нарастаннем рытуальнасці, дасягнуўшай у часы Брэжнева сваёй кульмінацыі.

Палітыкай Хрушчова была незадаволена партыйная бюракратыя. Старая наменклатура не магла дараваць выкрыцця культу асобы Сталіна. Вайсковыя вярхі былі незадаволены скарачэннямі ўз-броеных сіл, дзеячы навукі і культуры – грубым умяшаннем у іх творчасць. Сялянства не магло пагадзіцца з палітыкай ліквідацыі многіх вёсак, скарачэннем асабістых гаспадарак. Нягледзячы на тое, што рэформы не знялі кардынальных праблем грамадскага развіцця, перыяд "адлігі" быў моцным ударам па таталітарнай сістэме сталінізму.

5 Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў 70-я – першай палове 70-х гг. П.М.Машэраў.

Пачаткам новага этапа савецкай гісторыі з'яўляецца кастрычніцкі (1964 г.) Пленум ЦК КПСС. Ён вызваліў М.С. Хрушчова ад займаемых пасад. Першым сакратаром быў абраны Л.І. Брэжнеў. Паколькі сістэма мела іерархічны характар, першая асоба ў складзе вышэйшага эшалона ўлады мела вызначальны характар. На XXIII з'ездзе КПСС (1966 г.) Брэжнеў стаў Генеральным сакратаром партыі. Паступова ён засяродзіў у сваіх руках усю паўнату ўлады: становіцца Старшынёй Савета абароны, у 1977 г. заняў пасаду Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Павышэнне кіруючай ролі партыі абвяшчалася універсальным сродкам рашэння ўсіх эканамічных і сацыяльных праблем. XXIV з'езд (1971) унёс у статут палажэнне аб праве кантролю партыйнымі арга-нізацыямі дзейнасці адміністрацыі. Партыйныя органы дубліравалі органы гаспадарчага кіраўніцтва. Завяршала гэту палітыку замаца-ванне ў 6-м артыкуле КанстытуцыіСССР(1977) палажэння аб кіруючай ролі партыі ў грамадстве. Абвешчаны курс на стабільнасць набываў рысы палітыкі стагнацыі. У палітычны лексікон увайшло паняцце "развіты сацыялізм", афіцыйную выснову аб якім зрабіў Л.І. Брэжнеў у юбілейным дакладзе да 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі і вызначэнне якому было дадзена ў Канстытуцыі СССР (1977). Новая канцэпцыя прыз-вана была вырашыць супярэчнасці паміж дэкларацыяй аб блізкай перамозе камунізму і нерэалізаваным яго ўвасабленнем у жыццё. Уся сістэма грамадскіх адносін пачала разглядацца з пункту гледжання адпаведнасці "крытэрыям спеласці". Пачалася падгонка жывых працэсаў пад новую схему. З грамадска-палітычнай літаратуры зніклі недахопы, цяжкасці. Уведзенае ў гэты час вызначэнне "новай гістарычнай супольнасці – савецкага народа" ігнаравала існуючую сацыяльную дыферэнцыяцыю, нацыянальныя асаблівасці.

У грамадстве складваўся кантраст паміж лозунгамі і рэальнымі справамі. Усё больш мацнелі заклікі да працоўных мабілізаваць сродкі, павысіць актыўнасць, адрадзіць стаханаўскі рух, пачалі раздавацца пагрозы ў адрас вінаватых. Усе гэтыя сцвярджэнні па сутнасці адкрыта заклікалі вярнуцца да мінулага. У рамках новых установакпачала гаснуць і паступова заціхла крытыка Сталіна. Між тым у краіне наспявала незадавальненне, сфарміравалася апазіцыя. Частка інтэлігенцыі пачала выступаць з крытыкай сістэмы. Вышэйшае палітычнае кіраўніцтва краіны ўсё рабіла для таго, каб скончыць з палітычнай "адлігай". Рэзка ўзмацніліся цэнзурныя абмежаванні пасля прыняцця пастановы ЦК КПСС "Аб павышэнні адказ-насці кіраўнікоў органаў друку, радыё, тэлебачання, кінематаграфіі, устаноў, культуры і мастацтва за ідэйна-палітычны ўзровень публікуемых матэрыялаў і рэпертуараў" (1969) . Меры па выкананню гэтай пастановы ў Беларусі зацвердзіла ў сакавіку 1969 г. Бюро ЦК КПБ.

Любыя адхіленні ад афіцыйных установак падлягалі асуджэнню. Пад барацьбу з іншадумствам была падведзена прававая аснова. У

Крымінальны кодэкс БССР быў уведзены артыкул 67, які прадугле -джваў за агітацыю ці прапаганду ў мэтах падрыву ці паслаблення
Савецкай улады, распаўсюджванне, выраб і захоўванне ў тых самых мэтах літаратуры такога зместу – пакаранне пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасцімесяцаў да сямі гадоў з высылкай на тэрмін ад двух да пяці гадоў.

Людзей, якія выступалі супраць несправядлівасці, парушэнняў правоў чалавека, сталі называць "дысідэнтамі". Адным з ідэолагаў дэмакратычнага руху быў акадэмік Дз. Сахараў, які асудзіў увод савецкіх войскаў у Афганістан, за што быў сасланы, пазбаўлены ўсіх узнагарод. Пасля выхаду кнігі "Архіпелаг ГУЛАГ" пісьменнік А. Салжаніцын у 1974 г. быў пазбаўлены грамадзянства СССР і высланы за межы краіны. Дысідэнцтва на Беларусі было слабым. Але і тут некаторыя прадстаўнікі інтэлігенцыі выступалі за пашырэнне дэмакратычных правоў і свабод. Адміністрацыйна-камандная сістэма скоўвала ініцыятыву Саветаў, якія не выступалі паўнамоцнымі органамі народаўладдзя, страчвалі аўтарытэт у выра шэнні многіх пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця. Аказаліся скажонымі і асноўныя функцыі прафсаюзаў. Яны практычна пераўтварыліся ў адно са звёнаў партыйна-дзяржаўнай сістэмы ўлады. Супярэчлівыя працэсы адбываліся і ў камсамольскай арганізацыі Беларусі. З аднаго боку, яна праводзіла значную работу па ідэйна-палітычнаму, працоўнаму і маральнаму выхаванню моладзі. З другога, многія формы працы адставалі ад патрабаванняў жыцця, не адпавядалі інтарэсам юнакоў і дзяўчат. Ініцыятыва камсамольскіх арганізацый была пад кантролем партыйных камітэтаў.

Адміністрацыйныя метады кіравання не спрыялі павышэнню прэстыжнасці сумленнай працы. Усё больш заяўляла аб сабе тэндэн-цыя абязлічвання грамадскай уласнасці, чым у значнай ступені тлумачыліся абыякавыя адносіны да яе. Нерацыянальна выкарыстоўваліся матэрыяльныя рэсурсы, пашыра ўся крадзеж народнага багац-ця, марнатраўства і безгаспадарчасць.

Прыняцце многіх рашэнняў па барацьбе са службовымі злоўжываннямі поспеху не мелі. З высокіх трыбун гаварылі аб абавязку, гонары і сумленні камуніста. Але ішло размыванне маральных крытэ-рыяў, па якіх арганізоўвалася жыццё грамадства. Аўтарытэт партыі зменшыўся, многія кіраўнікі вышэйшага эшалона ўлады ў народзе сталі непапулярнымі.

Пошукі шляхоў выхаду з крызісу былі зроблены пасля лістападаўскага Пленума ЦК КПСС (1982 г.), на якім Генеральным сакрата-ром ЦК КПСС выбралі Ю.У. Андропава. Па-новаму быў пастаўлены шэраг пытанняў тэарэтычнага, сацыяльна-эканамічнага характару.

Пачалася барацьба з карупцыяй, кампанія па навядзенню парадку і дысцыпліны, ха ця ў ёй былі перагібы. Суадносіны сіл у структуры ўлады на карысць кансерватыўнага крыла адбыліся пасля смерці Ю.У. Андропава. На пасаду Генсека быў абраны К.У. Чарненка (1984). Працэс стагнацыі зайшоў так далёка, што ствараў пагрозу для стабільнасці палітычных структур. Грамадства стаяла на парозе непазбежных перамен.
Трэба адзначыць, што сярод кіраўнікоў рэспублікі, нягледзячы на вельмі

негатыўныя адносіны да былога партыйнага кіраўніцтва ў нашы дні, былі і даволі аўтарытэтныя, кампетэнтныя людзі. І сёння з павагай ўспамінаюць К.Т. Мазурава– першага сакратара ЦК КПБ з 1956 па 1965 гг., С.В. Прытыцкага – Старшыню Вярхоўнага Савета БССР з 1968 па1971 гг., П.М. Машэрава – Першага Сакратара ЦК КПБ з 1965 па 1980 гг. і інш. Асабліва яскравай з'яўляецца асоба П.М. Машэрава, а перыяд яго кіраўніцтва – гэта перыяд развіцця эканомікі высокімі тэмпамі.

6 Спробы мадэрнізацыі савецкай грамадска-палітычнай сістэмы пад час палітыкі перабудовы.

У сярэдзіне 80-х гадоў Беларусь уступіла ў перыяд радыкальных сацыяльна-палітычных пераўтварэнняў. Крызісныя з'явы ў жыцці савецкага грамадства хутка нарасталі. Перад вышэйшым партыйным і дзяржаўным кіраўніцтвам паўстала задача спыніць распад сістэмы сацыялізму.
У сакавіку 1985 г. пасля смерціК.У.Чарненкі генеральным сакратаром ЦК КПСС быў абраны М. С. Гарбачоў. У сваім выступленні на красавіцкім (1985 г.) Пленуме ЦК КПСС ён аб'явіў аб планах рэформ усебаковага абнаўлення грамадства. У гарбачоўскай адміністрацыі адсутнічала распрацаваная канцэпцыя таго, што трэба было зрабіць. Таму прымаемыя рашэнні не накіроўвалі працэсы, якія адбываліся ў грамадстве, а ў большасці выпадкаў ішлі за імі. Гэта тлумачылася запозненасцю рэформ, глыбінёй крызісу, які ахапіў усю сістэму. Асноўная ідэя канцэпцыі "паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны" напачатку была разлічана на хуткі ўздым эканомікі за кошт пераразмеркавання фінансавых сродкаў і новай структурнай палітыкі. Гэта быў не нейкі новы метад, з дапамогай якога планавалася вырашыць наспеўшыя праблемы, а своеасаблівае спалучэнне
прыёмаў, якія неаднойчы выкарыстоўваліся ў папярэднія часы.

Вынікі 1985 г. паказалі, што адміністрацыйныя меры ў эканоміцы вырашыць справы не могуць. Таму на XXVII з'ездзе КПСС, які адбыўся ў лютым 1986 г., прыйшлі да высновы, што канцэпцыю паскарэння трэба скіраваць і на грамадскія адносіны. З'езд зацвердзіў новую Праграму партыі, у якой замест палажэнняў аб пабудове камунізму, быў абвешчаны курс на ўдасканальванне сацыялізму. Была зацверджана стратэгічная мэта – да 2000 г. падвоіць эканамічны патэнцыял, а таксама кожнай сям'і даць асобную кватэру. Для вырашэння гэтых задач планавалася пераадолець прычыны, якія стрымлівалі дынамічнае развіццё эканомікі, павесці рашучую барацьбу з бюракратызмам і іншымі негатыўнымі з'явамі. У студзені 1987 г. адбыўся Пленум ЦК КПСС, на якім канстатавалася пашырэнне крызісных з'яў у грамадстве і выказана рашучасць каманды М.С. Гарбачова прадоўжыць пераўтварэнні, якія цяпер атрымалі назву "курс на перабудову". Была выказана думка аб неабходнасці ўдаска-нальвання сацыялізму з дапамогай шырокіх працоўных мас, інтэнсі-фікацыі эканомікі на падставе дасягненняў навукі і тэхнікі. Стрыжнем пераўтварэнняў аб'яўлялася дэмакратызацыя ўсіх сфер жыцця савецкага грамадства, рэфармаванне палітычных інстытутаў і на гэтым падмурку стварэнне новай

мадэлі грамадства – сацыялізму з чалавечым тварам. Быў выстаўлены лозунг "Больш дэмакратыі, больш сацыялізму!".

Першапачаткова значную ролю ў дэмакратызацыі грамадскага жыцця адыграла абвешчаная ў сярэдзіне 1987 г. галоснасць. На старонках часопісаў і газет, у тэле - і радыёперадачах разгарнулася палеміка аб умовах грамадскага жыцця, шляхах абнаўлення сацыялізму і паскарэння рэформы. Развіццё публічнасці, якое пачалося зверху, даволі хутка ахапіла шырокія слаі грамадскасці і пераўтварылася ў магутную плынь, спыніць якую каманда М.С. Гарбачова ўжо не здолела. У краіне ўзнікаюць нефармальныя клубы і аб'яднанні, дзе вядуцца дыскусіі па ўсіх пытаннях палітычнага і грамадскага жыцця, была істотна абмежавана роля цэнзуры.

На Беларусі на хвалі публічнасці ўзрасла цікавасць да праблем нацыянальнай культуры і яе вытокаў. Гэта знайшло адлюстраванне ва ўтварэнні шматлікіх нефармальных аб'яднанняў па вывучэнню літаратурнай і гістарычнай спадчыны, клубаў па краязнаўству, сярод якіх вылучаліся "Талака", "Паходня", "Узгор'е", "Рунь" і іншыя. Арганізаваліся беларускія культурныя таварыствы ў Маскве, Літве, Латвіі і Эстоніі. Вялікую зацікаўленасць выклікалі працэсы дэсталінізацыі грамадства і пазбаўлення яго ад рэцыдываў застойнага часу. У прэсе і артыкулах друкаваліся матэрыялы, у якіх ўтрымліваліся негатыўныя адзнакі не толькі Сталіна і яго эпохі, але і ролі Леніна, Кастрычніцкай рэвалюцыі, партыі бальшавікоў у першыя гады Савецкай улады. Пачаўся новы этап рэабілітацыі. У верасні 1987 г. была створана камісія Палітбюро ЦК КПСС па дадатковаму вывучэнню матэрыялаў, якія былі звязаны з рэпрэсіямі 30-40-х і пачатку 50-х гадоў.

14 чэрвеня 1988 г. рашэннем Савета Міністраў БССР была створана ўрадавая камісія, якая прыйшла да высновы аб знішчэнні ў лясным масіве Курапаты пад Мінскам на працягу 1937-1941 гг. не менш 30 тыс. грамадзян. Былі выяўлены месцы масавых расстрэлаў у Мазыры, Барысаве, Гомелі, Віцебску, Оршы і іншых мясцінах Беларусі.

У канцы 1987 г. рэспубліканская пракуратура пасля ўсебаковай праверкі спыніла крымінальную справу вядомага дзяржаўнага і грамадскага дзеяча, Старшыні першага часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі пісьменніка З. Жылуновіча (Цішкі Гартнага)за адсутнасцю ў яго дзеяннях саставу злачынства. Бюро ЦК КПСС прыняло рашэнне аб яго партыйна-палітычнай рэабілітацыі і аднаўленні ў партыі з кастрычніка 1918 г. Усяго ў 1988 г. на Беларусі было рэабілітавана 832 чалавекі, а на пачатку 1993 г. іх колькасць павялічылася да 130 тыс. такіх асоб. Прымаліся меры па забеспячэнню правоў рэабілітаваных і іх родных, кампенсацыі нанесеных матэрыяльных страт.

Пашырэнне дэмакратызацыі ў грамадстве было немагчыма без рэформы палітычнай сістэмы. На XIX канферэнцыі КПСС, якая адбылася ў чэрвені-ліпені 1988 г., падкрэслівалася, што няўдачы ў правядзенні рэформ звязаны з кансерватызмам партапарату, камандна-адміністрацыйнай сістэмай, бюракратызмам, якія складалі галоўнае звяно "механізма тармажэння". Адсюль была зробле на выснова аб неабходнасці правядзення

радыкальных змен палітычнай сістэмы з абавязковай адмовай партыі ад сваёй кіруючай функцыі і перадачай дзяржаўнай улады Саветам.

У снежні 1988 г. у адпаведнасці з рашэннямі XIX парткан-ферэнцыі, 12-я нечарговая сесія Вярхоўнага Савета СССР прыняла Закон "Аб зменах і дапаўненнях Канстытуцыі (Асноўнага закона) СССР", згодна з якім было вырашана склікаць з'езд народных дэпутатаў і стварыць пастаянна працуючы Вярхоўны Савет СССР. Было вырашана абраць з'езд у колькасці 2250 народных дэпутатаў. Пры гэтым дзве трэці павінны былі абірацца насельніцтвам па тэрытарыяльных акругах на альтэрнатыўнай аснове, а трэцяя частка – прадстаўляць розныя грамадскія арганізацыі, у тым ліку і КПСС.

Падрыхтоўка да выбараў народных дэпутатаў СССР, якія былі прызначаны на сакавік 1989 г., у Беларусі, як і ва ўсёй краіне, праходзіла ў абставіях вялікай актыўнасці насельніцтва, адкрытай і напружанай барацьбы. Гэта былі першыя за многія дзесяцігоддзі свабодныя выбары, калі грамадзяне атрымалі магчымасць вылучаць і выбіраць у вышэйшы орган дзяржаўнай улады сваіх прадстаўнікоў. Усяго ад Беларусі на з'езд было абрана 60 народных дэпутатаў. 25 мая 1989 г. пачаў сваю работу Першы з'езд народных дэпутатаў СССР, які ста ў арэнай вострай палітычнай дыскус іі. З'езд абраў М.С. Гарбачова Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР - пастаянна працуючага парламента, прыняў рашэнне аб неабходнасці распрацоўкі новай канстытуцыі, зацвердзіў вышэйшых дзяржаўных кіраўнікоў, утварыў парламенцкія камісіі.

У сярэдзіне сакавіка 1990 г. адбыўся III з'езд народных дэпутатаў, які адмяніў 6-ты артыкул Канстытуцыі СССР. Аднак асноўную ўвагу дэлегаты надавалі пытанню аб увядзенні пасады Прэзідэнта СССР. Частка дэпутатаў патрабавала, каб яго абранне адбылося ў выніку ўсенароднага галасавання, другая – з'ездам. Ва ўмовах, калі скараціўся давер да М.С. Гарбачова і партыі ў цэлым, адзіным сродкам, каб яму ўтрымацца пры ўладзе, станавілася дасягненне прэзідэнцкай пасады. Абранне першага Прэзідэнта СССР адбылося непасрэдна на з'ездзе 15 сакавіка 1990 г. М.С. Гарбачоў атрымаў каля 60% галасоў народных дэпутатаў.

Важную ролю ў палітычнай рэформе адыграла абнаўленне вы-барчай сістэмы ў саюзных і аўтаномных рэспубліках, у тым ліку і ў Беларусі. У кастрычніку 1989 г. сесія Вярхоўнага СаветаБССР прыняла Закон аб выбарах народных дэпутатаў Беларускай ССР і аб выбарах народных дэпутатаў мясцовых Саветаў. Пашыраліся дэмакратычныя асновы выбараў і працоўныя атрымалі магчымасць абіраць дэпутатаў з некалькіх кандыдатур. Але па прыкладу саюзнага заканадаўства рэспубліканскі закон захаваў права абрання ў Вярхоўны Савет БССР 50 дэпутатаў ад грамадскіх арганізацый: Беларускай рэспубліканскай арганізацыі ветэранаў вайны і працы, таварыстваў інвалідаў.

Выбары пановаму ў Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы адбыліся 4 сакавіка 1990 г. У большасці выбарчых акруг на 310 месцаў у беларускім парламенце прэтэндавала 1769 кандыдатаў. Але толькі 98 народных дэпутатаў рэспублікі былі абраны пасля першага тура галасавання. Выбарчая кампанія пераўтварылася ў сапраўдны марафон і нават пасля некалькіх

паўторных выбараў у канцы 1991 г. заставаліся вакантнымі 11 месцаў у Вярхоўным Савеце рэспублікі.

Такая ж сітуацыя назіралася і ў мясцовых Саветах. Тым не менш, у выніку выбараў значна абнавіліся Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, клад мясцовых Саветаў, ажывілася іх работа, узмацніліся сувязі з працоўнымі калектывамі. У адпаведнасці з рэформай палітычнай сістэмы ў 1990 г. быў прыняты Закон СССР "Аб грамадскіх арганізацыях". Насельніцтва атрымала правы на стварэнне суполак і таварыстваў, а таксама палітычных партый. Але ў рэспубліцы нефармальныя аб'яднанні пачалі ўзнікаць значна раней. У чэрвені 1989 г. на з'ездзе ў Вільнюсе арганізацыйна аформіўся Беларускі народны фронт "Адраджэнне". У праграмнай заяве было падкрэслена, што БНФ выступае за перабудову грамадства на прынцыпах дэмакратыі і сацыяльнай справядлівасці, прававую дзяржаву, рэальны суверэнітэт Беларусі. Народны фронт стварыў у Вярхоўным Савеце парламенцкую апазіцыю.

Тэма 58. Сацыяльна-эканамічнае становішча ў 40-х – 80-х гг. XX ст.

1 Развіццё прамысловасці і транспарту. Разгортванне навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. З'яўленне новых галін вытворчасці. Здабыткі і праблемы эканомікі ў 70-я-80-я гг.

Цэнтралі-заваная сістэма кіраўніцтва народнай гаспадарка й з'яўлялася даволі эфектыўнай у гады індустрыялізацыі, калектывізацыі, пасляваеннага аднаўлення. Яна забяспечвала высокія тэмпы росту эканомікі ва ўмовах шырокага выкарыстання экстэнсіўных формаў і метадаў развіцця. Аднак гэты механізм не адпавядаў часу НТР. Пошук новых шляхоў стымулявання вытворчасці адбываўся ў межах старой адміністрацыйна-каманднай сістэмы.

У адпаведнасці з законам "Аб далейшым удасканаленні арганізацыі кіравання прамысловасцю і транспартам" (май 1957 г.) у БССР па, сутнасці, была ўведзена тэрытарыяльная сістэма кіравання эканомікай, утвораны адзін эканамічны раён і ліквідавана дзевяць міністэрстваў. Для кіравання саюзна-рэспубліканскай прамысловасцю і будаўніцтвам быў створаны Савет народнай гаспадаркі БССР, падпарадкаваны Савету Міністраў рэспублікі.

Набліжэнне кіравання да вытворчасці мела пэўнае станоўчае значэнне, што выявілася ў павышэнні ролі мясцовых органаў, у разбурэнні ведамасных перашкод у межах беларускага эканамічнага раёна. Саўнаргасы садзейнічалі лепшаму выкарыстанню мясцовых рэсурса ў, узмацненню спецыялізацыі і кааперавання вытворчасцей, арганізацыі вытворчых аб'яднанняў.

Акцэнт быў зроблены на развіцці цяжкай прамысловасці, асабліва машынабудавання і металаапрацоўкі. На Магілёўскім металургічным заводзе ў 1957 г. выпушчаны першы беларускі пракат.

Пасля арганізацыі вытворчасці аўтамабільных агрэгатаў і вузлоў на спецыялізаваных заводах у Гродна і Баранавічах з варотаў Мінскага

аўтамабільнага завода выйшлі першыя 6-7-тонныя бартавыя машы-ны, самазвалы і цягачы. Вытворчасць аўтамабіляў грузападымаль-насцю 25 тон і больш была сканцэнтравана на Беларускім аўтамабіль-ным заводзе ў Жодзіне. На Мінскім трактарным заводзе з 1963 г. пачалася вытворчасць новага трактара МТЗ-50. Па эксплуатацыйных якасцях ён перасягаў папярэднія маркі машын і не саступаў лепшым замежным узорам трактароў свайго класа. Павялічыўся выпуск сельскагаспадарчай тэхнікі. Далейшае развіццё атрымала станкабудаванне.

Увод у эксплуатацыю Бярозаўскай ДРЭС (што давала ў 1965 г. амаль у 5 разоў больш энергіі, чым усе электрастанцыі рэспублікі ў 1940 г.), будаўніцтва новых ліній электраперадачы дазволілі стварыць адзіную Беларускую энергасістэму.

Узніклі і новыя галіны прамысловасці: радыёэлектронная, электратэхнічная, кабельная, нафтаперапрацоўчая, дакладнае прыбора-будаванне, вытворчасць сінтэтычных смол. На аснове Старобінскага радовішча калійных соляў, прывазных кольскіх апатытаў і прыроднага газу з Украіны ў Салігорску пачала стварацца буйная база па выгворчасці мінеральных угнаенняў. Беларусь стала адным з галоўных раёнаўСССР па вытворчасці калійных угнаенняў.

Буйным аб'ектам вялікай хіміі стаў Гродзенскі азотнатукавы завод, першая чарга якога ўведзена ў строй у 1963 г. У гэтым самым годзе пачалося будаўніцтва Гомельскага суперфасфатнага завода. На карце рэспублікі з'явіліся новыя гарады – Наваполацк, Салігорск, Светлагорск.

Разам з тым ужо на XXV з'ездзе КПБ (1961) сур'ёзную трывогу выклікаў шэраг негатыўных з'яў у развіцці эканомікі. Адставала газіфікацыя, нездавальняючым было будаўніцтва ў хімічнай прамысловасці. Значная колькасць прадпрыемстваў выпускала прадукцыю састарэлых узораў, якая не карысталася попытам.

Знізіліся тэмпы росту валавой прадукцыі прамысловасці. На пачатку 1960-х гг. пачалі выяўляцца недахопы ў сістэме кіравання прамысловасцю па тэрытарыяльнаму прынцыпу. Шматступеньчатасць і паралелізм выклікалі многія непатрэбныя ўзгадненні. Укараненне новых узораў машын стрымлівалася з-за адсутнасці комплекснага планавання мерапрыемстваў па новай тэхніцы.

Недастатковай была ўвага да развіцця лёгкай прамысловасці. Рост галін групы "А" апярэджваў рост вытворчасці прадметаў народнага спажывання (група "Б") нават у большых памерах, чым было прадугледжана сямігадовым планам. Было недавыканана заданне сямігодкі па вытворчасці такіх прамысловых вырабаў, як ільновалакно, фотаапараты, хімічныя валокны і іншыя.Галоўнай прычынай замаруджвання тэмпаў эканамічнага развіцця на пачатку 60-х гг. з'яўлялася вычарпанне маічымасцей экстэнсіўнага развіцця, неадпаведнасць паміж значным павелічэннем аб'ёму вытворчасці, узросшай складанасцю структуры гаспадаркі, эканамічных сувязяў і тагачаснымі метадамі планавання і эканамічнага стымулявання вытворчасці.

У сакавіку 1965 г. на Пленуме ЦК КПСС было разгледжана пытанне "Аб неадкладных мерах па далейшаму развіццю сельскай гаспадаркі СССР", у верасні – "Аб паляпшэнні кіравання прамысловасцю, удасканаленні планавання і ўзмацненні эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці". Меры, якія ажыццяўляліся на аснове рашэнняў пленумаў, назвалі
эканамічнай рэформай. Фактычна рэформа складалася з дзвюх частак. Па-першае, у верасні 1965 г. было вырашана вярнуцца да гэліновага прынцыпу кіраўніцтва прамысловасцю. На Беларусі ў кастрычніку 1965 г. замест аднаго саўнаргаса былі створаны 6 міністэрстваў саюзна-рэспубліканскіх і 3 рэспубліканскіх (мясцовай прамысловасці, тарфяной, сельскага будаўніцтва). Па-другое, вызначаліся мерапры-емствы па ўдасканаленню планавання і эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці. Змянялася сістэма тэхніка-эканамічных
паказчыкаў, якія даводзіліся прадпрыемствам зверху (замест 109 толькі 9). Вышэйстаячыя органы павінны былі планаваць толькі асноўныя заданні: аб'ём рэалізацыі прадукцыі, асноўную намен-клатуру вырабаў, фонд зарплаты, прыбытак, рэнтабельнасць і інш.

Прадпрыемствы атрымалі права самастойна вызначаць рост прадукцыйнасці працы, зніжэнне сабекошту прадукцыі, колькасць персаналу. Вытворчасць валавой прадукцыі, як асноўны паказчык, быў заменены на аб'ём яе рэалізацыі. Меркавалася, што гэта выкліча прамую зацікаўленасць у выпуску тавараў, якія б карысталіся попытам у спажыўца. Ва ўмовах гаспадарчай рэформы па-новаму вырашаліся пытанні матэрыяльнага заахвочвання работнікаў. З прыбытку прадпрыемстваў, акрамя фонду развіцця вытворчасці, ствараліся фонды для матэрыяльнага заахвочвання і правядзення сацыяльна-культурных мерапрыемстваў.

Такім чынам, прадугледжвалася адначасовае ўмацаванне цэнтралізаванага кіравання народнай гаспадаркай і пашырэнне гаспадарчай самастойнасці, ініцыятывы калектываў прадпрыемстваў. Зразумела, што такое спалучэнне эканамічных і дырэктыўных метадаў было цяжка сумяшчальным.

Новыя метады планавання і эканамічнага стымулявання, што ўкараняліся з 1966 г., з‘явілі ся адметнай рысай восьмага пяцігадовага нлана (1966-1970). Першым у рэспубліцы пачаў працавацьпа-новаму калектыў Гомельскага шклозавода, а ўсяго ў 1966 г. – 40 прадпрыемстваў. Яны ў наступным годзе самі прасілі вышэйшыя органы павялічыць ім планавыя заданні па аб'ёму рэалізацыі больш чым на 60 млн. рублёў і па прыбытку – на 20 млн рублёў. Распаўсюджванне рэформы ўшыр на Беларусі ішло даволі паспяхова, бо першымі на новыя ўмовы гаспадарання сталі пераходзіць лепшыя ў сваіх галінах прадпрыемствы. Натуральна, яны мелі магчымасць захаваць сваіх рабочых. Але калі рэформа распаўсюдзілася на цэлыя галіны, то стала відавочным: міністэрствы па-ранейшаму забіраюць сродкі ў прадпрыемстваў перадавых і перадаюць адстаючым. Галоўным паказчыкам дзейнасці прадпрыемства заставаўся план. Перадавіком лічыўся не той, хто ўзяў больш напружанае заданне, а той, хто перавыканаў план. Усялякае

перавыкананне плана між тым выклікала змену прапорцый, устаноўленых народнагаспадарчым планам і садзейнічала арытміі вытворчасці. Зразумела, што ўсё вышэйпералічанае вызывалася да жыцця паступовым узмацненнем адміністрацыйнай сістэмы. Міністэрствы захавалі ў сваіх руках важнейшы сродак уздзеяння на прадпрыемствы – цэнтралізаванае разме ркаванне фондаў. Прадпрыемства не магло нават абскардзіць рашэнні вышэйстаячага кіраўніцтва, бо не быў выпрацаваны дакладны механізм юрыдычнай абароны правоў працоўнага калектыву.

Не дала неабходнага эфекту і механічная замена тэрытарыяльнага прынцыпу кіравання галіновым. Ужо ў восьмай пяцігодцы (1966-1970) асобныя міністэрствы парушылі тыя сувязі, якія склаліся ў рэспубліцы.

У другой налове 1960-х гг. асабліва выразна акрэсліліся супярэчнасці, увогуле характэрныя для развіцця беларускай прамысловасці ў пасляваенныя дзесяцігоддзі. З аднаго боку, высокія тэмпы развіцця электраэнергетыкі, нафтаздабываючай, нафтаперапрацоўчай, хімічнай, наліўнай прамысловасці, радыёэлектронікі, прыбора-будаўніцтва, высокадакладнага станкабудавання. З другога, нізкі ўзровень механізацыі дапаможных працэсаў. Прыкладна палова ўсіх рабочых прамысловасці БССР была занята на дапаможных працэсах.

У прадпрыемстваў не было эканамічнай зацікаўленасці ў зніжэнні ўдзельнай вагі ручной працы, у змяншэнні колькасці працуючых, бо гэта было звязана з памяншэннем планавых памераў фонду заработнай платы. Апошні паказчык кіраўнікі заводаў і фабрык, наадварот, імкнуліся павялічыць, таму што ў працэнтах да яго вызначаліся фонды матэрыяльнага заахвочвання сацыяльна-культурных і жыллёвых мерапрыемстваў. Як вынік, 50% прыросту прамысловай прадукцыі ў 1966-1970 гг. было атрымана за кошт павелічэння колькасці працуючых. Адпаведна павялічылася міграцыя з вёскі ў горад, што сур'ёзна адбілася на вырашэнні жыллёвай праблемы, якасці бытавога абслугоўвання насельніцтва гарадоў.

Здабыткі і праблемы 1970-1980-х гг. На пачатку ж 1970-х гг. экстэнсіўныя фактары сябе амаль вычарпалі. Партыйнае кіраўніцтва ўсё часцей гаварыла аб дэфіцыце працоўных рэсурсаў. Абсалютны сярэднегадавы прырост насельніцтва працаздольнага ўзросту ў 1971-1978 гг. быў вышэйшым, чым у 1961- 1970 гг. Прыкметна павысіўся ўзровень адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі працоўных. Але ў сярэдзіне 70-х гг. была дасягнута высокая ступень уключэння ў грамадскую вытворчасць працаздольна га насельніцтва (звыш 90%), у выніку чаго рэзка скараціліся дадатковыя крыніцы рабочай сілы. Калі ўлічыць, што больш палавіны ўсіх рабочых прамысловасці была занята ручной працай, то можна адзначыць, што дэфіцыт рабочай сілы ў значнай ступені быў выкліканыштучна. Забеспячэнне тэмпаў росту прадукцыі прамысловасці шляхам пабудовы новых прадпрыемстваў прыводзіла да распыленасці капітальных укладанняў, у выніку чаго з году ў год павялічваліся аб'ёмы незавершанага будаўніцтва. Улічваючы ўсе вышэйазначаныя недахопы, П.М. Машэраў на XXVII з'ездзе КПБ (1976) падкрэсліў, што "ў прамысловай,

калгасна-саўгаснай і будаўнічай вытворчасці мы яшчэ не можам гаварыць аб сапраўдным, паўсюдным пераходзе на рэйкі ўсебаковай інтэнсіфікацыі". Барацьба за інтэнсіфікацыю грамадскай вытворчасці, карэннае паляпшэнне якасных параметраў у эканоміцы вызначыліся як галоўная задача на 1976-1980 гг.

Пачынаецца пошук шляхоў адміністрацыйнага стымулявання развіцця эканомікі, пошук новых эфектыўных паказчыкаў і адзнак іх выканання. Так, 1 студзеня 1975 г. быў уведзены новы парадак ацэнкі работы прадпрыемства, згодна з якім план па рэалізацыі лічыўся выкананым толькі тады, калі былі выкананы дагаворныя абавязкі перад заказчыкамі. Парушальнікі дысцыпліны паставак пазбаўляліся на 15-20 і больш працэнтаў фонду матэрыяльнага заахвочвання.

У другой палове 1970-х гг. былі пабудаваны дзесяткі новых буйных прадпрымстваў. У іх ліку Жлобінская фабрыка штучнага футра, Слонімская камвольна-прадзільная фабрыка, Гродзенскае вытворчае прадзільнанітачнае аб'яднанне. Ішло далейшае ўзмацненне канцэнтрацыі вытворчасці. У 1980 г. на Беларусі дзейнічала каля 200 вытворчых і навукова-вытворчых аб'яднанняў, на долю якіх прыходзілася звыш 50% усяго аб'ёму рэалізаванай прадукцыі, тады як у 1975 г. іх было напалову менш.

Але разам з тым зніжаюцца асноўныя эканамічныя паказчыкі. У 1982 г. сярэднегадавы прырост нацыянальнага даходу паменшыўся да ўзроўню – 3,4% . Характэрнай рысай гаспадарчага механізму становіцца яго "затратнасць". Пераважна бюджэтнае фінансаванне капіталаўкладанняў і строга фондавае размеркаванне матэрыяльна-тэхнічных сродкаў прыводзіла да таго, што любыя выдаткі не закраналі непасрэдна інтарэсы вытворцаў. Усе страты, звязаныя з прастоем тэхнікі, наяўнасцю залішняга і не ўстаноўленага абсталя-вання, нерацыянальным выкарыстаннем матэрыяльных, энергетыч-ных рэсурсаў, "даўгабудам", цярпела дзяржава.

2 Спробы рэформ у сельскай гаспадарцы. Меліярацыя. Хімізацыя. Харчовая праграма 1982 г.

На пачатку 1960-х гг. назіраецца зніжэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчай прадукцыі, павялічваецца яе сабекошт.Былі вычарпаны магчымасці нарошчвання жывёлагадоўчай прадукцыі шляхам росту пагалоўя. Ужо ў 1960-1961 гг. мяса было выраблена да запланаванага –80% , малака –81% . Пачынаючы з 1962 г., у калгасах і саўгасах рэспублікі ўсё менш атрымліваюць малака ад кожнай каровы, што адпаведна выклікала і змяншэнне валавога

надою, нягледзячы на значны рост грамадскага стагка. На становішчы спраў у сельскай гаспадарцы Беларусі ў першай палове 60-х гг. адмоўна адбіўся нізкі ўзровень кіравання, падрыхтоўкі сельскагаспадарчых кадраў, агранамічнай навукі. Да непажаданых вынікаў прывяла і паспешлівасць у рэарганізацыі МТС (пачалася з 1958 г.). Большасць калгасаў, не маючы сродкаў выкупіць адразу ўсю тэхніку, вымушана была залезці ў даўгі да дзяржавы. Адмоўным фактарам з'явілася адсутнасць у калгасаў сваіх механізатарскіх

кадраў, бо значная частка былых работнікаў МТС засталася ў рамонтных службах ці знайшла іншую працу ў горадзе.

У пачатку 1960-х гг. разгарнулася кампанія па пераўтварэнню калгасаў у саўгасы. Зацікаўленыя гарантаванай аплатай працы ў саўгасе і пенсіяй калгаснікі не пратэставалі супраць страты "сваёй" калектыўнай уласнасці. А дзяржаве даводзілася шукаць новыя сродкі, якіх не хапала.

Істотную небяспеку для сельскай гаспадаркі ўяўляла кампанія па ліквідацыі асабістых гаспадарак, што разгарнулася пад лозунгам непасрэднага пераходу да камунізму. Вялікую шкоду калгаснай і саўгаснай вытворчасці нанеслі парушэнні ў палітыцы цэн на сельскагаспадарчыя прадукты, неабгрунтаваныя перабудовы органаў кіравання, а таксама шматлікія шаблонныя ўказанні па агратэхніцы і заатэхніі, структуры пасяўных плошчаў і іншых пытаннях, што даваліся зверху калгасам і саўгасам без уліку мясцовых умоў.

У сярэдзіне шасцідзесятых гадоў БССР заставалася аграрна-індустрыяльнай краінай. Доля прамысловасці ў нацыянальным даходзе рэспублікі складала 43,8% (у цэлым па СССР – 50,7%). Большая частка насельніцтва рэспублікі па-ранейшаму жыла ў вёсцы. Таму важнае значэнне надавалася развіццю сельскай гаспадаркі. Прадугледжвалася паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнага забеспя-чэння і капітальнага будаўніцтва на вёсцы. Былі ажыццёўлены за-хады супраць спроб адміністрацыйнымі метадамі скараціць дапаможную гаспадарку калгаснікаў. Вызначаўся шэраг мерапрыемстваў па стымуляванню калгасна-саўгаснай вытворчасці. Была спісана запазычанасць калгасам. Значная частка калгаснікаў поўнасцю вызвалялася ад выплаты падатку. Зацвярджаліся цвёрдыя пяцігадовыя планы закупкі сельскагаспадарчай прадукцыі. Той яе часткай, што заставалася пасля выканання дзяржаўнага плана, распара-джаліся калгасы і саўгасы. Уводзіліся новыя закупачныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю, павялічаныя ў сярэднім больш чым на 50% , а на прадаваемую прадукцыю дадаткова (звыш плана) яшчэ на 50% .

У выніку ў 1965 г. з усіх калгасаў рэспублікі нерэнтабельнымі засталіся толькі 6 гаспадарак, прадукцыйнасць працы ўзрасла на 12% . Рост грашовых даходаў даў магчымасць павялічыць аплату працы. У 1965 г. былі дасягнуты самыя высокія ў параўнанні з папярэднімі гадамі паказчыкі ў(555) сельскай гаспадарцы. Валавы збор збожжа перавысіў максімальныя зборы за лепшыя даваенныя і пасляваенныя гады. Значна ўзрасла ўраджайнасць бульбы. Рост вытворчасці мяса і надояў мал ака амаль у 2 разы перавысілі павелічэнне пагалоўя буйной рагатай жывёлы. У 1960-я гады праводзяцца мерапрыемствы па асушэнню зямель і будаўніцтву саўгасаў на Палессі. За кошт меліярацыі фонд ворыўных зямель калгасаў і саўгасаў Беларусі павялічыўся на 900 тыс. гектараў (на 10%). У гэтай справе ўзніклі і непажаданыя з'явы. Недаацэнка зваротнага водарэгулявання прыводзіла да хуткага зносу тарфянікаў. У 1969 г. была звернута ўвага на будаўніцтва больш дасканалых меліярацыйных сістэм, уводзіліся "гарантыйныя пашпарты" асушаных зямель, ствараліся дзяржаўныя камісіі.

Ва ўмовах адмаўлення прыватнай уласнасці павышэнне эфектыўнасці

сельскагаспадарчай вытворчасці бачылася праз паглыблен-не яе спецыялізацыі і канцэнтрацыі. З канца 1960 –пачатку 70-х гг. партыйнае кіраўніцтва рэспублікі пачынае праводзіць у жыццё курс на стварэнне буйных адкормачных комплексаў. Да працы ў гэтым напрамку натхняў як вопыт ГДР, так і асобных гаспадарак Беларусі, у якіх сабекошт кілаграма свініны склаў крыху больш рубля. Капітальныя ўкладанні на будаўніцтва і сродкі механізацыі накіроўваліся перш за ўсё ў тыя галіны жывёлагадоўлі, на якіх спецыялізаваўся калгас або саўгас. Удасканальвалася спецыялізацыя жывёлагадоўлі ў залежнасці ад месцазнаходжання гаспадарак у адносінах да вялікіх гарадоў і прамысловых цэнтраў.

Пэўны плён спецыялізацыі і канцэнтрацыі жывёлагадоўлі выявіўся. Вытворчасць прадуктаў жывёлагадоўлі ў цэлым па рэспубліцы павялічылася, хаця сабекошт яе застаўся амаль без змяненняў. Восьмая пяцігодка (1966-1970) была найбольш паспяховай за ўсю гісторыю СССР. Правядзенне эканамічнай рэформы дало штуршок развіццю прамысловасці, аднак закранула ў самой эканамічнай сістэме толькі знешнюю структуру. Саўнаргасы былі заменены міністэрствамі, адны паказчыкі другімі, скарацілася іх колькасць.

Рэформа не закранула пытання аб функцыяніраванні грамадскай уласнасці, паколькі лічылі, што ў выглядзе, які склаўся, яна стварае ўсё неабходнае для паспяховага развіцця народнай гаспадаркі. Не падтрыманая палітычнай рэформай, эканамічныя пераўтварэнні не былы даведзены да заканчэння.

Хутка ўзрастала колькасць стратных гаспадарак. У пэўнай ступені гэта адбывалася ў выніку імклівага росту цэн на сродкі вытворчасці (з 1965 па 1985 гг. у сярэднім у 3,5 раза). Такі рост цэн далёка не супадаў з ростам прадукцыйнасці сельскагаспадарчай тэхнікі.

Паступова складвалася і неўспрымальнасць самой калгасна-саўгаснай сістэмы да колькі-небудзь радыкальных змен. Пачуццё гаспадара сярод вяскоўцаў было канчатова згублена. Адчужэнне працаўніка ад сродкаў вытворчасці стала рэальнасцю. Паскорыўся працэс міграцыі з вёскі ў горад. З 1970 па 1984 гг. вясковае насельніцтва ў БССР паменшылася амаль у 1,5 раза.Адмоўна адбілася на забеспячэнні сельскагаспадарчай вытворчасці кваліфікаванымі кадрамі масавых прафесій "старэнне вёскі".

Недастатковая механізацыя вытворчых працэсаў і недахоп людскіх рэсурсаў значна пагаршалі ўмовы працы. Немагчыма было забяспечыць нават вызначаныя згодна закону водпускі. Ненармаваны працоўны дзень, нізкія заробкі садзейнічалі росту так званай "умоўнай міграцыі" – калі пэўная катэгорыя, пераважна мужчынскага насельніцтва, працягвала жыць у вёсцы, а працавала ў раённых цэнтрах, у бліжэйшых гарадах.

Разглядаючы пытанне аб стане сельскагаспадарчай вытворчасці на пачатку 1980-х гг., неабходна адзначыць, што традыцыйна значную таварную частку бульбы, мяса, малака, яек, гародніны складала прадукцыя асабістых гаспадарак (у 1961-1965 гг. –каля 69% усёй прадукцыі жывёлагадоўлі, у 1976-1980 гг. –30%).

Пэўныя спосабы паляпшэнняспраў у сельскай гаспадарцы мелі месца ў 1982

г. Згодна з рашэннямі майскага Пленума ЦК КПСС быў замацаваны статус падсобных гаспадарак калгаснікаў і мерапрыемствы па іх развіццю. Была ліквідавана запазычанасць калгасаў дзяр-жаве, павышаны закупачныя цэны. Аднак не адбылося істотных змен і ў сферы матэрыяльнага заахвочвання калгаснікаў, набліжэння сельскага працаўніка да сродкаў вытворчасці. Таму небяспечныя тэндэнцыі, што выявіліся ў канцы 70- пачатку 80 -х гг., працягвалі дзейнічаць.

3 Матэрыяльны дабрабыт насельніцтва і шляхі яго паляпшэння. Жыллёвае будаўніцтва

У пачатку 1960-х гг. пагоршылася становішча спраў у вытворчасці тавараў масавага попыту і сельскай гаспадарцы, што абвастрыла сацыяльныя канфлікты ў рэспубліцы. Асабліва напружаным быў 1962 г., калі на агульны невысокі ўзровень матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва Беларусі наклаліся вынікі грашовай рэформы 1961 г. і павышэнне цэн на мяса-малочную прадукцыю. Апошняе, напрыклад, падштурхнула да страйку работніц цэха Віцебскай швейнай фабрыкі "Сцяг індустрыялізацыі".

Сітуацыя ў 1962 г. настолькі накалілася, што Прэзідыум Савета народнай гаспадаркі БССР з 31 сакавіка да 14 жніўня гэтага года вымушаны быў 5 разоў звяртацца да сітуацыі на прадпрыемствах. Адзначалася, што ўзрасла колькасць выпадкаў адмаўлення ад работы. І ў вышэйшых эшалонах улады ўсё больш усведамлялася неабходнасць паступовага пераходу да эканамічна абгрунтаваных метадаў кіравання.

3 развіццём адпаведных галін прамысловасці ў 70— 80-я гг. павысіўся дабрабыт насельніцтва. Разам з тым вы творчасць звыклых для нас сёння каляровых тэлевізараў, персанальных камп'ютэраў, відэатэхнікі знаходзілася ў па- чатковым стане. Дасягненнем з'явілася распаўсюджванне пральных машын, халадзільнікаў і пыласосаў, газа- і элек- трапліт.

Значныя сродкі, якія маглі б палепшыць матэрыяльны ўзровень насельніцтва, ішлі на развіццё ваенна-прамысловага комплексу, а выпуск якасных прадуктаў народнага спа-жывання станавіўся другарадным.

Паказчыкам сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР стала паляшпэнне матэрыяльнага становішча працоўных. Былі ўстаноўлены больш высокія мінімальныя ўзроўні зара-ботнай платы і пенсій. Істотна павысілася аплата працы кал-гаснікаў,якіядагэтагапрацавалітолькізапрацадні. 3 1956 г. калгаснікам сталі назначацца пенсіі па старасці і інваліднасці. Сяляне атрымалі пашпарты і сталі адчуваць сябе паўна-праўнымі грамадзянамі краіны. Шырока вялося жыллёвае будаўніцтва. Сталі хутка будаваць 5-павярховыя дамы з сілікатных блокаў, так званыя «хрушчоўкі», паклаўшы пачатак панэльнаму дом.абудаванню. Толькі за 10 гадоў — з 1956 па 1965 гг. — у БССР больш за 3 млн чалавек атрымалі жыллё. Але патрэбнасць у жыллі так і не была задаволена.

4 Чарнобыльская катастрофа і яе наступствы для Беларусі.

У ноч з суботы на нядзелю 26 красавіка 1986 г. аварыя на Чарнобыльскай атамнай станцыі (ЧАЭС) падзяліла гісторыю Беларусі на да і паслячарнобыльскі перыяды.

Як высветлілася потым, аварыя мела глыбінныя прычыны, якія караніліся ў тэхнічным адставанні СССР і сур'ёзных праліках у развіцці атамнай энергетыкі. Непасрэдна 26 красавіка ў выніку непрадуманых дзеянняў дзяжурнай змены (суб'ектыўны фактар) пры наяўнасці слабасцей у канструкцыі рэактара і станцыі ў цэлым (аб'ектыўны фактар) адбыўся выбух на чацвёртым энергаблоку ЧАЭС. Разбурэнне рэактара прывяло да выкіду ў паветра велізарнай колькасці радыеактыўных рэчываў, якія патокамі паветра сталі хутка распаўсюджвацца на велізарныя тэрыторыі.

Прадстаўнікі самых розных прафесій праявілі самаахвярнасць у першыя гадзіны і дні, не дапусцілі пашырэння маштабаў аварыі.

Першасны аналіз сітуацыі паказаў, што непасрэдна ад выбуху ўздзеянню радыяцыі падверглася паўднёвая частка Беларусі. Пазней тэрыторыя інтэнсіўнага забруджвання павялічылася ў раёнах Магілёўскай вобласці, але тут яна з'явілася пераважна ў выніку мэтанакіраванага асаджэння спецрэагентамі радыенуклідаў з радыеактыўных хмараў, якія рухаліся ў напрамку Масквы. У выніку на тэрыторыю Беларусі прыпала 70% усяго радыеактыўнага забруджвання. У гэтай зоне апынулася каля 2 млн. 100 тыс. чалавек (25% беларускага насельніцтва).

Тым часам саюзныя і рэспубліканскія ўлады у першыя дні абралі тактыку ўмаўчання інфармацыі аб маштабах бяды і практычна замарудзілі арганізацыю дзеянняў, якія маглі б паменшыць адмоўныя вынікі для насельніцтва. На другі дзень пасля аварыі аб рэзкім павышэнні радыяцыйнага фону ў паветранай прасторы сваіх краінаў загаварылі прадстаўнікі Швецыі, Нарвегіі, Англіі і інш. Толькі пасля гэтага афіцыйныя СМІ СССР сціпла паведамілі аб аварыі, у выніку якой адбылося "некаторае павышэнне радыяцыйнага фону". І хаця памеры катастрофы станавіліся ўсё больш відавочнымі, беларускае кіраўніцтва (першы сакратар ЦК КПБ М. Слюнькоў) і падначаленыя яму ведамствы працягвалі хаваць ад насельніцтва праўду. У пачатковы перыяд аварыі кіраўніцтва рэспублікі нават адмовілася ад сродкаў, якія выдзяляў саюзны цэнтр для ліквідацыі гэтай бяды. Не звярнулася яно за дапамогай і да міжнароднай супольнасці.

Развіццё падзей прымусіла кіраўніцтва рэспублікі прыняць 4 мая 1986 г. рашэнне аб адсяленні насельніцтва з 30-кіламетровай зоны навокал ЧАЭС, у першую чаргу з Брагінскага, Хойніцкага і Нараўлянскага раёнаў. Да канца года ў чыстыя месцы было адселена 27,7 тыс. чалавек, а на Украіне, дзе плошчы забруджвання былі значна меншыя, адсялілі каля 100 тыс. Да таго ж былі дапушчаны сур'ёзныя памылкі і пралікі ў справе арганізацыі работы, тэрмінах выканання, інфармавання насельніцтва, забеспячэння яго прасцейшымі сродкамі абароны ад радыяцыі, прыборамі кантролю і дазіметрыі, аховы маёмасці і г. д.

Падыходы да вынікаў аварыі пачалі мяняцца пасля першых альтэрнатыўных выбараў 1989 г. Вярхоўнага Савета БССР. Новы склад Савета зацвердзіў Дзяржаўную праграму ліквідацыі ў Беларускай ССР наступстваў

аварыі на Чарнобыльскай АЭС на 1990-1995 гг., якую распрацаваў урад Беларусі.

У межах праграмы былі вызначаны дадатковыя захады па ахове здароўя насельніцтва: пачалося адсяленне ў чыстыя раёны яшчэ каля 100 тыс. чалавек, былі складзены і апублікаваны карты забруджанасці тэрыторыі рэспублікі, створаны Інстытут радыяцыйнай медыцыны і інш. Каб забяспечыць з боку дзяржавы сацыяльную падтрымку лю-дзей, якія пацярпелі ад аварыі, Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь у 1991-1992 гг. прыняў некалькі новых законаў.

Намаганні новага кіраўніцтва Беларусі былі падтрыманы міжнароднымі арганізацыямі. Генеральная Асамблея ААН прыняла спецыяльную рэзалюцыю аб аказанні Беларусі міжнароднай дапамогі. Прыкладна ў гэты ж час беларускае кіраўніцтва, навукоўцы і грамадскасць рашуча і аргументавана выступілі супраць заяваў чыноўнікаў МАГАТЭ (Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі) аб нібыта завышаных ацэнках небяспекі радыяцыйнага ўздзеяння на здароўе людзей і забруджанасці навакальнага асяроддзя. Цень Чарнобыля ўскосна закранула аўтарытэт міжнароднга атамнага кансорцыума, які ў першую чаргу занепакоіўся аб сваёй будучыні. Невыпадкова дзеянні прадстаўнікоў МАГАТЭ ў публікацыях, у тым ліку замежных, расцэньваліся як змова міжнароднага атамнага лобі, яго нежаданне ў пэўнай ступені падзяліць адказнасць за тэхнагенную катастрофу, якая ў гіганцкіх маштабах змяніла стан прыроднага асяроддзя і зрабіла яго небяспечнай для чалавека.

У выніку аварыі небяспечнымі радыенуклідамі засмечана 23% тэрыторыі краіны: больш за 1/3 усяго вырваўшагася цэзія-137, які распаўсюджваецца праз прадукты харчавання і асядае ў мышачных тканках, выпала на Беларусь; 10% тэрыторыі ўтрымліваюць стронцый-90 і 2% - выключна небяспечныя ізатопы плутонія. Зараз каля 70% калектыўнай дозы апраменьвання насельніцтва Беларусі выклікана радыенуклідамі праз прадукты харчавання.

Аварыя разбурыла ўклад жыцця соцень тысяч людзей і нарадзіла пастаянны стрэс у насельніцтва. Забруджаныя раёны пакінулі 335 тыс. чалавек, ліквідавана 415 населеных пунктаў, 607 школаў і дашкольных устаноў, 97 бальніц.

Яна падарвала эканамічны патэнцыял краіны. У зоне забруджанасці знаходзіцца 47% унікальных фармовачных пяскоў, 91% пяскоў для вытворчасці шкла, 13% запасаў розных глінаў, 5 млн. кубаметраў будаўнічага пяску, гравію і гліны, 13,5 млн. т. торфу, 7,7 млн. т. мелу, прыпынена разведка тэрыторый, перспектыўных на газ і нафту ў аб'ёме, прыкладна, 52 млн. тон. Агульныя страты склалі 235 млрд. долараў ЗША, або 32 гадавых рэспубліканскіх бюджэты 1985 г.

Чарнобыль увайшоў у гісторыю не толькі як вынік грубых памылак людзей і недасканаласці сістэмы, але і як суровае папярэджанне чалавецтву. Ен высветліў яшчэ адну важную ісціну - неабходнасць праўдзівага інфармавання насельніцтва. Утойванне праўды стварае дадатковыя пагрозы.

Тэма 58. Культура і навука ў БССР.

1 Аднаўленне і развіццё сярэдняй і вышэяшай адукацыі, клубаў, бібліятэк.

Падрыхтоўка навукова-педагагічных кадраў.

Другая сусветная вайна з усёй відавочнасцю паказала ролю навукі, тэхнікі ва ўсіх сферах жыцця. Невыпадкова таму ў пасляваенны перыяд савецкае кіраўніцтва надае развіццю фундамен-тальнай навукі, рэфармаванню адукацыі, культурнаму будаўніцтву прыярытэтнае значэнне. За гады вайны на Беларусі была амаль поў-насцю знішчана матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў навукі, адукацыі і культуры, загінулі многія навукоўцы і выкладчыкі. Але да 1950 г. школьная сетка ўрэспубліцы была адноўлена.

Рэформа ў сістэме народнай адукацыі другой паловы 50-х гадоў праводзілася ў рэчышчы агульных палітычных пераўтварэнняў. Асноўным яе стрыжнем з'яўлялася ўвядзенне політэхнічнага навучання і цесная сувязь яго з працоўным выхаваннем. У снежні 1958 г. Вярхоўны Савет СССРпрыняў Закон "Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці народнай адукацыі СССР", згодна з якім сямігадовыя школы пераўтвараліся ў васьмігадовыя, сярэднія – у агульнаадукацыйныя адзінаццацігадовыя з вытворчым навучаннем. Ствараліся школы-інтэрнаты, у якіх вучыліся дзеці-сіраты і дзеці з малазабяспечаных сем'яў. Ва ўсіх сярэдніх і большасці васьмігадовых школах былі адкрыты майстэрні. Школы пераходзілі на кабінетную сістэму. Аднак у 1964 г. школы былі зноў пераведзены на дзесяці-гадовы тэрмін навучання. Прафесійная падрыхтоўка стала неабавязковай.

Новая хваля мадэрнізацыі ў народнай адукацыі пачалася ў другой палове 60-х і пачатку 70-х гг. У школах уводзіліся новыя праграмы. Пачатковая школа перайшла на трохгадовы тэрмін навучання. Дзіцячыя дашкольныя ўстановы пачалі ператварацца ў першую ступень падрыхтоўкі ў школу. Да 1975 г. быў завершаны пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі.

Пашыралася падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых праз прафесійна-тэхнічныя вучылішчы. Калі ў 1961 г. іх было 103, то ў 1985 г. -240. У 70-я гады прафтэхвучылішчы рэспублікі перайшлі на сярэднюю сістэму адукацыі.

Развівалася вышэйшая і сярэдняя спецыяльная школы Беларусі. Былі адкрыты Беларускі тэатральны інстытут – 1945 г., Гро дзенскі сельскагаспадарчы інстытут – 1951 г., Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту ў Гомелі – 1953 г., Беларускі інстытут механізацыі і сельскай гаспадаркі – 1954 г., Беларускі інстытут замежных моў. У 1950/51 навучальным годзе налічвалася 29 ВНУ, а студэнтаў было на 10 тыс. больш, чым перад вайной.

За 1960-1985 гг. колькасць сярэдніх навучальных устаноў павялічылася з 102 да 139, а навучэнцаў у іх – з 62,6 тыс. да 160,4 тыс. У 60-70-я гг. вышэйшая школа Беларусі развівалася вельмі дынамічна. Былі адкрыты новыя навучальныя ўстановы: Мінскі радыётэхнічны інстытут, Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці, Брэсцкі інжынерна-будаўнічы, Мінскі інстытут культуры, Магілёўскі тэхналагічны, На-ваполацкі і Гомельскі політэхнічныя інстытуты. У 1969 г. на базе Гомельскага педагагічнага інстытута створаны Гомельскі дзяржаўны

універсітэт. У 1977 г. Гродзенскі педагагічны інстытут быў пераўтвораны ў Гродзенскі дзяржаўны універсітэт. Цэнтрам універсітэцкай адукацыі заставаўся Белдзяржуніверсітэт, уякім навучалася 17 тыс. студэнтаў. У 1985 г. у 33 ВНУ навучалася 182 тыс. студэнтаў, а агульны лік выпускнікоў ВНУ вырас з 10 тыс. у 1960 г. да 31,9 тыс. у 1985 г. Сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы забяспечвалі патрэбнасці народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі.

2 Дзейнасць АН БССР.

Значныя зрухі былі зроблены ў развіцці навукі. Праводзілася работа па пашырэнню сеткі навукова-даследчых устаноў, умацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы, падрыхтоўцы навуковых кадраў. Акадэмічныя ўстановы пачалі дзейнічаць у Гомелі, Магілёве, Гродне, Віцебску. Быў адкрыты шэраг новых інстытутаў і лабараторый у галіне фізіка-тэхнічных, хімічных, біялагічных і іншых навук.

Далейшае развіццё атрымала галіновая навука. У 1970 г., напрыклад, у рэспубліцы працавала 18 спецыялізаваных навукова-даследчых інстытутаў у галіне сельскай гаспадаркі. Колькасць навуковых і навукова-педагагічных работнікаў павялічылася з 4,4 тыс. у 1956 г. да 42,4 тыс. у 1985 г. Лік дактароў навук павялічыўся са 134 да 1011, кандыдатаў –з 1606 да 13,1 тыс.

Станаўленне Беларусі як буйнога цэнтра машынабудавання, станка-і прыборабудавання выклікалі патрэбу ў паскораным развіцці фізіка-тэхнічных навук. У прыватнасці ў галіне спектраскапіі, люмінесцэнцыі, квантавай электронікі, парашковай металургіі, тэхнічнай кібернетыкі, фізікі ядзерных рэактараў вучоныя рэспублікі займалі значнае месца ў СССР. Беларускія геолагі распрацавалі асноўныя заканамернасці будовы зямной кары. Дзякуючы іх распрацоўкам у БССР былі знойдзены радовішчы калійнай солі, нафты, граніту.

На працягу 1956-1985 гг. вучоныя Беларусі атрымалі 26 Дзяржаўных прэмій СССР і 57 Дзяржаўных прэмій БССР. Званне Героя Сацыялістычнай Працы было прысвоена М. М. Аляксандраву, П.І. Альсміку, Т.В. Бірыч, М.А. Барысевічу, Т.Н. Кулакоўскай, В.Ф. Купрэвічу, М.Д. Мухіну, А.Н. Сеўчанку, Б.І. Сцяпанаву, Ф.І. Фёдараву, Б.Л. Шапашніку, М.П. Яругіну.

Пэўная работа праводзілася па інтэграцыі навукі з вытворчасцю. Пры інстытутах АН БССР, вышэйшых навучальных установах развівалася вопытна-эксперыментальная база, ствараліся навукова-вытворчыя аб'яднанні. Але праблема ўкаранення навуковых распрацовак у вытворчасць вырашалася марудна. На прадпрыемствах адсутнічалі эканамічныя стымулы. Эканамічна больш выгадным для іх з'яўлялася выкананне плана па валавых паказчыках пры нязначных новаўвядзеннях.

У гэты перыяд развівалася гуманітарная навука. Былі выдадзены "Гісторыя БеларускайССР"у пяці тамах (1972-1975) і дванаццацітомная "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя" (1969-1975).

3 Развіццё беларускай літаратуры.

Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне аказала ўплыў на самасвя-домасць людзей і тым самым умацоўвала ў іх пачуццё ўласнай годнасці. Гэта праявілася ў тэматыцы пасляваеннай літаратуры і ў мастацтве.

У беларускую літаратуру прыйшлі маладыя пісьменнікі. Сярод іх празаікі І. Шамякін, Я. Брыль, І. Мележ, А. Кулакоўскі, А. Васілевіч; паэты К. Кірэенка, А. Вялюгін, У. Корбан; драматургі А. Макаёнак, К. Губарэвіч і інш. Шырокае прызнанне ў рэспубліцы і за яе межамі атрымалі творы беларускай літаратуры і мастацтва. Сведчаннем высокага грамадскага прызнання з'явілася ўзнагароджанне Сталінскай прэміяй Я. Коласа, П. Броўкі, А. Куляшова, І. Шамякіна. Лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў былі перакладзены на многія мовы народаў СССР і свету (каля 80 кніг).

Большасць празаічных твораў прысвячалася падзеям Вялікай Айчыннай вайны. У раманах "Глыбокая плынь" І. Шамякіна, "Мінскі напрамак" І. Мележа, "Расстаёмся ненадоўга" А. Кулакоўскага і асабліва ў рамане - эпапеі "Векапомныя дні" М. Лынькова адлюстраваны старонкі гераічнай барацьбы беларускага народа. Я. Колас скончыў працу над трылогіяй "На ростанях", прысвечанай прыходу беларускай інтэлігенцыі ў рэвалюцыю. Тонкі лірык і ўважлівы бытапісальнік, дасціпны гумарыст і мудры філосаф, натхнёны рамантык і бязлітасны сатырык – такім выступае Я. Колас у сваіх лепшых творах.

У беларускай пасляваеннай літаратуры пачаў развівацца мемуарны жанр. Удзельнікамі вайны і партызанскага руху былі напісаны творы "Партызанскі край" В. Лівенцава, "Людзі асобага складу" В. Казлова і інш.

Палітычная "адліга" спрыяла актывізацыі літаратурнага жыцця. Са сталінс кіх засценкаў вярнуліся А. Александровіч, Р. Бярозкін, Ю. Гаўрук, С. Грахоўскі, У. Дубоўка, А. Звонак, А. Пальчэўскі , Я. Пушча, Я. Скрыган, М. Хведаровіч, С. Шушкевіч і інш. Яны прынеслі сваё бачанне праблем жыцця грамадства і краіны. З'явілася новае пакаленне літаратараў – А. Адамовіч, В. Быкаў, Р. Барадулін, В. Зуёнак, У. Караткевіч, І. Навуменка, І. Чыгрынаў і інш.

Беларускія пісьменнікі, паэты, драматургі пераасэнсоўвалі вострыя праблемы гісторыі і сучаснасці, больш праўдзіва паказвалі рэчаіснасць. Аб гэтым сведчаць раманы І. Гурскага "Вецер веку", І. Мележа "Людзі на балоце" і "Подых навальніцы", І. Шамякіна "Петраград-Брэст", аповесць С. Грахоўскага "Рудабельская рэспубліка" і інш.

Шырокую вядомасць атрымалі творы В. Быкава "Альпійская балада", "Жураўліны крык", "Трэцяя ракета", "Абеліск", "Воўчая зграя", "Сотнікаў" і інш. Разважанні аб жыцці, псіхалогіі чалавека на вайне гучаць у творах І. Навуменкі "Сасна пры дарозе", "Вецер у соснах", "Сорак трэці", І. Чыгрынава "Плач перапёлкі", "Апраўданне крыві", Я. Брыля "Птушкі і гнёзды". Гераічным летапісам з'яўляюцца мастацка-дакументальныя творы І. Новікава "Руіны страляюць ва ўпор", "Дарогі скрыжаваліся ў Мінску" і інш.

Гістарычная тэма ў беларускай прозе знайшла ўвасабленне ў творах

У. Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха", "Чорны замак Альшаыскі", "Зямля пад белымі крыламі", "Каласы пад сярпом тваім" і інш. Традыцыі, закладзеныя У. Караткевічам, прадоўжылі К. Тарасаў, В. Іпатава, Л. Дайнека і інш.

Крытычнае пераасэнсаванне вострых праблем гісторыі і сучаснасці прынесла новае пакаленне паэтаў. Шырокую вя-домасць заваявалі зборнікі вершаў Н. Гілевіча "Песня ў дарогу", "Прадвесне ідзе па зямлі", "Неспакой", "Бальшак", "У добрай згодзе". З'явіліся зборнікі вершаў Р. Барадуліна "Рунець, красаваць, наліваццa!", "Неруш", "Рунь".

4 Дзейнасць тэатральных калектываў і развіццё музычнага мастацтва.

Далейшае развіццё атрымала тэатральнае мастацтва. Беларускія тэатры імкнуліся ўвасобіць на сцэне вобраз сучасніка з яго складаным і багатым духоўным светам. Паступова негатыўныя тэндэнцыі (прыхарошванне рэчаіснасці, схематызм вобразаў, павярхоўнае адлюстраванне жыццёвых канфліктаў) пераадольваліся. Лепшыя спектаклі паказвалі герояў, якія надзелены высокім пачуццём грамадзянскай адказнасці., духоўна багатых і стойкіх у дасягненні сваіх высакародных мэт.

Высокамастацкія вобразы стварылі таленавітыя беларускія акцёры С. Станюта, Л. Александроўская, Ц. Сяргейчык, Г. Глебаў, П. Малчанаў, Б. Платонаў, Л. Рахленка, В. Тарасаў, С. Бірыла, З. Стома, З. Браварская, З. Канапелька, Г. Макарава, У. Уладамірскі, Л. Ржэцкая, Р. Янкоўскі.

Творча працаваў Беларускі тэатр оперы і балета. На сцэне тэатра былі пастаўлены оперы "Яўген Анегін" і "Пікавая дама" П. Чайкоўскага, "Царская нявеста" М. Рымскага-Корсакава, "Іван Сусанін" М. Глінкі, "Кастусь Каліноўскі" Д. Лукаса, "Фауст" Ш. Гуно, "Кармэн" Ж. Бізэ, "Зорка Венера" Ю. Семянякі, "Альпійская балада" Я. Глебава, "Францыск Скарына" Дз. Смольскага. Балетная трупа опернага тэатра паставіла спектаклі "Арлекінада" Р. Дрыгі, "Дон Кіхот" Л. Мінкуса, "Лебядзінае возера" П. Чайкоўскага.

У 60-80-я гг. павялічылася колькасць тэатраў з 11 у 1960 г. да 17 у 1985 г. Значнай падзеяй у культурным жыцці рэспублікі было адкрыццё Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР у 1971 г. і тэатра студыі кінаакцёра ў 1982 г. у Мінску. Дзяржаўны ансамбль танца БССР, вакальна-інструментальныя ансамб лі "Песняры", "Верасы", "Сябры", фальклорна-харэаграфічны ансамбль "Харошкі" і інш.

У пасляваенны перыяд новымі музычнымі жанрамі авалодалі беларускія кампазітары. Яны асобую ўвагу ўдзялялі гераічнай тэма-тыцы. Былі напісаны оперы "Алеся" Я. Цікоцкага, "Надзея Дурава" А. Багатырова, "Машэка" і першая опера для дзяцей "Марынка" Р. Пукста, балет "Князь-возера" В. Залатарова і інш. Актыўна ствараліся масавыя песні (гімны, маршы, вальсы, гарадскія лі рычныя песні: "Радзіма мая дарагая" і "Лясная песня" У. Алоўнікава, "Песня пра Нёман" Н. Сакалоўскага, "Ой, шумяць лясы зялёныя"Ю. Семянякі і інш. Песня Н. Сакалоўскага "Мы – беларусы"

на тэкст М. Клімковіча ў перапрацаваным выглядзе ў 1955 г. стала Дзяржаўным гімнам БССР.

5 Выяўленчае мастацтва. Архітэктура.

Пасляваеннае жыццё Беларусі адлюстравана ў выяўленчым мастацтве ў палотнах Ф. арашэвіча, Р. Кудрэвіч, В. Волкава, А. Малішэўскага, У. Стальмашонка, А. Шаўчэнкі і інш. Павялічылася цікавасць мастакоў да гістарычнага жанру: "Скарына ў рабочым кабінеце" П. Сергіевіч, "Кастусь Каліноўскі" А. Гугеля і Р. Кудрэвіч, "Паўстанне рыбакоў на возеры Нарач" В. Цвіркі.

Тонкім лірызмам, любоўю да беларускай прыроды прасякнуты пейзажы В. Цвіркі ("Каля млына", "Сакавік"), В. Бялыніцкага-Бірулі ("Зялёны май", "Пачатак лета"), З. Азгура ("Лагойскія ўзгоркі"), М. Дучыца, П. Данелііі, І. Карасева і інш. Умацоўваў свае пазіцыі жанр нацюрморта (В.Жолтак, М. Тарасікаў, А. Малішэўскі).

Прыход у мастацтва моладзі, якая ўдзельнічала ў вайне ці бачыла яе сваімі вачамі, прадвызначыў імкненне да перадачы рэчаіснасці ва ўсёй яе шматграннасці – драматызмам і гераізмам. Значным укладам у развіццё беларускага і сусветнага выяўленчага мастацтва з'явіліся работы М. Савіцкага "Партызанская мадонна", цыкл "Лічбы на сэрцы", у якім паказаны жахі фашысцкіх канцлагераў, асабіста перажытых мастаком. Роздуму пра лёс роднай зямлі, працы як асноўнай каштоўнасці зямлі прысвечаны яго палотны "Ураджай", "Хлябы", "У полі", "Сказ пра хлеб". Атрымалі шырокую вядомасць палотны Л. Шчамялёва "Маё нараджэнне", А. Малішэўскага "Дочкі", "Сёстры", Г. Вашчанкі "Маё Палессе" і інш.

Шырокай і разнастайнай тэматыкай вызначалася беларускае скульптурнае мастацтва. У партрэтным жанры – выдзяляюцца творы З.Азгура, А. Глебава, А. Бембеля, С. Селіханава. Ствараюцца помнікі-бюсты Ф. Дзяржынскаму, С. Грыцаўцу, Я. Купалу ў Мінску (З. Азгур), помнік К. Заслонаву ў Оршы (С. Селіханаў). Значным дасягненнем беларускіх скульптараў стаў завершаны ў 1945 г. ансамбль плошчы Перамогі ў Мінску. З. Азгур, А. Бембель, А. Глебаў і С. Селіханаў выканалі гарэльефы для абеліска-помніка воінам Савецкай Арміі і партызанам (архітэктары ансамбля У. Кароль і Г. Заборскі). Традыцыі беларускай скульптуры ўзбагаціліся новымі дасягненнямі ў творчасці маладых майстроў: Г. Мурамцава, В. Палійчука, А. Анікейчыка, Л. Гумілеўскага, І. Місько, Б. Маркава.

Дзеячы навукі, літаратуры і мастацтва ўнеслі значны ўклад у развіццё адукацыі, навукі і культуры, спрыялі падняццю агульнаадукацыйнага і культурнага ўзроўню працоўных.

Дамінуючай тэндэнцыяй у мастацтве становіцца манументалізм. У жанры скульптуры гэта прадвызначыла з'яўленне мемарыяльных комплексаў "Хатынь" (скульптар С. Селіханаў, архітэктары В. Занковіч, Л. Левін, Ю. Градаў), "Брэсцкая крэпасць-герой" (кіраўнік творчага калектыву А. Кібальнікаў), Курган Славы Савецкай Арміі (скульптары А. Бембель, А.

Арцімовіч, архітэктар А. Стаховіч), манумент у гонар маці-патрыёткі М.Ф. Купрыянавай у Жодзіна (М. Ражанкоў, А. Заспіцкі, І. Місько), помнікі народным паэтам Я. Купалу (А. Анікейчык, Л. Гумілеўскі, А. Заспіцкі) і Я. Коласу ў Мінску (З.Азгур), Ф. Скарыне ў Полацку (скульптар А. Глебаў, І. Глебаў, А. Заспіцкі, архітэктар В. Марокін).

Аднаўляліся беларускія вёскі і гарады. Праектныя арганізацыі распрацавалі генеральныя планы Мінска, Брэста, Віцебска і іншых гарадоў. Распрацоўшчыкі праектаў улічвалі гістарычную планіроўку, прадугледжвалі мерапрыемствы па іх рэканструкцыі, удасканаль-ванню планіровачнай структуры, асновы комплекснага вырашэння сацыяльных, эканамічных, архітэктурна-мастацкіх задач. Былі створаны комплексныя групы з архітэктараў, інжынераў, эканамістаў, якія працавалі пры ўдзеле вядучых майстроў з Масквы і Ленінграда (А. Шчусева, А. Мардвінава, М. Колі, У. Сямёнава, І. Лангбарда і інш.).

Рэалізацыя генплана Мінска вызначыла стварэнне новага гарадскога цэнтра, новых архітэктурных ансамбляў. У распрацоўцы праспекта (Сталінскі, Ленінскі, зараз – Францыска Скарыны) прынялі ўдзел архітэктары М. Паруснікаў, Н. Асмалоўскі, У. Кароль і інш. Будынкі ўзводзіліся пераважна на індывідуальных праектах, упрыгожваліся дэкорам, скульптурамі, прысутнічалі элементы лжэкласіцызму. У пасляваенныя гады будаўнічая вытворчасць, заснаваная на шырокім выкарыстанні ручной працы, цэглы і тынкоўкі. адносна лёгка мірылася з любымі традыцыйнымі формамі і дэкорам. Аднак з пашырэннем маштабу і тэмпаў будаўніцтва захапленне дэкаратыўнымі сродкамі стала тармазіць развіццё будаўнічай справы.

Тэма 59 Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

1 Распад СССР, утварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД).

Утварэнне палітычных партый і аб'яднанняў сведчыла аб глыбокіх зменах у грамадскім жыцці і развіцці дэмакратыі. Нягледзячы на невялікі колькасны склад, яны садзейнічалі ўзнікненню ў рэспубліцы парламенцкай апазіцыі, пашырэнню правоў грамадзян, плюралізму мыслення, пошуку новых падыходаў да вызначэння складаных праблем грамадскага жыцця. Шматпартыйнасць азначала канец манапаліі камуністаў на ўладу. Пад уздзеяннем гэтых працэсаў пачалі ўзнікаць ідэі аб неабходнасці рэфармавання камуністычнай партыі ў напрамку яе дэмакратызацыі і пераўтварэння ў партыю парламенцкага тыпу. Аднак гэтыя спробы аказаліся безвыніковымі, бо сітуацыя ў краіне працягвала пагаршацца.

На палітыку перабудовы адмоўны ўплыў аказалі міжнацыянальныя канфлікты, што разгарэліся ў СССР. У 1988-1990 гг. абвастрыліся ўзаемаадносіны паміж Арменіяй і Азербайджанам з-за Нагорнага Карабаха, якія хутка выліліся ў працяглую вайну. У чэрвені 1989 г. адбыліся сутыкненні ўзбекаў з туркамі- месхецінцамі ў Фергане, дзе ахвярамі сталі сотні бязвінных людзей. Усю краіну ўразілі крывавыя падзеі ў Ошскай вобласці Кіргізіі ў 1990 г. Абвастрыліся ўзаемаадносіны Грузіі з Абхазіяй

і Паўднёвай Асеціяй, прычым канфлікт з апошняй выліўся ў 1991 г. ва ўзброенае сутыкненне.

Цяжкая сітуацыя склалася ў Малдавіі і Прыбалтыцы, дзе ўзрасла напружаннасць паміж карэнным і рускамоўным насельніцтвам. Ва ўмовах жорсткіх сацыяльных узрушэнняў і міжнацыянальных канфліктаў узнікла пытанне аб існаванні Савецкага Саюза. У рэспубліках узмацніліся сепаратысцкія настроі. У лістападзе 1988 г. Эстонія прыняла Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце, якой абвясціла вяршэнства законаў рэспублікі над агульнасаюзнымі, рэспубліканскую ўласнасць на зямлю, нетры, асноўныя сродкі вытворчасці.

Вярхоўны Савет СССР прызнаў гэты дакумент несапраўдным, але спыніць "парад суверэнітэтаў" было ўжо немагчыма. Пасля выбараў у рэспубліканскія і мясцовыя Саветы вясной 1990 г., на якіх большасць галасоў атрымалі прыхільнікі самастойнага развіцця рэспублік, дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце прынялі Вярхоўныя Саветы Літвы, Латвіі, Арменіі, Грузіі і Малдовы. 12 чэрвеня 1990 г. адпаведны дакумент з'явіўся ў Расіі, а 27 ліпеня 1990 г. – у Беларусі. Рэгіёны павялі з цэнтрам барацьбу, якая атрымала назву "вайна законаў". У яе падмурку ляжала права самастойна распараджацца сваёй уласнасцю і сродкамі, што адбівалася на стане народнагаспадарчага комплексу.

Памкненне рэспублік да самастойнасці прымусіла кіраўніцтва СССР шукаць шляхі рэфармавання саюза і распрацаваць новы саюзны дагавор.
У студзені 1991 г. саюзныя ўлады паспрабавалі сілай спыніць сепаратызм у прыбалтыйскіх рэспубліках, наладзіўшы ў Вільнюсе і Рызе спробы ўзброенага пераваротy. Але гэта выклікала негатыўную рэакцыю расійскага кіраўніцтва і прывяло да ўзмацнення канфрантацыі паміж Б.М. Ельцыным і М.С. Гарбачовым. Каб паправіць сітуацыю і спыніць крызіс федэратыўных адносін, Вярхоўны Савет СССР вырашыў правесці 17 сакавіка 1991 г. Усесаюзны рэферэндум па пытанню аб неабходнасці захавання СССР. У ім прынялі ўдзел каля 80% грамадзян. За захаванне СССР выказаліся 76,4% удзельнікаў рэферэндуму. Цэнтр зрабіў выснову аб неабходнасці распрацоўкі новага саюзнага дагавора.

23 красавіка 1991 г. у рэзідэнцыі М.С. Гарбачова ў Нова-Агарове пад Масквой адбылася сустрэча кіраўнікоў дзевяці рэспублік (Расіі, Украіны, Беларусі, Казахстана, Узбекістана, Туркменіі, Кіргізіі, Таджыкістана, Азербайджана) і прэзідэнта СССР, атрымаўшая назву "9+1". Выйсце з крызісу федэратыўных адносін удзельнікі нарады знайшлі ў падрыхтоўцы тэксту новага саюзнага дагавора.

Пачаліся шматлікія сустрэчы па падрыхтоўцы гэтага дакумента, пад час якіх узнікалі разыходжанні рэспублік з цэнтрам. Масква вымушана была саступіць. На 20 жніўня 1991 г. была прызначана дата падпісання дагавора. Аднак жнівеньскі (1991 г.) путч спыніў гэты працэс, што, як высветлілася пазней, паскорыла распад СССР. Працэсы рэфармавання грамадства праходзілі ўжо ва ўмовах самастойнага і незалежнага развіцця рэспублік былога СССР.

8 снежня 1991 г. у рэзідэнцыі беларускага ўрада Віскулі С. Шушкевіч разам з прэзідэнтамі Расіі Б. Ельцыным і Украіны Л. Краўчуком падпісалі пагадненне аб фармальнай ліквідацыі СССР і стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Была пастаўлена апошняя кропка ў амаль 70-гадовай біяграфіі Савецкага Саюза.

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь 10 снежня 1991 г. Ратыфікаваў пагадненне аб утварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Адначасова была прынята пастанова аб дэнансацыі дагавора 1922 г. аб утварэнні СССР.

Нягледзячы на прынятыя дакументы і ўтварэнне дадатковых каардынацыйных органаў, у дзейнасці дзяржаў Садружнасці выявіліся рознагалоссі. Асабліва абвостраны яны праявіліся паміж Расіяй і Украінай па пытанню раздзелу арміі і Чарнаморскага флоту. Многія рэспублікі выказвалі незадавальненне тым, што Расіі ў якасці праваперaемніцы СССР адышла дыпламатычная сетка былога Саюза, большая частка маёмасці саюзных і партыйных структур, матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці, што ствараліся фактычна сіламі ўсіх рэспублік.

2 Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь і ўвядзенне новай дзяржаўнай сімволікі.

27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР мінімальнай большасцю галасоў абвясціў Дэклакрацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР у складзе савецкай
федэрацыі. Гэтае рашэнне з'явілася вынікам рэакцыі на знешнюю сітуацыю, прыняцце 12 чэрвеня 1990 г. першым з'ездам народных дэпутатаў РСФСР Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Расійскай Федэрацыі. Прынятае рашэнне не вынікала з пераканання і волі большасці беларускага народа. Між тым яно адкрыла шлях сапраўднай незалежнасці рэспублікі.

У дваццатым артыкуле Дэкларацыі сцвярджалася, што "любыя гвалтоўныя дзеянні супраць нацыянальнай дзяржаўнасці Беларускай ССР з боку палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў ці асоб праследуюцца па закону". Згодна з другім артыкулам Дэкларацыі выступаць ад імя народа дазвалялася выключна Вярхоўнаму Савету.

Урад рэспублікі атрымліваў права стварыць нацыянальную армію, міліцыю і службу бяспекі. Дэпутаты-камуністы прагаласавалі за адзінаццаты артыкул аб неабходнасці новай саюзнай дамовы паміж рэспублікамі. Дэпутаты ад БНФ, якія выступалі супраць якіх-небудзь саюзаў з Расіяй, не ўдзельнічалі ў гэтай частцы пасяджэння.

Правал жнівеньскага путчу 1991 г. стварыў спрыяльныя ўмовы на шляху да рэалізацыі дзяржаўнага суверэнітэту. Паведамленні з Масквы аб перамозе Ельцына над путчыстамі і прыпыненне дзейнасці КПСС выклікалі паніку сярод беларускай партна менклатуры.

Скліканая 24 жніўня пятая нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР адклікала з пасады Старшыні Вярхоўнага Савета М.І. Дземянцея. 25 жніўня быў прыняты Закон "Аб наданні статуса канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб дзяржаўным

суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі" і пастанова "Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларускай ССР". Гэтымі актамі аб'яўлялася палітычная і эканамічная незалежнасць рэспублікі. Ва ўласнасць Беларускай ССР пераходзілі прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы саюзнага падпарадкавання, размешчаныя на яе тэрыторыі.

Выключэнне складалі тыя прадпрыемствы і арганізацыі, кіраўніцтва якімі засталося, згодна з заканадаўствам Беларускай ССР, за адпаведнымі органамі Саюза ССР.

Была зменена назва рэспублікі, а таксама адбылася замена дзяржаўнай сімволікі. 19 верасня прынялі рашэнне Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку надалей называць "Рэспубліка Беларусь", а ў скарочаных назвах "Беларусь". У той самы дзень былі прыняты законы "Аб дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь" і "Аб дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь". Дзяржаўны сцяг з гэтага часу ўяўляў сабой прамавугольнае палотнішча бела-чырвонага колеру. Дзяржаўным гербам стаў старажытны герб "Пагоня" – выява конніка з занесеным над галавой мячом. Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь быў абраны С.С. Шушкевіч.

Станаўленне суверэннай дзяржавы патрабавала фарміравання органаў кіравання, стварэння ўласнага войска. Паводле закона ад 25 жніўня 1991 г. "Аб некаторых змяненнях у сістэме органаў дзяржаўнага кіравання Беларускай ССР" саюзна-рэспубліканскае Міністэрства ўнутраных спраў БССР было пераўтворана ў рэспубліканскае Міністэрства ўнутраных спраў. Яму былі падпарадкаваны ўнутраныя войскі і навучальныя ўстановы Міністэрства ўнутраных спраў СССР, размешчаныя на тэрыторыі рэспублікі. Саюзна-рэспубліканскі Камітэт дзяржаўнай бяспекі БССР быў пераўтвораны ў рэспубліканскі Камітэт дзяржаўнай бяспекі. Ён перадпарадкоўваўся Вярхоўнаму Савету Рэспублікі Беларусь. Былі перагледжаны функцыянальныя напрамкі дзейнасці камітэта, скасавана служба палітычнага вышуку, створана новае для гэтых сілавых ведамстваў падраздзяленне грамадскіх сувязяў. У забеспячэнні кадрамі стаўка была зроблена на прафесіяналаў.

Савету Міністраў Беларусі падпарадкоўваліся пагранічныя войскі Камітэта дзяржаўнай бяспекі. У пачатку 1992 г. пачало дзейнічаць Галоўнае ўпраўленне пагранічных войскаў пры Савеце Міністраў. За кароткі тэрмін Упраўленне пагранвойскаў правяло работу па ўмацаванню пагранзастаў. На службу ў рэспубліку вернута 1400 беларусаў-пагранічнікаў. Была таксама праведзена работа беларуска-літоўскай і беларуска-латвійскай змешанымі Камісіямі па ўстанаўленню мяжы Рэспублікі Беларусь з Літвой і Латвіяй, створаны новыя пагранатрады.

У мэтах забеспячэння палітычнай і эканамічнай самастойнасці рэспублікі ў верасні 1991 г. Вярхоўны Савет прыняў пастанову "Аб мытнай службе Рэспублікі Беларусь". Беларускае ўпраўленне дзяржаўнага мытнага кантролю СССР было пераўтворана ў Дзяржаўны мытны камітэт Рэспублікі Беларусь. У яго падпарадкаванне перайшлі мытныя органы, якія размяшчаліся на тэрыторыі рэспублікі.

Важным крокам на шляху ўмацавання суверэннасці Беларусі з'явілася стварэнне ўласнага войска на аснове прыняцця Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь у верасні 1991 г. адпаведнай пастановы.

У сакавіку 1992 г. пачало дзейнічаць Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь. Пастанова Савета Міністраў ад 6 мая 1992 г. паклала пачатак непасрэднаму стварэнню ўласных узброеных сіл. Беларуская ваенная акруга была скасавана. Усе яе часці і падраздзяленні, а таксама часці цэнтральнага падпарадкавання, якія не ўваходзілі ў склад стратэгічных сіл СНД, перайшлі ў падпарадкаванне Міністэрства абароны рэспублікі. Распрацаваная ў лістападзе 1992 г. ваенная дактрына зыходзіла з неабходнасці быць бяз'ядзернай, нейтральнай дзяржавай. У той час большасць камандната саставу беларускай арміі, якая налічвала 130 тыс. ваеннаслужачых, складалі расіяне. 13 тыс. беларускіх афіцэраў, што праходзілі службу на тэрыторыі Расіі і іншых былых савецкіх рэспублік, заявілі аб сваім жаданні служыць у беларускім нацыянальным войску. Прынятая праграма рэарганізацыі ўзброеных сіл прадугледжвала скарачэнне колькасці салдат да 60 тыс.

4 Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

На працягу 1992-1994 гг. Вярхоўны Савет ста ў арэнай жорсткай фракцыйнай палітычнай барацьбы па абвостраных праблемах эканамічнага жыцця, вызначэння палітычнага статуса дзяржавы, будучага дагавора з Расіяй. Прэзідэнцкія выбары, прызначаныя на чэрвень 1994 г., прымушалі розныя палітычныя лагеры да ўзмоцненай палітычнай актыўнасці. У гэтай сітуацыі ўзрастаў палітычны рэйтынг А. Лукашэнкі, тагачаснага старшыні парламенцкай камісіі па барацьбе з карупцыяй. Ён абвінаваціў С. Шушкевіча і некалькіх звязаных з ім чыноўнікаў у раскраданні дзяржаўнан маёмасці. 26 студзеня 1994 г. дэпутаты Вярхоўнага Савета (209 галасоў за і 39 супраць) адклікалі С. Шушкевіча з займаемай пасады. Старшынёй Вярхоўнага Савета некалькі дзён пазней стаў М.І. Грыб, які фарсіраваў працэс прыняцця канстытуцыі.

15 сакавіка 1994 г. Вярхоўны Савет рэспублікі прыняў новую Канстытуцыю – Асноўны закон Рэспублікі Беларусь. Паводле Канстытуцыі Беларусь з'яўляецца унітарнай дэмакратычнай сацыяльнай дзяржавай, якая валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі. У рэспубліцы ўводзілася прэзідэнцкая форма кіравання. На чарзе стаяла пытанне –абранне прэзідэнта.

Кандыдатамі на пасаду прэзідэнта былі вылучаны 6 чалавек: А. Дубко, В. Кебіч, А. Лукашэнка, В. Новікаў, З. Пазняк, С. Шушкевіч. Пераможцам першага тура выбараў 19 чэрвеня стаў А. Лукашэнка, які набраў 45% галасоў. В. Кебіча, хаця ён і выйшаў у другі тур, падтрымала толькі 17,4% выбаршчыкаў. Кандыдаты апазіцыі З. Пазняк і С. Шушкевіч атрымалі 13% і адпаведна 10% галасоў. В. Новікаў атрымаў 5% галасоў. У наступным туры выбараў 10 ліпеня амаль 80% выбаршчыкаў першым прэзідэнтам Беларусі абралі А. Лукашэнку. Насельніцтва Беларусі

выказалася за грамадскую справядлівасць, радыкальныя змены, якія ў ходзе выбарчай кампаніі абяцаў будучы прэзідэнт.

З мэтай забеспячэння эфектыўнасці дзяржаўнай палітыкі было праведзена рэфармаванне сістэмы выканаўчай улады. У пачатку 1995 г. стварылася падпарадкаваная прэзідэнту сквазная вертыкальная структура, якая ўключала выканаўчыя і распарадчыя органы як у цэнтры, так і на месцах, т. зв. "вертыкаль" – строга цэнтралізаваная сістэма дзяржаўнага кіравання.

5 Рэферэндумы 1995, 1996, 2004 гг.

Разам з выбарамі ў Вярхоўны Савет, прыз начанымі на 14 мая 1995 г., у мэтах вырашэння некаторых спрэчных пытанняў, што ставіла палітычная апазіцыя і якія мелі прынцыповае значэнне для ўзаемнай дамоўленасці ў грамадстве, у адпаведнасці з перадвыбарнай платформай прэзідэнта быў праведзены рэспубліканскі рэферэндум. 14 мая абраных было толькі 18 дэпутатаў, хаця ў галасаванні ўдзельнічалі 64,7% выбаршчыкаў. Дэпутацкі мандат прысвойваўся толькі тым кандыдатам, якія ў аднамандатных акругах набралі звыш 50% галасоў пры больш чым 50-працэнтнай прысутнасці выбаршчыкаў. Паколькі за кожны мандат змагалася некалькі, а ў некаторых акругах нават больш дзесяці кандыдатаў, вылучэнне пераможца аказалася складанай справай.

Затое рэферэндум, на які было вынесена 4 пытанні, завяршыўся вялікай перамогай Прэзідэнта. За адабрэнне пытання аб наданні рускай мове роўнага статусу з беларускай прагаласавалі 83,3% прыняўшых удзел у галасаванні, за прапанову аб устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь –75,1% .

Дзеянні Прэзідэнта, накіраваныя на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй, адобрылі 83,3% . Згоду з неабходнасцю ўнясення змяненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжвалі магчымасць датэрміновага спынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у выпадках сістэматычнага або грубага парушэння Канстытуцыі, прагаласавала 77,7% грамадзян, прыняўшых удзел у галасаванні. Прэзідэнт атрымаў падтрымку большасці беларускага насельніцтва на далейшае правядзенне пачатай унутранай і знешняй палітыкі.

У чэрвені 1995 г. Прэзідэнт падпісаў указ аб новай дзяржаўнай сімволіцы. Існуючы Вярхоўны Савет быў прызнаны нелігітымным. Ён не меў права прымаць новыя законы. Паўнамоцтвы парламента папярэдняга склікання скончыліся з моманту абвяшчэння новых выбараў.

У чэрвені 1996 г. Прэзідэнт унёс у Вярхоўны Савет прапанову аб рэферэндуме наконт змен у Канстытуцыі – перанясенні нацыянальнага свята з 27 ліпеня (Дзень абвяшчэння суверэнітэту ў 1990 г.) на 3 ліпеня (Дзень вызвалення Мінска Чырвонай Арміяй у 1944 г.), свабоднага абароту зямлі, адмены смяротнага пакарання, аб рэарганізацыі парламента, тэрміне паўнамоцтваў Кіраўніка дзяржавы.

24 лістапада 1996 г. адбыўся другі рэспубліканскі рэферэндум. З 7,4 млн. чалавек, якія мелі права ўдзельнічаць у рэферэндуме, галасавалі каля 6,2 млн.

чалавек, ці 84,4% . За прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. са змя-неннямі і дапаўненнямі (новая рэдакцыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь), прагаласавалі каля 5,2 млн. чалавек, ці 70,45% грамадзян, унесенных у спісы для галасавання.

У адпаведнасці з новай рэдакцыяй Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замест аднапалатнага Вярхоўнага Савета з 260 дэпутатамі быў сфарміраваны двухпалатны парламент – Нацыянальны сход, які з гэтага часу складаецца з Палаты прадстаўнікоў (110 дэпутатаў: выбіраюцца насельніцтвам) і Савета Рэспублікі (па 8 чалавек выбіраюцца ад кожнай вобласці і г. Мінска і 8 чалавек прызначаюцца прэзідэнтам). Канстытуцыйны суд адмяніў свае ранейшыя пастановы, прызнаў, што рэферэндум быў праведзены ў адпаведнасці з Канстытуцыяй.

Паводле новай рэдакцыі Канстытуцыі Прэзідэнт з'яўляецца кіраўніком дзяржавы, гарантам Канстытуцыі, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Кіраўніком выканаўчай улады з'яўляецца Прэм'ер-міністр Урада, пашыраны правы і паўнамоцтвы Савета Міністраў, зменены парадак прызначэння асоб на некаторыя дзяржаўныя пасады і вызваденне гэтых асоб ад пасад у адпаведнасці з Канстытуцыяй і заканадаўствам.Дзяржавы Заходняй Еўропы не прызналі ні вынікаў рэферэндуму, ні створанага Нацыянальнага сходу.

17 кастрычніка 2004 г. адбыўся ініцыіраваны Прэзідэнтам рэспубліканскірэферэндум і свабодныя дэмакратычныя выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Сфарміраваны таксама новы склад Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу. На аснове галасавання на рэспубліканскім рэферэндуме з артыкула 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь выключана яго другая частка: “Адна і тая ж асоба можа быць Прэзідэнтам не больш двух тэрмінаў”. Тым самым пераважная большасць беларускага народа пагадзілася з тым, каб А.Р. Лукашэнка нараўне з іншымі кандыдатамі мог балаціравацца ў час выбараў 2006 г. на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка быў абраны у 2006, 2010 і 2015 гг.

Тэма 60. Сацыяльна-эканамічнае становішча Рэспублікі Белаарусь (90-я гг. XX ст. – пачатак XXI стст.). Знешняя палітыка.

1. Разрыў ранейшых эканамічных сувязяў. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Інфляцыйныя працэсы. Зніжэнне ўзроўню жыцця насельніцтва.

У кастрычніку 1990 г. Вярхоўны Савет рэспублікі адобрыў распрацаваны Саветам Міністраў Беларускай ССР курс развіцця, у аснову якога была пакладзена радыкальная праграма пераходу да рыначных рэформ эканамістаў С. Шаталіна і Р. Яўлінскага, вядомая пад назвай "500 дзён". Яна праду-гледжвала шэраг надзвычайных стабілізацыйных мер, стварэнне асноўных рыначных інстытутаў, прыватызацыю, дэманапалізацыю, змену сістэмы дзяржаўнага рэгулявання эканомікі. Паэтапная лібералізацыя цэн павінна была сумяшчацца з выкарыстаннем "сацыяльных амартызатараў", якія дазволілі б не дапусціць рэзкага падзення жыццёвага ўзроўню асноўнай масы насельніцтва.

Аднак ужо ў першыя гады рэфармавання эканомікі былі дапушчаны памылкі. Нацыянальны банк быў выведзены з падначалення ўрада. Пры стварэнні ўстаўных фондаў камерцыйных банкаў, былі выкарыстаны дзяржаўныя сродкі, пасля чаго банкі сталі прыватызаванымі. Урад В. Кебіча пазбавіўся магутнага ўздзеяння на вытворчасць, дзе яшчэ заставалася ў той час больш чым 90 працэнтаў дзяржаўнай уласнасці.

Разбурэнне эканамічных сувязяў пасля распадуСССР паскорыла негатыўныя працэсы ў эканоміцы рэспублікі. У 1991 г. у Беларусі адбылося падз енне вытворчасці прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі. У наступныя гады для народнай гаспадаркі рэспублікі стала характэрным рэзкае абвастрэнне эканамічнага крызісу. Ён праявіўся ў значным зніжэнні ўсіх асноўных макраэканамічных паказчыкаў, падзенні грамадскай вытворчасці, павелічэнні дэфіцыту дзяржаўных фінансаў, росце інфляцыі, падзенні каштоўнасці бе ларускага рубля.

Скарачэнне маштабаў вытворчасці ў першай палове 90-х гг. было значным. З улікам нерэалізаваных таварных запасаў неаплачанай прадукцыі скарачэнне вытворчасці прамысловасці склала палову ўзроўню 1990 г. Асноўнымі прычынамі падзення аб'ёмаў вытворчасці ў прамысловасці стала перш за ўсё абвастрэнне праблемы збыту прадукцыі, рэзкае падаражанне матэрыяльных рэсурсаў, неплацяжы. Усё гэта абумовіла цяжкае фінансавае становішча большасці прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі.

У сваю чаргу абвастрэнне праблемы збыту прадукцыі айчынных прамысловых прадпрыемстваў звязана таксама з нізкім узроўнем канкурэнтаздольнасці прадукцыі, што стала вынікам скарачэння інвестыцый у навуку і новыя тэхналогіі, стратай традыцыйных рынкаў збыту ў Расіі, краінах Азіі, Афрыцы і на Бліжнім Усходзе.

У першай палове 90-х гг. рэзка знізіўся жыццёвы ўзровень насельніцтва рэспублікі. Адбыўся абвальны рост цэн на прадукты харчавання, тавары першай неабходнасці і паслугі. Намінальныя грашовыя даходы насельніцтва не паспявалі за расходамі. У 1994 г. за рысай мінімальнага спажывецкага бюджэту апынулася больш за 60% насельніцтва

рэспублікі. На змену ўсеагульнай занятасці насельніцтва прыйшло беспрацоўе. У 1993 г. было зарэгістравана ў службе занятасці 54,9 тыс. беспрацоўных.

2. Шляхі пераходу да рыначнай эканомікі. Стварэнне камерцыйных структур і сумесных прадпрыемстваў

Правядзенне рэформ у 1991-1994 гг. дазволіла стварыць у Беларусі неабходны мінімум асноўных рыначных інстытутаў, нарматыўна-прававых дакументаў, пераўтварыць сістэму дзяржаўнага кіраўніцтва эканомікай у новую сістэму, якая ў пэўнай ступені абапіралася на рыначныя рэгулятары. Былі зроблены практычныя крокі па лібералізацыі гаспадарчых сувязяў, рэфармаванні адносін уласнасці. Паступова мяняліся сацыяльна-псіхалагічныя ўстаноўкі суб'ектаў гаспадарання, іх эканамічныя адносіны. Дэфіцыт тавараў на ўнутраным рынку ўступіў месца дэфіцыту грошай у насельніцтва.

Свабоднымі сталі эканамічныя сувязі з замежнымі краінамі. Разам з тым рыначныя пераўтварэнні ў Беларусі праводзіліся супярэчліва. Гэта было звязана з складанасцю пераходу ад планавай сацыялістычнай эканомікі да эканомікі рыначнага тыпу, жаданнем уладаў стварыць новы эканамічны базіс за кароткі тэрмін. Яскравымі прыкметамі эканамічнага жыцця таго часу стала раскручванне інфляцыйнай спіралі і катастрафічнае падзенне курсу беларускіх грошай, крытычнае становішча з забеспячэннем гаспадаркі энергарэсурсамі, галапіруючы рост цэн.

У надзвычайным становішчы апынулася сельская гаспадарка Беларусі. Нягледзячы на тое, што ў 1990-1994 гг. на патрэбы АПК выдзялалася 25-30% бюджэтных сродкаў і амаль столькі ж ён атрымліваў дадаткова ў выглядзе розных ільгот і датацый, аб'ёмы вытворчасці сельскай гаспадаркі скараціліся на 14%.

Вёска была пазбаўле на магчымасці абнаўлення сельскагаспадарчай тэхнікі. У 1994 г. больш чым у 3 разы зменшылася набыццё ўгнаенняў, у 2 разы было менш нарыхтавана арганічных удабрэнняў, да мінімуму скараціліся пастаўкі хімічных сродкаў абароны раслін.

Працэс станаўлення рыначных адносін у аграрным сектары эканомікі праходзіў у адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб зямлі, Законам "Аб праве ўласнасці на зямлю" і іншымі заканадаўчымі актамі. У сярэдзіне 1993 г. налічвалася 2700 калгасаў і саўгасаў, 2658 фермерскіх гаспадарак і 1 926 400 сельскіх падвор'яў. Плошча выдзеленых зямель для фермерскіх гаспадарак складала 51 959 га, ці 0,5% усіх сельгасугоддзяў рэспублікі (для параўнання: у Расіі на долю фермераў прыпадала больш за 3%). Сярэдняя плошча зямель калгасаў і саўгасаў складала 1994 га, фермерскіх гаспадарак – 19,9 га, прысядзібных участкаў – 0,42 га. У 1993 г. на кожную фермерскую гаспадарку Беларусі прыходзілася па 3,5 чалавека, у тым ліку 2 працаздольныя работнікі. Амаль 35% фермерскай зямлі выкарыстоў-валася неэфектыўна. Удзельная вага прадукцыі фермерскіх гаспадарак у агульным аб'ёме прадукцыі аграпрамысловага комплексу Беларусі складала менш за 1%

, а таварнай прадукцыі толькі 0,3%. Цяжкасці з фінансаваннем, адсутнасць вопыту і сельскагаспадарчых ведаў, непарытэт цэн на сельскагаспадарчую тэхніку і сельскагаспадарчыя прадукты, прывялі да банкруцтва многія фермерскія гаспадаркі.

3. Распрацоўка нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага эканамічнага развіцця. Зніжэнне інфляцыі, ажыўленн вытворчасці. Сучаснае сацыяльна-эканамічнае становішча на сучасным этапе.

У другой палове 90-х гг. кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь прыклала шмат намаганняў, каб пераадолець крызісныя з'явы ў экано-міцы і грамадстве. Былі дасягнуты пэўныя пазітыўныя вынікі ў 1995-1996 гг. Адбылося запавольванне тэмпаў эканамічнага спаду, паніжэнне інфляцыі, ажыўленне вытворчасці ў асобных галінахі рэгіёнах.

Так, у 1996 г. у параўнанні з 1995 г. павялічыўся валавы ўнутраны прадукт, аб'ём прамысловай вытворчасці, рознічны тавараабарот. Упершыню ўдалося ўтрымаць у вызначаных межах інфляцыю, беспрацоўе і стрымаць зніжэнне жыццёвага ўзроўню насельніцтва. Па выніках 1996 г. Беларусь займала першае месца сярод дзяржаў былога СССР па вытворчасці мяса і малака на душу насельніцтва і другое – па вытворчасці збожжа, уступаючы толькі Казахстану.

1997 г. быў найлепшым з пункту гледжання выканання намечаных сацыяльна-эканамічных паказчыкаў развіцця краіны. Упершыню быў сабраны рэкордны ўраджай збожжа. Яго аб'ём пасля дапрацоўкі перавысіў 6,5 млн. тон. А гэта было амаль на 630 тыс. тон больш, чым у 1996 г. Ураджайнасць збожжавых склала амаль 24 ц з гектара.

Аднак становішча ў сельскай гаспадарцы заставалася складаным. Калектыўныя і індывідуальныя гаспадаркі амаль поўнасцю спынілі закупку тэхнікі, мінеральных угнаенняў, хімічных сродкаў аховы раслін. Унясенне мінеральных угнаенняў скарацілася ў 12 разоў. У выніку значна павялічылася эрозія зямель, іх культурная і тэхнічная неўладкаванасць. У 1997 г. з 9,3 млн. га сельскагас-падарчых зямель інтэнсіўна выкарыстоўвалася толькі 8,5 млн. га. У гаспадарках засталося вельмі мала прыдатных для працы зерне-ўборачных камбайнаў і каля 55% аўтамабіляў ад іх ранейшай колькасці. Невыпадкова, што ў 1998 і 1999 гг. выявіўся недабор збожжа, пладоў, ягад, кармоў, а таксама асобных відаў агароднінных культур.

Курс на сацыяльна арыентаваную рыначную эканоміку, ажыццяўленне эфектыўнай сацыяльнай палітыкі з'явіўся асновай унутрыпалітычнай дзейнасці кіраўніцтва краіны. За 1996-1998 гг. вытворчасць тавараў народнага спажывання павялічылася больш чым напалову. Захоўвалася сацыяльная накіраванасць бюджэту –64% яго сродкаў (1998) накіраваны ў сацыяльную сферу. Прыпыненне спаду вытворчасці, забеспячэнне некаторага эканамічнага росту садзейнічалі таму, што, пачынаючы з 1996 г., пачалося зніжэнне ўзроўню беспрацоўя: з 182,5 тыс. у 1996 г. да 151,1 тыс. у 1997 г. Аднак рост цэн па-ранейшаму

апярэджваў павышэнне заработнай платы, таму яе рэальны ўзровень няўхільна зніжаўся. Патрабавалася павышэнне памеру мінімальных дзяржаўных сацыяльных гарантый, удасканаленне пенсійнага забеспячэння, узмацненне адраснай сацыяльнай падтрымкі канкрэтных груп насельніцтва.

Валютны крызіс у рэспубліцы ў сакавіку і жнівеньскі фінансавы крызіс 1998 г. у Расіі – усё гэта адмоўна адбілася на эканоміцы Беларусі, бо гандаль з Расіяй складаў звыш 60% агульнага тавараабароту.

У мэтах пераадолення наступстваў крызісу кіраўніцтва Беларусі зрабіла важныя крокі ў эканамічнай палітыцы: былі праведзены ўніфікацыя валютнага курса ў адносінах да беларускага рубля і частковая лібералізацыя цэн, узмоцнена жорсткасць бюджэтнай дысцыпліны, у значнай ступені ажыццёўлены перавод разлікаў на грашовую аснову, скарачэнне бартэра. Вынікам прынятых мер з'явілася зніжэнне інфляцыі з 251% у 1999 г. да 108% у 2000 г. Аб'ём валавога ўнутранага прадукту павялічыўся ў 2000 г. на 5,8% , а ў 2001 г. больш чым на 4% . Вытворчасць прамысловай прадукцыі ўзрасла на 5,5% і склала 106% да ўзраўню 1990 г. Таму Беларусь стала адзінай з былых краін на постсавецкай прасторы, якая па асноўных эканамічных паказчыках дасягнула ўзроўню 1990 г.

Вынікам сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь у 1994 – 2006 гг. з'яўлялася тое, што ў краіне была створана і дзейнічала сацыяльна-эканамічная сістэма, заснаваная на паступовым, эвалюцыйным шляху эканамічных пераўтварэнняў, без абвальнай прыватызацыі і "шокавай тэрапіі". Захаваны і паглыблены сацыяльныя гарантыі для людзей – жыллё, пенсіі, бясплатныя за кошт бюджэту адукацыя і лячэнне.

4. Дыпламатычнае прызнанне Рэспублікі Беларусь. Статус без'ядзернай і нейтральнай дзяржавы. Заходні вектар знешняй палітыкі.

Пачынаючы праводзіць сваю незалежную знешнюю палітыку, Рэспубліка Беларусь пацвердзіла прыхільнасць да прынцыпаў Статута ААН, Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, далучылася да факультатыўнага пратакола Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах у тых выпадках, калі парушаюцца правы асобы. Такая пазіцыя садзейнічала росту яе аўтарытэту на міжнароднай арэне і забяспечыла хуткае дыпламатычнае прызнанне. Па стану на 1994 г. яе прызналі 123 краіны свету, 97 з іх устанавілі дыпламатычныя адносіны.

Рэспубліка Беларусь стала паўнапраўным членам больш 60 міжнародных арганізацый, у 10 атрымала статус наглядальніка. У 1991-1995 гг. яна падпісала больш за 600 двухбаковых міждзяржаўных і міжурадавых пагадненняў па пытаннях знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці. Рэспубліка стала паўнапраўнай удзельніцай Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. Сярод дзяржаў СНД яна першай падпісала Парыжскую хартыю для новай Еўропы, увайшла ў Міжнародны валютны фонд і Сусветны банк рэканструкцыі і развіцця.

На момант распаду СССР Беларусь з'яўлялася адной з самых мілітарызаваных краін свету. Па колькасці цяжкіх узбраенняў яна апярэджвала многія краіны Еўропы, бо на яе тэрыторыі была размешчана 250-тысячная вайсковая групоўка. Да гэтага трэба яшчэ дадаць, што на тэрыторыі рэспублікі было размешчана 73 стратэгічныя ракеты з ядзернымі боегалоўкамі, вялікая колькасць тактычнай ядзернай зброі.

Выконваючы ўзятыя на сябе абавязкі ў галінах бяспекі і раззбраення, Беларусь актыўна ўключылася ў перагаворны працэс.

Імкнучыся стварыць міжнародна-прававую базу пераходу да статуса бяз'ядзернай і нейтральнай дзяржавы, яна стала ўдзельніцай дагавораў аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі, аб звычайных узброеных сілах у Еўропе, падпісала канвенцыю аб забароне хімічнага ўзбраення.

23 мая 1992 г. ЗША, Расія, Украіна, Беларусь і Казахстан падпісалі Лісабонскі пратакол да дагавора паміж СССР і ЗША аб скарачэнні стратэгічных наступальных узбраенняў (СНУ-2). Згодна з пратаколам Украіна, Беларусь і Казахстан бралі на сябе абавязацельствы ліквідаваць або перадаць Расіі ўсе стратэгічныя ядзерныя боегалоўкі.

6 ліпеня 1992 г. дзевяць дзяржаў СНД (Рэспубліка Арменія, Рэспубліка Беларусь, Р эспубліка Казахстан, Кыртызская Рэспубліка, Рэспубліка Таджыкістан, Рэспубліка Узбекістан, Украіна, Рэспубліка Малдова і Туркменістан) пацвердзілі, што падтрымліваюць удзел Расіі ў дагаворы аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі ў якасці дзяржавы як уладальніцы і заявілі, што гатовы далучыцца да гэтага дагавора ў якасці неядзерных дзяржаў. Такім чынам, юрыдычна было вырашана пытанне аб праваперaемнасці, і Расійская Федэрацыя стала адзінай уладальніцай ядзернай зброі.

У адпаведнасці з падпісанымі пагадненнямі стратэгічныя ядзерныя сілы, якія былі размешчаны на тэрыторыі рэспублікі, пачалі выводзіць за яе межы. Беларусь абавязалася на працягу сямі гадоў поўнасцю пазбавіцца ад гэтых узбраенняў, па дамоўленасці з Расіяй скараціць тэрмін іх вываду. Тактычная ядзерная зброя была вывезена за межы рэспублікі ў 1992 г., а ў канцы лістапада 1996 г., напярэдадні сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў –удзельніц АБСЕ, апошнія міжкантынентальныя балістычныя ракеты СС-25 пакінулі яе тэрыторыю. Беларусь цалкам выканала міжнародныя абавязацельствы і стала дэ-факта краінай бяз'ядзернай зброі.

У якасці самастойнага суб'екта міжнароднага права рэспубліка далучылася таксама да дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе, падпісала пагадненне па адкрытаму небу, канвенцыю аб забароне хімічнай зброі і прыступіла да іх выканання ў 1993 г. Згодна з пастановай Вярхоўнага Савета колькасць узброеных сіл не павінна была пераўзыходзіць 100 тыс. чалавек, што складала 1,01% ад усяго насельніцтва. У выніку праведзеных мерапрыемстваў па рэфармаванню арганізацыйна-штатных структур да 1995 г. удалося знізіць колькасць кадравага складу ўзброеных сіл да 85 тыс. чалавек, што атрымала высокую адзнаку міжнароднага супольніцтва.

Распад СССР і Варшаўскага дагавора цалкам змянілі стратэгічны баланс сіл. Старая сістэма бяспекі рухнула. Таму для Беларусі, як і іншых

краін СНД, паўстала праблема пабудовы новай сістэмы бяспекі ў Еўропе і захавання свайго суверэнітэту. 15 мая 1992 г. у Ташкенце быў падпісаны Дагавор аб калектыўнай бяспецы, пад якім паставілі свае подпісы прадстаўнікі шасці краін СНД. Быў створаны

Савет калектыўнай бяспекі ў складзе кіраўнікоў і ўведзена пасада Галоўнакамандуючага аб'яднанымі ўзброенымі сіламі СНД. У дапаўненне да гэтага дагавора 15 красавіка 1994 г. была прынята Дэкларацыя аб захаванні суверэнітэту, тэрытарыяльнай цэласнасці і непахіснасці граніц дзяржаў СНД.

Ствараючы сістэму сваёй бяспекі, Беларусь улічвала рэаліі , якія ўзніклі ў сярэдзіне 90-х гадоў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. У зацверджанай у сакавіку 1994 г. Канстытуцыі былі вызначаны прынцыпы знешняй палітыкі. "Рэспубліка Беларусь у сваёй знешняй палітыцы, - падкрэслівалася ў Асноўным законе, - зыходзіць з прынцыпаў роўнасці дзяржаў, непрымянення сілы або пагрозы сілай, непарушнасці межаў, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяша нння ва ўнутраныя справы і іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў права". Развіваючы гэтыя палажэнні, Савет Бяспекі Рэспублікі Беларусь зацвердзіў 27 сакавіка 1995 г. Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі краіны. У дакуменце адзначалася, што забеспячэнне нацыянальнай бяспекі Беларусі павінна ажыццяўляцца на падставе выканання нормаў міжнароднага права і нацыянальнага заканадаўства. Сярод жыццёва важных інтарэсаў Беларусі ў палітычнай сферы былі адзначаны не толькі суверэнітэт і незалежнасць краіны, непарушнасць яе граніц і тэрытарыяльнай цэласнасці, але і захаванне міру і стабільнасці ў еўрапейскім рэгіёне.

З самага пачатку атрымання незалежнасці Беларусь імкнулася ўстанавіць нармальныя ўзаемаадносіны з усімі краінамі свету і, у першую чаргу, з суседзямі. У гэтай сувязі асабліва важнае значэнне набывалі адносіны з Рэспублікай Польшча, якая першай прызнала незалежнасць Беларусі. У чэрвені 1992 г. адбыўся візіт у Польшчу Старшыні Вярхоўнага Савета С. Шушкевіча, у выніку чаго быў падпісаны дагавор аб добрасуседстве і супрацоўніцтве. У Варшаве было адчынена беларускае пасольства, пачаліся ўзаемныя візіты, а ў чэрвені 1993 г. Мінск сустракаў польскага прэзідэнта Л. Валенсу. Добрасуседскія ўзаемаадносіны садзейнічалі таму, што паміж дзяржавамі было падпісана звыш 30 урадавых і міжурадавых дагавораў, перагледжаны прававыя акты, якія ў свой час былі заключаны паміж СССР і Польшчай з тым, каб вызначыць іх праваперaемнікаў. Паступова беларуска-польскія ўзаемаадносіны пачалі нармалізавацца па ўсіх накірунках. Паспяхова развівалася эканамічнае супрацоўніцтва, прыгранічны гандаль, быў уведзены бязвізавы рэжым.

Аднак пасля таго, як у 1993 г. Польшча актывізавала свае намаганні па ўступленню ў НАТА, а Беларусь узяла курс на інтэграцыю з Расіяй, адносіны паміж дзяржавамі сталі больш стрыманымі.

Існавала і другая прычына, якая істотна адбівалася на адносінах паміж дзяржавамі. Абедзве краіны прыступілі да сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў. На Беларусі было абвешчана аб пабудове сацыяльна

арыентаванай эканомікі, а ў Польшчы пачаў рэалізоўвацца план сістэмнай трансфармацыі з элементамі "шокавай тэрапіі" Л. Бальцэровіча. Польская эканамічная сістэма пачала актыўна інтэгравацца з Захадам.Тым не менш, супрацоўніцтва паміж дзяржавамі працягвала развівацца. Не спыніліся кантакты кіраўнікоў. У студзені 1995 г. Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка наведаў Польшчу і ўдзельнічаў у траурных цырымоніях у былым канцлагеры Асвенцім. Пад час гэтага візіту адбылася яго сустрэча з польскім прэзідэнтам Л. Валенсам. У канцы 1995 г. у Варшаву прыязджаў Прэм'ер-міністр Беларусі М. Чыгір. У сакавіку 1996 г. у Белавежскай пушчы адбылася сустрэча А. Лукашэнкі і А. Квасьнеўскага.

5. Дагавор аб Саюзе Беларусі з Расіяй 1997 г. Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы 1999 г. Узаемаадносіны Беларусі з краінамі Лацінскай Амерыкі, Азіі.

Палітыка Беларусі ў дачыненні да Расіі пачала змяняцца пасля прэзідэнцкіх выбараў, якія адбыліся ў ліпені 1994 г. А. Лукашэнка палічыў, што патрэбна надаць ім пэўны дынамізм і перавесці на якасна новы ўзровень. Але спачатку яму давялося вырашаць складаныя пытанні выплаты знешняй запазычанасці. Да канца 1994 г. адбыліся візіты А. Лукашэнкі ў Маскву, Сочы і Кіеў, падчас якіх беларускі прэзідэнт выступіў з жорсткай крытыкай урада В. Кебіча. Рэспубліка пачала плаціць за бягучыя пастаўкі паліва, а Расія без абмежаванняў яго пастаўляць.

Прэзідэнт краіны А. Лукашэнка надаў інтэграцыйным працэсам канкрэтны характар. 6 студзеня 1995 г. у Мінску было падпісана пагадненне аб стварэнні Мытнага саюза паміж Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай Беларусь, а крыху пазней прэзідэнты дзвюх краін А. Лукашэнка і Б. Ельцын заключылі дагавор аб сяброўстве, добрасуседстве і супрацоўніцтве тэрмінам на дзесяць гадоў. 25 мая 1995 г. Б. Ельцын выдаў указ аб адмене мытнага кантролю на расійска-беларускай мяжы, а на наступны дзень А. Лукашэнка і прэм'ер-міністр Расіі В. Чарнамырдзін сімвалічна ліквідавалі на ёй шлагбаум і пасадзілі бярозку.

Узмацненне расійскага напрамку ў знешняй палітыцы Беларусі адбылося пасля майскага (1995) рэферэндуму. З 64,8% грамадзян Беларусі, якія прынялі ў ім удзел, 82,4% падтрымалі ідэю аб эканамічнай інтэграцыі з Расіяй.

У лютым 1996 г. адбыўся афіцыйны візіт беларускага Прэзідэнта А. Лукашэнкі ў Маскву. У ходзе перагавораў з Б. Ельцыным галоўная ўвага надавалася абмеркаванню перспектыў паглыблення эканамічных, ваенных і культурных сувязяў, узаемадзеяння ў рамках Мытнага саюза. Прэзідэнты падпісалі сумесную заяву і далі даручэнне ўрадам сваіх краін падрыхтаваць праект дагавора, які вызначаў бы прынцыпы, асноўныя напрамкі і формы далейшага іх збліжэння.

Такі праект хутка падрыхтавалі і 2 красавіка 1996 г. у Крамлі быў падпісаны дагавор аб стварэнні Супольнасці суверэнных рэспублік. У дакуменце адзначалася, што бакі ўзгадняюць палітыку, агульныя пазіцыі

па асноўных міжнародных пытаннях, узаемадзейнічаюць у забеспячэнні бяспекі, ахове граніц і барацьбе са злачыннасцю. Захоўваючы атрыбуты свайго суверэнітэту, дзяржавы выходзілі на сумеснае будаўніцтва структур, якія мелі агульную заканадаўчую базу. Былі сфарміраваны Вышэйшы Савет, Выканаўчы камітэт, Парламенцкі сход, Мытны камітэт, Расійска-Беларуская камісія па навукова-тэхнічнаму супрацоўніцтву, Камітэт па гідраметэаралогіі і маніторынгу забруджвання прыроднага асяроддзя, Грамадскі савет прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў пры Выканкаме Супольнасці. Планавалася, што да канца 1996 г. дзяржавы сфарміруюць агульную транспартную сістэму з адзінымі тарыфамі па перавозках грузаў і пасажыраў, аб'яднаюць энергасістэмы і будуць мець сумесныя навукова-тэхналагічную і інфармацыйную прасторы.

На наступны год разлічваліправесці сінхранізацыю этапаў, тэрмінаў і глыбіні эканамічных рэформаў, падрыхтаваць адзіную нарматыўна-прававую базу, правесці уніфікацыю грашова-крэдытных і бюджэтных сістэм, стварыць умовы для ўвядзення адзінай валюты.

Пасля ратыфікацыі дагавора аб стварэнні супольнасці Беларусі і Расіі 29 жніўня 1996 г., праводзіліся пасяджэнні Вышэйшага Савета і Выканаўчага камітэта, зацверджана Праграма першачарговых мерапрыемстваў па рэалізацыі дагавора. У 1996 г. адбылася першая сесія Парламенцкага сходу, на якой было абрана кіраўніцтва, утворана 6 пастаянных камісій і зацверджана праграма на 1996-1997 гг. па стварэнню прававых асноў Супольнасці. Былі вырашаны ўсе арганізацыйныя пытанні па дзейнасці вышэйшых органаў.

Аднак бакі не дабіліся істотных поспехаў у справе рэальнага збліжэння краін. Цяжкасці ў пашырэнні інтэграцыі былі абумоўлены як эканамічным і сацыяльна-палітычным становішчам дзяржаў, так і адсутнасцю эфектыўнага механізма рэалізацыі прымаемых рашэнняў. Дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі выступалі з праектамі, якія былі заснаваны на розных, а часам дыяметральна супрацьлеглых варыянтах інтэграцыі, Частка расійскіх палітыкаў пачала выказвацца аб неабходнасці абмежавання правоў Беларусі ў складзе супольнасці і нават пазбаўленні таго статуса, які быў у часы існавання БССР.

Беларуска-расійскае збліжэнне было затарможана і ўнутрыпалітычным крызісам у Рэспубліцы Беларусь восенню 1996 г. Супрацьстаянне Прэзідэнта з Парламентам прывяло на гэты раз да рэферэндуму 24 лістапада 1996 г., пасля чаго змянілася Канстытуцыя, пачалася дыпламатычная блакада Беларусі з Захаду.

У студзені 1997 г. Б. Ельцын звярнуўся да А. Лукашэнкі з прапановай зрабіць канкрэтныя намаганні па рэальнай інтэграцыі і падрыхтаваць юрыдычны дакумент аб стварэнні адзінай дзяржавы.

Пачаліся ўзаемныя кансультацыі па гэтаму пытанню. Важнае значэнне набыла сустрэча лідэраў у Крамлі 7 сакавіка 1997 г., на якой А. Лукашэнка пагадзіўся з тым, каб аднавіць дагавор ад 2 красавіка 1996 г. і стварыць Саюз дзвюх дзяржаў. Абодва бакі палічылі мэтазгодным распрацаваць Статут, у

якім вызначаліся б функцыі наднацыянальных органаў, і пашырыць правы Вышэйшага Савета.

Паступіла таксама прапанова аб тым, каб Выканаўчы камітэт узначальвала аўтарытэтная асоба, якая б не займала іншых пасад, а Парламецкі сход –прымаў законы, якія праводзіліся б хутка ў жыццё.

2 красавіка 1997 г. у Маскве А. Лукашэнка і Б. Ельцын падпісалі Дагавор аб Саюзе Беларусі з Расіяй. У дакуменце падкрэслівалася, што Расійская Федэрацыя і Рэспубліка Беларусь пры яго заключэнні зыходзілі з духоўнай блізкасці і агульнасці гістарычных лёсаў сваіх народаў, абапіраліся на іх волю да далейшай еднасці, імкнуліся эфектыўна выкарыстоўваць маральны і інтэлектуальны патэнцыял у інтарэсах сацыяльнага і эканамічнага прагрэсу. У Дагаворы адзначалася, што кожная краіна –удзельніца Саюза – захоўвае дзяржаўны суверэнітэт, незалежнасць і тэрытарыяльную недатыкальнасць, канстытуцыю, сцяг, герб і іншыя атрыбуты дзяржаўнасці. Галоўнымі мэтамі Саюза былі: умацаванне адносін братэрства, сяброўства і ўсебаковага супрацоўніцтва паміж Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай Беларусь у палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай, ваеннай, навуковай, культурнай і іншых галінах; павышэнне ўзроўню жыцця народаў і стварэнне спрыяльных умоў для ўсебаковага, гарманічнага развіцця асобы; устойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё дзяржаў-удзельніц Саюза на падставе аб'яднання іх матэрыяльнага і інтэлектуальнага патэнцыялаў, выкарыстоўвання рыначных механізмаў функцыяніравання эканомікі; збліжэнне нацыянальных прававых сістэм, фарміраванне прававой сістэмы Саюза; забеспячэнне бяспекі і падтрыманне высокай абараназдольнасці, сумесная барацьба са злачыннасцю; спрыянне забеспячэнню агульнаеўрапейскай бяспекі і развіццю супрацоўніцтва ў Еўропе і ва ўсім свеце.

Праект Статута Саюза Беларусі і Расіі 9 красавіка 1997 г. быў вынесены на грамадскае абмеркаванне і 23 мая падпісаны ў Маскве прэзідэнтамі А. Лукашэнкам і Б. Ельцыным. 10 чэрвеня 1997 г. Дагавор аб Саюзе Беларусі і Расіі быў ратыфікаваны ў Мінску і ў Маскве.

Так быў зроблены яшчэ адзін крок наперад у развіцці двухбаковых адносін. Аднак і пасля заключэння Саюза не ўсе праблемы паміж Беларуссю і Расіяй былі вырашаны. Шматлікія пагадненні не рэалізоўваліся на практыцы. У дзяржавах існавалі палітычныя сілы, якія часам імкнуліся да дэстабілізацыі саюзніцкіх адносін. У прэсе, іншых сродках масавай інфармацыі ў асобныя моманты ўзнікала своеасаблівая інфармацыйная вайна і праводзілася дыскрэдытацыя асобных кіраўнікоў, што падрывала развіццё беларуска-расійскай інтэграцыі.

Але, як гэта ні парадаксальна, негатыўныя моманты толькі падштурхнулі беларускае кіраўніцтва да паглыблення інтэграцыі з Расіяй. 25 снежня 1998 г. была падпісана Дэкларацыя аб аб'яднанні Беларусі з Расіяй у Саюзную дзяржаву, а праз год – 8 снежня 1999 г. – намер быў ажыццёўлены. 26 студзеня 2000 г. Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі быў ратыфікаваны. Старшынёй Вышэйшага дзяржаўнага Савета быў

абраны А. Лукашэнка, Старшынёй Савета Міністраў ста ў М. Касьянаў, Дзярж-сакратаром – П. Барадзін.

Тэма 61. Навука і культура.

1 Роля навукі ў інфармацыйным грамадстве. Рэформа НАН Беларусі. Інтэграцыя ў міжнародную навуковую супольнасць.

У 90-я гады складаныя працэсы адбываліся ў навуковай сферы. Тэмпы развіцця навуковага патэнцыялу знізіліся. Колькасць супрацоўнікаў, занятых у навуцы, паменшылася з 102,6 тыс. чалавек у 1990 г. да 43,7 тыс. у 1999 г., а фінансаванне з дзяржбюджэту – у 4 разы. Аднак і ў гэтых умовах у структуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з'явіліся новыя навуковыя ўстановы: Інстытут праблем выкарыстання прыродных рэсурсаў і экалогіі, радыебіялогіі, сацыялогіі, малекулярнай і атамнай фізікі, прыкладной оптыкі і тэхналогіі металаў і інш. У 1993 г. Інстытут ядзернай энергетыкі пераўтвораны ў Акадэмічны навукова-тэхнічны комплекс «Сосны», у склад якога ўвайшлі інстытуты праблем энергетыкі, радыяцыйных фізіка-хімічных праблем і радыяэкалагічных праблем.

У сістэме іншых міністэрстваў і ведамстваў утвораны Інстытут радыяцыйнай бяспекі, Беларускі інстытут сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы, Беларускі НДІ дакументазнаўства і архіўнай справы, Інстытут сацыяльна-палітычных даследаванняў пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, НДІ пажарнай бяспекі і праблем надзвычайных сітуацый, шэраг цэнтраў і ўстаноў сельскагаспадарчага і медыцынскага профілю. З 1991 г. дзейнічае Фонд фундаментальных даследаванняў, які фінансава падтрымлівае творчыя калектывы і асобных навукоўцаў у вырашэнні актуальных навуковых праблем. Больш актыўная ў апошнія гады падтрымка з боку дзяржавы фундаментальных даследаванняў дазволіла часткова пераадолець крызіс у навуцы. Назіраецца тэндэнцыя звароту даследчыкаў да навукова-інавацыйных праектаў. Першынство ў гэтым напрамку належыць Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту, які сцвердзіў сябе як буйнейшы навуковы і навукова-вытворчы цэнтр краіны.

Роля вядучай навуковай установы нададзена Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, у сценах якой сканцэнтравана каля 70% фундаментальных даследаванняў краіны. У 1993 г. быў прыняты Закон "Аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі», які ўсклаў на Акадэмію навук адказнасць за развіццё ў краіне фундаментальных навуковых даследаванняў.

Пашыраны функцыі Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, удасканалена нарматыўна-прававая база развіцця навукі і тэхнікі, зацверджаны пералік і паслядоўнасць фарміравання і выканання дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм. Для пераадолення старэння прыборнага парка навуковых устаноў актывізацыі працэсу яго папаўнення сучасным абсталяваннем, Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях сумесна з іншымі органамі дзяржаўнага кіравання распрацавана і пачала выконвацца з 1997 г. праграма

развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы навукі і арганізацыі цэнтраў калектыўнага карыстання навуковым абсталяваннем. Створана міжведамасная экспертная рада па развіццю навукі з ліку аўтарытэтных вучоных і арганізатараў навукі.

Распрацавана сістэма дзяржаўнай фінансавай падтрымкі навуковых даследаванняў, якія выконваюцца маладымі навукоўцамі. Удасканальваецца сістэма маральных і матэрыяльных стымулаў. У апошнія гады навуковыя калектывы больш актыўна ажыццяўляюць канцэнтрацыю сіл і сродкаў на прыярытэтных напрамках, распрацоўках і рэалізацыі мерапрыемтваў па развіццю навукова-тэхнічнага прагрэсу. У 1996-2000 гг. на Беларусі распрацоўвалася 48 дзяржаўных праграм фундаментальных даследаванняў, у якіх удзельнічала 141 установа.

Апошняе дзесяцігоддзе азнаменавана далейшай інтэграцыяй беларускай навукі ў міжнародную навуковую супольнасць. У 1993 г. Акадэмія навук Беларусі прынята ў якасці нацыянальнага члена ў Міжнародную раду навуковых саюзаў (BCSU) – няўрадавую арганізацыю для развіцця навукі і аховы правоў і свабод вучоных.

Рада аб'ядноўвае акадэміі навук 95 краін, 25 міжнародных саюзаў практычна па ўсіх галінах навукі. У 1998 г. падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж ЮНЕСКА і НАН Беларусі, дзе ў якасці прыярытэтаў вызначаны фізіка і матэматыка, інфарматыка, камунікацыя, інжынерныя навукі, аднаўляльныя крыніцы энергіі і новыя тэхналогіі, хімія, геалогія, біялогія і біятэхналогіі, праблемы сацыяльных навук і культурнай спадчыны.

Выконваецца шэраг міждзяржаўных праграм. Пашыраны міжнародныя сувязі вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. У 1999 г., напрыклад, дзейнічала 27 дагавораў і пагадненняў на міжакадэмічным узроўні, выконваліся 265 праектаў з замежнымі навуковымі ўстановамі.

2 Заканадаўчая база для развіцця адукацыі і культуры. Рэформа школы, падрыхтоўка кадраў.

Абвяшчэнне дзяржаўнай незалежнасці Беларусі выклікала сапраўдны пераварот у духоўным жыцці грамадства. Нацыянальная культура перастала быць часткай агульнай культуры савецкага народа, у выніку абставін яна самавызначылася як культура беларускага народа і дзяржавы. Статус дзяржаўнай быў нададзены беларускай мове, на ёй гаварылі ў парламенце, урадзе. Ідэямі дзяржаўнасці насычаліся навука, мастацтва, іншыя сферы інтэлектуальнай творчасці.

З мэтай стварэння спрыяльных умоў для далейшага развіцця нацыянальнай адукацыі і культуры у 1991 г. былі прыняты Закон аб адукацыі і Закон аб культуры, якімі былі гарантаваны свабода творчай дзейнасці, стварэнне ўмоваў дзеля ўсебаковага развіцця асобы, задавальненне адукацыйных запатрабаванняў кожнага чалавека, плюралізм напрамкаў і стыляў, абарона інтэлектуальнай уласнасці, гуманістычная накіраванасць, арыентацыя на агульначалавечыя каштоўнасці.

Эканамічны крызіс, які суправаджаў пераходны перыяд, выразна адбіўся на сацыяльна-культурнай сферы. Так, бюджэтныя расходы Міністэрства культуры складалі ўсяго 0,6-1% расходнай часткі дзяржаўнага бюджэту, замест 3% , зафіксаваных у Законе аб культуры, а Міністэрства адукацыі – 5,5-6,5% , (згодна Закона аб адукацыі – 10%). Кіраўніцтва краіны рабіла захады, кааб падтрымаць установы адукацыі і культуры, але сродкаў на гэта не заўсёды хапала. На нізкім узроўні знаходзілася аплата працы творчай інтэлігенцыі, што прывяло да выезду за межы краіны дзеячаў культуры і навукі.

Між тым, нягледзячы на гэта, у сферы адукацыі і культуры адбылося шмат станоўчых перамен. Удалося ў асноўным аднавіць былы ўзровень забяспечанасці дзяцей адпаведнага ўзросту дашкольнымі ўстановамі. Калі ў 1994 г. дзіцячыя сады і яслі наведвалі 58% дзяцей, то ўжо ў 2000 г. – 71% .

На працягу 90-х гг. былі зроблены захады па ўдасканаленню нацыянальнай сістэмы адукацыі. З 1998 г. пачалася рэформа 4,5 тыс. агульнаадукацыйных школ. Яе асноўнымі рысамі сталі: дэмакратызацыя сістэмы адукацыі, арыентацыя яе на агульначалавечыя каштоўнасці, стварэнне ўмоў для гарманічнага развіцця асобы, павышэнне якасці і эфектыўнасці адукацыі. Распачата работа па аптымізацыі тэрмінаў навучання і аб'ёму атрыманых ведаў. Пачаўся пераход школ на 12-гадовае навучанне, у т. л. абавязковае 10-
гадовае. Узніклі новыя формы навучальных устаноў, з'явілася больш за 120 «элітарных» дзяржаўных гімназій, ліцэяў, каледжаў. Усё гэта дазваляе забяспечваць індывідуальную працу з вучнямі, стварае новыя магчымасці для больш ранняй спецыялізацыі і раскрыцця талентаў. Значная ўвага надаецца выкладанню замежных моў.

У краіне развіваецца сістэма сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі. У 156 каледжах, тэхнікумах і іншых установах сярэдняй спецыяльнай адукацыі навучаецца 150 тыс. юнакоў і дзяўчат. У 249 установах прафтэхадукацыі вучыцца больш за 135 тыс. чалавек.

У 90-я гг. пашырылася сетка вышэйшых навучальных устаноў. Сістэма дзяржаўнай вышэйшай адукацыі Беларусі аб'яднала 44 універсітэты, акадэміі. Побач з імі ўзніклі 20 недзяржаўных навучальных устаноў, навучанне ў якіх платнае. Выпрабаванне часам з іх вытрымалі толькі 12, аднак альтэрнатыўнасць формаў ВНУ стала фактам. За дзесяцігоддзе колькасць студэнтаў узрасла з 190 тыс. да 300 тыс. чалавек. У 2001 г. студэнтам стаў кожны другі выпускнік сярэдняй школы. Па колькасці студэнтаў у разліку на 10 000 насельніцтва Беларусь выйшла на сярэднееўрапейскі ўзровень (300 чалавек), што з'яўляецца найбольшым паказчыкам у гісторыі нашай краіны. Пералік спецыяльнасцяў дазваляе амаль поўнасцю задаволіць эканамічныя патрэбнасці рэспублікі ў кадрах. З 1995 г. колькасць аспірантаў павялічылася на 55%.

З мэтамі далейшага павышэння якасці вышэйшай адукацыі ў нашай краіне, неабходнасцю далучэння Беларусі да адукацыйнай прасторы СНД, Еўропы і сусвету, у вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь па ініцыятыве Белдзяржуніверсітэта распачаты пераход да двухступеннай сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. У Беларусі сфарміравалася

нацыянальная сістэма вучэбнага кнігавыдання. Убачылі свет каля 3 тыс. падручнікаў, у тым ліку 1350 – для сярэдніх школ, 760 – для ВНУ, 155 – для тэхнікумаў, 80 – для сістэмы прафтэхадукацыі, 192 вучэбныя дапаможнікі – для навучання дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. У 1997 г. узноўлена распрацоўка і вытворчасць картаграфічнай прадукцыі для агульнаадукацыйнай школы.

3 Новы этап ў развіцці літаратуры, мастацтва: дасягнення і цяжкасці. Нацыянальна-культурнае адраджэнне.

У 90-я гады скарбніца беларускай культуры папоўнілася значнымі творамі літаратуры, мастацтва. Гучны рэзананс у культурным жыцці атрымала пастаноўка ў 1995 г. балета «Страсці» («Рагнеда») А. Мдывані і В. Елізар'ева. Аўтары пастаноўкі атрымалі Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь (1996) і прэмію Міжнароднай асацыяцыі танца пад эгідай ЮНЕСКА (1996). Рэпертуар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь узбагацілі оперы «Князь Навагрудскі», «Майстар і Маргарыта», «Візіт дамы» і інш.

Да мастацкага асэнсавання рэальных гістарычных падзей былі скіраваны сучасныя пастаноўкі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы «Князь Вітаўт», «Звонне малітва», «Страсці па Аўдзею», «Саламея» і інш.

Поспеху беларускай драматургіі паспрыяла падтрымка ўрада, асабліва конкурсы на лепшую п'есу для драматычных, лялечных і дзіцячых тэатраў, якія раз у два гады праводзіць Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Побач з прызнанымі ў свеце творчымі калектывамі акадэмічных тэатраў прафесійным майстэрствам вылучаюцца акцёрскія трупы Маладзёжнага тэатра, Тэатра кінаакцёра, тэатра-лабараторыі «Вольная сцэна», тэатра «Дзея», Альтэрнатыўнага тэатра, Мінскага абласнога драматычнага тэатра ў Маладзечне, тэатра-студыі «Абзац» і інш. Зараз у рэспубліцы дзейнічае 24 тэатры.

Традыцыйным стала правядзенне музычных фестываляў «Музычнае Палессе», «Музы Нясвіжа», Міжнародны фестываль арганнай музыкі ў Полацку, «Мінская вясна», «Беларуская сакавіца», беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне і інш. Асаблівай папулярнасцю карыстаецца міжнародны фестываль «Славянскі базар у Віцебску».

У 90-х гг. развіваліся міжнародныя кантакты беларускіх творчых калектываў. Паспяхова гастралявалі ў краінах Еўропы розныя тэатральныя трупы. У беларускай літаратуры 90-х гадоў прыкметна праявіліся спробы адысці ад празмерна ідэалагізаванага мастацтва і ўзрасла цікавасць да мінулых літаратурных эпох, мадэрнізму і постмадэрнізму.

Новае пакаленне літаратараў ахвотна выкарыстоўвае ў сваёй творчасці разнастайныя жанравыя і стылёвыя формы замежнай літаратуры, і не толькі еўрапейскай. Звычайным стаў зварот пісьменнікаў да асэнсавання беларускай гісторыі. У актыўны ўжытак увайшлі паўзабытыя або недаступныя працы В. Ластоўскага, У. Ігнатоўскага, А. Цвікевіча, Я. Карскага, М. Доўнар-Запольскага і інш. Літаратура вызначылася велізарным попытам на новыя этычныя і

эстэтычныя каштоўнасці. Павышанай увагай да сацыяльнага боку рэчаіснасці, імкненнем выкрываць маральныя язвы грамадства вылучаюцца многія творы сучаснай тэматыкі.

Адкрыта заяўленая грамадзянская пазіцыя, высокае гуманістычнае гучанне характэрна для шматлікіх твораў І. Шамякіна, В. Быкава, Я. Брыля, П. Панчанкі, І. Пташнікава, А. Разанава, А. Дударава, Я. Янішчыц і інш. Разам з тым, не збыліся пакуль што спадзяванні на ўзлёт беларускай прозы ў сучасны перыяд. Літаратары не адшукалі яшчэ героя новага часу, а прадстаўнікі камерцыйнай генерацыі, якія прысутнічаюць у большасці твораў, такімі героямі не сталі.

У сучасным выяўленчым мастацтве выразна пашырыліся нефармальныя тэндэнцыі. Адкрыліся недзяржаўныя галерэі «Арт-творчасць», «Віта-нова», «Жыльбел», «Верхні горад» і інш. З'явіліся неафіцыйныя творчыя аб'яднанні. Традыцыйна высокім прафесіяналізмам вызначаецца беларуская школа графікі, у тым ліку работы В. Шаранговіча, А. Кашкурэвіча, М. Купавы, Ю. Герасіменка-Жызнеўскага і інш.

Асаблівы змест набыло мастацтва М. Савіцкага. Ім створаны цыкл карцін «Чорная быль». Сусветнае прызнанне атрымалітворы мастака Я. Батальёнка. Сем грандыёзных выстаўбыло наладжана мастаком А. Кузьмічом, асноўная тэма творчасці якога – стварэнне галерэі мадоннаў.

Крок наперад зрабіла беларускае кінамастацтва. У 2000 г. падрыхтавана кінастужка рэжысёра М. Пташука «У жніўні сорак чацвёртага...».

У маі 1993 г. быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны». Помнікі культурнай спадчыны сканцэнтраваны ў 138 музеях і іх філіялах – гістарычных, краязнаўчых, гісторыка-археалагічных, літаратурна-мемарыяльных, мастацкіх. Іх фонды папоўніліся асабістымі архівамі шматлікіх вядомых дзеячаў літаратуры і мастацтва. Прадоўжылася рэстаўрацыя гістарычнай забудовы Верхняга горада ў Мінску, Мірскага замка, які на сесіі адпаведнага камітэта ЮНЕСКА быў ўключаны ў спіс сусветнага культурнага наследства. Пашыраны рэстаўрацыйныя работы ў Гродне, Нясвіжы, Брэсце і інш.

Апошнім часам адраджаецца і актыўна развіваецца каля 40 відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дзейнічае больш 50 клубаў і дамоў рамёстваў, творчых майстэрняў народных майстроў. Духоўны патэнцыял нацыі ўзбагаціўся шляхам далучэння да яго сіл і творчасці прадстаўнікоў беларускан дыяспары. Яскравы прыклад – дзейнасць лаўрэатаў Нобелеўскай прэміі Ж. Алфёрава і С. Алексіевіч. Сталае месца ў сучаснай культуры займаюць высокатэхналагічныя сучасныя сродкі камунікацыі: інтэрнет, кабельнае і спадарожнікавае тэлебачанне, якія якасна змянілі рынак тавараў і паслуг культурнага прызначэння. Іх цесная сувязь з галіной электронікі прывяла да пашыранага разумення культурнай сферы. Сфера культуры цяпер нярэдка разглядаецца не толькіяк вытворца ізахавальнік культурных каштоўнасцяў, але і як важны сектар эканомікі, які забяспечвае развіццё навукаёмкіх галін.

Такім чынам, час эканамічных і сацыяльна-палітычных перамен у грамадстве быў цесна звязаны з пошукамі і здабыткамі ў галіне адукацыі, навукі і культуры краіны.

4 Месца рэлігіі ў духоўным адраджэнні, узаемаадносіны дзяржавы і царквы.

У Рэспубліцы Беларусь створаны спрыяльныя прававыя ўмовы для дзейнасці рэлігійных арганізацый, забеспячэння правоў грамадзян на свабоду веравызнання, захавання міжканфесійнага міру і згоды ў грамадстве, развіцця міжрэлігійнага дыялогу.

Свабода веравызнання ў Беларусі гарантавана Канстытуцыяй краіны. Правы і свабоды вернікаў замацаваны таксама ў Законе Рэспублікі Беларусь "Аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацыях".

Дзяржава падтрымлівае канструктыўныя ініцыятывы прадстаўнікоў розных рэлігій. У той жа час праводзіцца работа па прадухіленні дзейнасці дэструктыўных рэлігійных сект.

Сёння ў Беларусі дзейнічаюць больш як 3300 рэлігійных арганізацый 25 канфесій і напрамкаў. Сярод іх праваслаўныя абшчыны, рымска-каталіцкія, пяцідзясятніцкія (хрысціяне веры евангельскай), баптысцкія, адвентыстаў сёмага дня, лютэранскія, іўдзейскія, мусульманскія.

Вядучае месца ў рэлігійным жыцці краіны займае Беларуская праваслаўная царква**.** Яна складае аснову канфесійнай стабільнасці ў рэспублікі. Сёння БПЦ рэалізуе шэраг праграм узаемадзеяння з рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання.

Умацоўваюцца пазіцыі Рымска-каталіцкай царквы. Каталіцтва адносіцца да традыцыйных рэлігій Беларусі. Католікі складаюць 14,5% насельніцтва Беларусі (звыш 1,4 млн. чал.). На 1 студзеня 2012 года ў Беларусі налічвалася 479 каталіцкіх прыходаў.

Пратэстанцкія рэлігійныя арганізацыі налічваюць больш як 1 тыс. рэлігійных абшчын, 21 аб'яднанне, 22 місіі.

Гістарычна традыцыйным на тэрыторыі рэспублікі з'яўляецца лютэранства, якое налічвае 27 абшчын.

Найбольш шматлікія сярод пратэстанцкіх напрамкаў – аб'яднанні хрысціян веры евангельскай, евангельскіх хрысціян баптыстаў, адвентыстаў сёмага дня. Пратэстанцкія абшчыны, як правіла, нешматлікія (20–25 чалавек), выключэнні складаюць абшчыны ў буйных населеных пунктах.

Сёння ў Беларусі шырока прадстаўлены іўдзейскія рэлігійныя аб'яднанні. Паслядоўнікі іўдзейскай веры былі вядомы ў Беларусі яшчэ ў IX–XIII стагоддзях. На гэты дзень у рэспубліцы існуюць больш як 50 іўдзейскіх абшчын, якія маюць 7 культавых будынкаў.

У Рэспубліцы Беларусь дзейнічаюць 25 мусульманскіх рэлігійных абшчын. Найбольшая колькасць зарэгістравана ў Гродзенскай вобласці – 8 абшчын. У краіне дзейнічаюць 6 мячэцей.

Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы дзяржаўнага кіравання ўзаемадзейнічаюць з рэлігійнымі арганізацыямі ў вырашэнні сацыяльна значных пытанняў, прымаюць меры па прадухіленні парушэнняў дзеючага заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

3 РАЗДЗЕЛ КОНТРОЛЮ ВЕДАЎ

3. 1 Тэставыя заданні

1::001:: Освободительный поход Красной армии в Западную Беларусь и Западную Украину начался:
~3 сентября 1939 г.;
~16 сентября 1939 г.;
=17 сентября 1939 г.;
~27 сентября 1939 г.

1::001:: Супольнасцю людзей каменнага веку з’яўлялася:
~саслоўе;
=племя;
~народнасць;
~канфесія.

1::002:: Тыл пасялення першабытнага чалавека называецца:
~засценак;
~веска;
=стаянка;
~дзядзінец.

1::003:: Прыкладна 40—35 тыс. гадоу назад на тэрыторыі Беларусі:
=з’явіўся чалавек сучаснага тыпу;
~з’явіліся жалезныя прылады працы;
~людзі началі займацца земляробствам;
~рассяліліся індаеўрапейцы.

1::004:: Аснову гаспадаркі ўсходніх славян у раннім сярэдневякоўі складала(-ў):
~паляванне;
~гандаль;
~бортніцтва;
=земляробства.

1::005:: Полацк у XI ст. сапернічаў за валоданне волакамі з:
~Туравам;
~Смаленскам;
=Ноўгарадам;
~Мінскам.

1::006:: Барысаглебская (Каложская) царква — выдатны помнік дойлідства XII ст. — была пабудавана у горадзе:
~Полацку;
=Гродне;
~Віцебску;
~Слуцку.

1::007:: Рабоў у X—XII стст. усходнія славяне называлі:
=чалядзь;
~людзіны;
~отракі;
~баяры.

1::008:: Вызначце абавязак княжацкай дружыны ў Полацку:
~абранне князя;
~арганізацыя гарадскога рамяства;
~вядзенне замежнага гандлю;
=ахова князя і межаў княства.

1::009:: Аб завяршэнні працэсу ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага **(ВКЛ)** у другой палове XIV ст. сведчыла:
~устанаўленне ў дзяржаве абсалютнай манархіі;
~увядзенне ўніяцтва ў якасці дзяржаўнай рэлігіі;
~стварэнне агульнадзяржаўнага заканадаўства;
=завяршэнне ў асноўным фарміравання тэрыторыі дзяржавы.

1::010:: Адным з наступстваў Крэўскай уніі (1385 г.) з'явілася:
=атрыманне каталіцкімі феадаламі дадатковых правоў і вольнасцей;
~аслабленне феадальнага прыгнёту;
~страта незалежнасці ВКЛ;
~абвастрэнне адносін ВКЛ з каталіцкай царквой.

1::011:: Утварэнню Рэчы Паспалітай садзейнічала(-ў):
~узрастанне уплыву праваслаўнай царквы ў Польшчы;
=імкненне шляхты ВКЛ пашырыць свае правы;
~крызіс феадальнай сістэмы;
~адмена прыгоннага права ў Польшчы.

1::012:: Аб захаванні пэўнай самастойнасці ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай сведчыла:
~правядзенне павятовых соймікаў (сеймікаў);
=стварэнне Галоўнага трыбунала ВКЛ;
~валоданне шляхтай правам «ліберум вета»;
~правядзенне асобных выбараў манарха.

1::013:: Рэфармацыя на землях Беларусі ў XVI ст. спрыяла:
=распаўсюджванню асветы і кнігадрукавання;
~умацаванню аўтарытэту праваслаўнай царквы;
~распаўсюджванню атэізму і рэлігійнай нецярпімасці;
~аслабленню феадальнага прыгнёту.

1::014:: Г. Каніскі. М. Сматрыцкі, С. Полацкі ўвайшлі ў псторыю Беларусі XVII—XVIII стст. як вядомыя:
~кіраўнікі шляхецкіх паўстанняў;
=царкоўныя і культурный дзеячы;
~дзяржаўныя чыноўнікі;
~ідэолагі Рэфармацыі.

1::015:: Дакументы, у якіх у XVI — першай палове XIX ст. апісваліся феадальныя ўладанні і сялянскія павіннасці называліся:
~універсалы;
~статуты;

~пастановы;
=інвентары.

1::016:: Вызначце наступства шляхецкага паўстання 1830—1831 гг.:
=скасаванне дзеяння Статута ВКЛ 1588 г.;
~забарона дзейнасці каталіцкай царквы;
~вяртанне шляхце «залатых вольнасцей»;
~унясенне змен у ажыццяўленне сялянскай рэформы.

1::017:: У першай палове XIX ст. большасць прадпрыемстваў на тэрыторыі Беларусі належала:
~сялянам;
~царкве;
~мяшчанам;
=памешчыкам.

1::018:: Ініцыятарам і асноўным правадніком аграрных рэформаў у Беларусі ў першай палове XIX ст. быў:
~П. Курлоў
~М. Валовіч;
=П. Кісялеў;
~М.Мураўёў.

1::019:: У адлаведнасці з умовамі ваеннай рэформы 1874 г. на тэрыторыі Расійскай імперыі прадугледжвалася:
~павелічэннс тэрміну ваеннай службы;
=увядзенне льгот для асоб, якія атрымалі адукацыю;
~вызваленне сялян ад ваеннай службы;
~захаванне рэкруцкай павіннасці.

1::020:: Вызначце прычыну першай расійскай рэвалюцыі 1905—1907 гг.:
~удзел Расіі ў Першай сусветнай вайне;
~уплыў рэвалюцыйных падзей у заходнееўрапейскіх краінах;
=неабходнасць правядзення буржуазна-дэмакратычных рэформаў;
~невыкананне ўрадам палажэнняў Канстытуцыі.

1::021:: Прычынай маруднага развіцця цяжкай прамысловасці ў Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. з'яўлялася:
=адсутнаснь неабходнай сыравіны;
~абмежаванні на развіццё прамысловасці з боку ўлады;
~алсутнасць рынку збыту прамысловай прадукцыі;
~адсутнасць свабодных рабочых рук.

1::022:: Вызначце наступства паўстання 1863—1864 гг. на тэрыторыі Беларусі:
~абвяшчэнне палітычных правоў і свабод;
~закрыццё Віленскага ўніверсітэта;
=правядзенне буржуазных рэформаў з абмежаваннямі;
~нарастанне сялянскіх выступленняў.

1::023:: Вызначце кіраўнічы орган беларускіх нацыянальных партый і арганізацый у 1917 г.:
~Камітэт выратавання рэвалюцыі;
~Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту;
~Часовы ўрад;
=Вялікая беларуская рада.

1::024:: Брэсцкі мірны дагавор Савецкая Расія заключыла з:
~краінамі Антанты;
~Італіяй;
~Літвой;
=Германіяй.

1::025:: Вызначце элемент новай эканамічнай палітыкі (нэп), якая праводзілася ў БССР у 1920-я гг.:
~стварэнне машынна-трактарных станцый;
=увядзенне ў грашовы абарот савецкага чырвонца;
~скасаванне сялянскай абшчыны;
~забарона свабоднага гандлю.

1::026:: БССР увайшла у склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР) у:
~1920 г.;
=1922 г.;
~1924 г.;
~1926 г.

1::027:: Вызначце крыніцу фінансавання індустрыялізацыі ў БССР:
=даходы ад нацыяналізацыі прамысловасйі;
~ахвяраванні беларускай дыяспары за мяжой;
~даходы ад здабычы і продажу нафты;
~замежныя інвестыцыі і крэдыты.

1::028:: Вызначце вынік нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР у 1920—1930 я гг.:
~перавод навучання ў большасці школ на рускую мову;
=фарміраванне рабоча-сялянскай інтэлігенцыі;
~стварэнне недзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі;
~аднаўленне дзейнасці ўніяцкай царквы.

1::029:: Вызначце характэрную рысу індустрыялізацыі ў БССР:
~выхад беларускіх тавараў на міжнародны рынак;
=стварэнне новых галін прамысловасці;
~выкарыстанне навейшых замежных тэхналогій;
~перадача ў прыватную ўласнасць дробнай прамысловасці.

1::030:: Вызначце мерапрыемства палітыкі беларусізацыі, якая праводзілася ў 1920-я гг.:
=стварэнне сістэмы вышэйшай адукацыі;
~устанаўленне цесных навуковых сувязей з заходнееўрапейскімі краінамі;
~дазвол свабоднай дзейнасці царкоўных арганізацый;
~стварэнне незалежных сродкаў масавай інфармацыі.

1::031:: Палітычны рэжым, які быў устаноўлены ў Польшчы і Заходняй Беларусі ў 1926 г. у выніку дзяржаўнага пераваротy, атрымаў назву:
~«адліга»;
~«ваенны камунізм»;
~«казарменны сацыялізм;
=«санацыя».

1::032:: Заходняя Беларусь у складзе Польшчы атрымала назву:
~«Генеральная акруга Беларусь»;
~«Паўночна-Заходні край»;
=«Крэсы ўсходнія»;
~Вялікае Княства Літоўскае.

1::033:: Вызначце прозвішча лётчыка, які ў першыя дні вайны накіраваў свой падбіты самалёт на калону варожай тэхнікі каля Радашковіч:
~М. Шмыроў;
=М. Гастэла;
~П. Панамарэнка;
~І. Русіянаў.

1::034:: Вызначце першы абласны цэнтр Беларусі, які быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 26 лістапада 1943 г.
~Гродна;
=Гомель;
~Віцебск;
~Брэст.

1::035:: Вызначце мэту «рэйкавай вайны» ў гады Вялікай Айчыннай вайны:
~арганізацыя паставак зброі і медыкаментаў партызанам;
=дэзарганізацыя нямецкіх ваенных перавозак;
~эвакуайыя насельніцтва і матэрыяльных каштоўнасйей;
~будаўніцтва новых чыгунак на вызваленай тэрыторыі.

1::036:: Вызначце асаблівасць партызанскага і падпольнага руху на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны:
=удзел замежных антыфашыстаў у барацьбе з акупантамі;
~адсутнасць падтрымкі з боку мясцовага насельніцтва;
~цесныя сувязі з рухам Супраціўлення ў Заходняй Еўропе;
~адсутнасць адзінага каардынацыйнага цэнтра.

1::037:: Уклад беларускага народа ў перамогу над фашызмам у Другой сусветнай вайне быў адзначаны:
~пашырэннем паўнамоцтваў кіраўніцтва БССР;
~узбуйненнем тэрыторыі рэспублікі пасля вайны;
=уключэннем БССР у Арганізацыю Аб’яднаных Нацый (ААН);
~аслабленнем кантролю ўлалы за грамадскім жыцыём у БССР.

1::038:: Вызначце характэрную рысу грамадска-палітычнага жыцця БССР у 1945—1953 гг.:
~падзенне аўтарытэту Камуністычнай партыі ў грамадстве;
~правядзенне самастойнай знешняй палітыкі;
=панаванне адзінай дзяржаўнай ідэалогіі;
~правядзенне выбараў на альтэрнатыўнай аснове.

1::039:: Вызначце характэрную рысу развіцця сельскай гаспадаркі БССР у другой палове 1960-х— першай палове 1980-х гг.:
~заканадаўчае замацаванне прыватнай уласнасці на зямлю;
=правядзенне меліярацыі, механізацыі і хімізацыі сельскай гаспадаркі;
~адмена сістэмы дзяржзаказу на сельскагаспадарчую прадукцыю;
~стварэнне і развіццё аграгарадкоў.

1::040:: Вызначце характэрную рысу сацыяльна эканамічнага становішча БССР у другой палове 1960-х — першай палове 1980-х гг.:
~актыўнае выкарыстанне замежных крэдытаў;
=пераважна экстэнсіўны шлях развіцця;
~заканадаўчае замацаванне прыватнай уласнасці;
~скарачэнне колькасці гарадскога насельніцтва.

1::041:: Вызначце вынік ажыццяўлення палітыкі перабудовы ў сацыяльна-эканамічнай сферы БССР:
~адмова ад пяцігадовых планаў развіцця;
=прымяненне новых формаў арганізацыі працы;
~значнае абмежаванне правоў прадпрыемстваў;
~дэмантаж калгасна-саўгаснай сістэмы.

1::042:: Вызначце змену ў грамадска-палітычным жыцці БССР у другой палове 1980 х гг., якая была выклікана правядзеннем палітыкі перабудовы:
~правядзенне выбараў на безальтэрнатыўнай аснове;
~распрацоўка праграмы пабудовы камунізму;
~узмацненне дзяржаўнага ціску на царкву;
=узнікненне і развіццё нацыянальнага руху.

1::043:: Сярод прапанаваных вызначце прозвішча вядомага беларускага пісьменніка:
=І. Мележ;
~М. Фінберг;
~С.Селіханаў;
~Г.Вашчанка.

1::044:: Паводле Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР абвяшчалася:
~раўнапраўным членам Еўрапейскага саюза;
~унітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай;
~удзельніцай Міжнароднага дагавора аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі;
=раўнапраўным і незалежным членам сусветнага супольніцтва.

2::045:: Вялікі князь літоўскі Гедымін перанёс сталіцу ВКЛ у Вільню ў _____ годзе.
{=1323}

2::046:: Крэўская унія паміж ВКЛ І Польшчай была падпісана ў_____ годзе.
{=1385}

2::047:: Пазнайце гістарычную асобу і запішыце толькі прозвішча_____.
Прадстаўнік старажытнага роду тураўскіх князёў, палітычны дзеяч ВКЛ XVI ст., мецэнат. Займаў вышэйшыя дзяржаўныя пасады ў княстве. Выдатны палкаводзец, атрымаў перамогу больш чым у 60-ці бітвах, у тым ліку ў бітве пад Оршай (1514 г.).
{=Астрожскі}

2::048:: Князь Міндоўг каранаваўся ў Навагрудку ў_____ годзе.
{=1253}

2::049:: Запішыце назву асобнай часткі горада, якая знаходзілася пад уладай магната ці царкоўнай установы і на жыхароў якой не распаўсюджвалася адміністрацыйная і судовая ўлада магістрата_____.
{=Юрыдыка}

2::050:: Запішыце назву аб'яднання гарадскіх рамеснікаў адной ці некалькіх блізкіх прафесій з мэтай наладжвання збыту сваёй прадукцыі і абароны ад умяшання ў гарадскія справы феадалаў_____.
{=Цэх}

2::051:: Пазнайце гістарычную асобу і запішыце толькі прозвішча_____.

Палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі, славуты кампазітар, аўтар знакамітага паланэза «Развітанне з Радзімай». Удзельнік паўстання І794 г. Адзін з аўтараў праекта стварэння аўтаномнага Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Расійскай імперыі.
{=Агінскі}

2::052:: Запішыце назву уніі, якая была заключана паміж Польшчай і ВКЛ у другой палове XVI ст., і прывяла да стварэння новай дзяржавы_____.
{=Люблінская}

2::053:: У якім годзе адбылося прыняцце Канстытуцыі Рэчы Паспалітай_____.
{=1791}

2::054:: Выберыце і запішыце назву членаў арганізацыі, якая не адносілася да ліку сацыял-дэмакратычных:
меншавікі — бальшавікі — бундаўцы — філаматы.
{=Філаматы}

2::055:: Пазнайце гкгтарычную асобу і запішыце толькі прозвішча_____.
Ураджэнец Беларусі, кампазітар, аўтар музыкі да камедыі-оперы В. Дуніна-Марйінкевіча «Сялянка». Заснавальнік польскай і беларускай класічнай музыкі.
{=Манюшка}

2::056:: Пазнайце гістарычную асобу і запішыце толькі прозвішча_____.
Беларуская паэтэса-рэвалюцыянерка пачатку XX ст. Адна з заснавальнікаў і кіраўнікоў Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ). Удзельнічала ў выданні газеты «Наша ніва». Аўтар нелегальных паэтычных зборнікаў «Хрэст на свабоду» і «Скрыпка беларуская».
{=Пашкевіч/Цетка}

2::057:: У якім годзе адбылося Першае абвяшчэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (ССРБ) _____.
{=1919}

2::058:: Аднаўленне добрага імя і правоў нявінна асуджаных — гэта_____.
{=Рэабілітацыя}

2::059:: Абясцэньванне грошай у выніку выпуску іх у абарачэнне без забеспячэння неабходнай колькасцю тавараў — гэта_____.
{=Інфляцыя}

2::060:: Поўная незалежнасць дзяржавы ад іншых дзяржаў у яе ўнутраных справах і знешняй палітыцы называецца_____.
{=Суверэнітэт}

3. 2 Пытанні да экзаменаў

Пытанні па “Гісторыі Беларусі”
для спецыяльнасці “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны” 1 курс (1 семестр)

Ст. выкладчык – Сідорэнка Віталіна Мікалаеўна

1 Гісторыя Беларусі як навучальная дысцыпліна.
2 Перыядызацыя гісторыі Беларусі.
3 Крыніцы і гістарыяграфія вывучэння гісторыі Беларусі старажытнага і раннефеадальнага перыяду.
4 Засяленне тэрыторыі Беларусі чалавекам: неандэртальцы і краманьёнцы.
5 Умовы жыцця, прылады працы, асноўныя заняткі старажытнага чалавека у раннім каменным веку на тэрыторыі Беларусі.
6 Плямёны і археалагічныя культуры каменнага веку на тэрыторыі Беларусі.
7 Плямёны і археалагічныя культуры бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі.
8 Плямёны і археалагічныя культуры ранняга жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі.
9 З'яўленне індаеўрапейцаў, іх балцкая галіна на беларускіх землях.
10 Генезіс усходнеславянскіх плямён і шляхі іх рассялення па тэрыторыі Беларусі.
11 Праблема паходжання беларусаў.
12 Сельская абшчына , паселішчы і гарадзішчы на тэрыторыі Беларусі.
13 Разлажэнне першабытна-абшчынных адносін і ўзнікненне класавага грамадства.
14 Эвалюцыя грамадскага ладу, матэрыяльнай і духоўнай культуры радзімічаў.
15 Эвалюцыя грамадскага ладу, матэрыяльнай і духоўнай культуры дрыгавічоў.
16 Эвалюцыя грамадскага ладу, матэрыяльнай і духоўнай культуры крывічоў.
17 Узнікненне княстваў на тэрыторыі Беларусі: старажытнабеларускія землі і Кіеўская Русь.
18 Дзяржаўнасць Полацкай зямлі ў 9-13 стст.
19 Дзяржаўнасць Тураўскага княства ў 9-13 стст.
20 Беларускія землі ў Смаленскім, Чарнігаўскім, Кіеўскім, Уладзіміра-Валынскім княствах ў 9-13 стст.
21 Прычыны і наступствы феадальнай раздробленасці на беларускіх землях.
22 Удзельныя княствы Полацкай зямлі ў час феадальнай раздробленасці.
23 Падзел Тураўскай зямлі ў час феадальнай раздробленасці.
24 Княствы ў беларускім Пабужжы і Панямонні, воласці ў Пасожжы.
25 Арганізацыя кіравання і дзяржаўны лад у землях-княствах ў 9-13 стст.
26 Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель ў 10-13 ст.
27 Шматукладнасць эканомікі і развіццё феадальных адносін на землях Беларусі ў 9-13 стст.

28 Стан сельскай гаспадаркі на беларускіх землях ў 9-13 стст.
29 Узнікненне гарадоў і іх функцыі на беларускіх землях ў 9-13 стст.
30 Гарадское рамяство, унутраны і знешні гандаль на беларускіх землях ў 9-13 стст.
31 Сацыяльнае расслаенне грамадства беларускіх зямель ў 9-13 стст.
32 Прыняцце і распаўсюджанне хрысціянства на беларускімх землях.
33 Развіццё адукацыі і культуры на беларускіх землях ў 9-13 ст.
34 Знешнепалітычнае становішча беларускіх зямель у пачатку 13 ст.
35 Напад нямецкіх феадалаў на Усходнюю Прыбалтыку і Полацкую зямлю ў пачатку 13 ст.
36 Роля беларускага народа ў барацьбе з мангола-татарамі ў 13-14 стст.
37 Уплыў знешнепалітычнай сітуацыі на ўтварэнне дзяржавы ў верхнім і сярэднім Панямонні ў 13 ст.
38 Сацыяльна-эканамічныя перадумовы фарміравання Вялікага княства Літоўскага.
39 Міндоўг і яго палітыка.
40 Княжэнне Гедыміна і яго палітыка.
41 Княжэнне Альгерда і Кейстута, палітыка кансалідацыі беларускіх зямель.
42 Уключэнне ў склад Вялікага княства Літоўскага Полацкага, Віцебскага, Менскага княстваў і падняпроўскіх зямель.
43 Сталіцы, герб і мова дзяржаўнага справаводства ў Вялікім княстве Літоўскім ў 13 - пачатку 16 ст.
44 Органы дзяржаўнай улады і кіравання ў Вялікім княстве Літоўскім ў 13 - пачатку 16 ст.
45 Сістэма мясцовага кіраўніцтва ў Вялікім княстве Літоўскім ў 13 - пачатку 16 ст.
46 Судовая сістэма і асаблівасці яе існавання ў Вялікім княстве Літоўскім ў 14 - пачатку 16 ст.
47 Княжанне Вітаўта: унутраная і знешняя палітыка.
48 Знешняя палітыка і войны Вялікага княства Літоўскага ў 14 - першай палове 16 ст.
49 Адносіны Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай.
50 Арганізацыя войска ВКЛ і барацьба супраць крымскіх татар.
51 Развіццё адукацыі і культуры на беларускіх землях ў 14 – першай палове 16 ст.
52 Канфесійная сітуацыя на беларусіх землях ў 14 – першай палове 16 стст.

ПЫТАННІ
да заліку па гісторыі Беларусі для студэнтаў 2 курса
спец. “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны”
1 семестр

Выкладчык – к.г.н., дацэнт М.Н.Мурашка

1. Канфесіянальная палітыка царызму на Беларусі ў першай палове 19 ст. Полацкі царкоўны сабор.
2. Палітычная сітуацыя на Беларусі напярэдадні вайны 1812 г., пачатак вайны і ход ваенных дзеянняў.
3. Палітыка французскіх акупацыйных ўлад. Адносіны насельніцтва да вайны 1812 г. Вынікі вайны для Беларусі.
4. Памешчыцкая гаспадарка ў Беларусі ў першай палове 19 ст.
5. Стан сялянскай гаспадаркі ў першай палове 19 ст.
6. Сялянская барацьба на Беларусі ў першай палове 19 ст.: асноўныя формы і характар.
7. Разлажэнне феадальна-прыгонніцкага ладу ў першай палове 19 ст. Рэформы П.Кісялева.
8. Дробная і мануфактурная вытворчасці Беларусі ў першай палове 19 ст.
9. З'яўленне фабрычна-заводскай вытворчасці ў Беларусі і пачатак тэхнічнага пераваротy ў другой чвэрці 19 ст.
10. Тайныя вучнёўскія таварыствы ў Беларусі і іх дзейнасць у першай трэці 19 ст.
11. Дзекабрысцкі рух і Беларусь.
12. Ход паўстання 1830-1831 г. на Беларусі і прычыны яго паражэння.
13. Уплыў рэвалюцыйных падзей у Заходняй Еўропе на Беларусь і дэмакратызацыя грамадскага руху ў 30-50-я гады 19 ст. Ф.Савіч.
14. Змены ў палітыцы царызму на Беларусі ў 30-50-я гады 19 ст., узмацненне русіфікацыі.
15. Увядзенне расійскага заканадаўства і дзейнасць Камітэта па справах заходніх губерняў.
16. Развіццё адукацыі і асветы ў першай палове 19 ст.
17. Станаўленне навукі і навуковага беларусазнаўства ў першай палове 19 ст.
18. Літаратура, музыка і тэатр у першай палове 19 ст.
19. Выяўленчае мастацтва і архітэктура Беларусі ў першай палове 19 ст.
20. Перадумовы і падрыхтоўка сялянскай рэформы 1861 г. на Беларусі.
21. Адмена прыгоннага права і асаблівасці ажыццяўлення сялянскай рэформы 1861 г. на Беларусі.
22. Вынікі і значэнне аграрных пераўтварэнняў 60-70-х гг. 19 ст. на Беларусі.
23. Ажыццяўленне рэформы дзяржаўных сялян у 50-70-я гады 19 ст. на Беларусі.
24. Рэформы дзяржаўных інстытутаў і мясцовага кіравання ў 60-70-х гг. 19 ст. і асаблівасці іх правядзення на Беларусі (земская, судовая, гарадская).
25. Школьная, цэнзурная і ваенная рэформы і іх значэнне для Беларусі. Контррэформы.
26. Актывізацыя грамадскага жыцця ў Беларусі напярэдадні паўстання 1863 г.. К.Каліноўскі. "Мужыцкая праўда".
27. Прычыны, характар і ход паўстання 1863 г. Тактыка "белых".
28. Падаўленне паўстання 1863 г., прычыны паражэння і яго гістарычнае значэнне.
29. Узмацненне русіфікацыі. Фарміраванне рускай адміністрацыі на Беларусі і палітыка самадзяржаўя ў галіне землеўладання ў 60-70-х гг. 19 ст.

30. Змены ва ўрадавай палітыцы царызму па нацыянальна-рэлігійнаму пытанню ў 60-70-я гады 19 ст. і умацаванне дзяржаўнай рэлігіі.
31. Музыка і тэатр у Беларусі ў першай палове 19 ст.
32. Памешчыцкае і сялянскае землеўладанні. Рост бессаслоўнай земельнай уласнасці ў 60-90-х гг. 19 ст. на Беларусі. Сацыяльнае расслаенне сялянства і фарміраванне аграрнай буржуазіі.
33. Аграрны крызіс канца 19 ст. і змены ў спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі.
34. Спецыялізацыя прамысловасці і яе галіновая структура ў другой палове 19 ст.
35. Развіццё гарадоў Беларусі ў 60-90-х гг. 19 ст. Транспарт і гандаль.
36. Фарміраванне класа наёмных рабочых і гандлёва-прамысловай буржуазіі ў Беларусі.
37. Народніцкія гурткі і арганізацыі ў Беларусі ў 70-90-х гг. 19 ст.
38. Група “Гоман” і яе погляды на развіццё Беларусі.
39. Этнічная тэрыторыя беларусаў. Нацыянальны склад насельніцтва ў канцы 19 ст.
40. Фарміраванне агульных нацыянальных прыкмет беларускай нацыі.
41. Навука і развіццё навуковага беларусазнаўства ў другой палове 19 – пачатку 20 ст.
42. Развіццё мастацкай літаратуры ў другой палове 19 - пачатку 20 ст.
43. Мастацтва і архітэктура Беларусі другой паловы 19 – пачатку 20 ст.
44. Сацыяльная структура беларускага грамадства на мяжы 19-20 ст.
45. Стан і развіццё прамысловасці Беларусі ў пачатку XX ст.
46. Развіццё капіталізму у сельскай гаспадарцы Беларусі ў пачатку 20 ст.
47. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі ў канцы 19 – пачатку XX ст. Утварэнне палітычных партый.
48. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей і палітычнай сітуацыі ў Беларусі ў пачатку XX ст. Пачатак рэвалюцыі 1905-1907 гг.
49. БСГ і яе роля ў развіцці нацыянальнага і дэмакратычнага руху ў час рэвалюцыі. “Заходнерусізм”.
50. Дзяржаўныя Думы і Беларусь.
51. Сталыпінскія рэформы і іх вынікі для Беларусі.
52. Беларускі нацыянальны рух у 1901-1914 гг. “Наша ніва”.
53. Трэцячэрвеньскі дзяржаўны пераварот 1907 г. і грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі ў 1907-1914 гг.

Пытанні да экзаменаў па курсу Гісторыі Беларусі (1914 г. – пачатак 21 ст.)
для студэнтаў ГМ – 24
2 семестр
Лебедев А.Д.

1. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі (1914 г. – пачатак 21 ст.).
2. Крыніцы па гісторыі Беларусі (1914- пачатак 21 ст.)

3. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны.
4. Ваенныя дзеянні на германска-расійскім (Усходнім) фронце ў 1914-1916 гг.Становішча на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі.
5. Беларусь у час Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.
6. Беларускі нацыянальны рух у перыяд ад лютага да ліпеня 1917г.
7. Беларускі нацыянальны рух у перыяд ад ліпеня да кастрычніка 1917г.
8. Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і ўсталяванне савецкай улады ў Беларусі і на Заходнім фронце.
9. Утварэнне і дзейнасць Аблвыканкамзаха і СНК Заходняй вобласці і фронта. Першыя сацыяльна- эканамічныя пераўтварэнні.
10. Палітычнае становішча ў Заходняй вобласці ў снежні 1917- лютым 1918гг.
11. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Узаемаадносіны Рады і ўрада БНР з германскімі акупацыйнымі ўладамі.
12. Абвяшчэнне Беларускай ССР. Першая Канстытуцыя Савецкай Беларусі.
13. Утварэнне Літоўска-Беларускай ССР: мэтазгоднасць і вынікі.
14. Прычыны і пачатак польска-савецкай вайны. Усталяванне польскага акупацыйнага рэжыму.
15. Наступленне Чырвонай Арміі летам 1920 г. Другое абвяшчэнне БССР.
16. Заканчэнне польска-савецкай вайны. Рыжскі мірны дагавор.
17. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў БССР у 1921—1927 гг.
18. Палітыка беларусізацыі. Становішча нацыянальных меншасцей у БССР.
19. Усталяванне аднапартыйнай сістэмы ў БССР.
20. Ажыццяўленне мерапрыемстваў новай эканамічнай палітыкі ў БССР.
21. Фарміраванне савецкай сістэмы адукацыі. Развіццё навукі у 1920 – 1930-я гады.
22. Развіццё культуры БССО ў 1920-1930-я гады.
23. Развіццё нацыянальных культур у БССР у 1920 – 1930-я гады.
24. Ажыццяўленне і вынікі індустрыялізацыі ў БССР.
25. Калектывізацыя беларускай вёскі, яе палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя вынікі.
26. Палітыка «культурнай рэвалюцыі» і яе вынікі ў БССР у 1930-я гады.
27. Палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі ў 1930-я гг.
28. Прамысловасць і сельская гаспадарка Заходняй Беларусі пад уладай Польшчы.
29. Палітыка польскіх улад у Заходняй Беларусі. Нацыянальны прыгнёт.
30. Асноўныя палітычныя партыі і арганізацыі ў Заходняй Беларусі і іх дзейнасць.
31. Культура Заходняй Беларусі пад уладай Польшчы.
32. Прыняцце Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз'яднанне яе з БССР.
33. Сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і культурныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі (канец 1939 г. – першая палова 1941г.)
34. Беларусь у пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Баі пад Мінскам, Барысавам, Бабруйскам і Віцебскам. Абарона Магілёва і Гомеля.
35. Акупацыйны рэжым фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі.

36. Калабаранцкія арганізацыі і іх дзейнасць на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
37. Разгортванне ўсенароднай барацьбы супраць фашысцкіх захопнікаў на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.
38. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.
39. Дзейнасць фарміраванняў Арміі Краёвай на тэрыторыі Беларусі.
40. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
41. Індустрыялізацыя БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе і, яе сутнасць і вынікі.
42. Аднаўленне і развіццё сельскай гаспадаркі БССР ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.
43. Калектывізацыя ў заходніх абласцях БССР і яе вынікі.
44. Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё БССР ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.
45. Развіццё прамысловасці і транспарту ў БССР (сярэдзіна 50-х - 80-ягг. ХХст.).
46. Развіццё сельскай гаспадаркі ў БССР (сярэдзіна 50-х - 80-ягг. ХХст.).
47. Развіццё адукацыі ў БССР (сярэдзіна 50-х - 80-я гг. ХХст.).
48. Развіццё навукі ў БССР (сярэдзіна 50-х - 80-я гг. ХХст.).
49. Развіццё культуры ў БССР (сярэдзіна 50-х - 80-я гг. ХХст.).
50. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР (сярэдзіна 50-х - 80-я гг. ХХст.).
51. Змены ў матэрыяльным дабрабыце насельніцтва ў БССР (сярэдзіна 50-х - 80-я гг. ХХст.).
52. Палітыка «перабудовы» і яе наступствы ў БССР.
53. Палітычны крызіс у СССР, асаблівасці яго праяўлення ў Беларусі.
54. Чарнобыльская катастрофа і яе наступствы для Беларусі.
55. Асноўныя этапы афармлення незалежнасці і суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.
56. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Рэферэндумы 1995, 1996, 2004 гадоў.
57. Курс Рэспублікі Беларусь на сацыяльна-арыентаваную рыначную эканоміку: дасягненні і перспектывы.
58. Рэформаванне агульнай і вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.
59. Асноўныя этапы стварэнні Саюзнай дзяржавы: дасягненні і перспектывы.
60. Развіццё культуры Рэспублікі Беларусь: дасягненні і цяжкасці (90-я гг. ХХ ст. – пач. ХХІ ст.).
61. Шматвектарны характар знешняй палітыкі Рэспубліцы Беларусь.
62. Грамадска-палітычнае жыццё ў Рэспубліцы Беларусь.

4 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

4.1 ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА

Установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
УА “ГДУ ім. Ф. Скарыны”,
_____ І.В. Семчанка
“____”_____ 20 г.,
Рэгістрацыйны № УД- _____/р.

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

Вучэбная праграма дысцыплины абавязковага кампанента
для спецыяльнасці

1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

Факультэт гістарычны

Кафедра гісторыі Беларусі

Курс (курсы) 1 - 2

Семестр (семестры) 1 - 4

Лекцыі 92 гадз.

Экзамен – 1,2, 4
Залік - 3

Семінарскія заняткі 80 гадз.

Курсавая работа – 2, 4

Самастойная кіруемая работа
студэнтаў 18 гадз.
Разам аудыторных гадзін
па дысцыпліне 190 гадз.

Форма атрымання
вышэйшай адукацыі дзённая

Разам гадзін
па дысцыпліне 416 гадз.

Склаў: А.Р.Яшчанка,
В.М.Сідорэнка

2013

Вучэбная праграма дысцыпліны абавязковага кампанента “Гісторыя Беларусі” складзена на аснове Тыпавой вучэбнай праграмы для вышэйшых навучальных установ па спецыяльнасцях: 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па накірунках), зацверджанай 13.03.2009 г. рэгістрацыйны №ТД- Е 109 / тып.

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння на пасяджэнні кафедры гісторыі Беларусі
26.04.2013 г., пратакол № 10
Загадчык кафедрай
Дацэнт_____ А.Р.Яшчанка

Адобрана і рэкамендавана да зацвярджэння метадычным саветам гістарычныгы факультэта
26.04.2013 г., пратакол № 8
Старшыня
Дацэнт _____ С.Б. Жыхараў

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна "Гісторыя Беларусі" з'яўляецца адным з вядучых у навучальным плане спецыяльнасці "Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па накірунках)" ВНУ Рэспублікі Беларусь. Ён выкладаецца на працягу першага - другога гадоў навучання. Агульная колькасць гадзін на вучэбную дысцыпліну - 558, з якіх аудыторныя заняткі складаюць 238 гадзін (100 лекцый і 106 семінарскіх заняткаў), СКРС – 32 гадзіны.

Вучэбная праграма дысцыпліны «Гісторыя Беларусі» распрацавана ў адпаведнасці з наступнымі нарматыўнымі і метадычнымі дакументамі: - Адукацыйны стандарт «Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-23 01 13 "Гісторыка-архівазнаўства" (зацверджаны 29.05. 2008); Парадак распрацоўкі, зацвярджэння і рэгістрацыі вучэбных праграм для першай ступені вышэйшай адукацыі (зацверджана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12.11. 2008 г.).

У вучэбнай праграме ўлічаны патрабаванні адукацыйнага стандарта цыклу сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.

Мэта вывучэння курса заключаецца ў набыцці студэнтамі ведаў аб асноўных этапах, з'явах і падзеях і імѐнах айчыннай гісторыі; разуменні яе месца ў сістэме сацыяльна-гуманітарных ведаў; у дакладным уяўленні імі ўзаемапранікненняў і ўзаемаўплываў народаў, што адбываліся на сумежжы цывілізацый Захаду і Усходу; у фарміраванні творчай і гарманічнай, з навукова-гуманістычным светапоглядам, сацыяльна актыўнай і патрыятычнай асобы.

Для рэалізацыі вызначаных мэт прадугледжваецца вырашэнне наступных задач:

- навучыць студэнтаў знаходзіць прычынна-выніковыя сувязі гістарычных працэсаў і падзей;
- прывіць ім навыкі ў вызначэнні фактараў, якія абумовілі змест, характар і асаблівасці рэгіянальнага развіцця;
- сфарміраваць крытычны падыход да аналізу мінулага і правядзення яго сувязі з сучаснасцю;
- садзейнічаць фарміраванню ў выпускніка вышэйшай школы актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен ведаць:

- асноўныя тэорыі грамадскага развіцця ў адпаведнасці з фармацыйным і цывілізацыйным падыходамі да разгляду гісторыі Беларусі;
- асноўныя этапы фарміравання беларускага этнасу ў розныя гістарычныя перыяды;
- сутнасныя характарыстыкі еўрапейскага, расійскага, савецкага і сучаснага шляхоў мадэрнізацыі ў сацыяльна-эканамічнай, ідэйна-палітычнай, культурнай і духоўнай сферах;
- асноўныя дасягненні ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры, культурна-гістарычную спадчыну беларускага грамадства;
- асноўныя этапы станаўлення дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі, беларускай дзяржаўнасці і дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;
- месца і ролю беларускіх зямель у геапалітычных працэсах у розныя гістарычныя перыяды, месца і ролю суверэннай Рэспублікі Беларусь у працэсах інтэграцыі і глабалізацыі.

умець:

- прымяняць фармацыйны і цывілізацыйны падыходы пры характарыстыцы заканамернасцяў і асаблівасцяў гістарычнага развіцця беларускага соцыума;

- растлумачваць уплыў розных культурна-цывілізацыйных фактараў на сацыяльна-эканамічнае, дзяржаўна-палітычнае, этнаканфесійнае і культурнае развіццѐ Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды;

- ажыццяўляць параўнальны аналіз рэформ і рэвалюцый у працэсе мадэрнізацыі беларускага грамадства, ацэньваць вынікі дзейнасці савецкай грамадска-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сістэмы ў БССР, вызначаць сутнасныя характарыстыкі сучаснай беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця;

- ацэньваць асноўныя дасягненні матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі ў кантэксце гістарычнага развіцця і выкарыстоўваць культурна-гістарычную спадчыну ў сваѐй прафесійнай дзейнасці;

- аналізаваць працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці, афармлення і ўмацавання суверэнітэту Рэспублікі Беларусь у аспекце фарміравання прававой дзяржавы;

- характарызаваць ролю і месца беларускіх зямель у рэгіянальным, цывілізацыйным і геапалітычным развіцці ў розныя гістарычныя перыяды, месца і ролю суверэннай Рэспублікі Беларусь у сучаснай геапалітычнай сітуацыі ва ўмовах інтэграцыі і глабалізацыі.

Структура зместу праграмы грунтуецца на вызначэнні і адборы галоўных паняццяў, ідэй, тэндэнцый, фактаў, дат, імен і іншых элементаў гістарычных ведаў, накіравана на тое, каб раскрыць сутнасныя элементы развіцця эканамічных адносін і важнейшыя рысы ў Беларусі; дэмаграфічную характарыстыку і сацыяльную стратыфікацыю грамадства; асноўныя палітычныя падзеі і іх уплыў на дзяржаўна-прававую эвалюцыю Беларусі; канфесійнае і этнакультурнае развіццѐ; найкаштоўнейшыя здабыткі духоўнага жыцця народа.

Кафедры ВНУ, якія курыруюць выкладанне гісторыі Беларусі, распрацоўваюць вучэбныя праграмы па дысцыпліне ў рамках акадэмічных свабод. Вучэбная праграма па дысцыпліне адлюстроўвае спецыфіку профіля ВНУ, спецыяльнасці, уласных навукова-метадычных прыхільнасцей і прафесійнага вопыту прафесарска-выкладчыцкага складу кафедры.

Структура праграмы грунтуецца на вызначэнні і адборы галоўных паняццяў, ідэй, тэндэнцый, фактаў, дат, імён і іншых элементаў гістарычных ведаў, накіравана на тое, каб раскрыць сутнасныя элементы развіцця эканамічных адносін і важнейшыя рысы ў Беларусі; дэмаграфічную характарыстыку і сацыяльную стратыфікацыю грамадства; асноўныя палітычныя падзеі і іх уплыў на дзяржаўна-прававую эвалюцыю Беларусі; канфесійнае і этнакультурнае развіццё; найкаштоўнейшыя здабыткі духоўнага жыцця народа.Змест праграмы адпавядае сучасным дасягненням гістарычнай навукі. Дысцыпліна разлічана на 416 гадзін, з іх 190 гадзін аудыторных заняткаў (92 гадзін лекцый, 80 гадзін семінарскіх заняткаў, 18 гадзін СКРС). У якасці формы справаздачнасці праводзяцца экзамены і залік.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

РАЗДЗЕЛ 1. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ СА СТАРАЖЫТНАСЦІ ДА СЯРЭДЗІНЫ 16 СТ.

Тэма 1.1 Уводзіны ў гісторыю Беларусі.

Гісторыя Беларусі як навука і навучальная дысцыпліна, яе месца ў падрыхтоўцы спецыялістаў музейнай справы. Змест і структура курса. Характарыстыка вучэбнай літаратуры. Асаблівасці гістарычнага шляху беларускага народа. Тэрыторыя і прыродныя умовы. Эвалюцыя назваў краю і насельнікаў. Перыядызацыя гісторыі Беларусі. Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння айчыннай гісторыі. Гісторыя як памяць народа.

Важнейшыя крыніцы па гісторыі Беларусі. Навуковыя і вучэбныя выданні крыніц. Роля гістарычных ведаў у нацыянальна-культурным адраджэнні беларускага народа і станаўленні суверэннай дзяржавы - Рэспублікі Беларусь. Вывучэнне гісторыі Беларусі ў XIX - пачатку XX стст. Станаўленне польскай гістарыяграфічнай школы. Канцэпцыі расійскіх гісторыкаў. Пачатак фарміравання беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі. Савецкая гістарыяграфія гісторыі Беларусі. Развіццѐ гістарычнай навукі ў БССР у 20-я гады. XX ст. Беларускія гісторыкі ў 1930 - 1950-х гг. Гістарыяграфія 60 - 80-х гадоў. "Белыя плямы" і дэфармацыі ў савецкай гістарычнай навуцы. Гісторыя Беларусі ў замежнай гістарыяграфіі XX ст. Даследаванні ў міжваеннай Польшчы. Пасляваенная польская гістарыяграфія. Працы гісторыкаў дыяспары. Сучасны этап развіцця айчыннай гістарыяграфіі. Важнейшыя дасягненні, супярэчнасці і кірункі ў гістарычнай навуцы Рэспублікі Беларусь. Перамены ў сістэме гістарычнай адукацыі.

Гістарычная свядомасць беларускага грамадства.

Тэма 1.2 Першапачатковае засяленне тэрыторыі Беларусі.

Засяленне тэрыторыі Беларусі чалавекам. Каменны век, яго перыядызацыя. Прыродна-кліматычныя умовы. Старажытныя стаянкі. Фізічны тып, прылады працы, зброя, асноўныя заняткі першых насельнікаў Беларусі. Неаліт. З'яўленне вытвараючых формаў гаспадаркі. Крэмнездабыўчыя шахты. Эвалюцыя сацыяльнай арганізацыі. Рэлігійныя вераванні і абрады. Першабытнае мастацтва.

Насельніцтва Беларусі ў бронзавым і жалезным вяках. Асаблівасці бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі. Рассяленне індаеўрапейцаў. Гаспадарчыя заняткі. Жывѐлагадоўля і земляробства. Выплаўка і апрацоўка металаў. Першапачатковы абмен. Бацькоўскі род.

Тэма 1.3 Рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі

Рассяленне славян. Першыя славянскія помнікі на тэрыторыі Беларусі. Славянская каланізацыя. Узаемаадносіны славян і балтаў. Сацыяльна-эканамічнае развіццѐ. Сельская абшчына. Тып паселішчаў.Разлажэнне першабытнаабшчынных адносін. Матэрыяльная і духоўная культура. Рэлігійныя вераванні.

Тэма 1. 4 Першыя княствы-дзяржавы на беларускіх землях.

Першыя дзяржавы-княствы. Вытокі дзяржаўнасці Беларусі. Княжанні і княствы. Роля варагаў. Землі старажытнай Беларусі і Кіеўская Русь. Полацкае княства. Узаемаадносіны Полацка з Кіевам і Ноўгарадам. Рагвалод і Рагнеда. Падпарадкаванне Полацка Ўладзімірам. Аднаўленне полацкай дынастыі. Ваенна-палітычная дзейнасць Брачыслава і Ўсяслава. Бітва на Нямізе. Узнікненне Тураўскага княства. Княжанне ў Тураве Святаполка Уладзіміравіча. Асаблівасці адміністрацыйнага ладу Турава. Узаемаадносіны з Кіевам. Княствы беларускага Панямоння. Землі беларускага Падняпроўя, Пасожжа і Пабужжа ў складзе Смаленскага, Чарнігаўскага, Кіеўскага і Валынскага княстваў. Феадальная раздробленасць.

Тэма 1.5 Феадальная раздробленасць на беларускіх землях.

Перадумовы, прычыны і галоўныя рысы феадальнай раздробленасці. Пачатак драблення Полацкай зямлі і яе ўдзелы. Часовае узвышэнне Менска ў часы Глеба Ўсяслававіча. Барацьба полацкіх князёў з кіеўскімі і яе вынікі. Усобіцы ў Полацкай зямлі. Ускладненне знешнепалітычнага становішча Полацкага княства напрыканцы XII - пачатку XIII стст. Самастойнасць Тураўскага княства. Юрый Яраслававіч. Феадальная раздробленасць Тураўскага княства. Удзелы Тураўскай зямлі.

Тэма 1. 6 Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель ў10-13 ст.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Шматукладнасць гаспадаркі. Зараджэнне і станаўленне феадальных адносін. Феадальнае землеўладанне. Умовы развіцця і стан сельскай гаспадаркі. Сістэмы земляробства, прылады працы, ураджайнасць. Натуральная гаспадарка. Шляхі узнікненне гарадоў. Зараджэнне і станаўленне гарадскога рамяства. Унутраны і знешні гандаль. Дагавор Смаленска, Полацка і Віцебска з Рыгай 1229 г. Сацыяльная структура грамадства. Катэгорыі сялянства, іх павіннасці і падаткі. Свабоднае гарадское насельніцтва. Фарміраванне і склад федальнай вярхушкі грамадства. Духавенства.

Эканамічны лад і сацыяльныя працэсы. Стан сельскай гаспадаркі. Формы феадальнага землеўладання. Катэгорыі, землекарыстанне і павіннасці сялян. Віды сельскіх паселішчаў і сялянскіх надзелаў. Сялянская абшчына. Гарады і замкі. Склад гарадскога насельніцтва. Рамёствы і гандаль. Князі і баяры. Шляхта і яе паходжанне.

Тэма 1. 7 Барацьба з крыжацкай агрэсіяй і нашэсцем мангола-татараў.

Барацьба з мангола-татарамі і Ордэнам. Стабілізацыя сітуацыі пры Віцені. Узмацненне ВКЛ пры Гедыміне і Альгердзе. Барацьба з крыжакамі. Давыд Гарадзенскі. Змаганне з мангола-татарамі. Бітва на Сініх Водах. Вялікая вайна. Бітва пад Грунвальдам. Супрацьстаянне з мангола-татарамі. Бітва пад Клецкам. Міхаіл Глінскі.

Тэма 1.8 Утварэнне Вялікага княства Літоўскага.

Утварэнне Вялікага княства Літоўскага. Асноўныя канцэпцыі утварэння Вялікага княства Літоўскага. Першыя згадкі пра Літву ў крыніцах. Праблема лакалізацыі летапіснайЛітвы. Перадумовы і прычыны утварэння новай дзяржавы. Унутраныя і знешнія фактары. Роля Верхняга Панямоння ў працэсе складвання ВКЛ. Міндоўг і яго палітыка. Войшалк. Шляхі ўваходжання беларускіх зямель у ВКЛ.

Тэма 1.9 Дзяржаўны лад Вялікага княства Літоўскага.

Абвастрэнне ўнутраных супярэчнасцей у Вялікім княстве Літоўскім у канцы XIV ст. Дынастычнаябарацьба пасля смерці Альгерда. Андрэй Полацкі. Перагаворы аб шлюбе Ягайлы з дачкой Дзмітрыя Данскога. Падрыхтоўка, заключэнне і змест Крэўскага пагаднення. Аугльназемскі прывілей 1387 г. і яго сутнасць. Пачатак распаўсюджання каталіцтва на беларускіх землях. Узмацненне палітычных супярэчнасцей паміж феадаламі каталіцкага і праваслаўнага веравызнання. Пазіцыя Вітаўта.

Эвалюцыя дзяржаўна-палітычнага ладу Вялікага княства Літоўскага. Вялікакняская ўлада, паны-рада, вялікі вальны сойм. Агульназемскія прывілеі 1492 і 1506 гг. Абмежаванне ўлады вялікага князя і пашырэнне паўнамоцтваў рады. Агульнадзяржаўны сойм, павятовыя соймікі. Цэнтральныя і мясцовыя органы ўлады і кіравання, іх структура і функцыі. Асаблівасці мясцовага кіравання Полацкай і Віцебскай зямель. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. Ваяводствы, намесніцтвы, дзяржавы. Воласці. Адміністрацыйная рэформа 1565-1566 гг. Судовая сістэма і заканадаўства. Статуты Вялікага княства Літоўскага. Судовая рэформа. Галоўны Трыбунал Вялікага княства Літоўскага.

Тэма 1. 10 Знешняя палітыка і войны Вялікага княства Літоўскага ў 14 - першай палове 16 ст.

Барацьба Вітаўта з Ягайлам.Востраўскае пагадненне. Унутраная і знешняя палітыка Вітаўта. Ліквідацыя удзелаў і ўмацаванне цэнтральнай улады. Абласныя прывілеі і іх значэнне. Бітва на Ворскле і яе вынікі. Пашырэнне агрэсіі Тэўтонскага ордэна ў Прыбалтыцы. Саюз ВКЛ з Полынчай. "Вялікая вайна". Разгром крыжакоў пад Грунвальдам. Гарадзельскі прывілей 1413 г. і яго значэнне. Палітыка Вітаўта ў дачыненні да праваслаўнай царквы. Грамадзянская вайна 30-х гг. XV ст. у Вялікім княстве Літоўскім. Свідрыгайла і Жыгімонт Кейстутавіч. Прывілеі 1432 і 1434 гг. праваслаўнай знаці. Бітва пад Вількамірам. Казімір Ягелончык і яго палітыка. Пачатак княжання Казіміра. Паўстанні ў Смаленску і Жамойці. Барацьба за аднаўленне адзінства дзяржавы.

Залагоджванне сацыяльных канфліктаў. Агульназемскі прывілей 1447 г. і яго значэнне. Пачатак юрыдычнага афармлення прыгоннага права. Судзебнік 1468 г. Рэлігійная палітыка Казіміра Ягелончыка. Лѐс Фларэнтыйскай уніі ў Вялікім княстве Літоўскім. Усходняя палітыка
Казіміра Ягелончыка. Мірны дагавор 1449 г. з Масквой. "Змова князѐў" 1481 г. Абвастрэнне ўзаемаадносін з Крымскім ханствам.

Унутры- і знешнепалітычнае становішча Вялікага княства Літоўскага ў першай палове і сярэдзіне XVI ст. Уступленне на трон Аляксандра. Часовы разрыў асабістай уніі з Полыпчай. Абвастрэнне адносін з Масквой. Бітвы на Вядрошы і пад Оршай. Барацьба з нападамі крымскіх татар. Бітва пад Клецкам. Абвастрэнне ўнутрыпалітычнай барацьбы. Мяцеж Міхаіла Глінскага, яго вынікі і наступствы. Ваенныя рэформы. Паспалітае рушанне і наѐмнае войска. Рэлігійная талерантнасць у грамадска-палітычным жыцці ВКЛ. Адмена Гарадзельскага прывілея 1413 г.

Тэма1. 11 Унутрыпалітычнае і знешнепалітычнае становішча ВКЛ ў сярэдзіне 16 ст.

Усталяванне фальваркова-паншчыннай гаспадаркі і запрыгоньванне беларускага сялянства. Панская гаспадарка. Прычыны з'яўлення фальваркаў. Сялянскае землекарыстанне. "Устава на валокі" 1557 г. Катэгорыі сялянства паводле падаткаў і павіннасцей. Памер і нормы павіннасцей. Катэгорыі сялянства паводле характару асабістай залежнасці. Працэс запрыгоньвання сялянства. Этапы заканадаўчага афармлення прыгоннага права. Антыпрыгонніцкая барацьба беларускага сялянства. Гарадское жыццѐ на беларускіх землях. Колькасны рост гарадоў і мястэчак. Гарадскія рамѐствы і цэхавая арганізацыя. Унутраны і знешні гандаль беларускіх гарадоў. Магдэбургскае права. Войты і іх улада. Функцыі і дзейнасць магістрата. Юрыдыкі. Сацыяльныя групы і этнічны склад гарадскога насельніцтва. Сацыяльныя канфлікты ў гарадах. Гарадскія паўстанні. Царква і рэлігія. Прывілеяванае становішча каталіцкага касцѐла ў Вялікім княстве Літоўскім. Прыкметы крызісу праваслаўнай царквы напрыканцы XVI ст. Рэфармацыя на беларускіх землях. Галоўныя плыні і дзеячы Рэфармацыі. Пачатак Контррэфармацыі. Езуіты і іх дзейнасць. Ідэя царкоўнай уніі. Прыхільнікі і праціўнікі уніі. Берасцейскі царкоўны сабор і стварэнне уніяцкай царквы. Барацьба вакол уніяцкага пытання ў канцы XVI -першай трэці XVII стст. Праваслаўныя брацтвы і іх дзейнасць.

Лівонская вайна. Прычыны Лівонскай вайны. Расстаноўка сіл напярэдадні Лівонскай вайны. Уступленне ў вайну Вялікага княства Літоўскага. Страта Полацка. Уплыў Лівонскай вайны на ўнутрыпалітычную сітуацыю ў Вялікім княстве Літоўскім. Перамір'е 1570 г. Аднаўленне ваенных дзеянняў. Паходы Стэфана Баторыя 1579 - 1581 гг. Завяршэнне Лівонскай вайны, яе вынікі і наступствы. Люблінская унія. Прычыны і фактары аб'яднання ВКЛ з Полынчай. Падрыхтоўка Люблінскага сойма.Расстаноўка сіл і ход перагавораў. Акт аб утварэнні Рэчы Паспалітай, яго змест і значэнне. Барацьба Вялікага княства Літоўскага за самастойнасць.

Раздзел 2. БЕЛАРУСЬ У СЯРЭДЗІНЕ 16 – КАНЦЫ 18стст.

Тэма 2.1 Войны сярэдзіны XVII і іх наступствы

Казацка-сялянская вайна 1648 - 1651 гг. Яе прычыны і вытокі. Паўстанне пад кіраўніцтвам Б. Хмяльніцкага на Украіне і яго роля ў разгортванні антыфеадальнага руху ў Беларусі. Казацкія загоны і іх кіраўнікі. Сацыяльна-саслоўны склад паустанцаў. Баявыя дзеянні казацкіх атрадаў і шляхецкага апалчэння пад Пінскам Мазыром і Бабруйскам. Бітва пад Лоевам. Завяршэнне і вынікі казацка-сялянскай вайны. Вайна Расіі і Рэчы Паспалітай 1654 - 1667 гг. Прычыны і пачатак вайны. Ход і характар баявых дзеянняў. Поспехі расійскіх войск у 1654 -1655 гг. Палітыка царскіх улад у Беларусі. Пазіцыя казацкай вярхушкі. Паводзіны шляхты і магнатаў. Антыфеадальныя і антымаскоўскія выступленні сялян і гараджан. Умяшанне ў канфлікт Швецыі. Спробы аддзяліць Вялікае княства Літоўскае ад Полынчы. Вайсковая і палітычная дзейнасць Януша Радзівіла. Кейданская унія. Ваенныя дзеянні 1658 - 1666 гг. і іх вынікі. Андросаўскае перамір'е. Страты Вялікага княства Літоўскага.

Тэма 2.2 Паўночная вайна ў Беларусі.

Паўночная вайна ў Беларусі. Прычыны і пачатак Паўночнай вайны. Ход баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі. Паводзіны іншаземных войск. Адносіны насельніцтва да ваюючых бакоў. Выступленні шляхецкіх груповак. Выкарыстанне казацка-сялянскіх атрадаў. Выбранне каралём Станіслава Ляшчынскага. Сандамірская канфедэрацыя. Бітва пры Лясной і яе значэнне.Вынікі вайны для Беларусі. Узмацненне расійскіх уплываў у Рэчы Паспалітай. Культура.

Тэма 2.3 Унутрыпалітычная сітуацыя ў ВКЛ і Рэчы

Палітычны крызіс. Арганізацыя ўлады і кіравання ў ВКЛ. Павятовыя і ваяводскія соймікі. Недзеяздольнасць вальных соймаў. Палітычнае панаванне магнатаў у дзяржаве. Становішча дробнай і сярэдняй шляхты. Аслабленне каралеўскай улады. Узмацненне феадальнай анархіі. Саперніцтва Радзівілаў, Пацаў і Сапег. Ваенны канфлікт паміж Сапегамі і беларуска-літоўскай шляхтай. Спроба аддзялення Вялікага княства Літоўскага ад Польшчы. Рост уплыву каталіцкай царквы. Далейшае распаўсюджванне уніяцтва. Становішча іншых канфесій.

Тэма 2.4 Эканамічнае становішча і сацыяльныя супярэчнасці ў 17- першай палове 18 ст.

Эканамічнае становішча і сацыяльныя супярэчнасці. Эканамічны заняпад Беларусі і яго прычыны. Абясцэньванне грошай. Рост буйнога феадальнага землеўладання. Сялянская і панская гаспадарка. Гарады і мястэчкі. Рамяство і гандаль. Эвалюцыя феадальнай рэнты. Дзяржаўныя падаткі. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцяў у гарадах. Сялянскія хваляванні у Крычаўскім старостве і на Каменшчыне.

Гістарычныя ўмовы этнакультурнага развіцця. Афіцыйная забарона беларускай мовы. Працэс паланізацыі і яго вынікі. Стан школьнай асветы і выхавання. Езуіцкія калегіумы. Віленская акадэмія, яе роля ў распаўсюджванні навуковых ведаў. "Вялікае мастацтва артылерыі" К.Семяновіча. Развіццё фальклору. Тэатр. Інтэрмедыі. Батлейка. Літаратура. Кнігадрукаванне. Грамадска-палітычная думка. Сімяон Полацкі і яго дзейнасць. А.Белабоцкі. К.Лышчынскі. І.Капіевіч. Сарматызм як ідэалогія шляхты. Архітэктура скульптура і жывапіс. Стыль барока. Развіццё прыкладнога мастацтва.

Тэма 2.5 Сацыяльна-эканамічнае развіцц ў другой палове 18 с

Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Нармалізацыя эканамічнага жыцця ў Беларусі. Аднаўленне сельскай і гарадской гаспадаркі. Рост насельніцтва. Развіццё шляхоў зносін. Пачатак разлажэння феадальнай фармацыі. Панская гаспадарка і спробы яе рацыяналізацыі. Рэфарматарская дзейнасць А.Тызенгаўза. Сялянская гаспадарка і катэгорыі сялян. Вотчынныя мануфактуры. Унутраны і знешні гандаль. Развіццё гарадоў. Вынікі і характар эканамічнага ажыўлення. Становішча гарадскога і вясковага насельніцтва. Спробы дзяржаўных рэформ.

Тэма 2.6 Спробы дзяржаўных рэформ. Першы і другі падзелы Рэчы Паспалітай

Першы і другі разборы Рэчы Паспалітай. Прычыны падзення Рэчы Паспалітай. Абвастрэнне барацьбы паміж шляхецкімі групоўкамі ў 60 - пачатку 70-х гадоў XVIII ст. Умяшанне суседніх дзяржаў. Дысідэнцкае пытанне. Канфедэрацкі рух. Першы падзел Рэчы Паспалітай і далучэнне ўсходняй часткі Беларусі да Расіі. Абвастрэнне сацыяльнай напружанасці ў Рэчы Паспалітай у 80-х гадах. Шляхецка-буржуазны блок і яго дзейнасць. Рэформы Чатырохгадовага сойма. Канстытуцыя Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Барацьба ўнутраных і знешніх сіл супраць канстытуцыі. Другі падзел Рэчы Паспалітай і далучэнне да Расіі цэнтральнай часткі Беларусі.

Тэма 2.7 Паўстанне 1794 г.

Паўстанне 1794 г. Ліквідацыя Рэчы Паспалітай. Падрыхтоўка і пачатак паўстання ў Полынчы. Тадэвуш Касцюшка. "Віленскія якабінцы" . Якуб Ясінскі. Перамога паўстання ў Вільні. Найвышэйшая Літоўская Рада. Пашырэнне паўстання на Беларусі. Фарміраванне і баявая дзейнасць паўстанцкіх атрадаў. Адносіны да паўстання сялян. Паланецкі універсал. Палітыка расійскага ўрада. Карныя аперацыі царскіх войск. Прычыны паражэння паўстання.

Тэма 2.8 Трэці падзел Рэчы Паспалітай

Трэці разбор Рэчы Паспалілітай і далучэнне да Расіі заходняй часткі Беларусі.

Тэма 2.9 Беларускія землі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай (1772 - 1801 гг.).

Беларускія землі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай (1772 - 1801 гг.). Увядзенне новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу і арганізацыя кіравання. Судаводства. Змены ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці, унутраным і знешнім гандлі. Паштовыя дарогі. Стан гарадоў. Прывядзенне да прысягі і афармленне сацыяльнага статусу насельніцтва. Правы і прывілеі пануючага саслоўя. Падаткі і павіннасці. Насаджэнне рускага дваранскага землеўладання. Нацыянальна-рэлігійная палітыка царызму.

Тэма 2.10 Эпоха Асветніцтва на Беларусі.

Культура. Асветніцтва, своеасаблівасць і супярэчлівасць гэтай эпохі на Беларусі. Пачатак секулярызацыі асветы і навукі. Дзейнасць Адукацыйнай камісіі. Галоўная школа Вялікага княства Літоўскага. Гродзенская медыцынская школа. Дасягненні прыродазнаўчых навук. М.Пачобут-Адляніцкі. Ж.Жылібер. Ідэі Асветніцтва ў літаратуры і грамадскай думцы. С.Майман. К.Нарбут. І.Яленскі. Г.Каніскі. Фізіякраты. Мецэнацтва. Прыгонныя тэатры. Музычнае мастацтва. Камедыі К.Марашэўскага і М.Цяцерскага. Друк, першыя газеты. Архітэктура і жывапіс. Класіцызм. Палацава-сядзібнае будаўніцтва.

РАЗДЗЕЛ 3 БЕЛАРУСЬ Ў XIX – ПАЧ. XX СТ.

Тэма 3.1 Сацыяльна-эканамічнае развіцце Беларусі на зыходзе прыгонніцтва

Эканамічнае развіццѐ і сацыяльныя супярэчнасці. Разлажэнне феадальна-прыгонніцкага ладу і фарміраванне капіталістычных адносін. Структура і формы арганізацыі прамысловай вытворчасці. Вотчынныя і купецкія мануфактуры. Пачатак прамысловага пераварота. Рост прымянення наѐмнай працы. Будаўніцтва дарог і каналаў. Гандаль. Кірмашы. Узрастанне ролі гарадоў і мястэчкаў. Развіццѐ таварнай вытворчасці ў сельскай гаспадарцы. Пачатак яе спецыялізацыі. Новыя з'явы ў агратэхніцы. Промыславая дзейнасць сялянства, узровень яго дыферэнцыяцыі. Крызіс паншчыннай гаспадаркі. Спробы яе рацыяналізацыі. Узмацненне феадальнай эксплуатацыі сялянства, антыпрыгонніцкая накіраванасць іх хваляванняў.

Тэма 3.2 Вайна 1812 г. і Беларусь.

Расійска-французскія адносіны і палітычная сітуацыя ў заходніх губернях напярэдадні вайны. Перадача Расіі Беластоцкай вобласці. Праект адраджэння Вялікага княства Літоўскага. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам 1812 г. Палітыка французскіх улад. Дзейнасць Часовай камісіі ўрада Вялікага княства Літоўскага. Адносіны шляхты да Напалеона. Паводзіны сялянства. Удзел насельніцтва Беларусі ў баявых дзеяннях. Разгром французскіх войскаў на Бярэзіне. Вынікі вайны для Беларусі. Палітыка царскага урада.

Тэма 3.3 Урадавая палітыка ў Беларусі

Урадавая палітыка ў заходніх губернях у першай чвэрці XIX ст. Эвалюцыя саслоўнай палітыкі. Палажэнне аб яўрэях. Ваенныя пасяленні. Актуалізацыя сялянскага пытання ў другой чвэрці XIX ст. Люстрацыя дзяржаўных маёнткаў. Інвентарная рэформа. Канфесіянальная палітыка. Полацкі царкоўны Сабор і яго вынікі. Змяненні палітыкі ў галіне асветы. Заканадаўства. Камітэт па справах заходніх губерняў і яго дзейнасць. Русіфікацыя і яе сутнасць.

Тэма 3.4 Грамадска-палітычнае жыццё.

Ажыўленне грамадска-палітычнага руху. Характар і сацыяльна-саслоўны склад яго ўдзельнікаў. Тайныя таварыствы вучнёўскай моладзі і іх дзейнасць. Дзекабрысты і Беларусь. «Таварыства ваенных сяброў». Выступленні ў Літоўскім корпусе і ў Бабруйскай крэпасці. Разгром тайных таварыстваў. Шляхецкае паўстанне 1830—1831 гг. Яго мэты і праграма дзеянняў. Развіццё паўстання ў заходніх і паўднёвых раёнах Беларусі. Бітва за Вільню. Падаўленне паўстання. Дэмакратызацыя грамадскага руху. «Экспедыцыя Валовіча». «Дэмакратычнае таварыства». Ф. Савіч. «Саюз свабодных братоў». Уплыў рэвалюцыйных падзей у Заходняй Еўропе на грамадска-палітычны рух у Беларусі.

Тэма 3.5 Адмена прыгоннага права ў Беларусі

Прычыны і пачатак падрыхтоўкі сялянскай рэформы. Ініцыятыва інвентарных камітэтаў Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў па вызваленні сялян. Рэскрыпт У. І. Назімаву. Маніфест і «Палажэнні» 19 лютага 1861 г. Спецыфіка мясцовых «Палажэнняў» для Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губерняў. Выкупная аперацыя. «Часоваабавязанае становішча». Устаўныя граматы і выкупныя акты. Сялянскі рух. Змены ў рэалізацыі рэформы, звязаныя з паўстаннем 1863 г. Рэформы аграрных адносін дзяржаўных сялян і ўпарадкаванне іншых катэгорый сельскага насельніцтва. Вынікі і значэнне аграрных рэформ.

Тэма 3.6 Буржуазныя рэформы 60-70 гг. XIX ст. і ўрадавая палітыка ў Беларусі

Урадавая палітыка. Рэформы 60—70-х гг.: ваенная, школьная, цэнзурная, судовая, гарадскога самакіравання і асаблівасці іх рэалізацыі ў Беларусі. Контррэформы і іх вынікі. Увядзенне інстытута земскіх начальнікаў. Асаблівасці эканамічнай і саслоўнай палітыкі ў Беларусі. Абмежаванні ў дачыненні да палякаў, беларусаў-католікаў. Заканадаўства ў адносінах да яўрэяў. Пашырэнне рускага землеўладання. Сервітутнае пытанне. Рэформы ў сістэме падаткаў і павіннасцей. Змены ва ўрадавай палітыцы ў Беларусі па нацыянальным і рэлігійным пытаннях. Умацаванне «традыцыяналісцкіх» пачаткаў ва ўрадавай палітыцы. Русіфікацыя Беларусі. Пашырэнне ўплыву праваслаўнай царквы.

Тэма 3.7 Сельская гаспадарка Беларусі ў 60-90 гг. XIX ст.

Сельская гаспадарка. Памешчыцкае і сялянскае землеўладанне. Асаблівасці буржуазнай эвалюцыі сельскай гаспадаркі Беларусі. Аграрны крызіс 80-х гг. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі. Малочная і мясная жывёлагадоўля. Вытворчасць тэхнічных культур. Вінакурэнне. Скарачэнне дваранскага землеўладання і рост

бессаслоўнай зямельнай уласнасці. Становішча сялян. Сацыяльныя працэсы сярод сялянства. Фарміраванне аграрнай буржуазіі.

Тэма 3.8 Прамысловасць і гарады Беларусі ў другой палове XIX ст.

Прамысловасць і гарады. Спецыялізацыя беларускай прамысловасці, яе галіновая структура. Тэрытарыяльнае размяшчэнне прамысловых прадпрыемстваў. Асаблівасці прамысловай рэвалюцыі ў Беларусі. Удзельнаявага дробнай вытворчасці. Рост гарадоў. Асаблівасці ўрадавай палітыкі ў дачыненні горадаўтварэння. Мястэчкі. Фарміраванне гандлёва-прамысловай буржуазіі. Транспарт, гандаль, крэдыт. Будаўніцтва чыгунак, іх уплыў на развіццё сельскай гаспадаркі, прамысловасці, гарадоў і гандлю. Рачны транспарт. Фарміраванне фінансава-крэдытнай сістэмы. Скарачэнне кірмашоў і развіццё магазінна-крамнага гандлю. Фарміраванне на тэрыторыі Беларусі адзінага эканамічнага рэгіёна.

Тэма 3.9 Паўстанне 1863 г. у Беларусі

Паўстанне 1863 г. Прычыны паўстання. Варшаўскі нацыянальны і Літоўскі правінцыяльны камітэты. «Белыя» і «Чырвоныя»: З. Серакоўскі, Л. Звяждоўскі, В. Урублеўскі, Ф. Ражанскі і інш. К. Каліноўскі і яго дзейнасць. «Мужыцкая праўда». Пачатак паўстання. Маніфест Часовага правінцыяльнага ўрада Літвы і Беларусі. Арганізацыя паўстанцкіх атрадаў і іх дзейнасць на тэрыторыі Беларусі. Меры царскай адміністрацыі ў сувязі з паўстаннем. М. Мураўёў. Падаўленне паўстання. «Лісты з-пад шыбеніцы» К. Каліноўскага. Характар і прычыны паражэння паўстання.

Тэма 3.10 Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі ў 60-90 гг. XIX ст.

Грамадска-палітычнае жыццё. Ідэалогія манархізму ў Беларусі. «Заходнерусізм» і яго плыні. М. Каяловіч. Станаўленне ліберальнай думкі. Варшаўскі пазітывізм. «Минский листок». Рэвалюцыйна-дэмакратычная думка. Вытокі ідэалогіі беларускага нацыянальнага руху. Ф. Багушэвіч. К. Каліноўскі. Польскі і яўрэйскі нацыянальныя рухі і іх ідэалогія. Вытокі і сутнасць народніцтва. Прапаганда народніцтва. І. Грынявіцкі, М. Судзілоўскі, С. Кавалік, Р. Ісаеў і інш. Народніцкія арганізацыі ў Беларусі ў першай палове 80-х гг. Група «Гоман» і яе погляды на развіццё Беларусі. Ліберальныя народнікі. Адраджэнне рэвалюцыйнага народніцтва ў канцы 90-х гг. Эвалюцыя рабочага руху. Распаўсюджванне марксізму. І з'езд РСДРП. Асаблівасці сацыял-дэмакратычнага руху ў Беларусі.

Тэма 3.11 Культура Беларусі ў 60-90 гг. XIX ст. і фарміраванне беларускай нацыі

Культура. Уплыў польскай і рускай культур на культуру беларускага народа. Культурныя цэнтры Беларусі. Нацыяльна-культурная палітыка ўрада. Асвета. Фарміраванне сістэмы свецкай і духоўнай адукацыі. Віленская навучальная акруга. Віленскі універсітэт. Гімназіі. Павятовыя вучылішчы. Царкоўнапрыходскія школы. Змены ў сістэме адукацыі. Беларуская навучальная акруга. Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Віцебская настаўніцкая семінарыя. Духоўная адукацыя. Полацкая езуіцкая акадэмія. Ваеннае і прафесійнае навучанне. Друкарні. Навука. Зараджэнне і развіццё археаграфіі, крыніцазнаўства, славяназнаўства, беларусазнаўства, этнаграфіі і археалогіі. З. Даленга-Хадакоўскі, М. Баброўскі, І. Даніловіч, К. і Я.Тышкевічы і інш. Прыродазнаўчыя веды. Станаўленне новай беларускай мовы і літаратуры. А. Міцкевіч, Я. Чачот, У. Сыракомля, Я. Баршчэўскі. В. Дунін-Марцінкевіч. Ананімная паэзія. Мастацтва. Музыка. Тэатр. А. Абрамовіч, М. Агінскі, С. Манюшка. Архітэктура. Жывапіс. Графіка. Скульптура. Выспяванне беларускай нацыянальнай ідэі.

Тэма 3.12 Беларусь на мяжы XIX—XX ст.

Фарміраванне беларускай нацыі. Умовы ўтварэння беларускай нацыі. Этнічная тэрыторыя беларусаў, нацыянальны склад насельніцтва. Стварэнне агульнасці эканамічнага жыцця. Сацыяльна-класавыя асаблівасці станаўлення беларускай нацыі. Фарміраванне агульных нацыянальных прыкмет. Этнічная і нацыянальная самасвядомасць. Станаўленне беларускай літаратурнай мовы. Культура Беларусі ў 60—90-я гг. Палітыка

ўрада ў галіне школьнай справы. Пачатковая і сярэдняя адукацыя. Узнікненне прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Настаўніцкія семінарыі. Развіццѐ прыродазнаўчых навук. Вывучэнне этнаграфіі, гісторыі і культуры Беларусі. А. Кіркор, П. Шэйн, І. Насовіч, Е. Раманаў, М. Каяловіч і інш. Публікацыя гістарычных крыніц і помнікаў духоўнай культуры. Развіццѐ мастацкай літаратуры. Творчасць Ф. Багушэвіча, А. Гурыновіча, Я. Лучыны, К. Каганца і інш. Быт і матэрыяльная культура, звычаі, абрады, нормы маралі народаў Беларусі. Развіццѐ друку. Тэатр і музыка. Архітэктура і горадабудаўніцтва. Жывапіс: К. Альхімовіч, Д. Баркоўскі, Н. Сіліванович, А. Гараўскі. Графіка. Творчасць М. Андрыѐлі, Ф. Дмахоўскага, Н. Орды.

Тэма 3.13 Рэвалюцыйныя падзеі 1905—1907 гг. у Беларусі.

Грамадска-палітычнае жыццѐ Беларусі напярэдадні рэвалюцыі. Актывізацыя рабочага руху. З'яўленне палітычных партый і арганізацый. Паліцэйскі сацыялізм. Утварэнне і дзейнасць Беларускай сацыялістычнай грамады. Абвастрэнне сацыяльных і нацыянальных супярэчнасцей. Пачатак рэвалюцыі. Кастрычніцкая палітычная стачка. Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. і рэпрэсіі самадзяржаўя. Курлоўскі расстрэл у Мінску. Снежаньскія падзеі ў Беларусі. Дыферэнцыяцыя грамадска-палітычных сіл. Адступленне рэвалюцыі. Выбары ў I і II Дзяржаўныя думы Расіі, удзел у іх дэпутатаў ад беларускіх губерняў. Беларускі нацыянальны рух у перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг., роля БСГ. Трэцячэрвеньскі дзяржаўны пераварот 1907 г. Прычыны паражэння рэвалюцыі і яе значэнне для Беларусі. Грамадска-палітычнае жыццѐ Беларусі ў 1907—1914 гг. Сутнасць выбарчага закона ад 3 чэрвеня 1907 г. і асаблівасці яго ажыццяўлення ў Беларусі. Палітычныя пазіцыі ўрадавых партый і арганізацый, ліберальны рух, аслабленне рэвалюцыйных партый і арганізацый.

Тэма 3.14 Эканамічнае развіццё і грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў 1907—1914 гг.

Сацыяльна-эканамічнае развіццѐ. Стан і развіццѐ прамысловасці, яе структура і спецыялізацыя. Прамысловы крызіс у Беларусі 1900— 1903 гг. Пранікненне замежнага капіталу ў эканоміку Беларусі. Банкі, транспарт і гандаль. Рост гарадоў. Павелічэнне колькасці рабочага класа, яго нацыянальны і сацыяльны склад. Становішча рабочага класа. Развіццѐ капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Структура землеўладання, яе асаблівасці ў Беларусі. Спецыялізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці, агратэхніка і матэрыяльная база сельскай гаспадаркі. Феадальна-прыгонніцкія перажыткі ў беларускай вѐсцы, сацыяльная дыферэнцыяцыя сялянства. Эканамічнае развіццѐ ў 1907-1914 гг. Уздым прамысловасці. Рост канцэнтрацыі вытворчасці. Становішча рабочага класа. Сельская гаспадарка.

Сацыяльныя зрухі ў вѐсцы. Падаткі і павіннасці сялян. Сталыпінская рэформа і яе сутнасць. Асаблівасці рэалізацыі ў Беларусі. Скасаванне сельскай абшчыны. Насаджэнне хутароў і атрубоў. Перасяленне сялян у азіяцкую частку Расіі. Узмацненне сацыяльнай дыферэнцыяцыі беларускай вѐскі. Прычыны і мэты правядзення земскай рэформы ў беларускіх губернях, яе асаблівасці.

Дынаміка і характар рабочага і сялянскага рухаў. Грамадска-палітычны рух у Беларусі ў час выбараў у III і IV Дзяржаўныя думы. Дэпутаты ад беларускіх губерняў у III і IV Думах і іх пазіцыі па пытаннях палітычнага і эканамічнага жыцця краіны. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух. Барацьба самадзяржаўя з беларускім нацыянальна-адраджэнскім рухам. «Наша ніва». Культура Беларусі. Уплыў рэвалюцыі 1905 — 1907 гг. на развіццѐ нацыянальнай беларускай культуры.

РАЗДЗЕЛ 4. РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСІ У 20 – ПАЧАТКУ 21 СТСТ.

Тэма 4.1 Беларусь у гады Першай сусветнай вайны.

Пачатак вайны. Увядзенне ваеннага становішча ў Беларусі. Адносіны да вайны розных груп насельніцтва, палітычных партый і грамадскіх арганізацый. Захоп Заходняй Беларусі войскамі кайзераўскай Германіі. Бежанства. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў 1916 г. Нарачанская і Баранавіцкая ваенныя аперацыі. Становішча на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі. Ваенныя павіннасці. Харчовы крызіс. Рабочы і сялянскі рух у прыфрантавых раёнах, салдацкія выступленні. Пачатак разлажэння ў войсках.

Тэма 4.2 Беларускі нацыянальны рух у перыяд ад лютага да кастрычніка 1917 г.

Беларускі нацыянальны рух у гады вайны. Школа і культурна-асветніцкая справа ва ўмовах нямецкай акупацыі ў 1915—1916 гг. Беларускі народны камітэт і Цэнтральны саюз беларускіх нацыянальных грамадскіх арганізацый. Стварэнне Беларускай сацыял-дэмакратычнай групы. Канфедэрацыя Вялікага княства Літоўскага. Беларусь у час Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Падзеі Лютаўскай рэвалюцыі ў Беларусі і на Заходнім фронце. Звяржэнне самадзяржаўя. Стварэнне органаў Часовага ўрада, Саветаў, салдацкіх камітэтаў. Пазіцыі беларускіх і агульнарасійскіх партый па галоўных пытаннях палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця краіны. Рабочы рух, арганізацыя прафесійных саюзаў рабочых і служачых. Дэмакратызацыя арміі на Заходнім фронце. Абуджэнне вёскі. Наступленне на франтах і яго вынікі. Ліпеньскія падзеі. Канец двоеўладдзя. Беларускі нацыянальны рух у перыяд ад лютага да кастрычніка 1917 г. Аднаўленне дзейнасці БСГ, яе праграмныя ўстаноўкі. Утварэнне новых беларускіх нацыянальных партый і арганізацый. З'езд беларускіх нацыянальных арганізацый 25—27 сакавіка 1917 г., рашэнні па пытанні аўтаноміі Беларусі. Стварэнне Беларускага нацыянальнага камітэта (БНК). Адносіны Часовага ўрада да ідэі нацыянальна-дзяржаўнага вызначэння Беларусі. II з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый і партый 8—10 ліпеня 1917 г. і яго асноўныя рашэнні. Раскол у БНК. Стварэнне Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый (ЦРБА), яе дзейнасць. Размежаванне ў беларускім нацыянальным руху. Стварэнне Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі. III з'езд БСГ. Прыняцце новай праграмы партыі. Рэарганізацыя ЦРБА і ўтварэнне Вялікай Беларускай Рады (ВБР). Пашырэнне беларускага нацыянальнага руху ў войску і заснаванне Цэнтральнай беларускай вайсковай рады (ЦБВР). Беларускі абласны камітэт пры Усерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў (БАК), яго склад і ініцыятывы.

Тэма 4.3 Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўсталяванне савецкай улады ў Беларусі і на Заходнім фронце.

Узброенае паўстанне ў Петраградзе. Пераход улады да Саветаў і ваенкомаў у Беларусі і на Заходнім фронце. Усталяванне савецкай улады ў Мінску. Стварэнне Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта (ВРК) Заходняй вобласці і фронту. «Камітэт выратавання рэвалюцыі», барацьба за ўладу. Усталяванне савецкай улады ў Віцебску, Гомелі, Магілёве, Оршы і іншых гарадах Беларусі, ліквідацыя органаў Часовага ўрада і Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў Магілёве. З'езды Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў. Утварэнне і дзейнасць Абласнога Выканаўчага камітэта Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкамзах) і СНК Заходняй вобласці. Дзейнасць Паўночна-Заходняга камітэта балынавіцкай партыі, яго адносіны і пазіцыя органаў савецкай улады да беларускага нацыянальнага пытання. Першыя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні. Стаўленне беларускіх нацыянальных партый да савецкай улады. «Грамата да беларускага народа» Вялікай Беларускай Рады. I Усебеларускі кангрэс (снежань 1917 г.) і яго рашэнні. Утварэнне Выканкома Савета Усебеларускага кангрэса.

Тэма 4.4 Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.

Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Наступленне войскаў кайзераўскай Германіі ў лютым 1918 г. Брэсцкі мірны дагавор 3 сакавіка 1918 г. і яго наступствы для Беларусі. Падпольная і партызанская барацьба супраць нямецкіх акупантаў. Беларускі

нацыянальны рух пасля разгону I Усебеларускага кангрэса. Першая і другая Устаўныя граматы. Стварэнне Народнага сакратарыята. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Стварэнне Рады БНР і яе склад. Прыняцце трэцяй Устаўной граматы. Узаемаадносіны Рады і ўрада БНР з германскімі акупацыйнымі ўладамі. Адыход нямецкіх акупацыйных войскаў і ўступленне Чырвонай Арміі на тэрыторыю Беларусі. Барацьба Рады і ўрада БНР за міжнароднае прызнанне.

Тэма 4.5 Утварэнне БССР і Літоўска-Беларускай ССР.

Утварэнне Беларускай ССР. Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам) і беларускія секцыі РКП(б), іх роля ў абвяшчэнні Беларускай рэспублікі. Адносіны Паўночна-Заходняга камітэта РКП(б) і Аблвыканкамзаха да праблемы стварэння беларускай дзяржаўнасці. Барацьба па пытанні аб беларускай савецкай дзяржаўнасці. Дз. Жылуновіч, А. Чарвякоў, А. Мяснікоў, В. Кнорын. VI Паўночна-Заходняя канферэнцыя РКП(б). Фарміраванне Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларускай ССР. Маніфест аб абвяшчэнні Беларускай ССР. Пастанова ЦК РКП(б) ад 16 студзеня 1919 г. I з'езд Саветаў БССР і яго рашэнні. Першая Канстытуцыя Савецкай Беларусі. Пасяджэнне ЦВК БССР і ЦВК ЛітССР 27 лютага 1919 г., абранне ЦВК і СНК Літоўска-Беларускай ССР (Літбел) і яе дзейнасць.

Беларусь у час польска-савецкай вайны. Прычыны польска-савецкай вайны. Федэралісцкая канцэпцыя Ю. Пілсудскага і канцэпцыя інкарпарацыі польскіх нацыянал-дэмакратаў. Наступленне польскіх войскаў і ваенныя дзеянні на польска-савецкім фронце. Усталяванне польскага акупацыйнага рэжыму. Падпольны і партызанскі рух. Пазіцыя партыі беларускіх эсэраў. Ідэя «трэцяга шляху» ў рэвалюцыі. У. Ігнатоўскі. Раскол у беларускім грамадска-палітычным руху. Утварэнне Найвышэйшай Рады БНР. Наступленне Чырвонай Арміі летам 1920 г. Аднаўленне савецкай улады. Дагавор РСФСР і Літвы 12 ліпеня 1920 г. і яго наступствы для Беларусі. Другое абвяшчэнне БССР. Заканчэнне польска-савецкай вайны. Разгром атрадаў С. Булак-Балаховіча. Слуцкі збройны чын у лістападзе — снежні 1920 г. Рыжскі мірны дагавор.

Тэма 4.6 Грамадска-палітычнае жыццѐ і нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва Беларусі ў 20-я гг. XX ст.

Палітычнае, тэрытарыяльна-адміністрацыйнае і эканамічнае становішча БССР пасля Рыжскага міру. Палітычная амністыя 1923 г. у БССР. Пагадненні БССР з РСФСР і іншымі савецкімі рэспублікамі. Роля БССР у стварэнні Саюза ССР. IV з'езд Саветаў Беларусі і яго рашэнні. Дэкларацыя і дагавор аб утварэнні Саюза ССР, іх змест. Статус Беларускай ССР у складзе СССР. Нацыянальная палітыка РКП(б) і КП(б) Беларусі. Палітыка беларусізацыі, яе прычыны, сутнасць. Прычыны яе згортвання. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа ў БССР. Узбуйненне тэрыторый БССР у 1924 і 1926 гг. Актывізацыя дзейнасці Саветаў. Усталяванне аднапартыйнай сістэмы. Самароспуск партыі беларускіх эсэраў. Прыняцце Канстытуцыі БССР 1927 г.

Тэма 4.7 Сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё БССР ў 1920-1930-х гг.

Пераход да новай эканамічнай палітыкі (НЭПа). Становішча беларускай вѐскі і сельскай гаспадаркі ў пачатку 20-х гг. Пераход да НЭПа на вѐсцы. Замена харчразвѐрсткі харчовым падаткам. Землеўпарадкаванне, яго асаблівасці ў Беларусі. Рост хутарской сістэмы гаспадарання. Змены ў сацыяльнай структуры беларускай вѐскі. Кааператыўны рух у беларускай вѐсцы, яго формы і дынаміка. Вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі ў канцы 20-х гг. Прамысловасць Беларусі ва ўмовах пераходу да мірных умоў развіцця. Ажыццяўленне мерапрыемстваў новай эканамічнай палітыкі ў прамысловасці. Грашовая рэформа і яе вынікі. Развіццѐ крэдыту. Рост прадукцыйнасці працы. Паляпшэнне сацыяльных умоў жыцця рабочых. Згортванне дзейнасці прыватных прамысловых і гандлѐвых прадпрыемстваў. Крызіс збыту, таварны голад. Паступовае згортванне НЭПу.

Тэма 4.8 Індустрыялізацыя ў Беларускай ССР. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі рэспублікі.

Індустрыялізацыя ў Беларускай ССР. Індустрыялізацыя краіны, яе прычыны, мэты і задачы. Першы пяцігадовы план развіцця эканомікі і культуры. Рэсурсы і сродкі развіцця для індустрыялізацыі рэспублікі. Стварэнне новых галін прамысловасці. Узмацненне камандна-адміністрацыйных метадаў кіравання прамысловасцю і вынікі пяцігодкі. Развіццѐ прамысловасці рэспублікі ў гады другой пяцігодкі. Падрыхтоўка кадраў інжынерна-тэхнічных работнікаў і кваліфікаваных рабочых. Стаханаўскі рух у Беларусі. Метады дасягнення планавых паказчыкаў. Вынікі індустрыялізацыі ў БССР.

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі рэспублікі. Яе мэты і задачы. Крызіс хлебанарыхтовак. Пераход да масавай калектывізацыі, тэрміны і метады яе правядзення. Выхад сялянскіх гаспадарак з калгасаў вясной 1930 г. Новы этап калектывізацыі восенню 1930 г. Арганізацыя МТС, палітаддзелаў пры іх. Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў і іх матэрыяльна-тэхнічнай базы. Саўгасы і іх гаспадарчая дзейнасць. Голад 1932—1933 гг. у Беларусі. Завяршэнне калектывізацыі беларускай вѐскі, яе палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя вынікі.

Тэма 4.9 Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы.

Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы. Тэрыторыя Заходняй Беларусі, яе адміністрацыйны падзел. Органы кіравання, сацыяльны і нацыянальны склад насельніцтва і канфесій. Палітыка польскіх улад у Заходняй Беларусі. Адметныя рысы эканомікі Заходняй Беларусі. Прамысловасць і асноўныя яе галіны. Становішча рабочага класа. Рост беспрацоўя. Аграрная палітыка польскіх улад. Зямельныя рэформы і іх вынікі. Падатковая палітыка. Збядненне вясковага насельніцтва, эканамічная эміграцыя.

Тэма 4.10 Рэвалюцыйна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі.

Рэвалюцыйна-вызваленчы рух. Асноўныя палітычныя партыі і арганізацыі ў Заходняй Беларусі. Выбары ў польскі сейм 1922 г. Стварэнне і дзейнасць Беларускага пасольскага клуба. Беларускія нацыянальныя партыі і арганізацыі. Партызанская барацьба. Утварэнне Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) і Камуністычнага Саюза моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ). Праграмныя мэты і задачы КПЗБ, яе дзейнасць. Арганізацыя Беларускай сялянска-работніцкай Грамады (БСРГ), яе праграма і дзейнасць. Прычыны забароны БСРГ польскімі ўладамі і яе разгром. Стварэнне Беларускага сялянска-рабочага пасольскага клуба «Змаганне». Уздым рабочага і сялянскага руху ў пачатку 1930-х гг. Узмацненне палітычных рэпрэсій польскіх улад. Спробы стварэння дэмакратычнага антыфашысцкага народнага фронту. Беларускае народнае аб'яднанне (БНА). Роспуск КПЗБ: яго вынікі.

Тэма 4.11 Грамадска-палітычнае жыццё у БССР (сярэдзіна 50-х - 80-ягг. XXст.).

Грамадска-палітычнае жыццѐ. Надзеі на дэмакратызацыю грамадскага жыцця. Умацаванне адміністрацыйна-каманднай сістэмы. Формы і метады дзейнасці партыйных, савецкіх, камсамольскіх, прафсаюзных і грамадскіх арганізацый, іх роля ў жыцці рэспублікі. П.К. Панамарэнка. М. І. Гусараў. М. С. Патолічаў. Грамадска-палітычная праца ў заходніх абласцях рэспублікі. Новая хваля рэпрэсій. Беларусь — адна з краін-заснавальніц ААН. Роля і месца БССР на міжнароднай арэне ў перыд канфрантацыі дзвюх грамадска-палітычных сістэм у другой палове 40-х — першай палове 80-х гг. XX ст. Асаблівасці працэсу дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў другой палове 50-х — 60-я гг. «Хрушчоўская адліга». Пачатак рэабілітацыі ахвяр сталінскага рэжыму і яго супярэчнасці. Спробы абнаўлення адміністрацыйна-каманднай сістэмы. Пашырэнне правоў саюзных рэспублік. К. Т. Мазураў.

Тэма 4.12 Развіццё прамысловасці, транспарту і сельскай гаспадаркі (сярэдзіна 50-х - 80-ягг. XXст.).

Сацыяльна-эканамічнае становішча. Развіццѐ прамысловасці і транспарту. Будаўніцтва новых і мадэрнізацыя дзеючых прадпрыемстваў і транспарту ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. З'яўленне новых галін вытворчасці. Рэформа 1965 г. і яе ажыццяўленне ў Беларусі. Здабыткі і праблемы ў развіцці эканомікі ў 1970—1980 гг. Сельская гаспадарка. Спробы рэформ у сельскай гаспадарцы, іх сутнасць і вынікі. Меліярацыя, хімізацыя сельскагаспадарчых угоддзяў. Харчовая праграма 1982 г. Стварэнне аграпрамысловых комплексаў. Рост стратных гаспадарак. Матэрыяльны дабрабыт насельніцтва і шляхі яго паляпшэння. Жыллѐвае будаўніцтва.

Тэма 4.13 Палітыка «перабудовы».

Грамадска-палітычнае жыццѐ Беларусі ў 70-я — першай палове 80-х гг. Дзейнасць партыйных, савецкіх, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый. П. М. Машэраў. Спробы мадэрнізацыі савецкай грамадска-палітычнай сістэмы пад час палітыкі перабудовы. Узнікненне палітычных партый і грамадскіх рухаў. Аслабленне пазіцый КПБ у палітычным жыцці рэспублікі. Чарнобыльская катастрофа і яе наступствы для Беларусі.

Тэма 4.14 Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Спробы рэфармавання СССР: крызіс перабудовы. Узмацненне руху за нацыянальнае адраджэнне і суверэнітэт Беларусі. Дэкларацыя Вярхоўнага Савета БССР ад 27 ліпеня 1990 г. Правал жнівеньскага путчу 1991 г. і яго ўздзеянне на грамадска-палітычнае развіццѐ ў Беларусі. Прыпыненне дзейнасці КПСС — КПБ. Наданне Дэкларацыі аб суверэнітэце статуса канстытуцыйнага закона. Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь і ўвядзенне новай дзяржаўнай сімволікі. Распад СССР, утварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Прыняцце новай Канстытуцыі. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Рэфармаванне сістэмы выканаўчай улады. Рэферэндумы 1995, 1996 і 2004 гг. Змены ў Канстытуцыі. Шляхі і асаблівасці фарміравання прававой дзяржавы і грамадзянскай супольнасці ў Беларусі. Дзяржаўныя інстытуты і ідэалагічныя працэсы ў сучаснай Беларусі.

Тэма 4.15 Сацыяльна-эканамічнае і знешнепалітычнае становішча.

Сацыяльна-эканамічнае становішча. Разрыў ранейшых эканамічных сувязей. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Скарачэнне маштабаў вытворчасці. Інфляцыйныя працэсы. Зніжэнне ўзроўню жыцця насельніцтва. Сацыяльная напружанасць у грамадстве. Шляхі пераходу да рыначнай эканомікі. Стварэнне камерцыйных структур і сумесных прадпрыемстваў. Распрацоўка нацыянальнай стратэгіі устойлівага эканамічнага развіцця. Зніжэнне інфляцыі, ажыўленне вытворчасці. Курс на сацыяльна арыентаваную рынкавую эканоміку. Грашова-фінансавая сістэма.

Знешняя палітыка. Дыпламатычнае прызнанне Рэспублікі Беларусь. Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі краіны. Павышэнне актыўнасці Рэспублікі Беларусь у дзейнасці ААН. Расійскі напрамак у знешняй палітыцы Беларусі. Эканамічная інтэграцыя з Расіяй. Стварэнне супольнасці суверэнных рэспублік. Дагавор аб Саюзе Беларусі з Расіяй 1997 г. Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы 1999 г. Супрацоўніцтва з Расіяй на міжрэгіянальным узроўні. Заходні вектар знешняй палітыкі. Паглыбленне знешнеэканамічных сувязей. Эканамічнае супрацоўніцтва Беларусі з краінамі Лацінскай Амерыкі і Азіі.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА

Нумар раздзела, тэмы, заняткаў	Назва раздзела, тэмы, заняткаў; Пералік вывучаемых пытанняў	Разам гадзін	Количество аудиторных часов				Матэрыяльнае забеспячэнние заняткаў	літаратура	Формы кантроля ведаў
			лекцыі	Практычныя (семінарскіе) заняткя	лабараторныя заняткі	СКРС			
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
	1курс 1 семестр	**36**	**22**	**14**					
1.	**Раздзел 1 Уводзіны ў гісторыю Беларусі**	**4**	**2**	2					
1.1.	Уводзіны ў гісторыю Беларусі. 1. Гісторыя Беларусі як навучальная дысцыпліна. 2. Тэрыторыя і прыродныя ўмовы. Перыядызацыя гісторыі Беларусі. 3. Важнейшыя крыніцы па гісторыі Беларусі 4. Асноўныя этапы развіцця гістарыяграфіі гісторыі Беларусі	4	2	2				[80; 15]	
2	**Раздзел 2. Першабытная эпоха на тэрыторыі Беларусі (100-35 тыс. гадоў да н.э. – VIII ст. н.э.)**	**6**	**4**	**2**					
2.1.	Тэма 1. Засяленне тэрыторыі Беларусі. Насельніцтва Беларусі ў бронзавам і жалезным веках. 1. Неандэртальцы і краманьёнцы.Умовы жыцця, прылады працы, асноўныя заняткі. 2. Плямёны і археалагічныя культуры каменнага веку.	2	2	-			Карта	[3; 15; 80]	

	3. З'яўленне індаеўрапейцаў, іх балцкая галіна на беларускіх землях.								
22.	Тэма 2. Рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі 1. Генезіс усходнеславянскіх плямён і шляхі іх рассялення па тэрыторыі Беларусі. 2. Праблема паходжання беларусаў. 3. Сельская абшчына (“мір”). Паселішчы і гарадзішчы. 4. Разлажэнне першабытна-абшчынных адносін. Узнікненне класавага грамадства. 5. Саюзы плямён (“княжанні”).	4	2	2			Карта	[15; 20; 23; 78; 80]	
3	**Раздзел 3. Раннефеадальныя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях (IX – першая палова XIII ст.)**	**14**	**8**	**6**					
3.1.	Тэма 1. Першыя княствы-дзяржавы на беларускіх землях. 1. Узнікненне княстваў. Старажытнабеларускія землі і Кіеўская Русь. 2. Дзяржаўнасць Полацкай зямлі. 3. Утварэнне Тураўскага княства 4. Беларускія землі ў Смаленскім, Чарнігаўскім, Кіеўскім, Уладзіміра-Валынскім княствах.	2	2	-			Карта	[7; 10; 15; 68]	
3.2.	Тэма 2. Феадальная раздробленасць на беларускіх землях. 1. Прычыны і наступствы феадальнай раздробленасці. 2. Драбленне Полацкай зямлі. 3. Падзел Тураўскай зямлі 4. Княствы ў беларускім Пабужжы і Панямонні, воласці ў Пасожжы. 5. Арганізацыя кіравання і дзяржаўны лад у землях-княствах.	4	2	2				[7; 10; 15; 30; 68; 82]	
3.3.	Тэма 3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель ў 10-13 ст.	4	2	2				[15; 30; 78; 79]	

	1. Шматукладнасць эканомікі. Развіццё феадальных адносін на землях Беларусі. 2. Стан сельскай гаспадаркі. 3. Узнікненне гарадоў. Гарадское рамяство. 4. Унутраны і знешні гандаль. 5. Сацыяльнае расслаенне грамадства.								
3.4.	Тэма 4. Барацьба з крыжацкай агрэсіяй і нашэсцем мангола-татараў. 1. Знешнепалітычнае становішча беларускіх зямель у пачатку XIII ст. 2. Напад нямецкіх феадалаў на Усходнюю Прыбалтыку і Полацкую зямлю. 3. Роля беларускага народа ў барацьбе з мангола-татарамі.	2	-	2			Падборка ілюстрацый	[15; 20; 30]	
3.5.	Тэма 5. Рэлігія і культура ў IX – першай палове XIII ст.ст. 1. Распаўсюджанне хрысціянства. 2. Літаратура. 3. Школы дойлідства, фрэскавыя роспісы. 4. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.	2	2	-					
4	**Раздзел 4. Утварэнне і станаўленне Вялікага княства Літоўскага (другая палова XIII – XV ст.ст.)**	**12**	**8**	**4**					
4.1.	Тэма 1. Утварэнне Вялікага княства Літоўскага. 1. Уплыў знешнепалітычнай сітуацыі на ўтварэнне дзяржавы ў верхнім і сярэднім Панямонні. 2. Сацыяльна-эканамічныя перадумовы фарміравання ВКЛ. 3. Міндоўг і яго палітыка. 4. Уключэнне ў склад ВКЛ Полацкага, Віцебскага, Менскага княстваў і падняпроўскіх зямель.	4	2	2			Карта	[13; 16; 41; 80]	

4.2.	Тэма 2. Эканамічны лад і сацыяльныя працэсы. 1. Формы феадальнага землеўладання, павіннасці сялян. 2. Гарады і замкі, рамёствы і гандаль. 3. Сацыяльны склад насельніцтва.	4	2	2				[13; 16; 41; 80; 82]	
4.3.	Тэма 3. Унутраная і знешняя палітыка і войны Вялікага княства Літоўскага. 1. Унутраная палітыка ВКЛ. 2. Барацьба з крыжацкай агрэсіяй, Грунвальдская бітва. 3. Адносіны Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай. 4. Арганізацыя войска ВКЛ і барацьба супраць крымскіх татар.	2	2	-			Карта	[16; 13; 24]	
4.4.	Тэма 4. Этнічныя працэсы і культура беларускіх зямель ў XIV-XV ст. 4. Этнічныя працэсы. 5. Дойлідства і выяўленчае мастацтва. 6. Рукапісная кніга. Арыгінальная і перакладная літаратура. 7. Беларуска-літоўскае летапісанне.	2	2	-					
	1 курс 2 семестр	**50**	**22**	**22**		**6**			
5	**Раздзел 5. Беларусь ў XVI – першай палове XVII ст.**	**16**	**6**	**6**		**4**			
5.1.	Тэма 1. Унутрыпалітычнае і знешнепалітычнае становішча ВКЛ ў першай палове і сярэдзіне XVI ст. 1. Аграрная рэформа сярэдзіны XVIст. “Валочная памера” і яе сутнасць. Запрыгоньванне сялянства. 2. Гарады і гарадскога насельніцтва. Цэхавая арганізацыя гарадскіх рамеснікаў. 3. Лівонская вайна. 4. Люблінская унія 1569 г. 5. Стафан Баторый, яго ўнутраная і знешняя палітыка.	6	2	2		2	Карта	[16; 13; 80]	

5.2.	Тэма 2. Эвалюцыя дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ. 1. Сталіцы, герб і мова дзяржаўнага справаводства, органы дзяржаўнай улады і кіравання. 2. Сістэма мясцовага кіраўніцтва, судовая сістэма і асаблівасці яе існавання ў XIV — XVI ст.	4	2	2					
5.3.	Тэма 3. Царква і рэлігія. Адраджэнне на Беларусі. 1. Рэлігійныя адносіны. 2. Гуманізм. Дзеячы Адраджэння на Беларусі. 3. Кнігадрукаванне. Францыск Скарына і яго дзейнасць. 4. Грамадска-палітычная думка і літаратура. Сістэма адукацыі. 5. Горадабудаўніцтва і архітэктура. Выяўленчае, тэатральнае і музычнае мастацтва.	6	2	2		2			
6	**Раздзел 6 Беларусь у сярэдзінеXVII– першай палове XVIII ст.**	**12**	**6**	**6**					
6.1.	Тэма 1. Войны сярэдзіны XVII і іх наступствы. Паўночная вайна на Беларусі. 1 Казацка-сялянская вайна 1648 – 1651 гг. 2 Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай з 1654—1667 гг. 3. Прычыны і пачатак Паўночнай вайны. Ход баявых дзеянняў і вынікі вайны для Беларусі.	4	2	2			Карта	[13; 17; 80]	
6.2.	Тэма 2. Унутрыпалітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў сярэдзіне XVII – першай палове XVIII ст. 1. Унутрыпалітычная сітуацыя ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Палітычны крызіс, узмацненне феадальнай анархіі, рэлігійная сітуацыя. 2.Эканамічнае становішча. Сялянская і панская гаспадарка.	4	2	2			карта	[13; 17; 80]	Абарона рэфератаў

	3. Гарады і мястэчкі. Рамяство і гандаль.								
6.3.	Тэма 3. Культура Беларусі ў сярэдзіне XVII – першай палове XVIII ст. 1. Гістарычныя ўмовы этнакультурнага развіцця. Працэс паланізацыі і яго вынікі. 2. Адукацыя і навука. 3. Развіццё літаратуры і кнігадрукавання. Грамадска-палітычная думка. 4. Мастацтва. Стыль барока.	4	2	2				[13; 17; 80]	
7	**Раздзел 7. Беларусь ў другой палове XVIII ст.**	**22**	**10**	**10**		**2**			
7.1.	Тэма 1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове XVIII ст. 1. Нармалізацыя эканамічнага жыцця ў Беларусі: аднаўленне сельскай і гарадской гаспадаркі. Унутраны і знешні гандаль. 2. Сялянская гаспадарка і катэгорыі сялян. Вотчынныя мануфактуры. 3. Рэфарматарская дзейнасць А.Тызенгаўза.	4	2	2				[13; 17; 80]	
7.2.	Тэма 2. Спробы дзяржаўных рэформ. Першы і другі падзелы Рэчы Паспалітай 1. Прычыны падзення Рэчы Паспалітай 2 Спробы дзяржаўных рэформ. 3 Першы падзел Рэчы Паспалітай. 4 Другі падзел Рэчы Паспалітай.	4	2	2			карта	[13; 17; 78; 79]	
7.3.	Тэма 3. Паўстанне 1794 г. Ліквідацыя Рэчы Паспалітай. 1. Падрыхтоўка і пачатак паўстання ў Польшчы. Тадэвуш Касцюшка. 2. "Віленскія якабінцы" і Якуб Ясінскі. Фарміраванне і баявая дзейнасць паўстанцкіх атрадаў. 3. Адносіны да паўстання сялян. Паланецкі універсал.	6	2	2		2	Карта	[1; 2; 13; 17; 82]	

	4. Палітыка расійскага ўрада і прычыны паражэння паўстання. 5. Трэці падзел Рэчы Паспалітай. Прычыны ліквідацыі Рэчы Паспалітай								
7.4.	Тэма 4. Беларускія землі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай (1772 - 1801 гг.). 1. Увядзенне новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу. Змены ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці і гандлі. Стан гарадоў. 2. Прывядзенне да прысягі і афармленне сацыяльнага статусу насельніцтва. Правы і прывілеі пануючага саслоўя. 3. Змены ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці, унутраным і знешнім гандлі. 4. Насаджэнне рускага дваранскага землеўладання.	4	2	2			карта	[13; 17; 78; 79]	
7.5.	Тэма 5. Культура Беларусі ў другой палове XVIII ст. 1. Эпоха Асветніцтва на Беларусі. 2. Стварэнне і дзейнасць Адукацыйнай камісіі. 3. Гродзенская медыцынская школа. Дасягненні прыродазнаўчых навук 4. Ідэі Асветніцтва ў літаратуры і грамадскай думцы. 5. Прыгонныя тэатры. Музычнае мастацтва. 6. Архітэктура і жывапіс, класіцызм.	4	2	2				[13; 17; 70]	
	2 курс 1 семестр	**54**	**24**	**24**		**6**			
8	**Раздзел . Беларусь у першай палове XIX ст.**								
8.1.	Тэма 1. Эканамічнае развіццё і сацыяльныя супчярэчнасці. 1. Сельская гаспадарка. Узмацненне феадальная эксплуатацыі сялянства. 2. Разлажэнне феадальна-прыгонніцкага ладу. Пачатак прамысловага пераваротy.	4	2	2		-		[23; 78; 79]	

	3. Узрастанне ролі гарадоў і мястэчак. Транспарт і гандаль.								
8.2.	Тэма 2. Вайна 1812 г. і Беларусь 1. Расійска-французскія адносіны і палітычная сітуацыя ў заходніх губернях напярэдадні вайны. 2. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам 1812 г. і палітыка французскіх улад 3. Адносіны насельніцтва да вайны і яго удзел у баявых дзеяннях 4. Ваенныя дзеянні восенню 1812 г. і выгнанне французаў. Вынікі вайны для Беларусі	4		2		2	Карта	[18; 40; 80]	
8.3	Тэма 3. Палітыка царскага ўрада. 1. Эвалюцыя саслоўнай палітыкі. Палажэнне аб яўрэях. Ваенныя пасяленні. Актуалізацыя сялянскага пытання. 2. Люстрацыя дзяржаўных маёнткаў. Інвентарная рэформа. 3. Канфесіянальная палітыка ў Беларусі. Полацкі царкоўны сабор. 4. Змяненні ўрадавай палітыкі ў галіне асветы.. Заканадаўства. 5. Русіфікацыя і яе сутнасць.	4	2	2				[18; 40; 80]	
8.4	Тэма 4. Грамадска-палітычнае жыццё. 1. Тайныя таварыствы на Беларусі і іх дзейнасць. 2. Дзекабрысцкі рух і Беларусь. 3. Шляхецкае паўстанне 1830-1831 гг. 4. Дэмакратызацыя грамадскага руху. Уплыў рэвалюцыйных падзей у Заходняй Еўропе на грамадска-палітычны рух на Беларусі.	4	2	2				[18; 40; 53; 80]	
8.5.	Тэма 5. Культура ў першай палове XIX ст. 1. Уплыў польскай і рускай культур на культуру беларускага народу. Нацыянальна-культурная палітыка ўрада.	2	2						

	2. Асвета. 3. Навука. 4. Станаўленне новай беларускай мовы і літаратуры. 5. Мастацтва, музыка, тэатр. 6. Архітэктура, жывапіс, графіка, скульптура.								
9	**Раздзел 9. Беларусь у другой палове XIX ст.**								
9.1.	Тэма 1 . Адмена прыгоннага права ў Беларусі 1 Перадумовы і падрыхтоўка сялянскай рэформы 2 Рэалізацыя “Палажэнняў” 19 лютага 1861 г. і асаблівасці правядзення аграрнай рэформы ў Беларусі 3 Рэформа аграрных адносін дзяржаўных сялян Вынікі і значэнне аграрных рэформ.	4	2	2				[18; 23; 40; 53; 78; 79; 80]	
9.2.	Тэма 2. Паўстанне 1863 г. на Беларусі.. 1 Актывізацыя грамадскага жыцця напярэдадні паўстання. К. Каліноўскі. “Мужыцкая праўда” 2 Ход паўстання. Тактыка “белых”. 3 Падаўленне паўстання і прычыны яго паражэння.								
9.3.	Тэма 3. Буржуазныя рэформы 60-70 гг. XIX ст. і ўрадавая палітыка ў Беларусі 1 Рэформа дзяржаўных інстытутаў і мясцовага кіравання. Контррэформы 2 Барацьба з “польскасцю” і пашырэнне рускага землеўладання. 3. Змены ва ўрадавай палітыцы ў Беларусі па нацыянальным і рэлігійным патаннях. Пашырэнне ўплыву праваслаўнай царквы	4	2	2				[18; 23; 40; 53; 78; 79; 80]	Кантрольная работа
9.4.	Тэма 4. Сельская гаспадарка Беларусі ў 60-90 гг. XIX ст. 1 Памешчыцкае і сялянскае землеўладанне, рост бессаслоўнай зямельнай уласнасці	4	2	2				[18; 23; 40; 53; 78; 79; 80]	

	2 Аграрны крызіс 80-х гг. XIX ст. і змены ў спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі 3 Сацыяльнае расслаенне сялянства і фарміраванне аграрнай буржуазіі.								
9.5.	Тэма 5. Прамысловасць і гарады Беларусі ў другой палове XIX ст. 1. Спецыялізацыя прамысловасці і яе галіновая структура ў перыяд прамысловай рэвалюцыі 2. Рост гарадоў. Мястэчкі. Транспарт. Гандаль. Крэдыт. Фарміраванне адзінага эканамічнага рэгіёна.	4	2			2		[18; 23; 40; 53; 78; 79; 80]	Пісьмовая праверачная работа
9.6.	Тэма 6. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі ў 60-90 гг. XIX ст. 1. Ідэалогія монархізму. “Заходнерусізм”. Станаўленне ліберальнай думкі. Рэвалюцыйна-дэмакратычная думка. 2. Вытокі ідэалогіі беларускага нацыянальнага руху. Польскі і яўрэйскі нацыянальныя рухі. 3. Вытокі і сутнасць народніцтва. Народніцкія арганізацыі на Беларусі. Група “Гоман”. 4. Эвалюцыя рабочага руху. Распаўсюджанне марксізму.	2		2				[5; 18; 20; 80]	

9.7.	Тэма 7. Культура Беларусі ў 60-90 гг. XIX ст. і фарміраванне беларускай нацыі 1. Умовы ўтварэння беларуская нацыі. Фарміраванне этнічнай тэрыторыі. Агульнасць эканамічнага жыцця. Сацыяльна-класавыя асаблівасці. Этнічная самасвядомасць. 2. Асвета і палітыка ўрада ў галіне школьнай справы 3. Навука і развіццё навуковага беларусазнаўства 4. Развіццё мастацкай літаратуры 5. Тэатр і музыка, архірхітэктура і горадабудаўніцтва. Выяўленчае мастацтва.	6	2	2		2		[18; 47; 80] [18; 47; 80]	Кантрольная работа
10	**Раздзел 10. Беларусь ў пачатку XX ст.**								
10.1.	Тэма 1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі. 1. Сацыяльны і нацыянальны склад насельніцтва Беларусі. 2. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Стан і развіццё прамысловасці. 3. Сталыпінская рэформа і яе сутнасць. Асаблівасці рэалізацыі ў Беларусі. 4. Прычыны і мэты правядзення земскай рэформы ў Беларускіх губернях, яе асаблівасці.	4	2	2				[18; 78; 79; 80]	калоквіум
10.2.	Тэма 2. Рэвалюцыйныя падзеі 1905—1907 гг. у Беларусі. 1. Пачатак рэвалюцыі. 2. Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. Адступленне рэвалюцыі. 3. Выбары ў I і II Дзяржаўныя думы Расіі. Трэцячэрвеньскі дзяржаўны пераварот 1907 г. 4. Беларускі нацыянальны рух у перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг.	2		2				[8; 18; 20; 80]	

10.3.	Тэма 3. Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў 1907—1914 гг. 1. Грамадска-палітычнае жыццё. Грамадска-палітычны рух у Беларусі ў час выбараў у III і IV Дзяржаўныя думы. 2. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух.	4	2	2				[18; 23; 78; 79]	
10.4.	Тэма 4. Культура Беларусі ў пачатку XX ст. 1. Палітыка ўрада ў галіне адукацыі. 2. Перыядычны друк і выдавецкая справа. 3. Развіццё беларусазнаўства. 4. Развіццё беларускай літаратуры. 5. Тэатр і музыка. Архітэктура, выяўленчае мастацтва.	2	2						
	2 курс 2 семестр	**50**	**24**	**20**		**6**			
11	**Раздзел 11. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны. Станаўленне Беларускай дзяржаўнасці (1914-1920 гг.)**	**12**	**6**	**4**		**2**			
11.1	Тэма 1. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны і Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. 1. Прычыны і пачатак вайны. Ваенныя дзеянні на германска-расійскім (Усходнім) фронце ў 1914—1916 гг. 2.Становішча на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі. 3.Палітыка нямецкай акупацыйнай адміністрацыі. Беларускі нацыянальны рух у гады вайны.	2	2				Карта	[18; 20; 80]	

11.2.	Тэма 2. Беларусь ў час Лютайўскай рэвалюцыі 1917 г. 1. Падзеі Лютаўскай рэвалюцыі на Заходнім фронце. 2. Палітычнае развіццё. 3. Рабочы рух. 4. Дэмакратызацыя арміі. Абуджэнне вёскі. 5. Канец дваеўладдзя.	2				2			
11.3.	Тэма 3. Беларускі нацыянальны рух у перыяд ад лютага да кастрычніка 1917 г. 1. Аднаўленне дзейнасці БСГ. Утварэнне беларускіх нацыянальных партый і арганізацый. 2.З'езд беларускіх нацыянальных арганізацый 25—27 сакавіка 1917 г. 3.II з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый і партый 8—10 ліпеня 1917 г. Размежаванне ў беларускім нацыянальным руху. 4. Пашырэнне беларускага нацыянальнага руху ў войску.	2	2				прэзентацыя	[19; 38; 40; 67]	
11.4.	Тэма 4. Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і ўсталяванне савецкай улады ў Беларусі і на Заходнім фронце. 1. Абвастрэнне палітычнай сітуацыі. Пераход улады да Саветаў і ваенкомаў у Беларусі і на Заходнім фронце. 2. Утварэнне і дзейнасць Аблвыканкамзаха і СНК Заходняй вобласці. Першыя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні. 3. Стаўленне беларускіх нацыянальных партый да савецкай улады.	2		2				[19; 38; 40; 67]	
11.5.	Тэма 5. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. 1. Палітычнае становішча на беларускіх землях у пачатку 1918 г. Падпісанне Брэсцкага мірнага дагавора 3 сакавіка 1918 г. і яго наступствы для Беларусі.	2	2				Падборка ілюстрацый	[19; 38; 40; 67]	калоквіум

	2. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Устаўныя граматы. 3. Узаемаадносіны Рады і ўрада БНР з германскімі акупацыйнымі ўладамі. Аднаўленне савецкай улады ў Беларусі. 4. Месца БНР у гісторыі нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва беларускага народа.								
11.6.	Тэма 6. Утварэнне БССР і Літоўска-Беларускай ССР. 1. Барацьба па пытанні аб беларускай савецкай дзяржаўнасці. 2. Абвяшчэнне Беларускай ССР. Першая Канстытуцыя Савецкай Беларусі. 3. Стварэнне і сутнасць Літоўска-Беларускай ССР. Ліквідацыя Літбела і яе прычыны. 4. Беларусь у час польска-савецкай вайны. 5. Другое абвяшчэнне БССР, заканчэнне вайны.	2		2			карта	[19; 40; 80]	Вусная гутарка
12	**Раздзел 12. Беларусь у 20-30-я гады XX ст.**	**16**	**8**	**6**		**2**			
12.1.	Тэма 1. Грамадска-палітычнае жыццё і нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва Беларусі ў 20-я гг. XX ст. 1. Палітыка «ваеннага камунізму». Абвастрэнне сацыяльнай напружанасці. 2. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў БССР у 1921—1927 гг. 3. Палітыка беларусізацыі. Становішча нацыянальных меншасцей у БССР. 4. Усталяванне аднапартыйнай сістэмы. Прыняцце Канстытуцыі БССР 1927 г.	4	2	2			Падборка ілюстрацый	[19; 38; 40; 57]	
12.2	Тэма 2. Пераход да Новай эканамічнай палітыкі (НЭПа). 1. Ажыццяўленне мерапрыемстваў новай эканамічнай палітыкі ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы. 2. Згортванне НЭПу і пераход да адміністрацыйна-камандных метадаў	2		2				[19; 40; 57]	Пісьмовая кантрольная работа

	кіравання эканомікай.								
12.3.	Тэма 3. Індустрыялізацыя ў Беларускай ССР. 1. Прычыны, мэты і задачы індустріялізацыі. Рэсурсы і сродкі. 2. Стварэнне новых галін прамысловасці. 3. Развіццё прамысловасці ў гады першай і другой пятігодкі. 4. Падрыхтоўка кадраў. Стаханаўскі рух у Беларусі. 5. Вынікі індустріялізацыі ў БССР.	2	2					[19; 38; 57]	
12.4	Тэма 4. Калектывізацыя ў Беларускай ССР. 1. Курс на сацыялістычную перабудову вёскі. 2. Пераход да масавай калектывізацыі. 3. Завяршэнне калектывізацыі беларускай вёскі, яе палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя вынікі.	2		2					
12.5.	Тэма 5. Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё Беларускай ССР. 1. Фармсіраванне савецкай сістэмы адукацыі. Барацьба з непісьменнасцю. 2. Развіццё мастацкай літаратуры, тэатра ва ўмовах савецкай улады. Выяўленчае і музычнае мастацтва. 3. Карэнны паварот у грамадска-палітычным і культурным жыцці ў пачатку 30-х гг. Разгортванне ідэйна-палітычнай барацьбы з беларускім «нацыянал-дэмакратызмам». 4. Абвастрэнне ідэйна-палітычнай барацьбы сярод беларускіх літаратараў. Архітэктура, мастацтва. Укараненне “пралетарскай” культуры. 5. Палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі ў 30-я гг.	2	2					[19; 47; 57; 58]	Абарона рэферата ў

12.6.	Тэма 6. Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы. 1. Тэрыторыя Заходняй Беларусі, яе адміністрацыйны падзел. 2. Сістэма кіравання, сацыяльны, нацыянальны і канфесійны склад насельніцтва. 3 Адметныя рысы эканомікі Заходняй Беларусі. 4. Сельская гаспадарка Заходняй Беларусі. Аграрная палітыка польскіх улад.	2	2				Карта	[19; 40; 80] [19; 78; 79]	
12.7.	Тэма 7. Рэвалюцыйна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі. Культура Заходняй Беларусі. 1. Палітыка польскіх улад у Заходняй Беларусі. Нацыянальны прыгнёт. 2.Асноўныя палітычныя партыі і арганізацыі ў Заходняй Беларусі. 3. Арганізацыя Беларускай сялянска-работніцкай Грамады (БСРГ), яе праграма і дзейнасць. 4. Уздым рабочага і сялянскага руху ў пачатку 1930-х гг. 5. Умовы развіцця культуры. Таварыства беларускай школы і інш. 6. Літаратура, друк, мастацтва.	2				2		[19; 40; 80]	Франтальнае апытанне
13.	**Раздзел 13. Беларусь у гады Другой сусветнай вайны (1939-1945 гг.)**	**8**	**4**	**4**					
13.1.	Тэма 1. Беларусь у пачатку Другой сусветнай вайны. 1. Пачатак Другой сусветнай вайны. Паход Чырвоная арміі ў Беларусь. 2. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. 3. Асноўныя накірункі і вынікі развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў 1938-1941 гг.	2	2						

13.2.	Тэма 2. Беларусь у гады Вялікай айчыннай вайны. 1. Прыгранічныя баі на тэрыторыі БССР. Абарона Брэсцкай крэпасці. 2. Мерапрыемствы па мабілізацыі насельніцтва і эвакуацыя ў савецкі тыл. 3. Абарончыя баі летам 1941 г. Прычыны паражэння савецкіх войскаў у першы перыяд вайны.	2		2					
13.3	Тэма 3. Акупацыйны рэжым. 1. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі. Сістэма акупацыйнай улады. Рабаванне гітлераўцамі гаспадарчых і культурных каштоўнасцей. 2. Стварэнне канцлагераў. Яўрэйскія гета. Угон насельніцтва ў Германію. 3. Калабаранцкія арганізацыі і іх дзейнасць.	2		2					
13.4.	Тэма 4. Барацьба супраць фашысцкіх захопнікаў на акупіраванай тэрыторыі. Вызваленне Беларусі. 1. Стварэнне антыфашысцкага падполля. 2. Разгортванне партызанскага руху. 3. Партызанскія зоны. Партызанскія рэйды. “Рэйкавая вайна”. 4. Дзейнасць Арміі Краёвай на тэрыторыі Беларусі. 5. Пачатак вызвалення Беларусі ў канцы 1943. Аперацыя “Баграціён”. 6. Вызваленне сталіцы савецкай Беларусі. Завяршэнне вызвалення Беларусі.	2	2						
14	**Раздзел 14. Беларусь у другой палове 40-х – 80-х гг. XX ст.**	**8**	**2**	**6**					

14.1.	Тэма 1. Пераход да мірнага будаўніцтва. 1. Страты ў народнай гаспадарцы і культуры Беларусі. Пачатак аднаўлення. 2. Пасляваенная індустрыялізацыя. 3. Становішча сельскай гаспадаркі. Адраджэнне калгасна-саўгаснай сістэмы. Калектывізацыя ў Заходніх абласцях БССР. 4. Матэрыяльнае становішча насельніцтва.Жыллёвае будаўніцтва. Адмена картачнай сістэмы. 5. Наладжванне медыцынскага і сацыяльнага забеспячэння.	2		2					
14.2.	Тэма 2. Грамадска-палітычнае жыццё. 1. Умацаванне адміністрацыйна-каманднай сістэмы. 2. Формы і метады дзейнасці партыйных, савецкіх, камсамольскіх, прафсаюзных і грамадскіх арганізацый. 3. Беларусь – адна з краін заснавальніц ААН. Роль і месца БССР на міжнароднай арэне ў другой палове 40-х – першай палове 80-х гг. XX ст. 4. “Хрушчоўскай адліга”. 5. Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў 70-я – першай палове 70-х гг. П.М.Машэраў. 6. Спробы мадэрнізацыі савецкай грамадска-палітычнай сістэмы пад час палітыкі перабудовы.	2	2						
14.3.	Тэма 3. Сацыяльна-эканамічнае становішча ў 40-х – 80-х гг. XX ст. 1. Развіццё прамысловасці і транспарту. Разгортванне навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. З’яўленне новых галін вытворчасці. Здабыткі і праблемы эканомікі ў 70-я-80-я гг.	2		2					

	2. Спробы рэформ у сельскай гаспадрцы. Меліярацыя. Хімізацыя. Харчовая праграма 1982 г. 3. Матэрыяльны дабрабыт насельніцтва і шляхі яго паляпшэння. Жыллёвае будаўніцтва. 4. Чарнобыльская катастрофа і яе наступствы для Беларусі.								
14.4.	Тэма 4. Культура і навука ў БССР. 1. Аднаўленне і развіццё сярэдняй і вышэяшай адукацыі, клубаў, бібліятэк. Падрыхтоўка навукова-педагагічных кадраў. 2. Дзейнасць АН БССР. 3. Развіццё беларускай літаратуры. 4. Дзейнасць тэатральных калектываў і развіццё музычнага мастацтва. 5. Выяўленчае мастацтва. Архітэктура.	2		2					
15	**Раздзел 15. Рэспубліка Беларусь (90-я гг. XX ст. – пачатак XXI стст.)**	**6**	**4**			**2**			
15.1.	Тэма 1. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь. 1. Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь і ўвядзенне новай дзяржаўнай сімволікі. 2. Распад СССР, утварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). 3. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. 4. Рэферэндумы 1995, 1996, 2004 гг.	2	2				Компьютэрная прэзентацыя	[8; 38; 40; 80; 82]	
15.2.	Тэма 2. Сацыяльна-эканамічнае становішча. Знешняя палітыка. 1. Разрыў ранейшых эканамічных сувязяў. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця. 2. Інфляцыйныя працэсы. Зніжэнне ўзроўню жыцця насельніцтва. 3. Шляхі пераходу да рыначнай эканомікі. Стварэнне камерцыйных структур і сумесных прадпрыемстваў 4. Распрацоўка нацыянальнай стратэгіі	2				2	Кампьютарная прэзентацыя	[78; 79; 80]	

	ўстойлівага эканамічнага развіцця. Зніжэнне інфляцыі, ажыўленн вытворчасці. 5. Сучаснае сацыяльна-эканамічнае становішча на сучасным этапе. 6. Дыпламатычнае прызнанне Рэспублікі Беларусь. Статус без'ядзернай і нейтральнай дзяржавы. 7. Дагавор аб Саюзе Беларусі з Расіяй 1997 г. Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы 1999 г. 8. Заходні вектар знешняй палітыкі. Узаемаадносіны Беларусі з краінамі Лацінскай Амерыкі, Азіі.								
15.3.	Тэма . Навука і культура. 1. Роля навукі ў інфармацыйным грамадстве. 2. Рэформа НАН Беларусі. Інтэграцыя ў міжнародную навуковую супольнасць. 3. Заканадаўчая база для развіцця адукацыі і культуры. Рэформа школы, падрыхтоўка кадраў. 4. Новы этап ў развіцці літаратуры, мастацтва: дасягнення і цяжкасці. Нацыянальна-культурнае адраджэнне. 5. Месца рэлігіі ў духоўным адраджэнні, узаемаадносіны дзяржавы і царквы.	2	2					[78; 79; 80]	Выніковая праверачная работа
	Всего:	190	92	80		18			

ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

Уводзіны ў гісторыю Беларусі
Рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі.
Феадальная раздробленасць на беларускіх землях.
Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель ў 10-13 ст.
Барацьба з крыжацкай агрэсіяй і нашэсцем мангола-татараў.
Утварэнне ВКЛ.
Эканамічны лад і сацыяльныя працэсы ў ВКЛ (другая палова XI – XV ст.ст.).
Унутрыпалітычнае і знешнепалітычнае становішча ВКЛ у першай палове і сярэдзіне XVI ст.
Эвалюцыя дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ ў XVI – першай палове XVII ст.
Царква і рэлігія. Адраджэнне на Беларусі (XVI – першая палова XVII ст
Войны сярэдзіны XVII на Беларусі і іх наступствы.
Унутрыпалітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў сярэдзіне XVII – першай палове XVIII ст.
Культура Беларусі ў сярэдзіне XVII – першай палове XVIII ст.
Сацыяльна-эканамічнае развіццѐ ў другой палове XVIII ст.
Спробы дзяржаўных рэформ. Першы і другі падзелы Рэчы Паспалітай/
Паўстанне 1794 г. на Беларусі. Ліквідацыя Рэчы Паспалітай.
Беларускія землі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай (1772 - 1801 гг.)/
Культура Беларусі ў другой палове XVIII ст.
Беларусь у першай палове XIX ст. (эканамічнае развіццё і сацыяльныя супярэчнасці).
Вайна 1812 года і Беларусь.
Беларусь у першай палове XIX ст. (палітыка царскага ўрада).
Беларусь у першай палове XIX ст.(грамадска-палітычнае жыццё).
Адмена прыгоннага права ў Беларусі.
Паўстанне 1863 г. у Беларусі.
Буржуазныя рэформы 60-70-х гг. на Беларусі.
Сельская гаспадарка Беларусі ў 60-90-х гг. XIX ст.
Грамадска-палітычнае жыцце ў Беларусі ў 60-90-х гг. XIX ст.
Культура Беларусіў 60-90 –я гг. XIX ст.
Беларусь у пачатку XX ст.: сацыяльна-эканамічнае развіццё.
Рэвалюцыйныя падзеі 1905-1907 гг. на Беларусі
Грамадска-палітычнае жыцце Беларусі ў 1907 – 1914 гг.
Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і ўсталяванне савецкай улады ў Беларусі і на Заходнім фронце.
Утварэнне БССР і Літоўска-Беларускай ССР.
Грамадска-палітычнае жыццё і нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва Беларусі ў 20-я гады XX ст.
Пераход да Новай эканамічнай палітыкі (НЭПа).
Калектывізацыя ў Беларускай ССР.
Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны.
Акупацыйны рэжым.
Пераход да мірнага будаўніцтва.
Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі ў 40-х — 80-х гг. XX ст.
Культура і навука ў БССР

ТЭМАТЫКА СКРС

Унутрыпалітычнае і знешнепалітычнае становішча ВКЛ у першай палове і сярэдзіне XVI ст.
Царква і рэлігія. Адраджэнне на Беларусі (XVI – першая палова XVII ст
Паўстанне 1794 г. на Беларусі. Ліквідацыя Рэчы Паспалітай.
Вайна 1812 года і Беларусь.
Прамысловасць і гарады Беларусі ў другой палове XIX ст.
Культура Беларусі ў 60-90-я гады XIX ст. і фарміраванне беларускай нацыі.
Беларусь у час Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.
Рэвалюцыйна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі. Культура Заходняй Беларусі.
Сацыяльна-эканамічнае становішча і знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь.

ПРЫКЛАДНЫ СПІС ТЭМ РЭФЕРАТАЎ

Асветніцкая дзейнасць Ефрасінні Полацкай
Асветніцкая дзейнасць Кірылы Тураўскага
Полацкая архітэктурная школа 10-13 ст
Полацкі Сафійскі сабор
Палітычны партрэт Усяслава Чарадзея
Язычніцкія вераванні славян і балтаў
З'яўленне і распаўсюджанне хрысціянства на беларускіх землях
Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі 10-13 ст.
Палітычны партрэт Міндоўга
Грунвальдская бітва
Леў Сапега і яго час
Асветніцкая і друкарская дзейнасць Францыска Скарыны
Развіццё архітэктуры на Беларусі ў 14-16 ст.
Мірскі замак
Лідскі замак
Крэўскі замак
Постаць Вітаўта ў гісторыі
Партрэт парсуна і сармацкі партрэт
Радзівілы ў гісторыі Беларусі
Грамадска -палітычная думка на Беларусі ў 17-18 ст.
Магнацкія войны першай трэці 18 ст.
Эканамічны заняпад беларускіх зямель ў першай трэці 18 ст.
Семяон Полацкі
Віленскае барока ў архітэктуры
Магілёўская гравёрная школа
Канфесійная і саслоўная палітыка царызму ў першай трэці 19 ст.
Праекты грамадскіх пераўтварэнняў А.Чартарыйскага
Дзекабрысці рух на Беларусі
Дзейнасць філаматаў і філарэтаў
Група "Гоман"
Творчая спадчына В.Дуніна-Марцінкевіча
А.Чачот, Т.Зан, А.Міцкевіч
Віленскі універсітэт
Горы-Горыцкі земляробчы інстытут
М. Пачобут-Адляніцкі
Тэатральнае жыццё беларускіх губерній ў другой палове 19 ст.

5 ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

5.1 ЛІТАРАТУРА

ЛІТАРАТУРА

АСНОЎНАЯ

1. Археалогія Беларусі: У 4 т. Т. 1. Каменны і бронзавы вякі / Э.М. Зайкоўскі [і інш.]; пад рэд. М.М.Чарняўскага. – Мн.: Беларуская навука, 1997. – 424 с.
2. Архітэктура Беларусі: Энцыкл. давед. / Рэдкал.: А.А. Воінаўііінш. – Мн.: БелЭн, 1993. – 620 с.
3. Асветнікі зямлі Беларускай Х – пач. ХХ ст.: Энцыкл.давед. / Рэдкал. Г.П. Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 2001. – 490 с.
4. Басин, Я. Большевизм и евреи: Белоруссия, 1920-е: исторические очерки / Я. Басин. - Мн: А. Н. Вараксин, 2008. - 304 с.
5. Беларускія летапісы і хронікі: Пер. са старажытнарускай, старажытнабеларускай і польск. / Уклад. У. Арлова; - Мн.: Беларускі кнігазбор, 1997. – 432.
6. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. - Мн.: БелЭн, 2000. – 432 с.
7. Белы, А. Хроніка «Белай русі». Нарыс гісторыі адной геаграфічнай назвы. – Мн., «Энцыклапедыкс», 2000. – 238 с.
8. Богомольников, В.В. Радимичи (по материалам курганов Х – XII вв.) / В.В. Богомольников.- Гомель, 2004. - 226 с.
9. Великая отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): учеб. пособ. под ред. А.А.Ковалени. – Мн.: БГУ, 2004. – 279 с.
10. Верашчагіна, А. Гісторыя канфесій на Беларусі: Мінулае і сучаснасць: Дапаможнік для настаунікаў / А. Верашчагіна, А. Гурко. – Мінск: Тэхналогія, 2002. - 157 с.
11. Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т. Т. 1-2. / рэдкал. : Г.П.Пашкоў (гал. Рэд.) і інш. – 2-е выд. Мінск: БелЭн, 2007.
12. Гарбінскі, Ю. Беларускія рэлігійныя дзеячы ХХ ст. – Мн.-Мюн.: “Беларускі кнігазбор”, 1999. – 752 с.
13. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч.2. XIX – ХХ стагоддзі: Курс лекцый / Рэд. кал. П.І.Брыгадзін, І.Ф.Ладысеў, П.І.Зялінскі і інш. –Мн.: РІВ Ш БДУ, 2002.
14. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 1. Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / рэдкал: М.Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]; - Мн.: Экаперспектыва, 2000. – 351 с.
15. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 2. Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоускага / Ю. Бохан (і інш.); рэдкал.: М. Касцюк (гал.рэд.). - Мінск: Экаперспектыва, 2008. - 688 с.
16. Гісторыя Беларусі: У 6 т. т. 3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII-XVIIIст.) / Ю. Бохан (і інш.); рэдкал.: М. Касцюк (гал.рэд.). - Мінск: Экаперспектыва, 2004. - 344 с.
17. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII - пачатак ХХ ст.) / рэдкал.: М.Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мн.: Экаперспектыва, 2005. – 519 с.
18. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917-1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.] – Мінск: Экаперспектыва, 2006. – 613 с.
19. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. Ад старажытных часоў – па люты 1917 г.: вучэб. дапам. / пад рэд. Я.К.Новіка, Г.С.Марцуля. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – 416 с.

20. Гісторыя беларускай літаратуры XIX – пач. XX ст.: Падручнік / Пад агул. рэд. М.А. Лазарука, А.А. Семяновіча. – Мн.: Вышэйшая школа, 1998. – 559 с.
21. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзен. У 3 т. Т. 2. Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. пад рэд. В.П.Панюціча. – Мн.: Бел. Навука, 2002. – 552.
22. Гісторыя сялянства Беларусі: Са стараж. часоў да 1996 г.: У 3 т. Т.1–2./ Гал. рэд. М.П. Касцюк. – Мн.: Бел. навука, 1997 – 2002.
23. Гудавичюс, Э. История Литвы с древнейших времен до 1569 года. Т. 1. пер. на рус. яз. Г. И. Ефремова. Издательство: Фонд Имени Сытина, 2005 г. - 679 с.
24. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі ў сярэднія вякі (VI-XV ст.ст.). пад. рэд. Г.В.Штыхава. – Мн.: Народная асвета, 1998. – 191 с.
25. Декреты советской власти. Т. 1. 25 октября 1917 г. – 16 марта 1918 г. – Москва, Государственное издательство политической литературы, 1957. – 626 с.
26. Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі. – Мн.: БелЭн, 1994. – 510 с.

ДАДАТКОВАЯ

27. Анішчанка, Я. Інкарпарацыя: Літоўская правінцыя ў падзелах Рэчы Паспалітай / Я.Анішчанка. - Мінск, 2003. – 470 с.
28. Анішчанка, Я. Стогн. Паўстанне і вайна 1794 года ў Літоўскай правінцыі. Дакументы. / Я.Анішчанка. - Мінск: Пейто, 2002. – 208 с.
29. Дробов, Л.Н. Живопись Белоруссии XIX – начала XX вв. – Мн.: Вышэйшая школа, 1974. – 334 с.
30. З гісторыяй на "Вы": Публіцыстычныя артыкулы / Уклад У. Арлова. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1991. –398 с.
31. Загарульскі, Э.М. Заходняя Русь: IX-XIII стст.: вучэб. дапам. - Мн.: Універсітэцкае, 1998. – 240 с.
32. История Беларуси в документах и материалах / Авт.-сост. И.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Мн.: Амалфея, 2000. – 672 с.
33. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Мн.: Амалфея, 2000. – 672 с.
34. История Беларуси: Учебное пособие /Е.Л. Абецедарская, П.И. Бригадин, Л.А. Жилунович и др.; Под ред. А.Г. Кохановского и др. – Мн.: Экоперспектива, 1997. – 319 с.
35. Ігнатоўскі, У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. – Мн.: Беларусь, 1992. – 190 с.
36. Каганович, А. Речица: История еврейского местечка Юго-Восточной Белоруссии / А. Каганович. – Иерусалим, 2007. - 367 с.
37. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII - XX ст.) / В.В. Грыгор'ева, У.М.Завальнюк, У.І.Навіцкі, А.М.Філатава; Навук. рэд. У.І. Навіцкі. – Мінск: ВП «Экаперспектыва», 1998. – 340 с.
38. Карскі Я. Беларусы / Уклад. і камент. С. Гараніна і Л. Ляўшун; Навук. рэд. А. Мальдзіс; Прадм. Я. Янушкевіча і К. Цвіркі. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 2001. – 640 с.
39. Касцюк, М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. – Мн.: Экаперспектыва, 2000. – 308 с.
40. Касяк, І. З гісторыі праваслаўнай царквы беларускага народа / І. Касяк. – выд. бел. цэнтр. рады. – Нью-Йорк, 1956. – 140 с.
41. Ковкель И., Ярмусик Э. История Беларуси с древнейших времен до нашего времени. – Мн.: Аверсэв, 2000. – 591 с.
42. Краўцэвіч, А.К. Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага. - Мн.: Беларуская навука, 1998. — 208 с.

43. Кривонос, Ф., (священник). У Бога мертвых нет. Неизвестные страницы из жизни Минской епархии (1917-1939 годы). - Мн.: МФЦЛ, 2007. – 240с.
44. Кузнецов, И.Н., Шелкопляс В.А. История государства и права Беларуси. – Мн.: Дикта, 1999. – 272 с.
45. Лазука, Б.А. Гісторыя мастацтваў: Вуч. дапам. – Мн.: Беларусь, 1996. – 399 с.
46. Лебедев, А. Костел и власть на Гомельщине (20-30-е годы XX в.) / А.Лебедев, В.Пичуков, С.Лясковски. – Варшава-Люблин-Гомель : IPN-IESW, 2009. – 470 с.
47. Лысенко, П. Ф. Дреговичи. Под ред. В. В. Седова; Минск.: Навука і тэхніка, 1991. – 244 с.
48. Лыч, Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: Экаперспектыва, 1997.– 486 с.
49. Маракоў, Л. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі. 1794 – 1991: Энцыкл. давед.: У 3 т. Т.1. – Мн.: ATHENAEUM, 2002.– 480 с.
50. Маракоў, Л. Рэпрэсаваныя каталіцкія духоўныя, кансэкраваныя і свецкія асобы Беларусі (1917—1964) / Леанід Маракоў.: — Мінск: "Смэлтак", 2009. — 776 с.
51. Марозава, С.В. Уніяцкая царква у этнакультурным развіцці Беларусі (1596-1839 гады) / С.В. Марозава; пад навук. рэд. Конана У.М.; - Гродна: Гродзен. дзярж. ун-т імя Я.Купалы, 2001. - 352 с.
52. Мельтюхов, М. Советско-польские войны. 1918-1939 гг. М., Вече, 2001. – 185 с.
53. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. / М.П. Касцюк, У.Ф. Ісаенка, Г.В. Штыхаў і інш.– Мн.: Беларусь,1994.
54. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч.1. М.П.Касцюк [і інш.]; - Мн.: Беларусь, 1994, - 527 с.
55. Падокшын, С.А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры. – Мн.: Бел. Навука, 2003. – 316 с.
56. Падокшын, С.А. Унія. Дзяржаунасць. Культура: (філас.-гіст.аналіз). НАН Беларусі. Ін-т філасофіі права; рэд.А.С.Майхровіч. — Мінск : Бел.навука, 1998. - 110 с.
57. Пилипенко, М.Ф. Возникновение Белоруссии: новая концепция. - Мн.: Беларусь, 1991. - 142 с.
58. Протько, Т.С. Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917-1941 гг.) / Т.С. Протько.- Минск: Тесей, 2002. - 688 с.
59. Пушкін, І.А. Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (20-я гады ХХст.): / І.А Пушкін. Навук. рэд. М.П.Касцюк. – Магілеў: МДУ імя А. Куляшова, 2004. - 168 с.
60. Рудовіч, С.С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе. - Мн.: Тэхналогія, 2001. – 201 с.
61. Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. давед. / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 2001. – 368 с.
62. Саверчанка, І. Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока. – Мн.: Тэхналогія, 1998. – 319 с.
63. Сагановіч, Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя. – Мн.: Энцыклапедыкс, 2001. – 412 с.
64. Седов В.В. Восточные славяне в VI-XIII вв. - М.: Наука,1982. - 326 с.
65. Силова, С.В. Православная церковь в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941—1945 гг.). — Гродно: ГрГУ, 2003. - 105 с.
66. Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакументах і ўспамінах. (Зборнік). Мн., Энцыклапедыкс, 2001. - 372 с.
67. Смиловицкий, Л. Евреи в Турове: история местечка Мозырского Полесья [Текст] / Л. Смиловицкий. – Иерусалим, 2008. – 848 с.
68. Солский, В. 1917 год в Западной области и на Западном фронте. Мн.: Тесей, 2004. – 224 с.

69. Старажытная беларуская літаратура: Зборнік. - Мн.: Юнацтва, 1990. - 350 с. Лысенко, П.Ф. Туровская земля IX-XIII вв. / П.Ф. Лысенко; НАН Беларуси, Ин-т истории. - 2-е изд. - Минск : Белорусская наука, 2001. - 268 с.
70. Ткачоў, М. А. Замкі і людзі / пад. рэд. Г.В.Штыхава. - Мн.: Навука і тэхніка,1991. – 184 с.
71. Турук, Ф. Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белоруссов. Москва, Государственное издательство, 1921. – 143 с.
72. Філаматы і філарэты: зборнік / Укладанне. пераклад польскамоўных твораў, прадмова, біяграфічныя даведкі пра аўтараў і каментарыі К. Цвіркі — Мн.: Бел. кнігазбор, 1998. — 400 с.
73. Франциск Скорина и его время: Энцикл. справочник / Редкол. И.П. Шамякин и др. – Мн.: БелСЭ, 1990. – 631 с.
74. Цвікевіч, А. "Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадскай думкі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. 2-е выд. - Мн.: Навука і тэхніка,1993.- 352 с.
75. Чантурия, В.А. Архитектурные памятники Белоруссии. – Мн.: Полымя, 1982. – 223 с.
76. Чигринов П. Г. Очерки истории Беларуси. – Мн.: Полымя, 2002. – 432 с.
77. Шалькевіч, В.Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. – Мн.: МНС, 2002. – 248с.
78. Шыбека, З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795-2002). – Мн.: Энцыклапедыкс, 2003. – 490 с. Бярозкіна, Н.Ю. Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI- пачатак XX ст.). – Мн.: Беларуская навука, 1998. – 199 с.
79. Эканамічная гісторыя Беларусі: Вучэб. дапам. / Пад рэд. В.І. Галубовіча. – Мн.: Экаперспектыва, 1999. – 446 с.
80. Экономическая история Беларуси: Учебное пособие. / Под ред. проф. В.И. Голубовича. – Мн.: Экоперспектива, 2001. – 400 с.
81. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 1-6. / рэдкал.: Г.П.Пашкоў [і інш.]; Мн.: Беларус. Энцыкл., 1993-2003.
82. Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя / Гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.
83. Юхо, Я. Гісторыя дзяржавы и права Беларусі: Вучэб. дапам. – У 2ч. Ч.1. – Мн.: РІВШ БДУ, 2000. – 352 с.
84. Янушевич, И.И. Конфессиональная политика советского государства: уроки истории (1917-1928 г.) / И. И. Янушевич. - Минск: БГУ, 2005. - 143 с.
85. Ярмусик, Э.С. Католический костел в Беларуси в 1945-1990 годах. Гродно, 2006. - 568 С.
86. Ярмусик, Э.С. Католический Костёл в Белоруссии в годы второй мировой войны (1939– 1945): Монография / Э.С.Ярмусик. — Гродно: ГрГУ, 2002. — 240 с.